Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

М.У.Сільчанка

АГУЛЬНАЯ ТЭОРЫЯ ПРАВА

Вучэбна-метадычны комплекс па аднайменнаму курсу
для студэнтаў спецыяльнасцей
1-24 01 02 – Правазнаўства
1-24 01 03 – Эканамічнае права

Гродна 2008

УДК 340
ББК 67.0
С36

Рэцэнзенты: прафесар, доктар юрыдычных навук, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права УА «Беларускі дзяржаўны універсітэт» *С.Р.Драбязка;*

прафесар, доктар юрыдычных навук, суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь *А.Г.Цікавенка.*

Рэкамендавана Саветам юрыдычнага факультэта ГрДУ імя Я.Купалы.

Сільчанка, М.У.

С36 Агульная тэорыя права : вучэб.-метад. комплекс / М.У.Сільчанка. – Гродна : ГрДУ, 2008. – 712 с.

ISBN 978-985-417--

Анатацыя

УДК 340
ББК 67.0

ISBN 978-985-417--

© Сільчанка М.У., 2008
© Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы», 2008

ТЛУМАЧАЛЬНАЯЗАПІСКА

Агульная тэорыя права з'яўляецца фундаментальнай навукай, «філасофскім» падмуркам усяго комплексу юрыдычных ведаў, таму што яна вывучае агульныя заканамернасці ўзнікнення, функцыянавання, развіцця і ўзаемадзеяння права і дзяржавы. Паняцці і іх азначэнні, якія распрацоўваюцца і фармулююцца агульнай тэорыяй права, выконваюць ролю своеасаблівых катэгорый юрыспрудэнцыі. Ад паўнаты іх ведання і глыбіні засваення залежаць узровень вывучэння галіновых юрыдычных навук, фармаванне юрыдычнага мыслення, якасць падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў-юрыстаў.

Асноўныя мэты вывучэння агульнай тэорыі права зводзяцца да таго, каб закласці падмурак юрыдычных і палітычных ведаў у будучых спецыялістаў-юрыстаў, сфармаваць суцэльнае і поўнае ўяўленне аб дзяржаўна-прававой арганізацыі грамадства, даць веды аб цэнтральных, вузлавых катэгорыях і паняццях юрыдычнай навукі. Задачы вывучэння агульнай тэорыі права заключаюцца ў тым, каб падрыхтаваць спецыялістаў-юрыстаў, якія валодаюць трывалымі, глыбокімі і ўсебаковымі ведамі аб агульных і спецыфічных заканамернасцях паходжання (узнікнення), развіцця, функцыянавання і ўзаемадзеяння дзяржавы і права.

Шчыльная сувязь існуе паміж агульнай тэорыяй права і дысцыплінамі гісторыка-прававога цыкла – гісторыяй дзяржавы і права замежных краін, гісторыяй дзяржавы і права славянскіх народаў, гісторыяй дзяржавы і права Рэспублікі Беларусь, гісторыяй прававых вучэнняў, гісторыяй палітычнай і прававой думкі Беларусі. Праграма курса «Агульная тэорыя права» пабудавана такім чынам, што гэтыя сувязі праглядваюцца ў большасці тэм, але найбольш грунтоўна яны адлюстраваны ў тэмах 2, 3, 4, 5, 7, 8, 9, 19, 23.

Філасофія і эканамічная тэорыя ўзбройваюць агульную тэорыю права метадалагічнымі ведамі, і таму іх узаемасувязі адлюстраваны ў асноўным у тэме курса агульнай тэорыі права. Тым не менш такія філасофскія катэгорыі, як сутнасць, змест, форма, сістэма, структура, адносіны і іншыя, пранізваюць амаль усе раздзелы праграмы.

Сувязі агульнай тэорыі права з галіновымі юрыдычнымі навукамі найбольш грунтоўна асвятляюцца ў тэмах 10, 14, 15, 16, 18. Значная ўвага ў праграме ўдзяляецца такім базавым паняццям юрыдычнай навукі, як норма права, крыніцы права, рэалізацыя і прымяненне права, прававыя адносіны, правапарушэнне і юрыдычная

адказнасць, таму што яны маюць вялікае значэнне ў падрыхтоўцы спецыялістаў-юрыстаў і шырока выкарыстоўваюцца пры вывучэнні іншых юрыдычных дысцыплін.

Праграма курса агульнай тэорыі права ўключае ўводную тэму, у якой разглядаюцца пытанні прадмета, метадалогіі, метадаў агульнай тэорыі права, а таксама высвятляецца месца агульнай тэорыі права ў сістэме гуманітарных і прававых ведаў, а таксама 4 раздзелы, якія ў сваю чаргу разбіваюцца на 22 тэмы.

Раздзел 1 вучэбнага курса «Паходжанне дзяржавы і права» ўключае тэмы 2–5. У іх асвятляюцца асноўныя рысы першабытнага грамадства, пытанні паходжання (узнікнення) дзяржавы і права, а таксама асноўныя канцэпцыі (тэорыі) паходжання дзяржавы і права. Пры іх асвятленні выкарыстоўваюцца новыя веды аб паходжанні дзяржавы і права, якія былі атрыманы гістарычнай, археалагічнай і этнаграфічнай навукамі. Гэта тычыцца, у прыватнасці, пераходу ад прысвойваючай да вытворчай эканомікі («неалітычная рэвалюцыя») і ўздзеяння гэтага працэсу на ўзнікненне дзяржавы і права.

У раздзеле 2 «Тэорыя дзяржавы» разглядаюцца пытанні сутнасці і азначэння дзяржавы, а таксама выкладаецца вучэнне аб формах дзяржавы, яе функцыях і апараце (механізме) дзяржавы.

Раздзел 3 «Тэорыя права» ўключае ў сябе асноўныя катэгорыі і паняцці тэорыі права. У гэты раздзел вучэбнага курса ўключаецца ўся праблематыка так званай «догмы права», г.зн. тэмы аб нормах права і іх крыніцах, а таксама аб сістэме права, праватворчасці, правапрымяненні і прававых адносінах.

Раздзелы 2 і 3 вучэбнай праграмы завяршаюцца адпаведна тэмамі, у якіх пытанні тэорыі дзяржавы і пытанні тэорыі права разглядаюцца ў больш шырокіх сістэмах: дзяржава – у палітычнай сістэме, а права – у сістэме іншых сацыяльных рэгулятараў.

Раздзел 4 праграмы як бы падводзіць высновы вывучэння папярэдніх тэмаў і раздзелаў. Ён утрымлівае толькі адну тэму. На падставе разгляду агульных заканамернасцяў аб суадносінах дзяржавы і права ў дадзенай тэме вывучаюцца праблемы гісторыі, тэорыі і практыкі прававой дзяржаўнасці. Тут асвятляюцца ўмовы і перспектывы пабудовы прававой дзяржавы ў Рэспубліцы Беларусь. Пры гэтым праблематыка прававой дзяржаўнасці разглядаецца ў якасці адной з праяваў агульных заканамернасцяў, якія ляжаць у падмурку суадносінаў дзяржавы і права.

1. ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

А. ТЭМАТЫКА ЛЕКЦЫЙ

1. Агульная тэорыя права як палітыка-прававая навука і вучэбная дысцыпліна – 2 гадз.

Раздзел 1. Паходжанне дзяржавы і права.

2. Асноўныя рысы першабытнага грамадства. – 2 гадз.
3. Паходжанне дзяржавы. – 4 гадз.
4. Паходжанне права. – 2 гадз.
5. Асноўныя канцэпцыі (тэорыі) аб паходжанні дзяржавы і права. – 4 гадз.

Раздзел 2. Тэорыя дзяржавы.

6. Паняцце, сутнасць і азначэнне дзяржавы. – 2 гадз.
7. Форма дзяржавы. – 2 гадз.
8. Функцыі дзяржавы. – 2 гадз.
9. Апарат (механізм) дзяржавы. – 2 гадз.
10. Дзяржава ў палітычнай сістэме грамадства. – 2 гадз.

Раздзел 3. Тэорыя права.

11. Паняцце, сутнасць і азначэнне права. – 4 гадз.
12. Норма права. – 4 гадз.
13. Крыніцы права. – 4 гадз.
14. Крыніцы права ў Рэспубліцы Беларусь. – 4 гадз.
15. Сістэма права. – 4 гадз.
16. Дзеянне права і яго крыніц. – 4 гадз.
17. Праваўтварэнне, праватворчасць, нарматворчасць і сістэматызацыя крыніц права. – 2 гадз.
18. Рэалізацыя, прымяненне і тлумачэнне права. – 4 гадз.
19. Правасвядомасць, прававая культура і прававое выхаванне. – 2 гадз.
20. Прававыя адносіны. – 4 гадз.
21. Правамерныя паводзіны, правапарушэнне і юрыдычная адказнасць. – 4 гадз.
22. Права і іншыя сацыяльныя рэгулятары. – 2 гадз.

Раздзел 4. Узаемадзеянне дзяржавы і права.

23. Прававая дзяржава: гісторыя, тэорыя, практыка. – 4 гадз.

У С Я Г О 70 гадзін

Б. ТЭМАТЫКА СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ

1. Паходжанне дзяржавы і права. – 4 гадз.
2. Паняцце, сутнасць і азначэнне дзяржавы. – 2 гадз.
3. Форма дзяржавы. – 2 гадз.
4. Функцыі дзяржавы. – 2 гадз.
5. Апарат (механізм) дзяржавы. – 2 гадз.
6. Паняцце, сутнасць і азначэнне права. – 4 гадз.
7. Норма права. – 4 гадз.
8. Крыніцы права. – 2 гадз.
9. Крыніцы права ў Рэспубліцы Беларусь. – 2 гадз.
10. Сістэма права. – 2 гадз.
11. Дзеянне права і яго крыніц. – 4 гадз.
12. Праваўтварэнне, праватворчасць, нарматворчасць і сістэматызацыя крыніц права. – 4 гадз.
13. Рэалізацыя, прымяненне і тлумачэнне права. – 4 гадз.
14. Правасвядомасць, прававая культура і прававое выхаванне. – 2 гадз.
15. Прававыя адносіны. – 2 гадз.
16. Правамерныя паводзіны, правапарушэнне і юрыдычная адказнасць. – 4 гадз.
17. Права і іншыя сацыяльныя рэгулятары. – 2 гадз.
18. Прававая дзяржава: гісторыя, тэорыя, практыка. – 2 гадз.

УСЯГО 50 гадзін

2. ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

ТЭМА 1. Агульная тэорыя права як палітыка-прававая навука і як вучэбная дысцыпліна

Аб'ект і прадмет агульнай тэорыі права. Найбольш агульныя заканамернасці ўзнікнення, развіцця і функцыянавання дзяржавы і права як самастойных, арганічна ўзаемазвязаных сацыяльных інстытутаў.

Метадалогія агульнай тэорыі права. Філасофскія асновы агульнай тэорыі права. Дыялектыка-матэрыялістычны метад вывучэння права і дзяржавы. Агульнанавуковыя прыёмы (аналіз, сінтэз, абагульненне, параўнанне, аналогія, сістэмны падыход і г.д.), прыватнанавуковыя метады (канкрэтна-сацыялагічны, статыстычны, кібернетычны, гістарычны і інш.) і прыватнанавуковыя спосабы (параўнаўчага правазнаўства, фармальна-лагічны) вывучэння дзяржавы і права.

Месца і функцыі агульнай тэорыі права ў сістэме навук, якія вывучаюць дзяржаву і права. Сувязь агульнай тэорыі права з філасофіяй, эканамічнай тэорыяй, сацыялогіяй, паліталогіяй і іншымі гуманітарнымі навукамі.

Агульная тэорыя права, філасофія права, сацыялогія права. Агульная тэорыя права і гісторыя дзяржавы і права. Узаемасувязі агульнай тэорыі права з гісторыяй прававых вучэнняў, гісторыяй палітычнай і прававой думкі Беларусі. Суадносіны агульнай тэорыі права з галіновымі і прыкладнымі юрыдычнымі навукамі.

Станаўленне, развіццё і сучасны стан агульнай тэорыі права як навукі і як вучэбнай дысцыпліны. Праграма і парадак вывучэння агульнай тэорыі права студэнтамі, якія навучаюцца па спецыяльнасцях «Правазнаўства» і «Эканамічнае права».

РАЗДЗЕЛ 1. ПАХОДЖАННЕ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА

ТЭМА 2. Асноўныя рысы першабытнага грамадства

Характарыстыка эканамічнай сістэмы першабытнага грамадства. Формы ўласнасці на сродкі вытворчасці і іншыя матэрыяльныя каштоўнасці. Эвалюцыя форм уласнасці ў першабытным грамадстве. Сістэма размеркавання ў першабытным грамадстве.

Сацыяльны лад першабытнага грамадства. Праабшчына. Род. Мацярынскі род (матрыярхат) і бацькоўскі род (патрыярхат). Племя. Тэрытарыяльная суседская абшчына.

Сістэма кіравання ў першабытным грамадстве. Кіраванне ў праабшчыне. Органы кіравання ў родавай абшчыне. Агульны сход. Старэйшына. Военачальнік. Шаман. Эвалюцыя сістэмы кіравання ў першабытным грамадстве.

ТЭМА 3. Паходжанне дзяржавы

Неалітычная рэвалюцыя – перадумова ўзнікнення дзяржавы. Пераход ад прысвойваючай да вытворчай эканомікі. Сацыяльныя наступствы, якія адбыліся падчас неалітычнай рэвалюцыі. Перамены ў сістэме органаў улады і кіравання ў грамадстве. Агульныя заканамернасці ўзнікнення дзяржавы.

Тры буйныя падзелы грамадскай працы як фактары істотных пераменаў у грамадскіх адносінах. Прыметы дзяржаўна-арганізаванага грамадства (дзяржавы), якія адрозніваюць дзяржаву ад першабытнага грамадства (аганізацыі ўлады ў першабытным грамадстве). Дзяржава як сацыяльны інстытут, які ўзнікае ва ўмовах сацыяльна-неаднароднага грамадства. Дзяржава як асобная тэрытарыяльная арганізацыя. Фармаванне якасна новай сістэмы кіравання і ажыццяўлення ўлады. Выдзяленне асобнага слоя людзей, функцыя якіх зводзіцца да кіравання. Узнікненне ўлады, якая не супадае з усім насельніцтвам. Апарат дзяржавы і сродкі яго ўтрымання. Падаткі і зборы.

Асноўныя шляхі, агульныя заканамернасці і формы паходжання дзяржавы. «Дзяржава–улада» і «дзяржава–уласнасць». Стадыі (=агульныя заканамернасці) паходжання дзяржавы. Формы паходжання дзяржавы. Паходжанне дзяржавы на Усходзе, у Афінах, у Рыме і ў франкаў (германскага народа). Узнікненне дзяржавы шляхам «запрашэння на княжанне». Тыповыя і унікальныя формы паходжання дзяржавы. «Пярвічныя» і «другасныя» дзяржавы. Нераўнамернасць развіцця дзяржаўнасці ў розных народаў.

ТЭМА 4. Паходжанне права

Сістэма нарматыўнага рэгулявання грамадскіх адносінаў у першабытным грамадстве. Асноўныя нарматыўныя рэгулятары першабытнага грамадства ва ўмовах прысвойваючай эканомікі. Табу, маральныя табу. Міф. Нарматыўна-рэгулятыўная частка міфа. Змены ў сістэме нарматыўнага рэгулявання, якія адбыліся падчас «неалітычнай рэвалюцыі». Каляндар (агранамічны каляндар і жывёлагадоўчы каляндар). Эвалюцыя сістэмы нарматыўнага рэгулявання ва ўмовах вытворчай эканомікі.

Агульныя рысы нарматыўных рэгулятараў першабытнага грамадства. Прыродны характар і звычаёвасць нарматыўных рэгулятараў першабытнага грамадства. Монанарматыўнасць, добраахвотнасць і непадзельнасць правілаў паводзінаў першабытнага грамадства. Рэлігійны характар нарматыўных рэгулятараў у першабытным грамадстве.

Заканамернасці паходжання права. Тры буйныя падзелы грамадскай працы. Развіццё таварна-грашовых адносінаў і адносінаў, якія заснаваны на рэгулярным тавараабмене. Прыметы права, якія адрозніваюць яго ад нарматыўных рэгулятараў першабытнага грамадства. Эквівалент – сэрцавіна, «стрыжань», «душа» права. Знешняя фіксацыя, «матэрыялізацыя» права. Прадстаўніча-абавязваючы характар права. Абарона права з боку грамадства і яго афіцыйнага прадстаўніка – дзяржавы.

Асноўныя шляхі і формы паходжання права. «Еўрапейскі шлях» фармавання права. «Азіяцкі шлях» паходжання права. Уплыў права на развіццё дзяржавы і ўплыў дзяржавы на развіццё права.

ТЭМА 5. Асноўныя канцэпцыі (тэорыі) паходжання дзяржавы і права

Прычыны існавання мноства канцэпцый (тэорый) паходжання дзяржавы і права. Сацыяльна-палітычныя і гнасеалагічныя прычыны. Разнастайнасць і супярэчлівасць інтарэсаў розных сацыяльных груп. Рэгіянальны вопыт развіцця і функцыянавання дзяржаўна-арганізаванага грамадства. Накапленне новых ведаў аб умовах і заканамернасцях развіцця дзяржавы і права. Перамены ў метадалогіі даследавання дзяржавы і права.

Асноўныя канцэпцыі паходжання дзяржавы і права, іх класіфікацыя і эвалюцыя.

Тэалагічная дактрына. Узнікненне тэалагічнай тэорыі. Павучэнні Птахатэпа. Паходжанне дзяржавы і права згодна з Бібліяй. Вучэнне Аўгусціна Блажэннага і Фамы Аквінскага аб паходжанні дзяржавы і права. Абарона тэалагічнай дактрыны Жазэфам дэ Мэстрам. Тэалагічная дактрына ў сучасных умовах.

Патрыярхальная тэорыя паходжання дзяржавы і права. Думкі і меркаванні Платона, Арыстоцеля і Цыцэрона аб паходжанні дзяржавы і права. Вучэнне Рэберта Філмера.

Дагаворная дактрына паходжання дзяржавы і права. Вучэнне аб натуральным стане супольнасці – асноўная тэарэтычная кан-

струкцыя дагаворнай тэорыі паходжання дзяржавы і права. Характарыстыка натуральнага стану супольнасці і дагавору аб утварэнні дзяржавы Гуга Гроцыем, Джонам Локам, Томасам Гобсам, Ж.-Ж. Русо. Вучэнне Самуіла Пуфендорфа. Дагаворная дактрына ў сучасных умовах.

Арганічная тэорыя паходжання дзяржавы і права. Метадалагічны пераварот у разуменні грамадства – асноўная гнасеалагічная прычына ўзнікнення арганічнай тэорыі паходжання дзяржавы і права. Вучэнне І.-К. Блюнчлі і Г. Спенсера аб паходжанні дзяржавы і права.

Дактрына гвалту. Асноўныя варыянты гвалтоўнага паходжання дзяржавы і права. Я. Дзюрынг, К. Кауцкі, Ф. Апенгеймер, Л. Гумпловіч аб гвалтоўным паходжанні дзяржавы і права. Дактрына гвалту ў сучасных умовах.

Марксісцкая дактрына ўзнікнення дзяржавы і права, яе змест і абумоўленасць канкрэтна-гістарычнымі ўмовамі. Сучасны стан марксісцкай дактрыны. Абсалютызацыя «класавасці» ў паходжанні і сутнасці дзяржавы і права ў марксізме. Марксісцкая дактрына ўзнікнення дзяржавы і права ў сучасных умовах.

РАЗДЗЕЛ 2. ТЭОРЫЯ ДЗЯРЖАВЫ

ТЭМА 6. Паняцце, сутнасць і азначэнне дзяржавы

Метадалагічныя падыходы да азначэння сутнасці дзяржавы ў мінулым і ў сучаснай навуцы. Дзяржава як палітычная, структурная і тэрытарыяльная арганізацыя сацыяльна неаднароднага грамадства. Агульнасацыяльнае і «вузкакласавае» ў сутнасці дзяржавы. Формы і спосабы вырашэння і забеспячэння дзяржавай агульнасацыяльных інтарэсаў, інтарэсаў класаў, нацый, сацыяльных груп. Азначэнне дзяржавы.

Сацыяльная, палітычная, дзяржаўная ўлада. Дзяржаўная ўлада і дзяржава. Прыметы дзяржавы, якія адрозніваюць яе ад іншых арганізацый сацыяльна неаднароднага грамадства. Суверэнітэт. Сувязь дзяржавы і права. Асобны апарат кіравання.

Тыпалогія развіцця дзяржавы. Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы пры перыядызацыі і тыпалагізацыі развіцця дзяржавы. «Чалавечае вымярэнне» ў якасці крытэрыю тыпалогіі і прагрэсу дзяржаўнасці.

ТЭМА 7. Форма дзяржавы

Паняцце і азначэнне формы дзяржавы. Форма праўлення. Дзяржаўна-тэрытарыяльнае ўладкаванне, дзяржаўна-прававы рэжым.

Узнікненне і эвалюцыя поглядаў на форму праўлення. Сучасныя ўяўленні аб форме праўлення. Манархія і рэспубліка, іх уласцівасці і адметныя рысы. Эвалюцыя манархічных і рэспубліканскіх формаў праўлення. Форма праўлення сучаснай беларускай дзяржавы.

Паняцце, азначэнне і віды дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання. Эвалюцыя дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання. Простае і складанае дзяржаўна-тэрытарыяльнае ўладкаванне. Дзяржава унітарная і федэратыўная. Федэрацыя на нацыянальным і тэрытарыяльным падмурку. Форма дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання Рэспублікі Беларусь.

Канфедэрацыя і іншыя міждзяржаўныя ўтварэнні. Асацыяцыі, супольнасці, садружнасці, хаўрусы, імперыі.

Паняцце, азначэнне і віды дзяржаўна-прававога рэжыму. Аўтарытарныя і дэмакратычныя рэжымы, іх разнавіднасці. Суадносіны дзяржаўна-прававога і палітыка-прававога рэжымаў. Дзяржаўна-прававы рэжым сучаснай беларускай дзяржавы. Суадносіны тыпу і формы дзяржавы.

ТЭМА 8. Функцыі дзяржавы

Паняцце, змест і азначэнне функцый дзяржавы. Мэты, задачы і асноўныя накірункі дзейнасці дзяржавы. Межы дзейнасці дзяржавы. «Вузкакласавае» і агульнасацыяльнае ў функцыях дзяржавы. Функцыі дзяржавы і функцыі органаў дзяржавы.

Класіфікацыя функцый дзяржавы. Знешнія і ўнутраныя функцыі дзяржавы, іх узаемасувязь. Функцыі галоўныя і дадатковыя. Функцыі пастаянныя і часовыя. Класіфікацыя функцый па сферах грамадскага жыцця. Функцыі і падфункцыі дзяржавы. Дынаміка функцый дзяржавы. Сувязь і ўзаемадзеянне функцый дзяржавы.

Характарыстыка асноўных унутраных функцый дзяржавы. Эвалюцыя ўнутраных функцый дзяржавы. Унутраныя функцыі сучаснай беларускай дзяржавы.

Характарыстыка знешніх функцый дзяржавы. Эвалюцыя знешніх функцый дзяржавы. Знешнія функцыі сучаснай беларускай дзяржавы.

Формы і метады ажыццяўлення функцый. Прававыя і арганізацыйныя формы. Метады і сродкі ажыццяўлення функцый.

ТЭМА 9. Апарат (механізм) дзяржавы

Паняцце, прыметы і азначэнне апарата дзяржавы. Функцыі і апарат дзяржавы. Апарат і механізм дзяржавы. Дзяржаўны апарат і апарат дзяржавы. Эвалюцыя апарата дзяржавы. Фактары, якія абумоўліваюць развіццё апарата дзяржавы.

Паняцце, прыметы і азначэнне органа дзяржавы. Класіфікацыя і віды органаў дзяржавы. Падзел улады і органы дзяржавы. Органы дзяржавы і органы мясцовага самакіравання.

Прынцыпы арганізацыі і дзейнасці апарата дзяржавы. Асноўныя напрамкі ўдасканалення апарата сучаснай беларускай дзяржавы.

Кадры апарата дзяржавы. Дзяржаўны служачы і службовая асоба. Чыноўніцтва. Паняцце і сутнасць бюракратыі і бюракратызму. Дэмакратыя і дысцыпліна ў дзейнасці апарата дзяржавы.

ТЭМА 10. Дзяржава ў палітычнай сістэме грамадства

Паняцце, структура і азначэнне палітычнай сістэмы грамадства. Суб'екты і элементы палітычнай сістэмы грамадства. Палітычная сістэма і палітычная арганізацыя грамадства. Суадносіны эканамічнай, сацыяльнай і палітычнай сістэм. Цывільнае грамадства і палітычная сістэма. Палітычны працэс.

Месца і роля дзяржавы ў палітычнай сістэме грамадства.

Дзяржава і іншыя суб'екты палітычнай сістэмы: асоба, палітычныя партыі, грамадскія рухі і грамадскія аб'яднанні, прафесійныя саюзы, кааператыўныя арганізацыі, працоўныя калектывы.

Дзяржава і асоба. Узаемазалежнасць і ўзаемадапамога асобы і дзяржавы.

Дзяржава і палітычныя партыі. Формы ўдзелу партый ва ўпраўленні дзяржавай. Кіруючая партыя і дзяржаўная ўлада. Парламенцкая партыя. Шматпартыйнасць. «Партыйная» дзяржаўнасць.

Дзяржава, грамадскія рухі і грамадскія аб'яднанні, кааператыўныя арганізацыі, прафесійныя саюзы і працоўныя калектывы. Уплыў прафесійных саюзаў, кааператыўных арганізацый, працоўных калектываў, грамадскіх рухаў і грамадскіх аб'яднанняў на дзяржаву і ўздзеянне дзяржавы на іх арганізацыю і функцыянаванне.

Дзяржава і царква. Свецкая і тэакратычная дзяржавы.

Дзяржава і нарматыўная аснова палітычнай сістэмы грамадства. Дзяржава, ідэалагічная і камунікатыўная часткі палітычнай сістэмы.

Функцыі палітычнай сістэмы ў жыцці грамадства. Асноўныя тэндэнцыі развіцця беларускай палітычнай сістэмы.

РАЗДЗЕЛ 3. ТЭОРЫЯ ПРАВА

ТЭМА 11. Паняцце, сутнасць і азначэнне права

Асноўныя падыходы да вызначэння сутнасці права і яго азначэння ў сусветнай і айчыннай юрыдычнай навуцы. Права як нарматыўны рэгулятар грамадскіх адносінаў ва ўмовах вытворчай эканомікі. Эквівалентны характар права. Права ў якасці сістэмы правілаў паводзін. Развіццё права. Пераемнасць і абнаўленне ў праве. Рэцэпцыя права.

Права як мера свабоды асобы. Права – аднолькавая мера (маштаб), якая прымяняецца да розных людзей. Аб'ектыўнае і суб'ектыўнае права.

Прынцыпы і аксіёмы права.

Права і грамадскія адносіны. Права як сродак уздзеяння на грамадскія адносіны. Прававое рэгуляванне. Функцыі права. Эфектыўнасць права.

Прававая сістэма. Паняцце і азначэнне прававой сістэмы. Тыпалогія прававых сістэм. Прававыя сем'і. Агульная характарыстыка рамана-германскай (кантынентальнай), англасаксонскай, мусульманскай і традыцыйнай сем'яў права.

ТЭМА 12. Норма права

Паняцце нормы, яе этымалагічнае значэнне. Класіфікацыя і віды сацыяльных нормаў.

Паняцце нормы права, яе прыметы: агульны характар прававой нормы, фармальна-азначаны характар, агульная значнасць, прадстаўніча-абавязваючы характар, сістэмнасць, сувязь з дзяржавай. Азначэнне нормы права.

Адрозненне нормы права ад маральных прадпісанняў, індывідуальных прававых прадпісанняў, заклікаў, зваротаў, рэкамендацый, дырэктыў дзяржаўных органаў.

Класіфікацыя і віды нормаў права. Тыповыя і нетыповыя нормы права.

Структура нормы права. Структура нормы ў рамана-германскай (кантынентальнай) і англасаксонскай сістэмах права. Гіпотэза, дыспазіцыя і санкцыя.

Норма права і артыкул нарматыўнага прававога акта. Спосабы выкладання нормаў права ў тэксце нарматыўнага прававога акта.

Эфектыўнасць нормы права. Юрыдычная і сацыяльная эфектыўнасць нормы права.

ТЭМА 13. Крыніцы права

Паняцце і азначэнне крыніцы (формы) нормаў права. Віды крыніц нормаў права. Суадносіны паняццяў крыніцы і форма права. Узаемасувязь сутнасці і формы права.

Прававы звычай. Форма прававога звычая. Звычаёвае права.

Прававы прэцэдэнт. Судовы і адміністрацыйны прэцэдэнт. Суадносіны прававога прэцэдэнта і іншых крыніц нормаў права. Прэцэдэнтнае права.

Дагавор нарматыўнага зместу ў якасці крыніцы права. Дагавор тыповы і прыкладны. Унутрыдзяржаўны, міждзяржаўны і міжнародны дагавор.

Дактрына (навука) у якасці крыніцы нормаў права. Дактрына і каментарыі да юрыдычных тэкстаў.

Кананічныя нормы (свяшчэннае пісанне) у якасці крыніцы нормаў права. Кананічнае (царкоўнае) права.

Нарматыўны прававы акт (закон): агульная характарыстыка. Віды нарматыўна-прававых актаў. Нарматыўна-прававыя акты грамадскіх (кааператыўных) арганізацый. Уставы тыповыя і прыкладныя.

Развіццё (эвалюцыя) крыніц права. Месца і роля крыніц нормаў права ў розных прававых сістэмах.

ТЭМА 14. Крыніцы права ў Рэспубліцы Беларусь

Віды і канстытуцыйныя асновы сістэмы крыніц права ў Рэспубліцы Беларусь. Асноўныя (першасныя), дадатковыя (другасныя) і галоўныя крыніцы сучаснага беларускага права.

Юрыдычная значнасць, юрыдычная сіла і юрыдычная вага крыніц права.

Характарыстыка асноўных унутрыдзяржаўных крыніц сучаснага беларускага права Рэспублікі Беларусь.

Нарматыўны прававы акт – галоўная крыніца сучаснага беларускага права. Адрозненне нарматыўных прававых актаў ад індывідуальна-прававых актаў. Віды нарматыўных прававых актаў.

Закон і яго віды. Законы і падзаконныя акты. Канстытуцыя (Асноўны закон) дзяржавы. Вяршэнства законаў.

Нарматыўныя прававыя акты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Дэкрэт, указ і іх віды. Распараджэнне Прэзідэнта і яго юрыдычная прырода. Заканадаўчыя акты. Суадносіны Канстытуцыі, закону, дэкрэта і ўказа.

Нарматыўныя прававыя акты органаў выканаўчай улады Рэспублікі Беларусь – Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, міністэрстваў, дзяржаўных камітэтаў і іншых цэнтральных органаў выканаўчай улады.

Нарматыўныя прававыя акты мясцовых органаў улады і кіравання.

Лакальныя нарматыўныя прававыя акты.

Нарматыўныя прававыя акты грамадскіх і кааператыўных арганізацый.

Дагавор нарматыўнага зместу – асноўная ўнутрыдзяржаўная крыніца права ў Рэспубліцы Беларусь.

Дадатковыя ўнутрыдзяржаўныя крыніцы сучаснага беларускага права Рэспублікі Беларусь. Дактрына (навука), свяшчэннае пісанне, прававы звычай і прававы прэцэдэнт.

Нарматыўныя акты судовай улады. Акты Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, пастановы Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і акты Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь у якасці крыніц права.

Галоўная, асноўныя і дадатковыя крыніцы міжнародна-прававога характару.

ТЭМА 15. Сістэма права

Паняцце і азначэнне сістэмы права. Сістэма і структура права. Асноўныя элементы і структурныя часткі сістэмы. Сістэма права і прававая сістэма.

Галіновая структура права. Прадмет і метад прававога рэгулявання. Галіны, падгаліны і інстытуты нормаў права. Агульная характарыстыка галінаў права Рэспублікі Беларусь.

Публічна-прыватная структура права, характарыстыка права публічнага і права прыватнага.

Матэрыяльна-працэсуальная структура права. Матэрыяльнае і працэсуальнае права. Юрыдычныя працэдуры. Віды юрыдычных працэсаў.

Рэгулятыўна-ахоўная структура права. Права рэгулятыўнае і права ахоўчае.

Нацыянальнае і міжнароднае права. Паняцце міжнароднага права. Міжнароднае публічнае і міжнароднае прыватнае права. Суадносіны міжнароднага і нацыянальнага права. Нацыянальнае і міжнароднае права – самастойныя сістэмы права.

Сістэма заканадаўства (нарматыўных прававых актаў) Рэспублікі Беларусь. Паняцце заканадаўства ў шырокім і вузкім сэн-

сах слова. Удасканаленне заканадаўства. Крытэрыі дасканалага заканадаўства. Патрабаванні да заканадаўства.

Суадносіны сістэмы права і сістэмы заканадаўства.

Тэндэнцыі развіцця сістэмы права і сістэмы заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

ТЭМА 16. Дзеянне права і яго крыніц

Паняцце дзеяння права і яго крыніц. Дзеянне нарматыўных прававых актаў.

Дзеянне нарматыўна-прававых актаў у часе. Парадак і спосабы ўступлення нарматыўна-прававога акта ў юрыдычную сілу. Спыненне дзеяння нарматыўна-прававога акта. Віды (спосабы) спынення дзеяння нарматыўна-прававога акта. Зваротная сіла нарматыўна-прававога акта. Простая і рэвізійная зваротная сіла нарматыўна-прававога акта. Пераживанне дзеяння нарматыўна-прававога акта.

Дзеянне нарматыўна-прававых актаў у прасторы. Паняцце тэрыторыі дзяржавы, яе складаныя часткі. Экстэрытарыяльнае дзеянне нарматыўнага прававога акта.

Дзеянне нарматыўна-прававога акта па колу асобаў. Прававое становішча грамадзян, іншаземцаў і асобаў без грамадзянства.

Дзеянне нарматыўных прававых актаў па прадмету рэгулявання (па сферы рэгуляцыі).

Асаблівасці дзеяння міжнароднага права і міжнародных дагавораў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

ТЭМА 17. Праваўтварэнне, праватворчасць, нарматворчасць і сістэматызацыя крыніц права

Праваўтварэнне, фармаванне і стварэнне права. Праватворчасць, нарматворчасць і заканатворчасць.

Віды стварэння права, праватворчасці і нарматворчасці. Праваўтварэнне завершанае і няпоўнае. Віды праватворчасці. Нарматворчасць дзяржаўная і міждзяржаўная, нарматворчасць народа. Нарматворчасць кааператыўных і прафсаюзных арганізацый. Лакальная нарматворчасць. Нарматворчасць мясцовых органаў самакіравання і кіравання. Прэцэдэнтная нарматворчасць. Сумесная нарматворчасць.

Нарматворчасць Канстытуцыйнага Суда, Вярхоўнага і Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь.

Этапы і прынцыпы праваўтварэння, праватворчасці і заканатворчасці.

Паняцце і сутнасць канстытуцыйнага нагляду (кантролю). Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь.

Дзяржаўная сістэма прававой інфармацыі. Адзіны прававы класіфікатар. Апублікаванне крыніц права.

Паняцце і віды сістэматызацыі крыніц права. Інкарпарацыя і кансалідацыя крыніц права. Віды інкарпарацыі і кансалідацыі. Кадыфікацыя заканадаўства і яе віды. Звод законаў – вышэйшая форма сістэматызацыі заканадаўства. Зборнікі дзеючага заканадаўства.

Прававая (юрыдычная) тэхніка. Нарматворчая тэхніка. Мова прававых актаў.

ТЭМА 18. Рэалізацыя, прымяненне і тлумачэнне права

Паняцце рэалізацыі права. Непасрэдная і апасродаваная рэалізацыя права. Непасрэдная рэалізацыя права: захаванне, выкананне і выкарыстанне права.

Прымяненне права – асобная форма рэалізацыі права: паняцце, азначэнне. Асноўныя патрабаванні да прымянення права. Віды прымянення права.

Асноўныя стадыі прымянення права. Аналіз фактычных абставінаў справы. Устанаўленне ісціны ў працэсе прымянення права. Доказы. Выбар нормы права для прымянення. Юрыдычная кваліфікацыя. Праверка сапраўднасці нормаў права.

Акт прымянення права, яго змест, прыметы, віды. Асноўныя патрабаванні да акта прымянення права. Структура акта прымянення права. Кантроль за актамі прымянення права. Эфектыўнасць акта прымянення права.

Тлумачэнне права. Высвятленне і вытлумачэнне права. Суб'екты тлумачэння. Віды тлумачэння па суб'ектах. Афіцыйнае і неафіцыйнае тлумачэнне. Нарматыўнае і казуальнае тлумачэнне. Акты тлумачэння права. Спосабы (віды) высвятлення зместу права.

Тлумачэнне нормаў права па аб'ёму: адэкватнае, пашыранае, абмежаванае.

Прабелы ў праве, іх прычыны. Ліквідацыя прабелаў. Спосабы запаўнення (пераадолення) прабелаў у праве. Аналогія права і аналогія закону.

ТЭМА 19. Правасвядомасць, прававая культура і прававое выхаванне

Паняцце, сутнасць і азначэнне правасвядомасці. Правасвядомасць – адна з праяў права. Уздзеянне правасвядомасці на іншыя праявы (формы) права і іншых праяў (формаў) права на правасвядомасць.

Правасвядомасць і іншыя формы грамадскай свядомасці. Правасвядомасць і палітычная свядомасць. Прававая і маральная свядомасць. Пазнаваўчая, інфармацыйная, ацэначная, рэгулятыўная, выхаваўчая і іншыя функцыі правасвядомасці.

Структура правасвядомасці. Прававая псіхалогія і прававая ідэалогія. Практычная і тэарэтычная правасвядомасць. Правасвядомасць юрыстаў. Індывідуальная, групавая і агульнасацыяльная прававая свядомасць. Дэфармацыя правасвядомасці. Прававы нігілізм і прававы ідэалізм, формы і шляхі іх пераадольвання.

Прававая культура, яе паняцце, азначэнне, элементы. Асноўныя паказчыкі прававой культуры грамадства і асобы. Віды і ўзроўні прававой культуры.

Прававое выхаванне. Мэты і змест прававога выхавання. Механізм, формы і сродкі прававога выхавання. Прававая інфармаванасць грамадзян і веданне закону. Шляхі ўдасканалення прававога выхавання.

ТЭМА 20. Прававыя адносіны

Прававыя адносіны як асобны від грамадскіх адносінаў. Прыметы прававых адносінаў. Нормы права і прававыя адносіны. Законаадносіны. Віды і склад (элементы) прававых адносінаў.

Змест праваадносінаў. Фактычныя дзеянні ўдзельнікаў грамадскіх адносінаў. Суб'ектыўныя правы і юрыдычныя абавязкі.

Суб'екты прававых адносінаў. Віды суб'ектаў прававых адносінаў. Праваздольнасць, дзеездольнасць, дзеліктаздольнасць. Правасуб'ектнасць. Кампетэнцыя. Юрыдычная асоба. Прававы статус, прававы модус, прававое становішча.

Аб'екты праваадносінаў і іх характарыстыка. Віды аб'ектаў праваадносінаў. Каштоўнасці, якія не могуць быць аб'ектамі праваадносінаў.

Юрыдычныя факты: паняцце, асаблівасці. Класіфікацыя юрыдычных фактаў. Дзеянні, падзеі, юрыдычны стан. Фактычны (юрыдычны) склад. Юрыдычныя прэзумпцыі і фікцыі.

ТЭМА 21. Правамерныя паводзіны, правапарушэнне і юрыдычная адказнасць

Паводзіны фізічных і юрыдычных асобаў у сферы дзеяння права. Формы прававых паводзінаў.

Правамерныя паводзіны. Віды правамерных паводзінаў. Салідарызм. Канфармізм. Законапаслушэнства. Сацыяльная прававая актыўнасць. Шляхі і сродкі фармавання правамерных паводзінаў.

Правапарушэнне і яго азначэнне. Прыметы правапарушэння. Супрацьпраўнасць. Грамадская шкоднасць. Віноўнасць. Віды правапарушэнняў.

Юрыдычны склад правапарушэння. Аб'екты і аб'ектыўны бок правапарушэння. Суб'екты і суб'ектыўны бок правапарушэння.

Паняцце юрыдычнай адказнасці, яе асноўныя прыметы. Адрозненне юрыдычнай адказнасці ад маральнай і палітычнай адказнасці, ад іншых мераў юрыдычнага прымусу.

Мэты, функцыі і прынцыпы юрыдычнай адказнасці: законнасць, справядлівасць, неадваротнасць, індывідуалізацыя.

Віды юрыдычнай адказнасці. Перспектыўная і рэтраспектыўная юрыдычная адказнасць.

Падставы юрыдычнай адказнасці і падставы вызвалення ад юрыдычнай адказнасці. Прэзумпцыя невінаватасці.

Прычыны правапарушэнняў. Шляхі, сродкі ліквідацыі правапарушэнняў.

ТЭМА 22. Права і іншыя сацыяльныя рэгулятары

Паняцце сацыяльнага рэгулявання, яго віды – нарматыўнае (агульнае) і ненарматыўнае (індывідуальнае) рэгуляванне. Узаемаадносіны нарматыўных і ненарматыўных рэгулятараў.

Паняцце нормы, яе этымалагічнае значэнне. Норма як мера неабходнага і абавязковага. Класіфікацыя і віды нарматыўных рэгулятараў.

Асноўныя заканамернасці ва ўзаемаадносінах паміж нарматыўнымі рэгулятарамі грамадскіх адносінаў. Ненарматыўныя рэгулятары: каштоўнасны, інфармацыйны, дырэктыўны.

Нормы сацыяльныя і нормы тэхнічныя. Паняцце і асаблівасці тэхнічных нормаў, іх суадносіны з нормамі сацыяльнымі. Тэхнікаюрыдычныя нормы, іх месца і роля ў прававым рэгуляванні. Юрыдычная прырода стандартаў.

Суадносіны нормаў права з маральнымі прынцыпамі і нормамі, рэлігійнымі нормамі, карпаратыўнымі нормамі, звычаямі і традыцыямі.

РАЗДЗЕЛ 4. УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА

ТЭМА 23. Прававая дзяржава: гісторыя, тэорыя, практыка

Прававая дзяржава – гістарычная форма (праява) узаемаадносінаў паміж дзяржавай і правам.

Узроўні і характар узаемаадносінаў паміж правам і дзяржавай. Адрозненне дзяржавы ад права. Адзінства дзяржавы і права. Супярэчнасці паміж дзяржавай і правам.

Уздзеянне дзяржавы на права. Роля дзяржавы ў фармаванні права. Роля дзяржавы ў забеспячэнні дзеяння права.

Уздзеянне права на дзяржаву. Права як сродак фармавання структуры дзяржавы. Права – адзіная мова зносін паміж дзяржавай і грамадзянамі.

Ідэя прававой дзяржавы ў гісторыі палітычна-прававой думкі. Сучасная прававая дзяржава.

Прыметы прававой дзяржавы: наяўнасць грамадзянскай супольнасці; звязанасць дзяржавы правам; вяршэнства законаў; адзінства і падзел улады; ахова правоў і свабод чалавека; узаемныя абавязкі грамадзян перад дзяржавай і дзяржавы перад грамадзянамі.

Дзяржава прававая, сацыяльная і эфектыўная.

Прававая дзяржава як мэта развіцця Рэспублікі Беларусь. Практыка фармавання прававой дзяржавы ў Рэспубліцы Беларусь і іншых дзяржавах СНД.

Рэкамендаваная літаратура

1. Абдулаев, М.И. Теория государства и права: учебник / М.И.Абдулаев. – М.: Экономика, 2007.

2. Алексеев, С.С. Общая теория права: учебник / С.С.Алексеев. – М., 1995.

3. Агульная тэорыя права: навуч. дапам. / пад рэд. прафесара, доктара юрыдычных навук М.У.Сільчанкі. – Гродна: ГрДУ, 2004.

4. Дробязко, С.Г. Общая теория права: учебное пособие / С.Г.Дробязко, В.С.Козлов. – Минск: Амалфея, 2007.

5. Лазарев, В.В. Теория государства и права / В.В.Лазарев, С.В.Липень. – М., 2005.

6. Любашиц, В.Я. Теория государства и права: учебник / В.Я.Любашиц, М.Б.Смоленский, В.И.Шепелев. – Ростов-на-Дону, 2006.

7. Марченко, М.Н. Теория государства и права: учебник / М.Н.Марченко. – М., 2004.

8. Морозова, Л.А. Теория государства и права: учебник / Л.А.Морозова. – М., 2007.
9. Поляков, А.В. Общая теория права / А.В.Поляков. – СПб., 2004.
10. Спиридонов, Л.И. Теория государства и права: учебник / Л.И. Спиридонов. – М., 2004.
11. Теория государства и права: учебник для вузов / под ред. О.В. Мартышина. – М.: Норма, 2007.
12. Теория права и государства / под ред. М.Н.Манова. – М., 1995.
13. Трубецкой, Е.Н. Энциклопедия права / Е.Н.Трубецкой. – СПб., 1999.
14. Хропанюк, В.Н. Теория государства и права / В.Н.Хропанюк. – М., 2007.
15. Четвернин, В.А. Понятия права и государства. Введение в курс теории права и государства / В.А.Четвернин. – М., 1997.
16. Червонюк, В.И. Теория государства и права: учебник / В.И.Червонюк. – М.: ИНФРА-М, 2006.

ПЛАНЫ СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ

Тэма 1. Паходжанне дзяржавы і права (4 гадзіны)

Занятак першы

1. Асноўныя рысы першабытнага грамадства:
а) эканамічная сістэма;
б) сацыяльны лад;
в) сістэма кіравання.
2. Заканамернасці паходжання дзяржавы. Прыметы дзяржавы, якія адрозніваюць яе ад арганізацыі ўлады ў першабытным грамадстве.
3. Формы паходжання дзяржавы.

Рэкамендаваная літаратура

1. Алексеев, В.П. История первобытного общества: учебник / В.П. Алексеев, А.И.Першиц. – М., 1990.
2. Андреев, И.Л. Происхождение человека и общества / И.Л.Андреев. – М., 1988.
3. Аристотель. Афинская полития / Аристотель. – М.-Л., 1936.
4. Бутенко, А.П. Государство: его вчерашние и сегодняшние трактовки / А.П.Бутенко // Государство и право. – 1993. – № 7.
5. Випер, В.Г. Греция / В.Г.Випер. – Ростов-на-Дону, 1995.
6. Випер, В.Г. Рим / В.Г.Випер. – Ростов-на-Дону, 1995.
7. Гумплович, Л. Общее учение о государстве / Л.Гумплович. – СПб., 1910.
8. Кашанина, Т.В. Происхождение государства и права: современные трактовки и новые подходы / Т.В.Кашанина. – М., 2004.
9. Сільчанка, М.У. Паходжанне дзяржавы і права: навучальны дапаможнік / М.У.Сільчанка. – Мінск: Тесей, 2005.
10. Семенов, Ю.Н. На заре человеческой истории / Ю.Н.Семенов. – М., 1989.

Занятак другі

1. Паняцце і віды нарматыўных рэгулятараў у першабытным грамадстве. Агульныя рысы нарматыўных рэгулятараў першабытнага грамадства.
2. Заканамернасці паходжання права. Прыметы права, якія адрозніваюць яго ад нарматыўных рэгулятараў першабытнага грамадства.

3. Прычыны існавання розных канцэпцый (тэорый) паходжання дзяржавы і права.

4. Характарыстыка асноўных канцэпцый (тэорый) паходжання дзяржавы і права.

Рэкамендаваная літаратура

1. Аннерс, Э. История европейского права / Э.Аннерс. – М., 1994.

2. Валеев, Д.Ж. Обычное право и его генезис / Д.Ж.Валеев // Правоведение. – 1974. – № 6.

3. Венгеров, А.Б. Нормативная система и эффективность общественного производства / А.Б.Венгеров, Н.С.Барабашева. – М.: Издательство МГУ, 1985.

4. Кашанина, Т.В. Происхождение государства и права: современные трактовки и новые подходы / Т.В.Кашанина. – М., 2004.

5. Мэн, Г.С. Древнее право, его связь с древнейшей историей общества и его отношение к новейшим идеям / Г.С.Мэн. – СПб., 1873.

6. Першиц А. История первобытного общества / А.Першиц, А.Л.Монгайт, В.И.Алексеев. – М.: Высшая школа, 1982.

7. Прост, Г. Зачатки государственных и правовых отношений / Г.Прост. – М., 1901.

8. Сільчанка, М.У. Паходжанне дзяржавы і права: навучальны дапаможнік / М.У.Сільчанка. – Мінск: Тесей, 2005.

Тэма 2. Паняцце, сутнасць і азначэнне дзяржавы (2 гадзіны)

1. Сутнасць, прыметы і азначэнне дзяржавы. Агульнасацыяльнае і «вузкакласавае» ў сутнасці дзяржавы.

2. Сацыяльная, палітычная і дзяржаўная ўлады. Дзяржаўная ўлада і дзяржава. Дзяржаўны суверэнітэт.

3. Эвалюцыя дзяржавы і тыпалогія развіцця дзяржавы.

Рэкамендаваная літаратура

1. Ардашкин, В.Д. К современной концепции государства / В.Д.Ардашкин // Правоведение. – 1992. – № 2.

2. Бачило, И.Л. Факторы, влияющие на государственность / И.Л.Бачило // Государство и право. – 1993. – № 7.

3. Бутенко, А.П. Государство: его вчерашние и сегодняшние трактовки / А.П.Бутенко // Государство и право. – 1993. – № 7.

4. Гомеров, И.Н. Государство и государственная власть: предпосылки, особенности, структура / И.Н.Гомеров. – М., 2002.

5. Добролюбов, А.И. Государственная власть как техническая система: о трех великих социальных изобретениях человечества / А.И.Добролюбов. – Минск, 1995.

6. Зуев, В.И. «Власть» в системе политологических категорий / В.И. Зуев // Государство и право. – 1992. – № 5.

7. Манов, Г.Н. Признаки государства: новые прочтения / Г.Н.Манов. – М., 1998.

8. Мамут, Л.С. Государство в новом измерении / Л.С.Мамут. – М., 1999.

9. Тихомиров, Ю.А. Государство: развитие теории и общественная практика / Ю.А.Тихомиров // Правоведение. – 1999. – № 3.

10. Хабибулин, А.Г. Научные основы типологии государства: вопросы теории и права / А.Г.Хабибулин. – СПб., 1997.

11. Чиркин, В.Е. Три ипостаси государства / В.Е.Чиркин // Государство и право. – 1993. – № 8.

12. Чиркин, В.Е. Легализация и легитимация государственной власти / В.Е.Чиркин // Государство и право. – 1995. – № 8.

13. Чиркин, В.Е. Общечеловеческие ценности и современное государство / В.Е.Чиркин // Государство и право. – 2002. – № 2.

14. Чиркин, В.Е. О публичной власти (постановка проблемы) / В.Е. Чиркин // Государство и право. – 2003. – № 10.

Тэма 3. Форма дзяржавы (2 гадзіны)

1. Паняцце і азначэнне формы дзяржавы.

2. Паняцце, азначэнне і віды формы праўлення.

3. Характарыстыка формы дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання. Суверэнітэт ва ўмовах «складаных» формаў дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання.

4. Паняцце, азначэнне і віды дзяржаўна-прававога рэжыму.

Рэкамендаваная літаратура

1. Абдулатипов, Р.Г. Опыты федерализма / Р.Г.Абдулатипов, Л.Ф.Болтенков. – М., 1994.

2. Арзамаскин, Н.Н. Форма современного российского государства: эволюция и правовая основа / Н.Н.Арзамаскин, А.А.Кененов, А.Габибулин. – Смоленск, 1997.

3. Бабурин, С.Н. Территория государства / С.Н.Бабурин. – М., 1997.

4. Золотарева, М.В. Асимметрия в федеративном устройстве России / М.В.Золотарева // Вестник МГУ. – Сер. 11, Право. – 1999. – № 1.

5. Карапетян, Л.М. Федеративное устройство и правовой статус народов / Л.М.Карапетян. – М., 1996.

6. Кудрявцев, Ю.А. Политические режимы: критерии классификации и основные виды / Ю.А.Кудрявцев // Правоведение. – 2002. – № 4.

7. Моисеев, Е.Г. Правовой статус Содружества Независимых Государств: учебное пособие / Е.Г.Моисеев. – М., 1995.

8. Монархии Европы: Судьбы династий / ред., сост. Н.В.Попов. – М., 1996.

9. Тихомиров, Л.А. Монархическая государственность / Л.А.Тихомиров. – М., 1992.

10. Федерация. История и современность (сравнительное исследование) / отв. ред. М.Н.Марченко. – М., 2000.

11. Форма современного российского государства: эволюция и правовая основа. – Смоленск, 1997.

12. Чиркин, В.Е. Нетипичные формы правления в современном государстве / В.Е.Чиркин // Государство и право. – 1994. – № 1.

13. Чиркин, В.Е. Модели современного федерализма: сравнительный анализ / В.Е.Чиркин // Государство и право. – 1994. – № 8, 9.

14. Чиркин, В.Е. Современное федеративное государство: учебное пособие / В.Е.Чиркин. – М., 1997.

Тэма 4. Функцыі дзяржавы (2 гадзіны)

1. Паняцце, азначэнне, класіфікацыя і віды функцый дзяржавы.
2. Характарыстыка ўнутраных функцый дзяржавы.
3. Характарыстыка знешніх функцый дзяржавы.
4. Формы і метады ажыццяўлення функцый дзяржавы.

Рэкамендаваная літаратура

1. Байтин, М.И. Сущность и основные функции социалистического государства / М.И.Байтин. – Саратов, 1979.

2. Голубецкая, Н.П. Новые задачи природоохранной политики в условиях изменяющегося положения в Европе / Н.П.Голубецкая // Журнал российского права. – 2000. – № 8.

3. Каск, Л.И. Функции и структура государства / Л.И.Каск. – Л., 1969.

4. Морозова, Л.А. Функции российского государства на современном этапе / Л.А.Морозова // Государство и право. – 1993. – № 6.

5. Морозова, Л.А. Государство и собственность (проблемы межотраслевого института) / Л.А.Морозова // Государство и право. – 1996. – № 12.

6. Нуртдинов, А.Ф. Роль государства в механизме социального партнёрства // / Журнал российского права. – 2000. – № 2.

7. Пискотин, М.И. Функции государства и аппарат управления / М.И. Пискотин // Советское государство и право. – 1973. – № 10.

8. Сотрудничество государства и Белорусской Православной Церкви в Республике Беларусь: сборник документов. – Минск, 2004.

9. Социальное государство и права человека. – М., 1994.

10. Сташкевич, Н. Формирование идеологии белорусской государственности / Н.Сташкевич // Беларуская думка. – 2000. – № 1.

11. Талапина, Э.В. Вопросы правового регулирования экономической функции государства / Э.В.Талапина // Государство и право. – 1999. – № 11.

12. Тихомиров, Ю.А. Государство на рубеже столетий / Ю.А.Тихомиров // Государство и право. – 1997. – № 2.

13. Хабибулин, А.Г. Государственная идеология: к вопросу о правомерности категории / А.Г.Хабибулин, Р.А.Рахимов // Государство и право. – 1999. – № 3.

14. Чиркин, В.Е. Общечеловеческие ценности и современное государство / В.Е.Чиркин // Государство и право. – 2002. – № 2.

Тэма 5. Апарат (механізм) дзяржавы (2 гадзіны)

1. Апарат (механізм) дзяржавы, яго прыметы, будова (структура) і эвалюцыя.

2. Паняцце, прыметы, азначэнне і віды органаў дзяржавы.

3. Прынцыпы арганізацыі і дзейнасці апарату дзяржавы.

4. Кадры апарату дзяржавы, дзяржаўная служба, бюракратызм, дэмакратыя і дысцыпліна ў дзейнасці апарату дзяржавы.

5. Асноўныя накірункі ўдасканалення апарату сучаснай беларускай дзяржавы.

Рэкамендаваная літаратура

1. Атаманчук, Г.В. Сущность государственной службы: история, теория, закон, практика / Г.В.Атаманчук. – М., 2002.

2. Атаманчук, Г.В. Теория государственного управления / Г.В.Атаманчук. – М., 2005.

3. Бахрах, Д.Д. Государственная служба: основные понятия, ее составляющие, содержание, принципы / Д.Д.Бахрах // Государство и право. – 1996. – № 12.

4. Байтин, М.И. Механизм современного российского государства / М.И.Байтин // Правоведение. – 1996. – № 3.

5. Глазунов, Н.И. Государственное (административное) управление / Н.И.Глазунов. – М., 2004.

6. Дыльнов, Г.В. Законодательная власть в правовом государстве / Г.В.Дыльнов. – М., 1995.

7. Дубовицкий, В.Н. Исполнительная власть в Республике Беларусь: понятие и система органов / В.Н.Дубовицкий. – Минск: Белорусская наука, 2006.

8. Ершов, В.В. Статус суда в правовом государстве / В.В.Ершов. – М., 1992.

9. Мэннинг, Н. Реформа государственного управления: международный опыт / Н.Мэннинг; пер. с англ. – М., 2003.

10. Оболонский, А.В. Бюрократия и государство: очерки / А.В.Оболонский. – М., 1996.

11. Сахаров, Н.А. Институт президентства в современном мире / Н.А.Сахаров. – М., 1994.

12. Чиркин, В.Е. Публичное управление: учебник / В.Е.Чиркин. – М., 2004.

13. Шамхалов, Ф.И. Теория государственного управления / Ф.И.Шамхалов. – М., 2002.

14. Шевалье, Ж. Государственная служба / Ж.Шевалье; пер. с фр. – М., 1996.

Тэма 6. Паняцце, сутнасць і азначэнне права (4 гадзіны)

Занятак першы

1. Сутнасць і азначэнне права.
2. Развіццё права, пераемнасць, абнаўленне і рэцэпцыя ў праве.
3. Права аб'ектыўнае і права суб'ектыўнае.
4. Прынцыпы і аксіёмы права.

Рэкамендаваная літаратура

1. Алексеев, С.С. Восхождение к праву. Поиски и решения / С.С. Алексеев. – М., 2001.

2. Байтин, М.И. О современном нормативном понимании права / М.И.Байтин // Журнал российского права. – 1999. – № 1.

3. Байтин, М.И. Сущность права (современное нормативное правопонимание на грани двух веков) / М.И.Байтин. – Саратов, 2001.

4. Зажицкий, В.И. Правовые принципы в законодательстве Российской Федерации / В.И.Зажицкий // Государство и право. – 1996. – № 11.

5. Лейст, О.Э. Сущность права. Проблемы теории и философии права / О.Э.Лейст. – М., 2002.

6. Ллойд, Д. Идея права / Д.Ллойд. – М., 2002.

7. Манов, Г.Н. Аксиомы в советской теории права / Г.Н.Манов // Советское государство и право. – 1986. – № 9.

8. Мальцев, Г.В. Понимание права. Подходы и проблемы / Г.В.Мальцев. – М., 1999.

9. О понимании советского права // Советское государство и право. – 1979. – № 7, 8.

10. Основные концепции права и государства в современной России // Государство и право. – 2003. – № 5.

11. Преемственность и новизна в государственно-правовом развитии. – М., 1996.

12. Шикин, Е.П. Что такое право / Е.П.Шикин. – М., 1996.

13. Шундиков, К.В. Инструментальная теория права – перспективное направление научного исследования / К.В.Шундиков // Правоведение. – 2002. – № 2.

14. Честнов, И.Л. Правопонимание в эпоху постмодерна / И.Л.Честнов // Правоведение. – 2002. – № 2.

15. Ференс-Сороцкий, А.А. Аксиомы в праве / А.А.Ференс-Сороцкий // Правоведение. – 1988. – № 9.

16. Явич, Л.С. Сущность права / Л.С.Явич. – Л.: Издательство ЛГУ, 1986.

Занятак другі

1. Права як форма і мера свабоды.
2. Прававое рэгуляванне грамадскіх адносінаў.
3. Функцыі права і эфектыўнасць права.
4. Паняцце і азначэнне прававой сістэмы, віды прававых сем'яў.

Рэкамендаваная літаратура

1. Байтин, М.И. О принципах и функциях права / М.И.Байтин // Правоведение. – 2000. – № 3.

2. Марченко, М.Н. Правовые системы современности: учебное пособие / М.Н.Марченко. – М.: Зерцало, 2001.

3. Нерсесянц, В.С. Право – политика свободы. Опыт прошлого и перспективы / В.С.Нерсесянц. – М., 1996.

4. Осакве, Кристофер. Типология современного российского права на фоне правовой карты мира / Кристофер Осакве // Государство и право. – 2001. – № 4.

5. Радько, Т.Н. Функции права / Т.Н.Радько, В.А.Толстик. – Н.Новгород, 1995.

6. Решетников, Ф.М. Правовые системы стран мира / Ф.М.Решетников. – М.: Юридическая литература, 1993.

7. Развитие концепции правовой системы в отечественной доктрине права: общетеоретический и международно-правовой подходы // Журнал российского права. – 2004. – № 1.

8. Сорокин, В.В. Право и время: правовая система и переходное время / В.В.Сорокин // Правоведение. – 2002. – № 1.

9. Саидов, А.Х. Сравнительное правоведение и юридическая география мира / А.Х.Саидов. – М., 1993.

10. Тихомиров, Ю.А. Курс сравнительного правоведения / Ю.А.Тихомиров. – М.: Норма, 1996.

11. Эффективность норм права. – М.: Юридическая литература, 1980.

12. Эффективность закона: Методология и конкретные исследования. – М., 1997.

Тэма 7. Норма права (4 гадзіны)

Занятак першы

1. Паняцце, прыметы і азначэнне нормы права.
2. Змест нормы права і яго будова.
3. Норма права і ндывідуальнае прававое прадпісанне.
4. Класіфікацыя і віды нормаў права.

Рэкамендаваная літаратура

1. Афанасьева, Л.В. Нормы права и их действие: автореф. дис. ... канд. юрид. наук / Л.В.Афанасьева. – М., 2000.

2. Бибило, В.Н. Структура норм уголовно-процессуального права / В.Н.Бибило // Право и демократия: сб. науч. тр. / отв. ред. В.Н.Бибило. – Вып. 11. – Минск: БГУ, 2001.

3. Ген, Л.Н. Специфика конституционных норм и особенности их реализации / Л.Н.Ген // Журнал российского права. – 2001. – № 11.

4. Голунский, С.А. К вопросу о понятии правовой нормы в теории социалистического права / С.А.Голунский // Советское государство и право. – 1961. – № 4.

5. Горшенев, В.М. Нетипичные нормативные предписания / В.М.Горшенев // Советское государство и право. – 1978. – № 3.

6. Даштамиров, С.А. Социальные нормы: гносеологический и социологический анализ / С.А.Даштамиров. – Баку, 1984.

7. Кудрявцев, В.Н. Юридические нормы и фактическое поведение / В.Н.Кудрявцев // Советское государство и право. – 1982. – № 2.

4. Правілы паводзін у першабытным грамадстве

Першапачатковымі правіламі паводзін першабытнага грамадства былі разнастайныя *табу*, якія існавалі на працягу дзесяткаў і нават соцен тысяч гадоў. Самыя першасныя табу складваліся стыхійна ў ходзе практычнай дзейнасці людзей пад уздзеяннем навакольнага прыроднага асяроддзя. Адна з важнейшых асаблівасцяў табу зводзіцца да таго, што забарона нічым не матывуецца і нічым не абгрунтоўваецца. Парушаць табу нельга, бо ў гэтым выпадку чалавеку і калектыву пагражае небяспека.

На больш позніх этапах развіцця першабытнага грамадства ўзнікае новы від правілаў паводзін – *міф*. Міфы былі формай грамадскай свядомасці, сродкам мыслення першабытнага чалавека і пазнання рэчаіснасці. У міфах захоўваліся веды чалавека аб навакольным асяроддзі, аб сваім месцы ў прыродзе і грамадстве, замацоўваліся звесткі аб шляхах вандравання, аб месцах стаянак, аб спосабах вырабу сродкаў вытворчасці, аб правілах шлюбна-сямейных адносін, аб класах сваяцкіх адносін, татэмічныя правілы і г. д. Вельмі важнай складанай часткай міфа былі тыя нормы, тыя правілы паводзін, якія арганічна ўтрымліваліся ў змесце міфа.

У параўнанні з табу міф уяўляў больш складаны нарматыўны рэгулятар, бо ў міфах утрымліваюцца ўжо не толькі нейкія «нормы-забароны», але і станоўчыя правілы паводзін, паказваюцца, адабраюцца супольнасцю і ўсяляк стымулююцца ўзоры адмысловых паводзін. Міф суправаджаўся, як правіла, пэўнымі абрадамі, рытуаламі, якія садзейнічалі яго замацаванню ў свядомасці першабытнага чалавека.

Табу і міф былі асноўнымі відамі правілаў паводзін першабытнага чалавека ва ўмовах прысвойваючай эканомікі, г. зн. такой сістэмы гаспадарання, якая была заснавана на спажыванні гатовых, дадзеных прыродай раслінных і жывёльных форм. Асноўнымі

відамі вытворчай дзейнасці чалавека ва ўмовах гэтай эканомікі, як вядома, былі збіральніцтва, паляванне і рыбалоўства.

Значныя змены ў сістэме нарматыўнага рэгулявання першабытнага грамадства адбыліся пасля і ў выніку неалітычнай рэвалюцыі, калі чалавек перайшоў ад прысвойваючай да вытворчай эканомікі, г. зн. ад палявання, рыбалоўства і збіральніцтва да земляробства і жывёлагадоўлі, ад прысваення гатовых, дадзеных прыродай раслінных і жывёльных форм да сапраўднай працоўнай дзейнасці, якая была накіравана на пераўтварэнне прыроды і вытворчасць ежы, утварэнне новых раслінных і жывёльных форм.

Ва ўмовах прысвойваючай эканомікі не трэба было ўлічваць працоўны ўклад кожнай асобы ў агульныя здабыткі супольнасці, таму што гэта, па-першае, немагчыма было зрабіць, па-другое, было немэтазгодна, бо прысвойваючая эканоміка не магла забяспечыць стабільны лішкавы прадукт, які можна было б размеркаваць у залежнасці ад якасці і колькасці працы. Сітуацыя карэнным чынам памянялася з пераходам грамадства да вытворчай эканомікі. Селекцыя раслін і жывёл, поліўнае земляробства, ірыгацыя змянілі ўзаемаадносіны паміж чалавекам і навакольным асяроддзем, значна ўзвысілі вытворчасць працы і прывялі да таго, што ў грамадстве з'явіўся стабільны лішкавы прадукт. Яго трэба было ўлічыць, захаваць, а затым і пераразмеркаваць. Каб гэта здзейсніць, трэба было ўнармаваць і ўлічыць працоўны ўклад кожнага супольніка і вынікі яго працы, яго ўдзел у стварэнні грамадскіх фондаў і вырашыць пытанне выдачы яму часткі лішкавага прадукту з грамадскіх фондаў.

Пераход першабытнага чалавека да вытворчай эканомікі суправаджаўся фармаваннем якасна новай сістэмы нарматыўнага рэгулявання. Весці земляробства, асабліва поліўнае, немагчыма без астранамічных ведаў. Заняцце жывёлагадоўляй патрабуе ведаў аб размнажэнні жывёлы, яе развіцці, харчаванні і г. д. Узнікаюць *календары* (агранамічныя і жывёлагадоўчыя) як новыя віды правілаў паводзін земляробаў і жывёлаводаў. Гэтыя календары дэталёва, падрабязна рэгламентавалі жыццядзейнасць першабытных супольнасцей і жыццё кожнага чалавека ў адносна замкнутых, аўтаномна функцыянуючых абшчынах земляробаў і жывёлаводаў.

Табу і міфы, у тым ліку і новыя, працягваюць, як і раней, рэгламентаваць значную частку сацыяльных сувязяў, але яны ўжо не займаюць дамінуючага становішча ў сістэме нарматыўнага рэгулявання і перамяшчаюцца на «перыферыю» сістэмы нарматыўнага рэгулявання сацыяльных адносін.

Пытанні для самаправеркі

1. Абгрунтуйце тэзіс, згодна з якім з'яўленне новых сродкаў і прыладаў працы аказвала значны ўплыў на вытворчыя і ўвогуле на ўсе грамадскія адносіны ў першабытным грамадстве.

2. Чаму ў першабытным грамадстве існавала як калектыўная («агульная»), так і прыватная («індывідуальная») уласнасць на сродкі вытворчасці?

3. Якія сілы (прычыны) абумовілі тую з'яву ў жыцці грамадства, што зараз называецца «неалітычнай рэвалюцыяй»?

4. Ці азначае палажэнне аб неўладкаванасці палавых адносінаў у першабытнай праабшчыне тое, што яны былі хаатычнымі? Чаму?

5. Што было вызначальным у арганізацыі і пабудове родавага ладу: кроўныя сувязі ці супольная калектыўная праца аб'яднаных роднаснымі сувязямі людзей?

6. Чаму роднасныя (родавыя, кроўныя) сувязі ляжалі ў падмурку вытворчасці і размеркавання ва ўмовах першабытнага грамадства?

7. Як Вы разумееце ўжываемы ў юрыдычнай навуцы тэрмін «мацярынскае права»?

8. Чаму племянная арганізацыя першабытнага грамадства была заканамерным наступствам развіцця родавай арганізацыі грамадства?

9. Якія фактары абумовілі пераход першабытнага грамадства ад родава-племянной яго арганізацыі да тэрытарыяльнай суседскай абшчыны?

10. Якія, на Вашу думку, фактары аказвалі рашаючы ўплыў на трансфармацыю сістэмы кіравання і арганізацыю ўлады ва ўмовах першабытнага грамадства?

11. Пералічыце органы ўлады і кіравання ў першабытным грамадстве і раскрыйце іх паўнамоцтвы.

12. Якія правілы паводзін дзейнічалі ў першабытным грамадстве?

Тэма 2. ПАХОДЖАННЕ ДЗЯРЖАВЫ

1. Паходжанне дзяржавы; прыметы дзяржавы, якія адрозніваюць яе ад першабытнага грамадства.

2. Асноўныя шляхі і агульныя заканамернасці паходжання дзяржавы.

3. Формы паходжання дзяржавы:

а) паходжанне дзяржавы на Усходзе;

б) паходжанне дзяржавы ў Афінах;

в) узнікненне дзяржавы ў Рыме;

г) узнікненне дзяржавы ў франкаў (германскага народа);

д) узнікненне дзяржавы шляхам «запрашэння на княжанне».

1. Паходжанне дзяржавы; прыметы дзяржавы, якія адрозніваюць яе ад першабытнага грамадства

Дзяржава – з'ява гістарычная, яна ўзнікае ў выніку пераўтварэнняў, якія адбыліся ў эканамічнай і сацыяльнай сістэмах грамадства, у арганізацыі кіравання і ажыццяўленні ўлады. Гэтыя змены адбыліся ў ходзе неалітычнай рэвалюцыі, якая праводзіць своеасаблівую мяжу паміж «класічным» першабытным грамадствам і тым грамадствам, якое мы называем дзяржаўна-арганізаваным, альбо дзяржавай. Вядома, што ў ходзе неалітычнай рэвалюцыі чалавек перайшоў ад прысвойваючай да вытворчай эканомікі, г. зн. ад паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва да земляробства і жывёлагадоўлі, ад эканомікі, заснаванай на прысваенні дадзеных прыродай раслінных і жывёльных форм, да сапраўднай працоўнай дзейнасці, якая была скіравана на пераўтварэнне прыроды і вытворчасць ежы, утварэнне новых раслінных і жывёльных форм.

Вытворчая эканоміка – гэта эканоміка актыўнага ўмяшання чалавека ў навакольнае асяроддзе з дапамогай новых, больш дасканалых сродкаў вытворчасці і прыладаў працы. Перамены ў вытворчым жыцці грамадства садзейнічалі росту вытворчасці працы, з'яўленню лішкавага прадукту.

Неалітычная рэвалюцыя абумовіла і значныя перамены ў сацыяльным жыцці першабытнага грамадства, істотна памяняла яго сацыяльную структуру. З'яўленне ў жыцці першабытнага грамадства новых відаў дзейнасці, перш-наперш вытворчай, запатрабавала спецыялізацыі асобных груп людзей на іх выкананні. Гэта прывяло да фармавання ў грамадстве асобных сацыяльных груп, якія вылучаліся з супольнасці наяўнасцю адметных «прафесійных» і сацыяльных інтарэсаў. Такім чынам, у выніку неалітычнай рэвалюцыі сацыяльная структура першабытнага грамадства значна ўскладнілася.

Акрамя гэтага, вытворчая эканоміка, якая аб'ектыўна прывяла да далейшага падзелу грамадскай працы, значна ўскладніла і задачы па арганізацыі вытворчасці і кіраванню вытворчымі працэсамі. Яна прывяла да з'яўлення новых, невядомых раней кіраўнічых функцый. Са складу супольнасці ўжо ў гэты час пачынаюць выдзяляцца групы арганізатараў вытворчасці, групы людзей, якія вялі ўлік працы і ажыццяўлялі кантроль за выкананнем працоўных функцый.

Значныя змяненні ва ўсіх сферах грамадскага жыцця адбыліся пасля трох буйных падзелаў грамадскай працы, якія па сваёй

сутнасці азначалі з'яўленне ў жыцці першабытнага чалавека спецыялізацыі ў вытворчай дзейнасці. Прычым на першасных этапах спецыялізацыя мела хутчэй за ўсё стыхійны характар і была абумоўлена прыроднымі (геаграфічнымі і кліматычнымі) умовамі існавання асобных родаў і плямёнаў. Першы падзел грамадскай працы – аддзяленне жывёлагадоўлі ад земляробства, другі – аддзяленне рамяства ад земляробства, трэці – адасабленне групы людзей, якія сталі займацца гандлем тавараміі, г. зн. гандляроў.

Непасрэдным следствам трох буйных падзелаў грамадскай працы стала якасная маёмасная няроўнасць сярод людзей, сутнасць якой у тым, што пэўныя групы насельніцтва пачынаюць спецыялізавацца выключна (альбо пераважна) на нейкім адным відзе вытворчай дзейнасці, яны як бы «манапалізуюць» пэўную вытворчую дзейнасць, фармуецца спецыялізацыя вытворчасці. З аднаго боку, яна садзейнічае значнаму павышэнню вытворчасці працы, а з другога – натуральна прыводзіць да тавараабмену. Прычым у выніку першага буйнога падзелу грамадскай працы, што адбыўся пераважна паміж рознымі родамі і плямёнамі, складваецца рэгулярны міжродавы і міжпляменны тавараабмен, другі буйны падзел грамадскай працы садзейнічае пранікненню сістэматычнага тавараабмену непасрэдна ў род і племя. Усё гэта непазбежна прыводзіць да колькаснай маёмаснай няроўнасці спачатку паміж родамі і плямёнамі, а пасля і ўнутры іх. Адбываецца пераразмеркаванне лішкавага прадукту на карысць найбольш уплывовых груп насельніцтва, асобных сем'яў, старэйшын, военачальнікаў, жрацоў, так званай «родавай арыстакратыі». Да таго ж рэгулярны тавараабмен лагічна прыводзіць да перамешвання насельніцтва, бо людзі рухаюцца разам з тавармі.

Заканамерным вынікам адзначаных працэсаў, якія доўжыліся тысячагоддзі, стала фармаванне якасна новага, у параўнанні з першабытным, грамадства, якое мы называем дзяржаўна-арганізаваным, або дзяржавай.

У гэтым грамадстве пануюць якасная і колькасная маёмасная няроўнасці, а значыць, існуе і сацыяльная напружанасць (у тым ліку і барацьба) паміж багатымі і беднымі.У гэтым грамадстве няма адзіных для супольнасці багоў, ідалаў, культаў, бо побач пражываюць прадстаўнікі розных родаў і плямёнаў. Значыць, у гэтым грамадстве ўжо не можа існаваць першабытная сістэма кіравання, ажыццяўлення ўлады, бо нельга ва ўмовах існавання розных, часта супярэчлівых інтарэсаў людзей і іх груповак знайсці «агульную мову», агульны аўтарытэт, прыняць рашэнне, якое б задавальняла

ўсю супольнасць. Ды і ажыццяўляць кіраванне супольнасцю на «грамадскіх пачатках» немагчыма. Кіраванне пераўтвараецца ў самастойную складаную функцыю грамадства, якая патрабуе пэўнай кваліфікацыі, пэўнага часу і пэўнага матэрыяльнага забеспячэння тых, хто яе ажыццяўляе.

Дзяржаўна-арганізаванае грамадства (дзяржава) адрозніваецца ад першабытнага грамадства наступнымі прыметамі.

1. Гэта сацыяльна-неаднароднае грамадства, у якім побач суіснуюць самыя розныя групы людзей, занятыя разнастайнымі відамі чалавечай дзейнасці, са сваімі часта супрацьлеглымі інтарэсамі. Інтарэсы, галоўнымі сярод якіх з'яўляюцца матэрыяльныя, аб'ядноўваюць іх у супольнасць, нейкае адзінае цэлае, і гэтыя ж самыя інтарэсы ніколі не аб'яднаюць іх, не прывядуць да аднолькавага, аднастайнага міраўспрымання і дзеяння.

2. Гэта грамадства, у якім усе індывіды падзяляюцца першнаперш па тэрыторыі пражывання. Прыналежнасць да роду, племені, якое ў першабытным грамадстве мела першаснае значэнне для індывіда, вызначала яго ролю і месца ў вытворчым працэсе і размеркаванні матэрыяльных каштоўнасцей, адсоўваецца на другое і трэцяе месцы па значнасці сярод сацыяльных сувязей.

3. Гэта грамадства, у якім фармуецца якасна новая, у параўнанні з першабытным грамадствам, сістэма кіравання і ажыццяўлення ўлады. У новых умовах улада не ў стане выражаць і задавальняць у роўнай меры інтарэсы ўсіх індывідаў, іх груп, бо гэтыя інтарэсы не супадаюць. Для ажыццяўлення ўлады і кіравання, што выдзяляюцца ў самастойную функцыю супольнасці, фармуецца асобная група людзей, якія прафесійна займаюцца кіраваннем супольнасцю. Для ажыццяўлення ўлады і кіравання ўтвараецца асобны апарат кіравання – органы дзяржавы і дзяржаўныя ўстановы, якія надзяляюцца ўладнымі паўнамоцтвамі.

4. Гэта грамадства, ажыццяўленне ўлады і кіраванне ў якім патрабуе матэрыяльна-фінансавага забеспячэння. Паколькі дзяржаўны апарат ніякай вытворчай дзейнасцю не займаецца, яго патрэбна ўтрымліваць за кошт сродкаў супольнасці. Сродкі гэтыя збіраюцца з насельніцтва ў выглядзе падаткаў і іншых зборaў.

Толькі ў сукупнасці вышэйазначаныя прыметы дазваляюць адрозніць дзяржаўна-арганізаванае грамадства (дзяржаву) ад першабытнага, бо ў іх у канцэнтраваным выглядзе ўтрымліваюцца ўсе найбольш істотныя рысы дзяржавы. Разам з тым у навуковай і вучэбнай літаратуры дзяржаву разумеюць і ў больш вузкім сэнсе слова, зводзяць яе практычна да якасна новай сістэмы кіравання, ажыц-

цяўлення ўлады ва ўмовах сацыяльна неаднароднага грамадства. У метадалагічных адносінах такі падыход нельга прызнаць правільным. Справа ў тым, што кіраванне і ўлада як самастойныя функцыі супольнасці абумоўліваюцца ўсёй сістэмай сацыяльна-эканамічных адносін, развіваюцца і змяняюцца пад іх уплывам. У адрыве ад іншых бакоў супольнага існавання кіраванне і ўлада не існуюць. Сутнасць іх можа быць даследавана толькі пры ўмове шырокага сацыяльнага падыходу.

Разам з тым, у вучэбных мэтах звужэнне паняцця дзяржавы да асаблівай сістэмы кіравання і ўлады ва ўмовах сацыяльна-неаднароднага грамадства не можа выклікаць нараканняў. Важна пры гэтым захаваць разуменне сутнасці з'явы пад назвай «дзяржава».

2. Асноўныя шляхі і агульныя заканамернасці паходжання дзяржавы

У юрыдычнай літаратуры было сфармулявала палажэнне, згодна з якім у гісторыі чалавецтва існавалі па меншай меры два спосабы, альбо (больш правільна) два шляхі ўзнікнення дзяржаўна-арганізаванага грамадства (дзяржавы): «дзяржава-ўласнасць» і «дзяржава-ўлада».

Першы шлях фармавання дзяржаўна-арганізаванага грамадства заснаваны на тым, што пасля ўдасканалення сродкаў вытворчасці і пасля паступовага пераходу ад калектыўнай да прыватнай уласнасці спатрэбілася новая каардынуючая і рэгулюючая структура, якая б ва ўмовах узаемнага абмену матэрыяльнымі каштоўнасцямі і ўскладнення эканамічных сувязей паміж вытворцамі змагла пастаянна і прафесійна займацца рэгуляваннем і ўладкаваннем ускладніўшагася грамадскага жыцця. Менавіта такой структурай і стала дзяржава. Прычым дзяржаўнымі служачымі, як правіла, станавіліся самыя багатыя і самыя знатныя людзі ці іх прадстаўнікі. У гэтых умовах галоўным прызначэннем дзяржавы была абарона інтарэсаў прыватных уласнікаў.

Другі шлях фармавання дзяржавы заснаваны на тым, што яшчэ задоўга да з'яўлення ў жыцці грамадства прыватнай уласнасці з супольнасці заканамерна выдзеліўся асобны слой людзей, якія павінны былі выконваць неабходныя для грамадства агульныя функцыі, што патрабавалі прымянення прымусу. І толькі значна пазней у грамадстве адбываецца маёмасная дыферэнцыяцыя на падставе сацыяльнага статусу асобы. Месца той ці іншай асобы ў апараце кіравання супольнасцю і вызначала маёмаснае яе становішча. Так,

праз «прыватызацыю» функцыі кіравання ў грамадстве паступова адбыўся падзел на багатых і бедных, пераход ад калектыўнай да прыватнай уласнасці.

Такім чынам, два шляхі ўзнікнення дзяржавы розняцца паміж сабой пачатковай кропкай пры ўзнікненні асобнага апарату кіравання (дзяржавы). У першым выпадку асобны апарат кіравання ўзнікае ў выніку заканамерных трансфармацый у грамадстве пасля ўзнікнення прыватнай уласнасці. А другі шлях заснаваны на тым, што спачатку фармуецца асобны апарат кіравання, функцыянаванне якога прыводзіць да маёмаснай няроўнасці ў грамадстве і да трансфармацыі апарату кіравання ў апарат дзяржавы.

Але нельга зводзіць складаны працэс фармавання дзяржавы да двух акрэсленых вышэй шляхоў. Іх можна разглядаць у якасці своеасаблівых вектараў у дзяржаваствараючай дзейнасці народаў, маючы пры гэтым на ўвазе тое, што ў кожнага з гістарычных і зараз існуючых народаў дзяржава ўтвараецца сваім, адметным, непаўторным шляхам. Прыродныя ўмовы існавання чалавека ўплывалі на працэсы фармавання дзяржаўна-арганізаванага грамадства. Але на станаўленне дзяржавы ўздзейнічалі і іншыя не менш значныя фактары. Прычым гэтая акалічнасць прывяла да таго, што практычна кожнае з вядомых нам дзяржаўна-арганізаваных грамадстваў узнікала сваім адметным і непаўторным шляхам. Як няма абсалютна тоесных людзей, так у гісторыі не было аднолькавых шляхоў узнікнення дзяржавы. Нават у адных і тых жа прыродна-кліматычных умовах узнікненне дзяржаўна-арганізаваных супольнасцяў часта вельмі адрозніваласа.

Разам з тым палажэнне аб непаўторным абліччы і паходжанні кожнага з гістарычных дзяржаўных утварэнняў не адмяняе зробленай даследчыкамі высновы аб тым, што ўзнікненне дзяржаўна-арганізаванага грамадства падпарадкоўваецца (ці праходзіць) шэрагу паслядоўных, узаемазвязаных і абумоўленых стадый, нейкім агульным заканамернасцям. Да іх ліку можна аднесці: а) буйныя грамадскія падзелы працы і фармаванне якаснай маёмаснай няроўнасці; б) фармаванне лішкавага прадукту і развіццё рэгулярнага тавараабмену; в) фармаванне колькаснай маёмаснай няроўнасці, супрацьлеглых і супярэчлівых інтарэсаў і сацыяльнай напружанасці ў грамадстве; г) фармаванне тэрытарыяльнай абшчыны; д) фармаванне не супадаючай з грамадствам асобнай сістэмы кіравання, ажыццяўлення ўлады.

Усе гэтыя стадыі (агульныя заканамернасці) маюць надзвычай важнае значэнне і прысутнічаюць пры ўтварэнні ўсіх вядомых

нам дзяржаўна-арганізаваных грамадстваў. *Разам з тым трэба асабліва падкрэсліць значэнне такой стадыі (ці фазы), як з'яўленне лішкавага прадукту,* якая без перабольшання мае ключавое значэнне ў разуменні фармавання дзяржавы. Менавіта са з'яўленнем у выніку папярэдняга развіцця грамадства, у выніку падзелаў грамадскай працы і росту яе прадукцыйнасці лішкавага прадукту сталі магчымымі рэгулярны тавараабмен і перараэмеркаванне лішкавага прадукту на карысць таваравытворцаў, альбо з'явілася магчымасць перараэмеркаваць лішкавы прадукт, абапіраючыся на апарат кіравання ці шляхам вайны і рабунку. Лішкавы прадукт, такім чынам, – такое звяно ў фармаванні дзяржавы, якое асабліва яскрава ўвасабляецца ў асобным апараце кіравання (улады), з якога пачынаецца «тэхналагічны» працэс фармавання дзяржавы і вакол якога разгортваюцца ўсе дзяржаваствараль ныя падзеі.

Паслядоўнасць азначаных стадый у фармаванні дзяржавы можа быць рознай, часта яна можа мяняцца. Напрыклад, для фармавання «дзяржавы-ўлады» характэрна спачатку ўтварэнне не супадаючай з грамадствам асобнай сістэмы кіравання, манапалізацыя гэтай функцыі групай людзей, а затым выкарыстанне гэтай сістэмы кіравання для перараэмеркавання лішкавага прадукту на сваю карысць і з'яўлення затым у грамадстве колькаснай маёмаснай няроўнасці, супрацьлеглых інтарэсаў і сацыяльнай напружанасці, што ў сваю чаргу садзейнічае трансфармацыі ўлады і сістэмы кіравання. Але як бы адзначаныя стадыі ні змянялі адна другую, усе яны абавязкова прысутнічаюць пры фармаванні дзяржавы і абавязкова ключавое значэнне сярод іх займае працэс фармавання лішкавага прадукту.

3. Формы паходжання дзяржавы

Кожная з дзяржаў узнікала ў пэўных канкрэтных, непаўторных сацыяльна-эканамічных, прыродных (геаграфічных і кліматычных) умовах. Пры гэтым на працэсы фармавання дзяржаўна-арганізаваных супольнасцей уздзейнічалі самыя разнастайныя сілы (фактары) як унутранага, так і знешняга характару. Усё гэта прыводзіла да таго, што агульныя заканамернасці паходжання дзяржавы дзейнічалі як тэндэнцыя, але праяўляліся ў непаўторных формах, найбольш тыповымі з якіх былі: а) паходжанне дзяржавы на Усходзе; б) паходжанне дзяржавы ў Афінах; в) паходжанне дзяржавы ў Рыме; г) узнікненне дзяржавы ў франкаў (германскага народа); д) узнікненне дзяржавы шляхам «запрашэння на княжан-

не». Формы паходжання дзяржавы шмат у чым вызначаюцца характарам размеркавання і пераразмеркавання лішкавага прадукту.

а) паходжанне дзяржавы на Усходзе

Адметнай рысай паходжання дзяржаўнасці на Усходзе з'яўляецца тое, што на працэсы яе фармавання значны, рашаючы ўплыў аказалі прыродныя (геаграфічныя і кліматычныя) фактары. Прычым у месцах узнікнення першых цывілізацый існаваў аптымальны экалагічны асяродак, які садзейнічаў развіццю земляробства, а затым і цывілізацый. Аснову земляробства там складала штучнае арашэнне пры дапамозе каналаў і ірыгацыйных збудаванняў. Характар земляробства патрабаваў адзінства намаганняў вялікіх груп людзей, захавання абшчыннай сацыяльнай структуры. Такія асаблівасці земляробства не маглі не прывесці да ўзнікнення агульнай для адасобленых абшчын кіруючай сілы, улады, якая б была строга цэнтралізаванай і выконвала інтэгратыўную ролю ў адносінах да сукупнасці адасобленых абшчын.

Аднойчы ўзнікшы і паступова, крок за крокам, узмацняючыся, дадзеная ўлада адасобілася і пераўтварылася ў самастойную функцыю супольнага існавання і функцыянавання асобных абшчын. Гэтая дзейнасць па кіраванню з цягам часу непазбежна станавілася прэрагатывай толькі пэўных асоб, якія кансалідаваліся ва ўстойлівую і замкнутую групу. Устойлівыя групы кіраўнікоў фармаваліся галоўным чынам не ўнутры абшчын, не ва ўмовах іх распаду, а па-за межамі абшчын, пры іх захаванні. Маёмасная няроўнасць як вынік пераразмеркавання лішкавага прадукту фармуецца спачатку паміж кіраўнікамі і абшчыннікамі, а пазней пранікае ў абшчыну.

Такім чынам, дзяржава ўзнікае на Усходзе ў якасці арганізатара грамадскай працы, у якасці надбудовы над адасобленымі абшчынамі, у якасці фактару, які звязваў гэтыя самастойныя і эканамічна адасобленыя адна ад другой абшчыны ў адзінае цэлае. Дзяржава на Усходзе ўзнікае як сіла, што стаіць над грамадствам. Разам з тым, гэта сіла «матэрыялізуецца» і ўвасабляецца асобнай групай людзей на чале з кіраўніком (дэспатам, імператарам, фараонам і г. д.) і арганізуецца як асобны, прафесійны апарат па кіраванню супольнай працай абшчын, апарат, які займаецца тым і толькі тым, што стала ажыццяўляе ўладу, а гэтая ўлада ёсць разнавіднасць грамадска-карыснай працы.

Асноўны момант пры разглядзе працэсаў фармавання дзяржаўна-арганізаванага грамадства на Усходзе зводзіцца да наступнага. Тое, што асаблівыя прыродныя (кліматычныя і геаграфічныя) умовы прадвызначылі неабходнасць з'яўлення па-за межамі абшчын і як бы знешняй у адносінах да абшчын улады і сістэмы кіравання, не азначае, што дзяржава там узнікае пад уздзеяннем выключна (ці нават пераважна) прыродна-кліматычных фактараў. Гэтыя фактары, гэтыя ўмовы толькі падштурхнулі да стварэння асобнай, над абшчынамі стаячай сілы ў форме пэўнага кіруючага апарату.

Можна лічыць, што сам па сабе *гэты апарат улады і кіравання пераўтвараецца ў дзяржаву толькі пасля таго, як грамадства пачынае ствараць (не без удзелу, безумоўна, і апарату кіравання) лішкавы прадукт, які размяркоўваецца і перараз мяркоўваецца гэтым асобным апаратам кіравання* на сваю ў першую чаргу карысць. А гэта прыводзіць да маёмаснай няроўнасці ў грамадстве, сацыяльных супярэчнасцяў на гэтай падставе і сацыяльнай напружанасці, у тым ліку і барацьбы паміж рознымі сацыяльнымі групамі насельніцтва. Такім чынам, і на Усходзе дзяржава ўзнікае пад рашаючым, можна сказаць, пад вызначальным уздзеяннем сацыяльна-эканамічных прычын, а менавіта пад уздзеяннем размеркавання і перараз меркавання ствараемага грамадствам лішкавага прадукту.

б) паходжанне дзяржавы ў Афінах

У старажытнай Грэцыі ў перыяд, калі склаліся ўсе неабходныя перадумовы для фармавання дзяржаўна-арганізаванага грамадства, не было неабходнасці ва ўсталяванні, як гэта мы назіраем на Усходзе, цэнтралізаванай эканамічнай сістэмы і сістэмы гаспадарання, бо геаграфічныя і кліматычныя ўмовы былі вельмі спрыяльнымі для таго, каб кожная абшчына магла весці сваю гаспадарку і забяспечваць свае ўнутраныя патрэбы ў матэрыяльных каштоўнасцях і найперш у харчаванні, адзенні, жыллі. Часовыя аб'яднанні абшчын, пра якія паведамляюць літаратурныя крыніцы, былі абумоўлены ў асноўным тым, што гэтым абшчынам пагражала знешняя небяспека ў форме войнаў і набегаў і яны вымушаны былі аб'ядноўваць свае намаганні ў барацьбе з агульным знешнім ворагам.

У сувязі з гэтым працэсы фармавання сацыяльнай неаднароднасці грамадства і ўсіх іншых наступстваў, што прывялі да фарма-

вання дзяржаўна-арганізаванага грамадства на тэрыторыі Атыкі, адбываліся не па-за межамі, а ўнутры абшчын, а дакладней, арганічна вырасталі з патрэбаў асобных абшчын.

Вельмі важнае значэнне для фармавання дзяржаўна-арганізаванага грамадства ў Афінах мела каланізацыя грэкамі ўзбярэжжа Міжземнага мора. Яна прывяла да актыўнага развіцця тавараабмену. Тавараабмен суправаджаўся зыходам эмігрантаў у калоніі і іх вяртаннем на радзіму, прытокам новых пасяленцаў у метраполію. У Грэцыі з'явіўся значны слой людзей (метойкаў = перасяленцаў, абывацеляў), якія не ўпісваліся ў старую родавую (фратрыева-філавую) структуру грэчаскага грамадства і таму не падпарадкоўваліся ўладзе яе органаў. Разам з тым, гэта быў вялікі ў колькасных адносінах і моцны ў эканамічных стасунках слой людзей, не лічыцца з якім было немагчыма.

Важную ролю ў фармаванні дзяржаўна-арганізаванага грамадства ў Афінах адыграла так званая гамераўская эпоха, той час, калі грэкі стварылі сваю адметную вайсковую арганізацыю, мэтамі якой былі заваяванне, захоп чужых тэрыторый, рабаванне і падзел заваяванай маёмасці. У выніку гэтай дзейнасці былі фактычна створаны асобныя групоўкі прыватнага характару, добрай вайсковай вывучкі, якія фактычна «вырывалі» яе ўдзельнікаў з асяродку старой філа-фратрыевай структуры. Ваенная арганізацыя разбурала стары лад грэчаскай супольнасці. Паралельна, побач з родавай арганізацыяй улады і кіравання, узнікала новая і вельмі ўплывовая ўладная структура. Людзі прывыкалі да таго, што ёсць іншыя цэнтры ўлады, якія могуць задаволіць іх інтарэсы і патрэбы.

Такім чынам, развіццё вытворчых сіл і тавараабмену прывяло ў Афінах да абагачэння старой родавай знаці, узнікнення за кошт ваенных дзеянняў новага слою багатых і знатных людзей, разарэння мелкіх вытворцаў, росту рабства, яўнай маёмаснай дыферэнцыяцыі людзей і росту сацыяльнай напружанасці. Адначасова з гэтым адбывалася перамешванне паміж сабой прадстаўнікоў розных родаў і плямёнаў. Усе гэта, як мы ведаем, стварае неабходныя перадумовы для фармавання дзяржаўна-арганізаванага грамадства. «Тэхналагічна» ж працэс фармавання дзяржаўна-арганізаванага грамадства ў Афінах быў завершаны ў выніку рэформаў Салона і Клісфена.

Пры правядзенні рэформаў Салон адмовіўся ад «адзінаўладдзя» і праводзіў рэформы на падставе здаровага розума і закону, з'яўляючыся па пасадзе толькі пасярэднікам (архонтам) і заканадаўцам.

Салон перш-наперш выдаў законы, у якіх адмяніў кабалу і забараніў забяспечваць ссуды асабістай кабалой, адмяніў усе пазыкі, як прыватныя, так і дзяржаўныя, дазволіў кожнаму рабіць апеляцыю да народнага суда, павялічыў меры, вагі і манеты. Галоўным у рэформах Салона быў афіцыйны падзел насельніцтва па маёмаснай прымеце, незалежна ад прыналежнасці да той ці іншай абшчыны, на чатыры катэгорыі (класы): пентакасіямедзімнаў, вершнікаў, зеўгітаў і фетаў. Пры гэтым кожнаму з адзначаных класаў ён дазволіў займаць пасаду ў органах улады ў адпаведнасці з велічынёй маёмасці, гэта значыць, увёў своеасаблівы цэнз, а тым, хто належаў да фетаў, дазволіў прымаць удзел толькі ў народных сходах і судах. Напрыклад, казначэяў можна было выбіраць толькі з класа пентакасіямедзімнаў. Вышэйшыя пасады Салон зрабіў выбіраемымі па жрэбію з ліку папярэдне выбраных, якіх намячала кожная з філаў.

Такім чынам, па сваёй накіраванасці рэформа Салона, у якой гаварылася аб скасаванні пазыкаў і юрыдычным замацаванні маёмаснага стану людзей, іх падзеле па маёмаснай прымеце на пэўныя катэгорыі, тычылася ў першую чаргу характару размеркавання і перараз меркавання лішкавага прадукту, які з'явіўся ў вялікіх памерах у афінян і які размяркоўваўся ва ўмовах «поўнай свабоды» тавараабмену. Такое становішча з размеркаваннем і перараз меркаваннем лішкавага прадукту і прывяло да хуткага размежавання маёмасці і абвастрэння сацыяльных супярэчнасцяў. Салон сваімі рэформамі ўвёў стабільнасць і парадак у тавараабменныя працэсы, урэгуляваў працэсы размеркавання і перараз меркавання лішкавага прадукту. *Адняўшы ў багатых афінян напачатку рэформаў пэўную частку лішкавага прадукту і задаволіўшы тым самым інтарэсы бедных, ён забяспечыў гарантаваную частку лішкавага прадукту багатым праз тыя дзяржаўныя пасады, якія яны змаглі займаць згодна са сваім юрыдычна замацаваным маёмасным становішчам*. Недарэмна пасады казначэяў, як было адзначана, маглі займаць толькі тыя афіняне, якія ўваходзілі ў першую катэгорыю.

Салон паспрабаваў сфармаваць новую сістэму цэнтральнага кіравання ў Афінах для вырашэння агульных спраў, якая б прыйшла на змену першабытнаабшчыннай сістэме арганізацыі ўлады. Аднак рэформы Салона ў дадзеным кірунку не былі паслядоўнымі і радыкальнымі. Рэшткі рода-племянной арганізацыі грамадства ліквідаваў Клісфен, ён жа завяршыў і стварэнне дзяржавы ў Афінах. На месца родавых сувязяў насельніцтва ён паставіў тэрытарыяльную яго арганізацыю.

Галоўнай мэтай рэформаў Клісфена было «перамешванне насельніцтва». Раздрабіўшы насельніцтва па невялікіх акругах і аб'яднаўшы ў кожнай акрузе прадстаўнікоў розных родаў і фратрыяў, Клісфен разбурыў вялікія групоўкі насельніцтва і «адсунуў» іх значэнне і ролю ў жыцці грамадства на «другія ролі». І самае галоўнае – ён «адсунуў» на «другія ролі» старадаўнія групоўкі насельніцтва, г. зн. рода-фратрыевыя сувязі ў фармаванні менавіта органаў улады і кіравання. Старая родавая арганізацыя працягвала існаваць і надалей, таму што былі захаваны ранейшыя роды, фратрыі і жрэчаствы, але яны не мелі свайго ранейшага значэння пры фармаванні органаў улады і кіравання, пры наданні статусу афінскага грамадзянства.

в) узнікненне дзяржавы ў Рыме

Утварэнне дзяржаўнасці ў Старажытным Рыме шмат у чым нагадвае працэс фармавання дзяржавы ў Афінах. І перш-наперш у тым, што ён адбываўся пад рашаючым і вызначальным уздзеяннем сацыяльна-эканамічных працэсаў, што праходзілі ўнутры родавай абшчыны, а не па-за яе межамі.

Адметнай рысай фармавання дзяржавы ў Рыме было тое, што ў гэты працэс актыўна ўмяшалася трэцяя сіла – plebs – прышлае насельніцтва, прадстаўнікі іншых родаў і плямёнаў. Гэта былі асабіста вольныя людзі, але яны не былі звязаныя з рымскім народам кроўна-роднаснымі сувязямі. Plebs валодаў гандлёвым і прамысловым багаццем, зямельнай уласнасцю, плаціў падаткі і адбываў вайсковую павіннасць. Але разам з тым plebs не мог удзельнічаць у сходах рымскага народа, не меў права займаць службовыя пасады ў органах улады і кіравання рымскага народа. Не маючы доступу да кіраўніцтва супольнасцю, plebs не прымаў удзелу ў падзеле заваяваных земляў і нарабаванага пад час бясконцых ваенных дзеянняў багацця.

Plebs, такім чынам, выконваў аднолькавыя з populus romanus – уласна рымскім народам – абавязкі ў сферы «публічнага права», але не меў «публічных правоў», бо сістэма кіравання і ажыццяўлення ўлады цалкам знаходзілася ў руках populus romanus, ад імя якога кіравала рымская арыстакратыя (патрыцыі). Трэба адзначыць, што патрыцыят (ад патрыцыі) у Рыме сфармаваўся паступова, пасля таго, як у рымлян склаўся звычай абіраць старэйшын (сенатараў), як правіла, з адной і той жа сям'і кожнага рода, што прывяло да ўзнікнення прывілеяваных, г. зн. знатных сем'яў, члены якіх і сталі называцца патрыцыямі.

Барацьба plebs супраць старой сістэмы кіравання, якая выглядала барацьбой плебеяў і патрыцыяў, і сталася адной з рашаючых сіл, што прывялі да ўтварэння дзяржаўна-арганізаванага грамадства ў Рыме. Вынікам гэтай барацьбы і стала разбурэнне старой рода-пляменнай арганізацыі, якая вызначала парадак фармавання органаў улады і кіравання і якая альбо давала магчымасць удзельнічаць у кіраванні і ажыццяўленні ўлады, альбо цалкам выключала з гэтага працэсу людзей у залежнасці ад таго, уваходзілі яны ў склад populus romanus ці не.

Прышлае насельніцтва ў Рыме (plebs) нагадвае метойкаў у Афінах. Але ў Афінах метойкі не прымалі актыўнага ўдзелу ў фармаванні дзяржаўна-арганізаванага грамадства, у той час, як прышлае насельніцтва ў Рыме актыўна ўмяшалася ў працэс стварэння дзяржаўна-арганізаванага грамадства. У барацьбе з старой родавай арганізацыяй грамадства плебеі паступова «вырывалі» ў патрыцыяў адну пазіцыю за другой, пакуль не дасягнулі поўнай роўнасці ў правах з populus romanus. Увянчала яе вынікі і цалкам парушыла рэшткі дадзяржаўнай арганізацыі грамадства рэформа цара Сервія Тулія. Яна абапіралася на вопыт грэчаскіх рэформаў, асабліва на вопыт рэформаў Салона і Клісфена.

Першае, што зрабіў Сервій Тулій, тычылася падзелу насельніцтва па маёмаснай прымеце. Дадзены падзел меў як вайсковы, так і палітычны сэнс. Акрамя гэтага, тэрыторыя Рыма была падзелена не па родавай прымеце, а былі створаны чатыры «тэрытарыяльныя» племені, кожнае з якіх жыло ў асобным квартале горада і мела палітычныя правы. Правы асобы сталі вызначацца не старой родавай сувяззю, а месцам пражывання, прыналежнасцю да аднаго з чатырох новых «тэрытарыяльных» плямёнаў. Да новых, зараз ужо тэрытарыяльных трыб было прыпісана ўсё насельніцтва як уласна рымскага народа, так і насельніцтва плебейскае, якое пражывала на дадзенай тэрытарыяльнай адзінцы і валодала зямлёй. Такім чынам, у выніку рэформы плебеі фактычна і юрыдычна былі ўключаны ў склад адзінай з уласна рымскім народам супольнасці. А дакладней, у выніку рэформаў была створана новая рымская супольнасць, у склад якой уваходзілі як прадстаўнікі былога populus romanus, так і прышлага насельніцтва.

На момант правядзення рэформаў Сервія Тулія рымляне знаходзіліся на той стадыі развіцця грамадства, якая называецца «ваеннай дэмакратыяй» і характарызуе заключную фазу рода-пляменнай арганізацыі грамадства, калі вядзецца вайна дзеля грабяжоў і перараз меркавання нарабаванага. У гэтых умовах прышлае насель-

ніцтва (plebs), якое выконвала ў Рыме ўсе публічныя, у тым ліку і ваенныя абавязкі, у прыватнасці, забяспечвала войска ўсім неабходным, удзельнічала ў войнах абароннага характару, знаходзілася ў «нераўнапраўным» становішчы ў параўнанні з populus romanus і патрыцыятам уласна рымскага народа. Рэформы Сервія Тулія, забяспечыўшы роўны доступ да ўлады як прадстаўнікам plebs, так і populus romanus, у залежнасці ад памеру іх маёмаснага становішча ўраўнялі іх у правах і ў атрыманні даходаў ад ваенных паходаў. Іншымі словамі, рэформы Сервія Тулія забяспечылі *роўны доступ да размеркавання і перараз меркавання лішкавага прадукту ўсім членам «новай рымскай абшчыны» ў залежнасці ад іх становішча ва ўладных структурах, якое, у сваю чаргу, вызначалася памерам (велічынёй) іх маёмаснага становішча.*

Пры параўнанні працэсаў паходжання дзяржавы ў Афінах і ў Рыме найперш відавочна, што пры ўсёй непаўторнасці гістарычных асобаў і падзеяў, якія прывялі да ўтварэння дзяржаўна-арганізаванага грамадства ў гэтых народаў, агульная схема, агульная «тэхналогія» стварэння дзяржаваў вельмі падобная і амаль люстэркавая.

Разам з тым, пры параўнанні працэсаў стварэння дзяржаўна-арганізаваных грамадстваў у Афінах і ў Рыме можна адзначыць і розныя моманты, у тым ліку і вельмі істотныя.

Па-першае, у існуючых літаратурных крыніцах пры апісанні ўтварэння дзяржавы ў Афінах найбольшая ўвага надаецца апісанню маёмаснага расслаення сярод грэкаў і дзеянням гістарычных асобаў (Салон), якія спрабавалі перш-наперш вырашыць маёмасныя супярэчнасці ў грамадстве і пры гэтым прыстасаваць новую сістэму ўлады і кіравання пад новыя сацыяльна-эканамічныя ўмовы, забяспечыўшы перавагу пры заняцці пасадаў у зноў створаных структурах улады і кіравання найбольш забяспечаным у маёмасных адносінах асобам незалежна ад родавай прыналежнасці. У той жа час пры апісанні стварэння дзяржавы ў Рыме найбольшая ўвага надаецца барацьбе прышлага насельніцтва з старой родавай структурай рымлян, якая выглядала як барацьба старой родавай рымскай знаці і прышлага насельніцтва, а, па сутнасці, была накіравана на ліквідацыю ранейшага значэння старых родавых структураў у вызначэнні месца асобы ў структурах улады і кіравання, а значыць, і ў доступе да размеркавання і перараз меркавання матэрыяльных каштоўнасцяў.

Па-другое, працэсы стварэння дзяржавы ў Афінах былі расцягнуты ў часе і складаліся як бы з двух адносна адасобленых крокаў. Першы быў ажыццёўлены Салонам, другі давялося зрабіць

Клісфену. Пры гэтым, маючы на ўвазе вышэйпрыведзенае меркаванне Арыстоцеля аб значнасці перамешвання насельніцтва ў стварэнні дзяржавы, нельга сцвярджаць, па меншай меры, тое, што рэформы Салона ў стварэнні дзяржавы адыгралі большую ролю, чым рэформы Клісфена. Такой была паслядоўнасць у стварэнні дзяржавы менавіта ў Афінах. Не больш і не менш. Яна, гэтая паслядоўнасць, дыктавалася гістарычнымі абставінамі. Што тычыцца стварэння дзяржавы ў Рыме, то там былі адначасова праведзены ў жыццё тыя меры (Сервій Тулій), якія ў Афінах правялі паасобку Салон і Клісфен.

Па-трэцяе, працэсы станаўлення дзяржаўна-арганізаванага грамадства ў Рыме і Афінах істотна розняцца па парадку фармавання і размеркавання лішкавага прадукту. У Афінах лішкавы прадукт ствараецца галоўным чынам у выніку вытворчай дзейнасці саміх афінян, размяркоўваецца і пераразмяркоўваецца праз развіццё тавара-абменных працэсаў, што працякалі таксама галоўным чынам унутры грэчаскай абшчыны. У Рыме ж, ужо з самага пачатковага моманту заснавання горада, значную, калі не большую, частку лішкавага прадукту здабывалі ў выніку бясконцых войнаў, якія вялі рымляне.

г) узнікненне дзяржавы ў франкаў (германскага народа)

Франкская дзяржава ўзнікла пасля захопу франкамі (германскім народам) Паўночна-Усходняй Галіі. Канкрэтныя абставіны рассялення франкаў у Галіі малавядомыя, але дакладна можна сцвярджаць, што, замяніўшы на тэрыторыі Галіі ўладу рымскай імперыі, франкская дзяржава запазычыла ад яе многія дзяржаўныя інстытуты, напрыклад, падатковую сістэму. Прычым падаткамі абкладалася па-ранейшаму не толькі гальска-рымскае насельніцтва, але і свабодныя франкі, для якіх гэта было незвычайнай справай і супраць чаго яны неаднаразова бунтавалі. На гэтых прыкладах з падаткамі яскрава бачна, як франкі вельмі лёгка запазычылі інстытуты і атрыбуты дзяржавы, бо яны ўжо ходам сваёй папярэдняй гісторыі былі падрыхтаваны да іх успрыняцця.

Франкі, заваяваўшы Галію, вызвалілі гальска-рымскае насельніцтва ад рымскай дзяржавы, і той лішкавы прадукт, які забіралі праз існуючую ў рымскай дзяржаве сістэму падаткаў, рымляне сталі збіраць з карэннага рымскага насельніцтва самі. Акрамя гэтага, яны сталі абкладаць і сваіх ранейшых суродзічаў падаткамі, трансфармаваўшы пры гэтым сістэму вядомых франкам «падарункаў» у сістэму пастаянных падаткаў.

Франкі перад захопам часткі тэрыторыі Заходняй рымскай імперыі знаходзіліся на стадыі «ваеннай дэмакратыі», калі побач з элементамі «класічнага» родавага ладу – старэйшынамі, агульным сходам, маёмаснай роўнасцю суродзічаў і г. д. – з'явіліся, існуюць і распаўсюджваюцца элементы дзяржаўна-арганізаванага грамадства – улада военачальніка, пастаянная ваенная дружына для рабаўніцтва, перадзел нарабаванай маёмасці, рознае маёмаснае становішча ў стане дружыннікаў і г. д. Рашаючы ўплыў на фармаванне дзяржавы ў германцаў (франкаў) аказала заваяванне імі часткі тэрыторыі Заходняй рымскай імперыі. Заваяванне і яго вынікі значна паскорылі працэсы дзяржаваўтварэння ў франкаў. У гэтым сэнсе слова «заваяванне франкамі часткі Заходняй рымскай імперыі» стала своеасаблівым каталізатарам у фармаванні дзяржавы ў гэтай часткі германцаў. І гэта складае адну з істотных асаблівасцей узнікнення дзяржавы ў франкаў.

Бліжэйшым вынікам заваявання стаў падзел зямлі і ўсяго захопленага багацця на карысць перш-наперш старой родавай германскай знаці, военачальнікаў і дружыны. Гэта значна паскорыла маёмаснае размежаванне сярод германцаў. Па-другое, захоп тэрыторый прывёў да перамешвання насельніцтва былой Рымскай імперыі і германцаў. І, нарэшце, па-трэцяе, ва ўмовах, калі сфармаваліся сацыяльна-неаднародная супольнасць і тэрытарыяльная абшчына, ранейшая рода-пляменная сістэма кіравання была ўжо не ў стане ажыццяўляць уладу. Яна была заменена новай, месца ўлады военачальніка і родавай знаці заняла каралеўская ўлада. Паскарэнню трансфармацыі старой сістэмы ўлады на ўладу каралеўскую садзейнічала знешняя пагроза германскім заваяванням і вялікія абсягі заваяваных тэрыторый. У гэтых умовах кіраваць эфектыўна можна было, толькі сканцэнтраваўшы ўладу ў адных руках – руках караля і яго бліжэйшага атачэння.

Яшчэ адной важнай асаблівасцю ўзнікнення дзяржавы ў германцаў было тое, што яна сфармавалася ў якасці дзяржавы раннефеадальнага грамадства. Франкская дзяржава была адным з варварскіх каралеўстваў, якія ўзніклі на руінах разбуранай Заходняй рымскай імперыі, і з'яўлялася пераходнай формай ад познерымскай дзяржаўнасці і ў той жа час ад ваеннай дэмакратыі варвараў да раннефеадальнай дзяржавы. Асаблівасцю варварскіх каралеўстваў, у тым ліку і франкскай дзяржавы, было тое, што ў грамадстве захавалася сацыяльная структура познерымскага грамадства, але асноўная частка пануючага слою сфармавалася з вярхушкі пляменнай («варварскай») знаці.

д) узнікненне дзяржавы шляхам «запрашэння на княжанне»

Адной з адметных форм паходжання дзяржавы можна лічыць утварэнне дзяржаўнасці праз «запрашэнне на княжэнне». Прычым запрашэнне прадстаўнікоў іншаземнай дынастыі не было нейкай выпадковай з'явай, а сустракалася асабліва на позніх этапах фармавання дзяржаўна-арганізаванага грамадства даволі часта ў розных народаў. Але вельмі вялікае пашырэнне інстытут «запрашэння на княжанне» атрымаў у ўсходніх славян.

Для правільнага разумення месца і ролі інстытута «запрашэння на княжанне» ў справе фармавання дзяржаўнасці на тэрыторыі ўсходніх славян трэба мець на ўвазе, што на момант запрашэння на княжанне ў славян былі ўсе неабходныя перадумовы для стварэння дзяржаўна-арганізаванага грамадства.

Ва ўмовах панавання абшчыннага ладу жыцця роднасныя сувязі страцілі сваё ранейшае значэнне і не маглі больш выконваць ролю таго падмурка, на якім грунтавалася сістэма ўлады і кіравання. Больш таго, наяўнасць веча ў якасці галоўнага інструмента ўлады гаворыць аб тым, што гэта была слабая ўлада, прычым прамежкавая па сваёй сутнасці. З аднаго боку, веча працягвала выконваць пэўныя ўладныя паўнамоцтвы агульнага сходу суродзічаў. Але разам з тым на вечы панавала багатая ў маёмасных адносінах частка абшчыннікаў, і менавіта яна выбірала з свайго складу вышэйшых службовых асобаў – пасаднікаў, тысяцкіх, ваяводаў і г. д. Гэты факт пацвярджае, што сярод славян была пашырана маёмасная дыферэнцыяцыя. Такім чынам, у ўсходніх славян на момант запрашэння на княжанне існавалі ўсе «класічныя» перадумовы для фармавання «класічнай» дзяржавы.

Такім чынам, дзяржаўна-арганізаванае грамадства ва ўсходніх славян фармуецца ў выніку тых жа самых сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, якія прывялі да ўзнікнення дзяржавы ў іншых народаў і аб якіх ужо ішла размова. Разам з тым, у стварэнні якасна новай сістэмы кіравання ў дзяржаўна-арганізаваным грамадстве ўсходніх славян рашаючую ролю выканаў інстытут «запрашэння на княжанне». Яго можна разглядаць у якасці завяршаючага тэхналагічнага працэсу, які дазволіў нашым продкам годна выйсці са складаных сацыяльна-эканамічных супярэчнасцяў, з якімі яны сутыкнуліся ў выніку развіцця таварна-грашовых адносінаў, стварыць якасна новую форму ўлады і забяспечыць з яе дапамогай цэласнасць грамадства.

Факт «запрашэння на княжанне», на нашу думку, ніколькі не прыніжае годнасці славян у справе дзяржаўнага будаўніцтва. Наадварот, нашы продкі гэтым самым запрашэннем больш глыбока

зразумелі сутнасць дзяржавы ў якасці нейтральнай, «трэцяй сілы», якая б стаяла над унутранымі супярэчнасцямі, не была звязана з супярэчнасцямі паміж рознымі сацыяльнымі групамі кроўнымі сувязямі. Такой нейтральнай сілай і сталі запрошаныя варагі, якія склалі ядро (ці значную яго частку) асаблівай прафесійнай групы кіраўнікоў, што сталі ажыццяўляць не супадаючую з усім насельніцтвам публічную ўладу. Акрамя гэтага, пры «запрашэнні на княжанне» ўсходнія славяне кіраваліся і іншымі матывамі, сярод якіх не апошнюю ролю адыгрывалі вайсковыя веды і навыкі скандынаваў, іх здольнасці ў арганізацыі вайсковых паходаў, асабліва воднымі шляхамі, якія скандынавы ведалі дасканала. Скандынавы добра ведалі таксама гандлёвыя справы і маглі іх наладзіць у Кіеве, іншых гарадах-княствах усходніх славян.

Узнікненне дзяржаўна-арганізаванага грамадства ў усходніх славян уяўляе цікавасць і з пункту гледжання той ролі, які мае лішкавы прадукт у фармаванні дзяржавы ўвогуле. Вядома, што варагі рэгулярна здзяйснялі ваенныя набегі на славянскія землі і рабавалі іх. *Запрасіўшы варагаў на княжанне, нашы далёкія продкі як бы пагадзіліся добраахвотна, легальна, на «прававых падставах» перадаваць частку лішкавага прадукту варагам, забяспечваць жыццядзейнасць князя і яго дружыны на сталай падставе.* Але ўзамен яны атрымалі тавар іншага кшталту – паслугі (працу) па ажыццяўленню ўлады і кіравання, па ажыццяўленню правасуддзя і абароне сваіх земляў ад розных ворагаў, у тым ліку і ад іншых варагаў.

У сувязі з гэтым можна правесці параўнаўчы аналіз узнікнення дзяржаўна-арганізаванага грамадства ў усходніх славян і ў тых германцаў, якія заснавалі дзяржаўныя ўтварэнні на руінах Заходняй рымскай імперыі, так званыя «варварскія каралеўствы», прыкладам якіх з'яўляецца дзяржава ў франкаў. Франкі прыйшлі на тэрыторыю Паўночна-Заходняй Галіі як заваёўнікі і як пераможцы заснавалі там новую дзяржаву. У ўсходніх славян на момант запрашэння варагаў дзяржавы не было. Франкі разбурылі рымскую дзяржаву, прынамсі, на тэрыторыі Галіі. Варагі на тэрыторыі пражывання ўсходніх славян не разбуралі дзяржаўных утварэнняў, яны сталі той дзяржаваствараючай сілай, вакол якой узніклі першасныя дзяржавы-княствы на тэрыторыі ўсходніх славян. Франкі запазычылі многія дзяржаўныя інстытуты разбуранай імі рымскай дзяржавы, хаця маглі гэтага і не рабіць. Варагі вымушаны былі прыняць умовы ўсходніх славян «старыны не рушыці», але выкарысталі ў справе пабудовы дзяржавы практычна ўсе свае веды і інстытуты, прынамсі, у арганізацыі вайсковай справы і ажыццяўленні правасуддзя, але вымушаны былі іх, безумоўна, адаптаваць да рэальнасцяў жыцця ўсходніх славян.

Пытанні для самаправеркі

1. Ці можна вызначыць прычыны неалітычнай рэвалюцыі толькі прыроднымі, у прыватнасці, кліматычнымі фактарамі?

2. Якім чынам неалітычная рэвалюцыя паўплывала на працэсы спецыялізацыі ў вытворчасці матэрыяльных каштоўнасцяў і да якіх зрухаў у вытворчасці матэрыяльных каштоўнасцяў яна прывяла?

3. Чаму тры вялікія падзелы грамадскай працы не маглі ўзнікнуць да неалітычнай рэвалюцыі?

4. Да якіх зменаў і наступстваў у сацыяльнай структуры грамадства прывяла неалітычная рэвалюцыя?

5. Чым характарызуецца эпоха так званай «ваеннай дэмакратыі»? Чаму «ваенная дэмакратыя» лічыцца важным этапам станаўлення дзяржаўнасці?

6. Як Вы думаеце, чаму дзяржава здаўна, можна сказаць, з моманту ўзнікнення, зацікаўлена ва ўсталяванні стабільнай і дакладнай падатковай сістэмы?

7. Абгрунтуйце палажэнне, згодна з якім з'яўленне ў грамадстве лішкавага прадукту ёсць вузлавы, ключавы і самы значны момант у з'яўленні дзяржаўна-арганізаванага грамадства.

8. Чаму ў адных месцах зямнога шара лішкавы прадукт размяркоўваўся і пераразмярковаўся пераважна праз тавараабмен і заставаўся ў таваравытворцаў, а ў іншых месцах размяркоўваўся і пераразмяркоўваўся ўладнай сілай і кіраўнічым апаратам?

9. Дакажыце палажэнне, згодна з якім наяўнасць гарадоў у пэўнага народа з'яўляецца адной з знешніх праяў таго, што гэты народ арганізаваны ў дзяржаву.

10. Ці можна лічыць апарат кіравання, які ўзнік на Усходзе па-за межамі абшчын да з'яўлення лішкавага прадукту і яго пераразмеркавання на карысць улады, дзяржавай?

11. Чаму Ф. Энгельс называў узнікненне дзяржавы ў Афінах самай чыстай і класічнай формай паходжання дзяржавы? Ці згодны Вы з такой характарыстыкай?

12. Параўнайце змест рэформаў Сервія Тулія са зместам рэформаў Салона і Клісфена, пакажыце агульную накіраванасць і агульныя рысы, абгрунтуйце розніцу паміж імі.

13. Якія прычыны ляжалі ў падмурку стварэння дзяржавы шляхам «запрашэння на княжанне», у прыватнасці, у ўсходніх славян?

14. Якую ролю ў фармаванні дзяржаўна-арганізаванага грамадства адыграў інстытут «запрашэння на княжанне»?

15. Як Вы лічыце, чаму «запрашэнне на княжанне» стала вельмі пашыранай і найбольш тыповай формай узнікнення дзяржавы ў усходніх славян, хаця дадзены інстытут пры ўтварэнні дзяржаўнасці сустракаецца і ў іншых рэгіёнах?

Тэма 3. ПАХОДЖАННЕ ПРАВА

1. Агульныя рысы правілаў паводзін у першабытным грамадстве.
2. Паходжанне права, яго прыметы.
3. Асноўныя шляхі і формы паходжання права.

1. Агульныя рысы правілаў паводзін у першабытным грамадстве

Ніводнае грамадства не можа нармальна функцыянаваць і развівацца без таго, каб не ўрэгуляваць належным чынам адносіны паміж людзьмі. Ужо на самых ранніх этапах развіцця чалавецтва было зроблена адно з самых значных «сацыяльных адкрыццяў», згодна з якім найлепшым чынам грамадскія адносіны можна ўладкаваць шляхам стварэння разнастайных правілаў паводзін агульнага характару – сістэмы нарматыўнага рэгулявання.

У папярэдняй тэме, дзе ішла гаворка аб правілах паводзін у першабытным грамадстве, была зроблена выснова аб тым, што асноўнымі правіламі паводзін у першабытным грамадстве былі *табу, міф і каляндар*. Прычым на стадыі прысвойваючай эканомікі галоўнымі правіламі паводзін былі табу і міфы, а на стадыі вытворчай эканомікі з'явіўся якасна новы від правілаў паводзін – каляндар. Працягвалі функцыянаваць табу і міфы, але яны існавалі ў змененым выглядзе. Нягледзячы на тое, што ўсе правілы паводзін першабытнага грамадства мелі свой адметны змест, сваё непаўторнае аблічча, разам з тым ім былі ўласцівы і некаторыя агульныя рысы.

Па-першае, усе яны мелі прыродны характар, г. зн., яны фармуляваліся першабытным чалавекам падчас яго прыстасавання да навакольнага прыроднага асяроддзя ва ўмовах жорсткай барацьбы за выжыванне. Асабліва гэта прыметна на прыкладзе табу і міфаў, але прыродная залежнасць характэрна таксама і для агракалендароў і жывёлагадоўчых календароў. Жорсткасць умоваў існавання першабытнага чалавека абумоўлівала і жорсткасць зместу правілаў паводзін. Прыроднасць правілаў паводзін першабытнага грамадства азначае, што яны фармуляваліся дзеля таго, каб паводзіны чалавека былі адэкватнымі пэўным сувязям, якія чалавек назіраў у прыродным асяроддзі, пэўным прыродным залежнасцям і заканамернасцям, да якіх ён вымушаны быў прыстасоўваць свае паводзіны.

Правілы паводзін, якія фармуляваліся першабытным чалавекам, не ўтрымліваліся, безумоўна, у гатовым выглядзе ў прыродным асяроддзі, а фармуляваліся самім чалавекам у выніку яго інтэ-

лектуальных высілкаў. Прыродныя сувязі і заканамернасці чалавек «перакладваў на мову правілаў паводзін», якія змяшчалі нейкі загад, нейкі абавязковы імператыў для паводзін першабытнага чалавека. Выкананне гэтых загадаў (імператываў) дазваляла чалавеку выжыць у жорсткіх умовах існавання.

Па-другое, нарматыўныя рэгулятары першабытнага грамадства з'яўляліся звычаямі па форме існавання і захавання. Пад звычаёвасцю правілаў паводзін першабытнага грамадства разумеюцца не тыя звычаі, што называюцца гэтым тэрмінам у сучасным свеце – старыя, вядомыя ўсім правілы паводзін чалавека, правілы, якімі людзі кіруюцца ў паўсядзённым жыцці, а тысячагадовая прывычка не парушаць вядомых першабытнаму чалавеку правілаў паводзін – табу, міфы і г. д.

Першабытнае грамадства ўжо на самых ранніх этапах свайго існавання вынайшла спецыфічныя «правілы-сродкі», з дапамогай якіх захоўваліся і абараняліся табу, міфы, календары, з дапамогай якіх адбывалася рэалізацыя правілаў паводзін у паўсядзённым жыцці старажытнага грамадства і адначасова забяспечвалася іх перадача ад пакалення да пакалення, фармавалася ўстаноўка, звычка, а затым і звычай захоўваць і выконваць правілы паводзін.

Па-трэцяе, правілы паводзін першабытнага грамадства мелі «монанарматыўны» характар. Гэта значыць, што яны з'яўляліся адзінымі і непадзельнымі на віды ў залежнасці ад характару рэгулюемых грамадскіх адносінаў. «Монанарматыўнасць» азначала таксама, што гэтыя правілы паводзін мелі аднолькавыя механізмы ўздзеяння на грамадскія адносіны, аднолькавыя сродкі абароны ў выпадку іх парушэння. Яны знаходзіліся ў арганічнай сувязі з эканомікай і ідэалогіяй як прысвойваючай сістэмы гаспадарання, дзе чалавек з'яўляўся часткай прыроды, так і ва ўмовах вытворчай эканомікі земляробаў і жывёлаводаў у абшчынах, якія былі адносна замкнутымі і развіваліся аўтаномна. Але самае галоўнае ў «монанарматыўнасці» правілаў паводзін першабытнага грамадства зводзіцца да таго, што яны, будучы рознымі па свайму характару і зместу, з'яўляліся адзінымі для ўсіх членаў першабытнага грамадства, бо ў грамадстве не існавала сацыяльнай дыферэнцыяцыі, не было розных сацыяльных слаёў і груп насельніцтва, якія б выдзяляліся па маёмаснай прымеце.

Па-чацвёртае, правілы паводзін першабытнага грамадства зыходзілі ад усёй супольнасці, выказвалі яе волю, інтарэсы, а таму ўспрымаліся як свае і выконваліся добраахвотна. Іх захаванне забяспечвалася аўтарытэтам усёй супольнасці. У першабытным гра-

мадстве не існавала спецыяльных органаў, якія б сачылі за ажыццяўленнем нарматыўных рэгулятараў. Да парушальнікаў правілаў паводзін прымяняліся выхаваўчыя меры, пры неабходнасці прымус, але ўсе гэтыя меры зыходзілі ад усёй супольнасці – статка, рода, племені. Разам з тым па меры развіцця першабытнага грамадства і ўскладнення сістэмы нарматыўнага рэгулявання, асабліва пасля з'яўлення міфалогіі, у асяродку першабытнага грамадства з'явіліся людзі (жрацы, знахары, шаманы), якія спецыяльна займаліся захаваннем правілаў паводзін і пільна сачылі за тым, як выконваюцца правілы паводзін і асабліва правілы-сродкі – рытуалы, абрады, этыкет. Яны валодалі значным аўтарытэтам у супольнасці, які абапіраўся на іх грунтоўныя веды і незвычайныя здольнасці.

Па-пятае, для правілаў паводзін першабытнага грамадства характэрна тое, што яны не мелі прадстаўніча-абавязваючага характару. Гэта значыць, у той час не існавала ніякай розніцы паміж правамі і абавязкамі, права ўспрымалася як абавязак, а абавязак – як права. Справа ў тым, што першабытныя людзі, якія належалі да адной супольнасці, былі псіхалагічна і фізічна тоеснымі паміж сабой. Тоеснасць паміж людзьмі вынікала, па-першае, з адсутнасці супярэчнасцяў у грамадстве, якія былі б абумоўлены якаснай і колькаснай маёмаснай няроўнасцю, а, па-другое, абумоўлівалася роднаснымі сувязямі, якія ляжалі ў падмурку першабытнага грамадства.

Па-шостае, для нарматыўных рэгулятараў першабытнага грамадства характэрны іх «рэлігійны характар». Яны заўсёды асвяшчаліся нейкай звышсілай, якая, на думку першабытнага чалавека, кіравала прыродай і яго жыццём. У старажытнага чалавека ўжо на самых ранніх этапах існавання з'явілася патрэба ў падтрымцы з боку звышсілы. І таму цалкам лагічнай з'явай першабытнага грамадства сталі ахвярапрынашэнні і звязаныя з імі рытуалы і абрады рэлігійнага характару. Зразумела, што першасныя табу-забароны, у падмурку якіх ляжалі невядомыя чалавеку прыродныя сілы і з'явы, не маглі не мець рэлігійнага характару. Са з'яўленнем міфа і міфалогіі, асноўнымі дзеючымі асобамі якіх былі розныя богі, менавіта з іх учынкамі і дзеяннямі пачалі звязвацца пэўныя правілы паводзін. Вось чаму правілы паводзін, якія фармуляваліся ў міфе, падлягалі няўхільнаму захаванню і безумоўнаму выкананню. Калі пэўным чынам паступаюць богі, то чалавек тым больш павінен прытрымлівацца пэўных правілаў паводзін.

З развіццём рэлігіі і рэлігійнай свядомасці на больш позніх этапах першабытнага грамадства з'яўляюцца самастойныя, асобныя, рэлігійныя правілы паводзін, у падмурку якіх ляжалі патра-

баванні шматлікіх багоў, а затым – запаветы адзінага Бога і якія напачатку ўсталёўвалі парадак, працэдуру ўзаемаадносінаў паміж чалавекам і шматлікімі багамі, а затым – паміж чалавекам і адзіным Богам.

Характарызуючы правілы паводзін, уласцівыя першабытнаму грамадству, акрэсліваючы іх агульныя рысы, трэба мець на ўвазе і тое, што на іх характар, на іх змест, на іх развіццё і трансфармацыю вельмі моцны ўплыў аказвала мысленне першабытнага чалавека. Без эмацыянальна-інтэлектуальных высілкаў з боку чалавека ніякія правілы паводзін увогуле не маглі не толькі ўзнікнуць, але і існаваць. Разам з тым, мысленне першабытнага чалавека першапачаткова было інтуітыўна-містычным, таму што ва ўмовах прысвойваючай эканомікі вельмі цяжка было ўстанавіць і ўсталяваць сувязі паміж дзеяннямі чалавека і вынікамі яго дзеянняў. Выпадковасць вынікаў пры паляванні, збіральніцтве, рыбалоўстве, адсутнасць заканамерных сувязей паміж працай і яе вынікамі не дазвалялі сфармуляваць дакладна акрэсленыя, фармальна-азначаныя, правільныя, аднастайныя правілы паводзін пры паляванні, рыбалоўстве і збіральніцтве. У гэтых варунках акцэнт у нармаванні паводзін чалавека пераносіўся на рытуальную і абрадавую частку паводзін, на тыя правілы, якія папярэднічалі яго вытворчай дзейнасці і якія суправаджалі яе вынікі. Іх можна было сфармуляваць дакладна і адназначна.

Пасля пераходу першабытнага грамадства ад прысвойваючай да вытворчай эканомікі, з узнікненнем земляробства і жывёлагадоўлі перад чалавекам паўстала цэласная і даволі поўная карціна паходжання вынікаў яго працы, памянялася і мысленне чалавека. Ад інтуітыўна-містычнага светаўспрымання ён паступова перайшоў да мыслення, у якім пераважаюць лагічныя моманты. А разам з такім пераходам адбываюцца і змены ў характары і змесце сфармуляваных чалавекам правілаў паводзін. Яны набываюць большую абстрактнасць, абагулены характар, фармальную азначанасць. Больш таго, пры стварэнні правілаў паводзін першабытны чалавек пераносіць акцэнт на вытворчую сферу сваёй дзейнасці і імкнецца найбольш дэталёва і падрабязна ўрэгуляваць адносіны менавіта ў вытворчай сферы сваёй дзейнасці.

2. Паходжанне права, яго прыметы

Права, гэтаксама, як дзяржава, узнікае натуральна-гістарычным шляхам у выніку тых сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, што адбыліся ў грамадстве пасля і ў ходзе неалітычнай рэва-

люцыі, стрыжнем якіх былі тры буйныя грамадскія падзелы працы. Змест гэтых буйных падзелаў грамадскай працы і іх наступствы былі падрабязна разгледжаны ў папярэдняй тэме, а таму звернем увагу на наступнае.

Заканамерным вынікам азначаных працэсаў, якія доўжыліся тысячагоддзі, стала фармаванне якасна новага грамадства ў параўнанні з першабытным грамадствам, заснаванага на рэгулярным тавараабмене, вядучая роля ў якім належыць таварна-грашовым адносінам і адносінам, што абумоўлены існаваннем тавараабмену і таварна-грашовых адносін.

Важным этапам у фармаванні грамадства, заснаванага на рэгулярным тавараабмене, з'яўляецца перыяд так званай «прэстыжнай эканомікі». З развіццём індывідуальнай уласнасці і з'яўленнем лішкавага прадукту ў развіцці ўзаемаадносін паміж людзьмі, якія належалі пераважна да розных суседскіх абшчын, узнікае такая сацыяльная з'ява, як «абмен дарамі», ці, іншымі словамі, «дараабмен». Пры гэтым дарыцель нічога не губляў, бо пры абмене дарамі дзейнічаў прынцып эквівалентнасці, так званая ўзаемнасць. Дарыцель набываў грамадскі прэстыж. Але больш важным з'яўляецца тое, што падчас існавання ва ўмовах прэстыжнай эканомікі людзі набылі навыкі абмену таварамі на прынцыпе эквівалентнасці. У іх свядомасці замацавалася разуменне таго, што тавары можна мяняць на суразмерных пачатках, пры гэтым яны навучыліся вымяраць эквівалентнасць тавараў.

І калі на самых першасных этапах прэстыжнай эканомікі абмен дарамі меў спарадычны, нерэгулярны характар, а людзі ажыццяўлялі дараабмен пераважна дзеля таго, каб набыць (ці атрымаць) грамадскі прэстыж, то з развіццём рэгулярнага тавараабмену перад грамадствам паўстала пытанне аб тым, як і з дапамогай якіх правілаў паводзін урэгуляваць новыя грамадскія адносіны, заснаваныя на тавараабмене, а таксама грамадскія адносіны, якія сфармаваліся пад уздзеяннем таварна-грашовых адносін.

Існаваўшыя ва ўмовах першабытнага грамадства правілы паводзін – табу, міфы, аграрныя і жывёлагадоўчыя календары – не ў стане ўрэгуляваць узнікшыя ў выніку трох буйных грамадскіх падзелаў працы новыя грамадскія адносіны. Спатрэбіліся новыя віды нарматыўных рэгулятараў. Так узнікае права, а разам з ім адбываецца трансфармацыя ва ўсёй сістэме нарматыўнага рэгулявання грамадскіх адносін.

Якія прыметы выдзяляюць права сярод іншых нарматыўных рэгулятараў і адрозніваюць яго ад правілаў паводзін, якія былі ўласцівы першабытнаму грамадству?

Па-першае, права ўзнікае ў выніку развіцця рэгулярнага тавараабмену і таварна-грашовых адносін. Можна сказаць, што таварна-грашовыя адносіны з'яўляюцца «родавай пупавінай» права. Першапачаткова права ўзнікае менавіта для рэгулявання таварна-грашовых адносін, для рэгулявання такіх адносін, зместам якіх з'яўляецца абмен нейкімі матэрыяльнымі каштоўнасцямі. Затым права пачынае заканамерна пранікаць і ў іншыя сферы грамадскага жыцця і найперш выкарыстоўваецца для рэгулявання грамадскіх адносін, якія ўзнікаюць пад непасрэдным уплывам таварна-грашовых адносін.

Па-другое, права ўяўляе сістэму такіх правілаў паводзін, «стрыжнем» якіх з'яўляецца *эквівалент*, г. зн. суразмернасць. З дапамогай разнастайных па змесце правілаў паводзін, іх сістэмы ў таварна-грашовых адносінах, а таксама і ў іншых грамадскіх адносінах усталёўваецца суразмернасць пры абмене матэрыяльнымі каштоўнасцямі, пры кампенсацыі за згубленую маёмасць і г. д., тым самым забяспечваюцца раўнавага, стабільнасць, устойлівасць грамадскіх адносін.

Па-трэцяе, права – гэта такая сістэма правілаў паводзін, якая патрабуе абавязковай знешняй фіксацыі, знешняга выражэння, «матэрыялізацыі». Гэта патрэбна дзеля таго, каб аднастайна, «раз і назаўсёды» зафіксаваць у свядомасці людзей тыя суразмернасці, «эквіваленты», якія былі выпрацаваны для рэгулявання пэўных грамадскіх адносін, і надаць ім агульнаабавязковае значэнне, падкрэсліць іх непарушнасць. Прававыя нормы заўсёды фіксаваліся на «матэрыяльных носьбітах», якія былі найбольш зручнымі ва ўмовах існавання той ці іншай чалавечай супольнасці – на папірусе, гліне, дрэве, камені і г. д.

Па-чацвёртае, права – гэта такая сістэма правілаў паводзін, якая патрабуе абавязковай знешняй абароны з боку грамадства і яго афіцыйнага прадстаўніка – дзяржавы. Справа ў тым, што рэгулярны тавараабмен, які заснаваны на якаснай і колькаснай маёмаснай няроўнасці, заўсёды суправаджаецца барацьбой інтарэсаў пэўных уласнікаў адносна эквівалентнасці (суразмернасці) абменьваемых каштоўнасцей. І натуральным выглядае працэс абмену, пры якім яго вынікамі не могуць быць задаволены ўсе ўласнікі абменьваемых каштоўнасцей. У такім разе для захавання выпрацаванага грамадствам эквівалента (нормы ці нормаў паводзін, з дапамогай якіх рэгулююцца таварна-грашовыя адносіны і забяспечваецца неабходная эквівалентнасць) заканамерна патрабуецца знешняя прымусовая сіла. Такой сілай на самых ранніх этапах развіцця права

маглі выступаць родавыя і пляменныя арганізацыі і органы кіравання, а з узнікненнем асобнай публічнай улады ў форме дзяржавы менавіта яна, з'яўляючыся адзіным афіцыйным прадстаўніком усяго грамадства, сканцэнтравала ў сваіх руках абарону права.

Па-пятае, права ўяўляе такую сістэму правілаў паводзін, якія маюць прадстаўніча-абавязваючы характар. Гэта азначае, што яны надзяляюць нейкіх сацыяльных суб'ектаў правамі і адначасова ўскладваюць на іншых абавязкі. Пры рознасці ў маёмасным і сацыяльным становішчы людзей і супрацьлегласці інтарэсаў уласнікаў пэўных матэрыяльных каштоўнасцей, якімі яны абменьваюцца, у розных удзельнікаў абмену таварамі складваецца рознае фактычнае становішча, напрыклад, становішча гандляра і пакупніка. Урэгуляваць працэс перадачы нейкай матэрыяльнай каштоўнасці ад гандляра да пакупніка і працэс кампенсацыі на эквівалентных пачатках перададзенай каштоўнасці можна толькі шляхам надзялення гэтых удзельнікаў нейкімі правамі (прававымі магчымасцямі) і ўскладаннем на іх нейкіх абавязкаў. Прычым у гандляра і пакупніка з неабходнасцю будуць розныя па зместу правы і абавязкі, але яны павінны быць узаемазвязаны такім чынам, каб кожны з удзельнікаў мог рэалізаваць свае правы праз абавязкі іншага.

3. Асноўныя шляхі і формы паходжання права

Тры вельмі ўплывовыя сілы аказвалі непасрэднае ўздзеянне на ўзнікненне і развіццё права – новыя грамадскія адносіны, якія складваліся пад уздзеяннем тавараабмену; узнікаючая дзяржава; ужо існуючыя ў грамадстве правілы паводзін. Пры гэтым два першыя фактары аказвалі рашаючы ўплыў на генезіс права, а трэці выступаў у якасці нейкага інтэлектуальнага рэзервуара, у якім непасрэдныя стваральнікі норм права знаходзілі «нарматыўны матэрыял» для новых відаў правілаў паводзін. Узаемадзеянне двух рашаючых фактараў пры фармаванні права дае нам уяўленне аб асноўных кірунках (шляхах) узнікнення права, а разгляд працэсаў выкарыстання ўласцівых першабытнаму грамадству правілаў паводзін пры стварэнні норм права дазваляе сфармуляваць асноўныя формы паходжання права.

У залежнасці ад таго, які з двух асноўных, акрэсленых вышэй фактараў аказваў рашаючы ўплыў на фармаванне права, можна выдзеліць два асноўныя шляхі паходжання права. Калі асноватворчым фактарам з'яўляліся якасна новыя, невядомыя першабытнаму грамадству таварна-грашовыя адносіны, мы маем справу, умоўна

кажучы, з «*еўрапейскім шляхам»* фармавання права. Калі ж у якасці галоўнай рухаючай сілы пры ўзнікненні права выступала дзяржава, то ў гэтым выпадку зноў-такі, умоўна кажучы, мы маем справу з «*азіяцкім шляхам»* фармавання права.

Пры гэтым у выпадку першага шляху паходжання права большая частка норм права складвалася ў жыцці грамадства паступова, эвалюцыйным шляхам, а затым грамадства і яе афіцыйны прадстаўнік – дзяржава надавалі ім агульнаабавязковае значэнне, бралі іх пад сваю ахову і гарантавалі абарону. У выпадку ж другога шляху фармавання права значная частка норм права фармулявалася і выдавалася непасрэдна дзяржавай. Асабліва прыметна гэта ў станаўленні тых вядомых нам прававых сістэм, дзе дзяржава ў сваім развіцці значна апярэджвала фармаванне права.

Разам з тым вядомыя нам гістарычныя факты сведчаць пра тое, што ўзнікненне права адбывалася калі і не адначасова з фармаваннем дзяржаўна-арганізаванага грамадства (дзяржавы), то пад вельмі значным уплывам дзяржавы на фармаванне права.

Ключавую ролю як у фармаванні права, так і ў фармаванні дзяржавы адыграў такі фактар, такая з'ява, як лішкавы прадукт. З'яўленне ў грамадстве менавіта лішкавага прадукту дазволіла развіць рэгулярны тавараабмен і сфармаваць якасна новую сістэму нарматыўнага рэгулявання – права. Адначасова з развіццём тавараабмену і самага першаснага, хай сабе і «прымітыўнага» права, у грамадстве ўзнікаюць і такія ж самыя першасныя структуры абароны гэтага «прымітыўнага» права.

Нават калі прыняць пад увагу тое, што на першых этапах фармавання права яго абаранялі, гарантавалі і праводзілі ў жыццё, іншымі словамі, забяспечвалі старыя рода-пляменныя структуры кіравання і ўлады, то ўзнікае пытанне: забяспечваючы толькі што ўзнікаючае права, ці не мяняюць адначасова сваю прыроду і старыя рода-пляменныя структуры ўлады і кіравання? Нам уяўляецца, што адказ можа быць толькі станоўчы. Бо пры забеспячэнні інтарэсаў тавараўтворцаў і ўдзельнікаў тавараабмену яны аддаюць тым самым перавагу інтарэсам толькі часткі супольнасці над агульнымі інтарэсамі ўсёй супольнасці. Больш таго, гарантуючы гэтыя інтарэсы, старыя структуры ўлады пачынаюць «палітызавацца», выбіраць паміж рознымі і нават супрацьлеглымі інтарэсамі суродзічаў і супляменнікаў, параўноўваць іх, узважваць і аддаваць пры гэтым перавагу асобным інтарэсам над інтарэсамі ўсёй рода-пляменнай супольнасці. А што гэта, як не праява дзяржаўна-арганізаванага грамадства?

Уяўляецца, што як меркаванні аб першынстве фармавання права перад дзяржавай, так і адваротным прыярытэце заснаваны на тым, што іх аўтары ў сваіх высновах абапіраюцца пераважна альбо на еўрапейскі шлях фармавання права і дзяржавы, альбо на азіяцкі вектар у станаўленні гэтых сацыяльных інстытутаў. І пры гэтым акцэнтуюць сваю ўвагу альбо на фармаванні права, альбо на фармаванні дзяржавы, не заўважаючы галоўнага – таго, што без лішкавага прадукту не магло быць ні дзяржавы, ні права. А калі гэта так, то як права, так і дзяржава не могуць не ўзнікаць адначасова. Іншая справа, як, якім шляхам ішло размеркаванне і перараз-меркаванне лішкавага прадукту. Калі лішкавы прадукт перараз-мяркоўваўся самімі ўдзельнікамі тавараабмену, якія патрабавалі абароны сваіх інтарэсаў ад існуючых на той момант уладных структур, можна гаварыць аб тым, што паскоранымі тэмпамі развівалася права. Калі ж у размеркаванні і перараз-меркаванні лішкавага прадукту найперш удзельнічалі ўладныя і кіраўнічыя структуры, якія вымушаны былі стварыць для гэтага пэўныя нормы і правілы, то можна казаць пра паскоранае развіццё дзяржавы.

Такім чынам, з рознасці ў «тэмпах» фармавання дзяржавы і права нельга рабіць высновы аб тым, што нейкі з гэтых сацыяльных інстытутаў узнік раней за другі. Больш правільнай і адпавядаючай рэчаіснасці будзе выснова аб іх адначасовым узнікненні і ўзаемадзеянні з тым удакладненнем, што ў розных рэгіёнах свету іх узаемадзеянне мела свае адметныя рысы.

У адных рэгіёнах паскоранымі тэмпамі фармавалася дзяржава, адбывалася палітызацыя грамадства. Тут дзяржава аказвала значны ўплыў на ўзнікненне і фармаванне права. Звязана гэта было з тым, што ў гэтых рэгіёнах пануючае становішча займала дзяржаўная ўласнасць, і, такім чынам, дзяржава аказвала рашаючы ўплыў на развіццё тавараабмену і таварна-грашовых адносін, а адначасова і на права (Егіпет, Індыя, Месапатамія і г. д.). У гэтых рэгіёнах маральна-рэлігійныя сістэмы, якія фактычна выконвалі ролю дзяржаўнай ідэалогіі, аказалі значны ўплыў на станаўленне права (канфуцыянства ў Кітаі, навучэнні Птахатэпа ў Егіпце, Законы Ману ў Індыі). У іншых рэгіёнах больш хуткімі тэмпамі адбывалася фармаванне права, бо тут развіццё тавараабмену і таварна-грашовых адносін адбывалася на падмурку прыватнай уласнасці, а дзяржаўная ўласнасць не мела значнага распаўсюджвання (Афіны, Рым і г. д.).

Пры фармаванні права адбыліся карэнныя змены ва ўсёй сістэме нарматыўнага рэгулявання. Найперш, само права вылучылася пры ўладкаванні грамадскіх адносін на першае месца, таму што

яно стала рэгламентаваць самыя значныя для жыццядзейнасці грамадства адносіны. Але пры «разбурэнні» монанарматыўнай, адзінай для ўсёй супольнасці сістэмы нарматыўнага рэгулявання кожны з разгледжаных намі вышэй відаў правілаў паводзін паступова стаў займаць пры ўздзеянні на грамадскія адносіны сваю адметную «нішу», знаходзіў тыя грамадскія адносіны ці іх асобныя бакі, на якія працягваў аказваць далейшае рэгулюючае ўздзеянне. Такім чынам, пры ўзнікненні якасна новага нарматыўнага рэгулятара заканамерна адбыліся якасныя перамены і ў іншых відах правілаў паводзін. Сфера дзеяння адных правілаў паводзін павялічвалася, напрыклад, маралі і маральных норм, а поле дзеяння іншых памяншалася, напрыклад, табу і міфаў.

Але ці не адной з самых цікавых для нас з'яў сталася актыўнае выкарыстанне нарматыўных рэгулятараў, уласцівых першабытнаму грамадству, пры стварэнні норм права.

Для надання прававога характару асобным правілам паводзін першабытнага грамадства дастаткова было памяняць змест толькі часткі старога правіла паводзін, напрыклад, памяняць санкцыю за парушэнне правіла шляхам усталявання матэрыяльнай адказнасці замест «маральнай адказнасці». Частцы нарматыўных рэгулятараў першабытнага грамадства надавалася новае гучанне. Пры захаванні знешняй формы яны напаўняліся іншым зместам і прыстасоўваліся да рэгулявання новых грамадскіх адносін.

Але не меншае значэнне пры стварэнні норм права і асабліва пры іх замацаванні ў свядомасці людзей мелі тыя правілы-сродкі, якія былі вельмі добра распрацаваны ў першабытным грамадстве – рытуалы, абрады, разнастайныя рэлігійныя працэдуры і правілы. Для надання аўтарытэту і агульнай абавязковасці новым, невядомым першабытнаму грамадству правілам паводзін – нормам права – яны былі, магчыма, самым зручным сродкам.

На наш погляд, адной з форм узнікнення права на самых першасных яго этапах быў такі спосаб стварэння норм права, пры якім *часткова мяняўся змест старога, добра вядомага правіла паводзін* – нейкага табу, нейкага міфа, нейкага правіла календара. Пры гэтым для падтрымання яго аўтарытэту і надання агульнай абавязковасці новаму правілу паводзін выкарыстоўваліся добра вядомыя і неаспрэчныя правілы-сродкі. Больш таго, у першабытным грамадстве ўжо існавала пэўная, даволі арганізаваная сіла ў асобе жрацоў, знахараў, шаманаў, якія выконвалі рытуалы, абрады і іншыя правілы-сродкі. Не дарэмна менавіта гэтая група людзей у многіх рэгіёнах зямнога шара і стала першапачаткова той сацыяльнай сілай, якая і стварала нормы права, ажыццяўляла правасуддзе.

Разам з тым, асноўнай формай у развіцці права быў *шлях стварэння якасна новых, невядомых першабытнаму грамадству правілаў паводзін* – норм права, якія рэгулявалі невядомыя першабытнаму грамадству таварна-грашовыя адносіны і адносіны, якія былі абумоўлены развіццём рэгулярнага тавараабмену і таварна-грашовых адносін. Безумоўна, пры стварэнні і якасна новых, прававых па свайму зместу правілаў паводзін не маглі не выкарыстоўваць інтэлектуальна-інфармацыйнага зместу ўласцівых першабытнаму грамадству правілаў паводзін, г. зн. тых звестак аб грамадстве, паводзінах чалавека, якія знаходзілі ў табу, міфах, календарах, іншых правілах паводзін. Але пры гэтым самі правілы паводзін – нормы права – не мелі аналагаў раней.

Прычым калі на самых першасных этапах фармавання права доля норм права, якія мелі «выключна прававыя карані» і не мелі аналагаў у вядомых правілах паводзін, была невялікай, то па меры фармавання і пашырэння сферы таварна-грашовых адносін іх удзельная вага павялічвалася.

Пытанні для самаправеркі

1. Чаму, на Вашу думку, у першабытным грамадстве ўзніклі правілы паводзін агульнага характару (нарматыўныя рэгулятары), і якія функцыі яны выконвалі?

2. Ці можна лічыць, што будова (структура) разнастайных табу была затым запазычана іншымі відамі нарматыўных рэгулятараў грамадства? Калі гэта так, то абгрунтуйце дадзены тэзіс.

3. Чаму менавіта нарматыўная частка з'яўлялася галоўнай складанай часткай міфа, і ці захоўвае яна сваё значэнне ў сучасных умовах?

4. Ці былі ўласцівы першабытнаму грамадству такія нарматыўныя рэгулятары, як звычай, традыцыя і мараль?

5. Якія прычыны прывялі да неалітычнай рэвалюцыі, якімі былі яе наступствы ў сферы нарматыўнага рэгулявання?

6. Якая роля прэстыжнай эканомікі і «дараабмену» ў паходжанні права?

7. Якой была роля дзяржавы ва ўзнікненні і фармаванні права?

8. Ці можна лічыць правілы ўліку і размеркавання грамадскай працы, а таксама правілы размеркавання і перараз меркавання лішкавага прадукту, якія былі створаны дзяржавамі на Усходзе, нормамі права?

9. Якім чынам нарматыўныя рэгулятары першабытнага грамадства ўздзейнічалі на ўзнікаючае права?

10. Якім чынам змяніліся нарматыўныя рэгулятары першабытнага грамадства з узнікненнем права?

11. Якую ролю выконвала рэлігія ў станаўленні права?

12. Чаму эквівалентнасць (суразмернасць) з'яўляецца «стрыжнем» права?

13. Якая роля «класагенезу» ў станаўленні права?

14. Як Вы ставіцеся да думкі аб існаванні «маральнага права»?

15. Як суадносяцца паміж сабой асноўныя шляхі і формы паходжання права?

Тэма 4. АСНОЎНЫЯ КАНЦЭПЦЫІ (ТЭОРЫІ) ПАХОДЖАННЯ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА

1. Прычыны існавання розных канцэпцый (тэорый) паходжання дзяржавы і права.

2. Характарыстыка асноўных тэорый (канцэпцый) паходжання дзяржавы і права:

а) тэалагічная тэорыя паходжання дзяржавы і права;

б) патрыярхальная тэорыя паходжання дзяржавы і права;

в) дагаворная тэорыя паходжання дзяржавы і права;

г) арганічная тэорыя паходжання дзяржавы і права;

д) тэорыя гвалту;

е) марксісцкая (матэрыялістычная, «класавая») тэорыя паходжання дзяржавы і права.

1. Прычыны існавання розных канцэпцый (тэорый) паходжання дзяржавы і права

Са старадаўніх часоў людзі імкнуліся адказаць на пытанне аб паходжанні дзяржавы і права. З гэтай мэтай было створана шмат разнастайных тэорый, якія па-рознаму асвятлялі працэсы фармавання дзяржаўна-арганізаванага грамадства і яго прававой сістэмы. Адсутнасць аднастайнасці ў разуменні працэсаў паходжання дзяржавы і права абумоўлена шэрагам прычын.

Па-першае, у грамадстве з якаснай і колькаснай маёмаснай няроўнасцю складваюцца розныя сацыяльныя групы са сваімі адметнымі эканамічнымі, сацыяльнымі і палітычнымі інтарэсамі. Кожная з іх імкнецца абараніць свае інтарэсы самымі рознымі сродкамі, у тым ліку і з дапамогай навуковага, ідэалагічнага абгрунтавання ўласных інтарэсаў. Праз распрацоўку адпаведных тэорый паходжання дзяржавы і права можна надаць сваім інтарэсам агульнадзяржаўнае значэнне, паказаць іх значнасць для ўсёй супольнасці. Разнастайнасць і супярэчлівасць інтарэсаў розных сацыяльных груп

абумоўлівалі распрацоўку розных, нават супрацьлеглых ідэалагічных канцэпцый і падыходаў да абгрунтавання сутнасці дзяржавы і права і прычын, якія абумовілі іх з'яўленне ў грамадстве.

Па-другое, пры стварэнні тэорый паходжання дзяржавы і права іх распрацоўшчыкі карысталіся вопытам развіцця і функцыянавання дзяржаўна-арганізаванага грамадства і права ў пэўных рэгіёнах Зямлі і рабілі высновы, абагульняючы менавіта гэты «вузкарэгіянальны» вопыт. Таму створаныя пад уздзеяннем гэтага фактару асобныя канцэпцыі аб паходжанні дзяржавы і права маюць «вузкарэгіянальнае» значэнне і не могуць прэтэндаваць на раскрыццё агульных заканамернасцей паходжання дзяржавы і права.

Па-трэцяе, вядомыя зараз канцэпцыі аб паходжанні дзяржавы і права былі распрацаваны ў розныя, адрозныя адна ад другой, гістарычныя эпохі. А паколькі веды маюць уласцівасць мяняцца, то няма нічога дзіўнага ў тым, што з набыццём новых альбо дадатковых навуковых дадзеных мяняюцца погляды на адны і тыя ж сацыяльныя рэальнасці, у тым ліку і на праблему паходжання дзяржавы і права, шляхі (формы) іх узнікнення.

Па-чацвёртае, моцны ўплыў на перамену поглядаў аб дзяржаве і праве, іх генезісе і эвалюцыі аказвае метадалогія іх даследавання. Пры пераменах у метадалогіі даследавання нават адны і тыя ж гістарычныя, антрапалагічныя і этнаграфічныя звесткі і дадзеныя аб узнікненні дзяржавы і права можна выкласці ў рознай паслядоўнасці і пабудаваць такім чынам прынцыпова розныя тэорыі аб паходжанні дзяржавы і права. З пераменай у светапоглядах адбываюцца і перамены ў канцэпцыях аб паходжанні дзяржавы і права.

Па-пятае, на паходжанне дзяржавы і права ўплываюць самыя розныя фактары – біялагічныя, прыродна-кліматычныя (геаграфічныя), сацыяльна-эканамічныя і г. д. Кожны з іх мае сваю «велічыню» ўздзеяння на працэсы развіцця грамадства, дзяржавы і права. У залежнасці ад таго, якім фактарам надаецца пры распрацоўцы тэорыі большае ці меншае значэнне, атрымліваюцца і вынікі навуковага даследавання, фармуецца змест тэорыі паходжання дзяржавы і права.

Па-шостае, на змест тэорый аб паходжанні дзяржавы і права ўплывае і ацэначная пазіцыя распрацоўшчыкаў наконт ролі і значнасці дзяржавы і права ў жыцці грамадства. Калі аўтары лічаць, што вядучую ролю адыгрывае дзяржава, то адпаведна гэтаму вытлумачваецца працэс узнікнення і развіцця права. Калі ж, наадварот, першаснае значэнне адводзіцца праву, то працэсы ўзнікнення і развіцця дзяржавы разглядаюцца інакш.

Па-сёмае, часта дасягненні і высновы, якія зроблены ў адной галіне навук (натуральных ці грамадскіх), выкарыстоўваюцца пры вырашэнні «вузкаспецыяльных» праблем. Часта гэта прыносіць свой плён, асабліва пры выкарыстанні матэматычных сродкаў і метадаў у іншых натуральных навуках. Недарэмна матэматыку здаўна лічаць «царыцай усіх навук». Аднак далёка не заўсёды такія захады навукоўцаў з'яўляюцца карэктнымі, бо для кожнай навукі, якая мае свой адметны прадмет даследавання, існуюць адэкватныя гэтаму прадмету метады даследавання, дакладней, іх сістэма.

Ёсць, умоўна кажучы, тры групы тэорый, у якіх вытлумачваюцца пытанні паходжання дзяржавы і права. У склад першай уваходзяць тыя канцэпцыі, у якіх размова ідзе аб узнікненні як дзяржавы, так і права. У склад другой групы ўваходзяць тэорыі, у якіх разглядаецца пераважна паходжанне дзяржавы. І, нарэшце, трэцюю групу складаюць тэорыі аб паходжанні права, напрыклад, гістарычная школа права.

2. Характарыстыка асноўных тэорый (канцэпцый) паходжання дзяржавы і права

а) тэалагічная тэорыя паходжання дзяржавы і права

Дадзеную тэорыю можна лічыць ці не самай першай у гісторыі палітыка-прававой думкі спробай асэнсавання працэсаў паходжання дзяржавы і права, а таксама іх сутнасці. І гэта не выпадкова таму, што рэлігія, як вядома, была самай першай і самай уплывовай формай ідэалогіі і грамадскай свядомасці, якая тлумачыла ўсе сацыяльныя, ды і не толькі сацыяльныя, працэсы, што адбываліся з чалавекам і наогул у грамадстве.

Вельмі шырокі ўплыў і распаўсюджанне хрысціянская канцэпцыя паходжання дзяржавы і права мела ў сярэдневяковай Еўропе, не згубіла яна свайго найперш маральна-этычнага значэння і ў сучасным свеце. Разгледзім самыя істотныя і вузлавыя моманты тэалагічнай тэорыі паходжання дзяржавы і права, якія выкладзены ў Кнізе Кніг – у Бібліі на прыкладзе іх фармавання ў абранага Богам народа Ізраіля. Пры гэтым моманты ўзнікнення права і дзяржавы ў Ізраілі павучальныя на вечныя часы, як усё Божае тварэнне.

Для зямнога існавання чалавека дастаткова было і аднаго маральнага закону, яго безумоўнага захавання і выканання чалавекам. Але чалавек – істота, схільная да граху, і вось па гэтай прычыне спатрэбіліся законы (права) і дзяржава. Важна і тое, што народ

Ізраіля сам усвядоміў сваю бездапаможнасць існаваць ва ўмовах маральнага закону, адчуў неабходнасць падпарадкаваць сябе новым абмежаванням – праву (закону) і дзяржаве. Усе гэтыя абмежаванні ў форме права і дзяржавы былі неабходны не Богу, а народу.

І, нарэшце, важнай з'яўляецца паслядоўнасць узнікнення супольнасці, права (закона) і дзяржавы ў абранага народа. Яна выглядае так. Спачатку Бог даруе абранаму народу Ізраіля маральны закон, які зводзіцца да веры ў Бога і да падпарадкавання яго волі. Затым праз Маісея ў 10 (дзесяці) запаветах Богам былі дадзены асновы сацыяльнага ладу, а праз заканадаўства Маісея былі дапоўнены грамадскія статуты і аформлена Старазапаветная царква. Праз некалькі соцен гадоў праз прарока Самуіла і па волі Бога была ўсталявана і царская ўлада (дзяржава).

Важна падкрэсліць, што права і дзяржава не навязваюцца Усявышнім чалавечай супольнасці, а «даруюцца» Госпадам па просьбе народа Ізраіля. Народ пры гэтым не выходзіць з-пад улады Бога і нават не выбірае сабе цара, а прымае прызначанага Богам памазаніка. Богам жа дадзеная ўлада цара над народам Богам асвячаецца і атрымлівае зноў-такі ад Бога абавязак выконваць не сваю волю, а волю Бога. Народ жа абавязваецца падпарадкоўвацца цару, улада якога над народам абмежавана толькі тым, што цар абавязаны падпарадкоўвацца Богу.

Права і дзяржава, такім чынам, прадвызначаны стварыць неабходныя ўмовы для жыцця людзей, для таго, каб яны змаглі захаваць вобраз Божы, які прысутнічае ў чалавеку першапачаткова, і захавалі здольнасць наблізіцца да Божага падабенства, да якога чалавек імкнецца і набліжаецца ў розныя эпохі ў рознай ступені. Адсюль вынікае той вывад, згодна з якім дзяржава і права з'яўляюцца і ўзнікаюць як дадатковыя да маральнага закону сродкі для ўладкавання жыцця людзей, для абмежавання іх грахоўнасці.

б) патрыярхальная тэорыя паходжання дзяржавы і права

Асобныя моманты патрыярхальнай тэорыі паходжання дзяржавы і права былі сфармуляваны яшчэ ў старажытнасці. Цікавыя меркаванні аб патрыярхальным шляху паходжання дзяржавы і права былі выказаны Платонам і Арыстоцелем. Платон, у прыватнасці, лічыў, што дзяржава (поліс) узнікае як сумеснае пасяленне людзей, якое ўзнікае з таго, што людзі маюць агульныя патрэбы. Адзін чалавек не можа задаволіць усе свае патрэбы, а таму людзі збіраюцца разам, каб жыць супольна і аказваць адзін аднаму дапамогу.

З патрэбаў супольнага пражывання выводзіў абгрунтаванне паходжання дзяржавы і вучань Платона Арыстоцель. Аб'яднанне некалькіх сем'яў з мэтай абслугоўвання іх патрэбаў прыводзіць, на яго думку, да ўтварэння паселішчаў, а супольнасць, якая складаецца з некалькіх паселішчаў, ёсць цалкам завершаная дзяржава. Ён лічыў, што грэчаскія дзяржавы таму спачатку і кіраваліся царамі, што яны ўтвараліся з элементаў, якія прызнавалі над сабой царскую ўладу, бо ва ўсялякай сям'і старэйшы надзелены паўнамоцтвамі цара. Такім чынам, дзяржава, дзяржаўная (царская) улада, на думку Арыстоцеля, як бы ўзнікае, вырастае арганічна з разросшайся сям'і, а таму дзяржаўная (царская) улада ёсць заканамерны працяг бацькоўскай улады.

Выказваючы меркаванні аб паходжанні дзяржавы і права, Платон і Арыстоцель абапіраліся перш-наперш на вядомы ім вопыт узнікнення дзяржавы і права ў старажытнай Грэцыі і старажытнай Італіі. Пры гэтым яны звярнулі галоўную ўвагу на той бясспрэчны гістарычны факт, што ў станаўленні дзяржаўнасці ў гэтых рэгіёнах значную ролю адыгрывалі старэйшыны родаў, кіраўнікі саветаў старэйшын. Менавіта гэтая катэгорыя насельніцтва арганізоўвала вытворчасць і гандаль, наладжвала стасункі з суседзямі і кантралявала тавараабмен. Менавіта з гэтага слою падчас ваенных дзеянняў выбіралі военачальнікаў, а затым па меры павелічэння колькасці насельніцтва і ў мэтах эфектыўнага кіравання супольнасцю сталі выбіраць правадыроў. Менавіта з кола старэйшын паходзілі і першыя цары.

У гэтым рэгіёне Зямлі, як мы ведаем, працэс стварэння дзяржаўна-арганізаванага грамадства пайшоў як бы па патрыярхальнаму тыпу, г. зн. па тыпу разрастання кроўнароднаснай сям'і, а цар ужо станавіўся «бацькам» (патрыярхам) усяго народа. Такім чынам, узнікненне дзяржаўна-арганізаванага грамадства ў гэтай часткі чалавечай супольнасці выглядае як заканамерны вынік разросшайся сям'і, а дзяржаўная ўлада ўзнікае ў выніку паступовага пераўтварэння ўлады бацькі ва ўладу валадара, уладу манарха.

Найперш трэба адзначыць тое, што прыхільнікі дадзенай тэорыі шукаюць свае аргументы, як і распрацоўшчыкі тэалагічнай дактрыны, у Кнізе Кніг – у Біблії. Абапіраючыся на Святое пісанне, яны лічаць, што адначасова з стварэннем чалавека ствараецца і правобраз дзяржавы: першая сям'я і з'яўлялася першай дзяржавай. Бо, ствараючы Адама і Еву, Гасподзь прадугледзеў і заклаў у іх узаемаадносіны два вельмі важныя «дзяржаваствараючыя» прынцыпы – прынцып іерархічнасці ва ўзаемаадносінах Адама і Евы і

адначасова прынцып іх роўнасці. Такім чынам, па сутнасці, адначасова з стварэннем асобнай чалавечай істоты была створана таксама чалавечая супольнасць і закладзены асноўныя элементы дзяржаўна-арганізаванага грамадства і яго прававой сістэмы.

Дэталёвую распрацоўку гэтай канцэпцыі зрабіў англійскі даследчык сэр Роберт Філмэр. Абапіраючыся на тэкст Бібліі, Роберт Філмэр даказваў, што кароль валодае ўладай як патрыярх і нашчадак патрыярха Адама, ён з'яўляецца бацькам сваіх падданых. Р. Філмэр сцвярджаў, што біблейскі Адам атрымаў ад Бога не толькі бацькоўскую, але і каралеўскую ўладу над сваімі нашчадкамі. Ад Адама ўлада перайшла да яго старэйшага сына – патрыярха, ад якога ў сваю чаргу паходзяць каралі.

в) дагаворная тэорыя паходжання дзяржавы і права

У адрозненне ад тэалагічнай і патрыярхальнай канцэпцый, якія першапрычыну ўзнікнення дзяржавы і права бачаць у Божаскай волі, дагаворная дактрына сцвярджае, што арганізаванае ў дзяржаву грамадства – справа рук чалавека. Яе прыхільнікі зыходзяць з таго, што першапачаткова ўзнікае чалавечая супольнасць, якая доўгі час існуе, не маючы дзяржавы. Гэты перыяд у гісторыі чалавечага грамадства называецца натуральным станам супольнасці, і людзі жывуць у ім без улады над сабой.

Дзяржаўна-арганізаванае грамадства ўзнікае ў выніку дамовы (дагавору) паміж людзьмі.

Дагавор аб стварэнні дзяржавы, паводле аднаго са знакамітых распрацоўшчыкаў тэорыі Т. Гобса, – адзінае выйсце са стану анархіі, вайны і самазнішчэння чалавечай супольнасці. Прызначэнне дагавору Т. Гобс бачыць у тым, каб кожны падпарадкаваў сваю волю воле адной асобы, якая толькі і ў стане забяспечыць рэальнае адзінства людзей. З характару натуральнага стану людзей і зместу дагавору аб стварэнні дзяржавы Т. Гобс выводзіць яе сутнасць. У сваю чаргу, з характару дагавору і сутнасці дзяржавы выводзіцца і характар улады. Яна, на думку Т. Гобса, павінна быць абсалютнай манархіяй.

Адказваючы на пытанне аб тым, чаму чалавек вымушаны адмовіцца ад абсалютнай свабоды над самім сабой і над сваёй уласнасцю, якія пануюць у натуральным стане існавання чалавека, заключыць дагавор з іншымі людзьмі і стварыць дзяржаву, не менш вядомы распрацоўшчык дагаворнай тэорыі паходжання дзяржавы і права Дж. Лок лічыў, што заключаючы дагавор, людзі ахвяруюць толькі часткай сваіх натуральных правоў (правам на самадапамогу

і самаабарону), робяць гэта для забеспячэння іншых правоў (права прыватнай уласнасці і асабістай свабоды). Па Дж. Локу, дзяржава ёсць дамова людзей аб абароне і натуральным дабрабыце шляхам падпарадкавання волі большасці, якая не парушае асабістай свабоды і ўласнасці.

Нямецкі юрыст С. Пуфендорф пагаджаўся з Т. Гобсам у тым, што дзяржава неабходна для забеспячэння бяспекі людзей адзін ад аднаго, для забеспячэння агульнай карысці, але пісаў не аб адным, а аб двух дагаворах: а) дагаворы паміж людзьмі аб утварэнні дзяржавы (Pactum unionis civilis) і б) дагаворы паміж людзьмі і ўрадам аб падпарадкаванні людзей уладзе (pactum subjektionis civilis). У выніку першага дагавору асобныя індывіды аб'ядноўваюцца разам, і з дапамогай «dekretum formae» яны ўсталёўваюць форму кіравання, а ў выніку другога дагавору ўжо аб'яднаныя індывіды падпарадкоўваюць сваю волю воле адной вядомай асобы (фізічнай альбо зборнай).

У выніку аб'яднання ўсталёўваецца абсалютная манархія, у якой манарх павінен быць толькі інструментам дзяржаўнай улады. Разам з тым, канструкцыя другога дагавору, сфармуляваная С. Пуфендорфам, дазволіла яму абгрунтаваць не толькі абсалютныя правы манарха ва ўмовах абсалютнай манархіі, але і правы яго падданых. Калі падданыя перадаюць манарху неабмежаваныя паўнамоцтвы, то манарх, паводле С. Пуфендорфа, павінен узяць на сябе той абавязак, згодна з якім улада ніколі не можа быць выкарыстана ім інакш, як на карысць падданых. Заключаючы дагавор, людзі не адмаўляюцца ад большай часткі сваіх натуральных правоў, яны толькі дэлегуюць манарху ўладныя паўнамоцтвы, а манарх, які звязаны ўмовамі дагавору з падданымі, з'яўляецца абаронцам гэтага дагавору, прычым абаронцам з неабмежаванымі паўнамоцтвамі.

Ніхто з прыхільнікаў дагаворнай тэорыі паходжання дзяржавы не разглядаў грамадскі дагавор як гістарычны факт. На яго глядзелі як на тэарэтычную канструкцыю, без якой нельга растлумачыць паходжанне дзяржавы, розніцу паміж дадзяржаўным і дзяржаўна-арганізаваным грамадствам, форму дзяржавы: абсалютную манархію, па Т. Гобсу, і канстытуцыйную манархію, па Дж. Локу.

г) арганічная тэорыя паходжання дзяржавы і права

Асобныя меркаванні аб падабенстве дзяржавы і права чалавечаму арганізму выказваліся яшчэ старажытнымі грэкамі – знакамітымі Платонам і Арыстоцелем. Платон, напрыклад, параўноўваў

структуру і функцыі дзяржавы са здольнасцямі чалавека і асобнымі праявамі яго душы. Спрыяльную глебу арганічная тэорыя паходжання дзяржавы і права знайшла ў канцы XVIII–пачатку XIX стагоддзя пасля таго, як у філасофіі адбыўся метадалагічны пераварот, які быў звязаны з тым, што ажыццявіўся пераход ад механістычных уяўленняў аб развіцці грамадства да арганічнага міраўспрымання. Прыхільнікі арганічнай дактрыны лічаць, што грамадства – гэта жывы арганізм, які развіваецца натуральным шляхам (ад зародкавага да развітага стану), які не залежыць ад сваіх элементаў, а, наадварот, вызначае іх лёс. Дзяржава ў адпаведнасці з дадзенай канцэпцыяй – арганізм у арганізме ці жыццёва важны яго орган, які функцыянуе аб'ектыўна, у адпаведнасці з праграмай, якая закладзена ў генатыпе – зародышу дзяржавы.

Жывыя істоты развіваюцца ад ніжэйшых відаў да вышэйшых, а ад іх –да чалавека. Дзяржава з'яўляецца разнавіднасцю арганізма, яна ўзнікае адначасова з людзьмі, дзяржаўная ўлада па сваёй сутнасці ёсць натуральнае панаванне цэлага (арганізма, чалавечай супольнасці) над часткамі (індывідам, групамі індывідаў).

Паміж грамадствам, дзяржавай і біялагічным арганізмам ёсць вялікае падабенства ў прынцыпах арганізацыі і развіцця, а таму, падобна развіццю біялагічнага арганізма і згодна з заканамернасцямі яго арганізацыі і развіцця, можна даследаваць заканамернасці развіцця і функцыянавання грамадства і дзяржавы. Паколькі характэрнай асаблівасцю жывога цэлага з'яўляецца яго рост, дыферэнцыяцыя будовы і спецыялізацыя функцый, а таксама размнажэнне і смяротнасць, то і грамадства цалкам падпарадкоўваецца гэтым жа заканамернасцям. Грамадства развіваецца, як і біялагічныя арганізмы, ад простых да больш складаных формаў. Дробныя чалавечыя групы аб'ядноўваюцца ў больш буйныя і складаныя аб'яднанні – плямёны, саюзы плямёнаў, гарады-дзяржавы, імперыі, у ім утвараюцца розныя саслоўі, розныя грамадскія класы, усталёўваюцца ўсё больш і больш разнародныя грамадскія ўстановы, узрастае спецыялізацыя заняткаў. Спецыялізацыя і дыферэнцыяцыя органаў і ўстаноў дзяржавы адбываецца так, як адбылася дыферэнцыяцыя нервовай сістэмы. Вядома, што ў ніжэйшых жывёл адна нервовая сістэма, у вышэйшых іх дзве. Гэтаксама і ў дзяржаве, першапачаткова ваеннае кіраванне супадае з грамадзянскім, а ў выніку далейшага развіцця грамадства гэтыя сістэмы кіравання адасабляюцца адна ад адной.

Чалавек – першапачатковая клетка чалавечай супольнасці, а тып грамадства з'яўляецца, на яго думку, працягам якасцей інды-

відаў. У першабытным грамадстве па прычыне росту і ўдасканалення тэхнікі адбыўся падзел працы паміж людзьмі. Менавіта з яго выраслі «ніжэйшы клас», якому наканавана дабываць сродкі існавання супольнасці – гэта рукі і ногі чалавека; і «вышэйшы клас», які павінен кіраваць супольнасцю, быць на чале яе – гэта мозг, вочы чалавека. Такі падзел у грамадстве адбыўся яшчэ напачатку сацыяльнага жыцця і будзе існаваць вечна. Дзяржава і моцная дзяржаўная рэгламентацыя жыццядзейнасці грамадства ўзнікла ўжо на самых ранніх этапах развіцця чалавечай супольнасці, калі ваенная дзейнасць была галоўнай формай існавання розных плямёнаў. Гэтая дзейнасць патрабавала асобнага, прымусовага тыпу палітычнай арганізацыі грамадства, максімальнай мабілізацыі і інтэграцыі ўсіх яго членаў. Так узнікае, а затым і развіваецца па законах развіцця біялагічнага арганізма дзяржава.

д) тэорыя гвалту

Прыхільнікі тэорыі гвалту сцвярджаюць, што асноўнай прычынай узнікнення дзяржавы з'яўляецца гвалт у форме заваявання аднаго племені другім ці ў выніку гвалту адной часткі грамадства над другой.

Найбольш грунтоўна і паслядоўна тэорыю гвалту распрацаваў Людвіг Гумпловіч, які лічыў, што дзяржава і права ўзнікаюць натуральным шляхам з іншых, дадзяржаўных утварэнняў. На яго погляд, першаснымі сацыяльнымі групамі, з якіх пайшло ўсё чалавецтва, былі разнастайныя орды, якіх было вельмі шмат у розных частках свету. Орды былі непадобнымі адна на другую, таму што пражывалі ў розных геаграфічных умовах, карысталіся рознымі сродкамі і спосабамі для забеспячэння сваёй жыццядзейнасці. Але сярод мноства ордаў выдзяляліся два галоўных тыпы – орды качавыя і орды аседлыя. Качэўнікі – сапраўдныя касмапаліты, іх дэвіз – ubi bene, ibi patria, г. зн. дзе добра – там і радзіма. Яны не задавальняюцца той радзімай, якую дала ім прырода, і здзяйсняюць набегі на сваіх суседзяў дзеля рабаўніцтва. У сваю чаргу, аседлыя орды (плямёны) падобныя на птушак, якія вырабляюць свае гнёзды. Яны міралюбівыя і аседлыя расы, звязаны з зямлёй, і зямля з'яўляецца для іх qlebae abscripti.

Два вышэйакрэсленыя тыпы ордаў пастаянна сутыкаліся паміж сабой. З факта заваявання адной арды другой натуральным чынам вырастае арганізацыя ўлады ў форме дзяржавы. І надалей пачынае ўладарыць ужо дзяржава з дапамогай прававых норм, якія

з’яўляюцца чыста дзяржаўным устанаўленнем. Тое сацыяльнае цэлае, якое ўтвараецца пасля заваявання адной ардой арды іншай называецца народам. Менавіта дзяржава звязвае ў агульную супольнасць розныя орды (плямёны) і робіць іх адным народам. Такім чынам, племя (арда) – паняцце этнічнае, а народ – паняцце палітычнае. Нацыя ж, у сваю чаргу, на думку Л. Гумпловіча, ёсць з’ява і прадукт культурнага развіцця народа.

Крытыкуючы іншыя тэорыі паходжання дзяржавы і права, Л. Гумпловіч заўважае, што вучэнне аб узнікненні дзяржавы і права шляхам заваявання і падпарадкавання з’яўляецца цалкам рэальным вучэннем, таму што мае пад сабой гістарычную праўду. Што ж тычыцца іншых шляхоў узнікнення дзяржаўна-арганізаванага грамадства і дзяржавы, то Л. Гумпловіч лічыць іх усяго толькі лагічнымі канструкцыямі.

е) марксісцкая (матэрыялістычная, «класавая») тэорыя паходжання дзяржавы і права

Марксісцкая тэорыя доўгі час у XX стагоддзі была не проста пануючай, а і адзіна правільнай у савецкай, а, значыць, і беларускай юрыдычнай навуцы. Марксісцкая тэорыя паходжання дзяржавы і права называецца матэрыялістычнай таму, што асновай фармавання дзяржаўна-арганізаванага грамадства і ўзнікнення права лічыць аб’ектыўныя і заканамерныя працэсы, якія адбываліся ў вытворчых адносінах грамадства і якія ў сваю чаргу былі абумоўлены развіццём і ўдасканаленнем сродкаў вытворчасці і прыладаў працы. У той жа час марксісцкая тэорыя паходжання дзяржавы і права лічыцца класавай таму, што, па-першае, разглядае класы (асобныя сацыяльныя групы людзей) і іх барацьбу між сабой за ўладу рухаючай сілай гісторыі, а, па-другое, абгрунтоўвае палажэнне, згодна з якім дзяржава і права маюць выключна класавы характар, таму што выражаюць і абараняюць інтарэсы эканамічна і палітычна пануючых класаў.

Згодна з марксісцкай канцэпцыяй, у падмурку паходжання дзяржавы ляжаць перш-наперш эканамічныя прычыны. Напачатку чалавечай гісторыі існуе першабытнае грамадства, якое ў выніку росту вытворчых сіл і з’яўлення прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці, расколу грамадства на класы з супярэчлівымі эканамічнымі інтарэсамі і барацьбы паміж імі пераўтвараецца ў дзяржаўна-арганізаванае грамадства.

Дзяржава ўзнікае не як сродак прымірэння класаў, а як сродак у руках эканамічна пануючых класаў для ўтрымання свайго пануючага становішча, для класавага панавання. У адпаведнасці з класавым разуменнем грамадства і яго гісторыі было сфармулявана і азначэнне права, згодна з якім права з'яўляецца ўзведзенай у закон воляй эканамічна пануючага класа, якая вызначаецца матэрыяльнымі ўмовамі існавання пануючага класа.

Пытанні для самаправеркі

1. Як Вы лічыце, ці можна ўвогуле сфармуляваць «адзіна правільную» канцэпцыю (тэорыю) паходжання дзяржавы і права?

2. Ці можна шляхам абагульнення найбольш пераканаўчых момантаў асобных канцэпцый (тэорый) аб паходжанні дзяржавы і права сфармуляваць нейкі «інтэгральны» яе варыянт?

3. Чаму, абапіраючыся на адну і тую ж Святую кнігу – Біблію, прыхільнікі тэалагічнай канцэпцыі па-рознаму тлумачылі адны і тыя ж з'явы дзяржаўна-арганізаванага грамадства і права?

4. Як Вы думаеце, парушае ці не парушае вучэнне Фамы Аквінскага аб магчымасці звяржэння манархаў асноўныя моманты (пастулаты) тэалагічнай тэорыі аб вечнасці, нязменнасці і непарыўнасці дзяржаўнай улады?

5. Параўнайце паміж сабой асноўныя пастулаты тэалагічнай і патрыярхальнай тэорый паходжання дзяржавы і права, вызначце іх падабенства і пакажыце розніцу паміж імі.

6. Якія моманты і палажэнні дагаворнай дактрыны аб паходжанні дзяржавы і права з'яўляюцца метадалагічна прыдатнымі ў абгрунтаванні канцэпцыі прававой дзяржавы і тэорыі падзелу ўлады ў сучаснай практыцы дзяржаўна-прававога будаўніцтва?

7. Чаму дагаворная тэорыя паходжання дзяржавы і права знайшла найбольшае прызнанне і пашырэнне ў Еўропе?

8. Ці можна сёння выкарыстаць ідэі арганічнай тэорыі паходжання дзяржавы і права аб спецыялізацыі і інтэграцыі функцый у грамадстве пры даследаванні арганізацыі дзяржаўнай улады, заснаванай на прынцыпе падзелу ўлады?

9. Якія моманты ў марксісцкай тэорыі паходжання дзяржавы і права здаюцца Вам найбольш абгрунтаванымі?

10. У чым Вы бачыце падабенства тэорыі гвалту і марксісцкай (матэрыялістычнай) тэорыі (канцэпцыі) паходжання дзяржавы і права?

Тэма 5. ПАНЯЦЦЕ, СУТНАСЦЬ І АЗНАЧЭННЕ ДЗЯРЖАВЫ

1. Сутнасць і азначэнне дзяржавы.
2. Улада сацыяльная, палітычная і дзяржаўная. Прыметы дзяржаўнай улады (дзяржавы), якія адрозніваюць яе ад іншых відаў палітычнай улады.
3. Тыпалогія (класіфікацыя) развіцця дзяржаўнасці.

1. Сутнасць і азначэнне дзяржавы

Пад сутнасцю дзяржавы можна разумець устойлівыя ўласцівасці, адметнасці, якасці, якія заўсёды прысутнічаюць у дзяржаўна-арганізаваным грамадстве, якія характарызуюць грамадства, арганізаванае ў дзяржаву, ці грамадства, арганізаванае як дзяржава, і якія забяспечваюць тоеснасць дзяржаўна-арганізаванага грамадства самому сабе. Тоеснасць забяспечваецца сістэмай (сукупнасцю) устойлівых і нязменных якасцей. Іншымі словамі, сутнасць дзяржавы – гэта самае ўстойлівае ў дзяржаве, гэта той змест дзяржавы, які робіць дзяржаву дзяржавай і без якога дзяржава не можа існаваць.

Для высвятлення ўстойлівых якасцей, уласцівых дзяржаве, выкарыстоўваюцца розныя падыходы. Адным з іх з'яўляецца тлумачэнне зместу тэрмінаў, з дапамогай якіх абазначаецца дзяржаўна-арганізаванае грамадства. Этымалогія слова дазваляе вызначыць асобныя рысы вывучаемай з'явы. Вядома, што ў старажытных славянскіх летапісах і іншых крыніцах дзяржава (дзяржаўна-арганізаванае грамадства) абазначалася рознымі тэрмінамі: «княства», «каралеўства», «зямля», «воласць», «горад». Пры гэтым тэрмінамі «княства», «каралеўства» абазначалі пераважна характар вярхоўнай улады ў дзяржаўна-арганізаваным грамадстве, а тэрміны «зямля», «воласць», «горад» выкарыстоўвалі для абазначэння тэрытарыяльных межаў дзяржаўна-арганізаванага грамадства, а таксама характару сувязей паміж вярхоўнай уладай і мясцовай уладай альбо ўладай, якая існавала ў пэўнай частцы дзяржаўна-арганізаванага грамадства. Пасля таго, як быў знойдзены адзіны, універсальны тэрмін для абазначэння ўсіх праяў дзяржаўна-арганізаванага грамадства – дзяржава, далейшыя пошукі сутнасці дзяржаўна-арганізаванага грамадства шляхам этымалогіі тэрміна сталі непрадуктыўнымі.

Другім з падыходаў да вызначэння сутнасці дзяржавы стаў пераважна эмпірычны шлях фармулявання найбольш адметных і ўстойлівых прымет, якія найбольш яскрава характарызавалі дзяржаўна-арганізаванае грамадства ў якасці адносна самастойнай

рэальнасці. Дадзены падыход дазволіў вызначыць, што самыя ўстойлівыя прыметы дзяржавы: а) наяўнасць у грамадстве асобнай публічнай улады, якая не супадае з усім насельніцтвам; б) наяўнасць насельніцтва, ад імя якога выступае дзяржава і інтарэсы якога яна вывучае і прадстаўляе; в) наяўнасць тэрыторыі, на якой стала пражывае насельніцтва, ад імя якога дзейнічае асобная публічная ўлада і на якой асобная публічная ўлада праяўляе сваю дзейнасць.

Пасля таго, як было вызначана, што ў асобнай публічнай уладзе ў канцэнтраванай форме, як у асобнай кроплі вады, адлюстроўваюцца ўсе адметнасці і ўласцівасці дзяржаўна-арганізаванага грамадства, задача вызначэння сутнасці дзяржавы спрасцілася. Стала патрэбным вызначыць самае галоўнае і самае ўстойлівае ў асобнай публічнай уладзе, якая заўсёды прысутнічае ў дзяржаўна-арганізаваным грамадстве і без якой дзяржаўна-арганізаванага грамадства не існуе. Найлепшым чынам гэта можна зрабіць шляхам адказу на два шчыльна ўзаемазвязаныя пытанні: а) як і чаму ўзнікла асобная публічная ўлада (дзяржава) у жыцці грамадства; б) якое прызначэнне мае асобная публічная ўлада (дзяржава) у жыцці грамадства.

Трэба адзначыць, што, нягледзячы на рознасць поглядаў сярод навукоўцаў аб прычынах і канкрэтна-гістарычных механізмах паходжання дзяржавы паміж імі, як уяўляецца, не існуе прынцыповых разыходжанняў у тым, што дзяржава ў выглядзе асобнай публічнай улады «выросла» з патрэбаў самаго грамадства. Асобная публічная ўлада з'явілася ў грамадстве таму, што папярэдняя форма арганізацыі ўлады, якая была ўласціва першабытнаму грамадству, не магла ва ўмовах сацыяльнай неаднароднасці грамадства і існавання супярэчлівых інтарэсаў гарантаваць цэласнасць грамадства, забяспечыць неабходныя ўмовы для яго функцыянавання і самаразвіцця.

Больш складаным аказалася сфармуляваць адказ на пытанне аб прызначэнні асобнай публічнай улады ў жыцці грамадства. Справа ў тым, што гістарычны вопыт развіцця і функцыянавання асобнай публічнай улады сведчыць аб наступным: 1) дзяржава ў форме асобнай публічнай улады вельмі часта выкарыстоўвалася раней і выкарыстоўваецца сёння дзеля забеспячэння інтарэсаў нейкай часткі грамадства. Пры гэтым пад часткай грамадства разумеюць альбо пэўныя класы, касты ці нейкія іншыя групы насельніцтва; 2) асобная публічная ўлада (дзяржава) ва ўсе часы свайго існавання ў большай ці меншай ступені, але заўсёды, забяспечвала агульныя (агульнасацыяльныя) інтарэсы ўсёй супольнасці, ад імя якой яна заўжды выступала і якой яна кіруе.

Забеспячэнне, ажыццяўленне дзяржавай агульнасацыяльных інтарэсаў часта ў навуковай і навучальнай літаратуры абазначаецца ў якасці выканання дзяржавай функцыі «агульных спраў». Адначасова трэба адзначыць, што ў юрыдычнай літаратуры сустракаюцца меркаванні аб наяўнасці сярод функцый дзяржавы ў якасці самастойнай функцыі агульных спраў. Уяўляецца, аднак, што функцыя вядзення агульных спраў – гэта агульнасацыяльныя задачы, якія вырашае дзяржава ва ўсе часы свайго існавання. Праўда, склад, сістэма гэтых спраў мяняюцца, але яны заўсёды прысутнічаюць у кожнай дзяржаве. Агульныя справы прысутнічаюць у кожнай з тых самастойных унутраных і знешніх функцый, якія ўласцівы дзяржаве – у эканамічнай, сацыяльнай, палітычнай, прыродарэсурсавай і г.д.

Можна прывесці дастаткова гістарычных прыкладаў і доказаў на карысць таго, што сучасная цывілізаваная дзяржава (сучасная асобная публічная ўлада) аддае перавагу агульнасацыяльным інтарэсам. Але ў той жа час нельга сцвярджаць, што для гэтай дзяржавы не існуе паняцця «вузкакласавага» інтарэса і яна не ажыццяўляе такіх мерапрыемстваў і спраў, якія б адпавядалі інтарэсам асобных груп насельніцтва. Справа тут у тым, што ніводная дзяржава не можа адмовіцца ад таго, каб праводзіць у жыццё «вузкакласавыя інтарэсы». Дзяржава з'явілася на свет таму, што яна змагла забяспечыць такія інтарэсы. «Вузкакласавы інтарэс» – гэта «радзімая адмеціна» дзяржавы, ад якой яна не ў стане пазбавіцца. Разам з тым, асобная публічная ўлада, якая ўзнікла ў сацыяльна неаднародным грамадстве, не магла адмовіцца ад таго, каб забяспечыць агульнасацыяльныя інтарэсы, якія ўласцівы ўсёй супольнасці. Асобная публічная ўлада змяняе ўладу першабытнага грамадства і вымушана вырашаць тыя праблемы і пытанні, якія забяспечвала ўлада першабытнага грамадства.

Такім чынам, дзяржава адначасова вымушана ажыццяўляць як агульнасацыяльныя інтарэсы, так і інтарэсы вузкакласавыя. Забеспячэнне агульнасацыяльных інтарэсаў – гэта спадчына асобнай публічнай улады, якую яна атрымала ад улады першабытнага грамадства, а вырашэнне, забеспячэнне і абарона вузкакласавых інтарэсаў – «радзімая адмеціна» асобнай публічнай улады, ад якой дзяржава ніколі не ў стане пазбавіцца. Два гэтыя віды інтарэсаў асобная публічная ўлада павінна забяспечваць і вырашаць адначасова. І, больш таго, забяспечваючы агульнасацыяльныя інтарэсы, дзяржава праводзіць, як правіла, у жыццё адначасова і вузкакласавыя інтарэсы, як, дарэчы, і наадварот. Забеспячэнне тэрытарыяльнай

цэласнасці і незалежнасці дзяржавы адпавядае інтарэсам як маламаёмасных слаёў насельніцтва, так і багатых. Гэтае ж самае можна сказаць і аб дзейнасці дзяржавы па пераадоленню тэхнагенных катастроф і аварый, ахове прыроды і «ўзнаўленню» прыродных рэсурсаў. Барацьба з беднасцю, дапамога маламаёмасным слаям насельніцтва заўсёды ўмацоўваюць згоду і спрыяюць ўзаемапаразуменню ў грамадстве, служаць забеспячэнню яго адзінства і цэласнасці.

У кожнага інтарэса ёсць свае сацыяльныя носьбіты, свае «ўладальнікі». Асобная публічная ўлада можа спрыяць рэалізацыі і забеспячэнню вузкакласавых інтарэсаў да таго часу і моманту, пакуль гэта не будзе ісці на шкоду забеспячэння адзінства і цэласнасці грамадства, а, наадварот, будзе спрыяць адзінству, згодзе ў грамадстве і яго цэласнасці.

Іншая справа, калі размова ідзе аб інтарэсах самой асобнай публічнай улады і яе носьбітаў (дзяржаўных служачых, чыноўнікаў і г. д.). Прызначэнне дзяржавы, асобнай публічнай улады ў жыцці грамадства не мае на мэце забеспячэнне гэтай групы «вузкакласавых інтарэсаў». Наадварот, такія «вузкакласавыя інтарэсы» дзяржава не можа і не павінна забяспечваць, а тым больш супрацьпастаўляць іх агульнасацыяльным ці іншым відам «вузкакласавых інтарэсаў». «Вузкакласавыя інтарэсы» самой дзяржавы пры вызначэнні яе сутнасці, яе ролі ў жыцці грамадства не павінны прымацца пад увагу. Дзяржава ў гэтых варунках разглядаецца ў якасці асобнага полюса, асобнай сілы, а грамадства – той сферы дзейнасці, адносна якой вызначаецца прызначэнне дзяржавы. Менавіта адносна агульнасацыяльных інтарэсаў і «вузкакласавых інтарэсаў», якія ўласцівы грамадству, і вызначаецца місія дзяржавы ў жыцці грамадства, а інтарэсы самой дзяржавы і тых, хто ажыццяўляе асобную публічную ўладу, застаюцца за межамі адказу на пытанне аб прызначэнні асобнай публічнай улады ў жыцці грамадства.

Спалучыўшы адказы на два вышэйакрэсленыя пытанні, атрымаем наступны адказ. Асобная публічная ўлада (дзяржава) заканамерна вырастае з патрэб і супярэчнасцей сацыяльна неаднароднага грамадства, узвышаецца над супярэчнасцямі і інтарэсамі грамадства, з'яўляецца той матэрыяльна ўвасобленай сілай, якая знаходзіцца над супярэчнасцямі грамадства. Адначасова гэтая сіла ўздзейнічае на грамадства, вырашае разнастайныя агульнасацыяльныя і вузкакласавыя патрэбы і інтарэсы грамадства. Яна гарантуе пры гэтым рэалізацыю інтарэсаў розных груп насельніцтва цывілізаваным шляхам і ў цывілізаваных формах і забяспечвае тым са-

мым цэласнасць грамадства, мір і спакой у грамадстве, самаразвіццё грамадства.

Па сваёй сутнасці дзяржава (асобая публічная ўлада) з'яўляецца ва ўмовах сацыяльна неаднароднага грамадства адзіна магчымай сілай (арганізацыяй, інстытутам), якая вырастае з супярэчнасцей грамадства, знаходзіцца над імі, утрымлівае іх і гарантуе (забяспечвае) вырашэнне ў цывілізаваных формах у інтарэсах усёй супольнасці, асобных яе груп і індывідаў.

Дзяржава існуе ў трох формах, мае тры іпастасі свайго існавання.

Па-першае, дзяржаўна-арганізаванае грамадства першапачаткова фармуецца і доўгі час існуе ў форме асобнай публічнай улады, якая не супадае з інтарэсамі ўсяго насельніцтва. Наяўнасць дадзенай улады праяўляецца ў наяўнасці асобай групы людзей, якія займаюцца толькі тым, што ажыццяўляюць асобную публічную ўладу. Наяўнасць дадзенай улады не дарэмна лічыцца самай істотнай прыметай дзяржавы. Без яе дзяржава ўвогуле існаваць не можа. І не дарэмна некаторыя навукоўцы вызначаюць сутнасць дзяржавы ў якасці асобнага публічна-прававога саюза, падкрэсліваючы, што самай істотнай рысай дзяржавы з'яўляецца асобная публічная ўлада.

Па-другое, існаванне асобнай публічнай улады, якая выдзелілася з грамадства, стала асобным відам грамадска-карыснай працы і ўвасобілася ў асобнай групе прафесійных кіраўнікоў, што асэнсоўваецца ў грамадскай свядомасці як непазбежны і патрэбны для грамадства факт у форме палітычнай свядомасці. Асэнсаванне прыроды асобнай публічнай улады і яе прызначэння ў жыцці грамадства – непазбежная і заканамерная форма існавання дзяржаўнай улады.

Па-трэцяе, асобная публічная ўлада, якая ажыццяўляецца асобнай групай прафесійных кіраўнікоў і асэнсоўваецца ў якасці заканамернага і непазбежнага факта існавання грамадства ва ўмовах яго сацыяльнай неаднароднасці, арганізоўваецца і знаходзіць свае «матэрыяльнае» ўвасабленне ў сістэме органаў і ўстаноў. Дадзеная форма існавання дзяржавы сведчыць аб тым, што яна набывае цалкам завершаны выгляд, цывілізаваную форму існавання.

Самыя першасныя дзяржаўныя ўтварэнні, ці тыя дзяржаўныя ўтварэнні, якія складваюцца на рэштках разбураных дзяржаў, не выпадкова называюцца варварскімі дзяржавамі, напрыклад, варварскія каралеўствы, якія ўзніклі на рэштках Рымскай імперыі, бо на самых першасных этапах свайго існавання яны маюць толькі

самую першасную форму існавання і праяўлення дзяржавы – асобны слой людзей, прафесійных кіраўнікоў, якія выконваюць асобную публічную ўладу. Можна разбурыць апарат, можна дэфармаваць палітычную свядомасць, але дзяржава як асобная сацыяльная рэчаіснасць будзе існаваць, праўда, у варварскім выглядзе. Але вось калі не існуе асобнай публічнай улады, якая ўвасабляецца ў асобнай групе людзей, не існуе і дзяржавы.

Далейшая логіка лекцыйнага курса заснавана на паслядоўным выкладанні і вывучэнні трох акрэсленых форм існавання дзяржавы. Пасля вызначэння сутнасці дзяржавы разглядаецца парадак арганізацыі асобнай публічнай улады. Гэта праблематыка разглядаецца ў тэме аб форме дзяржавы. Затым у тэме аб функцыях дзяржавы асвятляюцца праблемы функцыянавання дзяржавы і вывучаецца яе ўздзеянне на грамадства. І, нарэшце, у тэме аб апараце (механізме) дзяржавы ажыццяўляецца аналіз трэцяй формы яе існавання, яе матэрыяльнага ўвасаблення. Палітычная свядомасць і палітычная навука ў сучасных вучэбных планах і вучэбных праграмах па падрыхтоўцы спецыялістаў-юрыстаў вывучаюцца ў межах асобнай вучэбнай дысцыпліны – паліталогіі.

2. Улада сацыяльная, палітычная і дзяржаўная. Прыметы дзяржаўнай улады (дзяржавы), якія адрозніваюць яе ад іншых відаў палітычнай улады

Сацыяльная ўлада з'яўляецца атрыбутам функцыянавання чалавечай супольнасці ва ўсе часы яе існавання. Сацыяльная ўлада – неабходная ўмова арганізацыі жыццядзейнасці грамадства і вельмі важны сродак забеспячэння яго адзінства, цэласнасці і самаразвіцця. Сутнасць і арганізацыя сацыяльнай ўлады заўсёды адэкватны зместу эканамічнай і сацыяльнай структур грамадства. З пераменамі ў гэтых сферах існавання чалавечай супольнасці мяняюцца арганізацыя і змест сацыяльнай улады. У сваю чаргу сацыяльная ўлада аказвае значны ўплыў на арганізацыю і функцыянаванне эканамічнай і сацыяльнай структур чалавечай супольнасці.

Станаўленне дзяржаўна-арганізаванага грамадства суправаджалася прынцыповымі зменамі ў сутнасці і арганізацыі сацыяльнай улады. У сацыяльна неаднародным грамадстве сацыяльная ўлада надалей не ў стане адлюстроўваць і забяспечваць у роўнай ступені інтарэсы ўсёй супольнасці, яна трансфармавалася ў публічную ўладу, якая не супадае з інтарэсамі ўсёй супольнасці. Асобная публічная ўлада выдзелілася з супольнасці ў якасна самастойны

від грамадска карыснай працы, чалавечай дзейнасці. Калі ў першабытным грамадстве сацыяльная ўлада супадала з насельніцтвам, то ў дзяржаўна-арганізаваным грамадстве яна ўзвышаецца над насельніцтвам. Узвышэнне асобнай публічнай улады над грамадствам азначае, што інтарэсы супольнасці і асобнай публічнай улады надалей ніколі не могуць быць тоеснымі.

У сацыяльна неаднародным грамадстве асобная публічная ўлада набыла такую якасць, якую можна абазначыць тэрмінам «палітычная». Асобную публічную ўладу называюць уладай палітычнай таму, што ў сваёй дзейнасці яна вымушана ўлічваць існуючыя ў грамадстве разнастайныя інтарэсы розных груп чалавечай супольнасці, узважваць гэтыя інтарэсы, прымаць іх пад увагу, прымаць на іх падставе агульнаабавязковыя для ўсёй супольнасці рашэнні. Сэнс палітычнасці, з'ява палітычнасці, такім чынам, зводзіцца да таго, што рашэнні асобнай публічнай улады ні тэарэтычна, ні практычна не могуць адпавядаць інтарэсам усіх існуючых у грамадстве сацыяльных груп.

Барацьба асобных слаёў насельніцтва за валоданне асобнай публічнай уладай называецца палітычнай барацьбой. Тая група насельніцтва, якая валодае асобнай публічнай уладай, мае магчымасць надаць сваім інтарэсам агульнаабавязковае значэнне і наўпрост праз дзейнасць асобнай публічнай улады, асабліва матэрыялізаванай яе часткі, забяспечыць рэалізацыю сваіх інтарэсаў у грамадскіх адносінах. У сучасных дзяржавах барацьба за валоданне асобнай публічнай уладай ажыццяўляецца ў разнастайных формах, шляхам стварэння палітычных партый, іншых аб'яднанняў і арганізацый палітычнага характару, суправаджаецца арганізацыяй і правядзеннем палітычных кампаній, выбараў і г. д.

Такім чынам, ва ўмовах сацыяльна неаднароднага грамадства сацыяльная ўлада мяняецца, ускладняецца. З'яўленне асобнай публічнай улады не азначае, што, акрамя яе, у грамадстве больш не існуе ніякіх іншых праяў сацыяльнай улады. Наадварот, падобна таму, як пры з'яўленні права, адбыўся распад монанарматыўнай сістэмы рэгулявання грамадскіх адносін на асобныя, адносна самастойныя віды правілаў паводзін, і ўзвышэнне права над усімі астатнімі відамі нарматыўных рэгулятараў, пераўтварэнне яго ў нарматыўны рэгулятар інтэгратыўнага характару, гэтаксама і пры з'яўленні асобнай публічнай улады адбылася дыферэнцыяцыя сістэмы сацыяльнага кіравання і ўлады. Асобная публічная ўлада вылучылася на першыя ролі ў сацыяльным кіраванні, пачала выконваць інтэгратыўныя функцыі адносна іншых праяў сацыяльнай

улады. Асобная публічная ўлада не ў стане замяніць сабой сацыяльную ўладу ў грамадстве цалкам. Яна сама з'яўляецца толькі адной з праяў сацыяльнай улады, дакладней, адной з самых важных праяў сацыяльнай улады. Іншыя праявы, іншыя віды сацыяльнай улады, напрыклад, улады бацькоўскай, родавай, пляменнай і г. д., уздзейнічаюць на асобную публічную ўладу, але знаходзяцца адносна яе ў падначаленым стане.

Пры распадзе сацыяльнай улады, якая была адзінай уладай першабытнага грамадства і супадала з насельніцтвам, на яе месцы фармуюцца розныя віды сацыяльнай улады. Гэтыя віды сацыяльнай улады ўсе разам і кожны паасобку не супадаюць з інтарэсамі тых сацыяльных груп, ад імя якіх яны дзейнічаюць. Іншымі словамі, усе віды сацыяльнай улады ў сацыяльна неаднародным грамадстве з'яўляюцца афіцыйнымі, публічнымі відамі ўлады. І толькі адзін з відаў публічнай улады, які з'явіўся ў сацыяльна неаднародным грамадстве, з'яўляецца асобнай публічнай уладай.

Асобная публічная ўлада ў дзяржаўна-арганізаваным грамадстве называецца дзяржаўнай уладай. Дзяржаўная ўлада адрозніваецца ад іншых відаў, форм сацыяльнай улады ў дзяржаўна-арганізаваным грамадстве наступнымі прыметамі (рысамі):

1) дзяржаўная ўлада з'яўляецца адзінай уладай, якая выступае ад імя ўсёй супольнасці, прэзентуе ўсю супольнасць, незалежна ад жаданняў асобных груп насельніцтва і асобных грамадзян. Сучасная дзяржаўная ўлада атрымлівае такія «паўнамоцтвы» шляхам легітымацыі і легалізацыі, г. зн. перыядычнага пераабрання насельніцтвам на падставе норм дзеючага права;

2) дзяржаўная ўлада адрозніваецца ад іншых відаў улады ў дзяржаўна- арганізаваным грамадстве тым, што яна манапольна валодае і распараджаецца асобным спецыфічным апаратам кіравання і прымусу – армія, паліцыя, выведка, контрвыведка, турмы і г. д. Імкненне іншых відаў сацыяльнай улады стварыць аналагічныя сродкі кіравання і ажыццяўлення ўлады недапушчальна, гэта жорстка караецца дзяржаўнай уладай;

3) дзяржаўная ўлада, у адрозненне ад іншых відаў улады, манапольна валодае магчымасцю фармуляваць і выдаваць абавязковыя для ўсяго грамадства правілы паводзін (законы і іншыя віды крыніц права) і з дапамогай асобнага апарату кіравання і прымусу забяспечваць выкананне норм дзеючага права на тэрыторыі ўсёй дзяржавы і адносна ўсіх удзельнікаў грамадскіх адносін незалежна ад іх жадання;

4) дзяржаўная ўлада мае такую якасную ўласцівасць, якая завецца суверэнітэтам. Пад суверэнітэтам дзяржаўнай улады можна разумець абсалютнае вяршэнства дзяржаўнай улады над іншымі відамі сацыяльнай улады ў грамадстве ўнутры пэўнай краіны, самастойнасць дзяржаўнай улады пры вызначэнні ўнутранай і знешняй палітыкі і незалежнасць дзяржаўнай ўлады пры прыняцці рашэнняў ад дзяржаўнай улады, якая ўласціва іншым дзяржаўна-ўладным утварэнням.

Вышэйакрэсленыя прыметы дазваляюць адмежаваць дзяржаўную (асобную публічную) уладу ад іншых праяваў сацыяльнай (публічнай) улады, якія суіснуюць адначасова, на адной і той жа тэрыторыі, у адным і тым жа дзяржаўна-арганізаваным грамадстве. Гэта трэба мець на ўвазе і не блытаць дадзеныя прыметы дзяржавы, што вельмі часта робіцца ў сучаснай вучэбнай літаратуры, з тымі прыметамі дзяржаўна-арганізаванага грамадства, якія дазваляюць дакладна акрэсліць яго адметнасці ў параўнанні з першабытным грамадствам і той уладай, якая існавала ў ім, правесці «гістарычныя межы» паміж першабытным і дзяржаўна-арганізаваным грамадствам.

Як вядома, для ўлады характэрна наяўнасць двух шчыльна ўзаемазвязаных кампанентаў (элементаў). Па-першае, улада фармулюе мэты і задачы развіцця, выяўляе пэўныя памкненні па развіццю ў пэўным кірунку (волю). Па-другое, улада заўсёды валодае пэўнымі сродкамі дасягнення мэтаў і вырашэння задач. Сродкамі ўлады могуць быць разнастайныя матэрыяльна-фінансавыя рэсурсы, духоўныя каштоўнасці, сацыяльныя групы насельніцтва, іх арганізацыі, з дапамогай якіх улада дасягае сваіх мэтаў і вырашае пэўныя задачы. Кожны від сацыяльнай улады валодае сваімі адметнымі сродкамі дасягнення мэтаў і вырашэння задач і кожны з відаў сацыяльнай улады фармулюе свае адметныя мэты і задачы, якія адпавядаюць прыродзе і характару ўлады. Напрыклад, бацькоўская ўлада не можа абапірацца на сродкі прымусу, якімі карыстаецца дзяржаўная ўлада.

У навуковай і вучэбнай юрыдычнай літаратуры выкарыстоўваюцца два шчыльна ўзаемазвязаныя паняцці, якія вельмі часта прымяняюцца як сінонімы – паняцце (тэрмін) дзяржаўнай улады і паняцце (тэрмін) дзяржавы. Але кожнае з гэтых паняццяў мае сваю спецыфіку, таму варта высветліць сітуацыю. Паколькі, як нам вядома, асобная публічная ўлада (дзяржаўная ўлада) у канцэнтраваным выглядзе прадстаўляе ўсё дзяржаўна-арганізаванае грамадства, то мы маем права паставіць знак роўнасці ці нават тоеснасці паміж

дзяржаўнай уладай і дзяржавай. Пры гэтым, калі мы ўжываем паняцце «дзяржаўная ўлада», то акцэнт увагі пераносіцца на тое, што дзяржаўная ўлада ёсць неад'емная функцыя, атрыбут грамадства, а калі мы ўжываем паняцце «дзяржава», то акцэнт увагі пераносіцца на характар арганізацыі і дзейнасці дзяржаўнай улады. Такім чынам, паняцці «дзяржаўная ўлада» і «дзяржава» суадносяцца між сабой як функцыя і сродак ажыццяўлення функцыі. Дзяржава ў такім разе з'яўляецца матэрыяльным увасабленнем дзяржаўнай улады. Дзяржаўная ўлада без свайго матэрыяльнага ўвасаблення існаваць не можа, а дзяржава без дзяржаўнай улады страчвае мэты і задачы свайго існавання і мэтанакіраванасць у развіцці.

3. Тыпалогія (класіфікацыя) развіцця дзяржаўнасці

Юрыдычная навука пры вывучэнні свайго аб'екта і прадмета даследавання вельмі актыўна выкарыстоўвае такія прыёмы і метады, як сістэматызацыя, класіфікацыя, тыпалогія і г. д. Шляхам падзелу дзяржаўна-прававыях з'яў і рэальнасцяў на асобныя групы, класы, сем'і можна, па-першае, атрымаць дадатковыя веды аб вывучаемых з'явах і рэальнасцях, па- другое, сістэматызаваць існуючыя веды аб дзяржаўна-арганізаваным грамадстве, а, па-трэцяе, выкласці вынікі даследаванняў у лагічнай і добра зразумелай паслядоўнасці. Тыпалогія дзяржаўнасці – такі спосаб, шлях вывучэння дзяржаўна-арганізаванага грамадства, які дазваляе адначасова вывучыць самыя розныя сувязі дзяржавы (асобнай публічнай улады) з іншымі праявамі, бакамі грамадскага жыцця, бо ажыццяўляе сістэматызацыю гістарычных і зараз існуючых дзяржаўных утварэнняў адразу па некалькіх параметрах (крытэрыях). Але самае галоўнае, што яна дазваляе канкрэтызаваць сутнасць дзяржавы. У канкрэтна гістарычных каардынатах высвятляюцца найбольш яскрава ўсе праявы і ўсе накірункі вырашэння дзяржаўнай уладай як агульнасацыяльных задач, так і вырашэння вузкакласавых праблем.

У агульнай тэорыі права найбольш пашыранымі тыпалогіямі дзяржаўнасці з'яўляюцца фармацыйная, цывілізацыйная і асабіста прававая.

Фармацыйная тыпалогія дзяржаўнасці заснавана на вучэнні аб грамадска-эканамічных фармацыях. Згодна з гэтым вучэннем у сваім развіцці грамадства праходзіць шэраг фаз (этапаў), якія называюцца грамадска-эканамічнымі фармацыямі. У падмурку кожнай фармацыі знаходзяцца яго эканамічная сістэма і перш-наперш форма ўласнасці на сродкі вытворчасці і матэрыяльныя каштоў-

насці. Менавіта ўласнасцю на сродкі вытворчасці вызначаюцца змест і характар эканамічнай сістэмы, сацыяльнага ладу і палітычнай улады, якія ўласцівы грамадству на пэўным этапе яго развіцця. Змена форм уласнаці прыводзіць да істотных пераменаў у эканамічнай сістэме грамадства і ва ўсіх астатніх яго сістэмах.

Кожнай грамадска-эканамічнай фармацыі ўласціва і свая дзяржаўнасць. Змест і характар дзяржаўнай улады, якая ўласціва грамадска-эканамічнай фармацыі, вызначаюцца эканамічна пануючымі групамі насельніцтва. Для рабаўладальніцкай грамадска-эканамічнай фармацыі характэрна, што эканамічна пануючай групай насельніцтва з'яўляюцца рабаўладальнікі, а таму менавіта іх воля найперш і знаходзіць адлюстраванне і ўвасабленне ў дзяржаўнай уладзе. У нетрах старой грамадска-эканамічнай фармацыі зараджаецца, а затым і атрымлівае развіццё якасна новая форма ўласнасці на сродкі вытворчасці. На падставе гэтай формы ўласнасці складваецца якасна новая эканамічная сістэма, якая заканамерна абумоўлівае трансфармацыю і ва ўсіх астатніх сферах жыцця грамадства. Узнікненне новай грамадска-эканамічнай фармацыі суправаджаецца фармаваннем і якасна новага тыпу дзяржаўнасці. Пры пераходзе ад адной грамадска-эканамічнай фармацыі да другой дзяржаўная ўлада выкарыстоўваецца ў якасці адной з рашаючых сілаў сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў.

Фармацыйная тыпалогія дзяржаўнасці вызначае месца і ролю дзяржавы найперш адносна эканамічнай сістэмы грамадска-эканамічнай фармацыі і яе асноўных форм уласнасці на сродкі вытворчасці, акрэслівае тыя сацыяльныя групы насельніцтва, воля якіх найперш і ажыццяўляецца праз дзяржаўную ўладу, а таксама паказвае ролю дзяржавы ў пераходзе ад адной да другой грамадска-эканамічнай фармацыі.

Адной з дактрынальных традыцый заходнееўрапейскай палітыка-прававой думкі з'яўляецца цывілізацыйная тыпалогія дзяржаўнасці, якая дазваляе вызначыць своеасаблівыя вектары ў развіцці дзяржаўнасці і этапы развіцця дзяржавы. Адным з тэарэтыка-метадалагічных падыходаў у цывілізацыйнай тыпалогіі дзяржаўнасці стала вучэнне Г.В.Ф. Гегеля аб самаразвіцці абсалютнага духа, які пачынае свае шэсце ў свеце на Усходзе і завяршае яго ў сучаснай нямецкаму філосафу Германіі. Кожнай фазе самаразвіцця абсалютнага духа, на думку распрацоўшчыкаў тэорыі цывілізацыі, адпавядае той ці іншы від цывілізацыі чалавека. Для цывілізацыі характэрныя прыродныя (геаграфічныя і кліматычныя) характарыстыкі, свой адметны ўзровень і характар духоўнага жыцця, культуры, рэлігіі, свае этнічныя, моўныя і іншыя асаблівасці.

Адным з важных элементаў цывілізацыі з'яўляецца дзяржава, асобная публічная ўлада, якая, з аднаго боку, вызначаецца характарам усёй цывілізацыі, да якой яна належыць, а, з другога боку, сама аказвае значны ўплыў на ўсе праявы жыцця цывілізацыі. Такім чынам, у параўнанні з фармацыйнай тыпалогіяй, дзе змест і характар дзяржаўнай улады вызначаецца «адналінейна», залежыць ад формы ўласнасці і волі эканамічна пануючых груп насельніцтва, цывілізацыйная тыпалогія дзяржаўнасці заснавана на «шматфактарным аналізе». На змест і характар улады ўплываюць усе адметныя асаблівасці пэўнай цывілізацыі, прычым памер іх уплыву можа мяняцца з цягам часу. На жаль, сярод навукоўцаў не існуе адзінства ў разуменні цывілізацыі, зместу і колькасці цывілізацыйных утварэнняў, а таму не існуе і аднастайнасці ў выдзяленні пэўных тыпаў дзяржаўнасці на падставе пэўных цывілізацый.

Было слушна заўважана, што ні фармацыйная, ні цывілізацыйная тыпалогія развіцця дзяржаўнасці не паказваюць месца і ролі асобы ў жыццядзейнасці дзяржавы. Таму была распрацавана асабіста-прававая тыпалогія дзяржаўнасці. Яна заснавана на вучэнні аб магчымасці ўплыву асобы на дзяржаву, на змест і характар дзяржаўнай улады. Калі асоба мае дакладна акрэсленыя прававыя магчымасці ўплыву на змест і характар дзяржаўнай улады, на правапарадак грамадства, то такія дзяржаўныя ўтварэнні мінулага і сучаснасці называюцца дэмакратычнымі дзяржавамі. Калі ж у асобы не існуе прававых магчымасцей уплыву на змест і характар дзяржаўнай улады, на фармаванне яго правапарадку, калі асоба не з'яўляецца суб'ектам, а толькі аб'ектам уздзеяння з боку дзяржаўнай улады, то такія дзяржаўныя утварэнні называюцца недэмакратычнымі.

Пытанні для самаправеркі

1. Калі з'явілася сацыяльная ўлада ў грамадстве?
2. Раскрыйце змест этымалагічнага падыходу да вызначэння сутнасці дзяржавы.
3. Якія з прымет (уласцівасцей) дзяржавы былі вызначаны пераважна эмпірычным шляхам?
4. Чаму асобная публічная ўлада ў канцэнтраванай форме адлюстроўвае змест і характар дзяржаўна-арганізаванага грамадства?
5. Якія з вырашаемых дзяржавай задач з'яўляюцца агульнасацыяльнымі задачамі? Раскрыйце іх змест.
6. Якія з задач, што вырашае асобная публічная улада, з'яўляюцца «вузкакласавымі задачамі»? Раскрыйце іх змест.

7. Як суадносяцца паміж сабой агульнасацыяльныя і «вузкакласавыя задачы», якія даводзіцца вырашаць дзяржаве?

8. Калі ў грамадстве з'явілася асобная публічная ўлада, чым яна адрозніваецца ад іншых відаў сацыяльнай улады?

9. Якім чынам суадносяцца паміж сабой паняцці асобнай публічнай улады і дзяржаўнай улады?

10. Раскрыйце змест палітычнасці асобнай публічнай улады.

11. Якімі прыметамі дзяржаўная ўлада адрозніваецца ад іншых відаў сацыяльнай улады?

12. Прааналізуйце суадносіны паміж дзяржаўнай уладай і дзяржавай.

13. Раскрыйце змест легітымнасці і легальнасці дзяржаўнай улады.

14. Правядзіце супастаўляльны аналіз такіх метадаў і сродкаў даследавання дзяржаўнасці, як сістэматызацыя, класіфікацыя і тыпалогія.

15. Раскрыйце змест фармацыйнай тыпалогіі развіцця дзяржаўнасці.

16. У чым Вы бачыце спецыфіку цывілізацыйнай тыпалогіі развіцця дзяржаўнасці?

17. Раскрыйце змест асабіста-прававой тыпалогіі развіцця дзяржаўнасці.

Тэма 6. ФОРМА ДЗЯРЖАВЫ

1. Паняцце і азначэнне формы дзяржавы.
2. Форма праўлення.
3. Форма дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання.
4. Дзяржаўна-прававы рэжым.
5. Суадносіны тыпу і формы дзяржавы.

1. Паняцце і азначэнне формы дзяржавы

Дзяржаўная ўлада (альбо дзяржава), як мы ведаем, уяўляе сабой самастойную функцыю грамадства, якое заснавана на маёмаснай няроўнасці. Дадзеная функцыя ўяўляе сабой якасна самастойны від грамадска-карыснай працы. Вынікамі гэтай грамадска-карыснай працы з'яўляюцца разнастайныя паслугі грамадству ў выглядзе (у форме) рашэнняў і вяленняў, адрасаваных грамадству, удзельнікам грамадскіх адносін, з дапамогай якіх грамадства захоўвае сваю цэласнасць і здольнасць да самаразвіцця. Дадзеная функцыя (дзяржаўная ўлада) знаходзіць сваё знешняе ўвасабленне, «матэрыялізацыю», па-першае, у тых людзях, якія ажыццяўляюць дзяржаўную ўладу. Прырода дзяржаўнай улады патрабуе выдзялення са складу супольнасці асобнай групы людзей, якія б займа-

ліся выключна выкананнем спраў па кіраўніцтву супольнасцю. Па-другое, дзяржаўную ўладу ажыццяўляюць створаныя ў грамадстве спецыяльныя органы, арганізацыі і ўстановы, якія надзяляюцца ўладнымі паўнамоцтвамі дзеля належнага і эфектыўнага выканання дзяржаўнай уладай свайго прызначэння ў жыцці грамадства.

Грамадства заўсёды было зацікаўлена ў тым, каб дзяржаўная ўлада была арганізавана належным чынам, бо толькі пры гэтай умове яна ў стане аказваць выніковае ўздзеянне на грамадства. Эфектыўнае ўздзеянне дзяржаўнай улады на грамадства прадвызначаецца шматлікімі фактарамі: станам эканамічнага жыцця і дабрабытам насельніцтва, прыроднымі (кліматычнымі і геаграфічнымі) умовамі, у якіх функцыянуе дзяржаўная ўлада, узроўнем разумення прыроды і магчымасцей дзяржаўнай улады, узроўнем падрыхтаванасці да кіраўнічай працы асобнай групы людзей і г. д. Але найперш эфектыўнасць функцыянавання дзяржаўнай улады вызначаецца тым, як арганізавана сама дзяржаўная ўлада, наколькі эфектыўнымі і выніковымі з'яўляюцца шматлікія сувязі, што складваюцца паміж органамі, арганізацыямі і ўстановамі дзяржавы, паміж гэтымі матэрыяльнымі ўвасабленнямі дзяржаўнай улады і насельніцтвам, ад імя якога дзейнічае дзяржаўная ўлада і дзеля задавальнення інтарэсаў якога яна функцыянуе. Дзяржаўная ўлада ўжывае ў ходзе свайго функцыянавання сістэму прыёмаў і метадаў уздзеяння на грамадства, якія таксама шмат у чым прадвызначаюць эфектыўнае дзеянне дзяржаўнай улады.

У юрыдычнай навуцы дзеля раскрыцця заканамернасцей арганізацыі дзяржаўнай улады выкарыстоўваецца шлях, пры якім трэба адказаць на тры наступныя групы пытанняў:

1) як, у якім парадку арганізавана вярхоўная дзяржаўная ўлада; як ствараюцца органы, якія ажыццяўляюць вярхоўную дзяржаўную ўладу; якім чынам органы, што ажыццяўляюць вярхоўную дзяржаўную ўладу, суадносяцца між сабой; які ўплыў аказвае насельніцтва на фармаванне гэтых органаў;

2) як, якім чынам і ў якім парадку рашэнні (вяленні) вярхоўнай дзяржаўнай улады даводзяцца да насельніцтва; якія органы ўлады на тэрыторыі дзяржавы, на месцах рэалізуюць рашэнні вярхоўнай улады; валодаюць ці не валодаюць мясцовыя органы ўлады нейкімі суверэннымі паўнамоцтвамі;

3) якія сродкі і прыёмы выкарыстоўвае вярхоўная дзяржаўная ўлада і, адпаведна, дзяржаўная ўлада на месцах пры прыняцці нейкіх рашэнняў і правядзенні гэтых рашэнняў у жыццё.

Для адказу на гэтыя пытанні ў юрыдычнай навуцы была распрацавана катэгорыя формы дзяржавы, якая ўключае ў сябе тры шчыльна ўзаемазвязаныя паняцці – «форма праўлення», «форма дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання», «дзяржаўна-прававы рэжым». Кожнае з адзначаных паняццяў характарызуе тыя ці іншыя ўласцівасці, якасці, заканамернасці ў арганізацыі дзяржаўнай улады. Паняцце формы праўлення скіравана галоўным чынам на характарыстыку арганізацыі вярхоўнай дзяржаўнай улады, на тое, каб ахарактарызаваць структуру вышэйшых органаў улады, іх узаемадзеянне паміж сабой і высветліць характар сувязей вярхоўнай дзяржаўнай улады з насельніцтвам.

Паняцце формы дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання галоўным чынам скіравана на тое, каб паказаць характар арганізацыі і працэс ажыццяўлення дзяржаўнай улады на тэрыторыі краіны праз высвятленне парадку арганізацыі мясцовых органаў улады і кіравання ў адміністрацыйна- тэрытарыяльных адзінках, праз характарыстыку ўзаемасувязей паміж вярхоўнай уладай і органамі мясцовай улады. Паняцце дзяржаўна-прававога рэжыму галоўным чынам скіравана на тое, каб вывучыць узаемаадносіны паміж дзяржаўнай уладай і насельніцтвам, ад імя якога дзяржаўная ўлада дзейнічае і адносна якога прымае шматлікія рашэнні і вяленні. Прычым пры характарыстыцы дзяржаўна-прававога рэжыму размова ідзе аб узаемаадносінах паміж усёй дзяржаўнай уладай і насельніцтвам, а не толькі ўзаемаадносінах паміж вярхоўнай дзяржаўнай уладай і насельніцтвам, як гэта мае месца пры даследаванні формы праўлення.

Такім чынам, сутнасць дзяржавы (асобнай публічнай улады) зводзіцца да прызначэння дзяржаўнай улады ў жыцці грамадства. Сутнасць дзяржавы ў тым, што ва ўмовах сацыяльна неаднароднага грамадства дзяржава з'яўляецца адзіна магчымай сілай (арганізацыяй, інстытутам), якая вырастае з супярэчнасцей грамадства, знаходзіцца над імі, утрымлівае іх і гарантуе (забяспечвае) вырашэнне ў цывілізаваных формах. Форма ж дзяржавы паказвае, як арганізавана гэтая адзіна магчымая сіла ў сацыяльна неаднародным грамадстве, як яна ўздзейнічае на грамадства, як выконвае сваё прызначэнне на тэрыторыі грамадства ў адносінах да ўсіх удзельнікаў грамадскіх адносін.

2. Форма праўлення

У юрыдычнай навуцы лічыцца, што першыя спробы сістэматычнага, паслядоўнага фармулявання эфектыўных і разумных спосабаў арганізацыі вярхоўнай улады (форм праўлення) былі зроблены Арыстоцелем і Палібіем. Абапіраючыся на дасканала вывучаны вопыт арганізацыі ўлады ў шматлікіх грэчаскіх дзяржавахполісах, знакаміты грэчаскі вучоны прыйшоў да высновы аб тым, што вярхоўная дзяржаўная ўлада можа ажыццяўляцца трыма спосабамі. Увесь аб'ём уладных паўнамоцтваў, якія належаць вярхоўнай дзяржаўнай уладзе, можа быць сканцэнтраваны ў руках адной асобы і ажыццяўляцца адной асобай, ён можа быць засяроджаны, сканцэнтраваны ў руках некалькіх асоб і ажыццяўляцца імі, і, нарэшце, увесь аб'ём вярхоўнай дзяржаўнай улады можа быць сканцэнтраваны ў руках палітычна актыўнай, свядомай часткі насельніцтва і ажыццяўляцца ёю.

Першы спосаб ажыццяўлення вярхоўнай дзяржаўнай улады называецца манархіяй, другі – арыстакратыяй, трэці – паліцыяй. Кожны з гэтых спосабаў з'яўляецца правільным спосабам. Але пры пэўных умовах правільныя спосабы ажыццяўлення вярхоўнай дзяржаўнай улады трансфармуюцца ў няправільныя. Да няправільных спосабаў ажыццяўлення вярхоўнай дзяржаўнай улады адносяцца тыранія, алігархія, дэмакратыя. Пры гэтым манархія трансфармуецца ў тыранію, арыстакратыя – у алігархію, а паліцыя – у дэмакратыю. Перараджэнне правільных форм праўлення ў няправільныя адбываецца пасля таго, як вярхоўная дзяржаўная ўлада пачынае выкарыстоўвацца не па свайму прызначэнню, а ў асабістых мэтах тых, хто яе ажыццяўляе.

Прыкладна да XIX ст. вучэнне аб спосабах (формах) арганізацыі вярхоўнай дзяржаўнай улады заставалася практычна нязменным. І.-К. Блюнчлі, адзін з распрацоўшчыкаў арганічнай тэорыі паходжання дзяржавы і права, прапанаваў выдзеліць у якасці самастойнай формы праўлення тэакратыю, пад якой можна разумець такую форму арганізацыі вярхоўнай дзяржаўнай улады, якая заўсёды абапіраецца на нейкае свяшчэннае пісанне. Прычым тэакратычнымі могуць быць і манархія, і арыстакратыя, і паліцыя. Р. Фон Моль у першай трэці XIX ст. прапанаваў дапоўніць вышэйазначаную класіфікацыю форм праўлення такой формай, як прававая дзяржава.

Сучасная юрыдычная навука пры характарыстыцы вярхоўнай дзяржаўнай улады і форм яе ажыццяўлення звяртае ўвагу не толькі на колькасць асоб, якія ажыццяўляюць вярхоўную дзяржаўную

ўладу, але і на структуру органаў вярхоўнай дзяржаўнай улады, іх узаемаадносіны паміж сабой і з насельніцтвам. Часцей за ўсё выдзяляюць дзве формы праўлення – манархію і рэспубліку. Манархія пры гэтым уяўляе сабой такую форму арганізацыі вярхоўнай дзяржаўнай улады, пры якой, па-першае, увесь аб'ём вярхоўнай дзяржаўнай улады, як правіла, сканцэнтраваны ў руках адной асобы, і, па-другое, вярхоўная дзяржаўная ўлада, як правіла, перадаецца спадчынным шляхам. Пад рэспублікай разумеецца, па-першае, такая форма праўлення, такі спосаб арганізацыі вярхоўнай дзяржаўнай улады, пры якім яна ажыццяўляецца, як правіла, некалькімі органамі ўлады, пры гэтым адзін з іх абавязкова з'яўляецца прадстаўнічым, і, па-другое, органы вярхоўнай дзяржаўнай улады, як правіла, перыядычна пераабіраюцца насельніцтвам.

Як бачна, манархія і рэспубліка розняцца паміж сабой не толькі па колькасці асоб, якія ажыццяўляюць вярхоўную дзяржаўную ўладу, не толькі па колькасці органаў, якія ажыццяўляюць вярхоўную дзяржаўную ўладу, і не толькі па ўзаемаадносінах органаў вярхоўнай дзяржаўнай улады, якія «падзяляюць» паміж сабой увесь аб'ём вярхоўнай дзяржаўнай улады. Яны розняцца паміж сабой і па ўплыву насельніцтва на фармаванне вярхоўнай дзяржаўнай улады. Пры манархічнай форме праўлення ўплыў насельніцтва на фармаванне вярхоўнай дзяржаўнай улады, на вызначэнне складу органаў вярхоўнай дзяржаўнай улады, паўнаты і аб'ёму іх паўнамоцтваў, вызначэнне асноўных накірункаў унутранай і знешняй палітыкі невялікі ў параўнанні з рэспубліканскай формай праўлення. Сказанае не азначае, што па ступені ўплыву насельніцтва на вярхоўную дзяржаўную ўладу можна беспамылкова рабіць выснову аб сутнасці дзяржаўнай улады, аб тым, наколькі вярхоўная дзяржаўная ўлада адпавядае свайму прызначэнню.

Як манархічная, так і рэспубліканская формы праўлення не застаюцца нязменнымі. Гісторыі развіцця дзяржавы і права вядомы абсалютная і абмежаваная манархіі, канстытуцыйная манархія і саслоўна-прадстаўнічая. Па грамадска-эканамічных фармацыях выдзяляюць манархію рабаўладальніцкую, феадальную і буржуазную. У сваю чаргу існавалі рэспубліканская форма праўлення ва ўмовах рабаўладальніцкай грамадска-эканамічнай фармацыі, пры феадалізме і, безумоўна, пры капіталістычным ладзе.

У сучасным свеце вярхоўная дзяржаўная ўлада арганізуецца пераважна як рэспубліка, але не страціла свайго значэння і манархічная форма арганізацыі вярхоўнай дзяржаўнай улады. Праўда, абсалютная манархія ў якасці формы праўлення выкарыстоўваец-

ца ў сучасным свеце як выключэнне, а вось парламентарная манархія (манархія, якая абмежавана прадстаўнічым органам – парламентам) не такая і экзатычная з'ява. Рэспубліка ў якасці формы праўлення ў сучасным свеце – найбольш распаўсюджаная з'ява. Рэспубліка падзяляецца на парламентарную, прэзідэнцкую і змешаную. Асноўны фактар, які размяжоўвае парламентарную і прэзідэнцкую рэспубліку – парадак фармавання выканаўчай улады і найперш органа, які ўзначальвае ўсю вертыкаль выканаўчай улады – урада. Калі ўрад краіны фармуецца парламентам, то мы маем справу з парламентарнай рэспублікай. Калі ж урад краіны ствараецца прэзідэнтам краіны, то мы маем справу з прэзідэнцкай рэспублікай. Змешаная рэспубліка ўяўляе сабой такую мадэль фармавання ўрада краіны, калі ён ствараецца «на парытэтных» пачатках і парламентам, і прэзідэнтам краіны.

Рэспубліка Беларусь па форме праўлення згодна з адзначанай класіфікацыяй адносіцца да прэзідэнцкай рэспублікі. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь валодае рашаючымі паўнамоцтвамі па фармаванню выканаўчай улады ў краіне, моцнымі рычагамі ўздзеяння на ўсе самастойныя галіны ўлады і шырокімі паўнамоцтвамі кіраўніка краіны, якія дазваляюць каардынаваць дзейнасць усіх самастойных галін улады.

3. Форма дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання

У адрозненне ад формы праўлення, якая галоўным чынам характарызуе спосаб арганізацыі вярхоўнай улады, структуру органаў вярхоўнай улады і парадак іх узаемаадносін паміж сабой, форма дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання засяроджвае ўвагу на тым, як вярхоўная дзяржаўная ўлада дзейнічае, ажыццяўляецца на тэрыторыі краіны. У паняцце формы дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання ўваходзяць пытанні падзелу тэрыторыі дзяржавы на нейкія адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі, пытанні прававога становішча адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак у складзе тэрыторыі краіны, парадак фармавання і структура органаў кіравання і самакіравання ў гэтых адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках (мясцовых органах кіравання і самакіравання), а таксама парадак і характар перадачы вяленняў вярхоўнай дзяржаўнай улады мясцовым органам кіравання і самакіравання і насельніцтву дзяржавы.

Можна выдзеліць два спосабы ажыццяўлення вярхоўнай дзяржаўнай улады на тэрыторыі краіны: просты і складаны. Просты

спосаб ажыццяўлення вярхоўнай дзяржаўнай улады ў юрыдычнай навуцы атрымаў назву унітарнай формы дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання, складаны спосаб называецца федэратыўным спосабам дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання. Адпаведна і ўсе дзяржавы па спосабу ажыццяўлення вярхоўнай дзяржаўнай улады падзяляюцца на дзяржавы унітарныя і федэратыўныя.

Унітарнай дзяржаве характэрна наяўнасць адзіных для ўсёй краіны вышэйшых органаў улады і кіравання. Уся тэрыторыя дзяржавы пры гэтым падзяляецца на пэўныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі (губерні, паветы, воласці, землі, раёны і г. д.). Адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі аднаго і таго ж узроўню маюць аднолькавае прававое становішча ў дачыненнях паміж сабой і з вярхоўнай дзяржаўнай уладай. Яны не валодаюць прыметамі дзяржаўна-арганізаваных утварэнняў, не маюць права выйсця са складу дзяржавы.

Для унітарнай дзяржавы характэрна, што вяленні вярхоўнай дзяржаўнай улады наўпрост дзейнічаюць на тэрыторыі ўсёй краіны і распаўсюджваюцца на ўсе адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі ў аднолькавай меры. Просты спосаб ажыццяўлення вярхоўнай улады на тэрыторыі краіны з'яўляецца зручным і найбольш эфектыўным, бо вяленні вярхоўнай дзяржаўнай улады аднастайна і адначасна дзейнічаюць ва ўсёй краіне і тычацца ўсіх удзельнікаў грамадскіх адносін. Не дарэмна абсалютная большасць сучасных дзяржаўных утварэнняў выкарыстоўваюць просты шлях уладкавання вярхоўнай дзяржаўнай улады.

Але па цэламу шэрагу аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын вярхоўная дзяржаўная ўлада не можа ажыццяўляцца простым спосабам і функцыянаваць як унітарная. У межах тэрыторыі адной і той жа дзяржавы адначасова, як правіла, пражываюць розныя народы і нацыі, якія імкнуцца захаваць сваю самабытнасць і ідэнтычнасць. У склад дзяржавы могуць уключацца іншыя тэрыторыі, якія раней былі складанымі часткамі іншых дзяржаўных утварэнняў. Гэтыя і іншыя не менш значныя абставіны абумоўліваюць існаванне федэратыўнай формы дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання.

У самым агульным плане федэратыўная дзяржава характарызуецца тым, што паміж вярхоўнай дзяржаўнай уладай і мясцовымі органамі кіравання і самакіравання існуюць «дадатковыя», «прамежкавыя» органы ўлады і кіравання, якія выконваюць на пэўнай частцы тэрыторыі дзяржавы некаторыя паўнамоцтвы вярхоўнай дзяржаўнай улады. Зразумела, што ў гэтых умовах у складзе дзяржа-

вы існуюць адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі з розным прававым становішчам (статусам). Адны з іх наўпрост падпарадкоўваюцца вяленням вярхоўнай дзяржаўнай улады, а адносна іншых дзеўнічаюць вяленні не толькі адзінай для ўсёй краіны вярхоўнай дзяржаўнай улады, але і вяленні «дадатковых», «прамежкавых» органаў улады і кіравання. У навуковай юрыдычнай літаратуры слушна заўважаецца, што адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі з асобным прававым становішчам звычайна валодаюць пэўнымі элементамі, прыметамі дзяржаўна-арганізаваных супольнасцей, самастойных дзяржаўных утварэнняў. Не без уліку гэтых акалічнасцей часта федэратыўныя дзяржавы называюцца саюзнымі дзяржавамі, ці саюзамі дзяржаў. У асобных федэратыўных дзяржавах іх асобныя тэрытарыяльныя адзінкі (складаныя часткі) валодаюць правам выхаду са складу саюзнай дзяржавы.

Калі ўсе складаныя тэрытарыяльныя адзінкі федэратыўнай дзяржавы маюць аднолькавае прававое становішча і аднолькавае дачыненне да вярхоўнай дзяржаўнай улады, то мы маем справу з федэрацыяй сіметрычнай, калі ж тэрытарыяльныя адзінкі розняцца па свайму прававому становішчу і ў дачыненнях да вярхоўнай дзяржаўнай улады, то мы маем справу з федэрацыяй асіметрычнай. Федэрацыя, якая створана пад уздзеяннем нацыянальных імператываў, мае назву нацыянальнай федэрацыі. Федэрацыя, створаная пад уздзеяннем іншых імператываў, мае назву тэрытарыяльнай федэрацыі. У навуковай юрыдычнай літаратуры існуюць даследаванні, згодна з якімі федэрацыі падзяляюцца таксама на саюзныя і аўтаномныя.

Федэратыўная форма дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання – досыць пашыраны спосаб ажыццяўлення вярхоўнай дзяржаўнай улады ў сучасных краінах. Трэцяя частка ўсіх сучасных дзяржаў маюць федэратыўную форму дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання.

Сярод форм дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання называецца канфедэрацыя – саюз суверэнных дзяржаў, якія аб'ядналіся ў адзінае дзяржавападобнае ўтварэнне для дасягнення пэўных, як правіла, часовых мэт. Але ў такіх аб'яднанняў не існуе адзінай для «саюзнікаў» тэрыторыі. Кожная з «дзяржаў-саюзнікаў» мае сваю тэрыторыю і ажыццяўляе на ёй поўны дзяржаўны суверэнітэт. У такіх дзяржаўных утварэнняў адсутнічае і адзіная для «дзяржаў-саюзнікаў» вярхоўная дзяржаўная ўлада. А калі не існуе адзінай вярхоўнай дзяржаўнай улады і адзінай тэрыторыі, то аб якім спосабе ажыццяўлення вярхоўнай дзяржаўнай улады можна весці размову?

Канфедэратыўнай формы дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання не існуе. Канфедэрацыя, як правіла, уяўляе сабой міждзяржаўнае ўтварэнне, у падмурку якога ляжаць міжнародныя двухбаковыя ці шматбаковыя пагадненні суверэнных дзяржаў. Канфедэратыўныя ўтварэнні маюць, як правіла, часовы характар і пасля дасягнення агульнай для «дзяржаў-саюзнікаў» мэты распадаюцца. Прыкладамі могуць быць канфедэрацыі пад назвамі ААР (Аб'яднаная Арабская Рэспубліка) і Сенегамбія (Сенегал і Гамбія). Здараецца і адваротны працэс, калі канфедэратыўнае аб'яднанне трансфармуецца ў федэрацыю. Злучаныя штаты Амерыкі (ЗША) былі першапачаткова створаны як канфедэрацыя, але паступова трансфармаваліся ў федэратыўную дзяржаву.

У гісторыі форм дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання сустракаюцца сітуацыі, калі назва, нават афіцыйная, не адпавядае фактычнаму зместу дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання. Швейцарыя, напрыклад, афіцыйна лічыцца канфедэрацыяй, хаця фактычна з'яўляецца класічнай федэрацыяй, заснаванай на нацыянальных пачатках.

4. Дзяржаўна-прававы рэжым

Паняцце дзяржаўна-прававога рэжыму скіравана на характарыстыку ўзаемаадносін паміж дзяржаўнай уладай і насельніцтвам, а таксама паміж дзяржаўнай уладай і іншымі ўдзельнікамі грамадскіх адносін. Дзяржаўна-прававы рэжым характарызуе механізм уплыву дзяржаўнай улады на грамадства і механізм уздзеяння грамадства на дзяржаўную ўладу. Вузлавы момант у разуменні дзяржаўна-прававога рэжыму – тыя механізмы, сродкі і прыёмы, праз якія і з дапамогай якіх функцыянуе дзяржаўная ўлада і адбываецца ўздзеянне насельніцтва на дзяржаўную ўладу, як вярхоўную дзяржаўную ўладу, так і мясцовую ўладу. Для дзяржаўна-прававога рэжыму характэрна, што дзяржаўная ўлада пры ўздзеянні на грамадства выкарыстоўвае выключна прававыя сродкі і прыёмы.

У сваю чаргу ўплыў грамадства і асобы на дзяржаўную ўладу можа адбывацца не толькі праз права, яго механізмы, метады і прыёмы. Удзельнікі грамадскіх адносін маюць магчымасць уздзейнічаць на дзяржаўную ўладу такімі прыёмамі і сродкамі палітычнага, маральнага, ідэалагічнага характару, якія не замацаваны ў праве, але якія не супярэчаць дзеючаму праву і закону. Іншымі словамі, тут мы сустракаемся з дзеяннем адной з прававых аксіём, згодна з якой «дазволена ўсё, што наўпрост не забаронена». У сваю чаргу,

«прававое становішча» дзяржаўнай улады ва ўзаемадачыненнях з насельніцтвам і іншымі ўдзельнікамі грамадскіх адносін дакладна і аднастайна акрэслена дзеючым правам і законам. Дзяржаўная ўлада мае права выкарыстоўваць толькі такія механізмы, метады і прыёмы, якія дакладна замацаваны ў дзеючым праве. Тут дзейнічае прававая аксіёма іншага зместу – «дазволена толькі тое, што наўпрост дазволена».

Такая «асіметрыя» ў змесце і характары механізмаў, метадаў і прыёмаў узаемадзеяння і ўзаемаўплыву дзяржаўнай улады і насельніцтва, іншых удзельнікаў грамадскіх адносін скіравана на забеспячэнне цывілізаваных форм развіцця і функцыянавання дзяржавы і грамадства. Яна забяспечвае ініцыятыву людзей, пашырае іх прававое поле дазволенага. Дзяржаўная ўлада, як мы ведаем, валодае моцнымі сродкамі ўздзеяння на грамадства, спецыяльным апаратам прымусу, і таму яна вымушана «самаабмежавацца» такімі механізмамі, метадамі і прыёмамі, якія наўпрост прадугледжаны ў дзеючым праве. Выхад дзяржавы за межы прававога поля азначае, што дзяржаўная ўлада страчвае легальнасць (законнасць існавання) і легітымнасць (падтрымку насельніцтва) і пераўтвараецца ў нейкую іншую рэальнасць.

Такім чынам, дзяржаўна-прававы рэжым умоўна складваецца з дзвюх адносна адасобленых груп механізмаў, сродкаў і прыёмаў. Адна з іх характарызуе ўздзеянне дзяржаўнай улады на грамадства, а другая – уздзеянне грамадства на дзяржаву. Перамены сістэмнага характару ў гэтых групах прыёмаў і сродкаў прыводзяць да трансфармацыі дзяржаўна-прававых рэжымаў. Звужэнне прававога поля для грамадства па ўздзеянню на дзяржаўную ўладу, як правіла, прыводзіць да пераменаў і ў сістэме механізмаў уплыву дзяржаўнай улады на грамадства. І, наадварот, усталяванне жорсткіх абмежаванняў для дзейнасці дзяржаўнай улады прыводзіць да яе пераражэння ў аўтакратыю.

Дзяржаўна-прававы рэжым існуе ў дзвюх формах (відах): у форме дэмакратычнага і ў форме аўтарытарнага рэжымаў. У адрозненне ад дэмакратычнага рэжыму, які характарызуецца шырокімі прававымі магчымасцямі асобы ў яе ўзаемадачыненнях з дзяржавай і іншымі ўдзельнікамі грамадскіх адносін, аўтарытарны рэжым характарызуецца звужэннем прававых магчымасцей асобы. Такое звужэнне адбываецца на прававых падставах і можа быць выклікана шэрагам вельмі важных фактараў: ваеннай пагрозай, неабходнасцю ўвядзення ваеннага і надзвычайнага становішча і г. д. Зразумела, што ў гэтых варунках прававое поле для дзейнасці

не толькі асобы, але і для самой дзяржаўнай улады, іншых суб'ектаў грамадскіх адносін значна звужаецца.

Дзяржаўна-прававы рэжым пры пэўных умовах можа набыць форму таталітарнага рэжыму. Таталітарны рэжым характарызуецца тым, што дзяржава абмяжоўвае грамадзян і іншых удзельнікаў грамадскіх адносін і дазваляе ім ва ўзаемадачыненнях з дзяржаўнай уладай і паміж сабой выкарыстоўваць такія прававыя механізмы, метады і прыёмы, якія толькі наўпрост замацаваны і дазволены. Імкненне паставіць усё пад кантроль, жорстка адрэгламентаваць усе праявы жыццядзейнасці грамадства якраз адметным чынам і характарызуе таталітарызм.

Дзяржаўная ўлада – толькі адзін з удзельнікаў (суб'ектаў) палітычнага жыцця. Удзельнікамі палітычных адносін з'яўляюцца палітычныя партыі, працоўныя калектывы, іншыя грамадскія аб'яднанні. Паміж імі ўсталёўваюцца разнастайныя палітычныя механізмы, метады і прыёмы ўзаемадачыненняў. Частка гэтых механізмаў, метадаў і прыёмаў мае прававую, законную прыроду, астатнія ж не знайшлі па самых розных прычынах адлюстравання і замацавання ў дзеючым праве. Для абазначэння механізмаў, метадаў і прыёмаў функцыянавання ўсіх відаў палітычнай улады ў навуцы выкарыстоўваецца паняцце палітыка-прававога рэжыму.

Палітыка-прававы і дзяржаўна-прававы рэжым – два паняцці, якія перасякаюцца паміж сабой. Справа ў тым, што дзяржаўная ўлада – асобны від палітычнай улады, які валодае такімі механізмамі, метадамі, сродкамі і прыёмамі ўздзеяння на грамадства, якімі не валодае ніводзін іншы суб'ект (від) палітычнай улады. У гэтай сваёй частцы дзяржаўна-прававы рэжым, безумоўна, выходзіць за межы палітыка-прававога рэжыму. Акрамя гэтага, у сваіх узаемадачыненнях іншыя віды (суб'екты) палітычнай улады ўжываюць такія механізмы, метады і прыёмы ўзаемаадносін і ўзаемаўздзеяння, якія нельга выкарыстоўваць ва ўзаемадачыненнях з дзяржаўнай уладай.

Такім чынам, паняцце палітыка-прававога рэжыму – паняцце, якое арганічна ўпісваецца ў катэгарыяльна-паняційны апарат паліталогіі, у той час, як паняцце дзяржаўна-прававога рэжыму – арганічная складаная частка навукі агульнай тэорыі права.

Усе тры формы, з дапамогай якіх вызначаецца парадак арганізацыі дзяржаўнай улады, маюць важнае значэнне, аднак сярод іх дамінуе форма праўлення. Арганізацыя вярхоўнай дзяржаўнай улады шмат у чым прадвызначае змест дзяржаўна-прававога рэжыму і аказвае вырашальнае ўздзеянне на характар ажыццяўлення ўла-

ды на тэрыторыі краіны. Памылкова лічыць вядучай формай дзяржавы дзяржаўна-прававы рэжым, бо ён не ўсталёўваецца сам па сабе. Яго змест, набор прававых механізмаў, метадаў і прыёмаў таксама знаходзяцца пад моцным уздзеяннем з боку вярхоўнай дзяржаўнай улады.

5. Суадносіны тыпу і формы дзяржавы

Паняцце тыпу дзяржавы, як вядома, дазваляе канкрэтызаваць сутнасць дзяржавы, дакладна акрэсліць тыя агульнасацыяльныя і вузкакласавыя інтарэсы, якія ажыццяўляе дзяржава ў канкрэтна-гістарычных умовах, але на нейкім даволі значным гістарычным адрэзку часу – у межах грамадска-эканамічнай фармацыі, у нейкай цывілізацыі ці адносна асобы і яе прававога становішча. Паняцце ж формы дзяржавы паказвае, якім чынам арганізавана дзяржаўная ўлада, як яна ажыццяўляецца і якія метады і прыёмы выкарыстоўвае дзяржаўная ўлада.

У межах аднаго тыпу дзяржаўнасці выкарыстоўваюцца розныя формы дзяржавы, розныя формы праўлення, дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання і дзяржаўна-прававога рэжыму. У звязцы «тып – форма дзяржавы» вядучай аказваецца першая складаная частка – тып дзяржавы. Дзве дыялектычна ўзаемазвязаныя складаныя часткі сутнасці дзяржавы – агульнасацыяльныя інтарэсы, так званыя агульныя справы, і «вузкакласавыя інтарэсы» патрабуюць для свайго належнага вырашэння адэкватных форм праўлення, дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання і дзяржаўна-прававога рэжыму.

Перамены, якія адбываюцца ў сутнасці дзяржавы, аказваюць уздзеянне на форму дзяржавы. Перавага, дамінаванне ў сутнасці дзяржавы агульнасацыяльных інтарэсаў над інтарэсамі «вузкакласавымі» азначае, што найбольш адэкватнымі для вырашэння гэтых інтарэсаў будзе дэмакратычны дзяржаўна-прававы рэжым, а таксама рэспубліканская форма кіравання і такая форма дзяржаўна-прававога ўладкавання, якая дазваляе найбольш адэкватна ўлічыць інтарэсы ўсіх слаёў насельніцтва, усіх нацыянальных груп і ўсіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Перавага ў сутнасці дзяржавы «вузкакласавых інтарэсаў» на працяглым гістарычным этапе развіцця дзяржавы абумоўлівае перамены ў дзяржаўна-прававым рэжыме, форме праўлення і форме дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання.

У сваю чаргу форма дзяржавы ў стане аказваць уздзеянне на сутнасць дзяржавы. Перамены ў формах праўлення, а таксама ў дзяржаўна-прававым рэжыме аказваюць уздзеянне на суадносіны ў сутнасці дзяржавы агульнасацыяльных і «вузкакласавых» задач. Усталяванне рэспубліканскай формы праўлення, дэмакратычнага дзяржаўна-прававога рэжыму наўпрост можа прывесці да таго, што дзяржаўная ўлада асноўную ўвагу стане надаваць вырашэнню агульнасацыяльных, а не «вузкакласавых» праблем.

Пытанні для самаправеркі

1. Сфармулюйце крытэрыі эфектыўнасці (выніковасці) дзеяння дзяржаўнай улады.
2. Што ўяўляе сабой форма праўлення?
3. Раскрыйце змест манархічнай формы праўлення і выдзеліце віды манархій.
4. Раскрыйце змест рэспубліканскай формы праўлення і выдзеліце віды рэспублік.
5. Як суадносяцца паміж сабой парламентарная рэспубліка і прэзідэнцкая рэспубліка?
6. Што ўяўляе сабой змешаная форма праўлення?
7. Якія бакі знешняга ўвасаблення дзяржаўнай улады характарызуе форма дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання?
8. Раскрыйце змест унітарнай формы дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання.
9. Раскрыйце змест федэрацыі і выдзеліце віды федэрацый.
10. Канфедэрацыя – гэта форма дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання краіны ці міждзяржаўнае ўтварэнне?
11. Што ўяўляе сабой дзяржаўна-прававы рэжым, якія формы (віды) дзяржаўна-прававога рэжыму Вы ведаеце?
12. Якім чынам дзяржаўна-прававы рэжым суадносіцца з палітыка-прававым рэжымам?
13. Ахарактарызуйце форму сучаснай беларускай дзяржавы.
14. Якім чынам суадносяцца паміж сабой тып і форма дзяржавы?

Тэма 7. ФУНКЦЫІ ДЗЯРЖАВЫ

1. Паняцце, азначэнне і віды функцый дзяржавы.
2. Характарыстыка ўнутраных функцый дзяржавы.
3. Характарыстыка знешніх функцый дзяржавы.
4. Формы і метады ажыццяўлення функцый дзяржавы.

1. Паняцце, азначэнне і віды функцый дзяржавы

Паняцце сутнасці дзяржавы, якое было разгледжана ў папярэдніх тэмах, дае самае агульнае ўяўленне аб сацыяльным прызначэнні дзяржаўнай улады ў жыцці грамадства – яна павінна адначасова вырашаць агульнасацыяльныя (агульныя справы) і вузкагрупавыя (вузкакласавыя) інтарэсы. Паняцце формы дзяржавы (дзяржаўнай улады) дазваляе ўявіць, якім чынам арганізавана, «матэрыялізавана» дзяржаўная ўлада. Далейшая канкрэтызацыя сутнасці дзяржавы і форм яе выражэння адбываецца ў межах наступных дзвюх парных катэгорый (паняццяў) тэорыі дзяржавы – паняцця функцый дзяржавы і паняцця апарату (механізма) дзяржавы. Паняцце функцый дзяржавы канкрэтызуе сутнасць дзяржавы ў стасунках дзяржавы з грамадствам, асвятляе сацыяльнае прызначэнне дзяржавы ў жыцці грамадства шляхам канкрэтызацыі працэсаў уздзеяння дзяржавы на грамадскія адносіны. А паняцце апарату (механізма) дзяржавы канкрэтызуе арганізацыю, «матэрыялізацыю» дзяржаўнай улады.

Пад функцыяй увогуле можна разумець ролю нейкай часткі ў адносінах да цэлага. Дзяржава з'яўляецца часткай грамадства, таму функцыя дзяржавы ў самым агульным плане – гэта роля (місія) дзяржавы ў адносінах да грамадства. Адпраўной кропкай аналізу ролі дзяржавы ў адносінах да грамадства з'яўляецца палажэнне аб адноснай самастойнасці дзяржавы ў адносінах да грамадства.

Дзяржава абапіраецца на заканамернасці функцыянавання і развіцця грамадства, павінна рэагаваць на імператывы, патрабаванні грамадскага жыцця. Але дзяржава рэагуе на патрабаванні супольніцтва не «люстэркава». Рэакцыя дзяржавы на заканамернасці і тэндэнцыі развіцця грамадства павінна быць адэкватнай, суразмернай, «эквівалентнай», але не люстэркава падобнай. Паміж патрабаваннямі развіцця грамадства і рэакцыяй дзяржавы на іх існуе асаблівы «зазор», у межах якога дзяржава самастойна выбірае сродкі і метады рэагавання на праблемы грамадства, вызначае прыярытэтнасць вырашаемых задач і паслядоўнасць іх вырашэння.

Найперш адносная самастойнасць дзяржаўнай улады (дзяржавы) да грамадства праяўляецца ў тым, што дзяржаўная ўлада з'яўляецца якасна самастойным відам грамадскай працы і таму паза межамі канкрэтнага грамадства не існуе. Дзяржава стварае паслугі па кіраванню грамадствам, якія неабходны менавіта дадзенаму грамадству, таму што па-за яго межамі яны страчваюць сваю вартасць. Таму ў сваёй дзейнасці дзяржава, безумоўна, абапіраецца на заканамернасці функцыянавання і развіцця грамадства, улічвае стан і тэндэнцыі развіцця грамадства, але яна не можа і не павінна люстэркава рэагаваць на патрэбы, заканамернасці і тэндэнцыі развіцця грамадства. Справа ў тым, што дзяржаўную ўладу ажыццяўляюць надзеленыя свядомасцю і воляй людзі, якія ўзважваюць існуючыя ў грамадстве інтарэсы, імкнуцца збалансаваць іх па свайму разуменню і зыходзячы з палітыка-ідэалагічных патрабаванняў. Дзяржаўная ўлада пры гэтым мае магчымасць выбіраць напрамкі і сродкі ўздзеяння на грамадскія адносіны з тым, каб забяспечыць цэласнасць і самаразвіццё грамадства, найлепшыя ўмовы для вырашэння ўнутраных і знешніх праблем грамадства ў самых розных сферах яго існавання.

Дзеля належнага выканання сваей місіі ў жыцці грамадства дзяржава павінна добра ведаць унутраныя і знешнія праблемы грамадства з тым, каб дакладна вызначыць мэты і задачы дзяржавы па іх вырашэнню, знайсці неабходныя матэрыяльна-фінансавыя рэсурсы і сродкі, сканцэнтраваць іх на асноўных накірунках дзеяння дзяржавы. Пасля таго, як зроблены азначаныя крокі, пачынаецца дзеянне дзяржаўнай улады (дзяржавы) па дасягненню мэт і выкананню задач. Усе вышэйакрэсленыя мерапрыемствы ўключаюцца ў паняцце функцый дзяржавы.

Уздзеянне дзяржавы на грамадства шматграннае і шматвектарнае, але функцыянальная характарыстыка дзяржавы патрабуе своеасаблівага абагульнення дзейнасці дзяржавы, вызначэння вузлавых, самых істотных момантаў уздзеяння дзяржаўнай улады на грамадскія адносіны. Да такіх момантаў адносяцца наступныя.

Па-першае, прадмет, сфера дзеяння дзяржаўнай улады. Для функцыянальнай характарыстыкі дзяржавы значэнне мае не ўсё мноства сацыяльных сувязей, на якія ўздзейнічае дзяржава, і не ўсе дзеянні дзяржаўнай улады, якія скіраваны на вырашэнне мноства самых разнастайных праблем жыццядзейнасці грамадства, а самыя істотныя віды (групы) грамадскіх адносін, сферы грамадства, на якія ўздзейнічае дзяржава.

Па-другое, пры ўздзеянні на грамадства, на асобныя сферы (віды) грамадскіх адносін дзяржава імкнецца дасягнуць пэўных мэт. Пад мэтамі дзеяння дзяржавы можна разумець той «ідэальны стан» пэўнай сферы існавання грамадства і пэўных відаў грамадскіх адносін, да якога дзяржава павінна іх прывесці шляхам уздзеяння на іх. У сваю чаргу мэты, якія пастаянна паўстаюць перад дзяржавай, вызначаюцца існуючымі праблемамі. Праблемы ў грамадскіх адносінах, іх характар, змест і вызначаюць мэты дзеяння дзяржаўнай улады.

Па-трэцяе, у функцыянальную характарыстыку дзейнасці дзяржавы ўваходзяць задачы дзеяння дзяржаўнай улады, якія фармулююцца на падставе мэт, што стаяць перад дзяржавай. Пад задачамі разумеюцца тыя меры, тыя крокі, тыя захады, якія павінна прадпрыняць дзяржаўная ўлада для дасягнення пастаўленых мэт.

Па-чацвёртае, для вырашэння задач, дасягнення пастаўленых мэт у пэўнай сферы чалавечага грамадства – эканамічнай, сацыяльнай, палітычнай, ідэалагагічнай – ствараюцца не асобныя дзяржаўныя органы, установы і арганізацыі, а іх сістэмныя блокі. Прызначэнне гэтых блокаў, падсістэм органаў і ўстаноў дзяржавы зводзіцца пераважна да вырашэння задач і дасягнення мэт у пэўных сферах грамадства.

Па-пятае, дзейнасць дзяржаўнай улады ў пэўнай сферы грамадства мае ўстойлівы характар і ажыццяўляецца на працягу даволі значнага гістарычнага адрэзку часу. Пры гэтым адны праблемы ў грамадскіх адносінах змяняюцца другімі, набываюць іншую форму, а дзейнасць дзяржавы па іх вырашэнню не спыняецца.

Па-шостае, вырашэнне праблем з боку дзяржавы патрабуе значных матэрыяльна-фінансавых рэсурсаў, якія дзяржаўная ўлада акумулюе з грамадства і выдаткоўвае іх на дасягненне мэт і вырашэнне пастаўленых задач, а таксама на ўтрыманне тых дзяржаўных органаў і ўстаноў, якія створаны для вырашэння праблем у пэўнай сферы грамадства.

Па-сёмае, для дасягнення мэт і належнага вырашэння задач дзейнасць дзяржаўнай улады ў пэўным накірунку заўсёды рэгламентуецца правам у форме самых розных крыніц права, асноўнай з якіх з'яўляюцца нарматыўныя прававыя акты.

Усё сказанае дазваляе зрабіць выснову, што *пад функцыяй дзяржавы можна разумець асноўныя, устойлівыя накірункі ўздзеяння дзяржавы, яе органаў на грамадскія адносіны дзеля дасягнення пэўных мэт і вырашэння задач у тых ці іншых сферах грамадскага жыцця, якія ажыццяўляюцца на падставе дзеючага пазітыўнага права.*

Пры ўздзеянні на грамадскія адносіны дзяржава вымушана лічыцца з тым, што існуюць аб'ектыўныя межы яе дзеяння. Дзяржава не можа дзейнічаць там, дзе не існуе і аб'ектыўна не можа існаваць права, бо права з'яўляецца адзіна магчымай мовай, інстытутам, праз які дзяржава ўздзейнічае на грамадскія адносіны. Дзяржава не можа адмяніць аб'ектыўныя законы развіцця і функцыянавання эканамічнай сістэмы, таму што ў такім разе загіне не толькі грамадства, але і дзяржава, бо не атрымае ад грамадства патрэбных матэрыяльна-фінансавых рэсурсаў для самазабеспячэння. У сучасным грамадстве аб'ектыўнымі межамі ўздзеяння дзяржавы на грамадскія адносіны з'яўляюцца: наяўнасць грамадзянскай (цывільнай) супольнасці, прыроджаных правоў і свабод чалавека, наяўнасць у грамадстве інстытутаў самакіравання, наяўнасці разнастайных палітычных партый і іншых удзельнікаў палітычных адносін.

Паняцце функцый дзяржавы не толькі канкрэтызуе сутнасць дзяржавы, але і дазваляе зрабіць прадметна-палітычную характарыстыку дзяржаўнай улады. Справа ў тым, што вызначэнне асноўных задач, якія вырашае дзяржава, іх канкрэтызацыя, аналіз сродкаў, прыёмаў, метадаў дзеяння дзяржавы, аналіз асноўных накірункаў выдаткавання матэрыяльна-фінансавых рэсурсаў дазваляюць вызначыць тыя «вузкакласавыя» і «агульнасацыяльныя інтарэсы», якія задавальняе дзяржаўная ўлада, і тым самым сфармуляваць дакладныя ўяўленні аб парадку і механізмах вызначэння прыярытэтнасці інтарэсаў, іх значнасці для дзяржаўнай улады. Інтарэсы, якія задавальняе дзяржава, – гэта прадмет яе дзеяння, а прыярытэтнасць інтарэсаў, перавага тых ці іншых інтарэсаў – гэта палітычнае стаўленне да інтарэсаў, палітычны твар дзяржаўнай улады.

У юрыдычнай літаратуры функцыі дзяржавы звычайна класіфікуюць (групуюць) па нейкіх прыметах.

Па скіраванасці ўсе функцыі дзяржавы падзяляюцца на ўнутраныя і знешнія, пры гэтым унутраныя функцыі дзяржавы характарызуюць асноўныя напрамкі дзеяння дзяржавы ўнутры дзяржаўнага ўтварэння, а знешнія – асноўныя напрамкі ўздзеяння дзяржавы на іншыя дзяржаўныя ўтварэнні.

Па сферах (відах) грамадскіх адносін, на якія ўздзейнічае дзяржава, выдзяляюцца эканамічная, сацыяльная, ідэалагічная, палітычная функцыі, разам з тым у гэтай класіфікацыі можна выдзеліць і яшчэ адну функцыю, якая характарызуе дзейнасць дзяржавы пры ўсталяванні нармальных адносін супольнасці грамадства з прыродным асяроддзем яго існавання.

Па значнасці ўсе функцыі дзяржавы падзяляюцца на галоўныя і дапаўняльныя, пры гэтым адна і тая ж функцыя дзяржавы можа пераходзіць са стану галоўных у дапаўняльныя, і наадварот.

Па часу дзеяння ўсе функцыі дзяржавы падзяляюцца на адвечныя, тыя, якія ўласцівы любому дзяржаўна-арганізаванаму грамадству ва ўсе часы існавання, і часовыя – тыя функцыі дзяржавы, якія яна выконвае ў пэўны, хаця і працяглы гістарычны час, але, тым не менш, канкрэтна акрэслены гістарычны адрэзак часу.

Усе функцыі дзяржавы дзейнічаюць у адзінстве, у сістэме, узаемадапаўняюць адна другую. Два галоўныя фактары абумоўліваюць адзінства функцый дзяржавы – адзінства дзяржаўнай улады, якая дзейнічае ад імя ўсёй супольнасці, з'яўляецца яе адзіным афіцыйным прадстаўніком, а таксама адзінства чалавечай дзейнасці ў самых розных кірунках. Нягледзячы на розную скіраванасць, унутраныя і знешнія функцыі тым не менш узаемадапаўняюць адна другую і толькі ў сістэме забяспечваюць выкананне дзяржавай сваёй місіі ў грамадстве. Напрыклад, унутраныя функцыі ўздзейнічаюць на знешнія, а знешнія аказваюць уплыў на ўнутраныя функцыі. Унутраныя функцыі ствараюць неабходныя перадумовы для паспяховай дзейнасці дзяржавы ў стасунках з іншымі дзяржаўнымі ўтварэннямі, а знешнія функцыі дзяржавы гарантуюць належныя ўмовы для ажыццяўлення ўнутраных функцый дзяржавы.

Галоўнымі з'яўляюцца тыя функцыі дзяржавы, якія наўпрост вырашаюць самую важную на пэўным гістарычным этапе развіцця грамадства праблему і скіраваны на рэалізацыю неабходных для гэтага задач, астатнія функцыі лічацца дапаўняльнымі. З пераменамі ў значнасці і важнасці вырашаемых праблем мяняюцца месцамі і функцыі дзяржавы. Дапаўняльныя пераўтвараюцца ў галоўныя, а галоўныя становяцца дапаўняльнымі. Калі галоўныя і дапаўняльныя функцыі дзяржавы могуць мяняцца месцамі, то для ўнутраных і знешніх функцый такая перамена не ўласціва. Адносна іх можна сцвярджаць, што яны пад уздзеяннем міжнародных інтэграцыйных працэсаў пачынаюць узаемадзейнічаць паміж сабой больш шчыльна. Сведчаннем гэтаму можа быць і інтэнсіўная дзейнасць органаў і ўстаноў дзяржавы, якія традыцыйна былі скіраваны на вырашэнне знешнепалітычных праблем, напрыклад, пасольстваў і консульстваў, на вырашэнне задач, якія адносяцца да сферы ўнутраных функцый дзяржавы.

Вечныя функцыі дзяржавы ўласцівы дзяржаўна-арганізаванаму грамадству з моманту яго ўзнікнення і на працягу ўсяго часу яго існавання. Мяняюцца формы і метады ажыццяўлення вечных

функцый, аб'ём вырашаемых задач, дзейнасці дзяржавы, але нязменнымі застаюцца інтарэсы дзяржавы па дасягненню мэт і вырашэнню задач у тых сферах існавання грамадства, ад умяшальніцтва ў якія дзяржава не можа адмовіцца па сваёй прыродзе. Дзяржава наўпрост вымушана іх вырашаць таму, што яны вызначаюць неабходнасць дзяржавы як самастойнай сацыяльна-палітычнай рэальнасці. Часовыя функцыі ўзнікаюць таму, што складваюцца нетрадыцыйныя сферы грамадскіх адносін і, адпаведна, праблемы, якія выходзяць за межы сфер грамадства і задач, якія дзяржава звычайна вырашае. Зразумела, што гэта павінны быць такія сферы грамадскіх адносін, якія існуюць часова, і такія праблемы, якія можна вырашыць у канкрэтны гістарычны адрэзак часу.

Памылковымі можна лічыць думкі асобных аўтараў аб наяўнасці ў дзяржавы фінансавай (ці падатковай) функцыі, а таксама шэрагу іншых функцый, такіх як функцыя аховы канстытуцыйнага ладу, правоў і свабод грамадзян, забеспячэння законнасці і правапарадку, культурная функцыя, праватворчая і праваахоўная функцыі і г. д.

Нам вядома з папярэдніх тэмаў аб тым, што наяўнасць у грамадстве інстытута падаткаў сведчыць аб тым, што дадзенае грамадства сфармавалася і існуе як дзяржаўна-арганізаванае грамадства. Дзейнасць дзяржавы па вызначэнню сістэмы падаткаў, акумуліраванню фінансавых і матэрыяльных рэсурсаў і іх перарасперкаванню не з'яўляецца самамэтай ці асобнай мэтай яе дзейнасці. Гэта дзейнасць дапамагае сфармаваць матэрыяльна-фінансавыя рэсурсы, з дапамогай якіх забяспечваецца, па-першае, задача па забеспячэнню самой дзяржавы неабходнымі матэрыяльнымі і фінансавымі рэсурсамі, а, па-другое, вырашаюцца іншыя задачы і ажыццяўляюцца самастойныя функцыі дзяржавы. Нельга не толькі лічыць дадзеную дзейнасць грамадства самастойнай функцыяй дзяржавы, але і дастасоўваць яе да эканамічнай функцыі дзяржавы. Падаткі збіраюцца і размяркоўваюцца не толькі ў эканамічнай сферы існавання грамадства, як, дарэчы, і фінансавы кантроль ажыццяўляецца дзяржавай ва ўсіх сферах існавання грамадства.

Гэтаксама нельга пагадзіцца з тым, што для дзяржавы ўласцівы праватворчая і праваахоўная (правапрымяняльная) функцыі, ці функцыя аховы канстытуцыйнага ладу, правоў і свабод грамадзян, умацаванне законнасці і правапарадку.

Дзейнасць дзяржавы па стварэнню права, а таксама яе місія па ахове і прымяненню права характарызуюць узаемаадносіны не дзяржавы і грамадства, а ўзаемаадносіны паміж асноўнымі інстыту-

тамі грамадства – дзяржавай і правам. Прычым права ва ўзаемадачыненнях паміж дзяржавай і грамадствам якраз знаходзіцца, вобразна кажучы, паміж дзяржавай і грамадствам. І выступае толькі той формай, у якой адбываецца ўздзеянне дзяржавы на грамадства, а таксама ўплыў грамадства на дзяржаву. Канстытуцыйны лад, правы і свабоды грамадзян ахоўваюцца, законнасць і правапарадак умацоўваюцца таму, што дадзеная дзейнасць дзяржавы ўяўляе сабой сістэму арганізацыйна-прававых сродкаў, з дапамогай якіх адбываецца належнае выкананне дзяржавай сваіх задач у асноўных сферах жыццядзейнасці грамадства і тым самым ажыццяўленне функцый дзяржавы.

Нельга, на наш погляд, побач з ідэалагічнай функцыяй дзяржавы ў якасці самастойнай функцыі выдзяляць культурную, ці, як у савецкі час пісалі, культурна-выхаваўчую функцыю. Уплыў дзяржавы на культуру грамадства, падтрымка дзяржавай нацыянальнай культуры цалкам вызначаюцца характарам і зместам ідэалагічнай функцыі дзяржавы, а аб'ём матэрыяльна-фінансавай падтрымкі з боку дзяржавы культурнага жыцця, арганізацыйна-прававыя мерапрыемствы ў гэтай сферы наўпрост вызначаюцца характарам і зместам культуры.

Пры выдзяленні асобных устойлівых накірункаў дзейнасці дзяржавы ў якасці самастойных функцый трэба ўсё ж прытрымлівацца дакладных, аднастайных і аднолькавых крытэрыяў. У гэтых варунках пры вызначэнні ўнутраных функцый дзяржавы ўстойлівымі і аднастайнымі крытэрыямі з'яўляюцца, па-першае, асноўныя сферы існавання грамадства, а, па-другое, наяўнасць устойлівай дзейнасці дзяржавы ў гэтай сферы грамдства. Любая дзяржава ва ўсе часы свайго існавання не можа адмовіцца ад вырашэння задач у эканамічнай, сацыяльнай, палітычнай і ідэалагічнай сферах існавання грамадства. Іншая справа, што аб'ём і характар дзейнасці дзяржавы, нават вырашаемыя дзяржавай задачы ў гэтых сферах існавання грамадства могуць быць рознымі, нават супрацьлеглымі, але гэта ўжо характарызуе змест функцый дзяржавы, змест яе дзейнасці ў пэўным асноўным накірунку дзеяння. Асноўны накірунак дзейнасці дзяржавы, такім чынам, застаецца заўсёды адным і тым жа, нязменным, а вось яго змест можа мяняцца. Такім чынам, мяняюцца не функцыі дзяржавы, а канкрэтны змест функцый дзяржавы. Гэтаксама, як сутнасць дзяржавы. Сутнасць дзяржавы застаецца нязменнай, але змест агульнасацыяльных і вузкакласавых задач, якія вырашае дзяржава, пастаянна мяняецца.

Да ўнутраных функцый дзяржавы, якія ўласцівы ёй ва ўсе часы, адносяцца эканамічная, сацыяльная, палітычная, ідэалагічная, прыродна-рэсурсавая. Для Рэспублікі Беларусь у дадзены гістарычны прамежак часу ўласцівы дзве часовыя функцыі – функцыя пераадолення наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС і функцыя інтэграцыі дзяржавы ў міжнародную і еўрапейскую супольнасць. Да знешніх функцый адносяцца функцыя абароны (забеспячэння бяспекі) дзяржавы і грамадства, функцыя экспансіі і функцыя падтрымання раўнапраўных адносін з іншымі дзяржавамі.

Паміж усімі ўнутранымі функцыямі дзяржавы, асабліва паміж пастаяннымі функцыямі, існуюць шчыльныя ўзаемасувязі. Яны абумоўлены ўзаемасувязямі паміж прадметамі уздзеяння дзяржавы, г. зн. паміж тымі сферамі існавання грамадства, на якія пастаянна ўздзейнічае дзяржава. Гэтаксама, як нельга правесці непраходную мяжу паміж эканамічнай і іншымі сферамі існавання грамадства, немагчыма ўявіць абсалютную аўтаномнасць пастаянных унутраных функцый дзяржавы. Іншая справа – часовыя функцыі. Яны не прывязваюцца да нейкіх дакладна вызначаных сфер існавання грамадства. Праблемы, для вырашэння якіх дзяржава ажыццяўляе часовыя функцыі, могуць узнікаць адразу ў некалькіх сферах існавання грамадства, і таму дзяржава не ў стане з дапамогай ужо апрабіраваных механізмаў, метадаў і прыёмаў уздзеяння на грамадскія адносіны, якія яна ўжывала пры выкананні пэўнай функцыі ў пэўнай сферы існавання грамадства, выканаць сваю місію пры вырашэнні дадзенай праблемы. Калі нейкая значная праблема ўзнікае ў межах пэўнай сферы грамадства, то яна пры ўсёй значнасці можа быць вырашана ў межах вядомай функцыі ў якасці падфункцыі дзяржавы.

2. Характарыстыка ўнутраных функцый дзяржавы

Эканамічная функцыя дзяржавы з'яўляецца пастаяннай функцыяй дзяржавы ва ўсе часы яе існавання. Дзяржава вымушана ўздзейнічаць на эканамічную сістэму грамадства, таму што яе стан прадвызначае не толькі дабрабыт людзей, але і матэрыяльна-фінансавыя ўмовы існавання і развіцця самой дзяржавы, таго слою людзей, які прафесійна забяспечвае функцыянаванне дзяржаўнай улады. Дзве галоўныя задачы вырашае дзяржава адносна эканамічнай сістэмы. Па-першае, дзяржава спрыяе ўзнікненню і развіццю тых відаў гаспадарчай, эканамічнай дзейнасці, якія з'яўляюцца перспектыўнымі, значнымі для эканомікі і аказваюць значны ўплыў на

развіццё эканамічнай сістэмы. Па-другое, дзяржава стварае перашкоды для састарэлых і грамадска-шкодных відаў эканамічнай і гаспадарчай дзейнасці. Першы від эканамічнай дзейнасці ўсяляк стымулюецца і заахвочваецца, а другі – забараняецца, выцясняецца з эканамічнай сферы жыцця грамадства. Крэдытаванне (асабліва льготнае), дацірованне, прэферэнцыі і г. д. – сродкі вырашэння першай задачы. Павелічэнне падатковага цяжару, разнастайныя адміністрацыйна-прававыя перашкоды – сродкі вырашэння другой задачы.

Па самых розных прычынах уздзеянне дзяржавы на эканамічныя адносіны можа быць розным па аб'ёму, пры гэтым, як сведчыць гісторыя, найбольш актыўна дзяржава ўмешваецца ў эканамічныя працэсы ў пераломныя, крызісныя моманты развіцця эканомікі, калі патрабуюцца неадкладныя і эфектыўныя захады з тым, каб адладзіць эканамічную сістэму, зрабіць яе функцыянаванне выніковым.

Пры стабільным і прагрэсіўным развіцці эканомікі ўздзеянне дзяржавы на эканамічныя працэсы адбываецца пераважна на макраўзроўні шляхам распрацоўкі і ажыццяўлення эканамічнай палітыкі, праграм, праектаў і планаў эканамічнага развіцця і іх фінансавання, у тым ліку і праз бюджэт. Да макраэканамічнага ўздзеяння дзяржавы на эканамічную сістэму грамадства можна аднесці і механізмы прававога рэгулявання эканамічных працэсаў. Але змест і характар прававых механізмаў вызначаецца зместам і станам эканамічнай сістэмы грамадства і задачамі, якія вырашаюць грамадства і дзяржава ў эканамічнай сферы свайго існавання.

Важнымі механізмамі, якія выкарыстоўвае дзяржава пры ўздзеянні на эканамічную сістэму, з'яўляюцца нацыяналізацыя і дэнацыяналізацыя, раздзяржаўленне ўласнасці. Нацыяналізуюцца звычайна тыя сектары эканамічнай сістэмы, якія патрабуюць пільнага ўмяшальніцтва з боку дзяржавы і якія без матэрыяльна-фінансавай дапамогі з боку дзяржавы існаваць самастойна ва ўмовах рыначнай эканомікі не ў стане.

У любой дзяржаве існуе так званая дзяржаўная ўласнасць. Мінімальнай праявай існавання дзяржаўнай уласнасці з'яўляецца наяўнасць «дзяржаўнай казны», у тым ліку дзяржаўнага бюджэту, якія служаць, па-першае, сродкам забеспячэння дзейнасці самой дзяржавы як самастойнай арганізацыі і якасна самастойнага віду грамадска-карыснай працы, а таксама для вырашэння дзяржавай самых розных задач і ажыццяўлення функцый. Але сучасная дзяржава, акрамя «класічных» праяў дзяржаўнай уласнасці, валодае і

іншымі значнымі матэрыяльнымі сродкамі, сярод якіх вылучаецца дзяржаўная ўласнасць на сродкі вытворчасці і матэрыяльныя каштоўнасці.

Сацыяльная (або сацыялізатарская) функцыя сучаснай дзяржавы лічыцца прыярытэтнай дзейнасцю, бо дзяржава, з'яўляючыся адзіным афіцыйным прадстаўніком усёй супольнасці, абавязана выконваць галоўны імператыў цывілізацыі, які зводзіцца да ўсебаковага развіцця асобы і тых сацыяльных структур, якія складваюцца ў пэўнай супольнасці. Галоўная мэта дзяржавы ў сацыяльнай сферы грамадства – захаваць сацыяльны мір і спакой у грамадстве. У сацыяльна неаднародным грамадстве, ад імя якога дзейнічае дзяржава, яна павінна стварыць цывілізаваныя формы вырашэння сацыяльных супярэчнасцей, а таксама знайсці і афіцыйна замацаваць метады і сродкі вырашэння сацыяльных праблем. Асноўныя накірункі ўздзеяння дзяржавы на сацыяльныя супярэчнасці ў грамадстве звязаны з размеркаваннем і перараспределением матэрыяльна-фінансавых сродкаў і каштоўнасцей з тым, каб папярэдзіць сацыяльныя канфлікты ў грамадстве. Не вырашыць гэтыя канфлікты, а менавіта папярэдзіць.

Сацыяльныя канфлікты параджаюцца ў рэшце рэшт у эканамічнай сістэме грамадства, якая функцыянуе на аб'ектыўных пачатках. Але дзяржава, стымулюючы адны віды эканамічнай дзейнасці і забараняючы іншыя праявы эканамічнай актыўнасці ў грамадстве, сама ж і стымулюе сацыяльныя зрухі і сацыяльную напружанасць у грамадстве. Іншая справа, што дзяржава адначасова з уздзеяннем на эканамічную сістэму займаецца і сацыяльнымі пытаннямі, згладжвае сацыяльныя супярэчнасці ў грамадстве. У сучасных эканамічна развітых дзяржавах ажыццяўляецца і моцная сацыяльная палітыка, рознабаковая сацыяльная функцыя. Пры ажыццяўленні сацыяльнай функцыі дзяржава падтрымлівае маламаёмасныя слаі насельніцтва, уздзейнічае на дэмаграфічныя працэсы, фінансуе адукацыйныя праекты і праграмы, ахову здароўя і праводзіць мерапрыемствы, якія скіраваны на захаванне сацыяльнага міра і спакою ў грамадстве. Дзяржава не можа і не павінна забяспечваць і гарантаваць вырашэнне ўсіх сацыяльных праблем і супярэчнасцей. Дзяржава – з'ява палітычная, і таму яна заўсёды аддае перавагу сацыяльным праблемам, якія адпавядаюць інтарэсам тых груп насельніцтва, якія ажыццяўляюць дзяржаўную ўладу.

Палітычная функцыя дзяржавы скіравана найперш на забеспячэнне палітычнай стабільнасці ў грамадстве, на ахову правапарадку, на забеспячэнне правоў і свабод асобы, а таксама на гаран-

таванне развіцця цывільнай супольнасці і разнастайных палітычных інстытутаў. Дзяржава – асноўны і галоўны палітычны інстытут грамадства. Яна адказвае перад усёй супольнасцю за захаванне цэласнасці і бяспекі грамадства, а таму і павінна забяспечыць і гарантаваць цывілізаваныя формы палітычнага жыцця і палітычнай барацьбы за дзяржаўную ўладу.

Ідэалагічная (культурна-выхаваўчая) функцыя дзяржавы. Любая дзяржава, з'яўляючыся афіцыйным прадстаўніком супольнасці, абавязана сфармуляваць і абараніць усімі магчымымі сродкамі агульныя для ўсёй супольнасці ідэалагічныя і маральныя каштоўнасці, бо дзяржава абавязана гарантаваць самаразвіццё супольнасці, якое немагчыма без адзіных для ўсёй супольнасці ідэалагічных і маральных каштоўнасцей. У сучасных дзяржавах азначаныя каштоўнасці замацоўваюцца, як правіла, у асноўных законах (канстытуцыях), выкладаюцца ў агульнадзяржаўных праграмах альбо ўтрымліваюцца ў свяшчэнных кнігах, калі дзяржава прымае нейкую рэлігію ў якасці дзяржаўнай. Наяўнасць агульнадзяржаўнай ідэалогіі не азначае, што іншыя формы ідэалогіі павінны быць забаронены. Дзяржава абавязана забараніць тыя формы ідэалогіі, якія скіраваны на разбурэнне цэласнасці супольнасці, наўпрост супярэчаць яе ідэалагічным, культурным і маральным каштоўнасцям.

Дзяржава не ў стане ўздзейнічаць на прыроду, на прыроднае асяроддзе, у якім яна дзейнічае і якое стварае неабходныя перадумовы існавання чалавечай супольнасці і дзяржавы. Дзяржава ажыццяўляе ўздзеянне на грамадства з тым, каб забяспечыць належныя і спрыяльныя прыродныя ўмовы для яго самаразвіцця. Прыродарэсурсавая функцыя дзяржавы складаецца з трох асноўных кірункаў уздзеяння дзяржавы на «ўзаемаадносіны» грамадства і навакольнага асяроддзя:

1) з мераў дзяржаўнага ўздзеяння, якія скіраваны на ахову прыроды і якія рэалізуюцца шляхам разнастайных забарон;

2) з дзеянняў дзяржавы, якія зводзяцца да ўсталявання прававых і тэхнічна-прававых стандартаў, правілаў і нормаў па выкарыстанню прыродных рэсурсаў;

3) з дзеянняў дзяржавы, якія скіраваны на ўзнаўленне тых прыродных рэсурсаў, якія можна ўзнавіць.

Для сучаснай беларускай дзяржавы ўласцівы дзве часовыя функцыі – беларускай дзяржавы ў сусветную і еўрапейскую супольнасць, а таксама функцыя пераадолення наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Функцыя інтэграцыі беларускай дзяржавы ў еўрапейскую і сусветную супольнасць сфармавалася таму, што сама сучасная беларуская дзяржава ўзнікла адносна нядаўна ў выніку разбуральных працэсаў, якія напаткалі былы Савецкі Саюз, федэратыўнай часткай якога і была доўгі час Беларуская ССР. Атрымаўшы поўны дзяржаўны суверэнітэт, беларуская дзяржава вымушана была дакладна вызначыць і акрэсліць сваё месца сярод іншых дзяржаўных утварэнняў. Вырашэнне дадзенай задачы стала магчымым толькі пасля таго, як былі дакладна вызначаны асноўныя кірункі развіцця беларускай дзяржавы ўнутры краіны – у эканамічнай сістэме, сацыяльнай і палітычнай сферах існавання беларускага грамадства.

Інтэграцыя дзяржавы ў супольнасць роўных, суверэнных і незалежных дзяржаў патрабуе вызначэння асноўных вектараў знешняй палітыкі і, адпаведна, іх скіраванасці. Мэтай дадзенай функцыі дзяржавы з'яўляецца дакладнае вызначэнне месца і ролі беларускай дзяржавы сярод еўрапейскіх і сусветных дзяржаўных утварэнняў, у сістэме геапалітычных каардынат. Задачы, якія вырашае дзяржава, – наладжванне рознабаковых стасункаў з іншымі дзяржавамі сусветнай і еўрапейскай супольнасці праз механізмы міжнароднага супрацоўніцтва.

Функцыя інтэграцыі, хаця і мае як бы знешнюю скіраванасць, бо патрабуе вызначэння знешнепалітычных вектараў развіцця беларускай дзяржавы, разам з тым праводзіцца шляхам пераўтварэнняў унутры грамадства. І менавіта ўнутраныя пераўтварэнні, якія ажыццяўляюцца ў сучаснай беларускай дзяржаве, вызначаюць прыярытэты яе знешняга развіцця.

Пераадоленне наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Буйнейшая тэхнагенная катастрофа чалавецтва абумовіла з'яўленне ў супольнасці і дзяржаве важнейшай праблемы, якая пагражае існаванню чалавечага роду. Мэта, якую імкнецца дасягнуць дзяржава ў справе прадухілення непажаданых наступстваў, зводзіцца першапачаткова да лакалізацыі і прадухілення небяспекі, якая склалася для грамадства і дзяржавы, а затым і да наступнай ліквідацыі непажаданых вынікаў тэхнагеннай катастрофы. Дадзеная ўнутраная функцыя сучаснай беларускай дзяржавы з'яўляецца часовай, хаця яе ажыццяўленне і будзе адбывацца на працягу некалькіх пакаленняў людзей. Выкананне дадзенай функцыі патрабуе значных матэрыяльна-фінансавых рэсурсаў, аб чым яскрава сведчыць штогадовая структура бюджэту беларускай дзяржавы на працягу апошніх двух дзесяцігоддзяў. Значная частка бюджэтных рэсурсаў выдаткоўваецца дзяржавай на ажыццяўленне дадзенай функцыі.

3. Характарыстыка знешніх функцый дзяржавы

Тры асноўныя задачы вырашае дзяржава ў стасунках з іншымі дзяржаўнымі ўтварэннямі. Па-першае, дзяржава павінна забяспечыць сваю самастойнасць і незалежнасць, а таксама незалежнасць і самастойнасць прадстаўляемага ёй грамадства. Па-другое, дзяржава павінна садзейнічаць забеспячэнню сваіх «нацыянальных інтарэсаў» на тэрыторыі іншых дзяржаўных утварэнняў. Па-трэцяе, дзяржава павінна падтрымліваць раўнапраўныя і добразычлівыя адносіны з іншымі дзяржавамі праз узаемаабмен рознымі каштоўнасцямі на эквівалентнай аснове. Дадзеныя задачы вырашаюцца шляхам ажыццяўлення трох знешніх функцый: функцыі абароны грамадства і дзяржавы ад знешніх пагроз, функцыі экспансіі (пранікнення) на тэрыторыю іншых дзяржаўных утварэнняў і функцыю падтрымання нармальных узаемаадносін з іншымі дзяржавамі.

Функцыя абароны ад знешніх пагроз. Дзяржава – афіцыйны прадстаўнік грамадства, яна абавязана забяспечыць незалежнасць, цэласнасць і самаразвіццё грамадства, гарантаваць усе магчымасці для самазахавання грамадствам сваёй тоеснасці, сваёй адметнасці і права выбару ўласнага шляху самаразвіцця, які найбольш адпавядае прыродзе грамадства, яго жаданням і мэтам. Уздзеянне на грамадства і на дзяржаву фактараў, якія прычыняюць шкоду інтарэсам грамадства, асобы, органаў і арганізацый, ставіць разнастайныя перашкоды на шляху самастойнага развіцця грамадства – гэта знешнія пагрозы для грамадства і дзяржавы. Пагрозы маюць самую розную форму і змест. Гэта могуць быць пагрозы ваенныя і эканамічныя, экалагічныя, энергетычныя, інфармацыйныя, ідэалагічныя, культурныя, маральныя і г. д. Функцыя абароны ажыццяўляецца праз распрацоўку задач і ажыццяўленне такіх мерапрыемстваў, якія ставяць надзейныя бар'еры для адзначаных пагроз.

Магчыма, што ў сучасным свеце ваенныя пагрозы і не з'яўляюцца для многіх суверэнных краін самымі небяспечнымі. Грамадства і дзяржава могуць быць разбураны і падначалены волі іншых якраз праз пагрозы іншага кшталту. Тым больш, што ваенная пагроза ва ўмовах валодання ядзернай зброяй многімі краінамі пагражае самазнішчэннем грамадства ўвогуле, таму і верагоднасць прывядзення яе ў дзеянне памяншаецца. А таму на першы план вылучаюцца іншыя віды і праявы пагроз. Кожная дзяржава выбудоўвае ўласна для сябе шкалу знешніх пагроз і выпрацоўвае адэкватныя ім перашкоды, якія адпавядаюць мэтам і задачам забеспячэння бяспекі дзяржавы і грамадства, іх цэласнасці, самастойнасці і незалежнасці.

Пад функцыяй экспансіі, якую ажыццяўляюць сучасныя дзяржавы, можна разумець дзейнасць дзяржавы на падставе прынцыпаў і норм міжнароднага права, а таксама дзеючага нацыянальнага права на тэрыторыі іншых дзяржаўных утварэнняў дзеля забеспячэння інтарэсаў прадстаўляемай гэтай дзяржавай супольнасці, асобных грамадзян, а таксама іх эканамічных, грамадскіх і палітычных аб'яднанняў. Усе гэтыя інтарэсы можна абазначыць тэрмінам «нацыянальныя інтарэсы». Формы, метады і сродкі ажыццяўлення гэтай функцыі маюць выключна прававую форму, а памер вырашаемых задач пры ажыццяўленні дадзенай функцыі вызначаецца аб'ёмам міжнароднай дзейнасці грамадства, яго прадстаўнікоў, арганізацый і самой дзяржавы. Функцыя экспансіі не з'яўляецца самамэтай і не можа быць галоўнай функцыяй дзяржавы. Функцыя экспансіі павінна спрыяць эфектыўнаму выкананню дзяржавай свайго прызначэння ўнутры грамадства, самаразвіццю грамадства, асобы і чалавека.

Функцыя падтрымання нармальных эканамічных, палітычных і іншых адносін з іншымі дзяржаўнымі ўтварэннямі – гэта дзейнасць дзяржавы, якая скіравана на тое, каб шляхам разнастайных кампрамісаў і заключэння міжнародных пагадненняў усталяваць фармальна роўныя стасункі з іншымі дзяржавамі і тым самым забяспечыць эквівалентнасць (суразмернасць) ва ўзаемадачыненнях самой дзяржавы, яе фізічных і юрыдычных асоб з іншымі дзяржавамі, фізічнымі і юрыдычнымі асобамі, якія звязаны з іншымі дзяржавамі. Дадзеная функцыя мае інтэгратыўны характар для ажыццяўлення разнапланавай дзейнасці (эканамічнай, сацыяльнай, культурнай) за межамі краіны і скіравана на забеспячэнне ўнутраных праблем грамадства і дзяржавы.

Дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульствы дзяржавы – гэта тыя дзяржаўныя ўстановы, сродкі, інструменты, з дапамогай якіх ажыццяўляюцца ўсе тры знешнія функцыі краіны.

4. Формы і метады ажыццяўлення функцый дзяржавы

Дзяржава ажыццяўляе ўздзеянне на грамадства выключна праз права, выкарыстоўваючы прававыя механізмы, прыёмы і метады. Усё, што робіць дзяржава адносна грамадства, павінна быць найперш прадугледжана ў дзеючым пазітыўным праве. Такім чынам, любой дзейнасці дзяржавы ў грамадстве павінна папярэднічаць прававое афармленне гэтай дзейнасці. Іншымі словамі, дзяржава павінна стварыць для самой сябе належную прававую аснову вы-

канання кожнай функцыі як унутры, так і за яе межамі. Унутры краіны дзяржава робіць гэта самастойна і суверэнна, а ў стасунках з іншымі дзяржавамі – шляхам міжнародных пагадненняў з дзяржавамі. Абапіраючыся на створаную прававую аснову, дзяржава праводзіць разнастайныя мерапрыемствы па ажыццяўленню ўнутранай і знешняй палітыкі дзяржавы і выкананню пастаўленых задач. І, нарэшце, у выпадках, калі дзейнасць па ажыццяўленню функцый дзяржавы выходзіць за межы прававога поля, праводзяцца мерапрыемствы праваахоўнага характару.

Сказанае дазваляе зрабіць выснову аб тым, што кожная з функцый дзяржавы выконваецца ў трох універсальных прававых формах шляхам ажыццяўлення разнастайных мерапрыемстваў арганізацыйнага характару, якія ажыццяўляюцца толькі на падставе права. Гэта нормастваральная, прававыканальная і праваахоўная формы. Гэтыя формы выкарыстоўваюцца дзяржавай як пры ажыццяўленні ўнутраных, так і пры ажыццяўленні знешніх функцый і таму з'яўляюцца універсальнымі. Унутры дзяржавы пры ажыццяўленні функцый выкарыстоўваюцца судовая форма і кантрольная форма. Не можа існаваць проста арганізацыйных форм ажыццяўлення функцый дзяржавы. Усе гэтыя формы павінны быць абавязкова замацаваны ў дзеючым пазітыўным праве. Іншая сітуацыя азначае, што дзяржава выходзіць за межы прававога поля, страчвае легальнасць і легітымнасць і перастае быць дзяржавай.

Дзяржава валодае двума універсальнымі прававымі метадамі ўздзеяння на паводзіны ўдзельнікаў грамадскіх адносін – метадам прымусу і метадам заахвочвання. Дадзеныя метады, як і вышэйадзначаныя формы ажыццяўлення функцый, таксама зафіксаваны і адлюстраваны ў дзеючым пазітыўным праве і маюць прававую прыроду.

Пытанні для самаправеркі

1. Што разумеецца пад адноснай самастойнасцю дзяржавы, у чым яна праяўляецца?
2. Як суадносяцца паміж сабой паняцці дзейнасці дзяржавы, мэт, задач і функцый дзяржавы?
3. З дапамогай якіх крытэрыяў можна дакладна вызначыць наяўнасць самастойнай функцыі дзяржавы?
4. Раскрыйце змест агульнасацыяльнага і вузкакласавага ў дзейнасці дзяржавы.
5. Сфармулюйце разуменне межаў дзейнасці дзяржавы.
6. Якім чынам суадносяцца паміж сабой паняцці функцый дзяржавы і функцый органаў дзяржавы?

7. Правядзіце класіфікацыю функцый дзяржавы па іх скіраванасці, значнасці і часу дзеяння.

8. Раскрыйце змест унутраных функцый дзяржавы.

9. Якім чынам адбываюцца развіццё і эвалюцыя ўнутраных функцый дзяржавы?

10. Раскрыйце змест знешніх функцый дзяржавы.

11. У якім кірунку адбываюцца эвалюцыя і развіццё знешніх функцый дзяржавы?

12. Як суадносяцца паміж сабой унутраныя і знешнія функцыі дзяржавы?

13. Пералічыце універсальныя формы ажыццяўлення функцый дзяржавы і раскрыйце іх змест.

14. Раскрыйце змест асноўных метадаў ажыццяўлення функцый дзяржавы.

Тэма 8. АПАРАТ (МЕХАНІЗМ) ДЗЯРЖАВЫ

1. Паняцце, прыметы і азначэнне апарату дзяржавы.

2. Паняцце, прыметы і віды органаў дзяржавы.

3. Прынцыпы арганізацыі і дзейнасці апарату дзяржавы.

4. Кадры апарату дзяржавы. Бюракратыя і бюракратызм, дэмакратыя і дысцыпліна ў дзейнасці апарату дзяржавы.

1. Паняцце, прыметы і азначэнне апарату дзяржавы

Дзяржаўна-арганізаванае грамадства, ці грамадства, якое арганізавана як дзяржава, мае сваё адметнае функцыянальнае выражэнне – дзяржаўную ўладу і матэрыяльнае ўвасабленне, «матэрыялізаваную частку» – апарат дзяржавы, які знешне існуе, назіраецца ў якасці сістэмы (сукупнасці) органаў і ўстаноў, праз якія і з дапамогай якіх прафесійнымі кіраўнікамі (службовымі асобамі, чыноўнікамі) ажыццяўляецца дзяржаўная ўлада. Можна сказать, што апарат дзяржавы – гэта той сродак, той інструмент, з дапамогай якога дзяржаўная ўлада (дзяржава) ажыццяўляе сваю місію ў жыцці грамадства. Апарат дзяржавы характарызуецца шэрагам прымет.

Па-першае, апарат дзяржавы складаецца з сістэмы (сукупнасці) дзяржаўных органаў, устаноў і арганізацый, якія дзейнічаюць ад імя дзяржавы і грамадства і створаны для належнага і эфектыўнага выканання дзяржаўнай улады, яе місіі ў жыцці грамадства. У

дзяржаве не павінна існаваць «сінекур», такіх органаў, устаноў і арганізацый, якія не патрэбны грамадству і дзяржаве і якія дзейнічаюць самі па сабе і ў інтарэсах тых асоб, якія заняты працай у гэтых дзяржаўных структурах.

Па-другое, усе органы і ўстановы дзяржавы згодна са сваім прызначэннем маюць уладныя паўнамоцтвы, г. зн. магчымасці ўплываць на паводзіны ўдзельнікаў грамадскіх адносін, службовых асоб, дзеянні іншых органаў і ўстаноў дзяржавы, дзяржаўных арганізацый шляхам фармулявання агульнаабавязковых вяленняў у форме загадаў, распараджэнняў і іншых формах. Аб'ём уладных паўнамоцтваў, тых прававых магчымасцей, якімі валодаюць дзяржаўныя структуры, вызначаецца дзяржавай.

Па-трэцяе, апарат дзяржавы будуецца і функцыянуе на падставе прынцыпаў строгай іерархіі і субардынацыі паміж органамі і ўстановамі дзяржавы. Уладныя распараджэнні вышэйстаячых у «піраміде» органаў і ўстаноў абавязковыя для ніжэйстаячых органаў і ўстаноў, а органы і ўстановы, якія знаходзяцца на адной прыступцы «піраміды», знаходзяцца ў субардынацыйнай залежнасці ад вышэйстаячых органаў і ўстаноў.

Па-чацвёртае, апарат дзяржавы можа належным чынам выканаць сваю місію па ажыццяўленню дзяржаўнай улады пры ўмове, калі сістэмай органаў і ўстаноў дзяржавы, дзяржаўных арганізацый ахоплена ўся тэрыторыя краіны. А дзяржава ўвогуле можа выступаць ад імя ўсяго насельніцтва, эфектыўна выяўляць і прадстаўляць яго інтарэсы пры ўмове, калі насельніцтва нават у самых аддаленых частках тэрыторыі дзяржавы мае доступ да органаў, устаноў і арганізацый дзяржавы.

Па-пятае, дзяржаўны апарат функцыянуе належным чынам пры ўмове, калі ўладныя паўнамоцтвы органаў і ўстаноў дзяржавы выконваюцца асобным корпусам прафесіяналаў – дзяржаўнымі служачымі, чыноўнікамі, службовымі асобамі. Асобная група людзей, якая выконвае ўсе ўладныя паўнамоцтвы дзяржавы, выступае рухаючай сілай апарату дзяржавы.

Такім чынам, пад апаратам дзяржавы можна разумець сістэму надзеленых уладнымі паўнамоцтвамі органаў і ўстаноў дзяржавы, якія дзейнічаюць ад імя дзяржавы на ўсёй яе тэрыторыі і ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы праз асобную групу людзей – прафесіянальных кіраўнікоў.

У юрыдычнай навуцы ўжываюцца два тоесныя па аб'ёму паняцці, якія пры аналізе дзяржавы выконваюць рознае прызначэнне – паняцце «апарат дзяржавы» і паняцце «механізм дзяржавы».

Паняцці «апарат дзяржавы» і «механізм дзяржавы»абазначаюць адную і тую ж рэальнасць – матэрыялізаваную частку дзяржаўнай улады і ўключаюць у сябе па аб'ёму ўсе органы, установы і арганізацыі, з дапамогай якіх ажыццяўляецца ўлада, а таксама ўсю сукупнасць прафесійных кіраўнікоў, якія прыводзяць у рух апарат дзяржавы. Разам з тым паняцце «апарат дзяржавы» выкарыстоўваецца пераважна для абазначэння будовы дзяржаўнай улады, а паняцце «механізм дзяржавы» дапамагае вывучыць працэсы функцыянавання дзяржаўнай улады.

Разам з тым існуе паняцце дзяржаўнага апарату, якое па свайму аб'ёму ахоплівае паняцце апарату дзяржавы і перасякаецца з паняццем «механізм дзяржавы». У склад паняцця дзяржаўнага апарату, акрамя надзеленых уладнымі паўнамоцтвамі органаў і ўстаноў дзяржавы, уключаюцца і разнастайныя дзяржаўныя арганізацыі. Пад дзяржаўнымі арганізацыямі можна разумець створаныя для належнага выканання органамі і ўстановамі дзяржавы сваіх паўнамоцтваў дзяржаўныя структуры, якія існуюць у шчыльнай узаемасувязі з апаратам дзяржавы і без апарату дзяржавы іх існаванне і функцыянаванне з'яўляецца бессэнсоўным. Самая істотная рыса дзяржаўных арганізацый заключана ў тым, што яны не маюць уладных паўнамоцтваў адносна насельніцтва, іншых органаў і ўстаноў дзяржавы.

Часта паняцці дзяржаўнага апарату і апарату дзяржавы ўжываюцца як сінонімы, што нельга лічыць карэктным у навуковых адносінах. А вось калі выкарыстоўваецца выраз, згодна з якім дзяржаўны апарат уяўляе сабой апарат дзяржавы ў шырокім сэнсе слова, то з такім падыходам пагадзіцца можна.

Збор і апрацоўка разнастайнай інфармацыі, падрыхтоўка неабходных даведак, падрыхтоўка і перападрыхтоўка кадраў для апарату дзяржавы, а таксама шэраг падобных спраў выконваецца дзяржаўнымі арганізацыямі. У сучасных цывілізаваных дзяржавах гэта частка дзяржаўнага апарату вельмі ўнушальная. Ад якасці яе працы шмат у чым залежаць паспяховасць і эфектыўнасць дзейнасці апарату дзяржавы.

Апарат дзяржавы не заставаўся нязменным. На самых першасных этапах функцыянавання дзяржаўна-арганізаванага грамадства апарат дзяржавы быў простым, можна сказаць, «прымітыўным». Аб'ём спраў, якія выконваў апарат дзяржавы, быў невялікі, а таму і колькасць органаў, якія ўваходзілі ў яго склад, была нязначнай, адпаведна, невялікай была і колькасць прафесійных кіраўнікоў. Па меры ўскладнення кіраўнічай працы адбывалася яе спецыялізацыя.

І калі першапачаткова ўвесь аб'ём уладных паўнамоцтваў (стварэнне норм права, правядзенне іх у жыццё, правасуддзе, кантроль і г. д.) мог быць паспяхова выкананы адной структурай, адным органам улады, пазней стала зразумела, што патрэбна спецыялізацыя органаў апарату дзяржавы на выкананні асобных кіраўнічых функцый. Спецыялізацыя органаў і ўстаноў дзяржавы на выкананні пэўных функцый абумоўлівала наступную іх інтэграцыю пры вырашэнні агульных для дзяржаўнай улады задач і функцый. Так адбывалася ўскладненне апарату дзяржавы, яго развіццё. А з павелічэннем аб'ёму кіраўнічай дзейнасці павялічвалася і колькасць прафесійных кіраўнікоў.

На развіццё і функцыянаванне апарату дзяржавы ўплываюць розныя фактары, памер уздзеяння якіх на апарат дзяржавы розны, часта нават супрацьлеглы.

Паняцце апарату дзяржавы з'яўляецца другой парнай катэгорыяй да паняцця «функцыі дзяржавы». Функцыянальны стан дзяржавы наўпрост уздзейнічае на будову апарату дзяржавы і парадак яго функцыянавання. Вылучэнне нейкай функцыі дзяржавы ў якасці галоўнай сярод унутраных ці знешніх функцый практычна азначае, што дзяржава канцэнтруе на пэўным кірунку развіцця сваю ўвагу, стварае там, як правіла, дадатковыя структуры органаў і ўстаноў дзяржавы і выдаткоўвае на вырашэнне задач значныя матэрыяльна-фінансавыя сродкі. Усе астатнія функцыі і органы дзяржавы дапаўняюць галоўную функцыю, скіроўваюцца на яе паспяховае выкананне. У сваю чаргу будова апарату дзяржавы, яго якасць шмат у чым прадвызначаюць паспяховае выкананне дзяржавай яе функцый. Але ў звязцы «функцыі – апарат дзяржавы» вызначальнай з'яўляецца функцыя дзяржавы, бо яе змест вызначаецца ўнутранымі і знешнімі праблемамі існавання грамадства. Структура і змест дзейнасці апарату дзяржавы, такім чынам, вызначаюцца зместам функцый дзяржавы.

Будова апарату дзяржавы залежыць ад унутранага становішча таго грамадства, ад імя якога выступае дзяржава. У грамадстве, дзе перманентна існуе сацыяльная напружанасць, як правіла, ствараецца і моцны апарат прымусу, а ў дзяржаве, якая эфектыўна ажыццяўляе сацыяльную функцыю, перавагу атрымліваюць органы сацыяльнай падтрымкі насельніцтва і сацыяльнага развіцця грамадства – органы адукацыі, навуковыя арганізацыі, арганізацыі аховы здароўя і г. д.

Значны ўплыў на будову апарату дзяржавы аказваюць знешнія абставіны дзяржавы, яе геапалітычнае становішча. Вызначэн-

не вектараў знешняй палітыкі, яе характар, аб'ём знешнепалітычных і знешнеэканамічных спраў уплываюць на склад зарыентаваных на вырашэнне знешнепалітычных і знешнеэканамічных праблем і задач органаў і ўстаноў дзяржавы.

На структуру апарату дзяржавы значны ўплыў аказвае форма дзяржавы, асабліва форма дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання. Федэратыўная дзяржава, як правіла, мае больш складаны апарат дзяржавы, дадатковыя ў параўнанні з унітарнай дзяржавай органы і ўстаноў дзяржавы і структурныя часткі.

Нават прыродны фактар (геаграфічныя і кліматычныя) умовы існавання дзяржаўна-арганізаванага грамадства аказвае значны ўплыў на асаблівасці будовы апарату дзяржавы. Для вялікіх па памерах дзяржаўных утварэнняў характэрным з'яўляецца і вялікі па памерах апарат дзяржавы. У ім існуе добра разгалінаваная структура органаў і ўстаноў дзяржавы, значны па аб'ёму корпус дзяржаўных служачых. Калі дзяржава існуе ў складаных кліматычных умовах, то яе эканамічная сістэма не ў стане эфектыўна працаваць без значнай падтрымкі з боку дзяржавы. А гэта азначае, што ў апараце дзяржавы існуе вялікі блок органаў, якія адказваюць за належнае ажыццяўленне эканамічнай функцыі дзяржавы.

2. Паняцце, прыметы і віды органаў дзяржавы

Апарат дзяржавы – матэрыялізаваная частка дзяржавы, адна з праяваў дзяржаўна-арганізаванага грамадства, дзяржавы. Апарат дзяржавы складваецца з трох роднасных, але адносна самастойных элементаў (кампанентаў) – органаў дзяржавы, устаноў дзяржавы і дзяржаўных арганізацый. Кожны з гэтых кампанентаў прымае ўдзел у ажыццяўленні дзяржаўнай улады і ўвасабляе яе, але кожны з іх вырашае спецыфічныя задачы спецыфічнымі сродкамі. Органы дзяржавы ствараюцца дзеля таго, каб ажыццяўляць самыя розныя па характару і прызначэнню ўладныя паўнамоцтвы ад імя дзяржавы. Яны маюць магчымасць уздзейнічаць на паводзіны насельніцтва, іншых органаў, устаноў і арганізацый шляхам выпрацоўкі і ажыццяўлення ўладных вяленняў у форме распараджэнняў і загадаў. Установы дзяржавы вырашаюць таксама важныя дзяржаўныя задачы, выконваюць частку спраў дзяржаўнай улады. Але яны надзелены толькі такімі знешнімі ўладнымі паўнамоцтвамі, якія неабходны для выканання імі сваіх задач. Дзяржаўныя арганізацыі, як правіла, не маюць самастойных задач па ажыццяўленню дзяржаўнай улады. Іх задачы – гэта задачы тых органаў і ўстаноў

дзяржавы, якім дзяржаўныя арганізацыі дапамагаюць выконваць сваё прызначэнне ў жыцці дзяржавы належным чынам.

Орган дзяржавы – мінімальны кампанент апарату дзяржавы, і таму яму ўласцівы ўсе якасці, прыметы апарату дзяржавы ўвогуле. Але разам з тым яму ўласцівы і спецыфічныя прыметы. Па-першае, орган дзяржавы заўсёды з'яўляецца адносна аўтаномнай часткай дзяржавы, якая ствараецца на падставе дзеючага пазітыўнага права і менавіта таму набывае легальнасць і легітымнасць. Па-другое, кожны орган дзяржавы валодае ўладнымі паўнамоцтвамі не ўвогуле, а дакладна вызначанымі ўладнымі паўнамоцтвамі, характар якіх вызначаецца месцам органа ў апараце дзяржавы і яго функцыямі. Па-трэцяе, звычайна орган дзяржавы для належнага выканання сваёй ролі надзяляецца правам выдаваць агульнаабавязковыя правілы паводзін – нормы права ў пэўных формах права – крыніцах норм права. Па-чацвёртае, орган дзяржавы мае сваю ўнутраную будову (штатную структуру), якая павінна найлепшым чынам спрыяць выкананню органам дзяржавы сваіх паўнамоцтваў. Па-пятае, орган дзяржавы для належнага ажыццяўлення сваіх паўнамоцтваў звычайна мае сваё незалежнае дзяржаўнае матэрыяльна-фінансавае забеспячэнне і валодае прававой якасцю юрыдычнай асобы.

На макраўзроўні апарат дзяржавы ў шырокім сэнсе слова складаецца з чатырох адносна самастойных структурных частак (блокаў): 1) апарат дзяржавы ва ўласным сэнсе слова; 2) апарат прымусу; 3) установы дзяржавы; 4) «рэчавыя прыдаткі». У склад апарату дзяржавы ва ўласным сэнсе слова ўваходзяць такія органы дзяржавы, як парламент, урад, прэзідэнт, мясцовыя органы дзяржаўнай улады і кіравання і іншыя органы дзяржавы. Апарат прымусу ўключае ў сябе армію, паліцыю, пракуратуру, выведку, контрвыведку і г. д. Установы дзяржавы – досыць пашыраны блок (частка) апарату дзяржавы. Сюды ўваходзяць дзяржаўныя банкі, натарыяльныя канторы і г. д. Да блока «матэрыяльных прыдаткаў» адносяцца сродкі транспарту, сувязі, узбраенне, турмы, іншыя месцы пазбаўлення волі і г. д.

У сучасных дзяржавах, якія пабудавалі сваю ўладу на прынцыпах яе падзелу на самастойныя галіны ўлады, найбольшую цікавасць уяўляе падзел усіх органаў і ўстаноў дзяржавы па іх функцыянальнаму прызначэнню. Па дадзенай прымеце ўсе органы і ўстановы дзяржавы падзяляюцца на:

1) органы, якія галоўным чынам фармулююць (выдаюць) агульнаабавязковыя правілы паводзін – нормы права. Часцей за ўсё

гэтыя органы ўлады называюцца заканадаўчымі. Але заканадаўчыя органы (парламент) на самай справе з'яўляюцца толькі часткай органаў дзяржавы, якія ствараюць нормы права;

2) выканаўчыя і распарадчыя органы дзяржавы, асноўнай прыметай якіх з'яўляюцца правядзенне ў жыццё і рэалізацыя агульнаабавязковых правілаў паводзін – норм права, а таксама і дзеянні распарадчага характару, без якіх немагчыма выкананне агульнаабавязковых правілаў паводзін;

3) органы судовай улады, галоўным прызначэннем якіх з'яўляецца ўсталяванне правапарадку шляхам вырашэння разнастайных спрэчак і разгляду правапарушэнняў, якія ўзнікаюць у жыццядзейнасці дзяржавы і грамадства;

4) кантрольна-надзорныя органы, асноўным прызначэннем якіх з'яўляецца нагляд і кантроль за належным выкананнем кожным з азначаных вышэй відаў органаў сваіх правоў і абавязкаў. Кантрольна-надзорныя органы – гэта своеасаблівая «кантрольна-тармазная сістэма», з дапамогай якой грамадства і дзяржава кантралююць і выпраўляюць дзейнасць апарату дзяржавы;

5) органы, якія ажыццяўляюць каардынуючую ўладу, часцей за ўсё ў сучасных цывілізаваных дзяржавах – гэта орган пад назвай «кіраўнік дзяржавы» – прэзідэнт краіны.

З дадзенай класіфікацыяй органаў дзяржавы перасякаецца іх падзел на асобныя групы ў залежнасці ад характару (будовы) кіраўнічай дзейнасці. Па дадзенай прымеце органы дзяржавы падзяляюцца на прадстаўнічыя органы дзяржавы, якія абіраюцца насельніцтвам і выяўляюць (прадстаўляюць) яго інтарэсы, на органы выканаўчыя і распарадчыя, якія выконваюць вяленні органаў прадстаўнічай улады і дзеля гэтага надзяляюцца распарадчымі паўнамоцтвамі, праваахоўныя органы, сэнс існавання якіх – у абароне дзеючага права і яго ўзнаўленні, кантрольна-надзорныя і каардынуючыя органы дзяржавы.

Органы дзяржавы класіфікуюцца і па шэрагу іншых не менш значных якасцяў (прымет), якія ім уласцівы. Па парадку стварэння (фармавання) яны падзяляюцца на органы дзяржавы, якія выбіраюцца, і органы дзяржавы, якія прызначаюцца. Па парадку выпрацоўкі і прыняцця рашэнняў органы дзяржавы падзяляюцца на органы калегіяльныя і адзінаначальныя. Па часу дзеяння існуюць органы пастаянныя, часовыя і надзвычайныя. Па аб'ёму ўладных паўнамоцтваў органы дзяржавы падзяляюцца на органы агульнай, галіновай і спецыяльнай (функцыянальнай) кампетэнцыі. Па тэрыторыі дзеяння органы дзяржавы падзяляюцца на цэнтральныя і

мясцовыя. Па спосабу стварэння органы дзяржавы падзяляюцца на органы першасныя і другасныя.

У сучасных дзяржавах на адной і той жа тэрыторыі адначасова дзейнічаюць органы дзяржавы і органы мясцовага самакіравання і кіравання. Органы дзяржавы заўсёды выступаюць ад імя ўсёй дзяржавы і выконваюць частку паўнамоцтваў, якія належаць дзяржаве цалкам. Органы мясцовага самакіравання і кіравання ствараюцца ў пэўных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках, яны выяўляюць інтарэсы і патрэбы той сацыяльнай супольнасці, якая стала пражывае на пэўнай тэрыторыі, мае свае адметныя інтарэсы і забяспечвае іх, абапіраючыся на свае ўласныя матэрыяльна-фінансавыя рэсурсы.

Органы мясцовага самакіравання і кіравання ўжываюць у сваёй дзейнасці такія самыя рычагі і метады ўздзеяння на паводзіны насельніцтва і іншых удзельнікаў грамадскіх адносін, якія ўласцівы дзяржаве, і ў гэтых варунках яны нічым не адрозніваюцца ад органаў дзяржавы. Але два моманты найбольш адметна выяўляюць іх спецыфіку. Па-першае, органы мясцовага самакіравання і кіравання ў матэрыяльна-фінансавых адносінах забяспечваюцца з мясцовых рэсурсаў. Па-другое, яны створаны для выяўлення і забеспячэння інтарэсаў менавіта мясцовай супольнасці.

3. Прынцыпы арганізацыі і дзейнасці апарату дзяржавы

Абагульненне багатага і разнастайнага шматвекавога вопыту арганізацыі і дзейнасці апарату дзяржавы дазволіла выпрацаваць імператывы і патрабаванні да арганізацыі і дзейнасці апарату дзяржавы, увасабленне якіх у практыку пабудовы і функцыянавання дзяржаўнага апарату дазваляе забяспечыць эфектыўнае выкананне дзяржаўнай уладай свайго прызначэння ў жыцці грамадства. Імператывы і патрабаванні да арганізацыі і дзейнасці апарату дзяржавы былі паслядоўна выкладзены ў навуковай форме і існуюць у форме фундаментальных ідэй аб тым, якім павінен быць апарат дзяржавы, каб дзяржава найлепшым чынам выконвала сваю місію ў жыцці грамадства. Разам з тым ідэй аб належнай арганізацыі і адмысловым функцыянаванні апарату дзяржавы многа, але далёка не кожная з іх увасабляецца ў практыку дзяржаўна-прававога будаўніцтва. Асобныя з іх хаця і маюць карыснае значэнне, але не заўсёды выкарыстоўваюцца ў дзейнасці апарату дзяржавы.

Толькі тыя фундаментальныя ідэі, якія знайшлі сваё належнае замацаванне ў дзеючым пазітыўным праве ў якасці арганіза-

цыйна-прававых патрабаванняў, імператываў да арганізацыі і дзейнасці апарату дзяржавы, адносяцца да прынцыпаў арганізацыі і дзейнасці апарату дзяржавы. Акрамя таго, патрабаванні, імператывы, якія можна лічыць прынцыпамі арганізацыі і дзейнасці апарату дзяржавы, заўсёды існуюць у якасці асобных арганізацыйна-прававых форм, якія дазваляюць у межах дзеючага права належным чынам арганізаваць апарат дзяржавы і забяспечыць яго адмысловае функцыянаванне.

Існуюць агульныя, універсальныя прынцыпы арганізацыі і дзейнасці апарату дзяржавы, але існуюць і асобныя прынцыпы арганізацыі і дзейнасці асобных структурных частак апарату дзяржавы, якія маюць значэнне пераважна для арганізацыі і функцыянавання асобных відаў органаў і ўстаноў дзяржавы. Да агульных прынцыпаў арганізацыі і дзейнасці апарату дзяржавы адносяцца прынцып легальнасці і легітымнасці, прынцып дэмакратызму, прынцып прафесіяналізму і кампетэнтнасці, прынцып прагназавання і планавасці, прынцып галоснасці.

Прынцып легальнасці і легітымнасці азначае, што апарат дзяржавы, усе яго органы, установы і арганізацыі ствараліся і дзейнічалі на падставе і ў межах дзеючага пазітыўнага права, каб апарат дзяржавы карыстаўся даверам і падтрымкай з боку шырокіх колаў насельніцтва. Такім чынам, прынцып легальнасці і легітымнасці арганізацыі і дзейнасці апарату дзяржавы ўключае ў сябе патрабаванне законнасці, але з'яўляецца больш шырокім. У адзначанай фармулёўцы прынцып патрабуе захавання не толькі патрабаванняў закону, але і ўвогуле права, а таксама і патрабаванняў іншых сацыяльных рэгулятараў, таму што ад гэтага залежыць падтрымка апарату дзяржавы з боку шырокіх колаў насельніцтва і, адпаведна, яго легітымнасць.

Прынцып дэмакратызму патрабуе, каб арганізацыя і функцыянаванне апарату дзяржавы ажыццяўляліся з захаваннем дэмакратычных працэдур і норм, каб да арганізацыі і працы апарату дзяржавы былі прыцягнуты самыя шырокія колы насельніцтва. Прынцып дэмакратызму найбольшае дачыненне мае да ўтварэння тых структур дзяржавы, якія перыядычна абіраюцца насельніцтвам, але ён не можа быць абмежаваны толькі такімі відамі органаў дзяржавы. Захаванне дэмакратычных працэдур і іх карыснасць для належнай арганізацыі і дзейнасці абсалютна ўсіх відаў органаў дзяржавы былі пацверджаны вопытам арганізацыі і дзейнасці апарату ўсіх сучасных цывілізаваных дзяржаў.

Прынцып прафесіяналізму і кампетэнтнасці азначае, што функцыі і кампетэнцыю органаў дзяржавы належным чынам могуць

ажыццявіць прафесіянальна падрыхтаваныя дзяржаўныя служачыя і службовыя асобы, якія валодаюць належнай адукацыяй, пэўнымі навыкамі, здольнасцямі. Гэты прынцып таксама патрабуе, каб паўнамоцтвы, уладныя магчымасці, якімі валодаюць органы дзяржавы, былі дакладна і аднастайна размеркаваны паміж асобнымі звёнамі і асобнымі органамі. Не павінна быць двухсэнсоўнасці ў тым, да ведама якога органа адносіцца тое ці іншае пытанне.

Прынцып прагназавання і планавасці азначае неабходнасць пабудовы апарату дзяржавы, вызначэння яго структуры, колькаснага складу на падставе доўгатэрміновых сацыяльна-эканамічных прагнозаў развіцця грамадства. Ён патрабуе таксама, каб дзейнасць дзяржаўных служачых, усіх службовых асоб была дакладна арганізавана на падставе планаў арганізацыі і дзейнасці апарату дзяржавы.

Прынцып галоснасці ў арганізацыі і дзейнасці апарату дзяржавы патрабуе, каб грамадства ведала аб тым, якім чынам арганізаваны і як дзейнічае апарат дзяржавы, якія пытанні вырашае і якія праблемы збіраецца вырашаць. Грамадства павінна мець магчымасць выказваць сваё меркаванне і сваё стаўленне да арганізацыі і дзейнасці апаратё дзяржавы, у тым ліку і праз сродкі масавай інфармацыі. Разам з тым прынцып галоснасці не можа быць зведзены толькі да магчымасцей насельніцтва, грамадства ведаць аб арганізацыі і дзейнасці апарату дзяржавы, але ён патрабуе, каб апарат дзяржавы быў абавязаны рэагаваць на заўвагі, прапановы і пажаданні з боку грамадства.

4. Кадры апарату дзяржавы. Бюракратыя і бюракратызм, дэмакратыя і дысцыпліна ў дзейнасці апарату дзяржавы

Як вядома, рухаючай сілай апарату дзяржавы з'яўляюцца прафесійныя кіраўнікі, чыноўнікі, дзяржаўныя служачыя. Без гэтай групы людзей, якія ажыццяўляюць асобны від грамадска-карыснай працы, немагчыма выкананне дзяржаўнай уладай ніводнай са сваіх задач і функцый. Грамадства і дзяржава зацікаўлены ў тым, каб дзяржаўную ўладу ажыццяўлялі адмыслова падрыхтаваныя людзі – кадры апарату дзяржавы.

Практыка дзяржаўна-прававога будаўніцтва абумовіла з'яўленне самастойнага сацыяльнага інстытута дзяржаўнай службы, які арганічна ўключае ў сябе прафесійную дзейнасць асобнай групы людзей, якія ажыццяўляюць асобны від грамадска-карыснай працы шляхам ажыццяўлення паўнамоцтваў органаў дзяржавы. Інстытут дзяржаўнай службы ў якасці самастойнага дзяржаўна-прававога інстытута складаецца з прынцыпаў падбору, падрыхтоўкі, пе-

рападрыхтоўкі, матэрыяльна-фінансавага (у тым ліку пенсіённага) забеспячэння гэтай групы людзей, сукупнасці (сістэмы) норм права, якія рэгламентуюць усе бакі функцыянавання дадзенага сацыяльнага інстытута.

Належная арганізацыя дзяржаўнай службы – першапачатковы клопат дзяржавы, таму важнейшыя яе параметры ў сучасных краінах замацоўваюцца на ўзроўні Асноўнага закону краіны, а затым дэталізуюцца і канкрэтызуюцца ў іншых крыніцах права і найперш у законах, напрыклад, у Законе аб дзяржаўнай службе. Вялікай перашкодай належнаму выкананню дзяржаўнай службай свайго прызначэння з'яўляецца бюракратызм. Барацьбе з ім і пераадоленню яго праяў найлепшым чынам спрыяюць дэмакратызацыя апарату дзяржавы, умацаванне дысцыпліны сярод служачых, галоснасць у дзейнасці апарату дзяржавы і кантроль за дзейнасцю апарату дзяржавы як з боку грамадства, так і з боку спецыяльна створаных у гэтых мэтах органаў дзяржаўнага кантролю.

Маладая беларуская дзяржава, сутыкнуўшыяся з бюракратызмам, адразу ж адрэагавала на яго непажаданыя праявы спецыяльнай дырэктывай Прэзідэнта краіны, у якой была замацавана сістэма мер па пераадоленню бюракратызма ў арганізацыі і асабліва ў дзейнасці апарата дзяржавы.

Пытанні для самаправеркі

1. У чым праяўляецца матэрыялізацыя дзяржавы?
2. Раскрыйце змест грамадска-карыснай працы, якую выконвае асобная група людзей (прафесійных кіраўнікоў).
3. Якія прыметы (рысы) характэрны для апарату дзяржавы?
4. Як суадносяцца паміж сабой катэгорыі апарату і функцый дзяржавы?
5. Якія фактары аказваюць уплыў на структуру (будову) і функцыянаванне апарату дзяржавы?
6. Як суадносяцца паміж сабой паняцці «апарат дзяржавы», «дзяржаўны апарат» і «механізм дзяржавы»?
7. Прааналізуйце суадносіны апарату дзяржавы і органаў мясцовага самакіравання і кіравання.
8. Якімі адметнымі рысамі характарызуецца орган дзяржавы?
9. Правядзіце класіфікацыю органаў дзяржавы.
10. У чым Вы бачыце падабенства і розніцу паміж органамі дзяржавы, установамі дзяржавы і дзяржаўнымі арганізацыямі?
11. Дайце паняцце прынцыпаў арганізацыі і дзейнасці апарату дзяржавы і раскрыйце іх змест.
12. Сфармулюйце асноўныя заканамернасці развіцця апарату сучаснай беларускай дзяржавы.

Тэма 9. ПАНЯЦЦЕ, СУТНАСЦЬ І АЗНАЧЭННЕ ПРАВА

1. Сутнасць і азначэнне права.
2. Права і іншыя віды нарматыўных рэгулятараў. Прыметы права, якія адрозніваюць яго ад іншых відаў нарматыўных рэгулятараў.
3. Развіццё права, пераемнасць, абнаўленне і рэцэпцыя ў праве.
4. Прынцыпы і аксіёмы права.
5. Функцыі і эфектыўнасць права.
6. Паняцце прававой сістэмы грамадства і прававой сям'і.
7. Характарыстыка асноўных прававых сем'яў:

а) рамана-германская прававая сям'я;

б) сям'я агульнага права (англа-амерыканская прававая сям'я);

в) мусульманская прававая сям'я.

1. Сутнасць і азначэнне права

Як нам ужо вядома, пад сутнасцю любога прадмета альбо з'явы звычайна разумеюць сукупнасць самых істотных рысаў, устойлівых якасцей і адносін, якія складаюць аснову прадмета альбо з'явы і азначаюць усе астатнія іх якасці і ўласцівасці. Такім чынам, сутнасць права – галоўная якасная аснова права, у якой адлюстроўваюцца сапраўдная прырода і прызначэнне права ў жыцці грамадства. Сутнасць права складаюць тыя яго ўласцівасці і якасці, якія заўсёды прысутнічаюць у праве і страта якіх правам азначае страту правам самаго сябе.

Пры вызначэнні сутнасці права трэба выкарыстаць той самы тэарэтыка-метадалагічны падыход, які быў выкарыстаны пры вызначэнні сутнасці дзяржавы. Справа тут найперш у тым, што толькі аднолькавы тэарэтыка-метадалагічны падыход можа прывесці да супастаўных з навуковага пункту гледжання вынікаў. Гэта – гнасеалагічны аспект праблемы. Але галоўнае тут у тым, што права і дзяржава выраслі з «аднаго кораня». Іх узнікненне ў жыцці грамадства, як было паказана пры вывучэнні паходжання дзяржавы і права, было абумоўлена аднымі і тымі сацыяльна-эканамічнымі пераўтварэннямі ў грамадстве, якія адбыліся ў ходзе і выніку неалітычнай рэвалюцыі. Аднолькавыя прычыны паходжання заканамерна патрабуюць і аднолькавых тэарэтыка-метадалагічных падыходаў да вызначэння іх прыроды.

Такім чынам, сутнасць права можа быць вызначана шляхам арганічнага спалучэння адказаў на два шчыльна ўзаемазвязаныя пытанні: а) як і чаму ўзнікла асобная сістэма сацыяльнага рэгуля-

вання (права) у жыцці грамадства; б) якое прызначэнне мае асобная сістэма сацыяльнага рэгулявання (права) у жыцці грамадства?

Права ўзнікае натуральна-гістарычным шляхам, яно заканамерна і арганічна вырастае з патрэбаў грамадства.

Вядома, што ні адно грамадства не можа існаваць без сацыяльных і ў тым ліку нарматыўных рэгулятараў – правілаў паводзін агульнага характару. Калі сацыяльнае рэгуляванне ў форме разавых даручэнняў, загадаў, распараджэнняў прысутнічае ў грамадстве заўсёды, бо без іх немагчыма ўвогуле скаардынаваць і ўзгадніць сумесныя дзеянні, то нарматыўнае рэгуляванне (другая форма сацыяльнага рэгулявання) узнікае пазней, што было абумоўлена патрэбамі грамадства ахапіць агульным правілам тыповыя сумесныя дзеянні, а затым і акты вытворчасці, размеркавання і абмену прадуктаў, стварыць такі парадак, пры якім асобны чалавек быў бы падпарадкаваны агульным умовам сумеснага пражывання, сумесных дзеянняў, а затым вытворчасці і абмену. Зразумела, што са змяненнем умоў сумесных дзеянняў, сумеснага пражывання, вытворчасці, размеркавання і абмену мяняюцца і правілы паводзін агульнага характару.

Права ўзнікае як натуральная, заканамерная рэакцыя грамадства на неабходнасць урэгуляваць невядомыя першабытнаму грамадству сацыяльна-эканамічныя працэсы і грамадскія адносіны, якія ўзніклі ў выніку трох буйных грамадскіх падзелаў працы, фармавання якаснай маёмаснай няроўнасці, развіцця тавараабмену, а затым і таварна-грашовых адносін. Па сутнасці, у выніку азначаных працэсаў сфармавалася якасна новае грамадства – сістэма грамадскіх адносін, у падмурку якіх знаходзяцца і абумоўліваюць усе праявы грамадскага існавання прыватная ўласнасць і таварна-грашовыя адносіны. Існаваўшая ва ўмовах першабытнага грамадства сістэма нарматыўнага рэгулявання не ў стане адэкватна адрэагаваць на новыя імператывы ў развіцці грамадства. З дапамогай старых, вядомых відаў правілаў паводзін нельга надалей забяспечваць парадак у сістэме якасна новых грамадскіх адносін, якая заснавана на маёмаснай няроўнасці, развіцці рэгулярнага тавараабмену і таварна-грашовых сувязях.

Па свайму зместу, характару яно павінна цалкам адпавядаць якасна новаму грамадству, быць адэкватным зместу і характару рэгулюемых грамадскіх адносін. А паколькі рэгулюемыя правам таварна-грашовыя і шчыльна звязаныя з імі грамадскія адносіны будуюцца на суразмерных асновах, абмен матэрыяльнымі і духоўнымі каштоўнасцямі ажыццяўляецца ў іх па прынцыпу эквівален-

ту, то забяспечыць парадак у эквівалентных, суразмерных па сваёй сутнасці грамадскіх адносінах можна было толькі з дапамогай такіх правілаў паводзін, у якіх былі б сфармуляваны, замацаваны адпавядаючыя зместу рэгулюемых адносінаў самыя розныя па зместу эквіваленты, суразмернасці прававога характару.

Гэтыя прававыя суразмернасці, эквіваленты, правілы паводзін фармулююцца, «бяруцца» з рэальных грамадскіх адносін, заснаваных на эквівалентных асновах. Яны ствараюцца шляхам духоўнага, інтэлектуальнага асэнсавання тых эквівалентных, суразмерных пачаткаў, на якіх будуюцца таварна-грашовыя і шчыльна звязаныя з імі грамадскія адносіны. У гатовым выглядзе прававыя эквіваленты нельга было запазычыць ад іншых відаў сацыяльнага рэгулявання, таму што аналагаў прававых эквівалентаў не магло існаваць у грамадстве, дзе не існавала маёмаснай няроўнасці і тавараабмену.

Як вядома, уласцівыя першабытнаму грамадству правілы паводзін мелі прыродны характар, яны складаліся пад моцным уздзеяннем імператываў прыроднага характару і дазвалялі перашабытнаму чалавеку прыстасавацца да навакольнага асяроддзя. Права фармуецца пад уздзеяннем сацыяльных імператываў, і ў гэтым адно з яго прынцыповых адрозненняў ад правілаў паводзін першабытнага грамадства. Правілы паводзін першабытнага грамадства ведалі адну меру – меру адэкватнага рэагавання на прыродныя імператывы, такога рэагавання, якое б гарантавала выжыванне старажытнага чалавека. Права не можа быць зведзена толькі да адэкватнасці, яно павінна забяспечваць яшчэ і суразмернасць. Адэкватнасць і суразмернасць складаюць такую якасць, як эквівалент. Такім чынам, па сваёй сутнасці, па свайму прызначэнню ў грамадстве права зводзіцца да эквіваленту.

Усе матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці ва ўмовах тавараабмену павінны быць параўнаны паміж сабой. Адсюль становіцца зразумелым, чаму права сімвалізуецца шалямі, якія знаходзяцца ў руху. Для аддзякі роўным неабходна знайсці ўраўненне паміж рознымі па каштоўнасці абменьваемымі паслугамі і прадуктамі. Напачатку трэба знайсці прапарцыянальную меру роўнасці, а затым ужо на гэтай падставе здзейсніць аддзяку роўным. Па ўзору гандлёвага абмену і ў права ўводзіцца абмен аднаго прадмета на другі. Чалавечае жыццё падвяргаецца расцэнцы, устанаўліваецца новая роўнасць больш тонкага і складанага тыпу – пазбаўленне волі, грашовыя выплаты і г. д. Фармуецца ўраўненне, якое дазваляе вымераць усялякую шкоду: калі вырвана, напрыклад, барада, то падлічваюцца валаскі і за кожны волас бяруцца грошы.

Сказанае дазваляе сцвярджаць, што *права ўяўляе такі від сацыяльнага рэгулявання, які ўзнікае ў выніку з'яўлення ў грамадстве маёмаснай няроўнасці, развіцця таварна-грашовых адносін і ў падмурку якога ляжыць эквівалент*.

Эквівалентнасць у грамадскіх адносінах складаецца як вынік мноства адхіленняў ад яе, у выніку сутыкнення ўсяго мноства патрэбнасцей і інтарэсаў індывідаў, сацыяльных груп, слаёў, якія ўступаюць у грамадскія адносіны, заснаваныя на суразмерных пачатках. Удзельнікі грамадскіх адносін зацікаўлены ў тым, каб надаць эквівалентнаму пачатку ўсеагульны характар, замацаваць яго і захоўваць яго надалей. Натуральна, што асобныя групы насельніцтва імкнуцца замацаваць у праве выгадныя ім уяўленні аб суразмернасці, надаць ім з дапамогай сілы, у тым ліку сілы дзяржавы, усеагульнае, абавязковае для ўсёй супольнасці значэнне. Ідзе «барацьба за права». Безумоўна, сам па сабе тавараабмен не існуе ў чыстым выглядзе і сам па сабе не здольны аўтаматычна гарантаваць і забяспечыць уласнымі сродкамі ідэю эквівалентнасці ў грамадскіх адносінах. Рэальна на працэсы выпрацоўкі і ўвасаблення эквівалентных пачаткаў у жыцці грамадства ўздзейнічаюць усе сацыяльныя сілы, усе групы насельніцтва, праўда, адны ў большай, а другія – у меншай ступені. У сучасных грамадстве на працэсы фармавання эквівалентных пачаткаў вельмі моцны ўплыў аказвае дзяржава. Яна не толькі абараняе прававыя эквіваленты і надае ім фармальна азначаны характар. Абапіраючыся на тэндэнцыі развіцця таварна-грашовых грамадскіх адносін, яна стварае якасна новыя і невядомыя грамадству прававыя суразмернасці.

Ідэя эквівалентнага пачатку ў грамадскіх адносінах – першая выключна прававая ідэя, прыватная праява залатога правіла нарматыўнага рэгулявання ўвогуле: «кожнаму па яго справах». Дадзеная ідэя з усёй дакладнасцю пачала праводзіцца ў жыццё ў прававых сістэмах па меншай меры пасля стварэння законаў XII табліц. У старажытным Рыме існавала нават пасада асобнага прэтара, які павінен быў «раўняць» адносіны, г. зн. рабіць іх эквівалентнымі, суразмернымі. Дарэчы, рымскае права запазычыла ідэю эквівалентнасці з грэчаскай філасофіі. Але гэта стала магчымым толькі пасля таго, як сфармаваўся рэгулярны тавараабмен з яго эквівалентнымі пачаткамі, суразмернасцямі. Прынцып эквівалентнасці, узнікшы ў сферы рэгулярнага тавараабмену, паступова пранікае ва ўсе сферы сацыяльнага жыцця, у тым ліку і ў адносіны публічна-прававога характару.

У сваім станаўленні права заканамерна праходзіць тры этапы, стадыі, на якіх яно існуе ў адпаведнай форме.

Першапачаткова права зараджаецца ў таварна-грашовых адносінах. Удзельнікі гэтых адносін вымушаны ствараць пэўныя трафарэты, стандарты, правілы, нормы, з дапамогай якіх можна ўрэгуляваць сацыяльныя сувязі. Працэс гэты можа адбывацца стыхійна, але часцей за ўсё знаходзіцца пад кантролем грамадства і кожнага ўдзельніка грамадскіх адносін. Але ў любым выпадку пэўны трафарэт, пэўнае правіла паводзін будзе абавязкова створана, бо без яго існаваць і нармальна развівацца існуючыя ў грамадстве таварна-грашовыя адносіны не ў стане. Так ствараецца першасная форма існавання права – прававыя адносіны. Калі права існуе першапачаткова толькі ў гэтай форме, яго часта называюць у літаратуры варварскім правам.

Сістэма створаных грамадствам прававых эквівалентаў затым паступова асэнсоўваецца ўдзельнікамі грамадскіх адносін у якасці справядлівых, заканамерных, патрэбных грамадству правілаў паводзін. Фармуюцца сістэмныя ўяўленні аб праве, аб тым, якім яно павінна быць. Даследуюцца заканамернасці і тэндэнцыі яго ўзнікнення і развіцця. Складваецца сістэма навуковых поглядаў на права, асобная форма грамадскай свядомасці – прававая свядомасць, якая і ўяўляе сабой другую форму існавання права – прававую свядомасць.

Наяўнасць прававой свядомасці сведчыць аб тым, што ў грамадстве існуе якасна новы від сацыяльнага рэгулявання і што грамадства мае аб гэтым дакладнае ўяўленне. Уяўленні аб праве павінны быць замацаваны на ўзроўні ўсяго грамадства, і ім павінна быць нададзена агульнаабавязковае значэнне. Без гэтага створанае ў грамадстве права не будзе мець завершанай формы. Адбываецца гэта шляхам замацавання прававых эквівалентаў у сістэме афіцыйна ўсталяваных крыніц права. Афіцыйна замацаванае ў грамадстве права называецца пазітыўным правам і складае трэці этап, трэцюю форму існавання права.

Адзначаныя тры формы існавання права – гэта тры яго праявы, тры іпастасі. Кожная з іх уключае ў сябе адны і тыя самыя прававыя эквіваленты, сродкі, інструменты, прыёмы, але знешнія праявы іх існавання розныя. Сэрцавіна, эквівалентны стрыжань у іх адзін, а сродкі адлюстравання, замацавання і выражэння розныя. Наяўнасць у праве трох адзначаных форм яго існавання сведчыць аб развітасці права. Гісторыя развіцця права гаворыць аб тым, што аб існаванні «паўнавартаснага» права сведчыць наяўнасць у

праве трох адзначаных форм. Праўда, у кожнага з гістарычных і зараз існуючых народаў адна з форм існавання права на пэўных этапах развіцця права дамінавала, яна падпарадкоўвала астатнія дзве формы існавання права. Дамінаванне пэўнай формы існавання права азначае, што і логіку даследавання права і выкладання яго вынікаў можна будаваць, абапіраючыся менавіта на дадзеную форму існавання права.

Азначэнне сутнасці права – гэта той «краевугольны камень», які павінен заўсёды вызначаць падыходы і характарыстыку асобных праяваў прававой матэрыі, асобных яе часцінак. Тэорыя права патрабуе сістэмнасці і лагічнасці ў асвятленні права, усіх яго праяў, яго будовы (структуры), развіцця, функцыянавання. Канцэптуальныя ідэі павінны пранізваць увесь аб'ём тэарэтычных ведаў аб праве, як, дарэчы, і аб дзяржаве. Не варта «збіраць» і выдаваць курсы лекцый па «ласкутнаму прынцыпу».

Для еўрапейскай дактрынальнай традыцыі характэрна, што тэорыя права распрацоўвалася пераважна на падставе аналізу пазітыўнага права. Усе астатнія катэгорыі і паняцці права, у якіх вызначаюцца прырода, змест і іншыя ўласцівасці правасвядомасці і прававых адносін, арганічна далучаюцца да катэгорый і паняццяў, праз якія вывучаецца пазітыўнае права. Не выпадкова самыя першыя падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, якія былі напісаны ў дарэвалюцыйнай Расіі ў XIX ст. аўтарамі, атрымаўшымі грунтоўную юрыдычную адукацыю ва універсітэтах Германіі, мелі назву «Законазнаўства» ці «Дагматыка права».

Пры распрацоўцы лекцыйнага курса і на працягу яго шматгадовага выкладання аўтар прытрымліваўся еўрапейскай дактрынальнай традыцыі. Таму пасля вызначэння сутнасці і зместу права, форм яго існавання ўвага засяроджваецца на характарыстыцы асноўнай у рамана-германскай прававой сям'і формы існавання права – пазітыўнага права, якая ў юрыдычнай літаратуры часта называецца нарматыўнай часткай. Падрабязна даследуецца норма права, затым яе крыніцы, у прыватнасці, крыніцы права Рэспублікі Беларусь, таму што беларуская нацыянальная прававая сістэма па многіх параметрах уваходзіць у склад рамана-германскай прававой сям'і. А пасля вывучэння сістэмы права, межаў яго дзеяння і дзеяння крыніц права разглядаюцца пытанні стварэння права і сістэматызацыі яго крыніц. І, нарэшце, аналіз нарматыўнай часткі права лагічна завяршаецца аналізам працэсаў рэалізацыі і прымянення права.

Другія формы існавання права ў такім разе вывучаюцца пасля даследавання яго нарматыўнай часткі ў наступнай паслядоўнасці: спачатку прававая свядомасць, а затым – прававыя адносіны.

Такім чынам, раздзел лекцыйнага курса, у якім разглядаюцца асноўныя катэгорыі і паняцці тэорыі права, у асноўным прысвечаны даследаванню пазітыўнага права (нарматыўнай часткі права). Другую ж па ліку і сярэдзінную па месцы знаходжання ў сістэме форм права форму існавання права – правасвядомасць – у асноўным вывучае філасофія права, вучэбны курс якой ужо на працягу некалькіх гадоў чытаецца ва Установе адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы». А на даследаванні такой формы існавання права, як прававыя адносіны, засяроджвае ўвагу пераважна сацыялогія права.

2. Права і іншыя віды нарматыўных рэгулятараў. Прыметы права, якія адрозніваюць яго ад іншых відаў нарматыўных рэгулятараў

У папярэдніх тэмах мы даволі падрабязна разглядзелі сістэму нарматыўнага рэгулявання, якая была ўласціва першабытнаму грамадству. Нагадаем, што ва ўмовах прысвойваючай эканомікі, якая была заснавана на прысваенні гатовых жывёльных і раслінных форм, грамадства наводзіла парадак ва ўзаемаадносінах з дапамогай разнастайных *табу, міфаў,* а пасля таго, як паступова стала пераходзіць да актыўнага ўмяшальніцтва ў навакольнае асяроддзе, з'явіліся *і календары (агранамічныя і жывёлагадоўчыя).* Кожная асобная першабытная абшчына мела і сваю асобную і адметную сістэму сацыяльнага рэгулявання, а кожны з адзначаных відаў правілаў паводзін рэгуляваў свой пласт грамадскіх адносін.

Старая сістэма сацыяльнага рэгулявання ў новых умовах аказваецца непрыдатнай, яна не можа быць мадэрнізавана ці дапоўнена новым відам правілаў паводзін, як гэта было раней, калі табу былі арганічна дапоўнены міфамі, а сістэма рэгулявання з табу і міфаў, у сваю чаргу, была дапоўнена календаром. Старая сістэма сацыяльнага рэгулявання развальваецца, і на яе рэштках фармуецца новая. На месцы монанарматыўнай сістэмы складваецца «полінарматыўная сістэма», у якой не проста існуюць розныя віды правілаў паводзін, а гэтыя віды правілаў паводзін пачынаюць рэгламентаваць якасна розныя віды грамадскіх адносін. Кожны з гэтых відаў сацыяльных рэгулятараў мае свой адметны механізм і свае адметныя сродкі ўздзеяння на паводзіны людзей. Акрамя гэтага, значнасць асобных відаў сацыяльных рэгулятараў вызначаецца ў новых умовах значнасцю рэгулюемых імі грамадскіх адносін.

Натуральна, што «эпіцэнтрам» новай сістэмы сацыяльнага рэгулявання з'яўляецца права, а побач з ім, ва ўзаемадзеянні і дапаўненні, дзейнічаюць мараль, звычаі, традыцыі. Працягваюць існаванне ў змененым выглядзе і такія сацыяльныя рэгулятары, як табу і міф, праўда, іх роля і значэнне ў жыцці грамадства памяншаюцца.

Пры разглядзе сістэмы нарматыўнага рэгулявання першабытнага грамадства былі сфармуляваны агульныя для ўсіх відаў правілаў паводзін рысы, уласцівасці. Пры паходжанні права былі вызначаны прыметы, якія праводзяць «гістарычную мяжу» паміж «даправавым» і «прававым» грамадствам. З дапамогай гэтых прымет можна акрэсліць якасныя ўласцівасці права ў параўнанні з тымі нарматыўнымі рэгулятарамі, якія былі ў першабытным грамадстве. Але паколькі ў якасна новым грамадстве адначасова суіснуюць як права, так і іншыя віды нарматыўных рэгулятараў, то ўзнікае патрэба вызначыць тыя прыметы, якія вылучаюць права з сістэмы іншых нарматыўных рэгулятараў у якасна новы від нарматыўнага рэгулявання. Пры параўнанні гэтых прымет з аналагічнымі прыметамі дзяржавы паміж імі можна знайсці нейкае падабенства і асобныя паралелі.

Права адрозніваецца ад іншых відаў нарматыўных рэгутараў, па-першае, тым, што з'яўляецца адзіным універсальным, інтэгратыўным відам нарматыўнага рэгулявання. Пры распадзе монанарматыўнай сістэмы, якая была адзінай для рэгулявання ўсіх відаў грамадскіх адносін і адзінай для ўсіх удзельнікаў грамадскіх адносін, кожны з новых, самастойных відаў правілаў паводзін заняў сваё адметнае месца, сваю «нішу», па-першае, сярод сацыяльных рэгулятараў, а, па-другое, пры ўздзеянні на тыя ці іншыя віды (пласты) грамадскіх адносін, якія ў далейшым і пачалі вызначаць развіццё якасна самастойных відаў сацыяльных рэгулятараў. Права займае не проста галоўнае месца ў сістэме нарматыўнага рэгулявання і рэгулюе самыя істотныя для «новага грамадства» адносіны, яно з'яўляецца адзіным рэгулятарам, які мае агульнае абавязковае значэнне для кожнага суб'екта грамадскіх адносін незалежна ад яго волі і жадання. Падобна таму, як дзяржава выступае ад імя ўсяго грамадства, так і права мае агульнаабавязковае значэнне для ўсяго грамадства.

Па-другое, старая сістэма нарматыўнага рэгулявання была разлічана на адносна адасобленыя і аўтаномныя сацыяльныя структуры, а ў новых умовах узнікае патрэба ў універсальным відзе сацыяльнага рэгулявання, бо таварна-грашовыя адносіны маюць міжпляменны і міжродавы характар, яны пранізваюць усё грамад-

ства. У гэтых умовах толькі права можа быць інтэгратыўным рэгулятарам, які забяспечвае аднолькавае і аднастайнае рэгуляванне грамадскіх адносін.

Па-трэцяе, падобна таму як дзяржава (дзяржаўная ўлада) у грамадстве мае такую якасць, як суверэнітэт, права мае ўласцівасць, якая падобна на суверэнітэт дзяржавы – вяршэнства (прыярытэт) над іншымі відамі нарматыўных рэгулятараў. Адзінства нарматыўнага рэгулявання, яго агульнаабавязковасць і універсальны характар забяспечваюцца пры ўмове, калі права мае перавагу пры рэгуляванні адных і тых самых адносін над іншымі відамі нарматыўных рэгулятараў.

Па-чацвёртае, толькі права мае самыя шчыльныя ўзаемасувязі і ўзаемадачыненні з дзяржавай. Гэтыя сувязі маюць для права істотнае значэнне, таму што без іх права губляе сваю агульную значнасць, свой універсальны характар. Дзяржава забяспечвае адзінства ў разуменні і рэалізацыі права ва ўсім грамадстве і на ўсёй тэрыторыі дзяржавы.

3. Развіццё права, пераемнасць, абнаўленне і рэцэпцыя ў праве

Права – адвечны спадарожнік грамадства, якое ўзнікла ва ўмовах якаснай і колькаснай маёмаснай няроўнасці ў грамадстве, у выніку развіцця рэгулярнага тавараабмену, таварна-грашовых адносін. Таварна-грашовыя адносіны з'яўляюцца той сферай грамадства, якая абумоўлівае ўсе працэсы, якія адбываюцца ў праве. Усе перамены, зрухі ў праве, якія тычацца пераменаў у змесце і формах існавання права, абазначаюцца паняццем «развіццё права».

Распаўсюджанне таварна-грашовых адносін у грамадстве, а таксама тых сацыяльных сувязей, якія абумоўлены таварна-грашовымі адносінамі, заканамерна азначае і пашырэнне сферы (поля) дзеяння права, і, наадварот, звужэнне таварна-грашовых пачаткаў у пэўнай сферы існавання грамадства азначае, што менавіта там звужаецца, змяншаецца сфера (поле) дзеяння права. Пашырэнне і звужэнне сферы дзеяння права з'яўляюцца асноўнымі формамі, праявамі развіцця права. Гісторыя развіцця права сведчыць, аднак, аб тым, што асноўным накірункам (асноўнай формай) развіцця права з'яўляецца пашырэнне сферы яго дзеяння.

Павелічэнне колькасці самастойных відаў таварна-грашовых і шчыльна звязаных з імі грамадскіх адносін, якія для свайго належнага рэгулявання, патрабуюць адэкватных і суразмерных свайму зместу прававых эквівалентаў. Дадзеныя эквіваленты, безумоў-

на, ствараюцца ў грамадстве, асэнсоўваюцца ў форме прававой свядомасці і замацоўваюцца ў нормах права. Натуральна, што ў гэтых умовах заканамерна адбываецца павелічэнне колькасці прававых эквівалентаў і адпаведна ўзрастае колькасць норм права. Павелічэнне аб'ёму дзеючага пазітыўнага права, такім чынам, уяўляе адну з заканамернасцей развіцця права. Натуральна, што другой заканамернасцю развіцця права, якая лагічна выцякае са звужэння сферы дзеяння права, з'яўляецца змяншэнне аб'ёму дзеючых норм права.

Але аб багацці прававой сістэмы, яе дасканаласці і ўзроўні развіцця сведчыць не колькасць і не аб'ём норм права, а разнастайнасць прававых эквівалентаў, з дапамогай якіх права ўздзейнічае на грамадскія адносіны. Чым большы і разнастайны спектр прававых эквівалентаў выкарыстоўваецца ў прававой сістэме, тым больш дасканалым з'яўляецца права. Дасканаласць права – гэта магчымасць з дапамогай прававой формы, сістэмы прававых эквівалентаў найбольш адэкватна ўздзейнічаць на грамадскія адносіны.

З'яўленне новых відаў таварна-грашовых адносін і адпаведных іх зместу прававых эквівалентаў абумоўлівае не толькі павелічэнне аб'ёму дзеючых норм права, але заканамерна суправаджаецца дыферэнцыяцыяй прававога рэгулявання і спецыялізацыяй паміж нормамі права, у якіх замацоўваюцца якасна новыя прававыя эквіваленты. Разам з тым, паміж асобнымі відамі таварна-грашовых адносін існуюць сувязі каардынацыі і інтэграцыі, якія абумоўлены адзінствам практычнай дзейнасці людзей. Гэта заканамерна патрабуе інтэграцыі прававога рэгулявання, абагульнення асобных прававых эквівалентаў і стварэння агульных прававых палажэнняў і норм права.

Таварна-грашовыя пачаткі пранізваюць практычна ўсе праявы чалавечага існавання, а следам за імі ў тыя самыя праявы жыцця чалавека пранікае і права. Пранікненне права ў новыя сферы існавання грамадства суправаджаецца тым, што права пачынае там дамінаваць, яно займае ў гэтых сферах сацыяльнага рэгулявання вяршэнства, прыярытэт першынства над іншымі відамі сацыяльнага рэгулявання. Іншыя правілы паводзін альбо выцясняюцца з гэтых сфераў існавання грамадства, альбо вымушаны падпарадкоўвацца прававым пачаткам, саступаючы першынство праву. Падпарадкаванне праву азначае, што яны не павінны разыходзіцца з правам у накірунках рэгулятыўнага ўздзеяння на грамадскія адносіны. Калі іншыя віды сацыяльнага рэгулявання супярэчаць прававым патрабаванням, то яны забараняюцца. Іншыя віды сацыяльна-

га рэгулявання могуць уздзейнічаць на тыя самыя пласты грамадскіх адносін іншымі сродкамі і ў гэтым плане садзейнічаць праву, узмацняць яго рэгулятыўны патэнцыял. Але яны могуць таксама ўздзейнічаць на іншыя пласты адных і тых самых грамадскіх адносін і арганічна дапаўняць права.

Калі аналізаваць развіццё права ў гістарычным ракурсе, то можна адзначыць наступнае. Грамадства развіваецца такім чынам, што ў ім, па-першае, з'яўляюцца якасна новыя віды таварна-грашовых адносін, па-другое, з жыцця грамадства знікаюць тыя віды таварна-грашовых адносін, якія страчваюць сваю значнасць для грамадства, і, нарэшце, па-трэцяе, доўгі час захоўваюцца практычна ў нязменным выглядзе і форме асобныя віды таварна-грашовых адносін. З'яўленне ў праве невядомых раней прававых эквівалентаў і адпаведна норм права ў мэтах адэкватнага ўздзеяння на якасна новыя віды грамадскіх адносін можна аднесці да працэсаў абнаўлення права. Захаванне ў праве доўгі час раней вынайдзеных эквівалентаў і норм пазітыўнага права для рэгулявання тых таварна-грашовых адносінаў, якія існуюць доўгі час, а таксама іх выкарыстанне для ўздзеяння на іншыя грамадскія адносіны, можна характарызаваць паняццем пераемнасці ў праве.

Права мае універсальны характар, але развіваецца пераважна ў нацыянальных формах. Разам з тым, паколькі таварна-грашовыя адносіны не абмяжоўваюцца межамі нацыянальных дзяржаўных утварэнняў, а маюць транснацыянальны, міжнародны характар, то транснацыянальныя, міжнародныя па сваёй прыродзе таварна-грашовыя адносіны з непазбежнасцю прыводзяць да неабходнасці стварэння універсальных прававых стандартаў, да збліжэння нацыянальных прававых эквівалентаў, нацыянальных прававых сістэм. Гэта суправаджаецца працэсамі гарманізацыі і уніфікацыі ў праве.

Для развіцця права характэрна і такая з'ява, як рэцэпцыя (запазычанне) права. З рэцэпцыяй у праве мы сутыкаемся, калі адна нацыянальная прававая сістэма запазычвае не проста вопыт развіцця прававых сістэм мінулага і іншых паралельна існуючых нацыянальных прававых сістэм, а зусім дакладныя і канкрэтныя прававыя эквіваленты (нормы права), асобныя прававыя інстытуты і нават галіны права.

Адначасова адзначым, што прававыя эквіваленты ў межах нацыянальных прававых сістэм, г. зн у межах нацыянальнай прававой прасторы, фіксуюцца, замацоўваюцца і выкладаюцца ў разнастайных крыніцах норм права, а агульныя для некалькіх нацыянальных прававых сістэм прававыя эквіваленты (нормы права)

фіксуюцца, замацоўваюцца і выкладаюцца ў двух- і шматбаковых пагадненнях – дагаворах, пактах, канвенцыях і г. д.

Пры гэтым у прававых эквівалентах, якія фармулюцца ў нормах права, замацоўваецца і выкладаецца далёка не ўся «прававая матэрыя», а толькі самая істотная, самая сутнасная, самая значная яе частка, тая частка, без якой немагчыма забяспечыць эквівалентную прыроду таварна-грашовых адносін. Астатняя частка, можна сказаць, «аб'ём прававой матэрыі», існуе і функцыянуе ў іншых формах – у форме правасвядомасці, прававой навукі, прававой культуры і г. д. Можна лічыць, што зафіксаваная і замацаваная ў нормах права частка «прававой матэрыі» складае своеасаблівае «прававое поле». Можна таксама сцвярджаць, што «прававое поле» ўяўляе сабой асвоеную нацыянальнымі суб'ектамі праватворчасці ў межах нацыянальнай прававой прасторы, а таксама дзяржавамі ў межах рэгіянальнай і сусветнай прававой прасторы частку нацыянальнай, рэгіянальнай і сусветнай прававой прасторы, г. зн. пэўны зрэз (пэўную частку) усёй «прававой матэрыі».

У межах прававога поля асобнай нацыянальнай дзяржавы можа ўстанаўлівацца, стварацца асобны прававы рэжым ці на частцы тэрыторыі дзяржавы, ці адносна асобных відаў грамадскіх адносін, ці адносна асобных удзельнікаў (суб'ектаў) грамадскіх адносін. У гэтым выпадку, як уяўляецца, можна гаварыць пра своеасаблівыя «прававыя зоны», якія праяўляюцца ў форме асобных (ці свабодных) эканамічных зон і існуюць у выглядзе нейкіх прававых ільгот, прававых выключэнняў, прававых прэферэнцый і г. д.

Шляхам самых разнастайных пагадненняў асобныя дзяржавы на сваіх тэрыторыях могуць устанаўліваць, замацоўваць агульныя толькі для іх прававыя эквіваленты (нормы права). Такім шляхам была створана Еўрапейская супольнасць, а таксама права Еўрапейскай супольнасці, ствараецца права Садружнасці Незалежных Дзяржаў і г. д. Добра вядома, што права Еўрапейскай супольнасці было сфармавана на падставе прызнання шэрагам еўрапейскіх краін агульных для іх стандартаў (прававых эквівалентаў) дзеля рэгулявання працэсаў перамяшчэння тавараў, капіталаў і працоўнай сілы на тэрыторыях дадзеных дзяржаў. Такім чынам, дадзеныя дзяржавы як бы прызналі сваю нацыянальную тэрыторыю часткай агульнай тэрыторыі Еўрапейскай супольнасці дзеля перамяшчэння па ёй тавараў, капіталаў і працоўнай сілы, распаўсюдзіўшы на яе агульныя для Еўрапейскай супольнасці прававыя эквіваленты ў выглядзе прававых стандартаў. Пры гэтым агульнай для супольнасці тэрыторыя нацыянальных дзяржаў з'яўляецца толькі ў той частцы і

ў той меры, у якіх яна неабходна дзеля дзеяння на ёй агульных прававых стандартаў Еўрапейскай супольнасці.

Дадзеныя і да іх падобныя прававыя ўтварэнні, якія створаны на падставе ўзаемадзеяння, збліжэння і інтэграцыі нацыянальных прававых сістэм, можна разглядаць з прававога пункту гледжання ў якасці асобных рэгіянальных «прававых зон». Пашырэнне гэтага віду «прававых зон» адбываецца шляхам прызнання іншымі дзяржавамі ва ўстаноўленым парадку і са згоды іх стваральнікаў абавязковымі для сябе агульных (універсальных) прававых эквівалентаў у форме прававых стандартаў. Паглыбленне дадзеных «прававых зон» ажыццяўляецца шляхам выпрацоўкі ўсё новых і новых, агульных для іх стваральнікаў прававых эквівалентаў, г. зн. шляхам адмовы ад права на стварэнне ўласна нацыянальных прававых эквівалентаў, ці, што адно і тое самае, ад суверэнных праў на іх стварэнне.

4. Прынцыпы і аксіёмы права

Прынцыпы права – фундаментальныя, асноватворчыя, вядучыя ідэі, у якіх адлюстроўваюцца самыя значныя, найбольш істотныя ўласцівасці, якасці права і праз якія канкрэтызуецца і «разгортваецца» сутнасць права. Праз сістэму такіх ідэй адбываецца дэталізацыя эквівалентнай прыроды права. У гэтым плане нельга адносіць да прынцыпаў права ідэі і ўяўленні, якія не маюць сваіх каранёў у праве, якія сфармуляваны ў межах іншых форм грамадскай свядомасці і характарызуюць сутнасць і змест іншых відаў сацыяльных рэгулятараў.

У прынцыпах (ідэях) права як бы сінтэзуецца сусветны вопыт развіцця права. Прынцыпы права з'яўляюцца своеасаблівым «сухім асадкам» прававой матэрыі, гэта яе шкілет, яе сутнасць, вызваленая ад канкрэтыкі і дробязей. Паколькі сутнасць права ва ўсе часы існавання і развіцця права заставалася нязменнай, то і да прынцыпаў права трэба адносіць такія фундаментальныя ідэі аб праве, якія здатны ахарактарызаваць права незалежна ад гістарычнага этапа яго развіцця. Праўда, прынцыпы могуць напаўняцца розным канкрэтна-гістарычным прававым зместам і ўключаць розныя па форме, але аднолькавыя па сутнасці прававыя эквіваленты.

Ёсць розніца паміж прынцыпамі права і прынцыпамі закону. Апошнія ўяўляюць ідэі, у тым ліку і прававога характару, якія замацоўваюцца ў выдаваемых дзяржавай нарматыўна-прававых актах (законах), іншых крыніцах права. Паколькі ў законах могуць

знайсці адлюстраванне не толькі прававыя ідэі, але і маральныя, палітычныя, рэлігійныя, іншага кшталту ідэі, то далёка не кожны прынцып закону з'яўляецца прынцыпам права. Уласна кажучы, прынцыпы права з'яўляюцца стабільнымі, нязменнымі. Прынцыпы закона больш рухомыя, яны могуць мяняцца. З другога боку, здараецца і так, што не ўсе прынцыпы права замацоўваюцца ў законе альбо замацоўваюцца не ў поўным аб'ёме. І тады яны не атрымліваюць абароны з боку дзяржавы.

1. Прынцып адзінства правоў і абавязкаў. У гэтым прынцыпе найбольш грунтоўна адлюстроўваецца эквівалентная сутнасць права. Суразмернасць у абмене матэрыяльнымі і духоўнымі каштоўнасцямі можа быць захавана толькі пры ўмове, калі кожны з сацыяльных суб'ектаў і грамадства цалкам захоўвае свае абавязкі на прадстаўленне пэўнай меры каштоўнасцей узамен на атрыманыя ў карыстанне, ва ўласнасць каштоўнасці ў іншай форме. Няма праў без абавязкаў, як не можа быць і абавязкаў без праў – так скарочана гучыць гэты прынцып. Ніхто не мае права прэтэндаваць на нейкую меру каштоўнасцей, калі сам не перадае ва ўласнасць ці карыстанне іншым суб'ектам грамадскіх адносін пэўныя каштоўнасці. Сувязь праў і абавязкаў мае розныя формы праяўлення, якія абумоўлены характарам і зместам абменьваемых каштоўнасцей. Яна можа праяўляцца ў спалучэнні права аднаго суб'екта з абавязкам другога альбо ў форме, калі кожны з суб'ектаў мае нейкія правы і адначасова выконвае нейкія абавязкі.

2. Прынцып фармальнай роўнасці суб'ектаў права. Ён азначае, што, уступаючы ў адносіны маёмаснага характару, сацыяльныя суб'екты натуральна вымушаны прызнаваць адзін аднаго фармальна роўным сабе. Пры гэтым кожны з сацыяльных суб'ектаў павінен мець свабоду волі. Толькі пры такіх умовах можа быць захаваны эквівалентны (суразмерны) характар рэгулюемых правам грамадскіх адносін. Выпрацаваны эквівалент (мера, норма) з'яўляецца адзіным для ўсіх суб'ектаў права маштабам паводзін. Гэты адзіны маштаб накладваецца, прымяняецца да розных па сваіх здольнасцях, маёмаснаму становішчу, узросту, сямейнаму стану і г. д. суб'ектаў, а гэта натуральна прыводзіць да няроўнасці ў грамадстве. Але гэта няроўнасць з'яўляецца справядлівай, заканамернай і прававой, бо вынікае з права, абумоўлена ім.

Такім чынам, справядлівасць у праве зводзіцца да прымянення роўнага, аднолькавага маштабу да розных людзей, што прыводзіць да фактычнай няроўнасці. Права па сваёй сутнасці не ведае іншай справядлівасці, акрамя той, якая вынікае з фармальнай

роўнасці ўдзельнікаў грамадскіх адносін і заканамерна вядзе да фактычнай няроўнасці. Фактычная няроўнасць і ёсць справядлівасць у прававым сэнсе слова. Таму ў праве не існуе асобнага прынцыпу справядлівасці. Справядлівасць у праве з'яўляецца лагічнай і заканамернай праявай прынцыпу фармальнай роўнасці бакоў. Нельга прыкладваць да права меру і шкалу маральнай справядлівасці і вылучаць сярод прынцыпаў права ў якасці асобнага прынцыпу прынцып справядлівасці і фармуляваць яго ў якасці нейкага універсальнага патрабавання да права.

3. Прынцып усеагульнай фармальнай роўнасці суб'ектаў права. Яго змест у тым, што выпрацаваныя аднойчы ў грамадстве эквівалент, мера, норма рэгулявання павінны быць прыкладзены абсалютна да ўсіх грамадскіх адносін аднаго і таго роду і віду. Для характару дадзенага прынцыпу права не мае значэння знешняя форма існавання эквівалента (прававыя адносіны, прававая свядомасць ці нормы права) і той від крыніцы права, у якой будзе замацаваны прававы эквівалент (закон, прававы прэцэдэнт і г. д.) Дадзены прынцып «выраўноўвае» ўсіх суб'ектаў права, забяспечвае ім роўныя магчымасці (правы) і роўныя абавязкі. Таму як патрабаванне законнасці, так і патрабаванне раўнапраўнасці, якія вылучаюцца асобнымі аўтарамі ў якасці самастойных прынцыпаў права, з'яўляюцца толькі праявамі прынцыпу ўсеагульнай фармальнай роўнасці суб'ектаў права.

Разам з тым неад'емнымі складанымі часткамі гэтага прынцыпу з'яўляюцца разнастайныя прававыя льготы і выключэнні рознага кшталту. Справа ў тым, што шэраг суб'ектаў права па прычыне сваіх псіхафізічных асаблівасцяў (інваліды, хворыя і г. д.) і па іншых абставінах не могуць аб'ектыўна ўдзельнічаць у эквівалентных грамадскіх адносінах на прынцыпе фармальнай роўнасці, а гэта, у сваю чаргу, прыводзіць да парушэння адзінства правоў і абавязкаў. Менавіта для забеспячэння фармальнай роўнасці суб'ектаў права і прадугледжваюцца разнастайныя прававыя выключэнні і льготы.

Можна выказаць меркаванне, што наяўнасць многіх выключэнняў у праве абумоўлена моцным уплывам, ціскам на права такога універсальнага сацыяльнага рэгулятара, як мараль. Маральныя перакананні грамадства патрабуюць усталявання перашкодаў для забеспячэння прававой справядлівасці і фактычнай няроўнасці.

4. Прынцып усеагульнай сацыяльнай кантралюемасці. Паколькі вытворчасць каштоўнасцей мае непасрэдна грамадскі характар, то грамадства мае непасрэдны, можна сказаць, «прававы» інтарэс у кантролі за іх абменам і размеркаваннем.

Удзельнікі грамадскіх адносін зацікаўлены ў тым, каб пры перамяшчэнні, пры абмене каштоўнасцей адной формы на каштоўнасці іншай формы не парушаліся суразмерныя пачаткі, эквівалентнасць у грамадскіх адносінах, бо гэта, у сваю чаргу, парушае нармальнае, прававое існаванне соцыума. Суразмернасць у грамадскіх адносінах можа быць рэальна забяспечана, калі працэсы размеркання і перараз меркавання каштоўнасцей знаходзяцца пад непасрэдным кантролем з боку грамадства і яго афіцыйнага прадстаўніка – дзяржавы. Грамадства і дзяржава зацікаўлены ў тым, каб паставіць пад свой кантроль усе матэрыяльна-фінансавыя патокі ў грамадстве з тым, каб кожны ўдзельнік прававых адносін атрымаў ад грамадства, ад іншых суб'ектаў права тое, што эквівалентна, суразмерна яго ўкладу ў скарбонку грамадства і дзяржавы. У грамадства і дзяржавы не існуе іншага сродку забеспячэння эквівалентнасці ў грамадскіх адносінах, акрамя сродкаў сацыяльна-прававога і дзяржаўна-прававога кантролю.

Прынцып усеагульнай сацыяльнай кантралюемасці дазваляе таксама абгрунтаваць неабходнасць умяшальніцтва дзяржавы ў грамадскія адносіны, якія заснаваны на эквівалентных, суразмерных пачатках. Дзяржава не можа пакінуць па-за ўвагай працэсы размеркавання і неразмеркавання матэрыяльна-фінансавых каштоўнасцей, таму што яна з'яўляецца афіцыйным прадстаўніком грамадства і вымушана забяспечыць усеагульны сацыяльны інтарэс. А ў сацыяльнай кантралюемасці прававых адносін закладзена і магчымасць дзяржаўнага прымусу.

5. Прынцып спалучэння пераканання і прымусу. Эквівалентнасць у грамадскіх адносінах можа быць захавана пры ўмове, калі парушаная суразмернасць узнаўляецца альбо кампенсуецца. Ужо на ранніх этапах існавання права былі выпрацаваны два універсальныя сродкі захавання суразмернасці ў грамадскіх адносінах – пераканане і прымус. Калі першапачаткова выкарыстоўваліся «варварскія» прыёмы прымусу, то затым паступова фармуюцца цывілізаваныя органы і ўстановы, напрыклад, суд. Існаванне суда як спецыфічнага інстытута грамадства абумоўлена, такім чынам, неабходнасцю абароны і захавання права.

6. Прынцып адказнасці за віну. Існаванне права, магчымасць яго парушэння абумоўліваюць існаванне ў грамадстве інстытута юрыдычнай адказнасці. Прынцып адказнасці за віну азначае, што непажаданыя наступствы, г. зн. юрыдычная адказнасць, наступаюць толькі ў тым выпадку, калі парушэнне права, невыкананне абавязкаў з'яўляюцца лагічным вынікам віны парушальніка.

Вобразна кажучы, прынцыпы права – гэта душа права. Яны пранізваюць усе прававыя з'явы, усю прававую сістэму. Яны маюць вялікае значэнне ў праватворчасці (заканатворчасці) і правапрымяненні. Менавіта прынцыпы права забяспечваюць сістэмнасць у заканатворчасці, сістэмнасць заканадаўства і ўсіх іншых крыніц права. У правапрымяненні да прынцыпаў права звяртаюцца, калі ў сістэме заканадаўства выяўляюцца прабелы і іх трэба запоўніць. Актыўна выкарыстоўваюцца прынцыпы права ў прававым выхаванні і ў падрыхтоўцы спецыялістаў-юрыстаў (пры выкладанні права на юрыдычных факультэтах універсітэтаў і ў юрыдычных інстытутах, акадэміях у кантынентальнай прававой сістэме).

Адны прынцыпы знаходзяць прамое замацаванне ў нормах закона, іншых крыніцах права (напрыклад, прынцып адказнасці за віну). Іншыя прынцыпы, наадварот, не фармулююцца ў канкрэтных нормах, але адлюстроўваюцца ў іх шэрагу. Ва ўсе часы заканадаўцы розных народаў імкнуліся дакладна і адназначна сфармуляваць сутнасць права, раскрыць яго змест праз фармулёўку прынцыпаў права. Свядома сфармуляваны і замацаваны прынцып права змяншае аб'ём, колькасць неабходных для прававой сістэмы норм права.

У адрозненне ад прынцыпаў права, якія ўяўляюць сабой фундаментальныя ідэі аб праве і маюць найбольш агульны, універсальны характар і ў якіх адлюстроўваюцца самыя істотныя якасці права, у прававой сістэме існуюць больш канкрэтныя паняцці і ідэі, з дапамогай якіх адбываюцца канкрэтызацыя і дэталізацыя прынцыпаў права. Гэта прававыя аксіёмы. У адрозненне ад прынцыпаў права, якія ствараюцца шляхам вывучэння заканамернасцей фармавання, функцыянавання і развіцця права і складаюцца з абагульненняў з высокай ступенню абстракцыі, прававыя аксіёмы ствараліся ў ходзе практычнага прававога вопыту, яны, умоўна кажучы, «арганічна выраслі» з паўсядзённых патрэбаў у прававых зносінах.

Людзі ў сваёй практычнай дзейнасці мільёны разоў сутыкаюцца з неабходнасцю паўтора нейкіх мадэляў паводзін, пасля чаго гэтыя мадэлі фактычна пераўтвараюцца ў агульнапрызнаваемыя і абавязковыя для выканання нормы права, калі гэта тычыцца грамадскіх адносін, заснаваных альбо абумоўленых маёмаснай няроўнасцю, тавараабменам і таварна-грашовымі адносінамі. У гэтым сэнсе аксіёмы права – гэта «першацаглінкі» права, яго самыя простыя, элементарныя нормы. Фармулюючы новыя правілы паводзін, любы заканадавец заўсёды так альбо інакш зыходзіць з найбольш вядомых, простых правілаў, выпрацаваных ягонымі папярэднікамі

ці прававой практыкай. Часцей за ўсё аксіёмы знаходзяць замацаванне ў законах альбо іншых крыніцах права. Але адметнай уласцівасцю менавіта аксіём права з'яўляецца тое, што яны фактычна існуюць і дзейнічаюць у прававых сістэмах нават тады, калі не знаходзяць афіцыйнага выражэння. Іншымі словамі, прававыя аксіёмы з'яўляюцца прававымі звычаямі ці нормамі звычаёвага характару. У міжнародным праве існуе паняцце агульнапрызнаных норм міжнароднага права, пад якімі разумеюцца прававыя палажэнні, што былі выпрацаваны на працягу стагоддзяў у практыцы міжнародных зносінаў і якія ўжываюцца і выкарыстоўваюцца без дадатковых аргументаў толькі таму, што іх карыснасць не патрабуе гэтага.

Праз аксіёмы права адбываецца пераемнасць у праве. У розных прававых сістэмах яны набываюць іншы славесны выраз, але захоўваюць пры гэтым свой змест. Вядома, што ў Кодэксе Напалеона, які быў выдадзены ў буржуазнай Францыі, былі замацаваны многія палажэнні рымскага права, якія вытрымалі выпрабаванне часам. Сярод іх мы знаходзім амаль усе сфармуляваныя рымлянамі аксіёмы. Прававыя аксіёмы з'яўдяюцца свайго роду «залатым фондам» прававых норм, якія склаліся ў ходзе развіцця чалавецтва. Адмова ад іх выкарыстання, невыкананне аксіём можа прывесці да таго, што права страціць сваю сацыяльную значнасць, не зможа забяспечыць у поўнай меры ўстойлівасць, парадак і арганізаванасць у грамадскіх адносінах. Вось некаторыя аксіёмы права: ніхто не можа быць суддзёй у сваёй уласнай справе; ніхто не абавязаны сябе абвінавачваць; няхай будзе выслуханы і іншы бок; асабістая карысць адступае перад грамадскай.

5. Функцыі і эфектыўнасць права

Падобна прынцыпам права, яго функцыі таксама «высвечваюць» сутнасць права, асноўныя ўласцівасці і якасці яго зместу. Але, у адрозненне ад прынцыпаў права, якія адлюстроўваюць сутнасць права ў яе, так сказаць, «статычным плане», функцыі раскрываюць яго сутнасць у «дынаміцы», у ходзе ўздзеяння права на грамадскія адносіны.

Пад функцыямі права можна разумець азначаемыя яго сутнасцю асноўныя напрамкі ўздзеяння на грамадскія адносіны і паводзіны людзей. У функцыях права праяўляюцца яго адметныя, спецыфічныя ўласцівасці, якія вынікаюць з яго якаснай самастойнасці і праяўляюцца пры ўздзеянні на грамадскія адносіны. Гэта такія напрамкі ўздзеяння права, якія ажыццяўляюцца кожнай з форм існа-

вання права, але ўласцівымі кожнай з іх механізмамі. Функцыі права характарызуюцца пастаянствам, паколькі яны накіраваны на ажыццяўленне карэнных задач, што абумоўліваюць існаванне самаго права як сацыяльнай з'явы. Разам з тым са зменай зместу грамадскіх адносін, рэгулюемых правам, мяняюцца механізмы, формы, сродкі, з дапамогай якіх права ўздзейнічае на сацыяльныя працэсы. Гэта азначае, што ў межах асноўных напрамкаў уздзеяння права на грамадскія адносіны ў яго змесце адбываюцца перамены, сэнс якіх у тым, каб забяспечыць адэкватнае, суразмернае рэагаванне на ўзнікаючыя праблемы грамадскага існавання.

У юрыдычнай літаратуры склаліся розныя погляды на класіфікацыю функцый права, характарыстыку іх зместу і механізмаў ажыццяўлення.

Найбольш грунтоўным уяўляецца сістэмны падыход да разгляду функцый права. Яго асаблівасць заключаецца ў тым, што выдзяленне саміх функцый і характарыстыка іх зместу адбываюцца ў залежнасці ад ролі права ў жыцці грамадства і яго асобных элементаў. Разгледзім функцыі права ў залежнасці ад яго ролі да грамадства цалкам, да дзяржавы і да асобы. Гэтыя ракурсы даследавання функцый дзяржавы заснаваны на асноўных структурных сувязях права ў сістэме сацыяльных каардынат. Адносна грамадства права выконвае сацыяльную місію па захаванню стабільнасці і ўмоў для самаразвіцця грамадства, і гэтая місія павінна быць суразмернай і адэкватнай тым імператывам, якія вылучае грамадства. Праз сувязі з дзяржавай высвятляюцца яго «дзяржаваўтваральныя» магчымасці, якія заснаваны на ўнутраных якасцях права, якія характарызуюць толькі дадзены сацыяльны рэгулятар. А праз узаемадзеянне з асобай – рэгулятыўныя магчымасці права, якія заснаваны на перадачы асобе пэўных імператыўных вяленняў прававога зместу і ў прававой форме. Характарыстыка кожнай з адзначаных структурных сувязей можа ажыццяўляцца праз вызначэнне задач, якія вырашаюцца правам.

У адносінах да грамадства цалкам права вырашае тры важнейшыя задачы. Па-першае, права павінна ўладкаваць грамадскія адносіны, стабілізаваць іх, замацаваць існуючыя сацыяльныя сувязі. Па-другое, права павінна забяспечыць магчымасць развіцця і ўдасканалення грамадскіх адносін. Па-трэцяе, права павінна гарантаваць абарону ўжо існуючых грамадскіх адносін і тых адносін, якія толькі складваюцца. Гэтыя тры задачы вырашаюцца шляхам ажыццяўлення трох функцый права. Першая задача – рэгулятыўна-статычнай функцыяй, другая – рэгулятыўна-дынамічнай, трэ-

цяя – ахоўнай функцыяй. Кожная з адзначаных функцый рэалізуецца адметнымі юрыдычнымі сродкамі і механізмамі. Рэгулятыўна-статычная функцыя ажыццяўляецца з дапамогай забарон на нейкія сацыяльныя дзеянні шляхам ускладання на ўдзельнікаў грамадскіх адносін пасіўных абавязкаў. Для рэгулятыўна-дынамічнай функцыі характэрна надзяленне сацыяльных суб'ектаў правамі, замацаванне самых розных, у тым ліку і агульных дазволаў на сацыяльныя дзеянні, ускладанне на іх актыўных абавязкаў. Ахоўная функцыя праводзіцца ў жыццё шляхам прымусу да здзяйснення нейкіх дзеянняў і ўскладання юрыдычнай адказнасці. Ахоўная функцыя права з'яўляецца ў адносінах да першых дзвюх у пэўным сэнсе слова «інтэграцыйнай», бо яна гарантуе іх рэалізацыю.

Як пры характарыстыцы функцый дзяржавы адзначалася неабходнасць вывучэння і захавання межаў уздзеяння дзяржавы на грамадскія адносіны, так гэта трэба падкрэсліць і адносна функцыянальнай характарыстыкі права. Права не ў стане кансерваваць развіццё і тым больш забараніць тыя адносіны грамадства, якія параджаюць права, з'яўляюцца яго «родавай пупавінай». Права разам з тым не ў стане стварыць якасна новыя грамадскія адносіны. У праве можна замацаваць прававыя магчымасці для актыўных дзеянняў суб'ектаў грамадскіх адносін, можна замацаваць прававыя стымулы для актыўных паводзін, напрыклад, усталяваць пэўныя льготы па падаткаабкладанню пры ажыццяўленні пэўнага віду грамадска-карыснай дзейнасці, але саму грамадска-карысную дзейнасць стануць ажыццяўляць суб'екты грамадскіх адносін, вынікам дзеяння якіх і можа стаць новы від грамадскіх адносін.

У праве можна замацаваць разнастайныя забароны і ўсталяваць юрыдычную адказнасць за ажыццяўленне пэўных дзеянняў і пэўнага віду грамадскай дзейнасці, але калі грамадства ў сваёй большасці не выступае супраць такіх дзеянняў і відаў дзейнасці, то само па сабе права выцесніць іх з жыцця грамадства не ў стане.

У адносінах да дзяржавы права вырашае дзве галоўныя задачы і выконвае, адпаведна, дзве функцыі. Па-першае, права з'яўляецца адзіна магчымым нарматыўным рэгулятарам, з дапамогай якога можна дакладна і адназначна акрэсліць паўнамоцтвы дзяржавы, яе органаў і ўстаноў, суадносіны гэтых органаў паміж сабой, парадак іх фармавання і ліквідацыі. Па-другое, права з'яўляецца адзіна магчымым сродкам, з дапамогай якога дакладна акрэсліваюцца ўзаемаадносіны дзяржавы і грамадства. Права з'яўляецца ў гэтым выпадку той адзіна магчымай «мовай», на якой дзяржава размаўляе з грамадзянамі. У першым выпадку мы маем

справу з арганізацыйнай функцыяй права, у другім – з кіруюча-рэгулятыўнай.

У адносінах да асобы, якая знаходзіцца ў сферы дзеяння таварна-грашовых і абумоўленых імі сацыяльных сувязей, права вырашае дзве галоўныя задачы. Па-першае, права з'яўляецца адзіна магчымым сацыяльным рэгулятарам, у якім асоба знаходзіць дакладна азначаныя арыенціры паводзін у прававой сферы, атрымлівае інфармацыю аб мерах і формах магчымых і абавязковых паводзін. Ніводзін іншы сацыяльны рэгулятар дадзеную задачу вырашыць не ў стане. Па-другое, прававая сацыялізацыя асобы, якая забяспечвае цалкам адэкватныя паводзіны ў сферы дзеяння права, адбываецца толькі шляхам засваення прававых каштоўнасцей. Такім чынам, у адносінах да асобы права выконвае дзве функцыі: арыентацыйную (інфармацыйную) і выхаваўчую (каштоўнасна-арыентацыйную).

Функцыянальная характарыстыка сацыяльных з'яў звычайна суправаджаецца аналізам іх выніковасці. У самым агульным плане пад эфектыўнасцю права можна разумець выніковасць уздзеяння права на грамадскія адносіны, на дзяржаву і на асобу. Выніковасць можа быць дакладна вымерана, вызначана праз супастаўленне права з іншымі сацыяльнымі рэгулятарамі пры вырашэнні адных і тых самых задач. Толькі пры гэтай умове можна зрабіць выснову аб тым, наколькі вынікова права вырашае тыя задачы, якія вынікаюць з яго структурных сувязей з грамадствам, дзяржавай і асобай. Без параўнання вынікаў уздзеяння права на таварна-грашовыя адносіны і адносіны, якія шчыльна з імі ўзаемазвязаны, з уздзеяннем на гэтыя самыя грамадскія адносіны іншых сацыяльных рэгулятараў аб выніковасці права разважаць немагчыма. Але паколькі абсалютна зразумела, што толькі права можа вырашыць тыя задачы адносна грамадства цалкам, дзяржавы і асобы, аб якіх было адзначана ніжэй, і ніякі іншы сацыяльны рэгулятар зрабіць гэта не можа па сваёй прыродзе, то ў метадалагічных адносінах пастаноўка пытання аб эфектыўнасці права з'яўляецца некарэктнай.

Разам з тым, сказанае адносна магчымасцей вымярэння эфектыўнасці права не азначае негатыўнага, адмоўнага стаўлення да права, тым больш прыніжэння яго ролі ў жыцці грамадства, што характэрна да такой з'явы, як прававы нігілізм. Разуменне рэальных магчымасцей права ў жыцці грамадства стварае перашкоды і для іншай, не менш адмоўнай з'явы – прававога ідэалізму ці прававога фетышызму, якія характарызуюцца перабольшаннем ролі і значнасці права ў жыцці грамадства. Права здатнае толькі на тое,

дзеля чаго яно было створана, дзеля забеспячэння адэкватнага і суразмернага ўздзеяння на грамадскія адносіны. Калі ж забеспячэнне эквівалентнасці ў грамадскіх адносінах не вырашае шматлікіх праблем у грамадстве, то ў гэтым віна не права, а грамадства. Яно ў гэтым разе павінна шукаць адказы на тое, якім чынам можна вырашыць свае праблемы не ў сферы права, а ў іншых сферах свайго існавання. Забеспячэнне ж эквівалентнасці ў грамадскіх адносінах дасягаецца адзіным шляхам – шляхам удасканалення прававых эквівалентаў, іх развіццём і найбольш поўнай рэалізацыяй у грамадскіх адносінах.

Зразумела, што паміж функцыямі права і функцыямі дзяржавы існуюць не толькі шчыльныя ўзаемаадносіны, але і падабенства. Як функцыі дзяржавы, так і функцыі права ўяўляюць асноўныя накірункі дзеяння гэтых вельмі важных інстытутаў грамадства на само грамадства, г. зн. вызначаць ролю часткі цэлага адносна цэлага. Функцыянальная характарыстыка дзяржавы абапіраецца на адносную самастойнасць дзяржавы ад грамадства. Гэта ўласціва і для права, якое складаецца з сістэмы прававых эквівалентаў, якія адэкватны і суразмерны прыродзе грамадскіх адносін, але не тоесны тым эквівалентам, якія існуюць у рэальных грамадскіх адносінах. Гэта дазваляе праву ўздзейнічаць на грамадскія адносіны не «люстэркава», а з улікам задач, якія паўстаюць перад грамадствам і дзяржавай. Гэта значыць, што права дае магчымасць выбару розных механізмаў, метадаў і прыёмаў прававога ўздзеяння. Як для функцый дзяржавы застаюцца нязменнымі асноўныя кірункі ўздзеяння на грамадскія адносіны, так і для права яны застаюцца стабільнымі і аднымі і тымі самымі, праўда, пры змене механізмаў, метадаў і прыёмаў прававога ўздзеяння. У залежнасці ад мэт і задач грамадства і дзяржавы права можа кансерваваць і стабілізаваць розныя пласты і віды грамадскіх адносін рознымі метадамі і рознымі прыёмамі.

Як вядома, функцыі дзяржавы ажыццяўляюцца праз тры універсальныя формы: праваствараючую, правапрымяняльную і праваахоўную. У сваю чаргу, асноўнымі формамі, якія забяспечваюць існаванне і функцыянаванне права, таксама з'яўляюцца такія формы функцыянавання дзяржавы, як яе ўздзеянне на права пры яго фармаванні (стварэнні права), яго рэалізацыі і ахове (абароне).

6. Паняцце прававой сістэмы грамадства і прававой сям'і

Прававая сістэма ўяўляе, па-першае, разгорнутую ва ўсіх адносінах і існуючую ў трох формах сутнасць права, па-другое, уключае структурную арганізацыю сутнасці права і, па-трэцяе, працэсы рэалізацыі і прымянення права. Яна складваецца з наступных асноўных кампанентаў (элементаў): а) прававыя адносіны (першасныя і другасныя); б) прававая свядомасць; в) нормы права; г) крыніцы права; д) стварэнне права і яго рэалізацыя

Асобнае месца ў прававой сістэме займае суд і звязанае з яго дзейнасцю правасуддзе. Сутнасць судовай улады, на наш погляд, зводзіцца да таго, каб забяспечыць уласцівы той альбо іншай супольнасці нармальны, правільны, справядлівы і выніковы шлях фармавання, усведамлення, замацавання і рэалізацыі прававых эквівалентаў. Такім чынам, судовая ўлада ўяўляе нейкую асобную функцыю грамадства, а яе носьбіт – суд – асобны, незалежны ад заканадаўчай і правапрымяняльнай частак прававой сістэмы сродак захавання, развіцця і функцыянавання права і прававой сістэмы на ўсіх этапах іх станаўлення і існавання. Адсюль вынікае, што самастойнасць, незалежнасць судовай улады – не нейкая тэарэтычная канструкцыя, модны тэзіс, а безумоўнае, найістотнейшае патрабаванне, што вынікае з самой сутнасці права.

Прававая сістэма кожнай дзяржавы адлюстроўвае заканамернасці развіцця грамадства, яго гістарычныя, нацыянальныя, культурныя асаблівасці, адметнасць станаўлення, развіцця і функцыянавання права кожнай супольнасці. На змест і дынаміку прававой сістэмы ўздзейнічае ўся духоўная культура грамадства: рэлігія, філасофія, мараль, мастацкая культура, навука. Вялікі ўплыў аказвае таксама дзяржава, палітыка цалкам, палітычная культура.

Кожная дзяржава мае сваю прававую сістэму, якой уласцівы свае спецыфічныя, адметныя рысы. Разам з тым у ёй прысутнічаюць і нейкія рысы, якія існуюць у прававых сістэмах іншых дзяржаў. Па свайму падабенству, адзінству прававыя сістэмы дзяржаў аб'ядноўваюцца ў групы, «прававыя сем'і». Аб'яднанне прававых сістэм у сем'і адбываецца на падставе юрыдычнага інструментарыя: крыніц права, месца суда ў прававой сістэме, дзялення дзеючых норм права на матэрыяльныя і працэсуальныя, а таксама на нормы публічнага і прыватнага права. У юрыдычнай навуцы склаліся розныя падыходы да выдзялення прававых сем'яў. Кіруючыся рознымі метадалагічнымі падыходамі, яны выдзяляюць часта розныя па зместу прававыя сем'і, якія перасякаюцца, называюць розную іх колькасць. Ахарактарызуем у самых агульных рысах некаторыя прававыя сем'і.

7. Характарыстыка асноўных прававых сем'яў

а) рамана-германская (кантынентальная) прававая сям'я

Да рамана-германскай (кантынентальнай) прававой сям'і адносяцца прававыя сістэмы, якія пачалі фармавацца ў кантынентальнай Еўропе ў XII–XIII ст. на падставе: рэцэпцыі рымскага права, кананічных норм і мясцовага звычаёвага права. Значную ролю ў станаўленні рамана-германскай прававой сям'і адыгралі найстарэйшыя універсітэты Італіі, Францыі, Германіі. Менавіта ва універсітэтах гістарычнае рымскае права, у асаблівасці Звод законаў Юсцініяна, было падвергнута дасканаламу вывучэнню, пачала фармавацца юрыдычная навука (дактрына). Паралельна з даследаваннем рымскага права адбывалася вывучэнне кананічнага права і нацыянальных прававых сістэм. Усё гэта ў сінтэзе падрыхтавала глебу да наступных кадыфікацый у кантынентальнай Еўропе на падставе агульных дактрынальных палажэнняў, навуковых і юрыдычных схем і канструкцый.

Кананічнае права навучала дакладнасці, фармальнай азначанасці і лагічнасці ў выкладанні разнастайных прававых эквівалентаў. Юрыдычная навука спрыяла фармаванню шырокіх, абстрактнага характару абагульненняў. Класічнае рымскае права прадаставіла гатовыя, універсальныя прававыя схемы і канструкцыі, якія можна было рэцэпіраваць амаль цалкам і выкарыстаць пры рэгуляванні набіраўшых развіццё ў гэты час у Еўропе таварна-грашовых адносін. А мясцовае звычаёвае права стала той прававой глебай, той скарбонкай прававога вопыту, які павінен быў быць апрацаваны, сістэматызаваны і выкладзены ў лагічнай паслядоўнасці з дабаўленнямі прававых палажэнняў, якія адпавядалі новаму часу.

Натуральна, што ўсе вышэйакрэсленыя фактары сталі перадумовамі фармавання адзіных нацыянальных прававых сістэм, а затым і сям'і рамана- германскага права. Рухаючымі сіламі працэсу, які завяршыўся стварэннем нацыянальных прававых сістэм і прававой сям'і, сталі: а) фармаванне агульнацыянальных рынкаў; б) фармаванне цэнтральнай дзяржаўнай улады.

Для прававых сістэм рамана-германскай прававой сям'і характэрна тое, што ўсе яны маюць добра распрацаваныя сістэмы заканадаўства, у якіх прызнаецца вяршэнства закона над іншымі нарматыўна-прававымі актамі і ўвогуле крыніцамі права. Асноўным законам у іх з'яўляецца пісаная Канстытуцыя, праводзіцца сістэматызацыя і кадыфікацыя заканадаўства. Прызнаецца дзяленне права на публічнае і прыватнае. Вялікая роля адводзіцца навуцы

(дактрыне), якая раней распрацавала асноўныя прынцыпы пабудовы гэтай прававой сістэмы, а зараз, у сучасны перыяд, мае вялікі ўплыў на заканатворчасць і ў правапрымяняльным працэсе. Для захавання Канстытуцыі, для падтрымання строгай іерархіі сярод крыніц права ў прававых сістэмах рамана-германскай прававой сям'і ствараюцца спецыяльныя органы канстытуцыйнага нагляду (кантролю) – Канстытуцыйныя суды.

б) сям'я агульнага права (англа-амерыканская прававая сям'я)

Сваімі каранямі гэта сістэма звязана з нарманскім заваяваннем Англіі ў 1066 г. Асноўная роля ў яе фармаванні належыць каралеўскім судам. Справа ў тым, што да нарманскага заваявання на тэрыторыі Англіі дзейнічала мясцовае звычаёвае права, якое мела мясцовы, «партыкулярны» характар. Стварэнне агульнай для Англіі прававой сістэмы ўзялі на сябе каралеўскія суды, якія, пачынаючы з XIII ст., засядалі ў Вястмінсцеры. Да сям'і агульнага права належаць прававыя сістэмы Англіі і Уэльса (Шатландыя і Паўночная Ірландыя не падпарадкоўваюцца англійскаму праву), ЗША, Канады, Аўстраліі, Новай Зеландыі, а таксама прававыя сістэмы іншых былых калоній Брытанскай імперыі.

У адрозненне ад дзяржаў рамана-германскай прававой сям'і, дзе асноўнай крыніцай права з'яўляецца такая крыніца права, як нарматыўны прававы акт, у англа-амерыканскай прававой сям'і такая роля належыць судоваму прэцэдэнту – норме, якая была сфармулявана судом пры разглядзе канкрэтнай справы. Для англа-амерыканскай прававой сям'і не ўласціва дзяленне права на публічнае і прыватнае, на права цывільнае, гандлёвае, адміністрацыйнае і г. д. Але ў англійскай прававой сістэме існуе іншы структурны падзел: агульнае права, заснаванае на прэцэдэнце; права справядлівасці, якое дапаўняе і карэктуе агульнае права; статутнае права – пісанае права, створанае парламентам.

Гістарычныя асаблівасці фармавання англійскага права прывялі да таго, што пераважнае значэнне надавалася не нормам матэрыяльнага права, якія ўстанаўліваюць правы і абавязкі ўдзельнікаў грамадскіх адносін, а працэдуры, працэсуальным нормам. Справа ў тым, што каралеўскія суды разглядалі спрэчкі толькі па загаду караля, канцлера. Каб атрымаць такі загад (дазвол), трэба было захаваць пэўную працэдуру. Англійскае права развівалася па прынцыпу: права там, дзе ёсць і абарона.

в) мусульманская прававая сям'я

Прававыя сістэмы мусульманскіх дзяржаў маюць свае асаблівасці, разам з тым усе яны сфармаваліся і дзейнічаюць на падставе ісламa. Мусульманскае права склалася ў Арабскім халіфаце ў VII–X ст. Іслам зыходзіць з таго, што права прыйшло ад Алаха, які адкрыў яго людзям праз прарока Мухамеда. Своеасаблівасць мусульманскага права ў тым, што яно ахоплівае ўсе сферы сацыяльнага жыцця, а не толькі тыя, якія адносяцца да прававой сферы.

Асноўнай крыніцай права ў мусульманскім праве лічыцца Каран. Цесна да яго прымыкае Суна – збор расказаў (ходзісаў) тых людзей, якія блізка ведалі Мухамеда. У гэтых расказах апісваюцца ўчынкі, паводзіны, выказванні прарока. Каран складаецца з 114 сур (главаў), а Суна – з шасці кананічных зборнікаў. Трэцяя крыніца права – іджма – адзінагалосная думка знаўцаў ісламa, вучоных-правазнаўцаў, якія на падставе Карана і Суны сфармулявалі норму мусульманскага права. Чацвёртая крыніца – кіяс-аналогія. У мусульманскім праве выдзяляецца пісанае права – шарыят і звычаёвае права – адаты. Нормы, якія зыходзяць ад дзяржавы, не могуць супярэчыць прадпісанням ісламa.

Пытанні для самаправеркі

1. Ці быў уласцівы эквівалент функцыянаванню грамадскіх адносін ва ўмовах першабытнага грамадства?
2. Ці ёсць розніца паміж эквівалентнасцю ў грамадскіх адносінах і эквівалентамі, якія замацоўваюцца ў праве?
3. Чаму ў праве існуюць розныя па зместу эквіваленты?
4. Назавіце формы, у якіх існуе права, раскрыйце іх змест.
5. У чым Вы бачыце багацце прававой сістэмы?
6. Якія фактары абумоўліваюць развіццё права і ў якіх асноўных формах яно развіваецца?
7. Раскрыйце змест паняццяў пераемнасці і абнаўлення ў праве.
8. На якіх момантах існавання права грунтуецца праваперaемнасць?
9. Што ўяўляе сабой рэцэпцыя права?
10. На чым заснаваны прававая дыферэнцыяцыя, прававая інтэграцыя, прававая гарманізацыя і інтэграцыя?
11. Як суадносяцца паміж сабой прынцыпы права і прынцыпы закону?
12. Як мяняюцца прынцыпы права ў ходзе развіцця права?
13. Назавіце прынцыпы права, раскрыйце іх змест.
14. У чым падабенства і розніца ў разуменні аксіём права ў філасофіі, дакладных навуках (матэматыцы і інш.) і юрыспрудэнцыі?
15. Як суадносяцца паміж сабой прынцыпы і аксіёмы права?

16. Дайце функцыянальную характарыстыку права.

17. Якой Вам бачыцца роля дзяржавы ў рэалізацыі права, яго функцый?

18. У чым праяўляецца «інтэграцыйны» характар ахоўнай функцыі права?

19. Як суадносяцца паміж сабой функцыі дзяржавы і функцыі права?

20. Што ўяўляе сабой прававая сістэма грамадства, з якіх элементаў яна складваецца?

21. Якія фактары абумоўліваюць існаванне розных сем'яў прававых сістэм?

22. Ці магчыма фармаванне нейкай агульнай, «інтэграцыйнай» прававой сістэмы?

Тэма 10. НОРМА ПРАВА

1. Паняцце, прыметы і азначэнне нормы права.
2. Будова (структура) нормы права.
3. Віды норм права.
4. Спосабы выкладання норм права ў тэксце нарматыўнага прававога акта.
5. Эфектыўнасць норм права.

1. Паняцце, прыметы і азначэнне нормы права

Мы ведаем, што права існуе ў трох формах: у форме прававых адносін, прававой свядомасці і пазітыўнага права. Кожная з іх уключае ў сябе адны і тыя самыя прававыя эквіваленты, сродкі, інструменты, прыёмы, але спосабы існавання, адлюстравання, замацавання і выражэння прававых эквівалентаў у кожнай з адзначаных форм існавання права розныя. Прававыя эквіваленты, прыёмы, сродкі і г. д. пранізваюць усе формы існавання права. Разам з тым кожная з форм існавання права, акрамя прававых па свайму зместу эквівалентаў, утрымлівае таксама і іншыя элементы (часткі) прававой матэрыі.

Вядома таксама, што пазітыўнае права з'яўляецца дамінуючай, «канцэнтраванай» выявай, формай існавання права ў раманагерманскай прававой сям'і. Дадзенай форме, умоўна кажучы, падпарадкоўваюцца дзве астатнія формы – правасвядомасць і правааднасіны. Але гэта своеасаблівае падпарадкаванне. Прававыя эквіваленты, суразмернасці, якія выкладзены і замацаваны ў пазітыўным праве і знешне існуюць у якасці правіла, якое замацавана

на нейкім матэрыяльным носьбіце, нельга адарваць ад правасвядомасці і ад прававых адносін, таму што без іх успрыняцця грамадскай і асабістай прававой свядомасцю і ўвасаблення ў прававых адносінах яны пераўтвараюцца ў фікцію.

Пры самым першасным набліжэнні да норм права можна выказаць меркаванне аб тым, што ў нормах права замацоўваюцца пэўныя прававыя эквіваленты. Норма права можа ўтрымліваць у сабе адзін прававы эквівалент, адзін прыём, адно прававое правіла, адзін прававы сродак, адно азначэнне, а магчыма, і некалькі прававых эквівалентаў, прыёмаў, правілаў, сродкаў, азначэнняў. Колькасны паказчык у дадзеных варунках не мае істотнага значэння для паняцця нормы права. Галоўнае значэнне мае той факт, што ў норме права заўсёды ўтрымліваецца нейкі прававы эквівалент у нейкай форме, нейкі прыём, нейкае азначэнне, нейкая мера прававых паводзін і г. д. Норма права не можа і не павінна змяшчаць у сваім змесце неправавыя рэальнасці, неправавую матэрыю, неправавыя азначэнні, мэты і задачы. Для ўвасаблення, выражэння і замацавання неправавой матэрыі, напрыклад, маральнай, існуюць іншыя сродкі і іншыя віды сацыяльных рэгулятараў. Праўда, у нормах права, якія замацоўваюцца ў пісаных крыніцах права, заканадавец у шырокім сэнсе слова можа выкласці асобныя неправавыя палажэнні. Але гэта не адмяняе агульнага правіла: у нормах права выкладаецца і замацоўваецца прававая матэрыя – прававыя эквіваленты разнастайнага характару.

У юрыдычнай навуцы існуе слушнае меркаванне аб тым, што суадносіны права і норм права можна разглядаць як суадносіны агульнага і асобнага, і ў гэтым разе правільнай будзе выснова аб тым, што норма права захоўвае, утрымлівае ў сабе ўсе прыметы права як агульнага. Нельга не пагадзіцца і з думкамі аб тым, што норма права ўяўляе адносна самастойную прававую з'яву, для якой характэрны рысы, якія не ўласцівы праву цалкам. Але зусім не лагічна ў такім разе пасля заяўленых тэзісаў у далейшым называць сярод прымет нормы права тыя яе рысы, якія ўласцівы праву цалкам – сувязь з дзяржавай (норма зыходзіць ад дзяржавы ці санкцыянуецца дзяржавай), што рэалізацыя прававой нормы забяспечваецца дзяржавай, дзяржаўнай абаронай, а, калі трэба, і дзяржаўным прымусам, што норма права мае агульнаабавязковы характар і г. д. Варта, як уяўляецца, пасля такіх грунтоўных тэарэтычных тэзісаў адзначыць толькі тыя якасці нормы права, якія не ўласцівы праву цалкам, бо прыметы права, а таксама тыя прыметы, якімі яно адрозніваецца ад правілаў паводзін першабытнага грамадства, як,

дарэчы, і аб правілах паводзін першабытнага грамадства, іх якасцях, аб іншых дзяржаўна-прававых рэальнасцях уважлівым студэнтам ужо добра вядома з папярэдніх тэмаў дадзенага выдання.

Нормам права ўласцівы шэраг прымет, якія падкрэсліваюць, па-першае, адметнае аблічча менавіта гэтай прававой рэальнасці, а, па-другое, дазваляюць выдзеліць іх са складу падобных да норм права прававых з'яў.

1. Норма права – правіла, якое мае агульны характар.

Два наступныя моманты найбольш яскрава сведчаць аб дадзенай якасці нормы права. Агульны характар нормы права праяўляецца, па-першае, у тым, што яна не вычэрпвае сябе разавым выкарыстаннем. Менавіта па гэтай прымеце норма права адрозніваецца ад індывідуальнага прававога прадпісання, якое тычыцца канкрэтнай жыццёвай сітуацыі і губляе сваё значэнне пасля разавай рэалізацыі. Разавыя вяленні і распараджэнні, якія тычацца адэкватнага і суразмернага ўздзеяння з боку грамадства і яго афіцыйнага прадстаўніка – дзяржавы на ўдзельнікаў таварна-грашовых адносін і адносін, існаванне якіх абумоўлена рэгулярным тавараабменам, таксама ўяўляюць сабой правілы, якія змяшчаюць прававыя эквіваленты, але гэта правілы (эквіваленты) разавага выкарыстання.

Нормы права маюць розную ступень абагуленасці, абстрактнасці. Сярод іх існуюць нормы права з высокай абагульненасцю і нормы права больш «канкрэтныя». У абстрактнасці нормы права праяўляецца «мера» яе агульнага характару. Адной з тэндэнцый у развіцці норм права з'яўляецца пераход ад «канкрэтных», «казуальных» норм права да больш абагульненых норм права.

Агульны характар нормы права грунтуецца на паўтараемасці тыповых сацыяльных сувязей, яна складваецца ў выніку абагульнення таго, што паўтараецца ў жыццёвых адносінах. У норме права адлюстроўваюцца не прыватныя, непаўторныя і другасныя прыметы, элементы прававых па свайму зместу грамадскіх адносін, а іх найбольш важныя тыповыя моманты. З памяншэннем у зместе нормы права колькаці адлюстраваных прымет, якія ўласцівы грамадскім адносінам, павялічваецца абстракнасць нормы права. З павелічэннем колькасці адметных жыццёвых момантаў, якія адлюстроўваюцца ў норме права, адбываецца «канкрэтызацыя» нормы права.

Агульны характар нормы права праяўляецца, па-другое, у тым, што яна распаўсюджвае сваё дзеянне на персанальна неазначанае кола суб'ектаў (удзельнікаў) грамадскіх адносін. Норма права па-

вінна ўтрымліваць у сабе такі прававы эквівалент, які можа быць прыдатным для кожнага, персанальна нявызначанага суб'екта (удзельніка) грамадскіх адносін, для кожнага, хто трапляе ў сітуацыю, прадугледжаную ў норме права. Канкрэтна азначаныя суб'екты грамадскіх адносін таксама ў стане стварыць персанальна для сябе нейкія асобныя эквіваленты прававога характару і кіравацца імі пры вызначэнні меры і межаў сваіх асабістых паводзін шмат разоў. Але такое правіла паводзін не будзе мець агульнага характару, бо тычыцца толькі дадзеных удзельнікаў (суб'ектаў) прававых адносін. Яно па свайму зместу набліжаецца да прававых эквівалентаў індывідуальнага прававога характару.

Больш-менш дакладна можна зафіксаваць толькі верхнюю і ніжнюю мяжу абагуленасці нормы права. «Верхнюю мяжу» агульнага характару нормы права можна сфармуляваць наступным чынам: норма права – гэта такое правіла паводзін, якое распаўсюджвае сваё дзеянне на многіх, але не на ўсіх суб'ектаў права, на многія, але не ўсе жыццёвыя выпадкі і сітуацыі. «Ніжняя мяжа» агульнага характару можа быць акрэслена наступным чынам: норма права – гэта такое правіла паводзін, якое разлічана (мае дачыненне) не менш чым да двух выпадкаў (сітуацый), распаўсюджвае сваё дзеянне не менш чым на двух суб'ектаў права. Калі перасягаецца верхняя мяжа, то норма права губляе свой сэнс і трансфармуецца ў нейкую дэкларацыю, у лепшым выпадку ў прававую аксіёму. Калі ж парушаецца ніжняя мяжа агульнага характару нормы права, то яна пераўтвараецца ў індывідуальнае прававое прадпісанне.

Як правіла, большая абагульненасць нормы права спрыяе стабільнасці і ўстойлівасці, дазваляе «сціснуць» нарматыўны матэрыял, зрабіць сістэму права больш кампактнай. Іншымі словамі, імкненне да справядлівасці патрабуе, каб норма права набліжалася да індывідуальных асаблівасцей суб'ектаў права, улічвала як мага болей спецыфічных падрабязнасцей і акалічнасцей у жыццёвых сітуацыях і выпадках. У гэтых умовах норма права непазбежна канкрэтызуецца, яе змест удакладняецца шматлікімі абставінамі, яна з'яўляецца нестабільнай і няўстойлівай. Пры гэтым колькасць норм права павялічваецца, а сістэма права ўзрастае ў сваіх памерах, што адмоўна адбіваецца на сістэмна-структурных сувязях паміж нормамі права і прыводзіць да шматлікіх парушэнняў лагічнай цэласнасці сістэмы права і заканадаўства.

Своеасаблівымі механізмамі ўсталявання суразмернасці нормы права індывідуальным асаблівасцям суб'ектаў права, адмысло-

вымі спосабамі «індывідуалізацыі», прыстасавання абагульненага характару нормы права да канкрэтных абставін і грамадскіх адносін з'яўляюцца шматлікія выключэнні з дзеючага права ў форме льгот, прывілеяў і імунітэтаў. Яны спрыяюць усталяванню суразмернасці паміж нормамі права і індывідуальнымі якасцямі і дзеяннямі людзей, але іх захаванне і забеспячэнне патрабуюць вялікіх матэрыяльных выдаткаў з боку грамадства і дзяржавы, якія павінны вырашаць пры гэтым цэлы шэраг даволі складаных праблем сацыяльнага, прававога, арганізацыйнага і матэрыяльна-фінансавага характару.

2. Норма права – правіла паводзін, якое мае фармальна азначаны характар, г. зн., што ў норме права дакладна, ясна і аднастайна акрэсліваецца змест прававых эквівалентаў, даецца дэталёвае азначэнне нейкіх прававых паняццяў і г. д. Іншыя прававыя з'явы, напрыклад, прававыя эмоцыі, прававыя пачуцці, прававыя ўяўленні, прававыя меркаванні могуць мець верагоднасны характар, не быць дакладнымі і аднастайнымі, але норма права можа існаваць толькі як фармальна азначаны прававы эквівалент, сродак, прыём і г. д. Гісторыя развіцця права сведчыць аб тым, што для фармальнага азначэння прававых эквівалентаў на першасных этапах развіцця права выкарыстоўваліся разнастайныя рытуалы, сімвалы і абрады. Для існавання права ў форме правасвядомасці характэрна, што дакладна, ясна і адназначна прававы эквівалент акрэсліць цяжка, але магчыма, аб чым сведчыць існаванне такой крыніцы права, як прававая дактрына. Разам з тым дадзеная форма існавання прававога эквіваленту найбольш зручная для таго, каб вызначыць і ўзважыць станоўчыя і адмоўныя бакі розных варыянтаў выкладання і афіцыйнага замацавання прававых эквівалентаў. Пазітыўнае права – такая форма існавання права, якая найбольш зручная і прыдатная для таго, каб дакладна, ясна і аднастайна вызначыць і замацаваць разнастайныя прававыя эквіваленты.

Для фармальнай азначанасці нормы права пры наяўнасці ўсіх трох форм існавання права характэрна не толькі дакладнае, яснае і аднастайнае вызначэнне яе зместу, але і тое, што яна звычайна замацоўваецца і выкладаецца ў афіцыйных крыніцах дзеючага пазітыўнага права – нарматыўным прававым акце, прававым звычаі, прававым прэцэдэнце, дагаворы нарматыўнага зместу і г. д.

Разам з тым з фармальна азначанага характару нормы права заўсёды існавалі выключэнні, у падмурку якіх ляжаць, як уяўляецца, дзве галоўныя прычыны – сацыяльная і гнасеалагічная. Сутнасць сацыяльнай прычыны ў тым, што нормы права рэгулююць

такія бакі грамадскіх адносін, якія фармалізаваць у прынцыпе можна, але непажадана. Гісторыя права дае падставы зрабіць вельмі важную выснову аб тым, што фармальная азначанасць нормы права павінна адступіць перад неабходнасцю ўлічыць індывідуальныя асаблівасці суб'ектаў права, у тым ліку і ў мэтах сцвярджэння сацыяльнай справядлівасці.

Гнасеалагічная прычына выключэнняў з фармальнай азначанасці нормы права бачыцца ў тым, што словы, з дапамогай якіх выкладаецца норма права, заўсёды маюць шматзначнасць, якая і з'яўляецца галоўнай перашкодай для «поўнай фармалізацыі» норм права. Справа ў тым, што ў адным і тым жа слове, умоўна кажучы, адначасова існуе некалькі зрэзаў, «некалькі зместаў». І ў залежнасці ад узроўню і характару сувязей з іншымі словамі ў сказе яно праяўляе тыя ці іншыя свае ўласцівасці, той ці іншы змест. Вось чаму калі мы праводзім тлумачэнне норм права, то павінны ўнікнуць у змест кожнага слова, выявіць яго месца ў сказе і ў залежнасці ад яго вызначыць змест слова, а затым і змест нормы права цалкам.

Каб норма права была ў поўнай меры фармальна азначанай, трэба, па-першае, каб кожнае слова ў сказе, з дапамогай якога выкладаецца норма, было дакладна і аднастайна азначана, а па-другое, каб сэнс кожнага слова ніколі не мяняўся ў залежнасці ад яго месца ў сказе. І толькі пры гэтых абедзвюх умовах можна сцвярджаць, што ў якой бы паслядоўнасці мы ні выкладалі нарматыўнае прававое прадпісанне ў форме сказа (норму права), сэнс нормы права будзе адным і тым самым.

Сказанае дазваляе зрабіць наступную выснову. Калі нельга дасягнуць поўнай фармальнай азначанасці нормы права, то зразумела, што нельга ў поўнай меры фармальна азначыць і права цалкам, фармалізаваць яго і «матэматычна пралічыць», выкласці з дапамогай правілаў і законаў матэматычнай логікі. Адсюль таксама зразумела і тое, што моўнае тлумачэнне нормы права з'яўляецца пастаянным прыёмам высвятлення зместу нормы права. Больш таго, на пошуках сапраўднага зместу словаў у сказе, на пошуках шматлікіх сэнсаў літаратурных (у тым ліку і юрыдычных) тэкстаў развіваецца, як вядома, асобны напрамак даследаванняў у юрыдычнай навуцы – юрыдычная герменеўтыка.

Такім чынам, пад нормай права можна разумець такое правіла паводзін, у якім выкладаюцца і замацоўваюцца разнастайныя прававыя эквіваленты агульнага і фармальна азначанага характару.

2. Будова (структура) нормы права

Кожная з форм існавання права, акрамя агульных і фармальна азначаных прававых эквівалентаў, уключае таксама іншыя прававыя рэальнасці. Для першасных прававых адносін уласцівы разнастайныя абрады і сімвалы прававога характару. Для прававой свядомасці – прававыя пачуцці, эмоцыі, уяўленні і г. д. У форме пазітыўнага права існуюць не толькі прававыя эквіваленты агульнага і фармальна азначанага характару, але і эквіваленты індывідуальнага прававога характару. Але для ўсіх форм існавання права характэрна наяўнасць адзіных прававых эквівалентаў – правілаў паводзін агульнага і фармальна азначанага характару, якія, праўда, маюць розную мадыфікацыю. Узаемаадносіны гэтых праяў, мадыфікацый прававых эквівалентаў паміж сабой, характар сувязей паміж імі і складаюць паняцце структуры (будовы) нормы права. Будова нормы права – гэта праява будовы права цалкам, толькі на мікраўзроўні, з тым, праўда, удакладненнем, што будова права не можа быць зведзена да будовы нормы, таму што кожная з форм існавання права, як было адзначана, не вычэрпваецца прававымі эквівалентамі агульнага і фармальна азначанага характару.

Пры наяўнасці трох форм існавання права структура (будова) нормы права арганічна спалучае тры моманты, тры мадыфікацыі прававога эквіваленту: а) сацыяльны; б) інтэлектуальна-псіхалагічны; в) юрыдычна-валявы. Сацыяльны элемент нормы права – гэта тыя тыповыя сітуацыі, тыя прававыя эквіваленты (фактычныя нормы), якія складваюцца ў прававых па свайму зместу грамадскіх адносінах. У фармаванні гэтых правілаў паводзін прымаюць удзел усе ўдзельнікі прававых адносін. Пад інтэлектуальна-псіхалагічным элементам зместу нормы права разумеецца асэнсаванне, усведамленне сацыяльнымі суб'ектамі склаўшыхся ў жыцці ў выніку паўтарэння тыповых жыццёвых сітуацый прававых суразмернасцей, правілаў паводзін як заканамерных, справядлівых, правільных, прававых і псіхалагічнае іх прыняцце ў гэтай якасці альбо аналагічнае ўсведамленне і псіхалагічнае прыняцце ў такой самай якасці выдадзеных дзяржавай правілаў паводзін, прамых аналагаў якіх у рэальных грамадскіх адносінах не існавала. Юрыдычна-валявы момант зместу нормы права зводзіцца да афіцыйнага надання правілу паводзін, якое сфармавана, асэнсавана і ўспрынята, статусу нормы права альбо да фармулёўкі правілаў паводзін у дзеючых крыніцах права.

Структура нормы права ўяўляе нейкую паслядоўнасць ва ўзаемадзеянні праяў, мадыфікацый прававых эквівалентаў, якая, у сваю чаргу, абумоўлена шляхамі фармавання і развіцця права, паслядоўнасцю ў складванні форм існавання права. Гістарычна першы і найбольш распаўсюджаны на ранніх этапах шлях развіцця права – шлях «знізу ўверх» – ад фармавання правіла паводзін у жыцці да яго афіцыйнага прызнання. Яму адпавядае і будова нормы права, згодна з якой эквіваленты размяшчаюцца ў наступнай паслядоўнасці: сацыяльны > інтэлектуальна-псіхалагічны > юрыдычна-валявы прававыя эквіваленты. Такая будова нормы права ўласціва сучасным традыцыйным прававым сем'ям. Другі шлях фармавання і развіцця права – шлях «зверху ўніз» – характэрны для сучаснага цывілізаванага грамадства, для функцыянавання і развіцця кантынентальнай (рамана-германскай) прававой сям'і. Ён характарызуецца тым, што першапачаткова правіла паводзін, будучая норма, замацоўваецца ў крыніцах права, затым яна асэнсоўваецца і ўспрымаецца сацыяльнымі суб'ектамі і, нарэшце, рэалізуецца, ажыццяўляецца ў рэальных грамадскіх адносінах. Яму адпавядае наступная будова нормы права: юрыдычна-валявы> інтэлектуальна-псіхалагічны > сацыяльны прававыя эквіваленты.

Першая структурная частка нормы права (сацыяльны прававы эквівалент) называецца нормай ***de re***, г. зн. фактычнай нормай, жывой нормай, нормай у жыцці, а апошняя (юрыдычна-валявы эквівалент) – нормай ***de jure***, г. зн. нормай, якая зафіксавана ў крыніцах права. Інтэгральным элементам будовы нормы права з'яўляецца яе інтэлектуальна-псіхалагічны момант. Ён, вобразна кажучы, злучае ў адно арганічнае і непадзельнае цэлае норму *de re* і норму *de jure,* бо якім бы шляхам ні адбывалася фармаванне нормы права – альбо знізу ўверх, альбо наадварот, норма павінна быць асэнсавана, усвядомлена і псіхалагічна ўспрынята менавіта як норма права. Без гэтага немагчыма існаванне нормы права, яе рэалізацыя.

Практыка развіцця і функцыянавання норм права ў розных прававых сістэмах сведчыць аб тым, што ўзаемаадносіны паміж элементамі нормы права далёка не заўсёды бываюць «гарманічнымі», часта норма *de re* і норма *de jure* не супадаюць паміж сабой па аб'ёму і накіраванасці. У тэорыі права сам факт магчымага несупадзення паміж імі стаў падставай фармулявання двух паняццяў: «кніжнай нормы» (кніжнага права, закону) і «драконаўскай нормы» (драконаўскага права, закону). З кніжнай нормай мы сутыкаемся ў сітуацыі, калі думка і воля заканадаўцы, выкладзеныя ў норме de jure, *не супадаюць* па розных прычынах з думкай і воляй знач-

най колькасці адрасатаў (сацыяльных суб'ектаў) наконт таго, якой павінна быць норма права. У сітуацыі, калі думка і воля заканадаўцы наконт нормы права *супярэчаць* уяўленням па гэтаму пытанню волі і жаданням значнай колькасці сацыяльных суб'ектаў, мы маем справу з драконаўскай нормай.

З часоў панавання рымскага права ў прававой практыцы склалася аксіёма аб нязменнасці нормы права да таго часу, пакуль не будзе адменена ці зменена крыніца права, у якой яна замацавана. У адной з фармулёвак гэта аксіёма гучыць так: ***dura lex, sed lex***. Гэтая аксіёма падкрэслівае неабходнасць выканання нават недасканалага, старога закону. Толькі заканадавец згодна з яе патрабаваннем можа змяніць альбо адмяніць закон, норму права. Дадзеная аксіёма перажыла стагоддзі і цалкам захоўвае сваё значэнне ў нашыя дні, бо накіравана яна на стабілізацыю грамадскіх адносін, на ўмацаванне законнасці і правапарадку. Разам з тым прапанаваны падыход да вызначэння будовы (структуры) нормы права, аналізу яе стабільнасці (нязменнасці) і дынамізму (змяняемасці) сведчыць аб тым, што нават пры захаванні нормы ў нязменнай форме бесперапынна адбываюцца змяненні ў яе сацыяльнай частцы (норма *de re*) і інтэлектуальна-псіхалагічным элеменце. У гэтых варунках заканадавец павінен пільна сачыць за тым, каб разыходжанні паміж нормай *de re* і нормай *de jure* не дасягалі крытычнай адзнакі, своечасова карэктаваць закон.

Пытанне аб будове (структуры) нормы права не мае і сёння адназначнага адказу. Прычын гэтаму некалькі. Сфармулюем змест дзвюх.

На першасных этапах існавання права, калі яно панавала ў форме перашасных праваадносін, не патрэбны былі нейкія ўяўленні аб будове (структуры) пэўнага правіла паводзін, прававога эквіваленту. Пасля фармавання прававой свядомасці паўстала пытанне аб значнасці прававых эквівалентаў, існуючых у форме прававых адносін і прававой свядомасці. Нарэшце, пасля таго, як права набыло завершаны, цывілізаваны выгляд і стала існаваць у трох формах, паўстала пытанне аб тым, як увасобіць у жыццё, прывязаць да прававых па свайму зместу грамадскіх адносін прававыя эквіваленты, якія знайшлі ўвасабленне і замацаванне ў нарматыўнай частцы права, асабліва тады, калі норма права фармуецца па прынцыпу «зверху – уніз». На аналізе пераважна гэтага шляху фармавання права будуецца вучэнне аб структуры нормы права ў кантынентальнай (рамана-германскай прававой сям'і).

Акрамя гэтага, на будову нормы права ўплывае і характар прававой сістэмы. Англа-амерыканская прававая сістэма з'яўляецца

адкрытай таму, што будуецца па прынцыпу: права ёсць там, дзе існуе абарона пэўнага інтарэса. Суддзя не мае права спасылацца на тое, што не будзе абараняць пэўны інтарэс таму, што не бачыць для гэтага юрыдычных падстаў – не існуе, напрыклад, патрэбнай нормы. Пры захаванні працэдуры звароту ў суд пэўны інтарэс павінен быць абаронены. Рамана-германская сям'я ў параўнанні з англа-амерыканскай прававой сям'ёй з'яўляецца закрытай, таму што абараняцца будзе толькі той інтарэс, для абароны якога ўжо існуюць юрыдычныя падставы – дзеючае пазітыўнае права. Найбольш адметна гэта назіраецца пры параўнанні поглядаў на будову нормы права ў сям'і агульнага права і кантынентальнай (рамана-германскай) прававой сям'і.

Падрабязны аналіз структуры нормы права ў англа-амерыканскай і рамана-германскай прававых сем'ях быў зроблены намі раней. З ім можна азнаёміцца ў шэрагу выданняў, у тым ліку і ў вучэбным дапаможніку «Агульная тэорыя права», які быў выдадзены ва Установе адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы» ў 2004 годзе. Акрэслім асобныя моманты з адзначанага выдання.

Асновы вучэння аб будове нормы права ў англасаксонскай прававой сям'і былі закладзены Г. Блэкстанам, які сцвярджаў, што норма права складаецца з чатырох частак: 1) аб'яўляльнай; 2) загадвальнай; 3) якая садзейнічае; 4) пакаральнай. Г. Блэкстан выводзіў свае меркаванні, абапіраючыся на рэальнасці англійскай прававой сістэмы, у якой, як вядома, галоўная роля ў стварэнні (афармленні) норм права належыць суддзі. Суддзя ў сваю чаргу выводзіць правіла для рашэння прававых па сваёй сутнасці пытанняў з жыцця, з будовы тыповых жыццёвых сітуацый, з выпрацаванай жыццём структуры правіла паводзін.

У кантынентальнай прававой сям'і праблема структуры (будовы) нормы права была падрабязна разгледжана нямецкімі вучонымі-юрыстамі ў XVIII?XIX ст. У большасці сваёй яны лічылі, што норма права складваецца з трох узаемазвязаных частак. Першую з іх складаюць умовы дзеяння нормы права (гіпотэза); другую – само правіла паводзін, у якім фармулююцца нейкія дазволы, забароны і г. д. (дыспазіцыя); трэцюю – негатыўныя наступствы, што надыходзяць у выніку парушэння нормы права, а дакладней, таго правіла паводзін, што сфармулявана ў дыспазіцыі нормы права (санкцыя). Праблема гэта падрабязна аналізавалася і ўсебакова абмяркоўвалася ў навуковай і вучэбнай літаратуры дарэвалюцыйнай Расіі. Пры гэтым выказваліся розныя меркаванні, хаця непахіснай заста-

лася пазіцыя аб трохэлементнай будове нормы права. Рэцэпіравана была гэтая пазіцыя і савецкай юрыдычнай навукай. Самай распаўсюджанай яна застаецца ў сёння.

Уяўляецца, што распрацаваны айчыннай юрыдычнай навукай падыход да будовы нормы па сутнасці зводзіцца да вучэння аб будове толькі адной з праяў прававога эквіваленту – таго эквіваленту, які знайшоў сваё замацаванне ў дзеючых крыніцах права. Натуральна, што ў такіх умовах паўстае пытанне аб тым, як «прывязаць» прававы эквівалент да грамадскіх адносін. Адсюль вынікаюць высновы аб наяўнасці ў норм права гіпотэзы, бо без іх норма права не мае сэнсу, а таксама разважанні аб дэспазіцыі, без якой норма «бессэнсоўна», і санкцыі, без якой норма «бяссільна». Асобныя аўтары, разумеючы, што далёка не кожная норма права ўключае ў сябе адзначаныя элементы, выкладаюць у курсах лекцый будову тыповай нормы права. Але ў гэтым выпадку ўзнікаюць пытанні аб будове нетыповай нормы права, аб магчымым існаванні нейкай універсальнай будовы для тыповых і нетыповых норм права. І калі вучэнне аб будове нормы ахоплівае толькі тыповыя нормы права, то чаму гэтыя высновы змяшчаюцца ў курсах лекцый па агульнай тэорыі дзяржавы і правы?

Цікавы падыход да будовы нормы права ў 80-х гадах мінулага стагоддзя быў прапанаваны Г.Т. Чарнобель, які лічыць, што норма права ў лагічных адносінах уяўляе нарматыўнае прававое меркаванне, а структура гэтага меркавання ў прынцыпе нічым не адрозніваецца ад будовы любога нарматыўнага наказу, які сфармуляваны ў іншых відах сацыяльных норм. Гэта будова ўключае адрасата – суб'екта грамадскіх адносін, меру (форму) паводзін, якая складае сутнасць патрабавання (загаду) нормы права і пабуджальнай да пэўных паводзін сілы. Такім чынам, у норме права выказваецца думка: менавіта такому адрасату прадпісваюцца менавіта такія паводзіны, і робіцца гэта шляхам забарон, прадстаўлення правамоцтваў, накладвання абавязкаў.

3. Віды норм права

Віды норм права – гэта вынік іх класіфікацыі, дзялення на нейкія групы, віды па тых альбо іншых крытэрыях. Крытэрыем класіфікацыі норм права можа быць тая ці іншая якасць, прымета нормы права. У юрыдычнай навуцы гэтае пытанне распрацавана грунтоўна і даволі падрабязна, бо з дапамогай класіфікацыі можна вызначыць месца кожнай нормы права ў сістэме норм права, яе

ролю і функцыі; вывучыць адметныя, непаўторныя рысы тых ці іншых норм права і, нарэшце, выкарыстаць атрыманыя ў выніку класіфікацыі веды аб нормах права ў ходзе іх удасканалення, прымянення і ў падрыхтоўцы спецыялістаў-юрыстаў.

Вядома, што галоўнае прызначэнне норм права ў жыцці грамадства зводзіцца да рэгулявання, уладкавання грамадскіх адносін. Пры аналізе ўсёй сукупнасці норм права менавіта з гэтага пункту гледжання высвятляецца, што яны істотна розняцца паміж сабой у механізмах уздзеяння на паводзіны сацыяльных суб'ектаў і ролі ў адносінах да іншых норм права. Адны з іх фармулююць правы і абавязкі сацыяльных суб'ектаў і менавіта так рэгулююць грамадскія адносіны, іншыя, наадварот, не змяшчаюць у сабе канкрэтных указанняў на правы і абавязкі, а фармулююць нейкія нарматыўныя (агульнаабавязковыя) палажэнні, азначэнні нейкіх юрыдычных паняццяў, мэты і задачы прававога рэгулявання грамадскіх адносін; пры гэтым яны як бы забяспечваюць неабходныя ўмовы для рэалізацыі першых. Першы від норм права можна назваць нормамі-прадпісаннямі. Часта іх называюць тыповымі нормамі права. Другі – зыходнымі, адпраўнымі, першаснымі, заснавальнымі нормамі права. Зразумела, што кожны з азначаных відаў норм права валодае сваімі адметнымі рысамі. Таму мэтазгодна правесці класіфікацыю кожнага з гэтых відаў, але напачатку разгледзім агульную іх класіфікацыю.

А. Агульная класіфікацыя норм права: па часу і тэрыторыі дзеяння, па колу сацыяльных суб'ектаў.

1. Па часу іх дзеяння. Па гэтаму крытэрыю ўсе нормы права падзяляюцца на вечныя, пастаянныя, часовыя і сітуацыйныя. Да *вечных* адносяцца тыя нарматыўныя палажэнні, якія існуюць ва ўсе часы і ва ўсіх прававых сістэмах. Да іх адносяцца многія нормы-прынцыпы, у якіх адлюстроўваецца сутнасць права. Могуць мяняцца іх фармулёўкі, але нязменнай застаецца іх сутнасць. Да гэтай групы адносіцца, напрыклад, прынцып адзінства правоў і абавязкаў. Менавіта нормы гэтага віду забяспечваюць пераемнасць у праве. Да *пастаянных* адносяцца нормы права, тэрмін дзеяння якіх дакладна не акрэслены, але вядома, што яны не з'яўляюцца «вечнымі». *Часовымі* лічацца тыя нормы права, тэрмін дзеяння якіх азначаны падчас увядзення іх у прававую сістэму грамадства. *Сітуацыйныя* нормы займаюць прамежкавае становішча паміж пастаяннымі і часовымі нормамі права. Тэрмін дзеяння іх дакладна не акрэслены, але яны ўступаюць у дзеянне ў выпадку нейкіх надзвычайных становішчаў, стыхійных бедстваў і г. д. Да таго, як

узнікнуць прадугледжаныя ў іх сітуацыі, яны знаходзяцца ў «спячым стане».

2. Па тэрыторыі дзеяння. Па дадзенаму крытэрыю выдзяляюцца нормы права, якія дзейнічаюць на тэрыторыі ўсіх дзяржаўных утварэнняў, у межах некалькіх дзяржаўных утварэнняў (дзяржаў), у межах адной дзяржавы, на частцы тэрыторыі адной дзяржавы. Да першай групы норм адносяцца агульнапрызнаныя прынцыпы міжнароднага права, нормы Усеагульнай Дэкларацыі правоў чалавека і г. д. Другую групу складаюць агульныя для нейкай прававой сям'і нормы-прынцыпы, прававыя аксіёмы і канкрэтныя нормы-прадпісанні, напрыклад, прынцып вяршэнства закону ў кантынентальнай прававой сістэме. Трэцяя група норм права дзейнічае на тэрыторыі адной дзяржавы, напрыклад, нормы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Прыкладам норм права чацвёртай групы з'яўляюцца тыя нормы права, якія ўтрымліваюцца ў нарматыўных прававых актах мясцовых органаў кіравання і самакіравання.

3. Па колу сацыяльных суб'ектаў, якім адрасавана норма права і на якіх распаўсюджвае яна сваё дзеянне, нормы права падзяляюцца на тры групы. Па-першае, ёсць нормы права, якія тычацца ўсіх сацыяльных суб'ектаў і фізічных асоб – удзельнікаў прававых адносін. Да другой групы адносяцца нормы права, што распаўсюджваюць сваё дзеянне на нейкую частку сацыяльных суб'ектаў, напрыклад, супрацоўнікаў пэўнай установы ці прадпрыемства. Трэцюю групу складаюць нормы права, якія тычацца нейкага аднаго сацыяльнага суб'екта, напрыклад, нормы права, у якіх замацоўваюцца кампетэнцыя і паўнамоцтвы вышэйшага прадстаўнічага і заканадаўчага органа ўлады. Так званыя лакальныя нормы права выдзяляюцца не па тэрыторыі і тым больш не «па месцы» дзеяння, а па колу сацыяльных суб'ектаў (адрасатаў).

Б. Класіфікацыя зыходных норм права. Сярод зыходных норм права выдзяляюцца дзве якасна розныя групы. Па-першае, гэта нормы права, якія сфармаваліся ў выніку паступовага, эвалюцыйнага станаўлення і развіцця права, так сказаць, натуральным шляхам. Да іх адносяцца нормы-прынцыпы і прававыя аксіёмы. Гэтыя нормы як бы «вырастаюць» з грамадскіх адносін. Роля заканадаўцы ў іх стварэнні мінімальная. Заканадавец апрацоўвае іх, надае ім афіцыйнае значэнне, цывілізаваную форму выражэння і існавання. Але сярод зыходных норм права ёсць такія, што з'явіліся ў прававых сістэмах дзякуючы актыўнай, творчай дзейнасці заканадаўцы ў стварэнні права. Гэта нормы-задачы, дэфінітыўныя, калізіённыя і аператыўныя нормы права. Яны ўносяць пэўную сістэматыку ў

сістэму права, афармляюць парадак узаемадзеяння норм права паміж сабой і г. д. Падрабязная характарыстыка норм-прынцыпаў і прававых аксіём была дадзена ў папярэдняй тэме. Разгледзім астатнія віды зыходных норм права.

1. Нормы-задачы (дэкларацыйныя нормы). У іх фармулююцца мэты, задачы прававога рэгулявання грамадскіх адносін. Нарматыўныя ўстаноўкі гэтага кшталту ствараюць своеасаблівы прававы калідор для нарматворчай і правапрымяняльнай дзейнасці. Звычайна нормы-задачы фармулююцца ў прэамбулах нарматыўных прававых актаў альбо ў першых артыкулах тэкстаў гэтых актаў.

2. Дэфінітыўныя нормы (ад лац. definitio – азначаю). У дэфінітыўных нормах права ўтрымліваюцца азначэнні нейкіх юрыдычных паняццяў у мэтах іх аднастайнага разумення і выкарыстання. Фармулюючы дэфінітыўныя нормы, заканадавец тым самым скарачае аб'ём нарматыўнага матэрыялу.

3. Аператыўныя нормы права. Па свайму зместу аператыўныя нормы накіраваны на тое, каб увесці ў сістэму дзеючых норм права новыя нормы альбо вывесці са складу дзеючых нейкія нормы права, прызнаць іх страціўшымі юрыдычную сілу. Першыя з іх можна вобразна называць «нормамі-бацькамі», а другія – «нормамі-магільшчыкамі».

*4. Калізіённыя нормы права***.** Калізіённыя нормы – гэта правілы, якія дазваляюць вырашыць супярэчнасці, якія па самых розных прычынах узнікаюць паміж дзеючымі нормамі права. Пры функцыянаванні норм права ўзнікаюць калізіі самага рознага характару – тэмпаральныя, прасторавыя, іерархічныя, змястоўныя і г. д. Для іх вырашэння ў заканадаўстве сфармуляваны разнастайныя па зместу правілы. Асобныя аўтары, якія адносяць калізіённыя нормы права да нетыповых, лічаць, што гэта «нормы аб нормах». Згодна з нашай пазіцыяй, якая выказана была больш за дзесяць гадоў таму, калізіённыя нормы адносяцца да «першасных» норм, г. зн. норм аб нормах, і таму класічным прыкладам калізіённага правіла з'яўляецца норма права, якая ўтрымліваецца ў арт. 137 Асноўнага закону Рэспублікі Беларусь: «Канстытуцыя валодае найвышэйшай юрыдычнай сілай. Законы, дэкрэты, указы і іншыя акты дзяржаўных органаў выдаюцца на падставе і ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь. У выпадку разыходжання закону, дэкрэта ці ўказа з Канстытуцыяй дзейнічае Канстытуцыя. У выпадку разыходжання дэкрэта ці ўказа з законам закон мае вяршэнства толькі тады, калі паўнамоцтвы на выданне дэкрэта ці ўказа былі прадстаўлены законам».

В. Класіфікацыя норм-прадпісанняў. Нормы-прадпісанні складаюць асноўную масу дзеючых норм права ў прававых сістэмах усіх вядомых нам прававых сем'яў. Па свайму зместу, форме выражэння, метадах уздзеяння на грамадскія адносіны яны адрозніваюцца адна ад другой шырокім спектрам параметраў, якасцей, уласцівасцей, а таму іх можна класіфікаваць па самых розных крытэрыях. Разгледзім найбольш важныя класіфікацыі.

1. Па характару рэгулюемых грамадскіх адносін нормы-прадпісанні падзяляюцца на матэрыяльныя і працэсуальныя. Да першых адносяцца нарматыўныя прадпісанні, у якіх замацоўваюцца правы і абавязкі суб'ектаў права, іх прававое становішча і г. д. Працэсуальныя нормы права рэгламентуюць парадак, працэдуру рэалізацыі і ажыццяўлення матэрыяльных норм права, а таксама парадак абароны парушаных правоў і абавязкаў, працэдуру і этапы разгляду спраў у юрысдыкцыйных органах.

2. Па метаду ўздзеяння на грамадскія адносіны нормы-прадпісанні падзяляюцца на імператыўныя і дыспазітыўныя. Для імператыўных норм характэрна катэгарычнае, строга абавязковае прадпісанне на выкананне нейкіх дзеянняў альбо ўстрымання ад нейкіх дзеянняў. Дыспазітыўныя нормы права прадпісваюць нейкі варыянт паводзін, але пры гэтым прадстаўляюць суб'ектам магчымасць у пэўных межах урэгуляваць адносіны па свайму меркаванню.

3. Па характару прадпісанняў. Кожная норма права прадпісвае сацыяльным суб'ектам нейкія строга азначаныя паводзіны шляхам забарон, ускладання абавязкаў, прадастаўлення паўнамоцтваў. У адпаведнасці з характарам прадпісанняў нормы права падзяляюцца на абавязацельныя, забараняльныя і ўпаўнаважвальныя. Упаўнаважвальныя нормы права не навязваюць удзельнікам грамадскіх адносін нейкіх строга азначаных дзеянняў ці ўстрымання ад іх. Яны надзяляюць сацыяльных суб'ектаў пэўнай свабодай у распараджэнні сваімі правамі, свабодай, карыстацца імі або адмовіцца ад іх выкарыстання. Такім чынам, сутнасць упаўнаважвальных норм зводзіцца да дазволу на ажыццяўленне нейкіх учынкаў. У тэксце гэтых норм прысутнічаюць тэрміны «мае права», «можа» і г. д. Забараняльныя нормы забараняюць некаторыя дзеянні, указваюць канкрэтна, чаго сацыяльныя суб'екты не павінны рабіць. У тэксце забараняльных норм ужываюцца словы і словаспалучэнні кшталту «забараняецца», «не мае права», «не можа».

Абавязацельныя нормы. У іх замацоўваюцца такія правілы паводзін, якія непасрэдна патрабуюць ад сацыяльных суб'ектаў ажыццявіць нейкія дзеянні. У іх тэксце выкарыстоўваюцца звычайна тэрміны «павінен», «абавязаны» і г. д.

4. Спосабы выкладання норм права ў тэксце нарматыўнага прававога акта

У прававых сістэмах, дзе асноўнай крыніцай права з'яўляецца нарматыўны прававы акт, у заканатворчай дзейнасці ўзнікаюць пытанні, якія звязаны з выкладаннем уласна-юрыдычнай часткі нормы права (будова якой часцей за ўсе зводзіцца да гіпотэзы, дыспазіцыі і санкцыі) у тэксце нарматыўнага прававога акта. У сваю чаргу, у ходзе прымянення норм права паўстаюць праблемы пошуку ўсіх элементаў нормы права ў тэкстах нарматыўных прававых актаў. Прычым праблемы, якія ўзнікаюць пры прымяненні норм права, з'яўляюцца своеасаблівым працягам тых задач, што вырашае заканадавец. Таму эфектыўнасць працы заканадаўцы ў гэтых стасунках шмат у чым вызначае выніковасць дзейнасці правапрымяняльніка.

Вельмі рэдка можна сустрэць прыклады таго, калі ўсе тры элементы ўласна юрыдычнай часткі нормы права выкладаюцца ў тэксце аднаго і таго самага артыкула нарматыўнага прававога акта. Чым гэта можна растлумачыць? Найперш тым, што паміж нормай права і артыкулам нарматыўнага прававога акта не існуе тоеснасці, што па аб'ёму яны часцей за ўсё не супадаюць. Норма права, як было высветлена раней, не можа быць зведзена да ўласна-юрыдычнай яе часткі. А таму паміж логікай права, логікай норм права і логікай нарматыўнага прававога акта існуюць аб'ектыўныя разыходжанні. Нарматыўны прававы акт ствараецца па правілах і законах фармальнай логікі, у той час, як права і яго нормы ўтвараюцца ў ходзе развіцця супярэчнасцей у таварна-грашовых адносінах. Заканадавец вымушаны лічыцца з гэтым свядома альбо не ўсведамляючы рэальнасцей існавання права. У любым выпадку ён не ў стане адэкватна выкласці нормы права ў тэксце нарматыўна-прававога акта ў тым выглядзе, у якім яны існуюць у рэальных грамадскіх адносінах, бо гэта прывяло б да стварэння супярэчлівага закону. У тэорыі права сфармулявана некалькі спосабаў выкладання норм права ў тэксце нарматыўнага прававога акта: прамы (поўны), адсылачны (ссылачны), бланкетны.

Прамы спосаб выкладання характарызуецца тым, што ў артыкуле нарматыўнага прававога акта выкладаюцца адначасова гіпотэза, дыспазіцыя і санкцыя ў неабходным спалучэнні. Такі спосаб выкладання норм права забяспечвае найлепшае іх прымяненне.

Адсылачны (ссылачны) спосаб выкладання. Для яго характэрна тое, што ў артыкулах нарматыўных прававых актаў утрымліва-

юцца не ўсе з адзначаных элементаў нормы права, але маецца адсылка (спасылка) на іншыя артыкулы гэтага самага нарматыўнага прававога акта, дзе знаходзяцца патрэбныя элементы, альбо адсылка (спасылка) на іншыя нарматыўныя прававыя акты ці крыніцы права.

Бланкетны спосаб выкладання. Гэты спосаб выкладання характарызуецца тым, што ў артыкуле нарматыўнага прававога акта ўстанаўліваецца толькі адказнасць за парушэнне сфармуляванага ў ім правіла, саміх жа правіл у ім няма. Правілы, за парушэнне якіх устанаўліваецца адказнасць, змяшчаюцца ў тэксце іншых нарматыўных прававых актаў. Для таго, каб прымяніць дадзеную норму ў кожным канкрэтным выпадку, трэба высветліць, ці былі парушаны правілы і якія з іх былі парушаны.

Адносна проста вырашаецца пытанне з выкладаннем норм права ў тэксце нарматыўна-прававых актаў у канцэпцыі, прапанаванай Г.Т. Чарнобель. Як было сказана вышэй, у разуменні Г.Т. Чарнобель норма права ўяўляе завершанае ў лагічных адносінах нарматыўнае прававое меркаванне, якое складаецца з адрасата (S), пабуджальнай сілы (P) і характару вялення (>). Пры такім падыходзе да сутнасці нормы і яе структуры любая завершаная ў лагічных адносінах думка, выкладзеная ў тэксце нарматыўнага прававога акта (у адным ці некалькіх сказах), змяшчае ў сабе абсалютна ўсе элементы структуры нормы права (S<P).

5. Эфектыўнасць норм права

У папярэдняй тэме была зроблена выснова аб некарэктнасці пастаноўкі пытання аб эфектыўнасці права. Права з'яўляецца адзіна магчымым рэгулятарам таварна-грашовых адносін, а таксама шчыльна звязаных з імі адносін і таму вызначыць выніковасць яго ўздзеяння на грамадскія адносіны немагчыма. Разам з тым адносна асобных норм права паняцце эфектыўнасці ўжо даволі даўно распрацоўваецца на тэарэтычным узроўні і выкарыстоўваецца на практыцы. У тэорыі права выдзяляюцца два ўзроўні эфектыўнасці норм права: а) юрыдычная эфектыўнасць норм права; б) сацыяльная эфектыўнасць норм права.

Юрыдычная эфектыўнасць норм права характарызуецца адпаведнасцю паводзін адрасатаў нормы права тым прадпісанням, што змяшчаюцца ў норме права. Вобразна кажучы, для юрыдычнай эфектыўнасці норм права галоўным паказчыкам з'яўляецца «працэнтная» рэалізацыя зместу норм права ў паводзінах суб'ектаў права. Формула юрыдычнай эфектыўнасці норм права выгля-

дае наступным чынам: $Э_{ю} = Л_{п}/Л_{в}$, дзе $Л_{п}$ – лік фактычнай рэалізацыі той ці іншай нормы права, $Л_{в}$ – лік тых выпадкаў (сітуацый), у якіх павінна была быць рэалізавана норма права.

Разам з тым забеспячэнне адпаведнасці паводзін суб'ектаў права прадпісанням прававых норм не з'яўляецца самамэтай. Нормы права з'яўляюцца сродкам дасягнення больш глыбінных сацыяльных мэт. І вось тут высвятляецца, што далёка не заўсёды пры рэалізацыі прадпісанняў норм права дасягаюцца гэтыя мэты. Устанаўленню залежнасці паміж нормай права і сацыяльнымі мэтамі дапамагае паняцце сацыяльнай эфектыўнасці нормы права. Яе формула выглядае наступным чынам: $Э_{с} = М/В$, дзе $М$ – сацыяльная мэта, якая павінна быць дасягнута ў выніку дзеяння нормы права, $В$ – фактычны вынік, што атрымаўся пасля рэалізацыі нормы права.

На вельмі важны момант у вывучэнні эфектыўнасці норм права звярнуў увагу С.С. Аляксееў. Ён прапанаваў даследаваць выніковасць (эфектыўнасць) юрыдычнага інструментарыя. Справа ў тым, што ў норме права, як было адзначана вышэй, уласна юрыдычны момант арганічна спалучаецца з сацыяльным (г. зн. эканамічным, палітычным, арганізацыйным і г. д.), а таму пры вызначэнні эфектыўнасці нормы права знаходзіцца адначасова выніковасць усіх частак нормы права. Праблема заключаецца ў тым, каб вырашыць пытанне аб эфектыўнасці адной з частак нормы права – яе юрыдычна-валявой часткі. Пры такой пастаноўцы праблемы вызначаецца выніковасць метадаў, спосабаў, тыпаў прававога рэгуляванння, якія выкарыстоўвае заканадавец у шырокім сэнсе слова пры стварэнні нормы права пераважна шляхам «зверху – уніз».

Паняцце эфектыўнасці нормы права, якое было распрацавана ў айчыннай юрыдычнай навуцы напрыканцы 70-х–пачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя, абапіралася на разуменне нормы права ў якасці правіла паводзін, якое фармулюецца дзяржавай і фактычна зводзіцца да пэўнага загаду (імператыва), які замацоўваецца ў нейкай крыніцы права, пераважна ў нарматыўным прававым акце.

На думку аўтара, паняцце эфектыўнасці нормы права трэба разглядаць у шчыльнай узаемасувязі з пытаннем аб змесце нормы права. Калі зыходзіць з таго, што змест нормы права складаецца з трох шчыльна ўзаемазвязаных частак – сацыяльнай (нормы дэ рэ), інтэлектуальна-псіхалагічнай і ўласна-юрыдычнай (нормы дэ юрэ), то хутчэй за ўсё для кожнай з гэтых частак зместу нормы права павінны існаваць свае адметныя крытэрыі эфектыўнасці, бо, нягледзячы на шчыльную і, можна сказаць, арганічную ўзаемасувязь паміж гэтымі часткамі зместу нормы, кожная з іх мае свой адмысло-

вы змест і сваё адмысловае месца ў структуры нормы права. Магчыма, што эфектыўнасць нормы права цалкам можа быць вынікам сістэмнага аналізу і абагульнення эфектыўнасці кожнай з адзначаных частак зместу нормы права. Але гэта толькі магчыма. Патрабуюцца дадатковыя даследаванні ў гэтым кірунку, каб альбо сцвердзіць, альбо абвергнуць дадзены тэзіс.

Уласна кажучы, аб эфектыўнасці сацыяльнай часткі нормы права ў сітуацыі, калі сама норма права фармуецца па прынцыпу «знізу–уверх», размовы быць не можа, бо ў гэтай сітуацыі само жыццё сфармавала пэўнае тыповае правіла паводзін прававога зместу. І калі яно знаходзіць затым замацаванне ў нейкім правіле паводзін на матэрыяльных носьбітах (у норме права дэ юрэ) у поўным аб'ёме, г. зн. без якіх-небудзь істотных зменаў, то пытанне аб яго выніковасці, г. зн. эфектыўнасці, адпадае. Калі гэта правіла паводзін адлюстравана і замацавана ў норме дэ юрэ не ў поўнай меры, то заканамерна паўстае пытанне аб адэкватнасці яго замацавання, адпаведна, і аб эфектыўнасці зваротнага ўздзеяння такой нормы дэ юрэ на фактычныя грамадскія адносіны.

Аб эфектыўнасці інтэлектуальна-псіхалагічнага элемента нормы права размова можа ісці, калі мы ацэньваем адэкватнасць усведамлення ўласна сацыяльнай яе часткі ў грамадскай свядомасці ў якасці правільнай і справядлівай (прававой) – пры фармаванні нормы права «знізу–уверх» і тады, калі грамадская свядомасць узважвае і ацэньвае норму дэ юрэ на яе адпаведнасць склаўшымся сацыяльным заканамернасцям, існуючым сувязям у сістэме норм права, на прадмет яе правамернасці, справядлівасці пры фармаванні нормы права па прынцыпу «зверху–уніз».

Па сутнасці, эфектыўнасць нормы дэ юрэ – гэта тое, наколькі вынікова правіла, якое замацавана ў нейкім тэксце ці на нейкім іншым матэрыяльным носьбіце, можа ўздзейнічаць на рэальныя грамадскія адносіны, на фактычна існуючае правіла паводзін (норму ў рэальных грамадскіх адносінах, г. зн. норму дэ рэ), іншымі словамі, пытанне ідзе аб тым, наколькі ўплывовым можа быць «ціск» нормы дэ юрэ на норму дэ рэ. Ці можна з дапамогай нормы дэ юрэ змяніць па сутнасці ці стварыць якасна новую норму дэ рэ, г. зн. новую невядомую раней тыповую сітуацыю.

Пытанні для самаправеркі

1. Пералічыце формы існавання прававога эквіваленту і вызначце іх адметныя ўласцівасці.

2. У чым Вы бачыце падабенства норм права і іншых відаў сацыяльных норм, а таксама розніцу паміж імі?

3. Правядзіце параўнальны аналіз нормы права і індывідуальнага прававога прадпісання.

4. Ці можна лічыць норму права «першаснай» цаглінкай права?

5. Ці можа быць пастаўлена пытанне аб сапраўднасці нормы права?

6. Які шлях фармавання нормы права – «знізу–уверх» ці «зверху–уніз» з'яўляецца гістарычна, генетычна і сацыяльна больш натуральным для развіцця права?

7. Якія прычыны абумоўліваюць рознае вырашэнне пытання аб структуры нормы права ў англасаксонскай і кантынентальнай прававых сістэмах?

8. Якая з пазіцый аб структуры нормы права ўяўляецца Вам найбольш абгрунтаванай і адпавядаючай сапраўднасці?

9. У чым заключаецца навуковае і практычнае значэнне класіфікацыі норм права?

10. Ці з'яўляюцца заахвочвальныя нормы права «класічным» відам норм права?

11. У чым Вы бачыце тэарэтычнае і практычнае значэнне праблемы выкладання норм права ў тэксце нарматыўна-прававога акта?

12. Ад чаго залежыць эфектыўнасць норм права?

13. Ці можна ставіць праблему эфектыўнасці норм права з адмоўным знакам?

14. Правядзіце размежаванне паміж паняццямі «эфектыўнасць», «эканамічнасць», «карыснасць», «сацыяльная каштоўнасць норм права».

Тэма 11. КРЫНІЦЫ ПРАВА

1. Паняцце, азначэнне і віды крыніц права.
2. Прававы звычай.
3. Прававы прэцэдэнт.
4. Дагавор нарматыўнага зместу.
5. Дактрына (навука) у якасці крыніцы права.
6. Свяшчэннае пісанне ў якасці крыніцы права.
7. Нарматыўны прававы акт (закон).
8. Эвалюцыя (развіццё) крыніц права.

1. Паняцце, азначэнне і віды крыніц права

Гісторыя развіцця права і прававой навукі сведчыць аб тым, што тэрмін «крыніцы права» выкарыстоўваўся раней і прымяняецца зараз у некалькіх сэнсах, г. зн., што дадзеным тэрмінам абазначаюць розныя сацыяльна-прававыя рэальнасці.

Па-першае, тэрмінам «крыніцы права» абазначаюць тыя сілы, якія прывялі калісьці да ўзнікнення права і якія абумоўліваюць зараз яго існаванне і развіццё.

Па-другое, тэрмін «крыніцы права» выкарыстоўваецца для абазначэння ролі ўнутранага (нацыянальнага) і замежнага права ў фармаванні той альбо іншай прававой сістэмы. Такое выкарыстанне тэрміна характэрна для спецыялістаў у галіне параўнаўчага правазнаўства.

Па-трэцяе, тэрмінам «крыніцы права» абазначаюць тую сілу, якая непасрэдна фармулюе нормы права, надае ім агульнаабавязковае значэнне. А сілу гэту бачаць у дзяржаве ці дзяржаўнай волі.

Па-чацвёртае, тэрмінам «крыніцы права» абазначаюць самыя розныя звесткі аб праве і прававых сістэмах мінулага, аб дзеючым праве і існуючых прававых сістэмах. Гэтыя звесткі ўтрымліваюцца ў літаратурных помніках, у працах юрыстаў, гісторыкаў, іншых вучоных, у летапісах, гістарычных хроніках, археалагічных знаходках і г. д.

Па-пятае, тэрмінам «крыніцы права» абазначаюць знешнія сродкі, формы выражэння і замацавання дзеючых у сучасны момант у той ці іншай дзяржаве, той ці іншай прававой сістэме норм права. У гэтым сэнсе тэрмінам «крыніцы права» абазначаюць прызнаныя ў грамадстве формы, у якіх змяшчаюцца дзеючыя нормы права. Менавіта ў апошнім сэнсе тэрмін «крыніцы права» быў найбольш распаўсюджаным у расійскай і савецкай юрыдычнай навуцы.

Як ставіцца да такой разнастайнасці падыходаў да разумення і азначэння аднаго і таго самага тэрміна? Безумоўна, як да анамальнай з'явы, бо пры такім становішчы не толькі навукоўцы, а нават простыя людзі перастаюць разумець адзін аднаго. Зусім недапушчальнай трэба лічыць такую сітуацыю ў юрыспрудэнцыі, якая звязана непасрэдна з жыццядзейнасцю чалавека, з рэалізацыяй правоў і свабод асобы, з прымяненнем права і ўжываннем моцных сродкаў дзяржаўнага прымусу. Для захавання законнасці, забеспячэння аднастайнага прымянення норм права да самых разнастайных жыццёвых сітуацый, для ўсталявання справядлівасці ў грамадскіх адносінах патрэбна абсалютна аднолькавае разуменне зместу норм права і, адпаведна, тых тэкстаў, у якіх яны выкладаюцца, усімі суб'ектамі права: і тымі, хто стварае нарматыўныя прававыя акты, і тымі, хто іх прымяняе, і тымі, хто імі карыстаецца.

Усе гэтыя абставіны не аднойчы прымушалі людзей прыйсці да паразумення ў аднастайным выкарыстанні тых ці іншых юрыдычных тэрмінаў. Рабілася гэта па-рознаму. У кантынентальнай

прававой сістэме «кансэнсус» дасягаўся часцей за ўсё шляхам азначэння спрэчнага тэрміна ў заканадаўстве, г. зн. шляхам фармулявання дэфінітыўных норм права. Пасля гэтага азначаны тэрмін уваходзіў у паўсядзённую прававую практыку і замацоўваўся ў ёй у пэўным сэнсе. Аднак не заўсёды спробы выйсці з «тэрміналагічнага крызісу» былі паспяховымі. Справа ў тым, што ў прававой сістэме, у прыватнасці, у юрыдычнай навуцы існуюць тэрміны, якія не выкарыстоўваюцца непасрэдна ў заканадаўстве і таму не маюць непасрэднага практычнага выкарыстання. Менавіта да гэтай катэгорыі і адносіцца тэрмін «крыніцы права». У юрыдычнай практыцы выкарыстоўваюцца тэрміны, якія абазначаюць асобныя віды крыніц права – закон, дэкрэт, указ, пастанова, звычаі і г. д., а родавы тэрмін «крыніцы права» ўжываецца пераважна ў навуковай і вучэбнай літаратуры. Гэта выратоўвае юрыдычную практыку, але пакідае поле для шматлікіх, часта схаластычных навуковых спрэчак.

Кіруючыся ўжо выказанымі высновамі аб сутнасці права і формамі яго існавання, пад *крыніцамі права можна разумець афіцыйна прызнаныя і замацаваныя знешнія формы выражэння і існавання норм права*, г. зн. тыя «рэзервуары», «сховішчы», у якіх знаходзяцца нормы права, куды іх памяшчаюць стваральнікі і дзе іх знаходзяць правапрымяняльнікі і карыстальнікі.

Логіка-тэарэтычны аналіз гісторыі развіцця прававых сістэм розных народаў у розныя гістарычныя часы сведчыць аб тым, што імі выкарыстоўваліся самыя разнастайныя знешнія формы выражэння і замацавання норм права. Пры гэтым выбар той альбо іншай формы існавання дзеючых норм права быў абумоўлены шэрагам фактараў (абставін): і шляхамі станаўлення і фармавання права, і рэлігійнымі і філасофскімі ўяўленнямі, і культурнымі і нацыянальнымі традыцыямі, і адметнасцю палітычнага развіцця, і стасункамі з іншымі народамі і цывілізацыямі, і г. д.

Разгледзім найбольш тыповыя крыніцы права, тыя, што часцей выкарыстоўваліся і выкарыстоўваюцца зараз у вядомых нам прававых сістэмах: прававы звычай, прававы прэцэдэнт, дагавор нарматыўнага зместу, навука (дактрына), свяшчэннае пісанне, нарматыўны прававы акт (закон).

2. Прававы звычай

Прававы звычай – гістарычна першая крыніца права. Развіццё права ва ўсіх гістарычных і зараз існуючых народаў адбывалася такім чынам, што менавіта ў гэтай крыніцы выкладалі і замацоў-

валі яны свае першыя прававыя нормы. Чаму? Справа ў тым, што права ўзнікае паступова, праходзіць доўгі шлях станаўлення і эвалюцыі. Вядома, што праву папярэднічала монанарматыўная сістэма рэгулявання грамадскіх адносін, для якой было характэрным зліццё, непадзельнае існаванне ўсіх правілаў паводзін з самім жыццём, свядомасцю і паводзінамі чалавека, не існавала падзелу на правы і абавязкі. Гэтыя правілы паводзін захоўваліся дзякуючы традыцыі, звычаю іх выканання, векавой іх даўніне.

Пасля развіцця таварна-грашовых адносін, тавараабмену ўзнікаюць, складваюцца новыя правілы паводзін – нормы права і распадаецца на асобныя віды правілаў паводзін уся монанарматыўная сістэма рэгулявання грамадскіх адносін. Натуральна, у гэтых умовах узнікае пытанне аб тым, як захаваць, абараніць невядомыя ранейшаму грамадству правілы паводзін, якія ўзнікаюць цяпер. Адказ напрошваўся сам сабой. Трэба было надаць ім старую, усім добра вядомую і паважаную ўсёй супольнасцю форму, форму традыцыі, векавога звычая, бо ён быў неаспрэчным, таму што меў рэлігійны, абрадавы, сімвалічны характар.

У літаратуры пры азначэнні прававога звычая для падкрэслівання менавіта яго прававога характару ўказваюць на сувязь звычая з дзяржавай, з дзяржаўнай воляй. Пры гэтым падкрэсліваецца, што толькі санкцыянаваны (г. зн. узяты пад абарону) дзяржавай звычай становіцца прававым. Памылковасць такога падыходу да азначэння прававога звычая бачна ўжо ў тым, што далёка не кожны звычай, скажам, у традыцыйнай ці мусульманскай прававых сістэмах, які рэгулюе прававыя па свайму зместу грамадскія адносіны, бярэцца пад ахову дзяржавы, тым не менш, ён у поўнай меры з'яўляецца крыніцай права, бо менавіта ў ім сацыяльныя суб'екты шукаюць адказы на прававыя пытанні і кіруюцца ў паўсядзённым жыцці нормамі прававога звычая. Гэта самае можна назіраць сёння ў кантынентальнай прававой сістэме. Важна, такім чынам, прызнанне звычая прававым не з боку дзяржавы, а з боку грамадскай супольнасці. Неблага, калі гэта зробіць і дзяржава. Але першынство тут усё ж застаецца за грамадствам. Больш таго, не ўсякі звычай, які ўзяты пад ахову дзяржавай, набывае прававы характар. Гэта сведчыць аб тым, што не дзяржава надае звычаю прававыя рысы, якасці крыніцы права, а зусім іншыя абставіны робяць яго прававым. У рэчышчы сфармуляванай і развіваемай намі канцэпцыі сутнасці права прававым з'яўляецца той звычай, існаванне якога наўпрост, непасрэдна альбо ўскосна, апасродкавана абумоўлена тавараабменам, абменам каштоўнасцямі і развіццём таварна-грашо-

вых адносін. Дзяржава можа (павінна) узяць пад сваю ахову толькі прававы па свайму характару звычай і гэтым надаць яму дадатковую сілу, фармалізаваць яго агульную значнасць і агульную абавязковасць.

У прававым звычаі выдзяляюцца два цесна ўзаемазвязаныя, але ўсё ж розныя моманты. Па-першае, гэта правіла паводзін – норма права, а па-другое, тая форма, у якой існуе правіла паводзін. Пры нязменнасці нормы права, замацаванай у прававым звычаі, можа мяняцца форма яе выражэння і, наадварот, мяняцца можа правіла паводзін, а нязменнай застаецца форма.

Што тычыцца звычаёвай нормы права, то яна ўзнікае дзякуючы дзеянню дзвюх сіл. Па-першае, нейкага ўчынку асобнага чалавека, учынку, які не ўкладваецца ў рамкі існуючых правілаў паводзін, але які адпавядае жыццёвым патрэбам, з'яўляецца карысным і не пагражае ўмовам існавання супольнасці. Па-другое, жадання іншых індывідаў зрабіць так, як папярэднік ці папярэднікі. Такім чынам, вобраз дзеяння, які выбіраюць асобныя, больш энергічныя людзі, становіцца агульнай нормай, звычаем таму, што астатнія прывыкаюць пасіўна рабіць таксама. Звычай зыходзіць ад індывідуальнага пераканання, але паступова становіцца агульным. Зразумела, што стваральнікамі звычаёвага права былі людзі энергічныя і дужыя. Менавіта таму першапачатковае звычаёвае права лічыцца правам дужага.

Прававы звычай (дакладней, яго форма) на працягу свайго доўгага існавання ў якасці крыніцы права прайшоў пэўныя адметныя этапы развіцця.

Першапачаткова ідэя права ўсведамлялася і асэнсоўвалася не шляхам нейкіх абстрактных разважанняў і тэарэтычных выкладак, а шляхам самых разнастайных сімвалічных дзеянняў і абрадаў. Юрыдычныя сімвалы, г. зн. знешнія фармальныя дзеянні, умоўныя факты, ужываліся для выражэння справядлівасці, правамернасці той ці іншай з'явы, таго ці іншага чалавечага ўчынку. Сімвалічная форма замацавання нейкіх юрыдычных паняццяў, норм права была найменш дасканалай спробай «апрануць» юрыдычныя паняцці і нормы ў знешнюю, даступную для разумення ўсёй супольнасцю форму.

Больш развітым этапам існавання прававога звычая былі юрыдычныя прымаўкі і юрыдычныя прыказкі. Тое правіла паводзін, якое першапачаткова выказвалася сімвалам і абрадам, стала фармулявацца словам, выказвацца ў выглядзе кароткіх і добра запамінаемых словазлучэнняў, у якіх азначаліся гатовыя да рэалізацыі і

прымяненне аксіёмы, нормы права па самых разнастайных юрыдычных пытаннях. Шмат якія з чыста юрыдычных прымавак дайшлі да сённяшняга дня, але страцілі пры гэтым свой ранейшы агульнаабавязковы змест. На гэтым прыкладзе мы назіраем сітуацыю, пры якой захоўваецца знешняя форма прававога звычая, а знікае яго змест.

Трэцім этапам у эвалюцыі прававога звычая былі юрыдычныя вершы, быліны, песні, легенды, казкі. Яшчэ ў старажытнасці людзі заўважылі, што менавіта з дапамогай гэтых паэтычных сродкаў можна перадаць больш даступна і без страты сэнсу вялікі аб'ём звестак аб дзеючым праве. З гісторыі развіцця права вядома, што старажытнагрэчаскі заканадавец Салон выклаў свае законы ў вершаванай форме. Рымляне таксама выкладалі прававыя формулы, якія выкарыстоўваліся ў юрыдычным працэсе, у вершаванай форме пад назвай «Кармэн».

Нарэшце, чацвёртым, найвышэйшым, этапам у развіцці прававога звычая як крыніцы права была сістэматызацыя прававых звычаяў, іх запіс. Развіццё звычаёвага права ў Старажытным Рыме фактычна было завершана пасля таго, як сістэматызаваныя прававыя звычаі знайшлі сваё адлюстраванне на XII драўляных дошках (адсюль і назва гэтага помніка права – законы XII табліц). Абагульненне прававых звычаяў, ліквідацыя розных супярэчнасцей паміж імі, іх сістэматызацыя і запіс у выглядзе нейкіх зборнікаў – агульная заканамернасць развіцця звычаёвага права розных народаў. Дастаткова ўзгадаць такія помнікі звычаёвага права, як Законы Хамурапі і Законы Ману, Саксонскае зярцала, Рускую Праўду, Польскую Праўду XIII ст.

Як было вышэй адзначана, доўгі час права існавала выключна або пераважна ў форме прававога звычая. Гэты перыяд развіцця права ў навуковай і вучэбнай літаратуры называюць звычаёвым правам. Яму ўласцівы некаторыя характэрныя асаблівасці: рэлігійны характар, партыкулярызм (пляменныя, родавыя, абшчынныя межы існавання звычая), кансерватызм (стабільнасць і нязменнасць). Доўгі час менавіта гэтыя якасці прававога звычая забяспечвалі яму амаль манапольнае панаванне ў сферы права. Інтэрнацыяналізацыя гаспадарчага жыцця, фарміраванне нацыянальнага, а затым і міжнароднага рынку, пранікненне таварна-грашовых адносін ва ўсё новыя і новыя сферы чалавечага жыцця разбураюць «вузка нацыянальныя» межы звычаёвага права. Выяўляецца няздольнасць прававога звычая як кансерватыўнай формы права адэкватна рэагаваць на новыя прававыя рэальнасці. Акрамя гэтага,

узмацняецца дзяржаўная ўлада і пачынае прэтэндаваць на ролю асноўнага творцы права, актыўна ўмешвацца ў гаспадарчыя і прававыя працэсы, стварае невядомыя раней агульнаабавязковыя нормы, якія часта адмяняюць або замяняюць прававыя звычаі. Дзяржава стварае і новую крыніцу (форму) права, нарматыўны прававы акт (закон) – пісьмовы акт-дакумент, у якім фармулююцца нормы права. Наступае заняпад звычаёвага права.

У сучасным грамадстве прававы звычай вельмі актыўна выкарыстоўваецца ў традыцыйных прававых сістэмах некаторых дзяржаў Афрыкі, Акеаніі, Лацінскай Амерыкі. Значную ролю адыгрывае прававы звычай у дзяржавах з мусульманскай прававой сістэмай у якасці дадатковай крыніцы права. Пры афіцыйным панаванні, «вяршэнстве» ў гэтых сістэмах норм шарыята ў рэальнасці шырока ўжываюцца старадаўнія прававыя звычаі.

Вядома, што ў свой час кансерватыўнасць звычаёвага права шмат у чым абумовіла яго заняпад, бо прававы звычай не паспяваў за грамадскімі адносінамі, якія дынамічна развіваліся. На змену звычаю тады прыйшлі нарматыўныя прававыя акты (законы). Але зараз высвятляецца, што за хуткімі пераменамі ў грамадскіх адносінах, якія абумоўлены навукова-тэхнічным прагрэсам, не паспяваюць і законы. Адбываецца своеасаблівая «рэцэпцыя» звычаёвага права, дакладней, яго разнавіднасцей. Пры адсутнасці патрэбных норм права сфера прававога рэгулявання запаўняецца судовай (арбітражнай) ці юрыдычнай, у шырокім сэнсе слова, практыкай. Менавіта практыка выпрацоўвае патрэбнае правіла паводзін, якое пазней фармулюецца ў законе.

Асобна трэба адзначыць, што прававы звычай захоўвае трывалыя пазіцыі ў міжнародным праве, дзе ён з'яўляецца важным сродкам не толькі існавання норм права, але і іх стварэння. Прававыя звычаі, у падмурку якіх ляжаць прынцыпы суверэнітэту і роўнасці дзяржаў, лічацца абавязковымі для ўсіх дзяржаў сусветнай супольнасці. Што ж тычыцца іншых прававых звычаяў, то яны з'яўляюцца абавязковымі для дзяржавы, калі дзяржава прызнае іх. Шырока прымяняюцца прававыя звычаі ў міжнародным гандлі. У прыватнасці, прававы звычай быў прызнаны крыніцай права ў Канвенцыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый «Аб дагаворах міжнароднай куплі-продажу тавараў» 1980 года.

3. Прававы прэцэдэнт

Прававы прэцэдэнт – адна з найстаражытнейшых крыніц права, якая выкарыстоўвалася раней і выкарыстоўваецца зараз ва ўсіх без выключэння прававых сістэмах. Праўда, межы выкарыстання прававога прэцэдэнта ў якасці крыніцы права ў вядомых нам прававых сістэмах істотна розныя. Напрыклад, у англасаксонскай прававой сістэме прававы прэцэдэнт з'яўляецца зараз асноўнай, вядучай крыніцай права, у той час як у кантынентальнай ці мусульманскай ён мае як бы «дадатковае» значэнне.

У самым агульным плане прававы прэцэдэнт уяўляе нейкае рашэнне суда ці іншага юрысдыкцыйнага органа, якое з'яўляецца, з аднаго боку, абавязковым для ўдзельнікаў канкрэтнай прававой справы, а з другога, узорам для выкарыстання пры разглядзе аналагічных спраў гэтым жа самым альбо іншым юрысдыкцыйным органам. Гістарычна і генетычна фармаванне прававога прэцэдэнта звязана са станаўленнем цэнтральнай дзяржаўнай улады альбо спецыяльных юрысдыкцыйных органаў (судоў), якія пачалі выконваць функцыю па прымяненню права, ажыццяўленню правасуддзя. Да гэтага дадзеную місію ў грамадстве здзяйсняла ўся супольнасць (абшчына, сход абшчыны ці яе прадстаўнічы орган) альбо розныя трацейскія ўстановы і інстытуты, бо такі парадак ажыццяўлення правасуддзя, прымянення права цалкам адпавядаў характару звычаёвага права, для якога ўласцівы стварэнне, захаванне і рэалізацыя права ўсёй супольнасцю.

Натуральны працэс фармавання правіла паводзін (нормы права) у прававым звычаі выглядае наступным чынам: нейкі ўчынак удзельніка грамадскіх адносін, які не ахопліваецца дзеючым правам – паслядоўнікі (іншыя сацыяльныя суб'екты), тыя, хто прымае здзейснены акт паводзін папярэдніка за ўзор – фармаванне агульнага правіла паводзін – нормы права – прызнанне яго агульнаабавязковым усёй супольнасцю і выкарыстанне ў паўсядзённым жыцці. Правіла паводзін набывае пры гэтым стабільнасць, устойлівасць і непарушнасць. Іншы, скарочаны, шлях праходзіць фармаванне правіла паводзін (нормы права) у прававым прэцэдэнце. Тут практычна нейкі адзіны ўчынак, аднаразавы акт (рашэнне) кампетэнтнага органа дзяржавы альбо спецыяльнага юрысдыкцыйнага органа стварае агульнаабавязковую норму. Акрамя гэтага, розніца паміж фармаваннем правіла паводзін у выпадку з прававым звычаем і прававым прэцэдэнтам бачыцца яшчэ і ў суб'ектах, якія фармулююць яго. У фармуляванні і захаванні нормы прававога звычая

ўдзельнічаюць у большай ці меншай меры амаль усе суб'екты грамадскіх адносін, а ў выпадку з прававым прэцэдэнтам – толькі строга акрэсленая іх частка. Гэта спецыяльна ўпаўнаважаныя на прыняцце рашэнняў органы дзяржавы ці спецыяльныя юрысдыкцыйныя органы.

Разгледзім больш падрабязна гэтую крыніцу права, яе структуру (будову) і правілы прымянення на прыкладзе агульнага права Англіі, дзе прэцэдэнт, як было вышэй адзначана, з'яўляецца асноўнай крыніцай права.

Што тычыцца будовы прэцэдэнта, то ў ім выдзяляюцца дзве часткі. Першая – гэта пазіцыя суддзі, яго разважанні, аргументацыя, на падставе якіх ён выносіць рашэнне альбо прысуд. Называецца яна ratio decidendi. Другую частку прэцэдэнта складае obiter dicta – тое, што сказана адначасова з ratio decidendi. Калі першая частка прэцэдэнта складае яго аснову і з'яўляецца абавязковай, бо менавіта на яе падставе прымаецца рашэнне, то obiter dicta ўяўляе сабой тыя аргументы, доказы суддзі, якія хаця і з'яўляюцца правапалажэннямі, але не ўваходзяць у склад ratio decidendi і таму не маюць абавязковага значэння для вывадаў суда па разглядаемай справе.

Сказанае аб структуры прававога прэцэдэнта дазваляе сцвярджаць, што задача англійскага суддзі, які вырашае нейкую справу і выкарыстоўвае пры гэтым вынесенае вышэйстаячым судом рашэнне па аналагічнай справе, зводзіцца да таго, каб выдзеліць у рашэнні вышэйстаячага суда тое, што для яго носіць абавязковы характар, г. зн. ratio decidendi, і тое, што носіць характар obiter dicta.

Зразумела, у англійскай сістэме права сродкі фіксацыі і перадачы норм прававых прэцэдэнтаў абумоўліваюць тое, што агульны аб'ём запісаў, у якіх выкладаюцца прэцэдэнты, пастаянна павялічваецца. Так, на пачатку XX ст. збор судовых прэцэдэнтаў налічваў 1800 тамоў і штогод павялічваўся на 10 тамоў. У Злучаных Штатах Амерыкі, дзе таксама дзейнічае агульнае права, аб'ём судовых прэцэдэнтаў яшчэ большы. Безумоўна, такая сітуацыя стварае пэўныя цяжкасці ў карыстанні прэцэдэнтным правам.

У англійскай прававой сістэме, акрамя прававога прэцэдэнта, распаўсюджаны такія крыніцы права, як нарматыўна-прававы акт (закон) і прававы звычай. У самай агульнай форме суадносіны прававога прэцэдэнта з іншымі крыніцамі права ў Англіі выглядаюць наступным чынам. Прававы звычай як крыніца права падпарадкаваны прававому прэцэдэнту. Справа ў тым, што ў прававой сістэме Англіі з даўніх часоў дзейнічае аксіёма, згодна з якой прымяняемы

прававы звычай павінен быць «разумным». Ніводная судовая інстанцыя Англіі не надзелена правам адмяняць ці змяняць прававы звычай, але калі яна прызнае яго «неразумным», г. зн. састарэлым, страціўшым сэнс, то астатнія суды перастаюць з ім лічыцца, і гэты прававы звычай страчвае юрыдычнае значэнне.

Больш складанымі выглядаюць узаемаадносіны паміж прававым прэцэдэнтам і законам – актам парламента. З аднаго боку, норма права, якая сфармулявана ў прававым прэцэдэнце, можа быць адменена парламенцкім актам. І ў гэтых стасунках прэцэдэнт як бы падпарадкаваны закону. Але, з другога боку, закон рэальна пачынае дзейнічаць пасля таго, як на яго пачынаюць спасылацца суды пры разглядзе канкрэтных справаў, і, такім чынам, змест норм закону ўваходзіць у ratio decidendi. Пры гэтым суды могуць па свайму разуменню тлумачыць змест закону, які пасля тлумачэння набывае той сэнс, што быў нададзены яму судом. Усё гэта дае падставу лічыць, што закон, у сваю чаргу, залежыць ад прэцэдэнта.

Прававая дактрына (навука) і заканадаўства ў рамана-германскай прававой сістэме прызнаюць, праўда, з пэўнымі агаворкамі і не заўсёды паслядоўна, прававы прэцэдэнт у якасці адной з дадатковых крыніц права. Непаслядоўнасць заканадаўчай практыкі ў адносінах да прававога прэцэдэнта – сведчанне адсутнасці ў кантынентальнай прававой сістэме грунтоўнага тэарэтычнага асэнсавання гэтай крыніцы права, яе прыроды і магчымых межаў выкарыстання. У адносінах да прававога прэцэдэнта ў асяроддзі навукоўцаў і асабліва юрыстаў-практыкаў пераважаюць палітыка-ідэалагічныя перакананні ў шкоднасці, а таму і недапушчальнасці выкарыстання гэтай крыніцы права. Менавіта адназначна адмоўныя адносіны да прававога прэцэдэнта панавалі ў савецкія часы ў айчыннай прававой навуцы. У апошнія гады шэрагам айчынных даследчыкаў прадпрыняты спробы тэарэтычнага асэнсавання прыроды прававога прэцэдэнта і асабліва доказаў магчымага і неабходнага выкарыстання гэтай крыніцы права.

У мусульманскай прававой сістэме прававым прэцэдэнтам па сваёй сутнасці з'яўляецца такая крыніца права, як кіяс – рашэнне, якое было прынята па аналогіі. Калі ў мусульманскай прававой сістэме правапрымяняльнікі не знаходзілі ў Каране і Суне прамога адказу на пытанне, якое трэба было вырашаць, яны выкарыстоўвалі норму, што рэгулявала падобныя сітуацыі. А паколькі фактычныя абставіны справы, да якой прымянялі норму, адрозніваліся ад тых, што апісваюцца ў Каране і Суне, асноўных крыніцах мусульманскага права, то рашэннем па аналогіі па сутнасці стваралася новая норма права.

4. Дагавор нарматыўнага зместу

Дагавор нарматыўнага зместу – адна з распаўсюджаных у мінулым і зараз крыніц права. Фармаванне норм права шляхам дагавору было абумоўлена шэрагам прычын (абставін), сярод якіх выдзяляюцца тры найбольш значныя. Сутнасць першай зводзіцца да таго, што дагавор дазваляў пераадолець кансерватыўны характар звычаёвага права. З дапамогай пагаднення ўдзельнікі грамадскіх, прававых па свайму характару адносін маглі сфармуляваць правіла паводзін, якое адсутнічала ў звычаёвым праве. У гэтым сэнсе дагавор нарматыўнага зместу садзейнічаў развіццю «нацыянальнага» (пляменнага, родавага) права. Другая прычына, якая ўздзейнічала на фармаванне дагавору нарматыўнага зместу, мае «інтэрнацыянальны» характар. Развіццё тавараабмену і таварна-грашовых адносін паміж асобнымі плямёнамі і родамі патрабавала стварэння аднолькавых для ўдзельнікаў гэтых адносін правілаў паводзін. Зрабіць гэта можна было рознымі шляхамі. Актыўна на першых этапах развіцця права выкарыстоўваўся шлях гвалтоўнага навязвання «свайго права» і адначасова знішчэння іншых прававых сістэм. Але не менш шырокае распаўсюджанне атрымаў і такі спосаб стварэння права, як пагадненне бакоў, у якім замацоўваліся новыя, невядомыя раней, нормы права. Затым яны арганічна ўваходзілі ў «нацыянальныя» прававыя сістэмы, узбагачалі і развівалі іх. І, нарэшце, значны ўплыў на станаўленне дагавору нарматыўнага зместу мы назіраем з боку дзяржаўнай улады. У гісторыі дзяржавы і права добра вядомы пагадненні паміж князямі і гарадамі (напрыклад, так званае запрашэнне на княжэнне), паміж саслоўямі і ўладарамі, паміж князямі.

Што тычыцца характарыстыкі дагавору нарматыўнага зместу непасрэдна ў якасці крыніцы права, г. зн. знешняй формы існавання норм права, то ў сваім развіцці ён прайшоў два этапы. Першапачаткова дагавор існаваў у выглядзе вуснага пагаднення, якое часта суправаджалася пэўнымі сімваламі і абрадамі, напрыклад, клятвай. Гэты этап у развіцці дагавору нарматыўнага зместу можна ўмоўна назваць «джэнтльменскім». Са з'яўленнем пісьменства дагавор нарматыўнага зместу ўступае ў больш развітую фазу свайго развіцця. Ён існуе ў пісьмовым выглядзе. Пісьмовы дагавор – больш дасканалы сродак замацавання норм права, якія фармулююцца шляхам пагаднення, бо дазваляе дакладна і ясна выкласці правіла паводзін, давесці яго да ўсіх суб'ектаў права і тым самым забяспечыць дадатковую (усеагульную) падтрымку ў рэалізацыі і абароне сфармуляванай у дагаворы нормы права. У сучасным грамадстве

дагавор нарматыўнага зместу пераважна існуе ў пісьмовым выглядзе. Разам з тым, як ва ўнутрыдзяржаўным, так і ў міжнародным праве выкарыстоўваюцца і «джэнтльменскія» пагадненні.

Такім чынам, дагавор нарматыўнага зместу ў якасці крыніцы права ўяўляе вуснае альбо пісьмовае пагадненне паміж двума ці некалькімі суб'ектамі (удзельнікамі) грамадскіх адносін, шляхам якога ствараюцца агульнаабавязковыя правілы паводзін – нормы права.

Натуральна, што ва ўмовах пашырэння сферы рыначных адносін адбываецца развіццё прававых па свайму зместу грамадскіх адносін. Нормы права, якія рэгулююць гэтыя адносіны, ствараюцца не толькі шляхам дзяржаўнай заканатворчасці, бо дзяржава ва ўмовах дынамічнага развіцця грамадскіх адносін звычайна не паспявае гэта зрабіць, а і шляхам самых разнастайных пагадненняў паміж удзельнікамі (суб'ектамі) грамадскіх адносін, і замацоўваюцца ў пісьмовых дагаворах. І калі раней пры характарыстыцы крыніц права, якія выкарыстоўваліся ў СССР, юрыдычная навука ў якасці асноўнага прыкладу ўжывання дагавору нарматыўнага зместу ўказвала на калектыўны дагавор у працоўным праве, то зараз практычна ў кожнай галіне права, за выключэннем крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага, актыўна выкарыстоўваецца менавіта гэтая крыніца права. Можна ўпэўнена сцвярджаць, што і ў бліжэйшай і нават больш аддаленай будучыні ў дагавора нарматыўнага зместу ў дзяржавах, што ўтварыліся на постсавецкай прасторы, маецца шырокая перспектыва.

Моцныя пазіцыі дагавор нарматыўнага зместу традыцыйна захоўвае ў міжнародным праве. Справа ў тым, што ў міжнародных адносінах няма іншых суб'ектаў стварэння норм права, акрамя іх удзельнікаў. Пры гэтым адзіным сродкам стварэння міжнароднаправавых норм з'яўляецца пагадненне паміж суб'ектамі міжнароднага права, бо толькі яны надаюць тым ці іншым правілам сваіх паводзін агульнаабавязковае значэнне. Калі пагадненне паміж суб'ектамі міжнародных адносін аб фармаванні норм права дасягаецца яўна, то яны маюць назву дагаворных норм, а калі яно дасягаецца маўкліва, то нормы называюцца звычаёвымі.

Аб значнасці дагавору ў міжнародным праве сведчыць той факт, што ў ім нават сфармавалася самастойная галіна агульнага міжнароднага права пад назвай «права міжнародных дагавораў». Больш таго, зараз практычна няма ні адной галіны міжнароднага права, узнікненне і развіццё якой у той ці іншай ступені не былі б звязаны з дагаворам. У 60-х гадах XX ст. створаная Арганізацыяй

Аб'яднаных Нацый спецыяльная камісія распрацавала праект кадыфікаванага акта аб праве міжнародных дагавораў, і ў 1968-1969 г. скліканая ААН канферэнцыя прыняла Венскую канвенцыю аб праве міжнародных дагавораў, якая ўступіла ў сілу ў 1980 годзе. У артыкуле 2 гэтай Канвенцыі даецца азначэнне міжнароднага дагавору як рэгулюемага міжнародным правам пагаднення, што заключана дзяржавамі і іншымі суб'ектамі міжнароднага права ў пісьмовай форме незалежна ад таго, змяшчаецца такое пагадненне ў адным, двух ці некалькіх звязаных паміж сабой дакументах, а таксама незалежна ад канкрэтнай назвы.

Вельмі значная роля адводзіцца міжнародным дагаворам і пагадненням і ў міжнародным прыватным праве. Сярод асноўных крыніц міжнароднага прыватнага права дагавор ставіцца многімі аўтарамі на першае месца. Пры гэтым падкрэсліваецца, што роля дагавору ў гэтай сферы міжнароднага права ўвесь час узрастае, а ў такіх галінах міжнароднага супрацоўніцтва, як эканамічная і навукова-тэхнічная, чыгуначныя, паветраныя, аўтамабільныя перавозкі, аўтарскае і патэнтнае права, дагавор стаў асноўнай, вядучай крыніцай права.

У сучасных Канстытуцыях дзяржаў звычайна фармулююцца палажэнні аб узаемаадносінах норм і прынцыпаў міжнароднага права, у тым ліку і міжнародных дагавораў, як з Канстытуцыяй, так і з законамі. Так, у артыкуле 8 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замацавана правіла, згодна з якім Рэспубліка Беларусь прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім заканадаўства. Адначасова ў ч. 3 гэтага ж артыкула Канстытуцыі ўстанаўліваецца правіла аб тым, што не дапускаецца заключэнне міжнародных дагавораў, якія супярэчаць Канстытуцыі.

5. Дактрына (навука) у якасці крыніцы права

Амаль ва ўсіх вядомых нам прававых сістэмах важнай крыніцай права з'яўляецца дактрына (навука). Адметным зъяўляецца сам працэс стварэння і фармулявання норм права, якія змяшчаюцца ў гэтай крыніцы права. Яны ўяўляюць нейкія філасофска-тэарэтычныя ці нават этычныя разважанні і вывады аб праве, будове тых ці іншых прававых рэальнасцей. Па сваёй стылістыцы, унутранай логіцы яны нічым не адрозніваюцца ад тых навуковых палажэнняў, што не з'яўляюцца прававымі нормамі. Пры ўсім гэтым трэба, аднак, падкрэсліць, што ўласна прававы характар нейкія навуко-

выя палажэнні набываюць не самі па сабе, не таму толькі, што на гэта існуе згода супольніцтва альбо дзяржавы. Галоўнае, што надае ім прававы змест, заключаецца ў тым, што яны тычацца эквівалентнай прыроды грамадскіх адносін, заснаваных (ці абумоўленых) на маёмаснай няроўнасці. Менавіта таму, што дактрынальныя палажэнні фармулююць лагічна і паслядоўна элементы «прававой матэрыі», ім можна надаць агульнаабавязковае значэнне.

Дактрынальныя (навуковыя) палажэнні, як сведчыць гісторыя развіцця права, пачынаюць выконваць ролю норм права ў пераломныя моманты развіцця грамадства, калі ні сам народ, ні яго афіцыйны прадстаўнік – дзяржава, ніякія іншыя сацыяльныя суб'екты не ў стане сфармуляваць дастатковую колькасць правілаў паводзін для рэгулявання прававых па сваёй прыродзе грамадскіх адносін. Вельмі часта дактрынальным палажэнням надавалася роля норм права пры стварэнні агульнанацыянальнага права з мэтай ліквідацыі мясцовых прававых сістэм. Нарэшце, спецыфіка англасаксонскай прававой сістэмы з яе прэцэдэнтным (агульным) правам лагічна абумоўлівае неабходнасць выкарыстання нейкіх навуковых вывадаў, аргументаў, сістэмы доказаў у якасці ratio decidendi ў вырашэнні канкрэтных юрыдычных спраў. Такім чынам, прычыны самага рознага кшталту абумоўліваюць выкарыстанне дактрынальных палажэнняў у якасці агульнаабавязковых правілаў паводзін.

Вядома, што навуковыя здабыткі, палажэнні, вывады знешне існуюць у выглядзе навуковых артыкулаў, падручнікаў, манаграфій, вучэбных дапаможнікаў, у іншых формах. Раней выкарыстоўваліся для іх абазначэння такія тэрміны, як «трактат», «вопыты», «даследаванне», «кніга» і г. д. Менавіта ў гэтых сваіх знешніх праявах дактрынальныя палажэнні і выкарыстоўваюцца ў якасці крыніцы права. Натуральна, што дактрына (навука) з'яўляецца выключна пісанай крыніцай права.

Класічны прыклад выкарыстання навукі ў якасці крыніцы права знаходзім у гісторыі рымскага права. Вядома, што пасля прыняцця XII табліц заканадаўчая дзейнасць у Рыме амаль цалкам была спынена. Доўгі час гэтая крыніца рымскага права лічылася яго падмуркам. Але так сталася, што далейшае развіццё рымскага права ажыццяўлялася з дапамогай магістрацкага эдзікта. Справа ў тым, што з расшырэннем межаў рымскай дзяржавы і пераўтварэннем яе ў імперыю асноўная місія ў стварэнні агульнаімперскай прававой сістэмы была ўскладзена на службовых асоб (прэтар, эдзіл). Пры заняцці сваіх пасад яны аб'яўлялі ў сваіх эдзіктах аб тым, якімі

нормамі (правіламі) будуць кіравацца ў сваёй дзейнасці ў сітуацыях, якія не прадугледжаны законамі. Зразумела, калі няма прамога закону, то пытанне аб тым, як вырашыць асобную сітуацыю ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу, вымагае значных інтэлектуальных высілкаў. Гэта і прадвызначыла ролю рымскіх вучоных-юрыстаў і іх навуковых досведаў у развіцці права.

Пры імператары Актавіяне Аўгусце было ўстаноўлена правіла, згодна з якім адказы ці аўтарытэтныя тлумачэнні юрыстаў па пытаннях права даваліся як бы ад імя самога імператара. Гэтым навуковым заключэнням, вывадам афіцыйна надаваўся статус крыніцы права, яны набывалі агульнаабавязковы характар як для асобы, так і для дзяржаўных органаў. Імператар Ціберый пачаў надзяляць асобных, найбольш знакамітых юрыстаў «правам адказаў». Своеасаблівым «залатым векам» рымскай юрыспрудэнцыі лічацца II-III ст. н. э., калі жылі і працавалі такія юрысты, як Папініян, Павел, Ульпіян, Мадзесцін, Гай. Пасля таго, як намаганнямі рымскіх юрыстаў прававая сістэма была дасканала распрацавана, былі знойдзены, сфармуляваны адказы практычна на ўсе прававыя пытанні, дзейнасць рымскіх юрыстаў пачынае абмяжоўвацца. У 426 годзе імператар Валенціян III выдаў указ, згодна з якім службовыя асобы і суддзі пры вырашэнні прававых пытанняў павінны былі кіравацца навуковымі здабыткамі, меркаваннямі пяці вышэйпералічаных юрыстаў, а таксама навуковымі працамі тых даследчыкаў, на якіх спасылаліся Папініян, Павел, Ульпіян, Мадзесцін, Гай. Было таксама сфармулявана правіла аб тым, што ў выпадку рознагалосся сярод гэтых юрыстаў па таму ці іншаму пытанню яно вырашалася па большасці галасоў. Пры роўнасці галасоў перавага аддавалася той пазіцыі, якой прытрымліваўся Папініян. Такім чынам, Папініян лічыўся першым сярод роўных (primus inter paros – лац.). Калі ж Папініян не выказваўся па разглядаемаму пытанню, то яно вырашалася па волі суддзі.

Важнай крыніцай права застаецца навука (дактрына) у прававой сістэме Англіі, дзе выкарыстоўваюцца навуковыя працы юрыстаў мінулага і сучасная юрыдычная літаратура. Ужо ў сярэднявечны аўтарытэтнымі крыніцамі права лічыліся: трактат Глэнвіла «Аб традыцыйным праве і законах каралеўства Англіі», які быў напісаны ў канцы праўлення Генрыха II (1154–1188), а таксама праца Брэктана «Аб традыцыйным праве і законах Англіі», напісаная прыкладна ў сярэдзіне XIII ст. Цікава тое, што за ўзор для свайго трактата Брэктан узяў працу Глэнвіла, але значна пашырыў і паглыбіў кола разглядаемых пытанняў. Яго трактат змяшчае апісанне больш за 2000 прэцэдэнтаў з практыкі каралеўскага суда.

Вялікім попытам у якасці крыніцы права карыстаюцца ў Англіі навуковыя працы Кока, які пасля выхаду на пенсію з пасады суддзі напісаў «Інстытуцыі англійскіх законаў». Сярод 12 аўтараў мінулага, працы якіх прызнаюцца ўсімі суддзямі і юрыстамі ў якасці аўтарытэтных крыніц права, можна адзначыць таксама прозвішча вядомага нам Блэкстана і яго працу «Каментарыі да законаў Англіі» (1765 г.). На працягу доўгага часу ў Англіі дзейнічала правіла, згодна з якім можна было лічыць крыніцамі права (і, адпаведна, спасылацца на іх) навуковыя працы тых аўтараў, што былі ўжо нябожчыкамі.

Вялізнае значэнне надаецца прававой дактрыне ў мусульманскай прававой сістэме, бо яна забяспечвае прыстасаванне мусульманскага права да рэчаіснасці, якая пастаянна мяняецца, захоўвае непарыўныя сувязі паміж заканадаўствам мусульманскіх дзяржаў і яго першаснымі крыніцамі – Каранам і Сунай. Навука ў якасці крыніцы мусульманскага права называецца «фікх». Роля навукі ў мусульманскім праве настолькі значная, што многія даследчыкі лічаць адзінай яго крыніцай працы вучоных-юрыстаў, а ўсё мусульманскае права – правам юрыстаў. Пры гэтым яны падкрэсліваюць, што ролю заканадаўцы фактычна выконвае прававая навука, а навуковыя працы маюць сілу закону, што суддзі ў мусульманскай прававой сістэме не звяртаюцца да Карана і Суны пры вырашэнні канкрэтных спраў, а спасылаюцца на аўтараў, аўтарытэт якіх лічыцца агульнапрызнаным.

Да ліку навуковых прац, якія ўваходзяць у паняцце «крыніцы права» («фікх»), належаць сачыненні знакамітых знаўцаў шарыята, якія былі напісаны ў асноўным у сярэднявеччы. Па некаторых звестках, такіх прац налічваецца прыкладна 6 тысяч. Ніякага афіцыйнага рэестра гэтых прац няма, тым больш цікавым з'яўляецца тое, што яны нікім афіцыйна не зацвярджаліся ў якасці крыніц права. Згодна з агульным духам ісламa крыніцамі права гэтыя навуковыя працы становяцца «натуральным» шляхам, г. зн. з маўклівай згоды мусульманскай супольнасці.

6. Свяшчэннае пісанне ў якасці крыніцы права

У самым агульным плане пад свяшчэнным пісаннем, якое выконвала ролю крыніцы права раней, а таксама займае значнае месца сярод крыніц права ў некаторых прававых сістэмах сучаснасці, разумеюцца тэксты і правілы, якія змяшчаюцца ў Бібліі, Каране, Суне, пастановах усяленскіх і памесных сабораў; правілы,

якія выпрацавалі і сфармулявалі святыя апосталы і святыя айцы царквы; правілы, выдадзеныя па царкоўных справах царкоўнымі ўладамі, і г. д.

З гісторыі развіцця права вядома, што ўвогуле рэлігія, царква аказалі вялізны ўплыў на фармаванне права і ўсіх прававых сістэм без выключэння. Яшчэ з часоў першабытнага грамадства жрацы і першасвятары «манапалізавалі» функцыю па стварэнню і захаванню рэлігійных па сваёй сутнасці норм і абрадаў, што былі агульнаабавязковымі для ўсёй супольнасці. З развіццём тавараабмену і таварна-грашовых адносін, пачаткам фармавання права яны імкнуліся ўрэгуляваць і гэтую сферу жыцця грамадства, стварыць нормы права. І трэба адзначыць, рабілася гэта небеспаспяхова. Аналіз тэкстаў такіх вядомых прававых помнікаў, як Законы Ману, Законы Хамурапі, сведчыць аб тым, што ў іх утрымліваецца шмат норм права, якія амаль літаральна былі перанесены са свяшчэнных пісанняў. Пэўны, даволі працяглы час існаваў дуалізм сярод крыніц права на ранніх этапах яго развіцця. Побач з прававым звычаем, дзе з перавагай над ім, а дзе і паралельна, дзейнічалі нормы права, сфармуляваныя першасвятарамі і выкладзеныя ў свяшчэнных пісаннях.

Для норм, якія змяшчаюцца ў свяшчэнных пісаннях (у навуковай літаратуры гэтыя нормы называюцца кананічнымі, або царкоўнымі), характэрна тое, што ў іх заўсёды прысутнічае маралізатарскі элемент. Другой адметнай рысай кананічных норм з'яўляецца тое, што яны заўсёды ствараюцца шляхам абстракцый і выключна ў выніку лагічных разважанняў. Справа ў тым, што прыняты царквою на ўзбраенне схаластычны метад мыслення садзейнічаў развіццю менавіта лагічнага мыслення, абуджаў рацыяналістычныя сілы чалавечага духа і, безумоўна, быў асновай фармулюемых кананічных норм. Яшчэ ў 30-я гады XX ст. знакаміты французскі даследчык Л. Леві-Бруль даказаў, аналізуючы мысленне чалавека, што існуюць два яго спосабы – пралагічны (містычны) і лагічны. Для першабытнага грамадства быў найбольш характэрным містычны спосаб мыслення (уласцівы ён і зараз адсталым у сваім развіцці супольнасцям), ён пераплятаўся з лагічным. Выцясненне містычнага спосабу мыслення лагічным адбывалася менавіта праз далучэнне народаў да сусветных рэлігій, праз засваенне імі схаластычнага метаду.

І, нарэшце, трэцяй асаблівасцю кананічных норм з'яўляецца тое, што яны строга ранжыраваны паміж сабой у залежнасці ад таго, у тэкстах якіх свяшчэнных пісанняў яны сфармуляваны. Найвялікшым аўтарытэтам карыстаюцца правілы, якія змешчаны ў тэкстах Старога і Новага Запаветаў, Каране і Суне.

Уздзеянне норм кананічнага права на фармаванне кантынентальнай прававой сістэмы і ў асаблівасці на заканадаўства назіралася на розных напрамках і ажыццяўлялася ў разнастайных формах. Фармальная азначанасць кананічных норм, іх дакладнасць, яснасць садзейнічалі поспеху пры апрацоўцы недакладных і заблытаных мясцовых прававых звычаяў. Пры рабоце з імі шырока выкарыстоўваліся навыкі і прыёмы, распрацаваныя царквою з мэтай фармулявання кананічных норм, складання царкоўных і манастырскіх статутаў, іншых нарматыўных актаў. Вядома, што з прыняццем усходнімі славянамі хрысціянства на тэрыторыі спачатку Кіеўскай Русі, а затым у Вялікім княстве Літоўскім, Масковіі дзейнічалі запазычаныя з Візантыі Намаканоны, якія ўяўлялі як зборы свецкага заканадаўства, так і правілы святых апосталаў, святых айцоў царквы, пастановы ўсяленскіх і памесных сабораў. Фактычна Намаканоны (nomas – закон; canon – царкоўнае правіла) з'яўляліся першымі кадыфікаванымі прававымі актамі, былі на той час найвялікшымі здабыткамі прававой культуры. Яны выконвалі ролю своеасаблівых падручнікаў па заканадаўчай тэхніцы, па якіх вучыліся апрацоўваць, сістэматызаваць і лагічна выкладаць мясцовае звычаёвае права. Можна вызначыць наступную цікавую асаблівасць заканатворчасці і развіцця заканадаўства ў народаў кантынентальнай Еўропы. Там, дзе існавалі моцныя хрысціянскія традыцыі і роля царквы была вялікай, было моцным яе ўздзеянне на свецкую ўладу, там сістэматызацыя і кадыфікацыя звычаёвага права, стварэнне новых, невядомых раней, правілаў паводзін ажыццяўлялася найбольш хутка і на даволі высокім тэхнічна-юрыдычным узроўні.

У Заходняй Еўропе моцным быў уплыў на фармаванне прававых сістэм класічнага рымскага права, у асаблівасці Кодэкса Юсцініяна. Разам з тым Кодэкс Юсцініяна ўздзейнічаў на мясцовае звычаёвае права не сам па сабе, бо выкарыстаць яго было цяжка. Ён быў апрацаваны ў італьянскіх універсітэтах навукоўцамі з дапамогай распрацаванага царквою метаду схаластыкі (дзейнасць школы гласатараў) і менавіта пасля гэтага фактычна выконваў у Заходняй Еўропе ролю, падобную той, што ва Усходняй Еўропе выконвалі Намаканоны.

Утварэнне ў кантынентальнай Еўропе адзіных цэнтралізаваных прававых сістэм і сістэм заканадаўства адбывалася, такім чынам, пад значным уплывам хрысціянскай культуры і царквы. Наколькі вялікай была іх роля, сведчаць наступныя факты. Велізарная і наймагутнейшая Рымская імперыя так і не змагла стварыць адзіную, аднастайную для ўсёй імперыі прававую сістэму. Не змаглі стварыць такую сістэму на Русі ні князь Святаслаў, ні князь Ігар.

Гэта стала магчымым пасля ўвядзення хрысціянства і творчага выкарыстання ўсіх яго здабыткаў, у тым ліку і кананічных норм.

Іншым быў шлях стварэння англасаксонскай прававой сістэмы, сістэмы агульнага права. Пачатак яе стварэння звязваецца з імем Вільгельма Заваёўніка. Вядома, што ён быў паганцам. Ці не гэтым тлумачыцца шлях, які быў абраны ім для аб'яднання партыкулярнага звычаёвага права ў адзіную прававую сістэму? Адсутнасць моцных хрысціянскіх традыцый у мясцовага насельніцтва і асабліва ва ўладных структурах аб'ектыўна вяла да таго, што агульнае права Англіі стваралася не абстрактна-тэарэтычным, а эмпірычным шляхам, дзейнасцю каралеўскіх судоў.

У мусульманскай прававой сістэме тэарэтычна прызнаецца, па сутнасці, толькі адна крыніца права – свяшчэнныя тэксты Карана і Суны. Каран разглядаецца ў якасці вечнага і нязменнага дакумента. Уласна юрыдычных норм у ім мала. Але паколькі ў ісламе рэлігійныя і маральныя прадпісанні непасрэдна звязаны з правам, то амаль усе яго палажэнні можна выкарыстаць у якасці крыніцы права. Суна – такая крыніца права, якая падначалена Карану. Калі яе палажэнні (ходзісы) супярэчаць Карану, то яны не маюць моцы крыніцы права. У выпадках, калі нельга знайсці адказ на юрыдычнае пытанне ні ў Каране, ні ў Суне альбо калі ўзнікае рознагалоссе ў разуменні палажэнняў гэтых крыніц права, ствараецца новая норма – іджма – адзінагалоснае меркаванне муджтахідаў. У адрозненне ад нязменных Карана і Суны, іджма лічыцца змяняемай крыніцай права.

7. Нарматыўны прававы акт (закон)

Нарматыўны прававы акт у самым агульным плане ўяўляе дакумент, вынік нарматворчай дзейнасці кампетэнтнага органа, у якім змяшчаюцца нормы права. Нарматыўны прававы акт – апошняя па часе ўзнікнення і адна з асноўных крыніц права ў сучасных цывілізаваных дзяржавах. Ёсць некалькі чыннікаў, якія абумоўліваюць зараз шырокае выкарыстанне менавіта гэтай крыніцы права. Па-першае, нарматыўныя прававыя акты могуць быць аператыўна выдадзены, у любым аб'ёме зменены альбо адменены. Гэтая ўласцівасць дадзенай крыніцы права дазваляе хутка і эфектыўна рэагаваць на змяненні ў грамадскіх адносінах, забяспечваць адэкватнае іх рэгуляванне з дапамогай норм права. Па-другое, нарматыўна-прававыя акты, як правіла, выдаюцца адзіным цэнтрам –

дзяржавай. Гэта забяспечвае іх сістэмнасць, лагічнасць і мэтанакіраванасць пры вырашэнні задач прававога рэгулявання грамадскіх адносін. Па-трэцяе, нарматыўны прававы акт дазваляе дакладна і адназначна, ясна выкласці змест прававых норм. Гэтая якасць нарматыўнага прававога акта дае яму значныя перавагі над прававым звычаем, прававым прэцэдэнтам, некаторымі іншымі крыніцамі права, у якіх нормы права не заўсёды выкладаюцца адназначна і маюць фармальна-азначаны характар.

Узнікненне і пашырэнне сферы выкарыстання гэтай крыніцы права, асабліва ў кантынентальнай сістэме права, знаходзяцца ў цесных стасунках з узмацненнем дзяржаўнай улады, узрастаннем яе ролі ў вырашэнні разнастайных праблем грамадскага развіцця. Напачатку дзяржава рэгулявала з дапамогай нарматыўных прававых актаў тыя грамадскія адносіны, якія непасрэдна абумоўлівалі дзяржаўныя інтарэсы. Гэта тычылася сродкаў фінансавага забеспячэння дзяржавы, вызначэння яе межаў, будовы дзяржаўнага апарату і дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання, вайсковых і паліцэйскіх спраў. Менавіта з гэтых сфер перш-наперш і былі выцеснены прававыя звычаі і іншыя крыніцы права. Асноўную, а часта выключную ролю тут сталі выконваць нормы права, якія былі сфармуляваны ў нарматыўных прававых актах. Крок за крокам нарматыўны прававы акт пачынае пранікаць у маёмасныя, сямейныя і іншыя віды грамадскіх адносін.

Месца і роля нарматыўных прававых актаў сярод крыніц права шмат у чым вызначаюцца характарам стварэння норм права, якія фармулююцца і замацоўваюцца ў іх. У мінулым пры стварэнні нарматыўных прававых актаў заканадаўцы шырока выкарыстоўвалі тыя нормы права, што ўжо склаліся ў жыцці і апраўдалі сябе. Безумоўна, выкарыстоўваемыя нормы старанна апрацоўваліся, сістэматызаваліся, частка з іх прызнавалася заканадаўцам страціўшымі сваю сілу і юрыдычнае значэнне. У сучасных умовах дзяржава аналізуе асноўныя напрамкі, тэндэнцыі развіцця грамадскіх адносін, якія маюць прававы характар, і на гэтай падставе фармулюе нормы права. Такі працэс стварэння норм права стаў своеасаблівым падмуркам для распаўсюджанай юрыдычнай ілюзіі аб тым, што менавіта дзяржава стварае права. Гэтая ілюзія ў дзяржавах з аўтарытарнымі дзяржаўна-прававымі рэжымамі ператвараецца нават у адзін з афіцыйных дагматаў дзяржаўна-прававой ідэалогіі.

Нарматыўны прававы акт – гэта родавая назва разглядаемай крыніцы права. Гэты тэрмін пачаў выкарыстоўвацца адносна нядаўна. Раней вельмі распаўсюджанай назвай гэтай крыніцы права

быў тэрмін «закон», хаця ў розных народаў і ў розныя часы ён абазначаў далёка не аднолькавыя прававыя з'явы. Так, у старажытнай Грэцыі гэтым тэрмінам абазначалі прававыя звычаі, у яўрэяў – рэлігійныя па свайму зместу правілы паводзін («Законы Маісея»), у Вялікім княстве Літоўскім – характар веравызнання («закон грэчаскі» і «закон лацінскі»), і толькі ў Старажытным Рыме гэты тэрмін (па лацінскі – «lex») адпавядаў свайму сучаснаму зместу, бо ім абазначалі прававыя акты, што зыходзілі ад палітычнай улады. У Новы час тэрмін «закон» пачалі выкарыстоўваць для абазначэння прававых актаў, якія выдаваліся вышэйшымі прадстаўнічымі органамі дзяржаўнай улады – парламентамі, а для абазначэння прававых актаў, што выдаваліся іншымі органамі дзяржавы, – дэкрэт, ардананс, рэгламент, пастанова, рашэнне, загад, распараджэнне і г. д. Агульнай назвай для самых разнастайных прававых актаў, якія выдаюцца ўсімі дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі і змяшчаюць у сабе нормы права, стаў тэрмін «нарматыўны прававы акт».

Нарматыўна-прававы акт (закон) – вядучая крыніца права ў дзяржавах рамана-германскай прававой сям'і. Гэты факт стаў бясспрэчным пасля таго, як у XIX ст. у дзяржавах кантынентальнай Еўропы былі праведзены агульнанацыянальныя кадыфікацыі і практычна ўсё дзеючае права было выкладзена ў выглядзе нарматыўных прававых актаў. Сучасная юрыдычная дактрына ў кантынентальнай прававой сістэме лічыць нарматыўны прававы акт лепшым тэхнічным сродкам фармавання норм права ва ўмовах складанасці і дынамізму грамадскіх адносін, які дазваляе каардынаваць дзейнасць людзей у разнастайных сферах чалавечага жыцця для дасягнення агульнага інтарэсу.

Іншае стаўленне да нарматыўнага прававога акта (закону) назіраецца ў англійскім праве. Класічная тэорыя бачыць у ім толькі другарадную крыніцу права, бо нарматыўны прававы акт, згодна з ёй, уносіць толькі нейкія змяненні і дапаўненні ў права, якое ствараецца судовай практыкай. Дух права, яго прынцыпы выпрацоўваюцца судамі, а нарматыўныя прававыя акты толькі ўдакладняюць і падмацоўваюць іх. У Англіі з павагай ставяцца да свайго ўсемагутнага парламента, шануюць і паважаюць прымаемыя ім статуты (законы), але дзеючым правам нарматыўныя прававыя акты становяцца там толькі пасля таго, як на змешчаныя ў іх нормы спасылаюцца суды пры разглядзе канкрэтных спраў. Гэта азначае, што толькі пасля таго, як тая альбо іншая норма, змешчаная ў статуце, увойдзе ў склад ratio decidendi прававога прэцэдэнта, яна становіцца дзеючым правам.

Другараднае значэнне мае нарматыўны прававы акт у мусульманскай прававой сістэме. Вынікае гэта перш-наперш з агульнай канцэпцыі праваразумення ў ісламе. Справа ў тым, што права, згодна з ісламам, ствараецца Алахам, яно становіцца вядома людзям праз прарока Мухамеда. Няма іншай сілы, якая б стварала права, акрамя Алаха. Праўда, мусульманская канцэпцыя крыніц права не забараняе парламенту, іншым органам дзяржаўнай улады выдаваць нарматыўныя прававыя акты і такім чынам ствараць нормы права. Пры гэтым выданне актаў абмяжоўваецца патрабаваннямі ісламa, якім ствараемыя дзяржавай нормы права ні ў якім разе не могуць супярэчыць, бо людзі не могуць адмяніць альбо змяніць патрабаванні Карана і Суны. Іх задача пры напісанні нарматыўных прававых актаў зводзіцца да выканання волі Алаха, а людзі павінны выкласці гэтую волю ў нормах, артыкулах, главах.

8. Эвалюцыя (развіццё) крыніц права

Гісторыя развіцця права сведчыць аб тым, што кожная з вышэйазначаных крыніц права выкарыстоўвалася ў вядомых нам прававых сістэмах, у функцыянаванні права кожнага з гістарычных і зараз існуючых народаў. Але дамінуючае значэнне мелі некаторыя з крыніц права. Выклікана гэта было шмат якімі прычынамі, своеасаблівымі шляхамі развіцця права ў розных народаў. Пры гэтым роля тых альбо іншых крыніц права ў іх прававых сістэмах то ўзрастала, то памяншалася. Ёсць, аднак, і агульныя заканамернасці ў развіцці крыніц права розных прававых сістэм і ў розных народаў.

На першапачатковых этапах развіцця права галоўную ролю сярод крыніц права выконвалі прававы звычай, прававы прэцэдэнт і дагавор нарматыўнага зместу. Крыху пазней, пасля ўзнікнення сусветных рэлігій, свяшчэнныя пісанні актыўна выкарыстоўваліся ў якасці важнай крыніцы права. Дактрына (навука) аказала актыўнае ўздзеянне ў якасці крыніцы права на прававыя сістэмы некаторых народаў (асабліва ў Старажытным Рыме) і займае зараз пачэснае месца ў мусульманскай і англасаксонскай прававых сістэмах. Нарматыўны прававы акт (закон) – цывілізаваная крыніца права ў класічным сваім абліччы, ён выконваў раней і выконвае зараз вядучую ролю ў кантынентальнай прававой сістэме.

У эвалюцыі крыніц права сустракаюцца сітуацыі, калі назвы, якія ўласцівы адным крыніцам, неабгрунтавана замацоўваліся за другімі. Так, у Новы час і зараз тэрмін «закон» выкарыстоўваецца для абазначэння звычаёвых па свайму характару крыніц права. Сведчаннем таму можа з'яўляцца гістарычны помнік права, вы-

дадзены пры вавілонскім цару Хамурапі прыкладна ў 2100 г. да нараджэння Хрыста, які называецца ў навуковай і вучэбнай літаратуры кодэксам Хамурапі, ці законамі Хамурапі. Аналіз гэтага помніка права не дае ніякіх падстаў лічыць, што змешчаныя ў ім палажэнні ўяўляюць уласныя «адкрыцці» цара-заканадаўцы. Наадварот, з усяго, што нам зараз дакладна вядома, вынікае, што гэтая крыніца права была пабудавана на падставе існаваўшых з незапамятных часоў старажытных прававых звычаяў, якія дайшлі да Хамурапі ад папярэднікаў, менавіта ад шумерыйцаў.

Сустракаюцца ў гісторыі развіцця крыніц права і такія нетыповыя сітуацыі, калі назва і змест крыніцы права ўтвараюцца ад зліцця розных па паходжанню норм права і ад спалучэння розных назваў. Так, вядома, што на Русі на працягу доўгага часу выкарыстоўвалася крыніца права пад назвай Намаканон (у рускім варыянце часта выкарыстоўвалася назва «Кормчая книга»). Яна ўяўляла па зместу збор кананічных (царкоўных) норм і норм права, выдадзеных дзяржаўнай уладай. Назва яе ўтварылася ад спалучэння двух тэрмінаў – nomas – па грэчаску «закон» і canon – «правіла».

Паколькі ў прававых сістэмах выкарыстоўваюцца ў тых ці іншых межах усе крыніцы права, то ўзнікае пытанне аб іх суадносінах паміж сабой, іх субардынацыі і значнасці. У навуцы гэтае пытанне фармулюецца як праблема вяршэнства, г. зн. першынства таго ці іншага віду крыніц права. Прыватным выпадкам гэтай праблемы з'яўляецца пытанне аб вяршэнстве закону сярод нарматыўна-прававых актаў і іншых крыніц права. У англасаксонскай прававой сістэме з моманту яе фармавання і па сённяшні дзень першынство належыць прававому прэцэдэнту, у рамана-германскай першапачаткова вядучая роля належала прававому звычаю, а зараз – нарматыўнаму прававому акту (закону), а ў мусульманскай прававой сістэме галоўнае значэнне належыць свяшчэннаму пісанню і дактрыне (навуцы). Але і ў асяроддзі прэцэдэнтаў, прававых звычаяў, свяшчэнных пісанняў, нарматыўных прававых актаў у сваю чаргу ўстанаўліваюцца сувязі падначалення, іерархічнай залежнасці, напрыклад, закон – падзаконныя акты, Каран – Суна – іджма і г. д.

Можна адзначыць, што ў кожнай з прававых сістэм субардынацыя крыніц права вельмі своеасаблівая. У залежнасці ад гістарычных умоў фармавання прававых сістэм іх найістотнейшыя, самыя фундаментальныя прынцыпы і нормы замацоўваліся ў тых ці іншых відах крыніц права. Менавіта гэтыя віды крыніц права і перамагалі сярод усіх відаў крыніц права. Безумоўна, такое вылучэнне адбывалася не само па сабе, так сказаць, аўтаматычна. За гэтым працэсам стаялі ў кожным выпадку пэўныя сацыяльныя сілы, якія

былі зацікаўлены ў змене прававых каштоўнасцей, а адпаведна, ва ўзвышэнні іерархіі і крыніц права, у якіх яны знаходзілі адлюстраванне.

У развіцці крыніц права назіраецца, такім чынам, заканамернасць, змест якой зводзіцца да таго, што карэнныя змены ў іх месце суправаджаюцца, як правіла, зменай іх ролі і месца сярод іншых крыніц права. Справа ў тым, што фармаванне ў прававых сістэмах новых, невядомых раней, прававых эквівалентаў патрабуе і новых форм выражэння і замацавання гэтых эквівалентаў. Як нельга маладое віно заліваць у старыя мяхі, так нельга ў адных і тых жа крыніцах права выкладаць супрацьлеглыя ці несумяшчальныя па зместу прававыя нормы. Лепш за ўсё сфармуляваць новыя прававыя эквіваленты ў іншых відах крыніц права і адначасова выдзеліць ім больш значнае месца сярод крыніц права. У такім разе састарэлыя прававыя эквіваленты, нормы права падпарадкоўваюцца новым згодна з новымі залежнасцямі паміж крыніцамі права. Прыкладам можа служыць развіццё традыцыйнай прававой сістэмы Афрыкі ў XIX–XX ст., якая пад уздзеяннем права метраполій (Англіі, Францыі, Германіі) прыняла новыя прававыя каштоўнасці і вымушана была змяніць субардынацыю паміж крыніцамі права. Прававы звычай як крыніца права адышоў на другі план, а на ролю вядучых крыніц былі вылучаны альбо прававы прэцэдэнт, альбо нарматыўна-прававы акт, у залежнасці ад таго, каштоўнасці якой метраполіі былі запазычаны.

Залежнасці паміж крыніцамі права не абавязкова ўстанаўліваюцца строга па іерархіі. Паміж імі можа існаваць узаемазалежнасць, як гэта склалася паміж статутам (законам) і прававым прэцэдэнтам у Англіі. А ў Данії, напрыклад, юрыдычная навука і практыка зыходзяць з таго, што ніводная з крыніц права не валодае абсалютнай перавагай (вяршэнствам) перад астатнімі. У Нарвегіі ўвогуле закон прызнаецца роўным з прававым звычаем і прававым прэцэдэнтам.

Вядома, што гістарычна першыя крыніцы права – прававы звычай, прававы прэцэдэнт і дагавор нарматыўнага зместу існавалі першапачаткова ў вуснай форме. Узнікненне і развіццё пісьменства прывяло да «рэвалюцыйных» перамен у характары крыніц права і выкладаемых у гэтых крыніцах права норм. З'явілася магчымасць сістэматызаваць дзеючыя нормы права, пазбавіцца ад супярэчнасцей паміж імі, ясна, дакладна і адназначна сфармуляваць іх змест, пазбавіцца ад прававога месніцтва і стварыць агульнадзяржаўную, уніфікаваную прававую сістэму. Пісьменства дазволіла ўсталяваць субардынацыйныя залежнасці паміж рознымі

відамі крыніц і надаць гэтым залежнасцям афіцыйнае, агульнаабавязковае значэнне.

Пытанні для самаправеркі

1. Якія, на Вашу думку, прычыны прывялі да таго, што тэрмінам «крыніцы права» абазначаюць у юрыдычнай навуцы розныя сацыяльныя з'явы?

2. Якія, на Вашу думку, навуковыя тэрміны можна было б выкарыстоўваць для абазначэння тых сіл, што абумоўліваюць існаванне права; для абазначэння той сілы, што непасрэдна фармулюе нормы права; для абазначэння звестак аб праве?

3. Пералічыце і абгрунтуйце станоўчыя і адмоўныя якасці (уласцівасці) звычаёвага права.

4. Якая існуе розніца паміж пісанымі і няпісанымі прававымі звычаямі?

5. Чаму прававы прэцэдэнт стаў асноўнай крыніцай права ў англасаксонскай прававой сістэме?

6. Пералічыце і абгрунтуйце станоўчыя і адмоўныя ўласцівасці прававога прэцэдэнта ў якасці крыніцы права.

7. Як, на Вашу думку, суадносяцца паміж сабой паняцці прававога і судовага прэцэдэнта?

8. Наколькі значным у параўнанні з прававым звычаем і прававым прэцэдэнтам, на Вашу думку, быў уплыў дагавораў нарматыўнага зместу на развіццё прававых сістэм?

9. Ці правільным будзе сцвярджэнне аб тым, што дактрына (навука) можа выкарыстоўвацца ў якасці крыніцы права і ў вуснай форме свайго існавання?

10. Ці можна лічыць дактрыну (навуку) адной з гістарычна першых крыніц права?

11. Параўнайце ўплыў свяшчэннага пісання ў якасці крыніцы права на станаўленне і развіццё кантынентальнай, англасаксонскай і мусульманскай прававых сістэм.

12. Параўнайце паміж сабой уласцівасці такіх крыніц права, як дактрына (навука) і свяшчэннае пісанне.

13. Як суадносяцца паміж сабой паняцці «нарматыўна-прававы акт», «індывідуальна-прававы акт», «прававы акт»?

14. Ці выкарыстоўваецца (і чаму так ці не) нарматыўна-прававы акт у якасці крыніцы міжнароднага і міжнароднага прыватнага права?

15. Як Вы ставіцеся да думкі некаторых навукоўцаў аб выдзяленні ў самастойныя віды крыніц права прынцыпаў права і рэферэндума (усенароднага галасавання)?

16. Якія, на Вашу думку, тэндэнцыі ва ўзаемаадносінах паміж крыніцамі права характэрны для кантынентальнай, англасаксонскай і мусульманскай прававых сістэм?

17. Наколькі верагодна і апраўдана ў сучасных цывілізаваных дзяржавах выкарыстанне вуснай формы існавання крыніц права?

Тэма 12. КРЫНІЦЫ ПРАВА Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

1. Віды і канстытуцыйныя асновы сістэмы крыніц права ў Рэспубліцы Беларусь.

2. Асноўныя (першасныя), дадатковыя (другасныя) і галоўныя крыніцы сучаснага беларускага права.

3. Юрыдычная значнасць, юрыдычная сіла і юрыдычная вага крыніц права.

4. Характарыстыка асноўных унутрыдзяржаўных крыніц сучаснага беларускага права Рэспублікі Беларусь.

4.1. Нарматыўны прававы акт – галоўная крыніца сучаснага беларускага права. Віды нарматыўных прававых актаў.

4.2. Дагавор нарматыўнага зместу – асноўная ўнутрыдзяржаўная крыніца права ў Рэспубліцы Беларусь.

5. Дадатковыя ўнутрыдзяржаўныя крыніцы права.

6. Нарматыўныя акты судовай улады.

7. Галоўная, асноўныя і дадатковыя крыніцы міжнародна-прававога характару.

1. Віды і канстытуцыйныя асновы сістэмы крыніц права ў Рэспубліцы Беларусь

У папярэдняй тэме была зроблена выснова аб тым, што ў кожнай з гістарычных і зараз існуючых прававых сістэм выкарыстоўваліся раней, выкарыстоўваюцца і зараз, праўда, у рознай ступені і з рознымі іерархічнымі залежнасцямі, наступныя крыніцы права: прававы звычай, прававы прэцэдэнт, дагавор нарматыўнага зместу, дактрына (навука), свяшчэннае пісанне (царкоўных норм) і нарматыўны прававы акт.

Справа ў тым, што кожная з азначаных крыніц права, па-першае, найбольш адэкватна адлюстроўвае асобныя бакі рэгулюемых грамадскіх адносін, а, па-другое, з'яўляецца найбольш прыдатнай для ўздзеяння на сацыяльныя сувязі ў тых ці іншых гістарычных умовах. Таму толькі ў сістэме, у пэўным «наборы» крыніцы права дазваляюць адэкватна ўладкаваць грамадскія адносіны ў межах пэўнага дзяржаўнага ўтварэння. Прававы звычай найбольш прыдатны для рэгулявання грамадскіх адносін, якія характарызуюцца стабільнасцю і кансерватызмам ва ўмовах паступовага, эвалюцыйнага развіцця грамадства, права і дзяржавы. Наадварот, нарматыўны прававы акт і дагавор нарматыўнага зместу найбольш адметна выяўляюць свае ўласцівасці ва ўмовах пастаяннага развіцця і змен-

лівасці грамадскіх адносін, калі патрэбна дакладна акрэсліць тэндэнцыі ў развіцці сацыяльных сувязей. Дактрына (навука) звычайна з'яўляецца найбольш спрыяльнай крыніцай права ва ўмовах гістарычных катаклізмаў, калі тэрмінова патрэбна запоўніць «прававы вакуум». Прававы прэцэдэнт – найбольш спрыяльная крыніца норм права ў так званых адкрытых прававых сістэмах, дзе дакладна не акрэслена сфера дзеяння права. Яго выкарыстоўваюць таксама пры неабходнасці выправіць недахопы ў прававым рэгуляванні грамадскіх адносін іншымі крыніцамі права і ў мэтах адаптацыі дзеючай сістэмы права да зменлівай рэчаіснасці без карэннай «ломкі» і пастаянных змен асноўных крыніц права.

Але калі набор крыніц права ў кожнай прававой сістэме застаецца практычна нязменным, то іх значнасць, межы выкарыстання, іерархічныя залежнасці паміж сабой істотна розныя ў кожнай прававой сям'і, у кожнай нацыянальнай прававой сістэме яны маюць своеасаблівасці. Гэта вызначаецца самымі рознымі фактарамі (абставінамі) – гістарычнымі ўмовамі фармавання прававой сістэмы, прававымі традыцыямі, у рэчышчы якіх сфармавалася пэўная прававая сістэма, узроўнем развіцця прававой культуры, навукі і юрыдычнай адукацыі і г. д.

Прававая сістэма Рэспублікі Беларусь – адносна новая прававая рэальнасць на прававой карце Еўропы. Яна сфармавалася пасля распаду савецкай прававой сістэмы і таму генетычна, асабліва на самых першых этапах фармавання, не магла не ўспрыняць многія яе ўласцівасці і адметнасці, у прыватнасці, істотную ролю дзяржаўнай улады ў стварэнні крыніц права. Моцны ўплыў на фармаванне нацыянальнай сістэмы крыніц права Рэспублікі Беларусь аказалі традыцыі рамана-германскай прававой сістэмы. Па шматлікіх параметрах сістэма крыніц сучаснага беларускага права адпавядае той іх мадэлі, якая склалася на еўрапейскім кантыненце – вядучая роля нарматыўнага прававога акта ў сістэме крыніц права, вяршэнства Канстытуцыі сярод крыніц права, наяўнасць спецыяльнага органа, які забяспечвае адпаведнасць крыніц права Асноўнаму закону, і г. д. Разам з тым асноўны ўплыў на сістэму крыніц сучаснага беларускага права, асабліва на іх субардынацыю і ўзаемазалежнасць, на вызначэнне поля дзеяння, ужывання асобных крыніц права аказвае Асноўны закон краіны, у якім дакладна вызначаны і адмыслова замацаваны сістэмна-прававыя асновы крыніц сучаснага беларускага права.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь для азначэння крыніц сучаснага беларускага права выкарыстоўвае паняцце (тэрмін) «нар-

матыўны акт». Пры гэтым дадзеным паняццем абазначаюцца як крыніцы нацыянальнага беларускага права, так і крыніцы міжнародна-прававога характару. Можна выказаць меркаванне, што паняццем «нарматыўны акт» Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь абазначае ўсе крыніцы права, і ў такім разе канстытуцыйнае паняцце (тэрмін) «нарматыўны акт» можна лічыць тоесным паняццю (тэрміну) крыніцы права. З тым, праўда, удакладненнем, што паняцце «нарматыўны акт» з'яўляецца легальным абазначэннем усёй сістэмы крыніц сучаснага беларускага права, у той час як паняцце (тэрмін) «крыніцы права» застаецца дактрынальным паняццем (тэрмінам).

У гэтых варунках паняцце (тэрмін) «нарматыўны акт» згодна з тэрміналогіяй, якая выкарыстоўваецца ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца родавым паняццем (тэрмінам) для азначэння ўсіх крыніц сучаснага беларускага права. Відамі крыніц права ў гэтым выпадку можна лічыць нарматыўныя акты нацыянальнага і міжнароднага права. У сваю чаргу, кожны з відаў нарматыўных актаў падзяляецца на пэўныя падвіды. Прычым нарматыўныя прававыя акты з'яўляюцца толькі адным з падвідаў нарматыўных актаў нацыянальнага права. Да іншых падвідаў нарматыўных актаў нацыянальнага права можна аднесці ўнутрыдзяржаўны дагавор нарматыўнага зместу, прававы звычай, прававы прэцэдэнт, нацыянальную прававую дактрыну, калі ёй нададзены статус крыніцы права і кананічныя (царкоўныя) нормы.

2. Асноўныя (першасныя), дадатковыя (другасныя) і галоўныя крыніцы сучаснага беларускага права

Да першасных крыніц права адносяцца тыя «рэзервуары», афіцыйныя «сховішчы» дзеючых норм пазітыўнага права, у якіх правапрымяняльныя структуры і ўсе правакарыстальнікі «знаходзяць» агульнаабавязковыя правілы паводзін і спасылаюцца непасрэдна на іх пры вырашэнні канкрэтных прававых пытанняў. Да другасных (дадатковых) крыніц можна аднесці тыя, да якіх правапрымяняльныя структуры звяртаюцца дзеля таго, каб знайсці ў іх дадатковыя прававыя аргументы пры вырашэнні нейкіх пытанняў. Прычым неабходныя для вырашэння справы прававыя аргументы, якія змяшчаюцца ў другасных крыніцах права, маюць юрыдычна абавязковае значэнне не самі па сабе, не паасобку, а толькі ў дадатку, у дапаўненні да асноўных крыніц права. Таму яны і носяць назву другасных (дадатковых) крыніц. Другасныя крыніцы права без першасных крыніц права, як правіла, не дзейнічаюць.

Падзел усіх крыніц права на асноўныя і дадатковыя (першасныя і другасныя) узыходзіць сваімі каранямі, па-першае, да шляхоў фармавання права (норм права) і, па-другое, да будовы (структуры) нормы права. Прычым у залежнасці ад дамінавання шляхоў фармавання норм права (права) у той ці іншай прававой сістэме вызначаюцца субардынацыя паміж элементамі зместу нормы права, значнасць таго ці іншага элемента ў змесце нормы права. А ўжо на падставе субардынацыі паміж элементамі зместу нормы права і вызначаецца падзел крыніц права на асноўныя і дадатковыя.

Справа тут вось у чым. Да ўласна юрыдычнай часткі зместу нормы права шчыльна прывязваюцца нарматыўныя прававыя акты і дагаворы нарматыўнага зместу. Да інтэлектуальна-псіхалагічнай часткі бліжэй знаходзяцца дактрына (навука) і свяшчэннае пісанне. А да сацыяльнай часткі зместу нормы права шчыльна прымыкаюць прававы звычай і прававы прэцэдэнт.

Калі асноўным шляхам стварэння норм права ў пэўнай прававой сістэме з'яўляецца шлях, умоўна кажучы, «зверху–уніз», шлях, які заснаваны на дзейнасці дзяржавы па фармуляванню правілаў паводзін агульнага характару, то вядучай часткай (элементам) у змесце нормы права будзе яе ўласна юрыдычная частка. Адпаведна гэтаму асноўнымі крыніцамі права ў дадзенай прававой сістэме будуць лічыцца нарматыўны прававы акт і дагавор нарматыўнага зместу. Калі ў нейкай з прававых сістэм асноўным шляхам стварэння нормы права будзе шлях, умоўна кажучы, «знізу–уверх», шлях, які заснаваны на стварэнні норм права самой грамадзянскай супольнасцю, то асноўнымі крыніцамі права ў гэтай сістэме будуць выступаць прававы звычай і прававы прэцэдэнт.

Пры пераменах у шляхах фармавання права, якія, у сваю чаргу, абумоўліваюцца шэрагам эканамічных, сацыяльных і палітычных прычын, перавага ў змесце нормы права можа перайсці ад нарматыўнай яе часткі да сацыяльнай. Натуральна, што ў гэтых умовах на ролю асноўных крыніц права будуць вылучаны прававы звычай і прававы прэцэдэнт, а тыя крыніцы права, якія былі дагэтуль асноўнымі, пераўтворацца ў дадатковыя крыніцы права.

Прававая сістэма Рэспублікі Беларусь, як адзначалася, па асноўных параметрах адносіцца да кантынентальнай прававой сям'і, для якой асноўным шляхам у стварэнні норм права з'яўляецца шлях «зверху–уніз», таму асноўнымі крыніцамі сучаснага беларускага права з'яўляюцца нарматыўны прававы акт і дагавор нарматыўнага зместу, а ўсе астатнія вядомыя нам крыніцы права можна лічыць дадатковымі крыніцамі сучаснага беларускага права.

Падзел крыніц права на асноўныя і дадатковыя суправаджаецца таксама вызначэннем таго віду (ці відаў) крыніц права, які займае першаснае значэнне, г. зн. цэнтральнае месца ў сістэме крыніц права, вызначае ў гэтай сістэме залежнасці іерархіі і супарадкавання, замацоўвае асноватворныя прававыя эквіваленты. Калі асноўных крыніц можа быць некалькі, то першаснай звычайна бывае толькі адна крыніца права. Яна лічыцца галоўнай крыніцай права ў пэўнай прававой сістэме. У прававой сістэме Рэспублікі Беларусь галоўнай крыніцай права сярод крыніц унутрыдзяржаўнага віду з'яўляецца нарматыўны прававы акт, а дагавор нарматыўнага зместу сярод унутрыдзяржаўных крыніц з'яўляецца асноўнай, але не галоўнай крыніцай права. Але сярод крыніц сучаснага беларускага права міжнароднага характару дагавор нарматыўнага зместу з'яўляецца адзінай галоўнай крыніцай права. Але ўлічваючы сістэмны характар і адзінства крыніц як унутрыдзяржаўнага, так міжнароднага відаў, можна сцвярджаць, што і нарматыўны прававы акт, і дагавор нарматыўнага зместу ў нацыянальнай беларускай прававой сістэме з'яўляюцца як асноўнымі, так адначасова і галоўнымі крыніцамі права.

3. Юрыдычная значнасць, юрыдычная сіла і юрыдычная вага крыніц права

Паколькі ў прававой сістэме Рэспублікі Беларусь выкарыстоўваюцца ўсе віды крыніц права, то, натуральна, узнікае пытанне аб іх суадносінах паміж сабой. Без супарадкавання крыніц права, вызначэння іх важнасці і падначаленасці, іерархіі і субардынацыі паміж сабой нельга кіравацца дзеючымі прававымі нормамі, прымаць правільныя і законныя прававыя рашэнні. Падзел крыніц права на асноўныя (першасныя), дадатковыя (другасныя) і галоўныя, вызначэнне падстаў такога падзелу ствараюць пэўныя тэарэтычныя перадумовы для вызначэння юрыдычнай значнасці, юрыдычнай сілы і юрыдычнай вагі крыніц права – тых юрыдычных канструкцый, крытэрыяў, з дапамогай якіх і адбываюцца сістэматыка сярод крыніц права, іх ранжыраванне, прывядзенне ва ўзаемаўзгодненую і лагічна несупярэчлівую сістэму. А юрыдычная значнасць, юрыдычная сіла і юрыдычная вага крыніц права вызначаюцца і «вымяраюцца», у сваю чаргу, праз вывучэнне ўзаемазалежнасцей і юрыдычна значных сувязей, якія існуюць у сістэме крыніц права.

Адносна проста юрыдычная значнасць, вага і сіла крыніц права вызначаліся ў савецкай прававой сістэме. Кіруючай сілай грамад-

ства і дзяржавы з'яўлялася КПСС, акты якой фактычна і мелі найбольшую юрыдычную значнасць, хаця да ліку крыніц права і не адносіліся. Вядома таксама, што асноўнай і практычна адзінай крыніцай права ва ўмовах савецкай прававой сістэмы быў нарматыўна-прававы акт, які выдаваўся органамі дзяржаўнай улады. Паколькі падзел уладаў паміж органамі ў савецкай сістэме адсутнічаў, а органы ўлады ранжыраваліся строга па вертыкалі, то юрыдычная сіла нарматыўных прававых актаў вызначалася месцам выдаўшага іх органа дзяржаўнай улады ў сістэме органаў дзяржаўнай улады і кіравання. Юрыдычная вага нарматыўных прававых актаў у той час вызначалася наступным чынам. Законы і заканадаўчыя акты ўвогуле мелі малую ўдзельную вагу сярод крыніц права, асноўную іх масу складалі нарматыўна-прававыя акты Урада, міністэрстваў і ведамстваў. Таму пры фармальным абвяшчэнні першынства закону, яго юрыдычнай значнасці і важнасці, вяршэнства закону, фактычна асноўная маса прававых эквівалентаў, асабліва ў сферы вытворчых і сацыяльных адносін, рэгулявалася актамі ўрада. Закон узначальваў піраміду крыніц права, але фактычна асноўная маса і аб'ём дзеючага права знаходзілі сваё ўвасабленне па-за яго межамі, выкладаліся ў іншых крыніцах права.

У практыцы функцыянавання крыніц права савецкай прававой сістэмы выкарыстоўваўся шэраг правілаў, з дапамогай якіх усталёўваліся юрыдычныя залежнасці паміж асобнымі відамі нарматыўных прававых актаў. Яны цалкам прыдатныя для ўсталявання юрыдычна значных залежнасцей, а, адпаведна, і юрыдычнай значнасці, сілы і вагі паміж нарматыўнымі прававымі актам і ў нашай прававой сістэме, праўда, з удакладненнем, што яны прыдатны для тых відаў нарматыўных прававых актаў, якія выдадзены органамі ўлады, што знаходзяцца ў іерархічнай залежнасці. Гэтыя правілы можна сфармуляваць наступным чынам: а) нарматыўныя прававыя акты органаў дзяржаўнай улады, якія ў іерархіі органаў дзяржавы стаяць вышэй, валодаюць большай юрыдычнай сілай у параўнанні з нарматыўнымі прававымі актамі органаў дзяржаўнай улады, якія знаходзяцца на больш нізкіх прыступках іерархічнай лесвіцы; б) апошнія па часу выдання нарматыўныя прававыя акты маюць юрыдычную перавагу над нарматыўнымі прававымі актамі тых самых органаў дзяржаўнай улады, якія былі выдадзены імі раней; в) сярод нарматыўных прававых актаў, якія былі прыняты органамі дзяржавы, што знаходзяцца на адной і той самай прыступцы іерархічнай лесвіцы, большай юрыдычнай сілай валодаюць акты тых органаў дзяржавы, якія маюць спецыяльную кампетэцыю,

г. зн. спецыяльна ўпаўнаважаны на рэгуляванне пэўнай сферы грамадскіх адносін.

Але ва ўмовах пабудовы дзяржаўнай улады на прынцыпе яе падзелу на асобныя галіны і пры наяўнасці ў прававой сістэме ўсіх вядомых відаў крыніц права дадзеных правіл недастаткова, каб вызначыць юрыдычную значнасць, сілу і вагу крыніц права, пабудаваць іх адмысловую сістэму. Справа ў тым, што паміж асобнымі галінамі адзінай дзяржаўнай улады існуюць не толькі адналінейныя іерархічныя сувяі (напрыклад, урад – міністэрства), а таксама сувязі каардынацыі (напрыклад, Нацыянальны сход –Прэзідэнт), іншыя ўзаемазалежнасці, а кожная з самастойных галінаў улады стварае ўласцівыя ёй крыніцы права. Акрамя гэтага, існуюць самыя розныя залежнасці паміж унутрыдзяржаўнымі відамі крыніц права і крыніцамі права міжнародна-прававога характару.

У гэтых умовах юрыдычная значнасць, сіла і юрыдычная вага крыніц права вызначаецца, па-першае, месцам і роллю асобных органаў улады ў сістэме самастойных галінаў улады і, па-другое, фармальна-азначанымі і канстытуцыйна замацаванымі палажэннямі. Іншымі словамі, у новых умовах юрыдычная сіла і вага асобных відаў крыніц права вызначаюцца не толькі «матэрыяльнымі» крытэрыямі – месцам выдаўшага іх органа ў сістэме органаў улады, але і «фармальнымі» крытэрыямі – тымі канстытуцыйна-замацаванымі палажэннямі, якія вызначаюцца мноствам сацыяльна-эканамічных і палітычных, унутрыдзяржаўных і міжнародна-прававых фактараў. Гэтыя фактары ўздзейнічаюць на будову дзяржаўнай улады, характар яе падзелу, на аб'ём паўнамоцтваў органаў асобных галінаў улады, узаемаадносіны паміж асобнымі галінамі і органамі, але дакладна матэрыялізаваны быць не могуць. Іх вагу і значнасць для сістэмы крыніц права можна фармалізаваць і замацаваць на ўзроўні Асноўнага закону ці шляхам выдання асобнай крыніцы права, напрыклад, закону (ці кодэкса аб крыніцах права). Усталяванне субардынацыйных залежнасцей паміж крыніцамі права можа адбывацца і натуральным шляхам, «стыхійна», паступова, але такі шлях непажаданы, таму што ён суправаджаецца шматлікімі парушэннямі права.

Для ўсталявання юрыдычна значных сувязей і залежнасцей у сістэме крыніц права трэба вызначыць, па-першае, сувязі і залежнасці, якія складваюцца ў асобных відах крыніц права, па-другое, сувязі і залежнасці, якія існуюць паміж асобнымі відамі крыніц права, і, нарэшце, па-трэцяе, сувязі і залежнасці, якія ўласцівы кожнай з падсістэм крыніц права – унутрыдзяржаўнай і міжнароднай.

У навуцы гэтае пытанне звычайна фармулюецца як праблема вяршэнства, г. зн. першынства таго ці іншага віду крыніц права. Прыватным выпадкам гэтай праблемы з'яўляецца пытанне аб вяршэнстве закону сярод нарматыўных прававых актаў і іншых крыніц права. Але вызначэнне ўсяго мноства юрыдычна значных сувязей і залежнасцей у сістэме крыніц права абумоўлівае выкарыстанне і іншых тэрмінаў і паняццяў – «юрыдычная значнасць», «юрыдычная вага» і «юрыдычная сіла».

У залежнасці ад гістарычных умоў фармавання прававых сістэм іх самыя істотныя і самыя фундаментальныя прынцыпы і нормы замацоўваліся ў тых ці іншых відах крыніц права. Менавіта гэтыя віды крыніц права і «перамагалі» сярод усіх відаў крыніц права, вылучаліся на першае месца сярод астатніх відаў крыніц права, набывалі прыярытэт, «вяршэнства», большую юрыдычную значнасць у параўнанні з іншымі крыніцамі права, і, як правіла, менавіта гэтаму віду крыніц права надавалася больш высокая юрыдычная сіла. Такім чынам, больш высокая юрыдычная сіла, як правіла, замацоўваецца за тымі відамі крыніц права, у якіх выкладаліся найбольш значныя па зместу прававыя эквіваленты.

Як вядома, у англасаксонскай прававой сістэме (сям'і агульнага права) з моманту яе фармавання і па сённяшні дзень прыярытэт захоўваецца за прававым прэцэдэнтам, у рамана-германскай (кантынентальнай) перавага аддаецца нарматыўнаму прававому акту (закону), а ў мусульманскай прававой сістэме цэнтральнае месца сярод усіх відаў крыніц права належыць свяшчэннаму пісанню і дактрыне (навуцы). У сваю чаргу, у асяроддзі прэцэдэнтаў, сістэме нарматыўных прававых актаў, сярод тэкстаў свяшчэнных пісанняў і іншых крыніц права ўстанаўліваюцца сувязі падначалення, іерархічнай залежнасці, напрыклад, закон – падзаконныя акты, Каран – Суна – іджма і г. д. Але ранжыраванне паміж крыніцамі права аднаго і таго самага віду адбываецца крыху па іншых падставах, чым паміж рознымі іх відамі.

Юрыдычная значнасць асобных відаў крыніц права вызначаецца не толькі іх юрыдычнай сілай, становішчам, месцам у сістэме крыніц права, але і іх юрыдычнай вагай. Пад юрыдычнай вагай крыніц права трэба разумець іх распаўсюджанасць сярод крыніц права, іх удзельную вагу сярод крыніц права. Юрыдычная вага крыніц права, такім чынам, вызначаецца аб'ёмам і колькасцю норм права, якія «апранаюцца» ў форму дадзенай крыніцы права. Чым больш дзеючых норм знаходзяць сваё ўвасабленне і замацаванне ў

тым ці іншым відзе крыніц права, тым большай з'яўляецца яго юрыдычная вага.

Важнае значэнне для пабудовы сістэмы крыніц права мае ўсталяванне залежнасцей паміж крыніцамі ўнутрынацыянальнага і міжнароднага права.

Вядома, нормы права, якія ўтрымліваюцца ў міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь і якія ўступілі ў сілу, з'яўляюцца складанай часткай дзеючага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь заканадаўства, падлягаюць непасрэднаму прымяненню і маюць юрыдычную сілу таго нарматыўнага акта, якім дадзена згода Рэспублікі Беларусь на абавязковасць для яе адпаведнага міжнароднага дагавору. Такім чынам, нельга ставіць міжнародны дагавор па юрыдычнай сіле адразу пасля Канстытуцыі дзяржавы. Ён можа мець юрыдычную сілу дэкрэта, указа, закону і г. д.

Аналагічна з вызначэннем юрыдычнай сілы міжнароднага дагавору можна, як уяўляецца, вызначыць юрыдычную сілу і, адпаведна, месца ў іерархіі крыніц права ўнутрыдзяржаўных дагавораў нарматыўнага зместу. Яны могуць мець юрыдычную сілу нарматыўных актаў Урада Рэспублікі Беларусь, калі адным з бакоў дадзенага дагавору з'яўляецца Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь. Такую юрыдычную сілу маюць, напрыклад, пагадненне паміж Беларускай Праваслаўнай Царквой і Рэспублікай Беларусь, а таксама пагадненне, якое заключаецца паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Саюзам Беларускіх Прафсаюзаў.

Такім чынам, юрыдычная сіла нарматыўных прававых актаў і, адпаведна, іх месца ў іерархіі нарматыўных прававых актаў з'яўляюцца тым «нарматыўным каркасам», да якога «прывязваецца» такая крыніца права, як дагавор нарматыўнага зместу (міжнародны і ўнутрыдзяржаўны). Гэта з'яўляецца дадатковай падставай для сцвярджэння аб тым, што нарматыўны прававы акт выступае галоўнай, вядучай крыніцай права ў Рэспубліцы Беларусь, а разам з дагаворам нарматыўнага зместу, як міжнароднага, так і ўнутрыдзяржаўнага характару, ён з'яўляецца асноўнай крыніцай сучаснага беларускага права.

Месца іншых відаў крыніц права і іх юрыдычная значнасць у прававой сістэме Рэспублікі Беларусь таксама вызначаюцца і замацоўваюцца ў нарматыўных прававых актах. Аб гэтым будзе ісці размова пры разглядзе дадатковых крыніц права і крыніц права, якія выдаюцца органамі судовай улады Рэспублікі Беларусь.

4. Характарыстыка асноўных унутрыдзяржаўных крыніц сучаснага беларускага права Рэспублікі Беларусь

4.1. Нарматыўны прававы акт – галоўная крыніца сучаснага беларускага права. Віды нарматыўных прававых актаў

У тэорыі права паміж тэрмінамі «нарматыўны» і «нарматыўны прававы акт» заўсёды праводзілася мяжа. Нарматыўным актам, напрыклад, з'яўляюцца і статуты пэўнай палітычнай партыі і грамадскай арганізацыі, у якіх утрымліваюцца правілы паводзін (нормы), якія маюць абавязковае значэнне для тых асоб, што ўваходзяць у склад палітычных партый ці грамадскай арганізацыі Але яны не лічацца нарматыўнымі прававымі актамі, таму што не ўтрымліваюць норм права. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь надае тэрміну «нарматыўны» выключна прававы характар, г. зн. выкарыстоўвае яго ў больш вузкім сэнсе слова, чым у тэорыі права. Тэрмінам «нарматыўны» ў Канстытуцыі абазначаюцца толькі акты, у якіх утрымліваюцца нормы права, агульнаабавязковыя правілы паводзін, якія разлічаны на нявызначанае кола асобаў і многаразовае прымяненне.

Нарматыўныя прававыя акты з'яўляюцца асноўнай і галоўнай крыніцай права ў Рэспубліцы Беларусь. У арт. 1 Закону Рэспублікі Беларусь «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь» яны азначаюцца ў якасці афіцыйных дакументаў усталяванай формы, якія прымаюцца (выдаюцца) у межах кампетэнцыі упаўнаважанага дзяржаўнага органа (службовай асобы) ці шляхам рэферэндума з захаваннем усталяванай заканадаўствам Рэспублікі Беларусь працэдуры, якія ўтрымліваюць агульнаабавязковыя правілы паводзін, разлічаныя на нявызначанае кола асобаў і многаразовае прымяненне.

Важна падкрэсліць, што для азначэння нарматыўнага прававога акта ў якасці самастойнага падвіду крыніц нацыянальнага беларускага права ў сэнсе Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і Закону Рэспублікі Беларусь «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь» важнае значэнне мае шэраг абставінаў і паняццяў, азначэнне якіх даецца ў Законе «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь».

Па-першае, нарматыўныя прававыя акты з'яўляюцца вынікам нарматворчай дзейнасці, г. зн. вынікам навуковай і арганізацыйнай дзейнасці па падрыхтоўцы, экспертызе, змяненню, дапаўненню, прыняццю (выданню), тлумачэнню, прыпыненню дзеяння, пры-

знанню страціўшымі сілу ці адмене нарматыўнага прававога акта ці яго часткі.

Па-другое, нарматыўныя прававыя акты з'яўляюцца вынікам дзейнасці нарматворчых органаў (службовых асоб). Прычым нарматворчымі органамі (службовымі асобамі) лічацца дзяржаўныя органы (службовыя асобы), якія ўпаўнаважаны (управамочаны) прымаць (выдаваць) нарматыўныя прававыя акты.

Па-трэцяе, нарматыўныя прававыя акты выдаюцца з захаваннем нарматворчага працэсу – нарматворчай дзейнасці нарматворчых органаў (службовых асоб) па распрацоўцы і прыняццю (выданню) нарматыўных прававых актаў, увядзенню іх у дзеянне.

Згодна з класіфікацый крыніц сучаснага беларускага права, якая была выкладзена намі вышэй, нарматыўныя прававыя акты складаюць толькі самастойны падвід крыніц нацыянальнага беларускага права. Але па сваёй значнасці, па юрыдычнай вазе ў сістэме крыніц права яны не толькі вылучаюцца на першыя ролі сярод крыніц права, але самі, у сваю чаргу, уяўляюць даволі разгалінаваную сістэму з уласцівымі ёй сувязямі і залежнасцямі. У Рэспубліцы Беларусь дзейнічае Закон «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь», у якім замацаваны юрыдычна значныя характарыстыкі дадзенай крыніцы права, праведзена класіфікацыя, замацаваны парадак распрацоўкі, прыняцця, уступлення ў сілу, дзеяння нарматыўных прававых актаў і шэраг іншых пытанняў.

Істотнае значэнне мае адмежаванне нарматыўных прававых актаў ад актаў індывідуальна-прававога характару, актаў, якія не ўтрымліваюць у сабе агульнаабавязковых правілаў паводзін – норм права – і таму не з'яўляюцца нарматыўнымі прававымі актамі. Закон «Аб нарматыўных прававых актах» у склад прававых актаў, якія не з'яўляюцца нарматыўнымі прававымі актамі ўключае тыя прававыя акты, якія прымаюцца (выдаюцца) з мэтай ажыццяўлення канкрэтных арганізацыйных, кантрольных ці распарадчых мерапрыемстваў ці разлічаны на іншае аднаразовае прымяненне.

У арт. 2 адзначанага Закону прыведзены пералік відаў нарматыўных прававых актаў па іх назве, г. зн. што нарматыўныя прававыя акты класіфікаваны тут па знешняму крытэрыю, па форме: Канстытуцыя, рашэнне рэферэндума, праграмны закон, кодэкс, закон, дэкрэт і ўказ Прэзідэнта і г. д. Усяго па дадзенай прымеце Закон налічвае семнаццаць відаў нарматыўных прававых актаў.

Найбольш распаўсюджанай і практычна значнай з'яўляецца класіфікацыя нарматыўных прававых актаў па органу прыняцця. Па дадзенай падставе можна выдзеліць: нарматыўныя прававыя

акты органа заканадаўчай улады, нарматыўныя прававыя акты Кіраўніка дзяржавы – Прэзідэнта краіны, нарматыўныя прававыя акты органаў выканаўчай улады, нарматыўныя прававыя акты органаў мясцовага самакіравання і кіравання, а таксама лакальныя нарматыўныя прававыя акты і нарматыўныя прававыя акты грамадскіх і кааператыўных арганізацый.

Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь з'яўляецца заканадаўчым органам Рэспублікі Беларусь і прымае законы. Палаты Нацыянальнага сходу прымаюць нарматыўныя прававыя акты ў форме пастаноў, калі гэта прадугледжана Канстытуцыяй краіны. Закон з'яўляецца заўсёды нарматыўным прававым актам, а пастановы Палат Нацыянальнага сходу могуць мець і індывідуальна-прававы характар. Згодна з Канстытуцыяй краіны законы могуць быць звычайнымі, праграмнымі альбо кодэксамі.

Усе нарматыўныя прававыя акты ў краіне павінны выдавацца ў адпаведнасці з Канстытуцыяй краіны, якая з'яўляецца Асноўным законам краіны і валодае найвышэйшай юрыдычнай сілай. Адпаведнасць нарматыўных прававых актаў і іншых крыніц права Канстытуцыі краіны называецца іх канстытуцыйнасцю, а адпаведнасць крыніц права законам краіны, іх выданне ў мэтах развіцця палажэнняў і норм, якія сфармуляваны ў законах, называецца падзаконнасцю. Такім чынам, усе нарматыўныя прававыя акты, як, дарэчы, і ўсе крыніцы права можна падзяліць на законы і падзаконныя акты.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь выдае згодна з Канстытуцыяй краіны дэкрэты, указы і распараджэнні. Прычым дэкрэты Прэзідэнта краіны могуць быць двух відаў: часовымі альбо выдадзенымі на падставе дэлегаваных парламентам паўнамоцтваў. Яны заўсёды з'яўляюцца нарматыўнымі прававымі актамі. Указы Прэзідэнта краіны могуць мець і ненарматыўны характар, калі яны маюць аднаразовае прымяненне, напрыклад, прысвечаны прызначэнню пэўнай асобы на дзяржаўную пасаду і г. д. Распараджэнні Прэзідэнта звычайна маюць індывідуальна-прававую прыроду, але могуць з'яўляцца і нарматыўна-прававымі актамі.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, законы, дэкрэты і ўказы Прэзідэнта краіны аб'ядноўваюцца згодна з Канстытуцыяй краіны і Законам «Аб нарматыўных прававых актах» у склад заканадаўчых актаў. Паміж асобнымі відамі заканадаўчых актаў Канстытуцыя краіны і Закон «Аб нарматыўных прававых актах» усталявалі іерархічныя залежнасці, вызначылі іх юрыдычную значнасць і юрыдычную сілу. Законы, дэкрэты, указы, як, дарэчы, і ўсе астат-

нія акты павінны выдавацца ў адпаведнасці з Канстытуцыяй, у выпадку іх разыходжання з Канстытуцыяй дзейнічае Канстытуцыя. Калі ўзнікаюць разыходжанні паміж дэкрэтам, указам і законам, то закон мае перавагу, прыярытэт над дэкрэтам і ўказам толькі тады, калі паўнамоцтвы на выданне дэкрэта ці ўказа былі прадстаўлены законам.

Заканадаўчыя акты – дэкрэты, указы, законы – маюць большую юрыдычную сілу ў адносінах да пастаноў палат парламента – Нацыянальнага сходу краіны – нарматыўных прававых актаў Савета Міністраў і іншых відаў нарматыўных прававых актаў.

Сярод нарматыўных прававых актаў органаў выканаўчай улады асобнае месца займаюць нарматыўныя прававыя акты Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Згодна з Законам «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь» Савет Міністраў краіны выдае нарматыўныя прававыя акты ў форме пастаноў. Пастановы Савета Міністраў выдаюцца на падставе заканадаўчых актаў і павінны адпавядаць ім, але яны маюць юрыдычную перавагу перад нарматыўнымі прававымі актамі іншых рэспубліканскіх органаў выканаўчай улады. Іншыя рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання і Нацыянальнага банка краіны выдаюць нарматыўныя прававыя акты ў форме пастаноў, калі яны прымаюцца калегіяльна, і ў форме загадаў, калі яны выдаюцца кіраўніком рэспубліканскага органа аднаасобна ў межах кампетэнцыі ўзначальваемага ім органа ў адпаведнай сферы дзяржаўнага кіравання. Загады маюць галінова-функцыянальны характар.

Органы мясцовага самакіравання і кіравання прымаюць у адпаведнасці са сваёй кампетэнцыяй нарматыўныя прававыя акты, якія называюцца рашэннямі. Рашэнні прымаюць мясцовыя Саветы дэпутатаў, выканаўчыя і распарадчыя органы ў межах іх кампетэнцыі. Праз выданне рашэнняў – нарматыўных прававых актаў, якія дзейнічаюць на адпаведнай тэрыторыі, органы мясцовага самакіравання і кіравання вырашаюць пытанні мясцовага значэння, якія ўваходзяць у іх кампетэнцыю.

Да ліку нарматыўных прававых актаў адносяцца таксама лакальныя нарматыўныя прававыя акты – нарматыўныя прававыя акты, якія дзейнічаюць у межах пэўнай арганізацыі, установы, прадпрыемства і г. д. і якія распрацаваны ва ўстаноўленым парадку і зарэгістраваны ў адпаведным органе дзяржаўнай улады. Юрыдычную значнасць лакальныя нарматыўныя прававыя акты набываюць менавіта пасля адпаведнай рэгістрацыі, але яны павінны па свайму зместу адпавядаць дзеючаму праву, у тым ліку нарматыўным

прававым актам мясцовых органаў самакіравання і кіравання. Часцей за ўсё лакальныя нарматыўныя прававыя акты выдаюцца ў форме статутаў. Напрыклад, статут Установы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы».

Памылкова адносіць да лакальных нарматыўных прававых актаў тыя асобныя акты нарматыўнага характару, якія актыўна распрацоўваюцца апошнім часам у асобных арганізацыях і ўстановах. Гэта лакальныя акты, прычым яны могуць утрымліваць нават нейкае правіла паводзін агульнага характару. Але гэтыя акты не маюць прававой прыроды. Па-першае, таму што іх прыняцце не прадугледжана дзеючым правам, і, па-другое, яны не санкцыянаваны з боку дзяржавы, па-трэцяе, дзяржава не будзе іх абараняць сваёй прымусовай сілай у выпадку парушэння.

Асобную групу нарматыўных прававых актаў складаюць нарматыўныя прававыя акты кааператыўных і прафсаюзных органаў. Гэтыя органы ўлады не ўваходзяць у склад органаў дзяржаўнай улады, таму што яны ўвасабляюць самастойныя віды сацыяльнай і палітычнай улады. Акты, якія выдаюцца гэтымі органамі ўлады, набываюць юрыдычную значнасць і юрыдычную сілу, па-першае, таму, што згодна з дзеючым правам, на падставе Законаў «Аб кааперацыі» і «Аб прафесійных саюзах» гэтыя органы маюць магчымасць выдаваць агульнаабавязковыя правілы паводзін, а, па-другое, парушэнне гэтых правілаў паводзін цягне за самой ускладанне мераў юрыдычнай адказнасці.

Такім чынам, юрыдычную значнасць і прававы характар лакальныя нарматыўныя акты і акты кааператыўных і прафсаюзных арганізацый набываюць толькі са згоды дзяржавы, толькі з яе санкцыі на дзейнасць у сферы стварэння норм права.

4.2. Дагавор нарматыўнага зместу – асноўная ўнутрыдзяржаўная крыніца права ў Рэспубліцы Беларусь

Дагавор нарматыўнага зместу з'яўляецца адной з асноўных крыніц сучаснага беларускага права, па-першае, таму, што дадзеная крыніца мае юрыдычнае значэнне і юрыдычную вагу сярод крыніц унутрыдзяржаўнага права, а нормы права, змешчаныя ў дадзенай крыніцы права, займаюць важкі сегмент у прававым полі дзеючага беларускага права, а, па-другое, таму што дагавор нарматыўнага зместу ўтрымлівае ў сабе першасныя нормы права, якімі можна наўпрост кіравацца і на якія можна спасылацца пры вырашэнні самых раснастайных прававых спраў – пры заключэнні дагавораў,

здзелак, пры звароце да праваахоўных структур у выпадку парушэння норм права, якія змяшчаюцца ў дадзенай крыніцы права.

Для ўнутрыдзяржаўнага дагавору нарматыўнага зместу ў параўнанні з дагаворам нарматыўнага зместу міжнародна-прававога характару ўласцівы шэраг асаблівасцей. Вядома, дзяржаўная ўлада з'яўляецца адзіным суверэнам унутры краіны, і толькі яна прадстаўляе інтарэсы ўсёй супольнасці. Дзяржаўная ўлада сама вызначае ўмовы і парадак фармавання, стварэння і заключэння ўнутрыдзяржаўных дагавораў нарматыўнага зместу з іншымі сацыяльнымі суб'ектамі, якія выяўляюць і прадстаўляюць інтарэсы часткі насельніцтва. У прынцыпе, дзяржава можа ўрэгуляваць адносіны ў пэўнай сферы грамадскага жыцця самастойна, але з дапамогай дагавору нарматыўнага зместу адэкватнасць права інтарэсам грамадства і зместу рэгулюемых адносін значна ўзрастае. Да таго ж, заключаючы дагавор нарматыўнага зместу, дзяржава разлічвае на дадатковую падтрымку дзеючага права з боку зацікаўленых груп насельніцтва і ў абароне норм права з боку прадстаўляючых гэтую частку насельніцтва арганізацыйных структур.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што сегмент прававога поля, які запаўняецца нормамі права, што змяшчаюцца ў дагаворы нарматыўнага зместу, вызначаецца дзяржавай. А ўлічваючы той факт, што такое вызначэнне звычайна робіцца праз выданне нарматыўных прававых актаў, можна гаварыць аб тым, што, з'яўляючыся адной з асноўных крыніц права, дагавор нарматыўнага зместу тым не менш падпарадкаваны галоўнай крыніцы сучаснага беларускага права – нарматыўнаму прававому акту.

Да нядаўняга часу найбольш распаўсюджаным відам унутрыдзяржаўнага дагавору нарматыўнага зместу былі самыя разнастайныя пагадненні паміж прафсаюзнымі органамі і адпаведнымі органамі дзяржавы. На агульнадзяржаўным узроўні паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Саюзам беларускіх прафсаюзаў заключаецца генеральнае пагадненне, а паміж галіновымі прафсаюзамі і асобнымі міністэрствамі і дзяржаўнымі камітэтамі, іншымі цэнтральнымі ведамствамі на падставе генеральнага пагаднення заключаюцца галіновыя пагадненні. У гэтых пагадненнях змяшчаюцца нормы права, якія рэгламентуюць працоўныя адносіны і адносіны па ахове працы, нормы, якія адносяцца да сацыяльнага, у тым ліку пенсіённага забеспячэння, аздараўлення і г. д.

Штогод на кожным прадпрыемстве і ў кожнай арганізацыі, якія маюць, як правіла, статус юрыдычнай асобы, паміж адміністрацыяй і прафсаюзнымі органамі заключаюцца калектыўныя дамовы, у

якіх рэгламентуюцца вельмі важныя і значныя для жыццядзейнасці асобы грамадскія адносіны – парадак дадатковых выплат і прэміравання, парадак аказання ўзаемадапамогі і іншыя пытанні. Калектыўныя дамовы (ці пагадненні) з'яўляюцца самай распаўсюджанай разнавіднасцю дагавору нарматыўнага зместу ўнутрыдзяржаўнага характару. Калектыўная дамова набывае юрыдычную значнасць і юрыдычную сілу пасля рэгістрацыі ў адпаведных органах дзяржавы – у выканаўчых камітэтах (адміністрацыі).

Калектыўныя дагаворы дзейнічаюць у межах асобных арганізацый, устаноў і прадпрыемстваў і таму нагадваюць па дадзенай прымеце лакальныя нарматыўныя прававыя акты. Але, у адрозненне ад лакальных актаў, якія з'яўляюцца разнавіднасцю нарматыўных прававых актаў, калектыўныя дагаворы з'яўляюцца разнавіднасцю іншай крыніцы права – дагавору нарматыўнага зместу. Акрамя гэтага, лакальныя нарматыўныя прававыя акты прымаюцца адміністрацыяй органа, установы, арганізацыі, а калектыўная дамова – вынік волевыяўлення двух бакоў – адміністрацыі і прафсаюзнай арганізацыі калектыву.

Падабенства паміж лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі і калектыўнымі дагаворамі бачыцца ў тым, што і ў лакальных нарматыўных прававых актах, і ў калектыўных дагаворах змяшчаюцца лакальныя нормы права. Лакальныя нормы права – такія нормы права, якія дзейнічаюць у межах адной арганізацыі, прадпрыемства, арганізацыі, нават калі яны знаходзяцца на тэрыторыі некалькіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, праўда, аднаго і таго самага дзяржаўнага ўтварэння, а ў рэдкіх выпадках – і на тэрыторыі некалькіх дзяржаў, напрыклад, на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, калі створана сумеснае беларуска-расійскае прадпрыемства, якое зарэгістравана на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, мае свае філіялы на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі і калектыўнае пагадненне якога таксама зарэгістравана ў дзяржаўных органах Рэспублікі Беларусь.

Паняцце лакальных норм права, такім чынам, уключае ў сябе нормы права, якія змяшчаюцца ў лакальных нарматыўных прававых актах і калектыўных дагаворах.

На развіццё крыніц сучаснага беларускага права ўплыў аказвае Беларуская праваслаўная царква. У прыватнасці, значны ўплыў на развіццё такой крыніцы права, як дагавор нарматыўнага зместу, аказвае Пагадненне аб супрацоўніцтве, якое было заключана паміж Беларускай праваслаўнай царквой і Рэспублікай Беларусь. Дадзенае пагадненне заклала своеасаблівы прававы падмурак развіцця

дагаворна-прававой базы паміж беларускай дзяржавай і Беларускай праваслаўнай царквой.

На падставе дадзенага Пагаднення былі распрацаваны, прыняты ва ўстановленым парадку і ажыццяўляюцца Пагадненні і Праграмы супрацоўніцтва паміж міністэрствамі, іншымі рэспубліканскімі органамі і Беларускай праваслаўнай царквой. На падстве вышэйазначаных Пагадненняў і Праграм на мясцовым узроўні паміж абласнымі выканаўнымі камітэтамі і ўсімі епархіямі Беларускай праваслаўнай царквы былі распрацаваны і паспяхова рэалізуюцца Праграмы мер па выкананню Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Беларускай праваслаўнай царквой.

5. Дадатковыя ўнутрыдзяржаўныя крыніцы права

Да дадатковых унутрыдзяржаўных крыніц сучаснага беларускага права адносяцца дактрына (навука), свяшчэннае пісанне, прававы прэцэдэнт і прававы звычай.

У прававой сістэме Рэспублікі Беларусь прыкладамі выкарыстання дактрыны (навукі) у якасці самастойнай, хаця і дадатковай крыніцы права, выступаюць разнастайныя канцэпцыі і дактрыны, якія былі зацверджаны законамі ці ўказамі Прэзідэнта краіны, напрыклад, Канцэпцыя ўдасканалення заканадаўства, Ваенная дактрына Рэспублікі Беларусь і г. д. Пры самым першасным аналізе яны ўяўляюць сабой пэўны «сімбіёз» прыметаў нарматыўнага прававога акта і прававой дактрыны. Прычым па знешніх фармальна-прававых прыметах яны набліжаюцца да нарматыўных прававых актаў, а па зместу – да прававой дактрыны.

Гістарычны вопыт развіцця крыніц права сведчыць аб тым, што для дактрыны (навукі) увогуле не існуе нейкіх агульнапрызнаных і агульнаабавязковых формаў. Такімі знешнімі формамі для навукі маглі быць працы знакамітых навукоўцаў-юрыстаў, разважанні аб праве вядомых, аўтарытэтных юрыстаў-практыкаў, разнастайныя каментарыі і тлумачэнні дзеючага права, навуковыя выкладкі філосафаў і нават тэолагаў і г. д. Найважнейшае значэнне для дадзенай крыніцы права мае, уласна кажучы, не форма, у якую «змяшчаюцца» навуковыя выкладкі, а сам факт надання пэўным навуковым выкладкам, разважанням і высновам афіцыйнага статусу, пацвярджэння іх значнасці і агульнаабавязковасці для ўсіх суб'ектаў права. Прычым такі статус навуковыя палажэнні заўсёды набывалі пасля таго, як іх значнасць і агульнаабавязковасць пацвярджаліся з боку дзяржавы, тых ці іншых яе органаў і ўстаноў

альбо іншых афіцыйных прадстаўнікоў супольнасці, якія выконвалі тыя ці іншыя функцыі дзяржаўнай улады.

Адной з дадатковых крыніц сучаснага беларускага права з'яўляецца свяшчэннае пісанне (царкоўныя нормы). Праўда, дадзеная крыніца права выкарыстоўваецца ў вельмі абмежаваных выпадках. У якасці прыкладу можна прывесці выкарыстанне царкоўнай нормы пры вызначэнні канкрэтнай даты непрацоўнага святочнага дня па праваслаўнаму календару – Радаўніцы. Канкрэтная дата непрацоўнага дня, у які адзначаецца Радаўніца, вызначаецца на падставе нормы права, якая сфармулявана ў Указе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 12 мая 1999 г. № 268 і на падставе царкоўных (кананічных) норм, з дапамогай якіх вызначаецца канкрэтная дата Вялікадня і Радаўніцы. Прычым норма, якая сфармулявана ў Указе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца першаснай нормай (асноўнай крыніцай права), а царкоўныя (кананічныя) нормы могуць быць аднесены да другасных (дадатковая крыніца права). Без нормы права, якая сфармулявана ў Указе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, царкоўныя нормы не маюць агульнаабавязковага значэння. У той самы час без царкоўных норм не можа быць рэалізавана і норма Указа. Дадзеныя нормы дзейнічаюць і рэалізуюцца толькі ў арганічнай спалучанасці.

У сучаснай расійскай і беларускай юрыдычнай навуцы ўвагу шырокага кола навукоўцаў прыцягвае такая крыніца права, як прававы прэцэдэнт, у сацыяльным падмурку якога знаходзіцца канкрэтная праява існуючых заканамернасцей, іншымі словамі, канкрэтная жыццёвая справа, сітуацыя, неад'емная праява і форма існавання заканамернасці, вырашэнне ці разгляд якіх адпаведнымі судовымі (іншымі юрысдыкцыйнымі інстанцыямі) прыводзіць да фармавання агульнаабавязковага правіла паводзін як для суб'ектаў разглядаемай справы, так і для іншых суб'ектаў права. І менавіта гэтым вельмі важным момантам прэцэдэнт адрозніваецца ад падобных да яго прававых з'яў.

З прававым прэцэдэнтам у прававой сістэме Рэспублікі Беларусь мы сутыкаемся не пры абагульненні судовай практыкі па асобных аднародных справах і судовай статыстыкі ў той ці іншай форме, не пры фармуляванні правапалажэнняў вышэйшымі судовымі інстанцыямі Рэспублікі Беларусь, не пры тлумачэнні дзеючых норм права і тым больш не пры выказванні меркаванняў прававога характару, нават аўтарытэтнымі дзяржаўнымі структурамі. Аналіз тых прававых сітуацый, якія абумоўліваюць фармуляванне і існаванне правапалажэнняў, што нагадваюць прававы прэцэдэнт – агульны,

абстрактны характар норм права; наяўнасць у заканадаўстве ацэначных паняццяў; наяўнасць прабелаў у пазітыўным праве і г. д. прыводзяць да высновы, што прэцэдэнт у яго «класічнай праяве» ў беларускай прававой сістэме можа быць створаны толькі пры наяўнасці прабелаў у дзеючым праве, калі, па-першае, адсутнічаюць патрэбныя нормы пазітыўнага права і судовая ўстанова павінна запаўняць прабел шляхам стварэння патрэбнай нормы права (правапалажэння), па-другое, калі створаная ў такім парадку норма права (правапалажэнне) будзе выкарыстана, запазычана іншай судовай інстанцыяй пры разглядзе аналагічнай справы.

Прычым вельмі важна падкрэсліць тую абставіну, што пры стварэнні прэцэдэнта прынцыповае значэнне мае не толькі рашэнне пэўнай судовай інстанцыі ў форме правапалажэння (нормы права), але і тое, што яно выкарыстоўваецца ў якасці ўзора іншымі судовымі інстанцыямі. Без выкарыстання правапалажэння (нормы права) іншымі судовымі інстанцыямі не можа быць завершаны працэс стварэння прэцэдэнта, не будзе завершаны, вобразна кажучы, прэцэдэнтны працэс. Справа тут у тым, што рашэнне суда, якое прынята ў выпадку наяўнасці прабелаў у пазітыўным праве, можа быць адменена вышэйстаячай судовай інстанцыяй. У дадзеным выпадку рашэнне пэўнай судовай інстанцыі застанецца толькі рашэннем гэтай судовай інстанцыі па канкрэтнай справе, але не будзе з'яўляцца прэцэдэнтам.

Дарэчы, і ў англасаксонскай прававой сям'і новы прэцэдэнт ствараецца тады, калі суд пры разглядзе канкрэтнай справы не знаходзіць у дзеючым праве канкрэтных норм права ў форме раней створаных прэцэдэнтаў, у прававых звычаях, дактрыне ці статутным праве і вымушаны самастойна фармуляваць прававую пазіцыю, на падставе якой ён будзе вырашаць прававы казус.

Паколькі запаўненне прабелаў у праве адбываецца на падставе дзеючага права, яго прынцыпаў ці канкрэтных норм права, то натуральна, што сам па сабе прававы прэцэдэнт дзейнічаць у прававой сістэме Рэспублікі Беларусь не можа. Гэта па-першае. А па-другое, факт існавання прававога прэцэдэнта толькі ў сітуацыях, калі адсутнічаюць патрэбныя для прымянення нормы права, пры наяўнасці прабелаў у дзеючым праве, сведчыць аб часовым характары дадзенай крыніцы права. Ліквідацыя прабелаў адначасова азначае і знікненне прававога прэцэдэнта. Часам свайго дзеяння прававы прэцэдэнт істотна розніцца ад усіх дадатковых крыніц права.

У якасці дадатковай крыніцы права ў сучаснай прававой сістэме Беларусі ў дастаткова абмежаванай сферы выкарыстоўваецца прававы звычай. Найперш гэта сфера таварна-грашовых адносін, дзе паводзіны ўдзельнікаў здзелак па абароту матэрыяльных каштоўнасцей часта прыводзяць да стварэння пэўных нарматываў, правілаў паводзін, так званых «звычаяў дзелавога абароту». Прыкладам дзеяння дадзенай крыніцы права можа быць арт. 193 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, згодна з якім суб'екты грамадзянскіх адносін могуць кіравацца ў сваіх паводзінах звычайна прад'яўляемымі патрабаваннямі. Вось гэтыя звычайна прад'яўляемыя патрабаванні і можна разглядаць як правілы паводзін прававога характару, што склаліся і існуюць незалежна ад дзяржаўнай волі, але іх існаванне дзяржава дапускае і, больш таго, у выпадку іх парушэння будзе абараняць сваёй прымусовай сілай.

Апошняя абставіна яскрава сведчыць аб прававым характары «звычаяў дзелавога абароту». А той факт, што без нормы права, якая сфармулявана ў арт. 193 ГК Рэспублікі Беларусь, звычайна прад'яўляемыя патрабаванні немагчыма выкарыстаць і тым больш абараніць, сведчыць на карысць дадатковасці дадзенай крыніцы права.

6. Нарматыўныя акты судовай улады

Акты Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь і пастановы Пленумаў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь складаюць самастойны падвід (самастойную падсістэму) крыніц сучаснага беларускага права. Гэтыя нарматыўныя акты асобнага зместу і асобнага прызначэння ў сістэме крыніц права, таму іх можна выдзеліць у самастойную групу нарматыўных актаў у сэнсе Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Іх можна назваць мадыфікаванымі крыніцамі права.

Месца пастаноў Пленумаў Вярхоўнага і Вышэйшага Гаспадарчага Судоў Рэспублікі Беларусь у сістэме крыніц сучаснага беларускага права, а, значыць, і юрыдычная сіла вызначаюцца месцам і юрыдычнай сілай тых крыніц права, адносна дзеяння і прымянення якіх Пленумамі Вярхоўнага і Вышэйшага Гаспадарчага Судоў Рэспублікі Беларусь былі абагульнены судовая практыка і судовая статыстыка. Такім чынам, юрыдычную сілу нарматыўных актаў гэтых органаў судовай улады нельга вызначыць аднастайна, бо яна мае «рухомы характар». У адных выпадках юрыдычная сіла нарматыўных актаў Пленумаў Вяроўнага Суда і Вышэйшага Гас-

падарчага Суда Рэспублікі Беларусь можа быць, напрыклад, вызначана праз юрыдычную сілу Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, калі абагульняюцца судовая практыка і судовая статыстыка непасрэднага прымянення судовымі інстанцыямі краіны пэўнай нормы Асноўнага закону краіны. Калі ж, напрыклад, абагульняюцца судовая практыка і судовая статыстыка прымянення дэкрэта і ўказа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, то юрыдычная сіла нарматыўных актаў вышэйшых судовых інстанцый вызначаецца праз юрыдычную сілу дэкрэта і ўказа Прэзідэнта краіны. Юрыдычная сіла нарматыўных актаў вышэйшых судовых інстанцый можа вызначацца і праз юрыдычную сілу іншых крыніц сучаснага беларускага права, напрыклад, праз вызначэнне месца і юрыдычнай сілы ратыфікаванага міжнароднага дагавору Рэспублікі Беларусь у сістэме крыніц права.

На наш погляд, разглядаемыя нарматыўныя акты судовай улады можна лічыць неабходнымі дапаўненнямі да самастойных крыніц сучаснага беларускага права, пэўнай «мадыфікацыяй» існуючых крыніц права, без якіх немагчымы належная рэалізацыя і прымяненне самастойных крыніц сучаснага беларускага права. Разам з тым нельга вырашыць ніводнае юрыдычнае пытанне, спасылаючыся толькі на нарматыўныя акты судовай улады. І больш таго, паколькі ў нарматыўных актах вышэйшых судовых інстанцый інтэрпрэтуюцца як крыніцы нацыянальнага, так міжнароднага права, то іх нельга аднастайна адносіць толькі да ліку крыніц унутрыдзяржаўнага беларускага права і лічыць самастойным падвідам гэтага віду крыніц сучаснага беларускага права.

У юрыдычным механізме рэгулявання грамадскіх адносін яны хутчэй за ўсё складаюць самастойны элемент (звяно) нарматыўнай асновы, і іх галоўным прызначэннем з'яўляецца адаптацыя агульных правілаў паводзін, якія замацаваны ў нормах права, да рэальных грамадскіх адносін без змены ці нарматыўнага тлумачэння дзеючых крыніц права. Але гэта такая адаптацыя, якая адбываецца шляхам (на падставе) абагульнення судовай практыкі і судовай статыстыкі. Правапалажэнні, якія змяшчаюцца ў пастановах Пленумаў Вярхоўнага і Вышэйшага Гаспадарчага Судоў Рэспублікі Беларусь, такім чынам, з'яўляюцца адначасова адаптацыяй норм права да рэальных грамадскіх адносін шляхам абагульнення судовай практыкі і судовай статыстыкі менавіта вышэйшымі судовымі інстанцыямі.

Не сама па сабе судовая практыка складае мадыфікаваную крыніцу права, а замацаваныя ў пастановах Пленумаў вышэйшых

судовых інстанцый у форме (відзе) правапалажэнняў вынікі абагульнення судовай практыкі і судовай статыстыкі. Таму памылковымі з'яўляюцца высновы аб аднясенні судовай практыкі да асобнага віду крыніц права. Судовая практыка і судовая статыстыка могуць абагульняцца і іншым чынам, напрыклад, у форме навуковых каментарыяў да дзеючых крыніц права ці асобных норм права. Але такое абагульненне, па-першае, не мае абавязковага (нарматыўнага) характару, па-другое, не выконвае ролі па адаптацыі норм права да рэальных грамадскіх адносін, па-трэцяе, не ажыццяўляецца вышэйшымі судовымі інстанцыямі краіны. Толькі арганічнае спалучэнне трох акрэсленых прымет дае ўяўленне аб прававой прыродзе пастаноў Пленумаў вышэйшых судовых інстанцый і характарызуе іх у якасці мадыфікаванай крыніцы сучаснага беларускага права.

Судовая практыка, безумоўна, можа прывесці да фармавання прававога звычая – нейкага агульнага правіла паводзін прававога характару, якое не знайшло свайго замацавання ў правапалажэннях пастаноў Пленумаў Вярхоўнага Суда і Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь, але выкарыстоўваецца судовымі ўстановамі Рэспублікі Беларусь у якасці агульнаабавязковага правіла. Праўда, такая сітуацыя мае найбольш гіпатэтычны, а не рэальны характар.

Такім чынам, нарматыўныя акты вышэйшых судовых інстанцый Рэспублікі Беларусь «завязваюцца» на іншыя крыніцы дзеючага права, без існавання якіх яны губляюць свой сэнс. Спецыфіка гэтых нарматыўных актаў якраз і зводзіцца да таго, што яны адначасова інтэрпрэтуюць нейкія крыніцы права і абагульняюць судовую практыку і судовую статыстыку. Гэта значыць, што яны выконваюць адначасова дзве неад'емныя для гэтых актаў функцыі – інтэрпрэтацыю іншых крыніц права на падставе абагульнення судовай практыкі і судовай статыстыкі і абагульненне судовай практыкі і судовай статыстыкі шляхам інтэрпрэтацыі іншых крыніц права. Ніводная з гэтых функцый не можа быць ажыццёўлена сама па сабе без выканання другой. Толькі адначасовае іх ажыццяўленне забяспечвае (гарантуе) нарматыўны характар актаў вышэйшых судовых інстанцый, іх абавязковасць для органаў судовай улады, іншых дзяржаўных органаў (службовых асоб) і грамадзян.

Для абазначэння тых нарматыўных палажэнняў, якія фармулююцца ў пастановах Пленумаў Вярхоўнага Суда і Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь, цалкам прымальным можна лічыць паняцце (тэрмін) «правапалажэнне». Правапалажэнне, якое

ствараецца Пленумамі вышэйшых судовых інстанцый, у адрозненне ад прэцэдэнта, фармуецца не пры разглядзе канкрэтнай судовай справы, а шляхам аналізу і абагульнення судовай практыкі па шэрагу спраў, судовай статыстыкі і на падставе ўжо дзеючых норм права ў мэтах іх «адаптацыі» да рэчаіснасці шляхам своеасаблівай дэталізацыі і канкрэтызацыі і, як вядома, падзяляе іх лёс пры змене ці адмене норм права. Прычым абагульненне правапрымяняльнай, у тым ліку судовай, практыкі не можа выходзіць за межы дзеяння існуючага пазітыўнага права і робіцца на яго падставе.

Вядома, што Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь забяспечвае вяршэнства Канстытуцыі краіны шляхам ажыццяўлення кантрольных паўнамоцтваў за адпаведнасцю ўсіх нарматыўных актаў Асноўнаму закону краіны. Нарматыўныя акты, якія прызнаюцца Канстытуцыйным Судом не адпавядаючымі Канстытуцыі ці актам, якія валодаюць больш высокай юрыдычнай сілай, лічацца страціўшымі сілу цалкам ці ў вызначанай іх частцы. Натуральна, што размова пры гэтым ідзе не толькі аб нарматыўных прававых актах, але і іншых відах крыніц як нацыянальнага, так і міжнароднага права – прававых звычаях, дагаворах нарматыўнага зместу, прававых прэцэдэнтах і г. д.

Такім чынам, заключэнні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі, як і пастановы Пленумаў Вярхоўнага і Вышэйшага Гаспадарчага Судоў Рэспублікі Беларусь, «завязваюцца» на ўсе вядомыя крыніцы сучаснага беларускага права і «абслугоўваюць» іх. Праўда, у іншым кірунку, чым гэта робяць акты вышэйшых судовых інстанцый судоў агульнай і гаспадарчай юрысдыкцыі. Калі акты Пленумаў Вярхоўнага і Вышэйшага Гаспадарчага Судоў адаптуюць нормы дзеючага беларускага права да рэальных грамадскіх адносін шляхам абагульнення судовай практыкі і судовай статыстыкі і выдання абавязковых для выканання пастаноў, то заключэнні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь забяспечваюць адпаведнасць зместу і формы ўсіх крыніц сучаснага беларускага права Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Натуральна, што заключэнні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь адносяцца да ліку нарматыўных актаў у сэнсе Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і займаюць у сістэме крыніц права прамежкавае становішча паміж Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і тымі відамі крыніц права, якія правяраюцца поўнасцю ці ў нейкай частцы на іх адпаведнасць Канстытуцыі краіны і іншым крыніцам права, якія валодаюць больш высокай юрыдычнай сілай. Толькі ў гэтай «звязцы» заключэнні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі

Беларусь набываюць юрыдычную значнасць і абавязковасць для ўсіх суб'ектаў права.

У адрозненне ад юрыдычнай сілы пастаноў Пленумаў Вярхоўнага і Вышэйшага Гаспадарчага Судоў Рэспублікі Беларусь, якая з'яўляецца «рухомай», юрыдычная сіла заключэнняў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь адназначна акрэслена ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Паколькі абсалютна ўсе крыніцы сучаснага беларускага права могуць быць праверaны Канстытуцыйным Судом на іх адпаведнасць Асноўнаму закону краіны, то юрыдычная сіла заключэнняў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь не можа быць меншай за юрыдычную сілу гэтых крыніц права, яна іх пераўзыходзіць, саступаючы толькі юрыдычнай сіле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Галоўная місія заключэнняў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь у сістэме крыніц сучаснага беларускага права, якая вызначальным чынам уплывае на іх прававую прыроду, зводзіцца да выканання кантрольнай функцыі ў сістэме крыніц права з мэтай забеспечэння іх сістэмнасці і ўзаемаўзгодненасці, падтрымання ўсёй сістэмы крыніц сучаснага беларускага права ў адпаведнасці з Канстытуцыяй краіны.

Усё сказанае прыводзіць да высновы, што заключэнні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца, як і пастановы Пленумаў Вярхоўнага і Вышэйшага Гаспадарчага Судоў Рэспублікі Беларусь, адной з мадыфікаваных крыніц сучаснага беларускага права. Праўда, функцыі гэтай мадыфікаванай крыніцы права ў сістэме крыніц сучаснага беларускага права адрозніваюцца ад функцый, якія выконваюць пастановы Пленумаў Вярхоўнага Суда і Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь. Улічваючы розніцу ў характары юрыдычнай сілы паміж заключэннямі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь і пастановамі Пленумаў Вярхоўнага і Вышэйшага Гаспадарчага Судоў Рэспублікі Беларусь, можна зрабіць выснову,, што заключэнні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, магчыма, і не ўваходзяць у склад самастойнай падсістэмы нарматыўных актаў судовай улады – нарматыўных актаў вышэйшых органаў судовай улады Рэспублікі Беларусь, а складаюць толькі самастойную падгрупу мадыфікаваных крыніц сучаснага беларускага права.

7. Галоўная, асноўныя і дадатковыя крыніцы міжнародна-прававога характару

У параўнанні з сістэмай унутрыдзяржаўных крыніц, дзе, як вядома, асноўнай і адначасова галоўнай крыніцай права з'яўляецца нарматыўны прававы акт, сярод крыніц міжнародна-прававога характару галоўнай і асноўнай крыніцай права з'яўляецца міжнародны дагавор – разнавіднасць дагавору нарматыўнага зместу.

Памылкова лічыць, што нарматыўны прававы акт не з'яўляецца крыніцай у сістэме крыніц міжнародна-прававога характару. Справа ў тым, што асноўная маса, асноўны аб'ём норм міжнароднага права (за выключэннем, магчыма, нормаў юс когенс), у асаблівасці норм, якія змяшчаюцца ў міжнародных дагаворах, што заключаюцца Рэспублікай Беларусь, набывае юрыдычна абавязковае значэнне на тэрыторыі Беларусі не інакш, як праз нарматыўныя прававыя акты, якія выдаюцца дзяржавай, яе ўпаўнаважанымі органамі ў мэтах імплементацыі норм міжнародных дагавораў у прававую сістэму Рэспублікі Беларусь. Прамое ўздзеянне норм міжнародных дагавораў на ўнутрыдзяржаўнае права без трансфармацыі, рэцэпцыі ці імплементацыі практычна немагчыма.

Ратыфікацыя, іншыя абавязковыя працэдуры надання нормам міжнародных дагавораў абавязковага значэння для Рэспублікі Беларусь ажыццяўляюцца, як правіла, шляхам выдання адпаведных нарматыўных прававых актаў унутрыдзяржаўнага характару. Ратыфікацыя міжнароднага дагавору Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь, напрыклад, ажыццяўляецца шляхам выдання закону Рэспублікі Беларусь аб ратыфікацыі пэўнага дагавору.

Такім чынам, нарматыўныя прававыя акты, без выдання якіх на тэрыторыі Беларусі практычна не дзейнічае ніводная норма міжнароднага дагавору, нельга не аднесці да ліку крыніц міжнародна-прававога характару, бо галоўная іх мэта і сэнс выдання «завязваюцца» на міжнародныя дагаворы. Наўпрост, без дагавораў міжнароднага характару такія нарматыўныя прававыя акты, як правіла, не маюць юрыдычнай значнасці. Таму нарматыўныя прававыя акты з'яўляюцца таксама адной з дзвюх асноўных крыніц міжнародна-прававога характару, але ў параўнанні з сістэмай унутрыдзяржаўных крыніц права дадзеная крыніца права ў падсістэме крыніц права міжнародна-прававога характару не з'яўляецца галоўнай.

Акрамя гэтага, міжнародныя дагаворы для набыцця юрыдычнай значнасці і непасрэднай дзейнасці на тэрыторыі нашай дзяр-

жавы патрабуюць ажыццяўлення шэрагу ўнутрыдзяржаўных працэдур, якія неабходны для выражэння згоды Рэспублікі Беларусь на абавязковасць для яе міжнародных дагавораў. Да ліку такіх працэдур адносіцца і выданне неабходных для ажыццяўлення міжнародных дагавораў нарматыўных прававых актаў ці нават заключэння дагавораў нарматыўнага зместу ўнутрыдзяржаўнага характару. Абсалютная большасць норм міжнародных дагавораў не дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь без выдання нарматыўных прававых актаў.

Міжнародны дагавор з'яўляецца асноўнай крыніцай міжнародна-прававога характару ў прававой сістэме Рэспублікі Беларусь. Абсалютная большасць норм права, якія маюць міжнародна-прававы характар і з'яўляюцца складанай часткай прававой сістэмы Рэспублікі Беларусь, былі сфармуляваны і замацаваны менавіта ў форме дагавору. Удзельная вага гэтай крыніцы права сярод крыніц права міжнародна-прававога характару набліжаецца да абсалютнай, таму што без суверэннай волі дзяржавы, якая выкладзена і выражана ў дагаворы, не існуе іншага шляху стварэння норма міжнароднага права.

Вядома, што прававая сістэма Рэспублікі Беларусь функцыянуе і развіваецца ў шчыльнай узаемасувязі з іншымі нацыянальнымі прававымі сістэмамі, а таксама з міжнародным правам. У артыкуле 8 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замацавана правіла, згодна з якім Рэспубліка Беларусь прымае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім заканадаўства. Агульнапрызнаныя прынцыпы міжнароднага права былі замацаваны ў шэрагу міжнародна-прававых дагавораў у форме Статута ААН, дэкларацый і г. д., якія Рэспубліка Беларусь прызнала для сябе абавязковымі. Таму фармулёўка артыкула 8 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь сведчыць, як уяўляецца, аб тым, што Рэспубліка Беларусь дала згоду на тое, што шэраг міжнародных дагаворных норм, якія змешчаны ў асобных міжнародных дагаворах, маюць прыярытэт, першынство ў прававой сістэме Рэспублікі Беларусь.

Агульнапрызнаныя прынцыпы міжнароднага права дзейнічаюць на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і маюць абавязковае значэнне для ўсіх асобаў, яны пранізваюць усю прававую сістэму Рэспублікі Беларусь, склаўшуюся гістарычна ў Беларусі сістэму крыніц права ўвогуле і сістэму заканадаўства, у прыватнасці. Прычым дзейнічаюць яны бестэрмінова. Частка агульнапрызнаных прынцыпаў і норм міжнароднага права існуе ў форме прававога

звычая, і таму гэтыя звычаёвыя па свайму характару і зместу нормы права асобныя аўтары – спецыялісты ў галіне міжнароднага публічнага права адносяць да асноўных крыніц права. Агульнапрызнаныя прынцыпы і нормы міжнароднага права, якія існуюць у форме прававога звычая, з'яўляюцца неабходнай перадумовай існавання міжнароднага дагаворнага права. Яны стваралі і ствараюць неабходную прававую базу, аснову для існавання агульнага міжнароднага права.

У склад дадатковых крыніц міжнародна-прававога характару ўваходзяць найперш прававы прэцэдэнт і прававыя звычаі, акрамя тых прававых звычаяў, аб якіх узгадвалася вышэй.

З міжнародна-прававым прэцэдэнтам, які мае значэнне на тэрыторыі пэўнай дзяржавы, мы сутыкаемся ў сітуацыях, калі дзяржава прызнае для сябе абавязковымі рашэнні міжнародных судовых інстанцый, напрыклад, Еўрапейскага Суда па правах чалавека. У такім разе на тэрыторыі дзяржавы рашэнне дадзенай судовай установы па канкрэтнай справе з удзелам грамадзяніна гэтай дзяржавы мае юрыдычна абавязковае значэнне. Акрамя гэтага, усе судовыя інстанцыі краіны, якая прызнае на сваёй тэрыторыі юрысдыкцыю Еўрапейскага Суда па правах чалавека, павінны кіравацца прэцэдэнтамі тлумачэння, якія былі сфармуляваны дадзенай юрысдыкцыйнай інстанцыяй пры разглядзе іншых спраў. Іншымі словамі, прызнаўшы аднойчы юрысдыкцыю Еўрапейскага Суда па правах чалавека на сваёй тэрыторыі, дзяржава тым самым стварае своеасаблівы легальны «прававы калідор», праз які ў прававую сістэму дадзенай дзяржавы наўпрост, без дадатковых унутрыдзяржаўных працэдур, паступаюць і становяцца складанай часткай яе прававой сістэмы нормы міжнароднага права. Прэцэдэнт тлумачэння, які ствараецца Еўрапейскім Судом па правах чалавека, уяўляе правіла паводзін агульнага характару, якое фармулюецца пры разглядзе канкрэтных спраў.

Для таго, каб прававы звычай стаў крыніцай міжнароднага права, патрэбна згода некалькіх дзяржаў на тое, што яны прызнаюць пэўны звычай прававым і абавязковым для кіравання. Такім чынам, калі ўнутры дзяржавы звычай можа стаць прававым пры згодзе на тое дзяржаўнай улады (пры яго санкцыянаванні дзяржавай), то для таго, каб, напрыклад, гэты самы ці нейкі іншы звычай стаў крыніцай міжнароднага права, патрэбна згода найменш дзвюх суверэнных дзяржаўных воль. На першасных этапах развіцця міжнароднага права прававы звычай, як, дарэчы, і ў нацыянальным праве, быў асноўнай і нават галоўнай крыніцай міжнароднага

права побач з дагаворам нарматыўнага зместу. Бо, уступаючы ў міжнародныя адносіны, дзяржавы павінны былі зыходзіць з прынцыпаў добрасумленнага захавання пагадненняў, якія яны заключалі, з прызнання непарушнасці дагавораў. Прынцып непарушнасці дагавораў і стаў тым першым прававым звычаем міжнароднага характару, з якога вырасла ўсё сучаснае міжнароднае права. У сучасным міжнародным праве прававы звычай выконвае ролю дадатковай крыніцы права. Прыкладам выкарыстання прававога звычая ў якасці крыніцы сучаснага міжнароднага права з'яўляецца сістэматызаваны збор прававых звычаяў у сферы міжнароднага гандлю ў форме правілаў ІНКАТЭРМС. Гэтымі правіламі, а таксама іншымі сістэматызаванымі зборамі правілаў звычаёвага характару кіруюцца ўдзельнікі прававых адносін не толькі ў сферы міжнароднага прыватнага права, але і ў сферы міжнароднага публічнага права.

Частка норм міжнародна-прававога характару існуе ў форме міжнародна-прававой дактрыны – навуковых палажэнняў, якімі кіруюцца пры заключэнні міжнародных дагавораў, пры іх тлумачэнні, выкананні, у тым ліку пры генеральнай і спецыяльнай трансфармацыі ва ўнутрыдзяржаўнае права. Асабліва значны ўплыў апошнім часам дактрынальныя міжнародна-прававыя палажэнні аказваюць на стварэнне прэцэдэнтаў тлумачэння Еўрапейскім Судом па правах чалавека і Еўрапейскім Судом. Такім чынам, дактрына і ў сістэме крыніц сучаснага міжнароднага права выконвае ролю дадатковай крыніцы права.

Да ліку дадатковых крыніц міжнароднага права можна аднесці і нормы, якія ўтрымліваюцца ў свяшчэнным пісанні, праўда, яны маюць абмежаванае выкарыстанне ў сучасным міжнародным праве. У прыватнасці, у праекце Канстытуцыі (Асноўнага закону) краін, якія ўваходзяць у склад Еўрапейскага Саюза, аб хрысціянскіх каштоўнасцях нават не ўзгадваецца. Пры заключэнні міжнародных пагадненняў паміж дзяржавамі мусульманскага свету найбольш пашырана выкарыстанне норм свяшчэнных пісанняў.

Пытанні для самаправеркі

1. Пералічыце вядомыя Вам крыніцы права, якія дзейнічаюць у прававой сістэме Рэспублікі Беларусь, дайце іх класіфікацыю на падставе Канстытуцыі краіны.

2. Раскрыйце змест фактараў, якія аказваюць уплыў на падзел крыніц права на асноўныя і дадатковыя крыніцы права.

3. Назавіце асноўныя крыніцы сучаснага беларускага права і ахарактарызуйце залежнасці, якія існуюць паміж імі.

4. Ці існуюць нейкія залежнасці паміж дадатковымі крыніцамі права?

5. Як узаемазвязаны паміж сабой паняцці юрыдычнай значнасці, юрыдычнай сілы і юрыдычнай вагі крыніц права?

6. Раскрыйце змест матэрыяльных і фармальных паказчыкаў (фактараў), якія аказваюць уплыў на юрыдычную сілу крыніц права.

7. Якія залежнасці існуюць паміж сувязямі іерархіі, каардынацыі і субардынацыі, што складваюцца ў сістэме крыніц права, і юрыдычнай значнасцю, юрыдычнай сілай і юрыдычнай вагай крыніц права?

8. Вакол якой крыніцы сучаснага беларускага права і чаму складваюцца іерархічныя сувязі і залежнасці, якія прыводзяць да пабудовы піраміды крыніц права?

9. Якім чынам суадносяцца паміж сабой паняцці вяршэнства права і вяршэнства закону?

10. Ахарактарызуйце заканадаўчыя акты і нарматыўныя прававыя акты выканаўчай улады.

11. Адзначце спецыфічныя асаблівасці нарматыўных прававых актаў кааператыўных і прафсаюзных органаў.

12. Дайце характарыстыку лакальным нарматыўным прававым актам і акрэсліце розніцу паміж імі і калектыўнымі дагаворамі.

13. Дайце характарыстыку дагавору нарматыўнага зместу ў якасці адной з асноўных крыніц сучаснага беларускага права.

14. Ахарактарызуйце нарматыўныя акты судовай улады Рэспублікі Беларусь.

15. Пры якіх умовах у прававой сістэме Рэспублікі Беларусь дзейнічае такая крыніца права, як прававы прэцэдэнт?

16. У якой форме ў якасці крыніцы сучаснага беларускага права выкарыстоўваецца дактрына (навука)?

17. Прывядзіце прыклады выкарыстання царкоўных норм у якасці крыніцы сучаснага беларускага права.

18. Дайце аналіз асноўных і дадатковых крыніц сучаснага беларускага права міжнародна-прававога характару.

Тэма 13. СІСТЭМА ПРАВА

1. Паняцце сістэмы і структуры права.
2. Галіновая структура права. Галіны, падгаліны і інстытуты права.
3. Агульная характарыстыка галін права.
4. Прыватна-публічная, матэрыяльна-працэсуальная і рэгулятыўна-ахоўная структуры права.
5. Нацыянальнае і міжнароднае права – самастойныя сістэмы права.
6. Сістэма права і сістэма заканадаўства.

1. Паняцце сістэмы і структуры права

У тэме аб паняцці і сутнасці права была зроблена выснова аб тым, што права існуе ў форме прававых адносін, у форме прававой свядомасці і ў форме пазітыўнага права. Адзначаныя тры формы існавання права – гэта тры яго праявы, тры іпастасі. Кожная з іх уключае ў сябе адны і тыя самыя прававыя эквіваленты, сродкі, інструменты, прыёмы, але знешнія праявы іх існавання розныя. Сэрцавіна, эквівалентны стрыжань у іх адзін і той самы, а сродкі адлюстравання, замацавання і выражэння розныя. Праўда, у кожнага з гістарычных і зараз існуючых народаў адна з форм існавання права на пэўных этапах развіцця права дамінавала, яна падпарадкоўвала дзве другія формы існавання права. Дамінаванне пэўнай формы існавання права азначае, што і логіку даследавання права і выкладання яго вынікаў можна будаваць, абапіраючыся менавіта на дадзеную форму існавання права. Для еўрапейскай дактрынальнай традыцыі характэрна, што тэорыя права распрацоўвалася пераважна на падставе аналізу пазітыўнага права. Усе астатнія катэгорыі і паняцці права, у якіх вызначаюцца прырода, змест і іншыя ўласцівасці правасвядомасці і прававых адносін, арганічна далучаюцца да катэгорый і паняццяў, праз якія вывучаецца пазітыўнае права.

Адметнай асаблівасцю права ўвогуле і пазітыўнага права ў прыватнасці з'яўляецца тое, што нормы права, у якіх выкладзены і замацаваны прававыя эквіваленты, шчыльна ўзаемазвязаны, узаемадзейнічаюць паміж сабой пры рэгуляванні грамадскіх адносін. Так пабудавана права, што ніводная з яго норм сама па сабе не ў стане дасягнуць пэўных мэт і выканаць пэўныя задачы без «супрацоўніцтва» з іншымі нормамі права. Разам з тым уся сукупнасць

дзеючых у грамадстве норм права падраздзяляецца на нейкія структурныя ўтварэнні, часткі, кожная з якіх выконвае самастойную ролю ў прававым рэгуляванні грамадскіх адносін. Менавіта для абазначэння шчыльнай узаемасувязі і ўзаемадзеяння паміж нормамі права пры іх адначасовым падраздзяленні на нейкія структурныя адзінкі (часткі) у агульнай тэорыі права выкарыстоўваецца паняцце (катэгорыя) сістэмы права.

Чым абумоўлены цэласнасць, адзінства, узаемаузгодненасць норм права?

Па-першае, адзінствам чалавечай дзейнасці, якая абумоўлівае адзінства грамадскіх адносін, рэгулюемых нормамі права. Па-другое, адзінствам, сістэмнасцю і ўзаемаўзгодненасцю прынцыпаў права. Вобразна кажучы, прынцыпы права з'яўляюцца той канструкцыяй, што сцягвае ў адзінае цэлае змест усяго мноства дзеючых у грамадстве норм права. І, нарэшце, па-трэцяе, сярод фактараў, што непасрэдна ўздзейнічаюць на сістэмнае адзінства норм права, трэба адзначыць адзінства дзяржаўнай волі. Справа ў тым, што любая дзяржава імкнецца звесці ў адзінае, несупярэчлівае цэлае ўсё мноства дзеючых у грамадстве крыніц права, забяспечыць узаемаўзгодненасць норм права, што змяшчаюцца ў гэтых крыніцах. Без адзінства, цэласнасці, узаемаўзгодненасці норм права ніводная дзяржава не ў стане вырашаць свае задачы. Гэтая абставіна мае настолькі важнае значэнне, што ў дзяржавах фармуецца нават асобны, самастойны, спецыфічны від дзейнасці па падтрыманні дзеючых норм і крыніц права ва ўзаемаўзгодненасці, у пастаяннай «баявой гатоўнасці» – сістэматызацыя права, альбо сістэматызацыя крыніц права. Першыя два фактары абумоўліваюць адзінства норм права з пазіцый, так сказаць, унутранага іх зместу, а трэці забяспечвае адзінства праз форму існавання норм права праз крыніцы права.

У падмурку дзялення ўсёй сукупнасці норм на нейкія структурныя адзінкі ляжыць таксама шэраг фактараў.

Па-першае, сярод мноства розных па зместу грамадскіх адносін, якія рэгулююцца нормамі права, існуюць асобныя, найбольш роднасныя, віды грамадскіх адносін, якія патрабуюць своеасаблівага прававога ўздзеяння, што не можа не абумоўліваць існавання ва ўсёй сукупнасці дзеючых норм права асобных структурных груп (частак), якія найбольш адэкватна адпавядаюць рэгулюемым грамадскім адносінам, забяспечваюць іх нармальнае функцыянаванне і развіццё.

Па-другое, адносная незалежнасць норм права ад рэгулюемых імі грамадскіх адносін дазваляе заканадаўцу ў шырокім сэнсе слова выбіраць найбольш эфектыўныя сродкі, прыёмы, інструменты ўздзеяння на грамадскія адносіны ў залежнасці як ад іх зместу, так і ад тых мэт, што імкнецца дасягнуць заканадавец, і ад тых задач, якія ён жадае вырашыць. Такім чынам, спецыфіка асобных груп рэгулюемых нормамі права грамадскіх адносін і магчымасць заканадаўцы выбіраць «па свайму густу» сродкі і прыёмы ўздзеяння на іх, абумоўліваюць існаванне асобных частак (груп) норм права.

Па-трэцяе, любая дзяржава зацікаўлена ў тым, каб правесці сістэматыку ўсёй вялізнай колькасці дзеючых норм права. Бо гэта дазваляе ажыццявіць элементарную іх інвентарызацыю, зрабіць дзеючыя нормы даступнымі і зразумелымі для правапрымяняльнікаў і іншых карыстальнікаў. Вырашыць гэтыя і іншыя праблемы значна прасцей, калі ўся сукупнасць норм права падзелена на нейкія таксанамічныя адзінкі (разрады), якія знаходзяцца паміж сабой у пэўнай супадпарадкаванасці, узаемазалежнасці.

Акрамя акрэсленых вышэй фактараў, якія найбольш істотна ўплываюць на сістэму пазітыўнага права, узаемасувязі паміж нормамі права абумоўліваюцца таксама навуковымі, культуралагічнымі, традыцыйнымі, гістарычнымі, дэмаграфічнымі, нацыянальнымі і шмат якімі іншымі прычынамі.

Сістэма права з'яўляецца высокаарганізаванай, у якой выдзяляецца некалькі структур. Адну з іх умоўна можна назваць «галіновай», бо асноўнымі структурнымі адзінкамі тут выступаюць галіны права. У сваю чаргу галіны права падраздзяляюцца на падгаліны і інстытуты права. Можна сцвярджаць, што інстытуты права аб'ядноўваюцца ў падгаліны і галіны права. Яшчэ адна са структур, што вядома з часоў старажытнарымскага права, можа быць абазначана як «публічна-прыватная» (ці «прыватна-публічная»), бо ў ёй уся сукупнасць дзеючых у пэўным грамадстве норм права падзяляецца на дзве вялікія групы – права публічнае і права прыватнае. Агульнай тэорыі права добра вядома і «матэрыяльна-працэсуальная» структура права з дзяленнем норм права на права матэрыяльнае і права працэсуальнае. І, нарэшце, «рэгулятыўна-ахоўная» структура з умоўным падзелам норм права на права рэгулятыўнае і права ахоўнае.

Выдзяленне асобных структурных частак у сістэме норм права праводзіцца не шляхам класіфікацыйных прыёмаў, а метадам тыпалогіі, пры якім выдзяленне груп адбываецца па сукупнасці прымет, уласцівых нормам права. Напрыклад, галіна права харак-

тарызуецца адначасова прадметам прававога рэгулявання, метадам прававога рэгулявання і адмысловым прававым рэжымам. Аб'яднанне норм права адбываецца тут у залежнасці ад сувязей норм права з іншымі грамадскімі рэаліямі – характарам грамадскіх адносін, інтарэсамі ўдзельнікаў грамадскіх адносін, мэтамі і задачамі прававога рэгулявання, зацікаўленасцю (воляй) дзяржавы і г. д. Пры гэтым, праўда, не забываюцца, не пакідаюцца за межамі навуковага аналізу сістэмнасць, узаемаўзгодненасць, узаемазалежнасць і «асаблівыя» якасці норм права.

Усе акрэсленыя структуры права не выключаюць адна другую. Яны існуюць адначасова і паралельна. Пры гэтым атрымліваецца так, што адна і тая самая норма права адначасова з'яўляецца «першацаглінкай» кожнай са структур права. У гэтым плане ўзнікае пытанне аб механізме ўтварэння ўсіх уласцівых сістэме норм права, структур і іх узаемаадносінах паміж сабой. Не разглядаючы яго па сутнасці і ва ўсёй падрабязнасці, акрэслім вузлавыя моманты.

Шматструктурнасць сістэмы норм права з'яўляецца вынікам адначасовага ўзаемадзеяння паміж сабой норм права шэрагам уласцівых ім якасцяў (прымет). Прычым фармаванне галіновай структуры адбываецца ў выніку аб'яднання норм права з аднолькавым, так сказаць, «матэматычным знакам». Для гэтай структуры важна, што нормы права, якія, напрыклад, аб ядноўваюцца ў грамадзянскае права, рэгулююць роднасныя грамадскія адносіны на падставе ўласцівага ім дыспазітыўнага метаду прававога рэгулявання. Што ж тычыцца астатніх структур права, то там у адну і тую самую структуру аб'ядноўваюцца нормы права з супрацьлеглымі, так сказаць, «матэматычнымі знакамі». Напрыклад, публічна-прыватная структура складаецца ў выніку аб'яднання і ўзаемадзеяння, з аднаго боку, норм права, якія забяспечваюць ажыццяўленне агульных для ўсёй грамадскай супольнасці інтарэсаў, з другога боку, тых норм права, што накіраваны на абарону і рэалізацыю ўласцівых грамадскасці прыватных інтарэсаў. Прыцягваючыся адна да адной альбо аднолькавымі, альбо супрацьлеглымі якасцямі, нормы права аб'ядноўваюцца ў нейкія ўстойлівыя групы, структурныя часткі, кожная з якіх займае сваё адметнае месца ў сукупнай структуры норм права і вырашае пэўныя задачы па ўладкаванню грамадскіх адносін.

Разам з тым аб'яднанне норм права ва ўстойлівыя структурныя адзінкі адбываецца пад уплывам знешніх структураўтваральных фактараў. Без знешніх фактараў працяглага, устойлівага дзеяння ўвогуле было б немагчыма існаванне самастойных структур

права. Некаторыя з іх маюць роўнавялікае значэнне для існавання кожнай са структур. Да іх адносяцца змест і характар грамадскіх адносін, прыёмы і сродкі юрыдычнага ўздзеяння на грамадскія адносіны, дзяржаўная воля і г. д. Магчыма, што на ўтварэнне асобных структур нейкія з гэтых фактараў уздзейнічаюць больш моцна, а на іншыя аказваюць чыста сімвалічны ўплыў. Для нас важна зафіксаваць адносна іх тое, што яны маюць дачыненні *да кожнай* са структур права, і менавіта ў гэтым сэнсе яны з'яўляюцца роўнавялікімі. У той жа час ёсць такія знешнія структураўтваральныя фактары, што ўздзейнічаюць на фармаванне адной ці пераважна адной са структур. Так, існаванне ўжо ўзгадваемай вышэй публічна-прыватнай структуры абумоўліваецца ўстойлівым існаваннем і ўздзеяннем на нормы права агульных для ўсёй супольнасці і толькі для яе часткі інтарэсаў.

Складанае перапляценне і ўзаемадзеянне знешніх структураўтваральных фактараў з уласцівасцямі (якасцямі) норм права і прыводзіць да адначасовага суіснавання некалькіх структур права.

Кожная з аднаўзроўневых структур можа стаць галоўнай, вядучай пры пэўных абставінах і ў пэўных стасунках. «Галіновая структура» можа лічыцца галоўнай, вядучай у метадычных адносінах (калі размова ідзе аб выкладанні права) і ў дачыненні да пабудовы сістэмы заканадаўства, яго сістэматызацыі і кадыфікацыі. Ва ўмовах рыначнай эканомікі, стварэння цывільнай супольнасці і пабудовы прававой дзяржавы важнае значэнне набыла «публічна-прыватная» структура.

Сістэма права пастаянна развіваецца і ўдасканальваецца. Патрэбы грамадскага жыцця, а таксама дзейнасць заканадаўцы, усіх органаў і інстытутаў, якія ствараюць нормы права ў адпаведнасці з патрабаваннямі грамадскіх адносін, уздзейнічаюць на сістэму права, прыводзяць да пэўных зрухаў у ёй. Са змяненнем зместу грамадскіх адносін (і асабліва іх структуры) мяняюцца нормы, што рэгулююць гэтыя грамадскія адносіны і, адпаведна, і сувязі (генетычныя, структурныя, функцыянальныя) змяніўшыхся норм з астатнімі нормамі права. Рана ці позна колькасныя змяненні ў характары сувязей паміж асобнымі нормамі права прыводзяць да якасных перамен паміж структурнымі часткамі сістэмы права, да трансфармацыі ва ўсёй сістэме.

Асабліва значныя перамены ў сістэме норм права адбываюцца ў выніку пашырэння ці, наадварот, звужэння сферы прававога рэгулявання. Гэтыя працэсы абумоўліваюць адразу даволі рэзкія і адчувальныя перамены ў колькасным і якасным стане структур-

ных элементаў. Узнікаюць новыя ці рэфармуюцца існуючыя галіны, падгалiны і інстытуты права. Атрымліваюць дадатковыя стымулы да развіцця альбо, наадварот, страчваюць грамадскую значнасць і гучанне прыватнае ці публічнае, матэрыяльнае ці працэсуальнае, рэгулятыўнае ці ахоўнае права.

Да значных пераўтварэнняў у сістэме норм права прыводзяць таксама змяненні ў знешніх структураўтваральных фактарах. Змяненні ва ўзаемаадносінах паміж цывільнай супольнасцю і дзяржавай, перамены ў мэтах, задачах і метадах уздзеяння дзяржавы на грамадскія адносіны прыводзяць да перамен у «публічна-прыватнай», «матэрыяльна-працэсуальнай» і «ахоўна-рэгулятыўнай» структурах права.

2. Галіновая структура права. Галіны, падгалiны і інстытуты права

Асноўнымі структурнымі часткамі (элементамі) галіновай структуры з'яўляюцца галіны права, якія падзяляюцца на інстытуты. Асобныя з галінаў права ўключаюць у сябе падгалiны права, якія распадаюцца на інстытуты права. Але існаванне ў структуры права такога падраздзялення, як падгалiна права, не адмяняе асноўнага ланцужка структурных залежнасцяў: уся сукупнасць норм права – галіны права – інстытуты права. Гэты ланцужок падаўжаецца, прычым падаўжаецца вельмі цікава. Нейкая група норм права ў межах пэўнай галіны адасабляецца ў падгалiну норм права, яна ўключае ў сябе інстытуты права. І вось для гэтай групы норм права ланцужок структурных залежнасцяў павялічваецца на адно звяно. Што ж тычыцца тых норм права, якія не ўключаюцца ў склад нейкіх падгалінаў права, то для іх структурныя залежнасці застаюцца ранейшымі. Нормы права аб'ядноўваюцца ў інстытуты, а інстытуты адразу ўваходзяць у склад пэўнай галіны права.

Для галіны права – асноўнага падраздзялення разглядаемай структуры права – уласцівы шэраг адметных рыс. Гэта прадмет прававога рэгулявання, метад прававога рэгулявання і асобны прававы рэжым рэгулявання.

Разгледзім кожны з вышэйазначаных параметраў, якія ўласцівы галінам права.

Прадмет прававога рэгулявання. Грамадскія адносіны ўяўляюць сабой структуру сацыяльнай дзейнасці людзей, іх супольнасцей і ўтварэнняў. Грамадскія адносіны – гэта стабільныя, устойлівыя моманты сукупнай дзейнасці людзей у самых разнастайных яе

праявах. Гэта каркас, шкілет усёй чалавечай дзейнасці, тое агульнае, што ўласціва адпаведнаму віду чалавечай дзейнасці. Індывідуальныя, непаўторныя, адметныя рысы, уласцівыя асобным сацыяльным сувязям, што складваюцца ў пэўнай сферы чалавечай дзейнасці, не ахопліваюцца паняццем грамадскіх адносін.

Нормы права, такім чынам, разлічаны не на канкрэтную сувязь паміж канкрэтнымі асобамі, у іх адлюстраваны структура, уласцівыя рысы той дзейнасці, якой займаюцца зараз гэтыя асобы, тыя ўстойлівыя рысы, што характарызуюць пэўнае становішча, у якое трапілі яны менавіта зараз, напрыклад, становішча суседзяў, гандляра і пакупніка, цесця і зяця, уласніка і арандатара і г. д. Разам з тым норма права можа ўздзейнічаць на грамадскія адносіны *толькі* праз свядомасць, інтарэсы, матывы паводзін канкрэтных людзей. Толькі змяняючы паводзіны канкрэтных асоб, можна памяняць рэальна іх дзейнасць і сацыяльныя сувязі і, нарэшце, вынік мноства актаў паводзін і канкрэтных сацыяльных сувязей – грамадскія адносіны. Такім чынам, паняцце рэгулявання грамадскіх адносін з пункту гледжання норм права азначае замацаванне склаўшайся (стабільнай, пастаяннай) структуры чалавечай дзейнасці, яе асобных відаў, ахову яе ад парушэнняў, кансервацыю грамадскіх адносін.

Чалавечая дзейнасць мае «шматвектарны» характар, у выніку чаго складваецца мноства самых разнастайных відаў грамадскіх адносін. У падмурку мноства асобных відаў грамадскіх адносін ляжаць разнастайныя інтарэсы і мэты ўдзельнікаў чалавечай дзейнасці, разнастайнасць складу ўдзельнікаў дзейнасці, спецыфічнасць прадмета і сродкаў дзейнасці, іншыя характэрныя асаблівасці і праявы ўзаемаадносін паміж людзьмі.

На наш погляд, вышэйшая таксанамічная адзінка класіфікацыі грамадскіх адносін – сфера (маюцца на ўвазе эканамічныя, сацыяльныя, палітычныя, ідэалагічныя адносіны) ні ў якім разе не можа лічыцца прадметам прававога рэгулявання асобнай галіны права. Справа ў тым, што ёсць такія эканамічныя, сацыяльныя, палітычныя, ідэалагічныя адносіны, якія не маюць прававых уласцівасцей, як кажуць, «прававой прыроды». А таму ў самых лепшых варунках прадметам рэгулявання асобнай галіны права можа быць толькі нейкая частка (група) эканамічных, палітычных і іншых адносін. Калі за адпавядаючую галіне права ўзяць нейкую групу грамадскіх адносін, то ў сітуацыі з падзелам галіны права на падгаліны і інстытуты права мы вымушаны знайсці ў гэтай групе грамадскіх адносін адпавядаючы падгаліне норм права від грамадскіх

адносін, а інстытуту – падвід нейкіх грамадскіх адносін. Калі ж галіна права ведае падзел толькі на інстытуты права, то патрабуецца знайсці ў групе грамадскіх адносін адпаведныя інстытутам права віды грамадскіх адносін.

Метад прававога рэгулявання. Далёка не кожная група грамадскіх адносін, што маюць прававую прыроду, складае прадмет прававога рэгулявання асобных галінаў права. Для таго, каб грамадскія адносіны сталі самастойным прадметам прававога рэгулявання, неабходна, каб яны патрабавалі сістэмы адпаведных сваёй прыродзе прыёмаў, сродкаў уздзеяння – своеасаблівага метаду прававога рэгулявання. Метад прававога рэгулявання ўяўляе юрыдычнае ўвасабленне асаблівасцей прадмета прававога рэгулявання. Паняцце «юрыдычнае ўвасабленне асаблівасцей прадмета прававога рэгулявання» азначае, што гэты прадмет у ходзе фармулявання норм права адлюстроўваецца ў іх тымі якасцямі, асаблівасцямі, якія ў стане ўспрыняць прававое ўздзеянне і адрэагаваць на яго.

Часцей за ўсё ў навуковай і вучэбнай літаратуры сустракаецца меркаванне аб тым, што пад метадам прававога рэгулявання трэба разумець той спосаб уздзеяння на грамадскія адносіны, які складаецца з сукупнасці прыёмаў юрыдычнага апасрэдавання грамадскіх адносін, і што асноўнымі яго элементамі з'яўляюцца: 1) характар агульнага юрыдычнага становішча ўдзельнікаў грамадскіх адносін (статусу), што праяўляецца ў адносінах роўнасці; стану ўлады і падпарадкаванасці, альбо звязанасцю «працоўным рэжымам» і г. д.; 2) характар падстаў узнікнення, змянення і прыпынення праваадносін (асаблівасці юрыдычных фактараў); 3) характар фармавання зместу праў і абавязкаў суб'ектаў; 4) характар юрыдычных санкцый, спосабаў, працэдур і падстаў для іх прымянення. Самыя разнастайныя спалучэнні азначаных элементаў (прыёмаў), іх асобных момантаў, якія абумоўлены прыродай рэгулюемых грамадскіх адносін, прыводзяць да фармавання метаду прававога рэгулявання самастойнай галіны права.

Рэжым прававога рэгулявання. Метад прававога рэгулявання складае вельмі важную, але не адзіную юрыдычную прымету самастойнай галіны права. Больш таго, метад прававога рэгулявання з'яўляецца *адным з асноўных элементаў* галіновага рэжыму прававога рэгулявання. Побач з ім у склад апошняга ўваходзяць асобныя юрыдычныя сродкі рэгулявання грамадскіх адносін.

Асобныя юрыдычныя сродкі – гэта тыя самыя нормы права, тэхніка-прававы інструментарый узнікнення і абароны правоў і г. д. Такім чынам, асобныя юрыдычныя сродкі не ўяўляюць нейкіх

«асобных» з'яў прававой рэчаіснасці. Пад імі трэба разумець усе «матэрыяльныя» сродкі прававога ўздзеяння на грамадскія адносіны, але разглядаемыя не ва ўсіх сваіх якасцях і сувязях.

Важным складнікам асобнага прававога рэжыму рэгулявання грамадскіх адносін з'яўляюцца прынцыпы і агульныя палажэнні, якія працінаюць змест пэўнай сукупнасці норм права, што адасабляюцца ў самастойную галіну норм права. Прынцыпы і агульныя палажэнні выконваюць ролю своеасаблівага інтэлектуальна-валявога стрыжня, вакол якога аб'ядноўваюцца асобныя сродкі і прыёмы ўздзеяння на грамадскія адносіны. Змест і накіраванасць гэтых сродкаў становяцца зразумелымі менавіта ў цеснай узаемасувязі з прынцыпамі і агульнымі палажэннямі. Метад прававога рэгулявання, уласцівы пэўнай групе норм права, выяўляе ўсю сваю адметнасць, высвечваецца непаўторнымі рысамі, набывае лагічнасць і мэтанакіраванасць.

Асобны прававы рэжым рэгулявання грамадскіх адносін ёсць вынік узаемадзеяння прадмета і метаду прававога рэгулявання, уздзеяння дзяржавы праз юрыдычныя сродкі і прыёмы на грамадскія адносіны. Асобны прававы рэжым выкрышталізоўваецца паступова. У ходзе юрыдычнага ўздзеяння на грамадскія адносіны выяўляюцца найбольш грунтоўныя, фундаментальныя ўласцівасці, якасці іх прававой прыроды, якія затым абагульняюцца ў галіновыя прынцыпы права, фармулююцца іншыя агульныя палажэнні, у якіх адлюстроўваюцца асаблівасці рэгулюемых грамадскіх адносін. Галіновыя прынцыпы права і агульныя палажэнні, якія ўжо сфарміраваны, пераўтвараюцца паступова ў вядучую частку асобнага прававога рэжыму, вакол якой аб ядноўваюцца і метад прававога рэгулявання, і іншыя яе элементы.

Прадмет і метад прававога рэгулявання, а таксама асобны прававы рэжым, якія ўласцівы пэўнай сукупнасці норм права, складаюць якасныя перадумовы існавання самастойнай галіны права, а, дакладней, выдзялення нейкай сукупнасці норм права ў самастойную структурную адзінку сістэмы норм права – галіну права.

Галіновая структура норм права не застаецца нязменнай. Яе развіццё звязана з пераменамі ў колькасным і якасным складзе самастойных галінаў права, а, адпаведна, з пераменамі ў месцы і ролі кожнай з галінаў права ў іх сістэме, са зменай функцыянальных і генетычных сувязей паміж галінамі норм права. Знешнім паказчыкам, своеасаблівым «паплаўком», які сведчыць аб развіцці галіновай структуры норм права, з'яўляецца асобны прававы рэжым, што складаецца паступова ў выніку пэўных пераменаў у прававым

рэгуляванні грамадскіх адносін. Фармаванне самастойнага, асобнага прававога рэжыму сведчыць аб з'яўленні новай галіны права, бо, як слушна падкрэслівалася ў юрыдычнай літаратуры, існуе столькі галінаў права, сколькі рэальна адасобілася асобных прававых рэжымаў.

Безумоўна, змяненні ў галіновай структуры права адбываюцца пастаянна. З узнікненнем новых грамадскіх адносін, якія патрабуюць прававога рэгулявання, складваюцца і новыя нормы права, мяняецца якасны і колькасны склад асобных інстытутаў і галінаў права, у склад якіх уключаюцца новыя нормы права. Узнікаюць (складваюцца) новыя інстытуты права, а разам з імі адбываюцца перамены ва ўнутрыгаліновых сувязях паміж асобнымі інстытутамі, якія вядуць часта і да пераменаў (праўда, нязначных) паміж галінамі норм права. Аднак да таго часу, пакуль гэтыя і іншыя перамены назіраюцца ў нетрах існуючых галінаў права, ніякага развіцця ў галіновай структуры норм права не адбываецца, бо развіццё структуры – гэта перш-наперш перамены ва ўстойлівых сувязях паміж яе асноўнымі (вядучымі) часткамі (структурнымі падраздзяленнямі).

Фармаванне самастойных галінаў права адбываецца рознымі шляхамі, але найбольш тыповымі з'яўляюцца наступныя два.

Адзін з іх пачынаецца са з'яўлення нейкіх якасна новых грамадскіх адносін, якія маюць прававую прыроду і патрабуюць уздзеяння з боку заканадаўцы. Затым натуральна фармуецца, адасабляецца група норм права. Працэс адасаблення норм права суправаджаецца складваннем спецыфічнага метаду і асобнага рэжыму прававога рэгулявання. Кадыфікацыя нарматыўна-прававых актаў завяршае станаўленне самастойнай галіны норм права і галіны заканадаўства. Такі шлях станаўлення прайшлі айчыннае працоўнае, калгаснае права, права сацыяльнага забеспячэння. Для яго, як бачна, характэрна фармаванне новай галіны як бы па-за межамі існуючых галінаў норм права, на чыстым, так сказаць, «неапрацаваным полі» грамадскіх адносін.

Другі шлях звязаны з тым, што пачынаюць бурна развівацца, пашырацца і памнажацца маючыя прававую прыроду грамадскія адносіны, якія ўваходзяць у склад прадмета прававога рэгулявання ўжо існуючых галінаў права. Паступова назапашваецца значны аб'ём нарматыўнага матэрыялу, фармуюцца адметныя метад і рэжым прававога рэгулявання. Кадыфікацыя нарматыўна-прававых актаў «высякае» з нетраў існуючай галіны норм права новую. Так узніклі сямейнае права і жыллёвае права. Першапачаткова ў скла-

дзе цывільнага права існавалі інстытуты сямейнага і жыллёвага права. Затым яны развіліся да статусу падгалінаў права і, нарэшце, адасобіліся ў самастойныя галіны норм права.

Такім чынам, галіна права – асноўнае структурнае падраздзяленне галіновай структуры права. Галіна права ўяўляе групу норм права, якая аб'ектыўна склалася і адасобілася ўнутры адзінай сукупнасці (сістэмы). Нормы права аб'ядноўваюцца паміж сабой агульнасцю прадмету, метаду і рэжыму прававога рэгулявання. Нормы права, якія ўваходзяць у склад нейкай галіны норм права, складаюць арганічную цэласнасць, г. зн. яны выступаюць у адносінах з іншымі галінамі права ў якасці непадзельнага цэлага. Гэтая абставіна складае структурна-функцыянальную прымету галіны норм права.

Як сведчыць вопыт развіцця галіновай структуры, асобныя галіны права ўключаюць у сябе адну ці нават некалькі падгалінаў права. Характэрнай асаблівасцю падгалінаў права з'яўляецца тое, што яны рэгулююць нейкую частку той групы грамадскіх адносін, якія ўладкоўваюцца нормамі права асобнай галіны. Прыкладамі падгалінаў права ў дзеючай сістэме права Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца, напрыклад, права інтэлектуальнай уласнасці ў цывільным (грамадзянскім) праве. Падгаліна права мае сваю спецыфічную агульную частку, у склад якой уваходзяць нормы права, што замацоўваюць нейкія агульныя палажэнні для ўсёй падгаліны права. Гэтыя агульныя палажэнні змяшчаюцца, як правіла, у асобных главах, падраздзелах галіновых кадыфіцыраваных нарматыўна-прававых актаў. Так, у Цывільным кодэксе Рэспублікі Беларусь знаходзім асобны раздзел, у якім змяшчаюцца агульныя палажэнні абавязацельственнага права – падгаліны цывільнага права Рэспублікі Беларусь.

Праўда, Агульная частка той ці іншай падгаліны права абапіраецца на Агульную частку адпаведнай галіны норм права. І гэта з'яўляецца прынцыпова важным момантам. Такая супадначаленасць сведчыць аб тым, што ў сваіх асноўных параметрах прававы рэжым нейкай падгаліны права з'яўляецца тым самым, што і ў галіны, у склад якой яна ўваходзіць. А тыя асаблівасці ў прававым рэжыме, механізме прававога рэгулявання, якія ўласцівы падгаліне права, недастатковыя для таго, каб падгаліна права адпавядала пэўным параметрам асноўнага структурнага падраздзялення галіновай структуры права. Аднак пры пэўных умовах (актыўнае развіццё грамадскіх адносін і, адпаведна, інтэнсіўная нарматворчасць дзяржавы) падгаліна права можа «перарасці» ў самастойную струк-

турную адзінку галіновай структуры. Так было, напрыклад, з сямейным правам, якое доўгі час знаходзілася ў нетрах цывільнага права ў якасці падгаліны права. Са складу крымінальнага права ў самастойную галіну права выросла крымінальна-выканаўчае права, існаваўшае ў нетрах крымінальнага права на «правах» падгаліны права.

Галіна (ці падгаліна) права падзяляецца на прававыя інстытуты, пад якімі можна разумець групу норм права, што рэгулюе пэўны від (падвід) грамадскіх адносін альбо нейкі ўчастак адносін нейкага віду ці роду. Галоўная прымета прававога інстытута заключаецца ў тым, што ён забяспечвае самастойнае рэгулятыўнае ўздзеянне на пэўны ўчастак грамадскіх адносін, пры гэтым у межах свайго ўчастка прававы інстытут забяспечвае цэласнае, адносна завершанае рэгуляванне. Для прававога інстытута ўласцівы адметны інтэлектуальна-валявы змест, які выкладаецца ў роднаснай групе паняццяў, агульных палажэнняў, тэрмінаў. У прававога інстытута маецца свая структура і свая адметная юрыдычная канструкцыя.

У сістэме права Рэспублікі Беларусь склалася некалькі відаў прававых інстытутаў. У асобныя групы яны выдзяляюцца па характару рэгулюемых грамадскіх адносін, па функцыях, што даводзіцца ім выконваць у сістэме норм права, і па іншых параметрах. Агульнай тэорыі права добра вядомы рэгулятыўныя і праваахоўныя, прадметныя і функцыянальныя, агульныя, асноўныя, генеральныя інстытуты. Выдзяляюцца таксама комплексныя інстытуты, аб'яднанні інстытутаў, субінстытуты і г. д.

3. Агульная характарыстыка галін права Рэспублікі Беларусь

Калі ўявіць сабе, што ўсе дзеючыя ў нацыянальнай прававой сістэме нормы права размешчаны на адной гарызантальнай лініі адносна рэгламентуемых імі грамадскіх адносін, то выявіцца, што любая з існуючых норм права ўключаецца толькі ў адну галіну права, бо яна ўдзельнічае ў рэгламентацыі нейкай аднароднай групы грамадскіх адносін, забяспечваючы пры гэтым існаванне спецыфічнага метаду і асобнага рэжыму прававога рэгулявання. І менавіта ў якасці «асобнай прылады», што забяспечвае існасць асобнага рэжыму і спецыфічнага метаду прававога рэгулявання, норма права ўключаецца ў склад той ці іншай галіны норм права. У сістэме норм права няма ніводнай нейтральнай, так сказаць, «безгаспадарчай» нормы права. Адносна той ці іншай нормы права нельга

сказаць, што яе галіновая прыналежнасць не зусім дакладная. Такое сцвярджэнне можа існаваць у суадносінах да нашых ведаў аб сістэме права. Нават адносна апісанай сітуацыі, калі фармаванне новай галіны права пачынаецца на «неапрацаваным полі», захоўвае сваю моц сцвярджэнне аб прыналежнасці нормы права толькі да нейкай адной, пэўнай галіны права. Справа ў тым, што нормы права, якія рэгулююць пры гэтым новыя грамадскія адносіны, якія раней не ўваходзілі ў сферу ўздзеяння з боку заканадаўцы, да набыцця ўсіх якасных параметраў новай галіны знаходзяцца ў «сілавым полі» ўжо існуючых галіновых рэжымаў.

Асобнае месца сярод галін права займаюць канстытуцыйнае, адміністрацыйнае, цывільнае, крымінальнае права, а таксама тры працэсуальныя галіны права – адміністрацыйнае працэсуальнае, цывільнае працэсуальнае і крымінальнае працэсуальнае права. Пералічаныя галіны права з'яўляюцца прафілюючымі, г. зн. першаснымі, фундаментальнымі.

На думку С.С. Аляксеева, намаганнямі якога было ў асноўным распрацавана вучэнне аб класіфікацыі галін права, іх відах, прафілюючыя (фундаментальныя) галіны норм права рэгулююць такія віды грамадскіх адносін, якія па свайму глыбіннаму эканамічнаму і сацыяльна-палітычнаму зместу патрабуюць своеасаблівага, зыходнага па спецыфіцы прававога рэгулявання і таму прадвызначаюць асноўныя, тыповыя асаблівасці юрыдычнага інструментарыя: 1) канцэнтруюць у сабе генеральныя юрыдычныя рэжымы, групавыя метады прававога рэгулявання; 2) адрозніваюцца юрыдычнай «чысцінёй», яркай кантрастнасцю, юрыдычнай несумяшчальнасцю, што выключае магчымасць узаемнага субсідзіярнага прымянення норм права, якія ўваходзяць у дадзеныя галіны; 3) з'яўляюцца юрыдычна першаснымі, г. зн. утрымліваюць зыходны прававы матэрыял, які выкарыстоўваецца пры фармаванні прававых рэжымаў іншых галінаў; 4) у сваёй сукупнасці маюць завершаную архітэктоніку, звязаны яснымі заканамернымі залежнасцямі і іерархічнымі сувязямі.

Канстытуцыйнае права з'яўляецца асноватворнай галіной права, бо ў яго нормах фармулююцца адпраўныя палажэнні ўсёй прававой сістэмы грамадства. У кантынентальнай (рамана-германскай) прававой сям'і гэтую галіну права называюць канстытуцыйным правам, таму што пісаная канстытуцыя – асноўная крыніца права гэтай сям'і – утрымлівае асноватворныя палажэнні ўсіх без выключэння прафілюючых (фундаментальных) галін права. Без палажэнняў такога кшталту немагчыма скаардынаваць у адзінае цэ-

лае ўвесь комплекс прафілюючых галін, акрэсліць сферы, мэты і задачы прававога рэгулявання, усталяваць іерархічныя і іншыя структураўтваральныя сувязі паміж асобнымі нормамі права і іх разнастайнымі аб'яднаннямі. Такім чынам, канстытуцыйнае права – гэта своеасаблівы цэнтр усёй галіновай структуры права.

Да канстытуцыйнага права вельмі шчыльна прымыкаюць усе прафілюючыя (фундаментальныя) галіны права. Прычым прафілюючыя галіны аб'ядноўваюцца паміж сабой такім чынам, што ўтвараюцца тры пары галін пэўнага кірунку (цыклу): крымінальнае і крымінальнае працэсуальнае права ўтвараюць крымінальны цыкл; цывільнае і цывільнае працэсуальнае права – цывілістычны кірунак; адміністрацыйнае і адміністрацыйнае працэсуальнае – адміністрацыйны (альбо ўпраўленчы) цыкл. Фундаментальныя галіны пэўнага кірунку звязаны паміж сабой генетычнымі, функцыянальнымі і структурнымі сувязямі, складаюць нейкае непарыўнае адзінства. У акрэсленых цыклах (кірунках) галін права выкрышталізоўваюцца і захоўваюцца ў класічным выглядзе першасныя, зыходныя элементы юрыдычнага інструментарыя – рэгулятыўныя і ахоўныя, матэрыяльныя і працэсуальныя, цэнтралізаваныя і дыспазітыўныя.

Усе астатнія галіны права знаходзяцца ў полі дзеяння «прававога рэжыму» фундаментальных галін, грунтуюцца непасрэдна на іх юрыдычных канструкцыях, выкарыстоўваюць прававы інструментарый прафілюючых галін права.

Акрэсленыя суадносіны паміж асноватворнай галіной, фундаментальнымі (прафілюючымі) галінамі права і астатнімі асноўнымі структурнымі падраздзяленнямі галіновай структуры права ні ў якім разе не азначаюць, што ў сістэме ёсць больш важныя і менш важныя галіны права. Сапраўды, у генетычных, функцыянальных, юрыдычна-структурных стасунках асобныя галіны права займаюць рознае становішча адносна адна другой. Але ў плане ўздзеяння на грамадскія адносіны паміж галінамі права (як, дарэчы, і паміж асобнымі нормамі права) не можа існаваць падзелу на больш ці менш важныя. Усе яны, Узятыя разам, без ніякага выключэння, у стане вырашаць задачы і мэты прававога рэгулявання грамадскіх адносін.

У айчыннай юрыдычнай навуцы доўгі час абмяркоўвалася канцэпцыя «комплексных галін» права. Пры разнастайнасці аўтарскіх падыходаў, якія былі сфармуляваны пры абмеркаванні гэтай ідэі, квінтэсэнцыя азначанай канструкцыі зводзіцца да таго, што ў сістэме права побач з іх асноўным дзеяннем на галіны права,

якія адасабляюцца ў самастойныя структурныя падраздзяленні згодна з асобным прававым рэжымам, прадметам, метадам прававога рэгулявання, у сістэме права існуюць такія падраздзяленні права, якія не звязаны адзіным прававым рэжымам, прадметам і метадам прававога рэгулявання.

Што тычыцца аўтарскага стаўлення да тэорыі комплексных галін права, то яно адмоўнае. Справа ў тым, што няма акрэсленых, дакладных, вывераных (як гэта, напрыклад, назіраецца ў сітуацыі з галінамі права) параметраў (крытэрыяў), якія б дазвалялі станоўча ці адмоўна сцвярджаць, з'яўляецца ці не з'яўляецца нейкая сукупнасць норм права «комплекснай галіной» права. Па сутнасці, адзіным значным доказам існавання комплексных (другасных) утварэнняў застаюцца рэальна існуючыя комплексныя кадыфікаваныя нарматыўныя прававыя акты. Але ў гэтым выпадку больш правільна весці размову аб існаванні комплексных галін заканадаўства, а не комплексных галін права.

4. Прыватна-публічная, матэрыяльна-працэсуальная і рэгулятыўна-ахоўная структуры права

Падзел права на права прыватнае і права публічнае вядомы даўно. З літаратурных крыніц вядома, што рымскі юрыст Ульпіян падзяляў усё рымскае права ў залежнасці ад карысці, якую яно прыносіць асобным людзям ці рымскай дзяржаве цалкам, на права прыватнае і права публічнае. За шматвекавую гісторыю развіцця юрыдычнай навукі яна не выпрацавала аднастайнага падыходу да падзелу права на права публічнае і права прыватнае. Найбольш абгрунтаванай нам падаецца пазіцыя, згодна з якой да публічнага права можна аднесці тыя нормы права, якія рэгламентуюць самыя розныя бакі ўладных адносін. Прычым гэта не абавязкова павінны быць, як уяўляецца, дзяржаўныя ўладныя адносіны.

Дзяржаўная ўлада з'яўляецца асобнай публічнай уладай, побач з якой існуюць і іншыя віды сацыяльнай (палітычнай) улады. Як вядома, асобная публічная ўлада выступае ад імя ўсяго грамадства і забяспечвае яго агульныя інтарэсы. Іншыя віды сацыяльнай улады выступаюць ад імя часткі грамадства, але таксама забяспечваюць агульныя інтарэсы гэтай яго часткі. Такім чынам, як у першым, так і ў другім выпадку ўлада забяспечвае агульныя інтарэсы. Зразумела, што забеспячэнне агульных інтарэсаў можа ажыццяўляцца рознымі прававымі прыёмамі і сродкамі. Зразумела таксама, што забеспячэнне агульных інтарэсаў не можа зводзіцца да падаў-

лення інтарэсаў прыватных. У сферы ўладных адносін не існуе прыватных інтарэсаў.

Прыватныя інтарэсы могуць быць нейкім чынам спалучаны з агульнымі інтарэсамі, абумоўлены імі ці звязаны з агульнымі інтарэсамі нейкім іншым чынам. У сферы ўладных адносін існуе агульны інтарэс, які заўсёды аб'ядноўвае ў адзінае цэлае два бакі – органы ўлады і адрасатаў уладных вяленняў. Адрасатамі ўладных вяленняў могуць быць іншыя органы ўлады, службовыя асобы альбо фізічныя асобы. Натуральна, змест і характар норм права, якія рэгламентуюць гэтыя адносіны ў залежнасці найперш ад адрасатаў уладных вяленняў, будуць рознымі, але гэта будуць нормы права з аднолькавай скіраванасцю на забеспячэнне агульнага інтарэсу. Калі ў сферы ажыццяўлення ўладных адносін з'яўляецца прыватны інтарэс, то ён, адпаведна, рэгламентуецца з дапамогай іншых прававых метадаў і сродкаў, якія характэрны для прыватнага права.

У адрозненне ад права публічнага, якое аб'ядноўвае ў адзінае цэлае нормы права, якія скіраваны на забеспячэнне агульнага інтарэсу, права прыватнае ўключае нормы права, якія скіраваны галоўным чынам на забеспячэнне самых розных інтарэсаў фізічных асоб, створаных імі органаў і арганізацый, якія не знаходзяцца паміж сабой ва ўладных стасунках і ўзаемаадносінах. Умоўна кажучы, для прыватнага права найбольш характэрнымі з'яўляюцца адносіны «па гарызанталі», у той час, як для публічнага – адносіны «па вертыкалі».

Уяўляецца, што падзел права на дзве акрэсленыя структурныя часткі не можа быць зведзены да падзелу асобных галін права на тыя, што адносяцца да права публічнага, і тыя, якія можна лічыць прыватнымі.

Падзел права на публічнае і прыватнае – гэта зусім іншы зрэз сістэмы права, гэта самастойная структура права, у якой існуюць дзве самастойныя структурныя часткі – права публічнае і права прыватнае. Той самы аб'ём норм права, які ў выпадку з галіновай структурай права падзяляўся на асобныя галіны права, у публічна-прыватнай структуры падзяляецца на дзве часткі – права публічнае і права прыватнае. Увогуле не існуе такіх галін права, усе нормы якіх можна было б аднастайна аднесці да права публічнага ці права прыватнага. Нават у крымінальным праве, якое часта адносяць да публічнага права, шмат норм права, якія можна аднесці да права прыватнага.

Зузім з іншым зрэзам у сістэме права мы сустракаемся, калі ўся сукупнасць (сістэма) норм права падзяляецца на права матэры-

яльнае і права працэсуальнае. Незалежна ад таго, які інтарэс забяспечваецца і рэгулюецца нормамі права (агульны ці прыватны), важна таксама высветліць, што ўяўляе гэты інтарэс па зместу: нейкую магчымасць прававых паводзін, ці нейкі абавязак па ажыццяўленню паводзін альбо ўстрыманне ад пэўных паводзін. Не менш важна высветліць і прававыя механізмы, працэдуры і сродкі ажыццяўлення інтарэсаў. Замацаванне мер магчымых, дазволеных прававых паводзін, мер патрэбных паводзін з боку удзельнікаў грамадскіх адносін адбываецца ў нормах матэрыяльнага права. А замацаванне механізмаў, працэдур і сродкаў ажыццяўлення інтарэсаў адбываецца ў нормах працэсуальнага права.

Матэрыяльным правам часта называюць тую частку дзеючых норм права, у якой суб'екты грамадскіх адносін надзяляюцца пэўнымі юрыдычнымі правамі і юрыдычнымі свабодамі. Працэсуальным правам абазначаюць тую частку норм права, у якой замацоўваецца працэдура ажыццяўлення, узнаўлення і абароны парушаных юрыдычных праў і свабод. Можна сказаць і так: да працэсуальнага права адносяцца нормы права, у якіх устанаўліваецца парадак ажыццяўлення матэрыяльных норм права, а таксама працэдура разгляду разнастайных прававых спрэчак.

Важнай адметнай рысай матэрыяльна-працэсуальнай структуры права з'яўляецца тое, што паміж матэрыяльным і працэсуальным правам павінна быць не толькі адпаведнасць, але і карэляцыя. Адпаведнасць у тым, што змест інтарэсу, які замацаваны ў нормах матэрыяльнага права, павінен быць суразмерным і адэкватным тым механізмам, сродкам і прыёмам яго рэалізацыі і забеспячэння, якія замацаваны ў нормах працэсуальнага права, як, дарэчы, і наадварот. Карэляцыя паміж матэрыяльным і працэсуальным правам зводзіцца да таго, што не могуць існаваць нормы матэрыяльнага права, для ажыццяўлення якіх не існуе адпаведных норм працэсуальнага права. І, наадварот, не маюць сэнсу працэсуальныя нормы, з дапамогай якіх не ажыццяўляюцца нормы матэрыяльнага права.

Праўда, суадносіны паміж матэрыяльным і працэсуальным правам у розных прававых сем'ях істотна розняцца. Калі ў рамана-германскай прававой сям'і перавага застаецца за матэрыяльным правам, якое і вызначае змест і характар права працэсуальнага, то, наадварот, у сям'і англа-амерыканскага права перавагу мае права працэсуальнае, таму што захаванне працэдуры абароны і ажыццяўлення інтарэсаў суб'екта права заўсёды прывядзе да вырашэння разглядаемай справы па сутнасці.

Асобную структуру права складае рэгулятыўна-ахоўнае права. Права рэгулятыўна ўяўляе сукупнасць норм права, якія скіраваны на тое, каб замацаваць існуючыя грамадскія адносіны ці спрыяць узнікненню і развіццю якасна новых сацыяльных сувязей і грамадскіх адносін. Праз гэтыя нормы права і з іх дапамогай ажыццяўляюцца рэгулятыўная статычная і рэгулятўна дынамічная функцыі права. Ахоўныя нормы права скіраваны на тое, каб захаваць і забяспечыць належнае развіццё грамадскіх адносін шляхам усталявання разнастайных мер юрыдычнай адказнасці і сродкаў юрыдычнага прымусу.

5. Нацыянальнае і міжнароднае права – самастойныя сістэмы права

Міжнароднае права як асобная сацыяльна-прававая рэальнасць сфармавалася адначасова з фармаваннем нацыянальнага (унутрыдзяржаўнага) права. Развіццё рэгулярнага тавараабмену і таварна-грашовых адносін заканамерна абумовіла фармаванне такіх эквівалентаў, з дапамогай якіх можна было аднастайна рэгуляваць грамадскія адносіны на тэрыторыі розных дзяржаўных утварэнняў. Разам з тым міжнароднае права з'яўляецца якасна самастойнай сістэмай права, таму што ствараецца ў выніку ўзаемаўзгодненых дзеянняў і ўзаемадзеянняў па меншай меры дзвюх суверэнных дзяржаўных воль. Без згоды суверэннай волі, якая можа быць выражана ў рознай форме, на тэрыторыі дзяржавы не можа дзейнічаць ніякі «іншародны» прававы эквівалент. Пад міжнародным правам можна разумець сукупнасць (сістэму) прававых эквівалентаў (норм права), якія рэгламентуюць тыя грамадскія адносіны, што складваюцца паміж дзяржавамі, міжнароднымі арганізацыямі, а таксама паміж фізічнымі і юрыдычнымі асобамі, якія з'яўляюцца грамадзянамі розных дзяржаўных утварэнняў ці створаны згодна з правам нейкай дзяржавы.

Усё міжнароднае права падзяляецца на міжнароднае публічнае і міжнароднае прыватнае права.

Міжнароднае публічнае права – сістэма норм права, якія рэгламентуюць міжнародныя палітычныя адносіны, г. зн. адносіны, якія складваюцца паміж асобнымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі, якія створаны дзяржавамі падчас іх супрацоўніцтва і барацьбы. Міжнароднае прыватнае права рэгламентуе тыя грамадскія адносіны міжнароднага характару, удзельнікамі якіх з'яўляюцца фізічныя і юрыдычныя асобы (напрыклад, грамадзяне

Польшчы і Беларусі, прадпрыемства, створанае на падставе беларускага права, і прадпрыемства, створанае на падставе польскага права). Міжнароднае прыватнае права ў юрыдычнай літаратуры вельмі часта называецца канфліктным правам, таму што яно дазваляе вырашаць прававыя супярэчнасці, якія аб'ектыўна ўзнікаюць у выніку сутыкнення розных нацыянальных прававых сістэм.

Асноўнай і галоўнай крыніцай міжнароднага права з'яўляецца дагавор нарматыўнага зместу, разнавіднасцямі якога выступаюць статуты міжнародных арганізацый (напрыклад, Статут ААН, Статут Міжнароднай арганізацыі працы), пакты, канвенцыі і дэкларацыі (Пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, Дэкларацыя правоў асобы і грамадзяніна), іншыя шматбаковыя і двухбаковыя дагаворы. Сярод пашыраных крыніц міжнароднага права можна адзначыць таксама прававыя звычаі і прававыя прэцэдэнты, прававую дактрыну. Агульнапрызнаныя нормы міжнароднага права, якія згодна з паняційна-тэрміналагічнай традыцыяй, якая склалася ў міжнародным праве, адносяцца да крыніц міжнароднага права, існуюць звычайна ў форме прававога звычая.

Гэта самае адносіцца і да агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права. Агульнапрызнаныя прынцыпы таму і лічацца агульнапрызнанымі, што знайшлі сваё ўвасабленне альбо ў форме дагавораў (статутаў, пактаў, дэкларацый), альбо ў форме дактрынальных палажэнняў. А таму не існуе нейкага «паветранага» агульнапрызнанага прынцыпу міжнароднага права. Само агульнае прызнанне павінна быць нейкім чынам, у нейкай форме выказана. Вось гэтая форма і з'яўляецца па сутнасці крыніцай міжнароднага права ў тым сэнсе, у якім увогуле крыніца права разглядалася намі вышэй. Не можа і не павінна існаваць розных падыходаў да разумення крыніц права ў праве міжнародным і праве нацыянальным (унутрыдзяржаўным).

У юрыдычнай навуцы не існуе аднастайнага разумення як сутнасці, прыроды міжнароднага права, так і яго ўзаемаадносін з нацыянальным (унутрыдзяржаўным) правам. Маністычны падыход заснаваны на тым, што міжнароднае і нацыянальнае права ўтвараюць нейкае адзінае цэлае, але пры гэтым альбо нацыянальнае, альбо міжнароднае права валодаюць прыярытэтам (першынствам). Дуалістычны падыход грунтуецца на тым, што адначасова суіснуюць і ўзаемадзейнічаюць міжнародная і нацыянальная прававыя сістэмы. Кожная з іх мае адносна самастойны характар, яны ўздзейнічаюць адна на другую і ўзаемадзейнічаюць паміж сабой. Ніводная з іх не можа існаваць у адрыве ад другой, але яны не падпарад-

коўваюцца адна другой. Як маністычны, так і дуалістычны падыходы да ўзаемаадносін паміж міжнародным і нацыянальным правам маюць свае разнавіднасці.

6. Сістэма права і сістэма заканадаўства

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб нарматыўных прававых актах», які быў прыняты ў 2000 г., заканадаўства азначаецца як сістэма нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць грамадскія адносіны. У сваю чаргу, сістэму заканадаўства, як уяўляецца, гэтаксама, як і сістэму права, можна азначыць праз адзінства нарматыўных прававых актаў, а таксама іх падзел на нейкія структурныя часткі. Адзінства сістэмы заканадаўства вызначаецца найперш тым, што сістэма нарматыўных прававых актаў фармуецца пераважна дзяржавай, ствараецца адзінай сілай (дзяржавай) і падрымліваецца ў працоўным стане гэтай самай сілай. Адзінства дзяржаўнай волі забяспечвае адзінства сістэмы заканадаўства.

Паколькі ўсе дзеючыя ў грамадстве нормы права выкладаюцца ў некалькіх крыніцах права (прававы прэцэдэнт, прававы звычай і г. д.), то ва ўсёй сістэме нарматыўных прававых актаў, г. зн. сістэме заканадаўства, фармулюецца (змяшчаецца) толькі частка дзеючых у грамадстве норм права, тая частка норм права, якія «апрануты» ў форму самых розных відаў нарматыўных прававых актаў. Разам з тым, у нарматыўных прававых актах побач з правіламі паводзін, якія разлічаны на дакладна неакрэсленае кола асоб і неаднаразовае прымяненне, змяшчаюцца і нарматыўныя прадпісанні індывідуальнага прававога характару. З савецкіх часоў юрыдычная навука карыстаецца дактрынальным правілам, згодна з якім да нарматыўных прававых актаў адносяцца такія акты-дакументы, якія выдаюцца кампетэнтнымі органамі дзяржавы і службовымі асобамі, у якіх утрымліваецца (змяшчаецца) хаця б адна норма права. Дадзеныя акты-дакументы таксама ўключаюцца ў склад паняцця «сістэма заканадаўства».

Сказанае дазваляе сфармуляваць (паказаць) суадносіны паміж сістэмай права і сістэмай заканадаўства наступным чынам. Паміж сістэмай права і сістэмай заканадаўства існуе адзінства, але існуе і несупадзенне.

Адзінства паміж адзначанымі сістэмамі назіраецца ў тым, што сістэма заканадаўства з'яўляецца знешняй формай існавання сістэмы права. Без сістэмы заканадаўства і акрамя сістэмы заканадаўства большасць сучасных дзеючых сістэм права існаваць не ў ста-

не. Праз знешнюю форму свайго існавання сістэма права аказвае ўздзеянне на грамадскія адносіны, у сістэме заканадаўства яна знаходзіць сваё ўвасабленне.

Сістэма права і сістэма заканадаўства не супадаюць найперш па аб'ёму. Яны перасякаюцца. Супадзенне па аб'ёму назіраецца толькі ў той частцы, у якой дзеючыя ў грамадстве нормы пазітыўнага права фармулююцца менавіта ў нарматыўных прававых актах. Сістэма права без сістэмы заканадаўства не будзе поўнай, а ў рамана-германскай прававой сям'і сістэму права без сістэмы заканадаўства ўвогуле цяжка ўявіць.

У сістэмы права і сістэмы заканадаўства розныя першасныя элементы. Першасным элементам сістэмы права з'яўляецца норма права, а першасным элементам сістэмы заканадаўства – нарматыўны прававы акт. А паколькі норма права і нарматыўны прававы акт – гэта шчыльна знітаваныя, але ўсё ж розныя прававыя рэаліі, якія маюць розную прыроду і розны набор сутнасных і якасных прымет, то яны маюць розныя структурныя і функцыянальныя сувязі і аб'ядноўваюцца ў розныя структуры. Для сістэмы заканадаўства характэрна вертыкальная структура, якая складаецца пад уздзеяннем юрыдычнай сілы нарматыўных прававых актаў, якая, у сваю чаргу, вызначаецца пад значным уздзеяннем структуры органаў улады. У сістэме права такой структуры не існуе. Бо юрыдычную сілу норм права без юрыдычнай сілы крыніц права вызначыць нельга. Яна вызначаецца апасрэдавана.

Разам з тым у сістэме заканадаўства існуе гарызантальная структура, у якой выдзяляюцца галіны, падгаліны і інстытуты заканадаўства і якая шмат у чым супадае з галіновай структурай права. Але паміж гэтымі структурамі існуюць і несупадзенні. Далёка не кожная галіна права цалкам супадае з галіной заканадаўства. У галіновай структуры права не існуе комплексных утварэнняў (галін права), у той час як у гарызантальнай структуры права існуюць комплексныя галіны заканадаўства і нават нарматыўныя прававыя комплексы, да ліку якіх адносіцца, напрыклад, адміністрацыйнае заканадаўства.

Пытанні для самаправеркі

1. Што разумецца пад сістэмай права?
2. У чым праяўляюцца адзінства і падзел норм права на асобныя структурныя часткі?
3. Якім чынам у сістэме права фармуюцца розныя структуры права?

4. Як суадносяцца паміж сабой тэарэтыка-прававыя канструкцыі прававой сістэмы і сістэмы права?

5. Якія, на Вашу думку, фактары ўплываюць на своеасаблівасць сістэмы норм права ў розных прававых сістэмах?

6. Ці існуе прынцыповая розніца ў паняццях «сістэма права» і «сістэма норм права»?

7. Як суадносяцца паміж сабой тэарэтыка-прававыя канструкцыі «сістэма норм права» і «сістэма крыніц права»?

8. Абгрунтуйце своеасаблівасць кожнага з наступных паняццяў: «сістэма норм права»; «сістэма заканадаўства»; «сістэма нарматыўных прававых актаў»; «сістэма крыніц права».

9. Як суадносяцца паміж сабой паняцці «сістэмы норм права» і «сістэмы заканадаўства»?

10. Якія крытэрыі ляжаць у падмурку выдзялення асобных галін права?

11. Якія крытэрыі ляжаць у падмурку выдзялення асобных галін заканадаўства?

12. Ахарактарызуйце публічна-прыватную, матэрыяльна-працэсуальную і рэгулятыўна-ахоўную структуры права.

13. Чаму так сталася, што не кожная матэрыяльная галіна права мае сваю адметную працэсуальную галіну права?

14. Што ўяўляе сабой міжнароднае права, якія Вы ведаеце крыніцы міжнароднага права і як суадносяцца паміж сабой міжнароднае і нацыянальнае права?

15. На чым грунтуюцца сістэматызацыя і кадыфікацыя заканадаўства: на сістэме норм права ці на сістэме заканадаўства?

16. Абгрунтуйце суадносіны паняццяў «сістэма заканадаўства» і «сістэма крыніц права».

17. Як суадносяцца паміж сабой сістэма права і сістэма заканадаўства?

Тэма 14. ДЗЕЯННЕ ПРАВА І ЯГО КРЫНІЦ

1. Паняцце дзеяння права і яго крыніц.
2. Дзеянне нарматыўных прававых актаў у часе.
3. Дзеянне нарматыўных прававых актаў у прасторы.
4. Дзеянне нарматыўных прававых актаў па колу асобаў.
5. Дзеянне нарматыўных прававых актаў па прадмету рэгулявання.
6. Асаблівасці дзеяння міжнароднага права і міжнародных дагавораў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

1. Паняцце дзеяння права і яго крыніц

Вядома, што ў падмурку развіцця права знаходзяцца таварна-грашовыя адносіны, што сфера распаўсюджання права ў жыцці грамадства, па меншай меры, не можа быць больш вузкай, чым сфера гэтых грамадскіх адносін. Акрамя таго, права непазбежна пранікае, распаўсюджвае сваё дзеянне і на тыя пласты грамадскіх адносін, якія ў рэшце рэшт былі абумоўлены, «абавязаны» сваім паходжаннем таварна-грашовым адносінам. Можна сцвярджаць, што права прысутнічае там, дзе ёсць таварна-грашовыя адносіны, дзе ўзаемасувязі і ўзаемадзеянні ўдзельнікаў таварна-грашовых адносін будуюцца на эквівалентных (суразмерных) пачатках. Пашырэнне і павелічэнне ці звужэнне і змяншэнне таварна-грашовых пачаткаў у грамадскіх адносінах заканамерна прыводзіць да пашырэння і павелічэння ці звужэння і змяншэння сферы распаўсюджання права ў грамадскіх адносінах. Прававыя эквіваленты ў межах нацыянальных прававых сістэм, г. зн. у межах нацыянальнай прававой прасторы, фіксуюцца, замацоўваюцца і выкладаюцца ў разнастайных крыніцах права, а агульныя для некалькіх нацыянальных прававых сістэм прававыя эквіваленты (нормы права) фіксуюцца, замацоўваюцца і выкладаюцца ў двух- і шматбаковых пагадненнях – дагаворах, пактах, канвенцыях і г. д.

Пры гэтым у прававых эквівалентах, якія фармулюцца ў нормах права, замацоўваецца і выкладаецца далёка не ўся «прававая матэрыя», а толькі самая істотная, самая сутнасная, самая значная яе частка, тая частка, без якой немагчыма забяспечыць эквівалентную прыроду таварна-грашовых адносін. Астатняя частка, можна сказаць, «аб'ём прававой матэрыі», існуе і функцыянуе ў іншых формах – у форме прававой навукі, прававой культуры і г. д. Тая частка «прававой матэрыі», якая зафіксавана і замацавана ў нор-

мах права, складае своеасаблівае «прававое поле». Можна таксама сцвярджаць, што «прававое поле» ўяўляе сабой асвоеную нацыянальнымі суб'ектамі праватворчасці ў межах нацыянальнай прававой прасторы, а таксама дзяржавамі ў межах рэгіянальнай і сусветнай прававой прасторы частку нацыянальнай, рэгіянальнай і сусветнай прававой прасторы, г. зн. пэўны зрэз (пэўную частку) усёй «прававой матэрыі».

Распрацаванае ў агульнай тэорыі права вучэнне аб дзеянні нарматыўных прававых актаў у часе, прасторы і па колу асобаў грунтуецца на тэарэтычнай канструкцыі «прававога поля», прычым у асноўным нацыянальнага прававога поля. Але дзеянне права не можа быць зведзена да дзеяння нарматыўных прававых актаў, таму што ў нарматыўных прававых актах адлюстроўваецца, фіксуецца і замацоўваецца дзеянне толькі часткі нацыянальнага прававога поля. Адлюстраванне, фіксаванне і замацаванне ўсяго нацыянальнага прававога поля ажыццяўляецца ўсёй сістэмай крыніц права, якія ўласцівы нацыянальнай прававой сістэме. Калі ж размова ідзе пра дзеянне права ўвогуле, г. зн. пра яго функцыянаванне ў якасці асобнай сацыяльнай рэальнасці, то яно ўключае ў сябе ўсе формы развіцця і праяў права, г. зн. прававых адносін і прававой свядомасці.

Доўгі час юрыдычная навука і практыка ўвогуле не цікавіліся пытаннямі дзеяння права і яго крыніц. На самых першасных этапах развіцця права, калі асноўнымі яго крыніцамі былі прававы звычай і прававы прэцэдэнт, права дзейнічала як бы «само па сабе». Тэрыторыя распаўсюджання права абмяжоўвалася тэрыторыяй пражывання нейкай супольнасці, якая кіравалася выпрацаванымі ёй прававымі звычаямі і прававымі прэцэдэнтамі. Кожная асоба супольнасці кіравалася ў сваім жыцці правам супольнасці. Час існавання права і яго крыніц вызначаўся простымі патрэбамі супольнасці ў іх. Адны прававыя звычаі і прэцэдэнты адміралі, можна сказаць, паступова «засыналі», таму што ў іх не было патрэбы, а на месцы старога права паступова, эвалюцыйна ўзнікала новае права.

Два моцныя фактары паўплывалі на неабходнасць вывучэння і замацавання правіл дзеяння права і яго крыніц. Першы фактар – сутыкненне розных прававых сістэм старажытнага права. Гэты фактар прымусіў дзяржавы заключаць дагаворы нарматыўнага зместу і вызначаць межы іх дзеяння на сваёй уласнай тэрыторыі. Другі фактар – пераўтварэнне дзяржаўнай улады ў асноўнага стваральніка норм права. Ён абумовіў неабходнасць вызначэнне межаў дзеяння нарматыўных прававых актаў і ўсіх астатніх крыніц нацыянальнага права.

У юрыдычнай навуцы выкарыстоўваюцца дзве вельмі падобныя, але не супадаючыя тэарэтыка-прававыя канструкцыі – межаў дзеяння нарматыўна-прававых актаў і межаў дзеяння норм права. Чаму так атрымалася? Справа ў тым, што ў рэальным жыцці назіраюцца сітуацыі, калі, напрыклад, пэўны нарматыўны прававы акт працягвае сваё дзеянне, а асобныя, змешчаныя ў ім нормы права змяняюцца ці адмяняюцца. Назіраюцца і адваротныя сітуацыі, калі пэўны нарматыўны прававы акт губляе сваю юрыдычную сілу ва ўстаноўленым парадку, але асобныя нормы права, якія былі ў ім змешчаны, працягваюць сваё існаванне і дзеянне, праўда, у іншай форме. Такое мы назіраем, напрыклад, у выпадку замацавання норм права, выкладзеных першапачаткова ў адным акце, у іншым нарматыўным прававым акце, які рэгулюе тыя самыя грамадскія адносіны. На наш погляд, пры вывучэнні дзеяння права ўвогуле і яго крыніц у прыватнасці, якія ажыццяўляюцца ў агульнай тэорыі права, больш правільна карыстацца тэарэтыка-прававой канструкцыяй «межаў дзеяння нарматыўна-прававых актаў», якая перасякаецца з канструкцыяй «межаў дзеяння норм права», але не з'яўляецца тоеснай. Справа ў тым, што практычна ў кожнай з вядомых нам прававых сістэм адначасова дзейнічаюць і дапаўняюць адна другую нормы права, якія змешчаны ў розных крыніцах права. Пры гэтым яны маюць агульнаабавязковае значэнне і не падзяляюцца па ступені значнасці на «першасныя» і «другасныя».

Але ў любой прававой сістэме ўстанаўліваецца строгая іерархія паміж крыніцамі норм права. Пры гэтым у вядучых крыніцах норм права ўстанаўліваюцца агульныя для ўсёй прававой сістэмы правілы функцыянавання крыніц права, у тым ліку і правілы дзеяння ў часе, у прасторы і па колу асобаў. А паколькі ў рамана-германскай прававой сям'і, да ліку якой па асноўных сваіх параметрах адносіцца і прававая сістэма Рэспублікі Беларусь, такой крыніцай з'яўляецца нарматыўны прававы акт, то тэарэтыка-прававая канструкцыя «межы дзеяння нарматыўных прававых актаў» мае пераважнае значэнне пры выкарыстанні перш-наперш у агульнай тэорыі права. Пры гэтым у галіновых юрыдычных навуках цалкам магчыма выкарыстанне канструкцыі «межаў дзеяння норм права», якая, на нашу думку, з'яўляецца вытворнай ад канструкцыі «межаў дзеяння нарматыўных прававых актаў».

Акрамя гэтага, трэба мець на ўвазе і тое, што дзеянне нормы права з дакладнасцю можа быць вызначана і ўстаноўлена толькі праз удакладненне і высвятленне дзеяння нарматыўнага прававога акта і іншых крыніц права, у якіх змяшчаюцца нормы права і праз

фармуляванне ў якіх яны толькі і набываюць агульнаабавязковае значэнне. Такім чынам, пры супастаўленні гэтых тэарэтыка-прававых канструкцый аказваецца, што паняцце дзеяння нарматыўнага прававога акта з'яўляецца вызначальным, бо толькі праз форму існавання можна высветліць межы дзеяння норм права.

Трэба мець на ўвазе і тое, што час дзеяння нарматыўнага прававога акта і час дзеяння нормы права – гэта толькі адныя з параметраў «вымярэння» іх юрыдычнага дзеяння. Што тычыцца вызначэння юрыдычнага дзеяння нарматыўнага прававога акта і нормы права на пэўнай тэрыторыі і адносна пэўнага кола асобаў, то гэтыя параметры высвятляюцца шмат у чым дзякуючы знаёмству выключна з фармальна-юрыдычнымі вымярэннямі нарматыўнага прававога акта, тымі параметрамі, якія тычацца юрыдычнага афармлення тэксту нарматыўнага прававога акта, напрыклад, назвы органа, які прыняў той ці іншы нарматыўны прававы акт. Гэта абставіна з'яўляецца яшчэ адным з аргументаў на выкарыстанне ў агульнай тэорыі дзяржавы і права менавіта канструкцыі «межаў дзеяння нарматыўнага прававога акта».

Важнай акалічнасцю ў дадатак да вышэйпрыведзеных аргументаў з'яўляецца наступнае. Вядома, што нарматыўныя прававыя акты, як, дарэчы, і іншыя крыніцы норм права, – гэта афіцыйныя сродкі, з дапамогай якіх у дзеючую прававую сістэму, сістэму норм права Рэспублікі Беларусь уключаюцца ў адпаведным парадку новыя правы і з дапамогай якіх з прававой сістэмы выключаюцца непатрэбныя, састарэлыя ці страціўшыя сваё значэнне нормы права. Прычым калі ўвядзенне ў прававую сістэму нейкіх новых норм права можа ажыццяўляцца ў роўнай ступені з дапамогай усіх афіцыйна прызнаных у нашай дзяржаве крыніц права, то іх вывядзенне з прававой сістэмы ажыццяўляецца пераважна, а ў асобных выпадках (калі гэта, напрыклад, тычыцца саміх нарматыўных прававых актаў) – і выключна з дапамогай нарматыўных прававых актаў.

Такім чынам, атрымліваецца, што толькі з дапамогай вызначэння і «вымярэння» менавіта межаў дзеяння нарматыўнага прававога акта магчыма вызначыць межы дзеяння абсалютна ўсіх дзеючых у прававой сістэме Рэспублікі Беларусь норм права, як тых, што ўтрымліваюцца ў нарматыўных прававых актах, так і тых норм права, якія змяшчаюцца ў іншых крыніцах права.

Няма такога нарматыўнага прававога акта (як, дарэчы, і іншай крыніцы норм права), які б існаваў (дзейнічаў) вечна, распаўсюджваў бы сваё дзеянне на ўвесь свет і быў бы абавязковым для ўсіх суб'ектаў права незалежна ад таго, да якой дзяржавы яны нале-

жаць. Таму для навуковых і практычных патрэбаў, для практыкі праватворчасці і правапрымянення вельмі важнае значэнне набываюць пытанні аб тым, калі змешчаныя ў нарматыўным прававым акце нормы права набываюць сваё юрыдычнае значэнне для ўсіх суб'ектаў прававых адносін і калі яны губляюць гэтую значнасць. Не меншае значэнне маюць і пытанні аб тым, на якое кола ўдзельнікаў прававых адносін распаўсюджваюць сваё дзеянне тыя ці іншыя нарматыўныя прававыя акты, бо ад гэтага залежаць аб'ём і змест суб'ектыўных праў і юрыдычных абавязкаў удзельнікаў прававых адносін. Акрамя гэтага, кожная дзяржава мае сваю тэрыторыю, і таму для рэальнага ўвасаблення ў жыццё норм права, практыкі правапрымянення асаблівую значнасць набываюць пытанні аб тым, дзейнічае ці не дзейнічае пэўны нарматыўны прававы акт на той тэрыторыі, дзе знаходзяцца ўдзельнікі прававых адносін і дзе ажыццяўляюцца рэалізацыя і прымяненне норм права, якія ўтрымліваюцца ў пэўным нарматыўным прававым акце.

Усе гэтыя праблемы, звязаныя з функцыянаваннем нарматыўнага прававога акта, з вызначэннем часу яго дзеяння, той тэрыторыі, на якой ён можа быць рэалізаваны, і з вызначэннем кола суб'ектаў прававых адносін, для якіх нарматыўны прававы акт мае абавязковае значэнне, абазначаюцца ў юрыдычнай навуцы агульным паняццем межаў дзейнасці нарматыўных прававых актаў. Каб акрэсліць гэтыя межы, трэба ведаць дакладна: а) калі нарматыўны прававы акт набывае сваё юрыдычна абавязковае значэнне, гэта значыць уступае ў юрыдычную сілу, і калі ён губляе сваю значымасць, гэта значыць страчвае юрыдычную сілу; б) дзейнічае ці не дзейнічае той ці іншы нарматыўны прававы акт на ўсёй тэрыторыі дзяржавы ці пэўнай частцы тэрыторыі дзяржавы; в) адносна якіх удзельнікаў прававых адносінаў (суб'ектаў права) маюць абавязковае значэнне нормы права, змешчаныя ў пэўным нарматыўным прававым акце; г) на якія па характару (зместу) грамадскія адносіны распаўсюджвае сваё дзеянне пэўны нарматыўны прававы акт; д) маюць ці не маюць абявязковае значэнне для ўладкавання пэўных грамадскіх адносін нормы міжнароднага права.

Паколькі дакладныя адказы на гэтыя пытанні маюць вялізнае значэнне для нармальнага функцыянавання прававой сістэмы грамадства, няма нічога дзіўнага ў тым, што здаўна навукоўцы і практыкі імкнуліся сфармуляваць дакладныя і аднастайныя адказы на іх, больш таго, замацаваць гэтыя адказы ў выглядзе фармальна азначаных і акрэсленых правіл, норм права. У старажытнасці гэтыя правілы фармуляваліся ў выглядзе пэўных прававых аксіём, напрык-

лад: lex posterior deroqat lex prior – пазнейшы закон адмяняе закон папярэдні; lex prospicit, non respicit – закон «глядзіць наперад», ён не дзейнічае ў зваротным кірунку; lex specialis deroqat lex qeneralis – спецыяльны закон адмяняе дзеянне закону агульнага; lex de futuro; judex de praeterio – закон дзейнічае на будучае, а суддзя разглядае мінулае.

Практычна ўсе сучасныя прававыя сістэмы рамана-германскай прававой сям'і замацоўваюць гэтыя правілы ў спецыялізаваных законах, а частку з іх нават у Асноўным законе дзяржавы – Канстытуцыі. У Рэспубліцы Беларусь межы дзеяння нарматыўных прававых актаў урэгуляваны ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь; Дэкрэце Прэзідэнта «Аб зацвярджэнні Палажэння аб афіцыйным апублікаванні і ўступленні ў сілу прававых актаў Рэспублікі Беларусь» (у рэдакцыі Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30.09.1999 г. № 38, Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 13.12.2000 г. № 671); Законе Рэспублікі Беларусь «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь» (у рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь ад 04.01.2002 г. № 81-З); Законе Рэспублікі Беларусь «Аб міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь» (у рэдакцыі ад 16.06.2000 г. № 401-З).

Практычна ў кожным спецыялізаваным нарматыўнам прававым акце кадыфікаванага тыпу, які ўзначальвае тую ці іншую галіну права і заканадаўства, напрыклад, Крымінальным ці Грамадзянскім кодэксе Рэспублікі Беларусь, таксама ўтрымліваюцца спецыяльныя нормы права, якія ўдакладняюць і канкрэтызуюць агульныя для ўсёй сістэмы нарматыўных прававых актаў межы дзеяння нарматыўных прававых актаў. Мае сваё значэнне для Рэспублікі Беларусь і шэраг міжнародных дакументаў, асабліва ў плане вызначэння ўзаемадзеяння крыніц міжнароднага права і нацыянальных нарматыўных прававых актаў, напрыклад, Венская канвенцыя аб дыпламатычных адносінах ад 18 красавіка 1961 г., Венская канвенцыя аб праве міжнародных дагавораў ад 23 мая 1969 г.

2. Дзеянне нарматыўных прававых актаў у часе

Дзеянне права ў часе пачынаецца задоўга да таго, як яно будзе замацавана ў выглядзе пэўных норм права ў нарматыўных прававых актах ці іншых крыніцах права. У гэтым сэнсе можна сцвярджаць, што права папярэднічае нарматыўнаму прававому акту і што менавіта права «падштурхоўвае» заканадаўца ў шырокім сэнсе слова да замацавання прававых эквівалентаў у нарматыўных права-

вых актах. І толькі пасля гэтага актуалізуецца пытанне аб дзеянні ў часе ўжо ўласна нарматыўнага прававога акта, які выдадзены ва ўстаноўленым парадку кампетэнтным органам дзяржавы.

Разам з тым буйныя, эпахальныя па сваёй значнасці нарматыўныя прававыя акты працягваюць «сваё жыццё» і пасля таго, як яны страчваюць сваю юрыдычную сілу ва ўстаноўленым законам парадку. Гэта тычыцца найперш канстытуцыйных нарматыўных актаў і кодэксаў, у якіх былі замацаваны вузлавыя прававыя каштоўнасці і тэарэтыка-прававыя канструкцыі высокай ступені абагульненасці. Праўда, яны працягваюць існаваць і дзейнічаць у прававой сістэме грамадства ў нейкай іншай форме – у форме прававой свядомасці, прававой культуры і прававой навукі. На прыкладзе дзеяння нарматыўнага прававога акта, разгледжанага ў шчыльнай сувязі з іншымі часткамі прававой сістэмы, мы можам, такім чынам, назіраць своеасаблівае «перацяканне» адной формы «прававой матэрыі» ў іншую форму. Адзначым, што дадзены аспект (ці зрэз) дзеяння права практычна не даследаваны ў юрыдычнай навуцы і патрабуе свайго даследчыка.

Дзеянне нарматыўнага прававога акта ў часе вызначаецца шляхам удакладнення двух асноўных момантаў: а) часу набыцця нарматыўным прававым актам юрыдычнай сілы (ці ўступленнем у сілу) і б) часу страты нарматыўным прававым актам сваёй юрыдычнай сілы.

Разгледзім спачатку парадак набыцця нарматыўным прававым актам юрыдычнай сілы.

Давядзенне нарматыўнага прававога акта да ведама адрасатаў з'яўляецца аб'ектыўна неабходнай умовай яго рэалізацыі. Аднак спосабы азнаямлення суб'ектаў права з актам могуць быць рознымі. Шмат у чым яны залежаць ад склаўшыхся ў грамадстве спосабаў перадачы інфармацыі. Напрыклад, у Расіі ў другой палове XIX стагоддзя абавязак па давядзенню акта да ведама быў ускладзены на губернскія праўленні і яго ўстановы. Маніфесты і ўказы цара зачытваліся пасля Божаскай літургіі і ў цэрквах па ўзгадненню з духоўным начальствам, і на гарадскіх плошчах, а ў паветах – на мірскіх сходах і на гандлёвых плошчах гарадоў, пасадаў, мястэчак і паселішчаў. Друкаваліся яны і ў губернскіх ведамасцях.

У агульнай тэорыі дзяржавы і права выдзяляюцца і разглядаюцца некалькі спосабаў уступлення нарматыўнага прававога акта ў юрыдычную сілу. Праўда, усе яны так ці інакш групуюцца вакол трох асноўных момантаў, што характарызуць само дзеянне нарматыўнага прававога акта ў часе: факта непасрэднага прыняцця нар-

матыўнага прававога акта; факта давядзення (шляхам апублікавання ці нейкім іншым чынам) зместу нарматыўнага прававога акта да карыстальнікаў і прымяняльнікаў; факта часу, які звычайна патрэбны для давядзення зместу нарматыўнага прававога акта да суб'ектаў права. Пры гэтым у кожнай асобнай дзяржаве пад уздзеяннем самых розных фактараў устанаўліваюцца і нарматыўна замацоўваюцца найбольш зручныя для яе прававой сістэмы і сістэмы заканадаўства спосабы ўступлення прававых актаў у юрыдычную сілу, спосабы давядзення актаў заканадаўства да ведама асоб, якім ён адрасаваны.

У Рэспубліцы Беларусь у актыкуле 65 Закону «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь» нарматыўна замацаваны наступныя з іх: а) акт набывае сілу пасля яго прыняцця; б) акт набывае сілу пасля ўключэння яго ў Нацыянальны рэестр прававых актаў; в) акт набывае сілу пасля яго афіцыйнага публікавання; г) акт уступае ў сілу пасля пэўнага тэрміну з моманту яго афіцыйнага апублікавання; д) акт набывае юрыдычную сілу пасля афіцыйнага апублікавання і тэрміну, які быў прадугледжаны пры прыняцці акта; е) акт уступае ў сілу пасля афіцыйнага апублікавання па частках.

Набыццё актам юрыдычнай сілы пасля яго прыняцця. Аб тым, што акт уступае ў сілу з моманту прыняцця, звычайна ўказваецца ў самім акце ці акце аб увядзенні яго ў дзеянне.

Дадзены спосаб уступлення нарматыўнага прававога акта ў юрыдычную сілу звязваецца з асноўнай стадыяй нарматворчага працэсу – з рашэннем аб прыняцці акта. Пры гэтым рашэнне аб прыняцці нарматыўнага прававога акта павінна быць нейкім чынам выказана знешне, дзеля таго, каб яно набыло юрыдычнае значэнне. Знешняй праявай рашэння можа быць факт падпісання нарматыўнага прававога акта кампетэнтнай службовай асобай, калі размова ідзе аб адзіначальных органах, ці знешне зафіксаваны факт падвядзення вынікаў галасавання кампетэнтнага органа дзяржавы, калі размова ідзе аб калегіяльных органах. У гэтых выпадках нарматыўны прававы акт, які прымаецца кампетэнтным праватворчым органам, адразу ж набывае юрыдычную сілу і, такім чынам, параджае юрыдычныя наступствы для ўсіх суб'ектаў права, на якія ён распаўсюджвае сваё дзеянне.

Практыка нарматворчасці ў Рэспубліцы Беларусь сведчыць аб тым, што часцей за ўсё з момантам прыняцця звязваецца ўступленне ў юрыдычную сілу такіх нарматыўных прававых актаў, якія маюць унутранае значэнне для арганізацыі і дзеяння пэўных органаў дзяржавы ці іх сістэмы. Так, напрыклад, згодна з часткай 3 арты-

кула 65 Закону «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь» пастановы палат Парламента – Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь уступаюць у сілу з моманту іх прыняцця, калі іншае не прадугледжана ў саміх пастановах.

Набыццё актам юрыдычнай сілы пасля ўключэння яго ў Нацыянальны рэестр прававых актаў. Дадзены спосаб набыцця нарматыўным прававым актам юрыдычнай сілы прадугледжаны ў артыкуле 65 Закону «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь» і п. 12 «Палажэння аб афіцыйным апублікаванні і ўступленні ў сілу прававых актаў Рэспублікі Беларусь». Сэнс яго ў тым, што ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастановы Савета Міністраў і іншыя прававыя акты, за выключэннем законаў і дэкрэтаў, а таксама нарматыўных прававых актаў, якія тычацца правоў, свабод і абавязкаў грамадзян, уступаюць у дзеянне з дня іх уключэння ў Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, калі ў гэтых актах не ўстаноўлены іншы тэрмін. Гэты спосаб можна лічыць у пэўным сэнсе разнавіднасцю першага з адзначаных спосабаў уступлення нарматыўнага прававога акта ў юрыдычную сілу. Чаму? Таму што ўключэнне ў Нацыянальны рэестр не азначае яго апублікавання ў выданні Нацыянальнага рэестра. Паміж уключэннем акта ў рэестр і яго апублікаваннем ёсць пэўны прамежак часу, калі акт яшчэ не даведзены да ведама карыстальнікаў і таму знаходзіцца фактычна ў «непрацуючым стане».

Разгледжаныя спосабы надання нарматыўнаму прававому акту юрыдычнай значнасці з'яўляюцца не самымі лепшымі, таму што суб'екты права, да якіх ён адрасаваны, рэальна ў сваёй дзейнасці не могуць кіравацца нормамі права, бо іх змест ім яшчэ невядомы і акты яшчэ не даведзены да іх ведама. У дадзеным выпадку мы назіраем сітуацыю, калі акт з фармальна-юрыдычнага пункту гледжання ўжо ўступіў у дзеянне, але рэальна дзейнічаць яшчэ не можа. Гэта своеасаблівы «перыяд бяздзеяння» акта. Разам з тым у жыцці грамадства і дзяржавы здараюцца выпадкі, калі патрабуюцца хуткія дзеянні па стварэнню і ўвядзенню ў дзеянне новых норм права ці адмене састарэлых. У гэтых сітуацыях, як сведчыць практыка, хутчэй за ўсё і карыстаюцца дадзенымі спосабамі надання нарматыўнаму прававому акту юрыдычнай сілы.

Уступленне акта ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання. Артыкулам 7 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замацавана правіла, паводле якога нарматыўныя прававыя акты дзяржаўных органаў павінны быць апублікаваны ці даведзены да ўсеагульнага ведама іншым шляхам, які прадугледжаны ў законе. Дадзенае прави-

ла канкрэтызуецца ў артыкуле 62 Закона «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь» і ў артыкуле 7 «Палажэння аб афіцыйным апублікаванні і ўступленні ў сілу прававых актаў Рэспублікі Беларусь», зацверджанага Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Пры гэтым сэнс канкрэтызацыі зводзіцца да таго, што, па-першае, нарматыўныя прававыя акты павінны быць не проста апублікаванымі, а быць афіцыйна апублікаванымі, па-другое, пад афіцыйным апублікаваннем разумеецца давядзенне прававых актаў да ўсеагульнага ведама шляхам узнаўлення іх тэкстаў у поўнай адпаведнасці з падпісанымі арыгіналамі, і, па-трэцяе, пад афіцыйным апублікаваннем нарматыўных прававых актаў разумеецца давядзенне іх да ўсеагульнага ведама шляхам узнаўлення арыгінала тэксту нарматыўнага прававога акта ў дакладна пералічаных афіцыйных выданнях.

Адначасова з гэтым для кожнага віду нарматыўных прававых актаў названым Дэкрэтам Прэзідэнта былі вызначаны канкрэтныя і дакладныя афіцыйныя выданні, а таксама замацавана правіла, згодна з якім датай афіцыйнага апублікавання трэба лічыць дату выхаду ў свет афіцыйнага выдання, у якім змешчаны нарматыўны прававы акт. Калі нарматыўны прававы акт апублікаваны ў некалькіх афіцыйных выданнях, то дата афіцыйнага апублікавання і тэрмін уступлення нарматыўнага прававога акта ў сілу вызначаюцца па даце першапачатковага апублікавання.

У Рэспубліцы Беларусь дзейнічае правіла, згодна з якім асобная катэгорыя нарматыўных прававых актаў незалежна ад іх віду набывае юрыдычную сілу толькі пасля іх афіцыйнага апублікавання. Гэта правіла адносіцца да тых нарматыўных прававых актаў, якія тычацца правоў, свабод і абавязкаў грамадзян. Пры гэтым, як правіла, акты публікуюцца пасля ўключэння іх у Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь.

Як сведчыць вопыт функцыянавання прававой сістэмы Рэспублікі Беларусь, часцей за ўсё з момантам афіцыйнага апублікавання звязваецца ўступленне ў юрыдычную сілу такіх нарматыўных прававых актаў, як дэкрэты і ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а таксама пастановы Савета Міністраў. У той жа час у айчыннай юрыдычнай літаратуры справядліва падкрэсліваецца, што ўвядзенне ў дзеянне нарматыўнага прававога акта з моманту яго апублікавання не забяспечвае суб'ектам права магчымасці своечасовага азнаямлення з новымі нормамі права, і таму такую практыку нельга лічыць прымальнай.

У сучасных умовах у шырокі ўжытак увайшло распаўсюджанне прававой інфармацыі праз разнастайныя сістэмы электроннага распаўсюджвання інфармацыі, якія лічацца адным з асноўных элементаў інфраструктуры прававой дзяржавы і ключавым момантам фармавання цывільнай супольнасці. Было выказана меркаванне, што далейшае развіццё электронных сродкаў инфармацыі і сістэм электроннага распаўсюджання прававой інфармацыі прывядзе ў недалёкім будучым да таго, што ў якасці афіцыйнага абнародавання (ці апублікавання) нарматыўнага прававога акта будзе разглядацца і яго перадача па электронных носьбітах інфармацыі. Можна пагадзіцца з гэтым і дадаць, што ў Рэспубліцы Беларусь ужо зроблены важны крок у дадзеным кірунку. Размова ідзе аб тым, што згодна з артыкулам 60 Закону «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь» нарматыўныя прававыя акты павінны прадстаўляцца ў Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі для ўключэння іх у Нацыянальны рэестр прававых актаў у выглядзе сапраўдных копій арыгінала на папяровых носьбітах і адначасова ў *выглядзе тэкставых файлаў на магнітных носьбітах* (падкрэслена аўтарам. – М.С.). Наступнымі крокамі павінна быць наданне гэтым копіям аднолькавай юрыдычнай значнасці і нарматыўнае замацаванне правіла аб тым, што змяшчэнне копіі нарматыўнага прававога акта ў Нацыянальным рэестры прававых актаў з'яўляецца яго афіцыйным апублікаваннем.

Набыццё актам юрыдычнай сілы пасля пэўнага тэрміну з моманту афіцыйнага апублікавання. У юрыдычнай літаратуры справядліва прызнана, што найбольш мэтазгодным лічыцца той варыянт уступлення актаў у юрыдычную сілу, пры якім устанаўліваецца пэўны тэрмін пасля яго апублікавання (т. зв. vokatio leqis), які неабходны для азнаямлення зацікаўленых суб'ектаў са зместам акта, таму што пры такім варыянце павышаецца эфектыўнасць рэгулявання грамадскіх адносін. У артыкуле 104 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь устаноўлена агульнае правіла, згодна з якім законы і дэкрэты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь павінны быць адразу ж апублікаваны і ўступаюць у дзеянне праз дзесяць дзён пасля іх афіцыйнага апублікавання, калі ў самім законе ці дэкрэце не ўстаноўлены іншы тэрмін уступлення ў сілу.

Уступленне акта ў юрыдычную сілу пасля афіцыйнага апублікавання і пэўнага тэрміну, які быў прадугледжаны пры прыняцці акта. Тэрмін уступлення нарматыўнага прававога акта ў юрыдычную сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання можа быць вызначаны ў тэксце нарматыўнага прававога акта ці ў спецыяльным нар-

матыўным прававым акце, у якім прадугледжваюцца і рэгламентуюцца ўсе пытанні, якія звязаны з ўвядзеннем у дзеянне новага нарматыўнага прававога акта. Практыка нарматворчасці сведчыць аб тым, што вялікія па аб'ёму і прынцыпова новыя па зместу нарматыўныя прававыя акты кшталту кодэксаў для эфектыўнага выкарыстання і прымянення патрабуюць пэўнага часу для таго, каб суб'екты права і асабліва правапрымяняльнікі добра іх вывучылі. Менавіта па гэтай прычыне такія нарматыўныя прававыя акты ўводзяцца ў юрыдычную сілу праз некалькі месяцаў ці нават гадоў пасля іх прыняцця ці апублікавання.

Набыццё актам юрыдычнай сілы пасля афіцыйнага апублікавання па частках. Па самых розных прычынах нейкія асобныя, як правіла, складаныя і аб'ёмныя нарматыўныя прававыя акты, могуць быць уведзены ў дзеянне па частках. Пры гэтым уступленне ў дзеянне асобных артыкулаў, главаў ці раздзелаў нарматыўнага прававога акта звязваецца з наступленнем нейкіх фактычных абставінаў ці з наступленнем пэўнай каляндарнай даты.

У агульнай тэорыі права былі падрабязна даследаваны і абгрунтаваны наступныя чатыры спосабы страты нарматыўным прававым актам юрыдычнай сілы і, такім чынам, спынення яго дзеяння: а) простая (прамая) адмена нарматыўнага прававога акта; б) фактычная адмена дзеяння нарматыўнага прававога акта; в) сканчэнне тэрміну, на які быў прыняты нарматыўны прававы акт, калі гэты тэрмін быў устаноўлены пры прыняцці нарматыўнага прававога акта; г) змена абставінаў, знікненне тых грамадскіх адносін, дзеля рэгулявання якіх быў выдадзены нарматыўны прававы акт.

Частка гэтых спосабаў у дачыненні да беларускай прававой сістэмы была нарматыўна замацавана ў артыкуле 69 Закона «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь». У дадзеным артыкуле Закону спосабы страты нарматыўным прававым актам юрыдычнай сілы былі сфармуляваны і пералічаны ў наступным парадку: сканчэнне тэрміну, на які быў разлічаны часовы акт (ці яго частка); прызнанне нарматыўнага прававога акта (яго часткі) неканстытуцыйным ва ўстаноўленым законам парадку; прызнанне нарматыўнага прававога акта (яго часткі) страціўшым сілу; адмена нарматыўнага прававога акта ў выпадках, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

Разгледзім спачатку нарматыўна замацаваныя ў Рэспубліцы Беларусь спосабы страты нарматыўным прававым актам юрыдычнай сілы, а затым тыя спосабы, якія не знайшлі свайго нарматыўнага адлюстравання, больш падрабязна.

Сканчэнне тэрміну, на які быў разлічаны часовы акт (ці яго частка). Звычайна нарматыўныя прававыя акты прымаюцца (уводзяцца ў дзеянне) без указання дакладнага тэрміну іх дзеяння, таму адно з агульных правілаў, сфармуляваных у тэорыі права, гучыць наступным чынам: нарматыўны прававы акт дзейнічае бестэрмінова, калі ў яго тэксце не агаворана іншае. Тэрміновым нарматыўным прававым актам лічыцца той акт, у тэксце якога (ці яго частцы) указаны дакладны тэрмін (звычайна каляндарны) дзеяння альбо нейкая падзея, пры наступленні якой нарматыўны прававы акт страчвае сваю сілу. Пры гэтым, як сведчыць практыка заканатворчасці, дакладны тэрмін дзеяння нейкага нарматыўнага прававога акта можа быць устаноўлены ці адносна нарматыўнага прававога акта цалкам, ці адносна яго нейкай часткі, альбо нават адносна асобнага нарматыўнага прадпісання. Пасля сканчэння тэрміну дзеяння ці пасля наступлення прадугледжанай падзеі нарматыўны прававы акт (яго частка, асобнае прадпісанне) страчвае сваю сілу аўтаматычна.

Разам з тым яшчэ да сканчэння ўстаноўленага тэрміну дзеяння нарматыўнага прававога акта адпаведны дзяржаўны орган (ці службовая асоба), які выдаў (прыняў) нарматыўны прававы акт, можа прыняць рашэнне аб працягу дзеяння нарматыўнага прававога акта (ці яго часткі) на новы тэрмін альбо надаць яму бестэрміновы характар дзеяння.

Прызнанне нарматыўнага прававога акта (яго часткі) неканстытуцыйным ва ўстаноўленым законам парадку. Дадзены спосаб страты юрыдычным нарматыўным прававым актам сваёй юрыдычнай сілы можна лічыць адносна новым для прававой сістэмы Рэспублікі Беларусь. Ён з'явіўся пасля таго, як у беларускую прававую сістэму быў уведзены спецыяльны інстытут канстытуцыйнай юстыцыі, а ў структуры органаў вышэйшай дзяржаўнай улады нашай краіны быў у 1994 годзе ўпершыню створаны Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь. Менавіта на дадзены орган улады быў ускладзены абавязак па ажыццяўленню кантролю за канстытуцыйнасцю нарматыўных прававых актаў у дзяржаве. Дакладныя паўнамоцтвы Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантролю за канстытуцыйнасцю нарматыўных прававых актаў замацаваны ў артыкуле 116 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і Законе «Аб Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь». Згодна з імі Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь мае права правяраць на адпаведнасць Канстытуцыі абсалютна ўсе нарматыўныя прававыя акты, выдаваемыя ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама ўсе міжнародныя дагаворныя і іншыя абавязкі Рэспублікі Беларусь.

Нарматыўныя прававыя акты ці іх асобныя палажэнні, якія прызнаюцца Канстытуцыйным Судом неканстытуцыйнымі, страчваюць сваю сілу ў парадку, які вызначаецца законам.

Прызнанне нарматыўнага прававога акта (яго часткі) страціўшым сілу. Гэты спосаб страты нарматыўным прававым актам юрыдычнай сілы характарызуецца тым, што кампетэнтныя органы дзяржавы, якія маюць права на выданне (прыняцце) нарматыўных прававых актаў, дакладна ўказваюць на тыя нарматыўныя прававыя акты, якія спыняюць сваё дзеянне з пэўнага тэрміну (даты) ці з наступленнем пэўнага факта. Часцей за ўсё гэта робіцца тады, калі прымаецца і ўводзіцца ў дзеянне новы нарматыўны прававы акт. Адначасова з гэтай працэдурай кампетэнтны орган дзяржавы дае пералік тых нарматыўных прававых актаў, якія страчваюць сваё дзеянне поўнасцю ці часткова, а таксама патрабуе, каб іншыя кампетэнтныя, часцей за ўсё ніжэйстаячыя праватворчыя органы, прывялі свае нарматыўныя прававыя акты ў адпаведнасць з новым актам. У артыкуле 59 Закону Рэспублікі Беларусь «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь» замацавана патрабаванне аб тым, каб пералік актаў заканадаўства ці іх частак, якія падлягаюць прызнанню страціўшымі сілу, змяненню і (ці) дапаўненню ў сувязі з прыняццем (выданнем) нарматыўнага прававога акта, утрымліваўся ў асобным раздзеле самаго акта ці ў дадатках да яго. Калі маецца значная колькасць такіх актаў ці іх частак, іх пералік павінен афармляцца ў выглядзе самастойнага праекта і прадстаўляцца адначасова з праектам асноўнага акта.

Аднак працэдура прамой адмены дзеяння нарматыўных прававых актаў можа выкарыстоўвацца і выкарыстоўваецца «сама па сабе» ў мэтах так званай «расчысткі» сістэмы заканадаўства ад састарэлых нарматыўных прававых актаў. Звычайна гэта адбываецца пры правядзенні агульнадзяржаўнай сістэматызацыі нарматыўных прававых актаў і прымяркоўваецца да выдання, напрыклад, Зводу законаў ці іншых сістэматызаваных выданняў.

Адмена нарматыўнага прававога акта ў выпадках, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь. Гэты спосаб страты нарматыўным прававым актам юрыдычнай сілы вынікае з агульнага іерархічнага прынцыпу пабудовы дзяржаўнага апарату, згодна з якім усе распараджэнні вышэйстаячага органа дзяржаўнай улады з'яўляюцца абавязковымі для органаў ніжэйстаячых. Аднак у сферы праватворчасці ён мае пэўныя абмежаванні.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь дакладна акрэслівае тыя выпадкі і віды нарматыўных прававых актаў, якія могуць быць ад-

менены вышэйстаячымі органамі дзяржаўнай улады. Так, згодна з п. 25 артыкула 84 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь мае права адмяняць акты Урада, а ў адпаведнасці з п.2 6 гэтага ж артыкула Канстытуцыі – рашэнні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў у выпадку іх неадпаведнасці заканадаўству. У адпаведнасці з часткай 2 артыкула 122 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь рашэнні мясцовых Саветаў дэпутатаў, якія не адпавядаюць заканадаўству, могуць быць адменены вышэйстаячымі прадстаўнічымі органамі. У частцы 3 гэтага ж артыкула прадугледжана, што рашэнні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, якія не адпавядаюць заканадаўству, адмяняюцца адпаведнымі Саветамі дэпутатаў, а таксама вышэйстаячымі выканаўчымі і распарадчымі органамі.

Фактычная адмена дзеяння нарматыўнага прававога акта. Гэты спосаб страты нарматыўным прававым актам сваёй юрыдычнай сілы не знайшоў свайго прамога нарматыўнага замацавання ў Законе «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь», але ён выкарыстоўваецца ў практыцы праватворчасці. Сутнасць яго заключаецца ў тым, што нарматыўны прававы акт страчвае сваю сілу поўнасцю ці часткова пасля таго, як прымаецца новы нарматыўны прававы акт, у якім рэгулююцца тыя самыя грамадскія адносіны і пытанні.

Фактычная адмена дзеяння нарматыўнага прававога акта поўнасцю ці часткова адбываецца ў адпаведнасці з вядомай са старажытных часоў аксіёмай: lex posterior deroqat lex prior – пазнейшы закон адмяняе закон папярэдні. Дадзеная прававая аксіёма знайшла сваё замацаванне ў частцы 2 артыкула 71 Закону «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь», згодна з якой у выпадку калізіі паміж нарматыўнымі прававымі актамі, якія валодаюць роўнай юрыдычнай сілай, і калі ніводзін з іх не супярэчыць акту з большай юрыдычнай сілай, дзейнічаюць палажэнні акта, які быў прыняты пазней.

У юрыдычнай літаратуры справядліва лічыцца, што дадзены спосаб адмены дзеяння нарматыўных прававых актаў з'яўляецца не вельмі зручным, таму што пры яго выкарыстанні не наступае поўнай яснасці для ўсіх карыстальнікаў права і правапрымяняльнікаў адносна дзеяння таго ці іншага нарматыўнага прававога акта, асобных яго частак, палажэнняў і прадпісанняў. Акрамя гэтага, фактычнае выкарыстанне дадзенага спосабу «знічтажэння» непатрэбных нарматыўных прававых актаў, вывядзення іх з дзеючай сістэмы заканадаўства прыводзіць да існавання ў ёй так званых

«фассаў» – нарматыўных прававых актаў, якія фактычна страцілі сілу. Як змагацца з гэтай з'явай? Спосабы і сродкі такога характару прадугледжаны ў артыкулах 58 і 59 Закону «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь».

Знікненне тых грамадскіх адносін, змена абставін, дзеля рэгулявання якіх быў выдадзены нарматыўны прававы акт. Вядома, што нарматыўныя прававыя акты выдаюцца (прымаюцца) дзеля рэгулявання пэўных грамадскіх адносін. Натуральна, што яны маюць сваё юрыдычнае і фактычнае значэнне да таго часу, пакуль рэальна існуюць самі грамадскія адносіны, г. зн. тая прычына, якая прымусіла адпаведныя органы дзяржавы выдаць нарматыўны прававы акт. Калі з жыцця грамадства знікаюць пэўныя адносіны, гэта азначае, што нарматыўны прававы акт фактычна страчвае сваё значэнне і сваю юрыдычную сілу, хаця ён па нейкіх прычынах у свой час і не быў афіцыйна, г. зн. ва ўстаноўленым законам парадку прызнаны страціўшым сілу ці не быў нават фактычна адменены.

З дзеяннем нарматыўнага прававога акта ў часе шчыльна звязаны два пытанні: а) *пра зваротную сілу нарматыўнага прававога акта і б) пра перажыванне нарматыўнага прававога акта*.

У падмурку гэтых пытанняў ляжыць розніца паміж дзвюма наступнымі абставінамі: часам, на працягу якога нарматыўны прававы акт знаходзіцца ў юрыдычнай сіле (тэрмінам яго каляндарнага дзеяння), і межамі яго дзеяння ў часе, г. зн. межамі яго распаўсюджання на нейкія юрыдычныя факты і грамадскія адносіны. Прычым першая абставіна тычыцца як бы «ўласна юрыдычнага» часу дзеяння нарматыўнага прававога акта, а другая – «фактычнага» часу яго дзеяння і існавання. Пры спалучэнні юрыдычнай значнасці і юрыдычнай абавязковасці нарматыўнага прававога акта і рэальна існуючых грамадскіх адносін і жыццёвых фактаў, на якія распаўсюджваюць сваё значэнне нарматыўныя прававыя акты, узнікаюць пэўныя несупадзенні, якія па вялікаму рахунку з'яўляюцца прыватнай праявай несупадзенняў і разыходжанняў паміж правам (нормай) de jure і нормай de re.

Адной з праяваў такога несупадзення з'яўляецца існаванне ў сістэме заканадаўства цывілізаваных краін асобнага закону ці шэрагу заканадаўчых актаў, якія рэгламентуюць надзвычайнае (ваеннае ці асобнае) становішча. Да таго часу, пакуль не ўзніклі абставіны, з якімі звязваецца яго фактычнае дзеянне, такі закон фактычна знаходзіцца як бы ў «спячым» становішчы. Разам з тым, з пункту погляду «ўласна юрыдычнага» часу дзеяння дадзены закон, безумоўна, дзейнічае. Прычым можа гэта рабіць вельмі актыўна. Безу-

моўна, актыўнічае не сам закон, а заканадавец ці нейкі іншы суб'ект праватворчасці, які на падставе і ў развіццё закону аб надзвычайным становішчы распрацоўвае, змяняе, дапаўняе і ўводзіць у дзеянне іншыя нарматыўныя прававыя акты.

Па агульнаму правілу, якое сфармавалася яшчэ ў старажытным Рыме і на лацінскай мове гучыць як «lex ad praeteriam non valet» – закон зваротнай сілы не мае, нарматыўны прававы акт дзейнічае толькі «наперад», г. зн. што ён звязвае нейкія юрыдычныя наступствы толькі з тымі юрыдычнымі фактамі і дзеяннямі, якія ўзніклі ці адбыліся пасля таго, як нарматыўны прававы акт уступіў у сілу. Такі парадак дзеяння нарматыўнага прававога акта ў часе садзейнічае стабільнасці ў адносінах паміж суб'ектамі права, паколькі стварае ў іх упэўненасць, што іх становішча не будзе пагоршана пасля выдання новага акта.

Якая прававая рэальнасць ляжыць у падмурку дадзенага правіла? Уяўляецца, што агульнай прычынай для ўвядзення дадзенага правіла ў вызначэнне межаў дзейнасці нарматыўных прававых актаў з'яўляецца бясспрэчны факт развіцця права, факт змянення тых прававых эквівалентаў, якія выпрацоўваюцца грамадствам пад час яго паступовай эвалюцыі. У гэтым плане прыняцце, увядзенне ў дзеянне новага нарматыўнага прававога акта трэба разглядаць не інакш як замацаванне ў ім такіх новых ці зменены х норм права, у якіх замацоўваюцца новыя ці зменены я прававыя эквіваленты, што адпавядаюць сучаснаму стану грамадскіх адносін. Таму было б неразумным распаўсюджваць новыя нарматыўныя акты, у якіх замацоўваюцца новыя, адпавядаючыя сучасным патрабаванням прававыя эквіваленты, на тыя адносіны, якія сфармаваліся і дзейнічалі раней, а таксама на тыя факты, якія мелі месца раней.

Аднак з указанага правіла існуе і выключэнне. Пры пэўных абставінах нарматыўнаму прававому акту надаецца зваротная сіла, гэта значыць, што ён распаўсюджвае дзеянне на тыя грамадскія адносіны і юрыдычныя факты, якія склаліся, узніклі да набыцця нарматыўным прававым актам сваёй юрыдычнай сілы. Праблема зваротнай сілы нарматыўнага прававога акта здаўна цікавіла навукоўцаў і практыкаў, асаблівую актуальнасць яна набывала ў крызісныя перыяды жыцця грамадства, пад час карэнных пераўтварэнняў у грамадскіх адносінах і сістэме заканадаўства. Сама праблема «правамернасці» зваротнай сілы актаў здаўна лічылася вельмі складанай і заблытанай. Пры гэтым адзначалася як тое, што прынцып зваротнай сілы закону ўяўляе сабой самае вялікае зло, бо ён робіць замах на права і парушае сацыяльны дагавор, так адначасо-

ва звярталася ўвага і на той бясспрэчны момант, што няўхільнае захаванне прынцыпу lex ad praeteriam non valet здольна звесці, напрыклад, на нішто права народа на самавызначэнне.

У артыкуле 67 Закону «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь» замацавана палажэнне, згодна з якім нарматыўны прававы акт набывае зваротную сілу ў выпадках, калі ён змякчае альбо адмяняе адказнасць грамадзян ці нейкім іншым чынам паляпшае становішча асоб, на якіх ён распаўсюджвае сваё дзеянне, ці калі ў нарматыўным прававым акце альбо ў акце аб увядзенні яго ў дзеянне прама прадугледжана, што ён распаўсюджвае сваё дзеянне на адносіны, якія ўзніклі да ўступлення нарматыўнага прававога акта ў юрыдычную сілу. Разам з тым, згодна з часткай 3 дадзенага артыкула зваротная сіла нарматыўным прававым актам не можа быць нададзена, калі яны прадугледжваюць увядзенне ці ўзмацненне адказнасці за тыя дзеянні, якія на момант іх учынення не цягнулі ўказаную адказнасць ці прадугледжвалі больш мяккую адказнасць. Уяўляецца, што можна было б удакладніць фармуліроўку артыкула 67 Закону шляхам замены выразу «дзеянне на адносіны» іншым, больш дакладным юрыдычным выразам – на «факты і дзеянні».

Адносна законаў і дэкрэтаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь правіла (ці дакладней, выключэнне з правіла) аб зваротнай сіле нарматыўных прававых актаў з'яўляецца больш жорсткім, таму што частка 2 артыкула 67 Закону «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь» дапускае іх зваротнае дзеянне толькі ў выпадках, калі яны змягчаюць ці адмяняюць адказнасць грамадзян.

У тэорыі права выдзяляюцца два віды зваротнай сілы нарматыўнага прававога акта: простая зваротная сіла і рэвізійная зваротная. Розняцца яны між сабой па сваіх юрыдычных асаблівасцях і найперш па ступені завершанасці тых прававых наступстваў, якія ўзніклі на падставе таго нарматыўнага прававога акта, што дзейнічаў раней. Для рэвізійнай зваротнай сілы характэрна тое, што юрыдычныя наступствы, якія наступілі па «старому» нарматыўнаму прававому акту, пераглядаюцца і вызначаюцца зноў, але ўжо на падставе новага нарматыўнага прававога акта. Пры простай зваротнай сіле палажэнні новага нарматыўнага прававога акта распаўсюджваюцца толькі на тыя факты, якія ўзніклі падчас дзеяння старога нарматыўнага прававога акта, але адносна якіх яшчэ не наступілі юрыдычныя наступствы. Такія юрыдычныя наступствы будуць вынікаць з новага нарматыўнага прававога акта.

Перажыванне нарматыўным прававым актам часу свайго дзеяння – гэта з'ява, якая па свайму зместу з'яўляецца супрацьлеглай зваротнай сіле нарматыўнага прававога акта. «Перажыванне» ў самым агульным плане зводзіцца да таго, што адменены ва ўстаноўленым парадку нарматыўны прававы акт у нейкай меры працягвае сваё дзеянне пасля страты ім юрыдычнай сілы і ўвядзення ў дзеянне новага нарматыўнага прававога акта, ён як бы «перажывае» такім чынам адведзены для яго тэрмін дзеяння. У юрыдычнай літаратуры падкрэсліваецца, што «перажыванне» нарматыўнага прававога акта магчыма толькі адносна тых грамадскіх адносін, якія лічацца працягнутымі ў часе дзеяння. Юрыдычная з'ява, якая знешне падобна на «перажыванне», назіраецца ў рэвалюцыйныя перыяды развіцця грамадства, калі проста немагчыма адразу, як кажуць, «адным махам», адмяніць старое заканадаўства і ўвесці новае. Для гэтага патрабуецца пэўны час. А да таго, пакуль будзе распрацавана і ўведзена ў дзеянне новае заканадаўства, на нейкі перыяд пралангіруецца дзеянне старых нарматыўных прававых актаў.

3. Дзеянне нарматыўных прававых актаў у прасторы

Дзеянне права ў прасторы не абмяжоўваецца тэрытарыяльнымі межамі, таму што такіх межаў не маюць таварна-грашовыя адносіны, якія параджаюць права. Аднак пасля таго, як права (дакладней, яго частка, зрэз) замацоўваецца і выкладаецца ў нарматыўным прававым акце, што прымаецца дзяржавай, яно адразу ж у сваім дзеянні абмяжоўваецца тэрыторыяй пэўнай дзяржавы, органам якой ён быў выдадзены. Права, такім чынам, адрасавана чалавеку незалежна ад яго месцазнаходжання. Але, будучы выкладзеным у нарматыўным прававым акце, яно набывае «дзяржаўна-тэрытарыяльную» афарбоўку і канкрэтызуе сваё дзеянне шляхам удакладнення кола суб'ектаў, што знаходзяцца на тэрыторыі менавіта гэтай дзяржавы, шляхам удакладнення грамадзянства фізічных асобаў і г. д.

Для таго, каб вызначыць дзеянне нарматыўнага прававога акта ў прасторы, трэба дакладна вызначыць, акрэсліць межы той тэрыторыі, на якую распаўсюджвае ён сваё дзеянне. Адсюль вынікае, што для вызначэння межаў дзеяння нарматыўнага прававога акта ў прасторы вельмі важнае значэнне мае азначэнне тэрміну і паняцця «тэрыторыя». Пад тэрыторыяй у шырокім сэнсе слова ў міжнародным праве разумеюцца розныя прасторы зямнога шара з яго сухапутнай і воднай паверхняй, нетрамі і паветранай прасторай, а так-

сама касмічнай прасторай з нябеснымі целамі, якія ў ёй знаходзяцца. З другой паловы XIX стагоддзя ў міжнародным праве пануючай стала канцэпцыя знакамітага рускага юрыста В.А. Незабітоўскага, згодна з якой дзяржаўная тэрыторыя – гэта не нейкая рэч, што належыць дзяржаве, а прасторавая мяжа, у якой дзяржава існуе і дзейнічае як палітычная арганізацыя ўлады.

У сучасным міжнародным праве тэрыторыяй дзяржавы лічыцца частка паверхні зямнога шара, на якой (ці ў межах якой) функцыянуе пэўная дзяржава і якая знаходзіцца пад яе суверэнітэтам, г. зн. што дзяржава ажыццяўляе ў яе межах сваё тэрытарыяльнае вяршэнства. Такім чынам, «прыналежнасць» да пэўнай дзяржавы і вяршэнства над ёй суверэнітэту пэўнай дзяржавы – гэта дзве асноўныя прыметы дзяржаўнай тэрыторыі. Пры гэтым у склад тэрыторыі дзяржавы ўключаецца частка зямной (сухапутнай і воднай) паверхні, на якую распаўсюджваецца суверэнная ўлада дзяржавы і якая дакладна акрэслена дэмаркаванай і дэлімітаванай лініяй дзяржаўнай граніцы пэўнага дзяржаўнага ўтварэння. У склад тэрыторыі дзяржавы ўключаюцца таксама нетры зямлі, якія знаходзяцца пад зямной і воднай паверхняй у межах дзяржаўнай граніцы без якіх-небудзь абмежаванняў па глыбіні; унутраныя воды, г. зн. воды рэк, азёраў і іншых вадаёмаў, берагі якіх поўнасцю належаць дзяржаве; тэрытарыяльныя воды; кантынентальны шэльф; паветраная прастора ў межах сухапутных і водных граніц; ваенныя і грамадзянскія судны пад сцягам дзяржавы, якія знаходзяцца ў нейтральных водах ці ў міжнароднай паветранай прасторы; тэрыторыя пасольстваў, місій, консульстваў дзяржавы, якія знаходзяцца за яе межамі; касмічныя караблі (станцыі), на якіх ёсць адзнака дзяржавы, што зарэгістравала касмічны аб’ект.

Уся заканадаўчая, выканаўчая і судовая ўлада дзяржавы распаўсюджваецца на яе тэрыторыі як на ўласных грамадзян і арганізацыі, так і на замежных грамадзян і замежныя арганізацыі, а таксама на асоб без грамадзянства. Па агульнаму правілу дзяржава не павінна дапускаць на сваёй тэрыторыі дзеянне замежных законаў, таму што гэта парушала б яе суверэнітэт, г. зн. права на вяршэнства і незалежнасць ад іншых дзяржаў. Тэрытарыяльнае вяршэнства не выключае, аднак, некаторых выключэнняў з дзеяння заканадаўства дзяржавы з яе згоды ў адносінах да пэўных катэгорый замежных грамадзян на ўсёй дзяржаўнай тэрыторыі ці дзеяння замежнага заканадаўства ў пэўных раёнах на сваёй тэрыторыі. Такая згода можа быць выкладзена ва ўнутраным законе ці ў міжнародным дагаворы.

Але разам з тым, калі дзеянне законаў адной дзяржавы можа распаўсюджвацца за межы яе тэрыторыі, то прымяненне сродкаў уладнага прымусу абмежавана толькі ўласнай тэрыторыяй. Ніякая дзяржава не мае права прымяняць свае сродкі ўладнага прымусу на тэрыторыі замежнай дзяржавы. У сучаснай тэорыі права і міжнародным праве пры вызначэнні сферы дзеяння нарматыўных прававых актаў у прасторы выкарыстоўваецца паняцце «юрысдыкцыя», якая з'яўляецца праявай дзяржаўнага суверэнітэту і абазначае сферу дзеяння дзяржаўнай улады. Пры гэтым па дзеянню ў прасторы выдзяляюць тэрытарыяльную і экстэрытарыяльную юрысдыкцыю, па аб'ёму – поўную і няпоўную, па характару – заканадаўчую (прадпісваючую), выканаўчую (адміністратыўную) і судовую.

Пры поўнай юрысдыкцыі дзяржава мае права фармуляваць правілы паводзін і забяспечваць іх выкананне ўсімі даступнымі дзяржаве законнымі сродкамі. А пры абмежаванай дзяржава можа выдаваць абавязковыя для выканання нарматыўныя прававыя акты, але яна абмежавана ў выкарыстанні сродкаў, якія забяспечваюць іх выкананне. Юрысдыкцыя, якую ажыццяўляе дзяржава ў межах сваёй тэрыторыі, называецца тэрытарыяльнай, а юрысдыкцыя, якую ажыццяўляе дзяржава за межамі дзяржаўнай тэрыторыі, называецца экстэрытарыяльнай.

Агульнае правіла пры вызначэнні тэрытарыяльнай юрысдыкцыі дзяржавы зводзіцца да таго, што дзяржава ажыццяўляе поўную юрысдыкцыю ў межах сваёй тэрыторыі і абмежаваную (няпоўную) у адносінах да сваіх грамадзян і арганізацый за яе межамі, у межах спецыяльнай эканамічнай зоны мора і кантынентальнага шэльфа. У падмурку экстэрытарыяльнай юрысдыкцыі ляжыць персанальны прынцып, у сілу якога дзяржава можа абавязаць сваіх грамадзян і свае арганізацыі за межамі сваёй тэрыторыі выконваць свае законы. Такая юрысдыкцыя мае абмежаваны характар і характар прадпісваючай (г. зн. нарматворчай ці заканадаўчай) юрысдыкцыі. Прымусовая юрысдыкцыя дзяржавы ажыццяўляецца толькі тады, калі суб'ект знаходзіцца пад поўнай юрысдыкцыяй дзяржавы, г. зн. на яе тэрыторыі.

У падмурку вызначэння тэрытарыяльных межаў дзеяння нарматыўных прававых актаў ляжыць так званая *статуарная тэорыя*, якая была распрацавана ў XIX стагоддзі. Сутнасць дадзенай тэорыі зводзіцца да таго, што для вызначэння нарматыўнага прававога акта, які павінен быць прыменены да пэўных прававых адносін – нацыянальны ці замежны – прымаецца пад увагу перш-наперш прырода прававых адносін. У залежнасці ад гэтага ў статуарнай

тэорыі выдзяляюцца тры віды нарматыўных прававых актаў: акты асабістыя (statuta personalia), акты рэчавыя (statuta realia) і акты змешаныя (statuta mixtra).

1. Statuta personalia – гэта нарматыўныя прававыя акты, якія вызначаюць юрыдычнае становішча, праваздольнасць асобы. Усе пытанні, якія ўзнікаюць адносна прававога становішча асобы, вырашаюцца на падставе нарматыўных прававых актаў радзімы (lex domicilii).

2. Statuta realia – гэта нарматыўныя прававыя акты, якія вызначаюць нашы правы на рэчы. Прычым яны, у сваю чаргу, распадаюцца на дзве групы: а) акты, у якіх фармулюцца правы на рухомую маёмасць і б) акты, у якіх вызначаюцца правы асобы на нерухомую маёмасць. У першым выпадку сутыкненні паміж нарматыўнымі прававымі актамі розных дзяржаў вырашаюцца, як правіла, на падставе актаў той дзяржавы, дзе пражывае ўладальнік рухомай маёмасці (lex domicilii). А ў другім выпадку ўсе сутыкненні паміж актамі вырашаюцца на падставе актаў месцазнаходжання рэчы (lex rei sitae).

3. Statuta mixtra – прынцып вызначэння нарматыўнага прававога акта ў залежнасці ад характару дагаворных адносінаў асобы. Пры гэтым выдзяляюць два пытанні: пытанне аб юрыдычнай сапраўднасці дагавору вырашаецца згодна з актамі той дзяржавы, дзе быў заключаны дагавор (locus reqit actum). Што тычыцца парадку ажыццяўлення дагавору, то ён, як правіла, адбываецца на падставе нарматыўных прававых актаў той дзяржавы, на тэрыторыі якой ён ажыццяўляецца.

Дзеянне нарматыўнага прававога акта на тэрыторыі дзяржавы вызначаецца наступнымі правіламі: 1) калі нарматыўны прававы акт выдадзены органам цэнтральнай улады, то ён мае значэнне і сілу на ўсёй тэрыторыі дзяржавы, калі іншае прама не агаворана ў ім ці іншых спецыялізаваных нарматыўных актах, што вызначаюць тэрытарыяльныя межы яго дзеяння; 2) калі нарматыўны прававы акт выдадзены ўпаўнаважаным органам улады пэўнай тэрытарыяльнай адзінкі, то ён мае юрыдычнае значэнне толькі ў межах гэтай тэрытарыяльнай адзінкі; 3) лакальныя нарматыўныя прававыя акты дзейнічаюць на тэрыторыі (у межах) пэўнага прадпрыемства, арганізацыі; 4) пэўныя нарматыўныя прававыя акты выдаюцца спецыяльна для іх дзеяння на пэўнай тэрыторыі дзяржавы, напрыклад, у межах так званай чарнобыльскай зоны.

Здаўна ў агульнай тэорыі права былі сфармуляваны высновы аб тым, што ў сферы дзяржаўнага права пануе тэрытарыяльны па-

чатак. Дзяржаўнае права абумоўлена асаблівасцямі яе палітычнага ладу, і таму дзяржава не дапускае на сваёй тэрыторыі дзеяння «чужога» палітычнага закону. Гэтае самае правіла тычыцца і крымінальнага закону. Разам з тым прырода грамадскіх адносін, што рэгулююцца грамадзянскім правам, наадварот, патрабуе пэўных абмежаванняў тэрытарыяльнага прынцыпу, бо без пэўных выключэнняў з яго будуць паралізаваны разнастайныя міжнародныя таварна-грашовыя адносіны.

Дзеянне нарматыўных прававых актаў у прасторы звязана з шэрагам выпадкаў, якія абазначаюцца паняццем экстэрытарыяльнага дзеяння нарматыўнага прававога акта (часцей за ўсё закону). Яго сутнасць заключаецца ў тым, што пры пэўных абставінах, якія часцей за ўсё прадугледжаны ў дзеючым праве, адносна пэўных дзеянняў пэўных суб'ектаў права, якія ўчынены на тэрыторыі адной дзяржавы, прымяняюцца нарматыўныя прававыя акты іншай дзяржавы. З экстэрытарыяльным дзеяннем нарматыўнага прававога акта часцей за ўсё мы сутыкаемся, калі на тэрыторыі нашай дзяржавы знаходзяцца замежныя грамадзяне ці грамадзяне з падвоеным грамадзянствам, альбо асобы без грамадзянства, а таксама замежныя ці міжнародныя арганізацыі.

Экстэрытарыяльнае дзеянне мы назіраем, калі нашы грамадзяне знаходзяцца за межамі нашай краіны, ці нашыя, беларускія, арганізацыі дзейнічаюць на тэрыторыі іншых дзяржаў. Знаходзячыся за межамі Рэспублікі Беларусь, нашыя грамадзяне і арганізацыі не вызваляюцца ад выканання і захавання норм беларускага права. Яны, наадварот, нясуць як бы «падвоены прававы цяжар». На тэрыторыях іншых дзяржаў яны абавязаны выконваць і захоўваць усе прававыя прадпісанні іншай прававой сістэмы, а таксама ўласна беларускага права. І калі, напрыклад, яны ўчыняць дзеянне, якое не лічыцца правапарушэннем на тэрыторыі іншай дзяржавы, а беларускае заканадаўства кваліфікуе яго як правапарушэнне, то грамадзяне могуць быць прыцягнуты да адказнасці згодна з беларускім заканадаўствам.

Дзеянне нарматыўных прававых актаў у прасторы звязана таксама з абмежаваннямі дзеяння пэўных нарматыўных актаў ці іх частак на нейкай частцы тэрыторыі дзяржавы. Звычайна гэта звязана з утварэннем на тэрыторыі асобнай дзяржавы ці тэрыторыі сумежных дзяржаў так званых асобных эканамічных, афшорных зон. У гэтых зонах устанаўліваецца «спецыяльны» прававы рэжым, які адрозніваецца ад агульнапрынятага. Спецыяльны прававы рэжым ствараецца наступным шляхам. Дзяржава прымае рашэнне,

згодна з якім на пэўнай тэрыторыі не дзейнічаюць пэўныя нарматыўныя прававыя акты ці іх часткі і асобныя палажэнні. Гэтыя «пустоты» ў прававой сістэме запаўняюцца іншымі, «спецыяльнымі» нарматыўнымі прававымі актамі, характар і змест якіх, як правіла, вызначаецца ў асобным законе аб асобнай эканамічнай зоне. На тэрыторыі гэтай асобнай зоны са згоды дзяржавы могуць дзейнічаць нарматыўныя прававыя акты іншых дзяржаў ці міжнародныя нормы права. Праўда, на тэрыторыі свабоднай ці афшорнай зоны ў поўным аб'ёме дзейнічае канстытуцыя дзяржавы, а таксама тыя нарматыўныя прававыя акты, у якіх устанаўліваюцца разнастайныя віды і меры юрыдычнай адказнасці.

4. Дзеянне нарматыўных прававых актаў па колу асобаў

Дзеянне нарматыўнага прававога акта па колу асобаў звязана з вызначэннем тых суб'ектаў права, адносна якіх нарматыўны прававы акт мае абавязковае значэнне. Агульнае правіла, якое было сфармулявана юрыдычнай навукай, гучыць наступным чынам: пад дзеянне нарматыўнага прававога акта падпадаюць усе суб'екты права: як фізічныя, так і юрыдычныя асобы. Да фізічных асобаў, адносна якіх нарматыўныя прававыя акты маюць абавязковае значэнне, адносяцца перш-наперш грамадзяне дзяржавы, асобы без грамадзянства (так званыя патрыды), асобы з падвоеным грамадзянствам (так званыя біпатрыды), а таксама замежныя грамадзяне.

Праўда, калі адносна грамадзян дзяржавы абсалютна ўсе нарматыўныя акты і ва ўсім іх аб'ёме маюць абавязковае значэнне, то адносна іншых фізічных асобаў у дзеянні нарматыўных прававых актаў практычна ў кожнай нацыянальнай сістэме існуюць выключэнні. З чым яны звязаны? Тут можна сфармуляваць агульнае правіла: тыя нормы права і тыя суб'ектыўныя правы і юрыдычныя абавязкі, якія ў іх замацаваны і якія непасрэдна вынікаюць з асобнай палітыка-прававой сувязі асобы і дзяржавы – грамадзянства, маюць абавязковае значэнне толькі для грамадзян пэўнай дзяржавы. Усе астатнія нормы права і юрыдычныя правы і абавязкі, якія ў іх замацаваны, маюць агульнаабавязковае значэнне абсалютна для ўсіх суб'ектаў права.

Адрасатамі асобных нарматыўных прававых актаў могуць быць не ўсе фізічныя ці юрыдычныя асобы, а толькі нейкія іх групы, напрыклад, пенсіянеры, ваеннаслужачыя, супрацоўнікі міліцыі і г. д. Ёсць і такія нарматыўныя прававыя акты, якія распаўсюджваюць сваё дзеянне толькі на суб'ектаў права ў межах пэўнага міністэрства, дзяржаўнага камітэта і г. д.

З дзеяннем нарматыўнага прававога акта па асобах шчыльна звязана пытанне аб прывілеях і імунітэтах. На думку прафесара А.В. Малько, імунітэты – гэта асобны від прывілеяў, якія, у сваю чаргу, з'яўляюцца спецыфічнай разнавіднасцю льгот, юрыдычных выключэнняў. Прывілеі і імунітэты ствараюць асобны юрыдычны рэжым, асобныя прававыя перавагі пэўнаму колу суб'ектаў права і садзейнічаюць такім чынам пашырэнню іх магчымасцей па задавальненню тых ці іншых інтарэсаў. Яны з'яўляюцца гарантыямі сацыяльна карыснай дзейнасці і садзейнічаюць ажыццяўленню тых ці іншых абавязкаў.

Прывілеі і імунітэты ўяўляюць сабой часта перажытак старых часоў, бо яны ўзніклі на ранніх этапах развіцця права і атрымалі бурнае развіццё ў эпоху феадалізму. Іх існаванне ў сучасным праве часцей за ўсё звязана з асобным палітычным і прававым становішчам, якое займаюць нейкія фізічныя і юрыдычныя асобы. Да гэтых асобаў належаць, напрыклад: а) кіраўнікі дзяржаў; б) народныя прадстаўнікі (парламентарыі); в) асобы, якія карыстаюцца правам экстэрытарыяльнасці (кіраўнікі іншых дзяржаў, паслы і іншыя дыпламатычныя агенты замежных дзяржаў).

Прывілеі і імунітэты кіраўнікоў дзяржаў былі вельмі пашыраны раней, ва ўмовах абсалютных манархій, значна меншымі яны сталі ва ўмовах канстытуцыйных манархій. Прывілеі манархаў зводзяцца да таго, што яны не падлягаюць юрыдычнай адказнасці і іх асоба лічыцца недатыкальнай. Гэта не азначае, што манарх з'яўляецца вышэйшым за закон, як гэта было, напрыклад, у дэспатычных дзяржавах, а азначае толькі асабістую прывілею манарха, якая абгрунтоўваецца тым, што «кароль не можа жадаць зла народу», што ён, з'яўляючыся крыніцай правасуддзя, не можа быць сам асуджаны судом, які дзейнічае ад яго імя. Такая прывілея патрэбна для падтрымання прэстыжу манарха, калі тыя ці іншыя дзеянні, здзейсненыя ўрадам, могуць быць злачыннымі. У гэтым выпадку адказнымі лічацца міністры, а не манархі. Менавіта таму кожны акт манарха патрабуе скрэпы ў выглядзе подпісу міністра. Часткова прывілеі і імунітэты захоўваюцца і зараз за кіраўнікамі цывілізаваных дзяржаў, асабліва за прэзідэнтамі, у тым ліку і былымі, а таксама тымі, якія выйшлі ў адстаўку.

Прывілеі і імунітэты народных прадстаўнікоў (парламентарыяў) больш абмежаваныя, чым прывілеі кіраўнікоў дзяржаў (манархаў). Яны з'явіліся пасля ўзнікнення інстытута прадстаўнікоў народа яшчэ ў старажытных дзяржавах (у Афінах, у Рыме), былі адноўлены пасля стварэння першых парламентаў і замацаваны ў

законах. Прывілеі народных прадстаўнікоў былі ўведзены дзеля таго, каб яны маглі паспяхова выконваць свае абавязкі. А для гэтага яны павінны быць вольныя ў выказваннях сваіх меркаванняў і быць недатыкальнымі. Менавіта з гэтымі праявамі дзейнасці народных прадстаўнікоў і звязаны галоўным чынам іх прывілеі, якія звычайна дакладна пералічваюцца ў законе і дакладна рэгламентуюцца. Разам з тым прывілеі народных прадстаўнікоў маюць умоўны характар. Яны карыстаюцца імі да таго часу, пакуль парламент не дасць сваю згоду на прыцягненне народных прадстаўнікоў да пэўнага віду адказнасці.

Адносна асобаў, якія карыстаюцца правам экстэрытарыяльнасці (кіраўнікі іншых дзяржаў і ўрадаў, супрацоўнікі дыпламатычных прадстаўніцтваў замежных дзяржаў, паслы, пасланнікі, павераныя ў справах, саветнікі, гандлёвыя прадстаўнікі і іх намеснікі, ваенныя аташэ і іх памочнікі, сакратары і іншыя дыпламатычныя агенты замежных дзяржаў, а таксама члены іх сем'яў і некаторыя іншыя замежныя грамадзяне), сучасная тэорыя права выкарыстоўвае тэрмін і паняцце «імунітэт». Гэтыя асобы згодна з Венскай канвенцыяй аб дыпламатычных адносінах ад 18 красавіка 1961 года карыстаюцца асабістай недатыкальнасцю. Яны не могуць быць арыштаваны ці затрыманы. Пытанні аб іх крымінальнай ці адміністрацыйнай адказнасці ў выпадку здзяйснення імі злачынстваў ці адміністрацыйных правапарушэнняў на тэрыторыі дзяржавы, дзе яны знаходзяцца, вырашаюцца дыпламатычным шляхам. Гэтая катэгорыя асобаў карыстаецца і іншымі імунітэтамі. Існаванне разнастайных імунітэтаў, што замацоўваюцца за дыпламатычнымі прадстаўнікамі, абгрунтоўваецца іх асобным грамадскім становішчам і дзяржаўнай роллю, пабудавана на тэарэтычнай канструкцыі, згодна з якой гэтыя асобы як бы жывуць па-за тэрыторыяй дзяржавы. Без імунітэтаў гэтай катэгорыі асобаў не змагло б існаваць дыпламатычнае прадстаўніцтва.

5. Дзеянне нарматыўных прававых актаў па прадмеце рэгулявання

Далёка не заўсёды ў навуковай і вучэбнай літаратуры дадзены аспект (зрэз) юрыдычнага дзеяння нарматыўнага прававога акта разглядаецца ў дадзенай тэме. Разам з тым знакаміты навуковец-юрыст Ганс Кельзен быў глыбока пераконаны ў тым, што дадзены аспект дзеяння норм права (ён называў яго матэрыяльным (ці змястоўным) неабходны пры вывучэнні дзеяння нарматыўных права-

вых актаў, падкрэсліваючы пры гэтым, што нормы права рэгулююць заўсёды толькі паводзіны чалавека, а іншыя з'явы, адрозныя ад паводзін чалавека, могуць быць прадугледжаны ў нормах права толькі ў сувязі з паводзінамі чалавека як яго ўмова ці наступства. Пры гэтым пад змястоўнай (матэрыяльнай) сферай дзеяння ён меў на ўвазе розныя вобласці чалавечай дзейнасці, якія падлягаюць прававому рэгуляванню: эканамічную, палітычную, рэлігійную і г. д.

Уяўляецца, што логіка вучэбнага курса па агульнай тэорыі дзяржавы і права патрабуе, каб пры дзеянні нарматыўнага прававога акта разглядаўся таксама і гэты аспект. Доказы тут наступныя. Пасля таго, як высветлены пытанні аб сутнасці, нормах і крыніцах права, а таксама аб сістэме норм права і сістэме заканадаўства, дзеля разгляду далейшых пытанняў вучэбнага курса, у асаблівасці пытанняў аб рэалізацыі і прымяненні норм права, патрабуецца ўдакладніць сферу дзеяння нарматыўных прававых актаў шляхам іх прывязкі да пэўных відаў грамадскіх адносін і, адпаведна, пэўных структурных частак сістэмы права. Толькі такім чынам можна высветліць усе сістэмна-структурныя і функцыянальныя сувязі нарматыўна-прававых актаў і тых норм права, што ў іх змяшчаюцца, прывязаць іх да пэўнага галіновага прававога рэжыму, асэнсаваць у поўнай меры іх мэты і задачы і праз гэта зразумець іх змест.

З дзеяннем нарматыўных прававых актаў па прадмету рэгулявання звязана пытанне аб суадносінах законаў агульных, законаў, якімі ўстанаўліваюцца нейкія выключэнні, і спецыяльных законаў. Справа тут у тым, што нярэдка здараюцца сітуацыі, пры якіх агульныя законы патрэбна «прыжывіць» да асобных сітуацый, якія патрабуюць індывідуальнага падыходу з боку заканадаўцы. Старажытнарымскія юрысты сфармулявалі для гэтых выпадкаў прававую аксіёму, згодна з якой lex specialis deroqat lex qeneralis – спецыяльны закон адмяняе дзеянне закону агульнага. Суадносіны паміж нарматыўнымі прававымі актамі агульнымі, спецыяльнымі і тымі, якія ўстанаўліваюць нейкія выключэнні, можна дакладна акрэсліць толькі шляхам вызначэння характару і спецыфікі рэгулюемых імі грамадскіх адносін. Пры гэтым спачатку трэба высветліць агульнагаліновы прававы рэжым гэтых адносін, а ўжо затым – спецыфіку прававога рэгулявання пэўнага віду грамадскіх адносін.

Па агульнаму правілу, нарматыўныя прававыя акты і нормы права, што ў іх змешчаны, якія рэгулююць грамадскія адносіны ў пэўнай галіне норм права, не распаўсюджваюць сваё дзеянне на

тыя грамадскія адносіны, якія рэгулююцца нарматыўнымі прававымі актамі, якія скіраваны на рэгуляванне грамадскіх адносін, што ўключаюцца ў прадмет прававога рэгулявання іншых галін норм права. І толькі ў некаторых выпадках (напрыклад, пры наяўнасці прабелаў у праве) дапускаецца так званае субсідзіярнае дзеянне тых ці іншых норм (і актаў) права за межамі сваёй сферы рэгулявання.

Разам з тым адной з асаблівасцей развіцця сістэмы нарматыўна-прававых актаў (у шырокім сэнсе слова – сістэмы заканадаўства) з'яўляецца тое, што нарматыўных прававых актаў «аднагаліновай» арыентацыі вельмі мала. У абсалютнай большасці нарматыўных прававых актаў змяшчаюцца нормы права, якія адносяцца да розных галін права. З гэтага пункту гледжання ўсе нарматыўныя прававыя акты падзяляюцца на дзве вялікія групы – галіновыя і комплексныя. Адсюль вынікае, што для правільнага разумення сэнсу і зместу норм права, вызначэння сферы іх дзеяння, кола суб'ектаў права, на якіх яны распаўсюджваюць сваё дзеянне, вельмі важна ўстанавіць структурна-функцыянальныя сувязі кожнага нарматыўнага прававога акта ў сістэме заканадаўства і найперш з галоўнымі кадыфікаванымі нарматыўнымі прававымі актамі, напрыклад, Грамадзянскім, Працоўным, Крымінальным і іншымі кодэксамі, якія ўзначальваюць пэўную галіну заканадаўства. Устанаўленне «сілавых» залежнасцей кожнага нарматыўнага прававога акта дазваляе праватворцам і правапрымяняльнікам правільна арыентавацца ў сістэме норм права і сістэме заканадаўства пры выбары неабходных для іх норм права, правільна іх разумець і прымяняць.

Вядома, што нацыянальная сістэма права ўмоўна падзяляецца на права публічнае і права прыватнае. Пры гэтым кожная з гэтых сфер адрозніваецца асобным суб'ектным складам грамадскіх адносін, своеасаблівым наборам прававых сродкаў і метадаў, якія выкарыстоўваюцца для іх рэгулявання. Таму для правільнага і адэкватнага разумення зместу нарматыўных прававых актаў, вызначэння сферы іх дзеяння і кола суб'ектаў, адносна якіх яны маюць абавязковае значэнне, вельмі важна вызначыць,, да якой сферы прававога рэгулявання – публічнай ці прыватнай – адносіцца той ці іншы нарматыўны прававы акт.

6. Асаблівасці дзеяння міжнароднага права і міжнародных дагавораў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь

Вядома, што прававая сістэма Рэспублікі Беларусь функцыянуе і развіваецца ў шчыльнай узаемасувязі з іншымі нацыянальнымі прававымі сістэмамі, а таксама з міжнародным правам. У артыкуле 8 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замацавана правіла, згодна з якім Рэспубліка Беларусь прымае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім заканадаўства. У гэтай сувязі ўзнікаюць пытанні аб тым, як трансфармуюцца агульнапрызнаныя прынцыпы міжнароднага права ў сістэму крыніц права Рэспублікі Беларусь і найперш у сістэму заканадаўства, якім чынам уплываюць міжнародныя дагаворы, што заключаюцца Рэспублікай Беларусь, на дзеянне нарматыўных прававых актаў.

Найперш трэба адзначыць, што агульнапрызнаныя прынцыпы міжнароднага права дзейнічаюць на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і маюць абавязковае значэнне для ўсіх асобаў, яны пранізваюць усю прававую сістэму Рэспублікі Беларусь, склаўшуюся гістарычна ў Беларусі сістэму крыніц права ўвогуле і сістэму заканадаўства ў прыватнасці. Прычым дзейнічаюць яны бестэрмінова. Што тычыцца міжнародных дагавораў, то трэба падкрэсліць, што згодна з часткай 3 артыкула 8 Канстытуцыі, па-першае, не дапускаецца заключэння такіх міжнародных дагавораў, якія супярэчаць Канстытуцыі, а, па-другое, для іх дзеяння на тэрыторыі Беларусі неабходна ажыццявіць цэлы шэраг юрыдычна абавязковых дзеянняў і працэдур.

У артыкуле 12 Закону «Аб міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь» сфармулявана агульнае правіла, паводле якога міжнародныя дагаворы ўступаюць у сілу для Рэспублікі Беларусь толькі пасля таго, як будзе выражана згода Рэспублікі Беларусь на абавязковасць для яе міжнароднага дагавору ў адпаведнасці з дадзеным законам у парадку і тэрміны, якія прадугледжаны ў дагаворы, ці іншым шляхам узгоднены паміж бакамі, якія дамаўляюцца.

Згодна з часткай 2 артыкула 3 Закона «Аб міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь» рашэнне аб згодзе на абавязковасць для Рэспублікі Беларусь міжнародных дагавораў прымаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь і Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з іх кампетэнцыяй, а сама згода Рэспублікі Беларусь на абавязковасць для яе міжнародных дагавораў можа быць выражана шляхам пад-

пісання дагавору, абмену дакументамі, пісьмамі ці нотамі, якія ўтвараюць дагавор, ратыфікацыі дагавору, далучэння да дагавору ці любым іншым шляхам, пра які дамовіліся бакі. Разгледзім гэтыя шляхі больш падрабязна.

Практыка функцыянавання беларускай прававой сістэмы сведчыць аб тым, што толькі нейкая ў колькасных адносінах невялікая частка міжнародных дагавораў пасля падпісання набывае абавязковае значэнне і пачынае дзейнічаць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Але абсалютная большасць міжнародных дагавораў для набыцця юрыдычнай сілы і непасрэднай дзейнасці на тэрыторыі нашай дзяржавы патрабуе ажыццяўлення шэрагу ўнутрыдзяржаўных працэдур, якія неабходны для выражэння згоды Рэспублікі Беларусь на абавязковасць для яе міжнародных дагавораў.

Адной з такіх унутрыдзяржаўных працэдур з'яўляецца ратыфікацыя міжнародных дагавораў, якая ажыццяўляецца Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым абавязковай ратыфікацыі падлягаюць міжнародныя дагаворы: аб удзеле Рэспублікі Беларусь у міждзяржаўных утварэннях; аб тэрытарыяльным размежаванні Рэспублікі Беларусь з іншымі дзяржавамі; міжнародныя дагаворы, прадметам якіх з'яўляюцца пытанні, што адносяцца толькі да сферы заканадаўчага рэгулявання, але па нейкіх прычынах не ўрэгуляваны законамі Рэспублікі Беларусь, дэкрэтамі і ўказамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь; іншыя міжнародныя дагаворы, пры падпісанні якіх бакі дамовіліся аб ратыфікацыі.

Тыя міжнародныя дагаворы, якія не падлягаюць ратыфікацыі і не ўступаюць у дзеянне пасля падпісання, набываюць юрыдычную сілу пасля іх зацвярджэння. Пры гэтым міждзяржаўныя дагаворы зацвярджаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, а міжурадавыя дагаворы – Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Яшчэ адзін шлях да набыцця міжнародным дагаворам юрыдычнай сілы на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь – далучэнне Рэспублікі Беларусь да міжнародных дагавораў у адпаведнасці з умовамі міжнароднага дагавору ці ў іншых выпадках, якія прадугледжаны міжнародным правам. Пры гэтым рашэнне аб далучэнні Рэспублікі Беларусь да міждзяржаўнага і міжурадавага дагавору, які падлягае ратыфікацыі Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь, прымаецца ў форме закону Рэспублікі Беларусь аб далучэнні да міжнароднага дагавору, а міждзяржаўных дагавораў, якія не падлягаюць ратыфікацыі, – Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь у форме ўказа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Рашэнне аб далучэнні да міжурадавых дагавораў, якія не падлягаюць ратыфікацыі, прыма-

ецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь у форме пастаноў Савета Міністраў.

Агульнапрызнаныя прынцыпы міжнароднага права і міжнародныя дагаворы, якія ўступілі ў сілу, з'яўляюцца неад'емнай часткай права і заканадаўства Рэспублікі Беларусь і падлягаюць непасрэднаму прымяненню. Яны маюць юрыдычную сілу таго акта, якім выражана згода Рэспублікі Беларусь на абавязковасць для яе адпаведнага міжнароднага дагавору. Калі з тэкста міжнароднага дагавору вынікае, што для яго рэалізацыі патрабуецца прыняцце ўнутрыдзяржаўнага нарматыўнага прававога акта, то ў гэтым выпадку кампетэнтны орган дзяржаўнай улады абавязаны прыняць такі нарматыўны прававы акт. Разам з тым можа высветліцца, што асобныя нарматыўныя прававыя акты нацыянальнага заканадаўства ці іх асобныя часткі не адпавядаюць уступіўшаму ў законную сілу міжнароднаму дагавору. У гэтых выпадках кампетэнтныя органы дзяржаўнай улады павінны прывесці выдадзеныя імі нарматыўныя прававыя акты ў адпаведнасць з міжнароднымі дагаворамі.

Важнымі момантамі дзеяння міжнародных дагавораў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца спыненне дзеяння, у тым ліку дэнансацыя, а таксама прыпыненне іх дзеяння. Пры гэтым адзначаныя юрыдычныя працэдуры ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з умовамі самога міжнароднага дагавору і нормамі міжнароднага права тым органам дзяржавы, у кампетэнцыю якога ўваходзіць прыняцце рашэння аб згодзе на абавязковасць міжнароднага дагавору для Рэспублікі Беларусь і ў форме тых самых нарматыўных прававых актаў, якімі была дадзена згода на абавязковасць – у форме закону, указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Пытанні для самаправеркі

1. Раскрыйце змест паняццяў «дзеянне права» і «дзеянне крыніц права».
2. Ці можна сфармуляваць адзінае паняцце для вызначэння дзеяння ўсіх праяў (форм) права?
3. У якой з старажытных прававых сістэм былі добра распрацаваны правілы вызначэння межаў дзеяння крыніц права?
4. Чаму праз вызначэнне межаў дзеяння нарматыўных прававых актаў можна вызначаць і межы дзеяння ўсіх крыніц права?
5. Раскрыйце змест спосабаў набыцця нарматыўным прававым актам юрыдычнай сілы, якія ўжываюцца ў прававой сістэме Рэспублікі Беларусь.

6. Раскрыйце змест спосабаў страты нарматыўным прававым актам юрыдычнай сілы, якія ўжываюцца ў прававой сістэме Рэспублікі Беларусь.

7. Што ўяўляюць сабой паняцце «зваротная сіла нарматыўнага прававога акта» і паняцце «пераживанне нарматыўнага прававога акта»?

8. Раскрыйце змест паняцця «прастора і парадак дзеяння нарматыўных прававых актаў у прасторы».

9. Як дзейнічаюць нарматыўныя прававыя акты па колу асобаў?

10. Ці маюцца нейкія асобныя правілы дзеяння ў прасторы, па часе, па колу асобаў, па прадмету (сферы рэгулявання) у іншых крыніцах норм права ў кантынентальнай прававой сям'і?

11. Ці ёсць адрозненні ў дзеянні нарматыўных прававых актаў у прасторы, у часе, па колу асобаў, па прадмету (сферы рэгулявання) у іншых прававых сем'ях у параўнанні з кантынентальнай прававой сям'ёй. Калі ёсць, то чым яны абумоўлены?

12. Ці можна ў прынцыпе выпрацаваць агульныя правілы дзеяння нарматыўных прававых актаў і іншых крыніц норм права для ўсіх прававых сем'яў?

13. Ці можна ў прынцыпе выпрацаваць аднолькавыя правілы для дзеяння крыніц міжнароднага права і крыніц нацыянальнага права?

14. Чаму не ўсе сфармуляваныя ў тэорыі права спосабы страты нарматыўным прававым актам юрыдычнай сілы былі дакладна замацаваны ў Законе Рэспублікі Беларусь «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь»?

Тэма 15. ПРАВАЎТВАРЭННЕ, ПРАВАТВОРЧАСЦЬ, НАРМАТВОРЧАСЦЬ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ КРЫНІЦ ПРАВА

1. Праваўтварэнне, фармаванне і стварэнне права. Праватворчасць, нарматворчасць і заканатворчасць.

2. Віды праваўтварэння (стварэння права), праватворчасці і нарматворчасці.

3. Дзяржаўная сістэма прававой інфармацыі. Адзіны прававы класіфікатар. Апублікаванне крыніц права.

4. Паняцце і віды сістэматызацыі крыніц права.

1. Праваўтварэнне, фармаванне і стварэнне права. Праватворчасць, нарматворчасць і заканатворчасць

У сучаснай юрыдычнай літаратуры ўжываюцца розныя паняцці і тэрміны для азначэння працэсаў, якія ляжаць у падмурку стварэння і развіцця права – праваўтварэнне, фармаванне права,

стварэнне права, праватворчасць, нарматворчасць, заканатворчасць і г. д. Розныя падыходы да вызначэння аб'ёму і зместу вышэйакрэсленых паняццяў і тэрмінаў у даследаваннях аўтараў, якія маюць сваё адметнае сістэмнае ўяўленне аб праве, яго сутнасці, праявах і іншых прававых рэальнасцях, як правіла, абапіраюцца на папярэдне зробленыя высновы, а таму з'яўляюцца лагічнымі і паслядоўнымі.

Як вядома, права першапачаткова зараджаецца ў таварна-грашовых адносінах. Удзельнікі гэтых адносін вымушаны ствараць пэўныя трафарэты, стандарты, правілы, нормы, з дапамогай якіх можна ўрэгуляваць сацыяльныя сувязі. Працэс гэты можа адбывацца стыхійна, але часцей за ўсё знаходзіцца пад кантролем грамадства і кожнага ўдзельніка грамадскіх адносін. Але ў любым выпадку пэўны трафарэт, пэўнае правіла паводзін будзе абавязкова створана, бо без яго існаваць і нармальна развівацца існуючыя ў грамадстве таварна-грашовыя адносіны не ў стане. Так ствараецца першасная форма існавання права – прававыя адносіны.

Сістэма створаных грамадствам прававых эквівалентаў затым асэнсоўваецца ўдзельнікамі грамадскіх адносін у якасці справядлівых, заканамерных, патрэбных грамадству правіл паводзін. Складваецца асобная форма грамадскай свядомасці – прававая свядомасць, якая і ўяўляе сабой другую форму існавання права. Уяўленні аб праве замацоўваюцца на ўзроўні ўсяго грамадства, ім надаецца агульнаабавязковае значэнне. Без гэтага створанае ў грамадстве права не будзе мець завершанай формы. Прававыя эквіваленты замацоўваюцца ў сістэме афіцыйна ўсталяваных крыніц права. Афіцыйна замацаванае ў грамадстве права называецца пазітыўным правам і складае трэцюю форму існавання права.

Кожная з адзначаных форм існавання права ўзнікае сваім адметным непаўторным шляхам, мае свой механізм фармавання і разам з тым з'яўляецца самастойным этапам у станаўленні права. Без існавання першасных прававых адносін не можа сфармавацца развітая прававая свядомасць, а без прававой свядомасці, без асэнсавання прававых эквівалентаў, якія склаліся ў першасных праваадносінах, не ўзнікае пазітыўнае права ў самых розных яго формах (крыніцах). Вядома, што права можа ўзнікаць і шляхам «зверху–уніз». Пры такім варыянце да механізмаў стварэння кожнай з форм існавання права дадаюцца новыя элементы, новыя прыёмы, невядомыя метады. У выніку мы атрымліваем даволі поўнае ўяўленне аб стварэнні кожнай з форм (іпастасяў) права.

Для апісання ўсяго працэсу станаўлення права цалкам, калі права існуе ў разгорнутай, поўнай форме і ўключае ў сябе тры іпастасі (прававыя адносіны, прававую свядомасць і пазітыўнае права), найбольш адэкватным будзе паняцце (тэрмін) праваўтварэння («правообразование»). Паняцце (тэрмін) праваўтварэння ўключае як асэнсаваныя, так і стыхійныя моманты, якія заўсёды прысутнічаюць на ўсіх этапах станаўлення права, і найлепшым чынам апісвае працэс станаўлення права, складвання ўсіх яго форм (іпастасяў). Паняцце праваўтварэння права апісвае паслядоўнасць і дынамізм у станаўленні права, паслядоўнасць у разгортванні і ўтварэнні ўсіх яго форм. Не менш важна і тое, што дадзенае паняцце скіравана на апісанне механізмаў пераходу ад адной формы існавання права да другой яго іпастасі (формы). Нарэшце, паняцце праваўтварэння ўключае не толькі стварэнне прававых эквівалентаў (суразмернасцей), але і іншых элементаў прававой матэрыі, якія суправаджаюць станаўленне прававых эквівалентаў на кожным этапе стварэння права.

Паняцце ж стварэння права будзе тоесным па аб'ёму паняццю праваўтварэння, але яно найлепшым чынам апісвае працэс праваўтварэння ў варыянце, калі станаўленне права адбываецца шляхам «зверху–уніз». Такім чынам, паняцці праваўтварэння і стварэння права з'яўляюцца найбольш агульнымі паняццямі, з дапамогай якіх апісваюцца ўсе магчымыя шляхі яго станаўлення. Гэтыя паняцці можна выкарыстоўваць і ў якасці ўзаемазамяняемых, але калі яны выкарыстоўваюцца побач, для апісання станаўлення права, то кожнае з іх будзе мець свае адметныя якасці і ўласцівасці. Паміж акрэсленымі паняццямі існуе і розніца, якая зводзіцца да наступнага. Праваўтварэнне заўсёды прыводзіць да стварэння права ва ўсіх ці некалькіх яго формах. Стварэнне ж права, якое пачынаецца «зверху–уніз», можа і не быць завершана вынікова. Можа так здарыцца, што правілы паводзін, якія створаны, напрыклад, дзяржаўнымі органамі, не будуць успрыняты грамадствам і не пераўтворацца ў прававыя эквіваленты.

Фармаванне права – паняцце (тэрмін), якое найбольш адэкватна апісвае складванне прававых эквівалентаў на самай першаснай стадыі станаўлення права, калі яно ствараецца ў ходзе разнастайных сацыяльных сувязей усіх удзельнікаў грамадскіх адносін. Дадзены тэрмін, як уяўляецца, найбольш адэкватна апісвае шмат у чым стыхійны характар складвання права ў рэальных грамадскіх адносінах. Прававыя эквіваленты тут менавіта фармуюцца, паступова «выспяваюць», эксперыментальна выпрабоўваюцца і правя-

раюцца на адпаведнасць сістэмным уяўленням аб прававой справядлівасці. Тэрмін «фармаванне» выкарыстоўваецца і ў дачыненнях да складвання правасвядомасці, а таксама ў адносінах да пазітыўнага права. Такім чынам, тэрмін «фармаванне» найбольш адэкватна апісвае складванне нейкай асобнай формы (іпастасі права) і найчасцей у спалучэнні з тэрмінам «права» выкарыстоўваецца для абазначэння і адлюстравання такой формы права, як прававыя адносіны.

На гэтай самай стадыі, асабліва на заключных яе фазах, там, дзе бярэ свой пачатак «правасвядомасць», г. зн. пачынае фармавацца правасвядомасць і пачынаецца мэтанакіраваная дзейнасць па наданню створаным прававым эквівалентам якасці пазітыўнага права, пачынаецца (ці заканчваецца) той від сацыяльна-карыснай дзейнасці, якая называецца *праватворчасцю і якая ўяўляе ўсвядомленую, мэтанакіраваную дзейнасць сацыяльных суб'ектаў, а таксама ўпаўнаважаных органаў, устаноў і арганізацый, скіраваную менавіта на стварэнне права*, а дакладней, на паспяховае завяршэнне працэсаў праваўтварэння. І пры гэтым не мае значэння шлях стварэння права. Праватворчасць альбо пачынаецца на заключных этапах фармавання права, у грамадскіх адносінах, альбо завяршаецца пасля таго, як створаныя і замацаваныя ў пазітыўным праве прававыя эквіваленты асэнсаваны і ўсвядомлены сацыяльнымі суб'ектамі (адрасатамі, удзельнікамі грамадскіх адносін) у якасці прававых эквівалентаў (суразмернасцей). Праватворчасць суправаджаецца элементамі планавасці і арганізаванасці, у сучасных развітых дзяржавах яна мае сістэмны характар і прагнозную падтрымку. Але для праватворчасці важна і тое, што яна скіравана не толькі на стварэнне нормы права, але і іншых яго праяў.

Паняцце ж нарматворчасці скіравана на тое, каб адлюстраваць працэс стварэння і замацавання сэрцавіны ўсіх трох форм існавання права – прававых эквівалентаў (норм права). Яно з'яўляецца больш вузкім у параўнанні з паняццем праваўтварэння, таму што апошняе ахоплівае стварэнне і іншых прававых рэалій. У юрыдычнай навуцы паняцце нарматворчасці выкарыстоўваецца таксама і ў іншым, больш шырокім плане. Паняццем нарматворчасці ў шырокім сэнсе слова называюць працэс стварэння самых розных па зместу і характару норм права – норм маралі, норм этыкету і г. д. і нават працэс стварэння тэхнічных норм.

У дадзенай тэме вучэбнага курса па агульнай тэорыі права паняцце нарматворчасці выкарыстоўваецца ў больш вузкім сэнсе слова, яно ўжываецца для абазначэння працэсаў стварэння права-

вых эквівалентаў (норм права). Такі падыход да азначэння нарматворчасці цалкам адпавядае разуменню нормы права, якое было сфармулявана намі ў папярэдніх тэмах. Разам з тым такое разуменне паняцця нарматворчасці адрозніваецца ад паняцця нарматворчасці, якое замацавана ў Законе аб нарматыўных прававых актах. Пад нарматворчай дзейнасцю ў адзначаным Законе разумеецца навуковая і арганізацыйная дзейнасць па падрыхтоўцы, экспертызе, змяненню, дапаўненню, прыняццю (выданню), тлумачэнню, прыпыненню дзеяння, прызнанню страціўшымі сілу ці адмене нарматыўных прававых актаў. Як бачна, нарматыўна замацаванае азначэнне нарматворчасці прывязваецца ў Законе «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь» да аднаго з відаў крыніц права – нарматыўных прававых актаў.

Такім чынам, праватворчасць ахоплівае працэс стварэння дзвюх форм існавання права – прававой свядомасці і ўсяго аб'ёму пазітыўнага права, а нарматворчасць уключае ў сябе працэс стварэння норм права на ўсіх этапах станаўлення права – як на этапе яго фармавання, так і на стадыі праватворчасці. Паміж паняццямі праватворчасці і нарматворчасці назіраецца несупадзенне. Несупадзенне існуе і паміж паняццямі праваўтварэння і нарматворчасці. Але гэта несупадзенне іншага характару. Нарматворчасць можна лічыць у пэўным сэнсе слова стрыжнем праваўтварэння, якое ўключае ў сябе працэс стварэння і іншых прававых рэалій.

2. Віды праваўтварэння (стварэння права), праватворчасці і нарматворчасці

Вышэйакрэсленыя паняцці (тэрміны), якія характарызуюць працэсы станаўлення права, уплываюць на вызначэнне відаў праваўтварэння (стварэння права), праватворчасці і нарматворчасці. Пры гэтым патрэбна зыходзіць з таго, што ў стварэнні права прымаюць удзел усе сацыяльныя суб'екты (фізічныя асобы) і самыя розныя іх аб'яднанні – працоўныя і тэрытарыяльныя калектывы, народ, нацыі, а таксама самыя розныя арганізацыі – дзяржава цалкам, яе асобныя органы, установы (службовыя асобы), кааператыўныя, прафсаюзныя і іншыя арганізацыі. Дзяржава цалкам, як вядома, выступае ад імя ўсяго грамадства, а кааператыўныя, прафсаюзныя і іншыя арганізацыі выяўляюць і прадстаўляюць інтарэсы часткі насельніцтва.

На вызначэнне відаў праваўтварэння (стварэння права), праватворчасці і нарматворчасці значны ўплыў аказвае сістэма дзею-

чых крыніц права. Справа ў тым, што кожная форма існавання (іпастасяў) права, як адзначалася ў папярэдніх тэмах, пераважна ўвасабляецца і афіцыйна замацоўваецца ў асобных відах крыніц права. Для першасных прававых адносін найбольш прыдатнымі відамі крыніц права з'яўляюцца прававы звычай і прававы прэцэдэнт. Прававая свядомасць знаходзіць замацаванне звычайна ў дактрыне і свяшчэнных пісаннях. А для пазітыўнага права найлепшымі відамі крыніц права з'яўляюцца нарматыўны прававы акт і дагавор нарматыўнага зместу.

Разам з тым, паколькі ў стварэнні права прымаюць удзел самыя розныя сацыяльныя суб'екты і самыя розныя арганізацыі, то ўсталяваць дакладна і аднастайна сувязі паміж сацыяльнымі суб'ектамі і асобнымі відамі крыніц права мы не можам. Напрыклад, нарматыўныя прававыя акты выдаюцца не толькі нарматворчымі органамі (службовымі асобамі) дзяржавы, але і ў адпаведнасці з дзеючым правам іншымі органамі і арганізацыямі. Унутрыдзяржаўныя дагаворы нарматыўнага зместу ствараюцца не толькі органамі дзяржавы, але і недзяржаўнымі арганізацыямі і працоўнымі калектывамі.

Праваўтварэнне (стварэнне права) можа быць поўным (завершаным) і незавершаным (няпоўным). Калі праваўтварэнне (стварэнне права) заканчваецца фармаваннем усіх акрэсленых форм існавання права (яго іпастасяў), то мы маем справу з поўным праваўтварэннем. А калі праваўтварэнне (стварэнне права) не прыводзіць да фармавання ўсіх іпастасяў права (форм яго існавання), то мы маем справу з няпоўным праваўтварэннем (стварэннем права). З няпоўным праваўтварэннем мы сутыкаемся, калі па нейкіх прычынах не фармуецца пазітыўнае права, але часцей за ўсё у сітуацыях, калі на падставе прынятых правіл паводзін (мадэляў паводзін) па нейкіх прычынах не складваюцца прававыя адносіны. У першым выпадку, як сведчыць гістарычны вопыт, права можа функцыянаваць і аказваць рэальнае ўздзеянне на грамадскія адносіны, а вось у другім выпадку, напэўна, не варта называць створаныя правілы паводзін нормамі права, бо калі яны не прымаюцца грамадствам, значыць, сацыяльныя адносіны, на якія яны павінны ўздзейнічаць, не маюць прававой прыроды.

Што тычыцца відаў праватворчасці, то яны могуць быць вызначаны шляхам канкрэтызацыі мэт праватворчасці. Калі дзейнасць суб'ектаў, якія ажыццяўляюць праватворчасць, скіравана на стварэнне якасна новых прававых эквівалентаў, такіх норм права, аналагаў якіх не існуе ў дзеючым праве, то мы маем справу з такім

відам праватворчасці, які ўмоўна можна назваць праваствараючым (ці праваўстанаўліваючым). Калі ж дасягаецца мэта па змяненню дзеючых прававых эквівалентаў, то мы маем справу са змяненнем права (ці правазмяняючай праватворчасцю). А калі мэтай дзейнасці сацыяльных суб'ектаў з'яўляецца адмена прававых эквівалентаў, якія страцілі сваё значэнне і не адпавядаюць новым рэальнасцям, то мы маем справу з адменай права (ці праваадмяняючым відам праватворчасці). Адзначаныя віды праватворчасці з'яўляюцца агульнымі відамі праватворчасці як для правасвядомасці, так і для пазітыўнага права. Больш таго, яны ўлічваюць усе праявы адзначаных форм існавання права, а не толькі той іх часткі, якая называецца прававым эквівалентам.

Але прававыя эквіваленты з'яўляюцца сэрцавінай дзеючага права, усіх яго форм. Як вядома з папярэдніх тэм, прававыя эквіваленты змяшчаюцца, выкладаюцца ў нормах права, а нормы права знаходзяць замацаванне і ўвасабленне ў дзеючых крыніцах права.

Пры спалучэнні асобных відаў сацыяльных суб'ектаў і відаў крыніц права, у якіх знаходзяць афіцыйнае выражэнне і замацаванне прававыя эквіваленты, мы можам выдзеліць віды нарматворчасці. Існуюць такія віды крыніц права, якія заўсёды завязаны на дзяржаву, бо без актыўных і мэтанакіраваных дзеянняў з боку дзяржавы, яе органаў і ўстаноў не можа быць завершаны працэс станаўлення права і не могуць быць створаны гэтыя крыніцы права. Так, без дзяржавы не ўзнікаюць такія крыніцы права, як нарматыўны прававы акт і міжнародны дагавор нарматыўнага зместу. Разам з тым вельмі важныя нарматыўныя прававыя акты, напрыклад, Канстытуцыя краіны, могуць быць прыняты і шляхам усенароднага галасавання (рэферэндуму), як гэта адбылося ў Рэспубліцы Беларусь 24 лістапада 1996 года пад час усенароднага галасавання.

У той самы час усенародны рэферэндум можа і не прывесці да стварэння такой крыніцы права, як нарматыўны прававы акт, тым не менш яго вынікі будуць мець агульнаабавязковае значэнне па нейкаму пытанню, напрыклад, рашэнне, якое было прынята на ўсенародным галасаванні (рэферэндуме) па пытанню аб уласнасці на зямлю. Наадварот, такая, напрыклад, крыніца права, як прававы звычай, можа быць створана і без удзелу дзяржавы. Больш таго, яна і выкарыстоўвацца можа без падтрымкі з боку дзяржавы, а абапірацца пры гэтым прававы звычай будзе на прымусовую сілу з боку супольнасці.

На наш погляд, можна выдзеліць наступныя віды нарматворчасці: а) дзяржаўную нарматворчасць; б) міждзяржаўную нарма-

творчасць, у тым ліку нарматворчасць міжнародных арганізацый; в) народную нарматворчасць, у тым ліку нарматворчасць шляхам рэферэндуму; г) нарматворчасць міжнародных арганізацый і недзяржаўных арганізацый унутры краіны; д) лакальную нарматворчасць; е) нарматворчасць мясцовых органаў самакіравання і кіравання; ж) нарматворчасць асобных сацыяльных груп; з) прэцэдэнтную нарматворчасць; е) сумесную нарматворчасць.

Усе віды нарматворчасці ў залежнасці ад іх ролі і значнасці ў стварэнні прававых эквівалентаў можна падзяліць на асноўныя і дадатковыя. Праз дзяржаўную і міждзяржаўную нарматворчасць у беларускую нацыянальную прававую сістэму ўводзіцца асноўная маса дзеючых норм права, і менавіта па дадзенай прымеце іх можна аднесці да асноўных відаў нарматворчасці. Такім чынам, падзел відаў нарматворчасці на асноўныя і дадатковыя адрозніваецца ад падстаў падзелу крыніц права на крыніцы асноўныя і дадатковыя.

Дзяржаўная нарматворчасць падрабязна і ўсебакова даследавана навукоўцамі і звычайна выкладаецца ў падручніках і вучэбных дапаможніках. Аб міждзяржаўнай праватворчасці ў агульнай тэорыі права чамусьці не ўзгадваецца, хаця неаспрэчным з'яўляецца факт, што міжнародныя дагаворы, якія належным чынам прызнаны дзяржавай абавязковымі, з'яўляюцца складанай часткай нацыянальнага права. Дзіўна атрымліваецца – стварэнне міжнароднага дагавору, якое, безумоўна, не ўкладваецца ў паняцце дзяржаўнай праватворчасці, не выдзяляецца ў самастойны від нарматворчасці. У той самы час прыняцце адной і той самай крыніцы права – нарматыўнага прававога акта – з аднаго боку, дзяржавай, а з другога – шляхам усенароднага галасавання, не перашкаджае навукоўцам весці размову аб двух самастойных відах нарматворчасці.

Дзяржаўная нарматворчасць, у сваю чаргу, падзяляецца на асобныя падвіды ў залежнасці ад той галіны ўлады, якая стварае прававы эквівалент і замацоўвае яго ў нормах права. У гэтым плане можна весці размову аб заканатворчасці, нарматворчасці выканаўчай і распарадчай улады і нарматворчасці судовай улады. Праўда, судовая ўлада стварае розныя прававыя акты. Адны з іх з'яўляюцца мадыфікаванымі крыніцамі права, а другія ўяўляюць такую крыніцу права, як прававы прэцэдэнт.

Народная нарматворчасць не можа быць зведзена толькі да рэферэндуму – нацыянальнага (усенароднага) ці мясцовага, на якіх прымаюцца нарматыўныя прававыя акты. Шляхам народнай нарматворчасці можа быць прынята і індывідуальнае прававое рашэнне (індывідуальны прававы эквівалент) па канкрэтнаму пытанню,

якое затым будзе «разгорнута», «канкрэтызавана» ў нормах права. Да народнай нарматворчасці можна аднесці і стварэнне прававых аксіём і звычаёвых норм.

Да самастойных відаў нарматворчасці патрэбна аднесці нарматворчасць, якая шчыльна звязана з дзейнасцю асобных сацыяльных суб'ектаў, напрыклад, навукоўцаў і калектываў навукоўцаў, а таксама асобных недзяржаўных арганізацый, напрыклад, прафесіянальных саюзаў, кааператыўных арганізацый, царквы і г. д. У выніку іх дзейнасці могуць быць створаны правілы паводзін (нормы права) у форме дактрыны (навукі), свяшчэннага пісання (царкоўных норм), а таксама нарматыўнага прававога акта ці дагавору нарматыўнага зместу.

Прыкладам сумеснай нарматворчасці можа быць стварэнне норм права шляхам заключэння пагадненняў (дагавораў нарматыўнага зместу) паміж дзяржавай, яе органамі і прафесійнымі саюзамі ці дзяржавай і царквой. Да сумеснай нарматворчасці можна таксама аднесці, напрыклад, дагавор (пагадненне) паміж рознымі адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі ўнутры дзяржавы, а таксама паміж адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі, якія ўваходзяць у склад розных дзяржаў.

Да лакальнай нарматворчасці можна аднесці працэс стварэння і замацавання такіх відаў крыніц права, як лакальныя нарматыўныя прававыя акты і калектыўныя дагаворы. Калектыўныя дагаворы ўяўляюць, як вядома, разнавіднасць такой крыніцы права, як дагавор нарматыўнага зместу, а лакальныя нарматыўныя прававыя акты – гэта разнавіднасць нарматыўных прававых актаў. Тое, што аб'ядноўвае іх у адзіную падсістэму крыніц права і адначасова дазваляе выдзеліць у самастойны від нарматворчасці, тычыцца межаў дзеяння гэтых крыніц права, працэсаў і суб'ектаў іх стварэння.

Выдзяленне нарматворчасці мясцовых органаў самакіравання і кіравання ў асобны і самастойны від нарматворчасці абумоўлена тым, што гэтыя органы выяўляюць інтарэсы тэрытарыяльных калектываў і абавязаны іх задавальняць і абараняць. У той самы час мясцовыя органы самакіравання і кіравання рэалізуюць свае паўнамоцтвы шляхам выдання нарматыўных прававых актаў і прычым не могуць не ажыццяўляць на сваёй тэрыторыі тых крыніц права, якія прыняты іншымі сацыяльнымі суб'ектамі, дзяржаўнымі і недзяржаўнымі органамі.

Прэцэдэнтная нарматворчасць не можа быць зведзена да стварэння судовага прэцэдэнта. Прававы прэцэдэнт – гэта такая крыніца права, якая можа быць створана і іншымі правапрымяняльнымі структурамі.

3. Дзяржаўная сістэма прававой інфармацыі. Адзіны прававы класіфікатар. Апублікаванне крыніц права

У Рэспубліцы Беларусь створана і дзейнічае унікальная сярод дзяржаў СНД Дзяржаўная сістэма прававой інфармацыі (скарочана – ДзСПІ). Яна ўключае: а) аўтаматызаваную сістэму фармавання дзяржаўнага інфармацыйнага прававога рэсурсу; б) сістэму распаўсюджання прававой інфармацыі; в) сістэму міждзяржаўнага абмену прававой інфармацыяй.

Аўтаматызаваная сістэма фармавання дзяржаўнага інфармацыйнага прававога рэсурсу ўключае ў сябе: 1) Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь – адзіную уніфікаваную сістэму ўліку і афіцыйнага апублікавання прававых актаў, якая не мае аналагаў на тэрыторыі СНД; 2) Эталонны банк дазеных прававой інфармацыі (скарочана – ЭБДПІ), які ўяўляе сабой поўны сістэматызаваны збор заканадаўства Рэспублікі Беларусь на электронных (магнітных) носьбітах у кантрольным стане і створаныя на яго базе іншыя базы дадзеных. Эталонны банк дадзеных прававой інфармацыі ўтрымлівае звесткі аб: а) нарматыўных прававых актах дзяржаўных органаў; б) аб міжнародных дагаворах; в) аб актах органаў кіравання і самакіравання. Эталонны банк дадзеных прававой інфармацыі папаўняецца інфармацыяй «Судовая практыка». Але пакуль што незразумела, якую практыку павінен утрымліваць ЭБДПІ; 3) Адзіны прававы класіфікатар – сістэматызаваны звод кодаў і найменняў класіфікацыйных дзяленняў, якія адлюстроўваюць галіны права і прававыя інстытуты, што згрупаваны па прадмету прававога рэгулявання і прызначаны для фармавання інфармацыйных масіваў прававой інфармацыі.

Сістэма распаўсюджання прававой інфармацыі прадстаўляе афіцыйную, поўную і актуальную прававую інфармацыю дзяржаўным органам, юрыдычным і фізічным асобам з дапамогай друкаваных выданняў, у камп'ютарным выглядзе, у тым ліку і праз Інтэрнет.

Прыватным выпадкам і адначасова складанай часткай сістэмы распаўсюджання прававой інфармацыі з'яўляецца пытанне аб апублікаванні крыніц права – давядзенні ідэнтычнага зместу дзеючых крыніц права да ведама суб'ектаў права, удзельнікаў грамадскіх адносін. Паколькі з апублікаваннем звязаны вельмі істотныя моманты дзеяння крыніц права, то звычайна ў кожнай нацыянальнай прававой сістэме ўсталёўваецца вельмі дакладны пералік афіцыйных сродкаў апублікавання для кожнага віду дзеючых крыніц права.

Згодна з агульным правілам апублікавання крыніц права, якое дзейнічае ў прававой сістэме Рэспублікі Беларусь, афіцыйнае апублікаванне крыніц права адбываецца пасля таго, як яны ўключаны ў Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, г. зн. зарэгістраваны адпаведным чынам, а датай афіцыйнага апублікавання лічыцца выхад у свет афіцыйнага выдання, у якім змешчана крыніца права. Але дэкрэты Прэзідэнта краіны і законы падлягаюць неадкладнаму афіцыйнаму апублікаванню адразу пасля падпісання.

У адпаведнасці з Палажэннем аб афіцыйным апублікаванні і ўступленні ў сілу прававых актаў Рэспублікі Беларусь, якое было зацверджана Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 10.12.1998 г. № 22, былі вызначаны выданні, якія ажыццяўляюць афіцыйнае апублікаванне нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь. Да іх ліку адносяцца: Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь (для ўсіх нарматыўных прававых актаў), газета «Советская Белоруссия» (для актаў Прэзідэнта краіны, пастаноў Пленумаў Вярхоўнага і Вышэйшага Гаспадарчага Судоў), газеты «Звязда» і «Народная газета» (для законаў, пастаноў палат Парламента, рашэнняў Канстытуцыйнага Суда), газета «Рэспубліка» (для пастаноў Савета Міністраў краіны, актаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання). Для нарматыўных прававых актаў, якія выдаюцца органамі мясцовага самакіравання і кіравання, афіцыйнымі крыніцамі (сродкамі) апублікавання з'яўляюцца выданні, якія вызначаюцца абласнымі Саветамі дэпутатаў і выканаўчымі камітэтамі.

Сёння ДзСПІ практычна выступае складанай часткай прававой сістэмы дзяржавы, механізма прававога рэгулявання і прававога ўздзеяння.

4. Паняцце і віды сістэматызацыі крыніц права

Непасрэднымі вынікамі праваўтварэння (стварэння права), розных відаў праватворчасці і нарматворчасці з'яўляецца права ў розных формах яго існавання – у форме праваадносін, прававой свядомасці і пазітыўнага права. Дзеючае права павінна быць адэкватным існуючым грамадскім адносінам, лагічным і несупярэчлівым. Паколькі асноўнай (вядучай) формай права ў рамана-германскай прававой (кантынентальнай) прававой сям'і з'яўляецца пазітыўнае права, а асноўнай яго крыніцай выступае нарматыўны прававы акт, то паняцце сістэматызацыі распрацоўвалася ў айчын-

най юрыдычнай навуцы пераважна на прыкладзе дадзенай крыніцы права. Але ў беларускай прававой сістэме выкарыстоўваецца не толькі нарматыўны прававы акт, а ўсе віды крыніц права, таму мэтазгодна ахапіць паняццем сістэматызацыі ўсе віды дзеючых крыніц права і весці размову аб сістэматызацыі крыніц права. Акрамя гэтага, мэтазгодна ўключыць у паняцце сістэматызацыі дзейнасць не толькі дзяржавы, але і іншых сацыяльных суб'ектаў, якія альбо ствараюць дзеючыя крыніцы права, альбо іх выкарыстоўваюць. У такім разе *пад сістэматызацыяй у самым агульным плане можна разумець дзейнасць дзяржавы, яе органаў і іншых сацыяльных суб'ектаў, якая скіравана на сістэматыку і падтрыманне дзеючых крыніц права ў «працоўным стане».*

У залежнасці ад відаў крыніц права, якія сістэматызуюцца, можна выдзеліць сістэматызацыю нарматыўных прававых актаў, дагавораў нарматыўнага зместу, прэцэдэнтаў, нарматыўных актаў органаў судовай улады і г. д. У залежнасці ад суб'ектаў, якія праводзяць сістэматызацыю, можна весці размову аб сістэматызацыі дзяржаўнай і недзяржаўнай. Крыху іншыя віды сістэматызацыі крыніц права атрымліваюцца пры падзеле сістэматызацыі на афіцыйную і неафіцыйную.

Сістэматызацыя крыніц права праводзіцца з рознымі мэтамі, рознымі суб'ектамі і рознымі метадамі. У залежнасці ад дадзеных крытэрыяў можна выдзеліць наступныя яе віды: інкарпарацыю, кансалідацыю, кадыфікацыю.

Інкарпарацыя (ад лац. in corpore – «цэлае», «у адно») уяўляе сабой такую дзейнасць, мэтай якой з'яўляецца звядзенне ў адзінае цэлае ўжо дзеючых у грамадстве нарматыўных прававых актаў і іншых крыніц права. Падчас інкарпарацыі выяўляюцца састарэлыя і супярэчлівыя нормы права, якія змешчаны ў розных крыніцах права. У выпадку, калі інкарпарацыя мае афіцыйны характар, састарэлыя нормы права «выводзяцца» з прававой сістэмы, а супярэчнасці ліквідуюцца. Прыкладам інкарпарацыі з'яўляюцца разнастайныя зборнікі заканадаўства Рэспублікі Беларусь, у якіх змяшчаюцца нарматыўныя прававыя акты, а таксама іншыя крыніцы норм права, якія рэгламентуюць пэўныя віды грамадскіх адносін, напрыклад, працоўнае заканадаўства, пенсіённае заканадаўства і г. д. Інкарпарацыя дазваляе сабраць, як кажуць, пад адной «вокладкай» усе крыніцы права (ці іх асобныя часткі), агледзець увесь аб'ём нарматыўнага матэрыялу з тым, каб распрацаваць стратэгію і тактыку яго ўдасканалення. Інкарпарацыя з'яўляецца універсальным відам сістэматызацыі крыніц права, таму што яна прыдатная для кожнага з відаў крыніц права і для ўсёй іх сістэмы.

Кансалідацыя ўяўляе сабой аб'яднанне некалькіх крыніц права, якія рэгламентуюць адны і тыя самыя грамадскія адносіны па адных і тых жа пытаннях, у адну крыніцу. У адрозненне ад інкарпарацыі, якая прыдатная для сістэматызацыі абсалютна ўсіх відаў крыніц права, кансалідацыя можа быць выкарыстана пры сістэматызацыі аднайменных крыніц права. Аб'яднаць у адну крыніцу можна, напрыклад, нарматыўныя прававыя акты, якія выдадзены адным і тым жа органам дзяржавы па аднаму і таму ж пытанню. Кансалідаваць можна, напрыклад, і дагаворы нарматыўнага зместу, якія заключаны аднымі і тымі ж суб'ектамі нарматворчасці, г. зн. маюць аднолькавую юрыдычную сілу, у адзін дагавор нарматыўнага зместу.

Кадыфікацыя ўяўляе сабой дзейнасць дзяржавы, яе органаў ці некалькіх дзяржаў па сістэматызацыі крыніц права, у выніку якой на месцы мноства дзеючых крыніц права, якія рэгламентавалі грамадскія адносіны, з'яўляецца адзіная і якасна новая па форме і зместу крыніца права (часта пад назвай «Кодэкс»). Пры гэтым тыя крыніцы права, якія дагэтуль уздзейнічалі на грамадскія адносіны, прызнаюцца страціўшымі юрыдычную сілу. Такім чынам, кадыфікацыя вырашае шэраг задач. Па-першае, яна прыводзіць да якаснага абнаўлення прававога рэгулявання грамадскіх адносін. Па-другое, кадыфікацыя садзейнічае ліквідацыі супярэчнасцей у сістэме крыніц права. Па-трэцяе, кадыфікацыя змяншае аб'ём дзеючага нарматыўнага прававога матэрыялу і робіць яго больш кампактным і зручным для правапрымяняльнікаў і правакарыстальнікаў.

Выдзяляецца кадыфікацыя нацыянальная і міжнароднаправавая, кадыфікацыя суцэльная (генеральная), галіновая і кадыфікацыя ў межах галінаў, падгалінаў і асобных інстытутаў права. Кадыфікацыя – такі від сістэматызацыі, які выкарыстоўваецца пераважна для сістэматызацыі аднаго і відаў крыніц права. Унутры дзяржавы такой крыніцай права выступае нарматыўны прававы акт, а ў міжнародным праве кадыфікуюцца звычайна шматбаковыя дагаворы і прававыя звычаі.

Кадыфікацыя – такі від дзейнасці ў сферы права, у якім арганічна спалучаюцца элементы праватворчасці, нарматворчасці і сістэматызацыі. Стварэнне кадыфікаваных актаў, асабліва правядзенне галіновай ці суцэльнай кадыфікацыі, патрабуе грунтоўных навуковых распрацовак, прыняцця сістэмы якасна новых крыніц права і адмены састарэлых, стаціўшых сваё значэнне. Пры кадыфікацыі ствараюцца якасна новыя прававыя эквіваленты альбо ў форме правасвядомасці і навуковых палажэнняў, альбо ў форме

іншых крыніц права. Калі створаныя падчас кадыфікацыі прававыя эквіваленты па нейкіх прычынах не знаходзяць увасабленне ў дзеючай сістэме крыніц права, то мы маем справу з элементамі праватворчасці, калі ж прававыя эквіваленты знаходзяць замацаванне ў дзеючай сістэме крыніц права (у пазітыўным праве), то мы маем справу з нарматворчай прыродай кадыфікацыі, а калі падчас і ў выніку кадыфікацыйнай дзейнасці ўладкоўваецца сістэма дзеючых крыніц права, то мы назіраем праявы сістэматызацыі.

Часта сярод відаў, асобных форм сістэматызацыі называюць улік, класіфікацыю і размяшчэнне (рэгістрацыю) нарматыўных прававых актаў (крыніц права). Аднак падчас дадзенай дзейнасці, якая ажыццяўляецца як дзяржаўнымі, так і недзяржаўнымі органамі і арганізацыямі, сістэма дзеючых крыніц права не ўладкоўваецца ні па форме, ні па зместу. У Рэспубліцы Беларусь улік і рэгістрацыя крыніц права ажыццяўляецца Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі (НЦПІ), які адначасова праводзіць працу па стварэнню і захаванню Эталоннага банка дадзеных прававой інфармацыі (ЭБДПІ). Выданне НЦПІ афіцыйнай крыніцы апублікавання крыніц права – Нацыянальнага рэестра прававых актаў Рэспублікі Беларусь – дзейнасць, якая, безумоўна, мае дачыненне да сістэматызацыі крыніц права, бо стварае неабходныя перадумовы для інкарпарацыі, кансалідацыі і кадыфікацыі. Але як пры рэгістрацыі крыніц права ў НЦПІ, так і пры вядзенні іх Нацыянальнага рэестра, як пры захаванні крыніц права ў ЭБДПІ, так і пры іх апублікаванні ў Нацыянальным рэестры прававых актаў крыніцы права не апрацоўваюцца і не ўдасканальваюцца ні па форме, ні па зместу, а таму адзначаныя віды дзейнасці органаў дзяржавы не маюць дачынення да сістэматызацыі крыніц права.

Апошнім часам у нарматворчай дзейнасці мы сустракаемся з даволі пашыранай практыкай унясення змяненняў у дзеючыя крыніцы права і выдання крыніц права (асабліва нарматыўных прававых актаў) у новай рэдакцыі). Дадзеная дзейнасць скіравана галоўным чынам на тое, каб стварыць адмысловыя новыя прававыя эквіваленты ці змяніць існуючыя нормы права. Яна суправаджаецца таксама прызнаннем страціўшымі сілу пэўных відаў крыніц права і такім чынам часткова выконвае асобныя задачы па сістэматызацыі крыніц права. Але прававая прырода гэтага віду дзейнасці ў сферы права пакуль што вывучана не да канца, і таму было б паспешным адносіць яе да асобнага віду сістэматызацыі крыніц права. Дадзенае пытанне патрабуе далейшага вывучэння.

Да асобных відаў сістэматызацыі ў вучэбных дапаможніках і падручніках па агульнай тэорыі права часта адносяць Звод законаў і выданне Зборнікаў дзеючага заканадаўства.

Пытанні для самаправеркі

1. Раскрыйце змест паняцця праваўтварэння, назавіце яго віды і раскрыйце іх змест.
2. Ахарактарызуйце паняцце праватворчасці, вызначце пачатак праватворчай дзейнасці і раскрыйце змест яго асноўных стадый.
3. У чым падобны і ў чым разыходзяцца паміж сабой паняцце праватворчасці і паняцце стварэння права?
4. Якім чынам паняцце фармавання права суадносіцца з паняццямі праваўтварэння і стварэння права?
5. Раскрыйце змест паняцця нарматворчасці.
6. Пералічыце віды нарматворчасці і раскрыйце іх змест.
7. З якіх элементаў (частак) складаецца дзяржаўная сістэма прававой інфармацыі?
8. Што ўяўляе сабой адзіны прававы класіфікатар?
9. Раскрыйце змест паняцця афіцыйных крыніц апублікавання крыніц права і пералічыце віды афіцыйных крыніц апублікавання ў Рэспубліцы Беларусь.
10. Што ўяўляе сабой сістэматызацыя крыніц права, якія віды сістэматызацыі крыніц права Вы ведаеце?
11. Раскрыйце змест інкарпарацыі крыніц права.
12. Ахарактарызуйце кансалідацыю крыніц права.
13. Вызначце змест і пералічыце віды кадыфікацыі крыніц права.

Тэма 16. РЭАЛІЗАЦЫЯ, ПРЫМЯНЕННЕ І ТЛУМАЧЭННЕ ПРАВА

1. Паняцце, азначэнне рэалізацыі права, формы рэалізацыі права.
2. Паняцце, азначэнне і віды прымянення права.
3. Стадыі прымянення права.
4. Акт прымянення права.
5. Тлумачэнне права.
6. Прабелы ў праве, спосабы запаўнення і ліквідацыі прабелаў у праве.

1. Паняцце, азначэнне рэалізацыі права, формы рэалізацыі права

Рэалізацыя права – працэс, які па сваёй скіраванасці ў прававой прасторы адваротны працэсу праваўтварэння (стварэння права). І ў залежнасці ад таго, як разумеецца права, асэнсоўваецца працэс яго стварэння, будуюцца і разважанні аб рэалізацыі права, яго формах і г. д. Акрамя гэтага, як нам вядома, працэс праваўтварэння (стварэння права) можа быць поўным і ўсечаным. Права ў ходзе праваўтварэння (стварэння) можа прайсці поўны цыкл і існаваць у трох формах, але працэс яго стварэння можа быць скарочаным па самых розных прычынах. Працэс яго формавання можа быць завершаны на стадыі фармулявання прававых эквівалентаў, стандартаў, звычаёвых форм ці на стадыі асэнсавання прававых эквівалентаў – у форме правасвядомасці. Калі права ствараецца шляхам «зверху–уніз», то працэс яго стварэння таксама можа быць поўным і ўсечаным. Прыкладам апошняга можа быць стварэнне такіх норм, якія не знаходзяць свайго ўвасаблення ў паводзінах удзельнікаў грамадскіх адносін, так званага «кніжнага права».

Пры скарочаных, усечаных варыянтах стварэння права мы будзем мець адзін варыянт рэалізацыі права, а пры поўным, завершаным цыкле стварэння права атрымаем зусім іншую карціну.

Калі працэс стварэння права шляхам «знізу–уверх» завяршаецца адмысловай адбудовай яго нарматыўнай складанай часткі, яе форм, сістэматызацыяй усіх праяў права, то пасля гэтага пачынаецца працэс руху права «зверху–уніз». Створаныя і замацаваныя ў формах (крыніцах) права нормы права пачынаюць аказваць уздзеянне на паводзіны ўдзельнікаў грамадскіх адносін. Такое ўздзеянне ажыццяўляецца ў самых розных формах і шмат у чым прадвы-

значаецца этапам адваротнага ўздзеяння права на грамадскія адносіны, той стадыяй (формай існавання права), на якой знаходзіцца працэс руху права «зверху–уніз».

На стадыі існавання права ў форме нарматыўнай складанай часткі, калі права існуе ў форме нарматыўных прававых прадпісанняў, яно ўздзейнічае на паводзіны ўдзельнікаў грамадскіх адносін у наступным парадку.

Частка норм права, у якіх усталяваны разнастайныя забароны на нейкія паводзіны, дзеянні і ўчынкі, стрымлівае ўдзельнікаў грамадскіх адносін ад іх здзяйснення. У гэтым выпадку можна гаварыць аб тым, што нормы права ўвасабляюцца ў жыццё, у паводзіны людзей шляхам іх захавання. Забарона рэалізуецца не тады, калі парушаецца, а тады, калі не парушаецца, а захоўваецца. Гэтаксама рэалізуюцца і такія нормы права, у якіх укладваюцца разнастайныя абавязкі пасіўнага характару.

Частка норм права, у якіх замацоўваюцца абавязкі актыўнага характару, г. зн. абавязкі на здзяйсненне актыўных знешніх дзеянняў і ўчынкаў, увасабляюцца ў жыццё, у паводзіны людзей і іншых удзельнікаў грамадскіх адносін праз актыўныя знешнія паводзіны ўдзельнікаў грамадскага жыцця.

Нормы права, у якіх замацоўваюцца разнастайныя правы, свабоды і законныя інтарэсы грамадзян, іншых фізічных асоб, а таксама іншых удзельнікаў грамадскіх адносін, рэалізуюцца пры ўмове, што ўдзельнікі грамадскіх адносін выкарыстоўваюць такія прававыя магчымасці ў сваім жыцці.

Акрэсленыя шляхі ўздзеяння норм права на паводзіны людзей складаюць асобныя формы рэалізацыі права, а дакладней, асобныя формы рэалізацыі нарматыўнай формы існавання права – захаванне, выкананне і выкарыстанне. Для дадзеных форм рэалізацыі права характэрна тое, што яны ажыццяўляюцца без актыўнага ўмяшальніцтва дзяржавы і іншых сацыяльных суб'ектаў і арганізацый у дадзены працэс. Умоўна кажучы, паміж нормамі права, якія ўвасабляюцца ў паводзінах удзельнікаў грамадскага жыцця, і паводзінамі ўдзельнікаў грамадскіх адносін не існуе неабходнасці ў дапамозе з боку іншых арганізацый, органаў і ўстаноў. Працэс рэалізацыі права адбываецца амаль «аўтаматычна». Калі ў гэтай справе і прысутнічаюць іншыя сацыяльныя суб'екты і нават органы і ўстановы дзяржавы, то яны не ўжываюць пры гэтым уладных паўнамоцтваў.

Такім чынам, пад рэалізацыяй права пры поўным цыкле стварэння права можна разумець працэс увасаблення норм права, якія

знайшлі замацаванне ў дзеючых крыніцах (формах) права, у паводзінах удзельнікаў грамадскіх адносін.

Акрэсленае разуменне рэалізацыі права называецца непасрэдным. Непасрэднасць азначае, што нормы права ўвасабляюцца ў паводзіны ўдзельнікаў грамадскіх адносін без узнікнення нейкіх прамежкавых прававых з'яў. Але непасрэдная рэалізацыя – далёка не адзіны шлях увасаблення прававых прадпісанняў у паводзіны людзей. На падставе дзеючых норм права ўдзельнікі грамадскіх адносін заключаюць паміж сабой разнастайныя пагадненні, здзяйсняюць іншыя ўчынкі (дзеянні) шляхам уступлення ў прававыя адносіны. Такі шлях рэалізацыі права называецца апасрэдаваным.

2. Паняцце, азначэнне і віды прымянення права

Далёка не заўсёды дзеючыя ў грамадстве нормы права добраахвотна і «аўтаматычна» захоўваюцца, выконваюцца і выкарыстоўваюцца ўдзельнікамі грамадскіх адносін. У гэтых выпадках існуе неабходнасць у актыўным умяшальніцтве дзяржавы, яе органаў, устаноў, службовых асоб, іншых сацыяльных суб'ектаў і арганізацый у працэс рэалізацыі норм права. Дадзенае ўмяшальніцтва ажыццяўляецца шляхам выкарыстання ўладных паўнамоцтваў, шляхам прымусу да выканання прадпісанняў норм права.

Існуе некалькі найбольш тыповых прычын (фактараў), якія абумоўліваюць неабходнасць уладнага ўмяшальніцтва ў працэс рэалізацыі права.

1. Дзяржава вымушана прымяняць нормы права ў выпадку, калі яны парушаны, калі яны не выконваюцца і нават тады, калі яны не выкарыстоўваюцца, напрыклад, уздзеянне на службовых асоб у мэтах належнага выканання імі сваіх службовых абавязкаў.

2. Дзяржава вымушана прымяняць нормы права ў выпадках, калі паміж рознымі суб'ектамі грамадскіх адносін узнікаюць спрэчкі наконт правоў, свабод і абавязкаў.

3. Дзяржава вымушана прымяняць нормы права ў выпадках, калі для нармальнага развіцця і функцыянавання грамадскіх адносін патрэбна зафіксаваць і пацвердзіць сапраўднасць тых ці іншых жыццёвых сітуацый, дзеянняў людзей, якія маюць юрыдычнае значэнне (напрыклад, дзейнасць натарыяльных кантор па рэгістрацыі грамадзянскіх здзелак).

4. Дзяржава актыўна ўмешваецца ў працэс рэалізацыі норм права і прымяняе іх у сітуацыях, калі размова ідзе аб выкарыстанні дзяржаўных матэрыяльна-фінансавых сродкаў і рэсурсаў (напрыклад, прызначэнне пенсій, стыпендый і іншых выплат).

Існуюць і іншыя выпадкі і тыповыя сітуацыі, якія прыводзяць да неабходнасці актыўнага і ўладнага ўмяшальніцтва ў працэс рэалізацыі права. *Рэалізацыя права, якая адбываецца шляхам актыўнага і ўладнага ўмяшальніцтва ў працэс рэалізацыі права з боку дзяржавы, яе органаў, устаноў, службовых асоб, іншых сацыяльных суб'ектаў і арганізацый, называецца прымяненнем права.*

Прымяняючы нормы права, дзяржава і іншыя сацыяльныя структуры як бы накладваюць (прыкладваюць) агульнае правіла паводзін, якое замацавана ў норме права, да канкрэтнай жыццёвай сітуацыі ці, наадварот, канкрэтную жыццёвую сітуацыю як бы падводзяць пад агульнае правіла паводзін. У выпадку прымянення права паміж правіламі паводзін і паводзінамі ўдзельнікаў грамадскіх адносін заўсёды прысутнічае надзеленая ўладнымі паўнамоцтвамі структура, без актыўных дзеянняў якой правіла паводзін не можа быць увасоблена ў жыццё.

Існуе шэраг універсальных патрабаванняў да прымянення права, якія былі сфармуляваны юрыдычнай навукай, выпрацаваны ў ходзе прымянення права і знайшлі нарматыўнае замацаванне практычна ва ўсіх нацыянальных прававых сістэмах.

1. Прымяненне права павінна быць здзейснена ў адпаведнасці з пэўнымі юрыдычнымі працэдурамі з захаваннем норм працэсуальнага права.

2. Прымяненне права павінна быць кампетэнтным: пэўная норма права павінна быць прыменена толькі ўпаўнаважаным на прымяненне органам, установай дзяржавы і службовай асобай ці іншай сацыяльнай структурай.

3. Прымяненне права павінна быць законным: яно павінна быць здзейснена на падставе закону і ў прадугледжаных законам формах.

4. Прымяненне права павінна быць абгрунтаваным: усе неабходныя матэрыяльныя і фармальныя патрабаванні і доказы павінны быць вытрыманы і сабраны

5. Прымяненне права павінна быць мэтазгодным: упаўнаважаная структура, якая прымяняе нормы права, павінна ў межах права знайсці найлепшы варыянт прымянення норм права.

Дзейнасць па прымяненню права можа быць класіфікавана па самых розных падставах, і такім чынам можна весці размову аб некалькіх відах прымянення права.

У залежнасці ад віду органаў улады, якія прымяняюць права, можна выдзеліць прымяненне права заканадаўчымі органамі, выканаўчымі, судовымі, кантрольна-надзорнымі і іншымі відамі орга-

наў улады. Прыкладам прымянення права заканадаўчымі органамі з'яўляецца, напрыклад, прыняцце закону аб бюджэце на каляндарны год Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь на падставе норм Асноўнага закону Рэспублікі Беларусь.

У залежнасці ад сацыяльных суб'ектаў, якія прымяняюць права, можна выдзеліць дзяржаўнае, грамадскае і народнае прымяненне права. Калі прымяненне права зыходзіць ад дзяржавы (ажыццяўляецца дзяржавай), то мы маем справу з дзяржаўным правапрымяненнем. Калі прымяненне права ажыццяўляецца грамадскімі арганізацыямі, напрыклад, органамі і арганізацыямі прафесіянальных саюзаў ці кааператыўнымі органамі і арганізацыямі, то мы маем справу з грамадскім прымяненнем права. Калі норма права прымяняецца на сходзе працоўных ці на рэферэндуме (нацыянальным альбо мясцовым), то мы маем справу з народным прымяненнем права.

3. Стадыі прымянення права

Прымяненне права з'яўляецца самастойнай прававой з'явай, уяўляе сабой сацыяльна-прававы працэс, які ажыццяўляецца на працягу пэўнага часу і ўмоўна распадаецца на некалькі самастойных этапаў (стадый), якія паслядоўна змяняюць адна другую і прыводзяць *да ўвасаблення права ў паводзіны ўдзельнікаў грамадскіх адносін*. Выдзеленая частка вельмі важная, таму што дае ўяўленне аб тым, калі заканчваецца працэс прымянення права.

А калі пачынаецца працэс прымянення права? У самым агульным плане можна сцвярджаць, што неабходнасць у прымяненні права ўзнікае ў выпадках, калі норма права без актыўнага, уладанага прымусу з боку ўпаўнаважаных структур не можа быць рэалізавана. Але паколькі ў сферы дзеяння права, як, дарэчы, і ўвогуле ў сацыяльным жыцці, нішто не адбываецца без волі чалавека, то можна сцвярджаць, што працэс прымянення права пачынаецца з рашэння ўпаўнаважанай структуры аб неабходнасці прымянення права. Прычым не абавязкова той структурай, якая і будзе прымяняць права. Працэс прымянення права можа быць пачаты і па ініцыятыве іншых структур, якія не ўпаўнаважаны прымяняць канкрэтныя нормы права, а таксама па ініцыятыве органаў, арганізацый, грамадзян, службовых асоб і г. д. Ініцыятарамі прымянення права могуць быць як упаўнаважаныя, так і не ўпаўнаважаныя на тое структуры, але пачатак прымянення права заўсёды звязваецца з рашэннем упаўнаважанай структуры аб неабходнасці прымянення права.

1. Рашэнне кампетэнтнай і ўпаўнаважанай структуры аб прымяненні права можна лічыць пачаткам працэсу прымянення права і яго першай стадыяй (этапам). Дадзеная стадыя (этап) можа быць адносна простай і непрацяглай па часу, а можа быць складанай і даволі працяглай. Яна можа ўключаць у сябе дзеянні адной упаўнаважанай структуры ці некалькіх структур. На гэтай стадыі павінна быць высветлена, усебакова абгрунтавана законнае рашэнне аб неабходнасці прымянення права, яго норм.

2. Аналіз фактычных абставін справы. На дадзенай стадыі орган, установа, службовая асоба дзяржавы, іншая сацыяльная структура абавязаны ўсебакова прааналізаваць пэўную жыццёвую сітуацыю, да якой павінна быць прыменена норма права, і адказаць на шэраг абавязковых пытанняў: хто? што? калі? пры якіх абставінах? як? з якімі мэтамі? На гэтай стадыі правапрымяняльнік абавязаны сабраць у законным парадку ўсе неабходныя па справе доказы, тыя доказы, якія маюць юрыдычную значнасць, г. зн. неабходныя для таго, каб можна было прымяніць нормы права.

3. Выбар нормы (ці норм) права, якая павінна быць прыменена да канкрэтнай жыццёвай сітуацыі. Дадзеную стадыю прымянення права ў юрыдычнай навуцы называюць стадыяй юрыдычнай кваліфікацыі. Пасля таго, як быў здзейснены выбар неабходнай для прымянення нормы (ці норм) права, можа спатрэбіцца ўдакладніць сабраныя па справе доказы, даследаваць іншыя фактычныя абставіны, а затым удакладніць і юрыдычную кваліфікацыю. Дадзеныя абставіны даюць падставы для высноў аб тым, што другая і трэцяя стадыі прымянення права могуць мяняцца месцамі і, хутчэй за ўсё, у залежнасці ад характару справы альбо выбар нормы, альбо аналіз фактычных абставін справы будуць з'яўляцца другой па часе і паслядоўнасці стадыяй прымянення права.

4. Праверка сапраўднасці зместу выбранай для прымянення нормы права. На гэтай стадыі правапрымяняльнік абавязаны азнаёміцца са зместам нормы права ў афіцыйных крыніцах апублікавання права. Ён павінен высветліць шэраг пытанняў: ці мае норма права дачыненне да разглядаемага выпадку, ці распаўсюджвае яна сваё дзеянне на пэўную сітуацыю, ці дзейнічае яна на дадзенай тэрыторыі, мяняўся ці не мяняўся змест нормы права і г. д. Іншымі словамі, на дадзенай стадыі прымянення павінна быць выбрана бездакорная юрыдычная падстава для прымянення права.

5. Тлумачэнне права выходзіць за межы канкрэтнага працэсу прымянення канкрэтнай нормы права, але заўсёды прысутнічае ў працэсе прымянення права незалежна ад яго віду ў той ці іншай

форме. Змест тлумачэння права пры рэалізацыі права ў форме прымянення права зводзіцца да высвятлення сапраўднага і поўнага зместу нормы (норм) права, якая павінна быць прыменена, прыкладзена да даследаваных фактычных абставін справы.

6. Вынясенне акта (рашэння) аб прымяненні права. Акт прымянення права – вузлавая стадыя прымянення права, таму што менавіта на дадзеным этапе робіцца выснова аб тым, што нейкая канкрэтная жыццёвая сітуацыя адпавядае пэўным нормам права. Усе папярэднія дзеянні правапрымяняльных структур ствараюць своеасаблівую базу для таго, каб было вынесена рашэнне (акт) прымянення права. На гэтым этапе прымянення права норма права (правіла паводзін агульнага характару) канчаткова канкрэтызуецца. Менавіта тут прымаецца асобны від прававых актаў – індывідуальныя прававыя акты, якія маюць абавязковае значэнне для ўсіх удзельнікаў працэсу прымянення права і найперш адносна тых фізічных і юрыдычных асоб, адносна якіх адбылося прымяненне права.

7. Давядзенне зместу прынятага акта (рашэння) да ведама зацікаўленых суб'ектаў і ажыццяўленне неабходных юрыдычных і фактычных учынкаў і дзеянняў для выканання акта прымянення права.

Далёка не заўсёды ў юрыдычнай навуцы сярод этапаў прымянення права называецца дадзеная яго стадыя. Але зыходзячы з таго азначэння прымянення права, якое было дадзена спачатку і сэнс якога заключаецца ў тым, што прымяненне права ажыццяўляецца дзеля ўвасаблення прадпісанняў норм права ў паводзінах удзельнікаў грамадскіх адносін, неабходнасць выдзялення дадзенай стадыі прымянення права відавочная. Без адпаведных дзеянняў па ўвасабленню зместу норм права ў паводзінах удзельнікаў грамадскіх адносін губляецца сэнс усяго працэсу прымянення права. А такія дзеянні могуць і павінны быць здзейснены толькі пасля таго, як рашэнне (акт) прымянення права будзе даведзена да ведама зацікаўленых суб'ектаў.

Адзначаныя стадыі прымянення права можна разгледзець больш падрабязна і амаль у кожнай выдзеліць больш дробныя, больш дэталёвыя і канкрэтныя этапы. Напрыклад, на стадыі вынясення акта прымянення права і выдання індывідуальнага прававога акта можна ў якасці самастойнай стадыі разглядаць працэс падрыхтоўкі праекта акта прымянення права. Таму адзначаныя стадыі прымянення права можна называць асноўнымі стадыямі прымянення права.

Рэалізацыя права ў форме прымянення завяршаецца ў паводзінах удзельнікаў рэальных грамадскіх адносін, але развіццё права, дзеянне права на гэтым не спыняюцца. З увасаблення ў паводзінах суб'ектаў грамадскіх адносін нарматыўных патрабаванняў можа пачынацца якасна новы цыкл стварэння права, асобных яго норм, цыкл змянення і дапаўнення існуючых норм права. Аналіз вынікаў рэалізацыі права, у тым ліку і прымянення права, дае падставы для высноў аб эфектыўнасці норм права, аб адпаведнасці зместу і формы норм права грамадскім адносінам, мэтам і задачам прававога рэгулявання.

І нават пры ўмове, што такія вынікі ніхто не падводзіць і высноў аб выніковасці права не робіцца, тым не менш завершаны цыкл рэалізацыі і прымянення права аказвае ўплыў на паводзіны ўдзельнікаў грамадскіх адносін, на змест і структуру чалавечай дзейнасці і, адпаведна, на грамадскія адносіны. Змены ў характары і змесце прававых па сваёй прыродзе грамадскіх адносін прыводзяць да фармавання ў рэальных адносінах новых прававых эквівалентаў, да зменаў ва ўжо існуючых стандартах і правілах, да з'яўлення патрэбаў у карэкціроўцы прававога рэгулявання грамадскіх адносін. Усё гэта асэнсоўваецца ў форме правасвядомасці. І далей... адбываецца рух права ў нарматыўную частку яго існавання. А ад яе – да рэальных грамадскіх адносін.

4. Акт прымянення права

Акт прымянення права – уладнае рашэнне кампетэнтнага органа дзяржавы, яго службовай асобы ці іншай упаўнаважанай структуры, якое прынята (вынесена) ва ўстаноўленай форме па канкрэтнай справе і скіравана на ўвасабленне прадпісанняў нормы права ў рэальных грамадскіх адносінах.

Акт прымянення права заўсёды мае індывідуальны прававы характар. У ім не ўтрымліваецца правіла паводзін агульнага характару, а змяшчаецца ўладнае прававое вяленне, якое мае абавязковае значэнне для ўсіх удзельнікаў справы, у межах якой быў вынесены акт прымянення права. Ён канкрэтызуе агульны характар нормы права, робіць абавязковымі для ўдзельнікаў справы і яе адрасатаў прадпісанні і вяленні, што ўтрымліваюцца ў нормах права, дакладна акрэслівае іх правы і абавязкі. Акт прымянення права мае разавы, індывідуальны характар, яго юрыдычнае значэнне, як правіла, вычэрпваецца той сітуацыяй, адносна якой быў вынесены акт прымянення права. Праўда, асобныя рашэнні індывідуальнага

прававога характару могуць мець юрыдычна абавязковае значэнне пры разглядзе іншых спраў. У такіх выпадках кажуць аб прэюдыцыяльным значэнні акта прымянення права.

Акт прымянення права можа мець розную форму. Часцей за ўсё ён выносіцца ў пісьмовай форме, мае выгляд акта-дакумента. Але актам прымянення права можна лічыць і рашэнне ў вуснай форме. Існуюць і іншыя формы вынясення рашэння, прыняцця рашэння аб прымяненні права, напрыклад, жэставая форма. Прыкладам першай формы з'яўляецца загад рэктара аб залічэнні пэўнай асобы ў склад студэнтаў. Прыкладам вуснай формы акта прымянення права з'яўляецца, напрыклад, папярэджанне студэнта рэктарам установы адукацыі аб недапушчальнасці парушэння вучэбнай дысцыпліны. У жэставай форме прымяняюцца, напрыклад, правілы дарожнага руху, калі дарожны рух рэгулюецца ўпаўнаважанай службовай асобай з дапамогай спецыяльнага жэзла.

Як правіла, пісьмовы акт-дакумент мае сваю структуру. У ім выдзяляюцца атрыбутыўная, апісальная, матывіровачная і рэзалютыўная часткі. Атрыбутыўная частка ўключае ў сябе патрабаванні аб дакладнай назве акта прымянення, якая замацавана нарматыўна і адпавядае характару акта прымянення права, напрыклад, рашэнне суда. Яна ўключае ў сябе ўказанні на дату і месца вынясення акта прымянення, а таксама на дакладную назву органа ці ўстановы, якія вынеслі акт прымянення права. Атрыбутыўная частка ўключае ў сябе і подпісы ўпаўнаважаных асоб.

Апісальная частка ўтрымлівае ў сабе апісанне і аналіз фактычных абставін справы, доказы па справе. Матывіровачная частка ўказвае на матывы, якімі кіруецца ўпаўнаважаны орган ці службовая асоба пры вынясенні акта прымянення права. Рэзалютыўная частка змяшчае само рашэнне.

Акты прымянення права заўсёды скіраваны на вырашэнне канкрэтнай справы, выносяцца ўпаўнаважанай уладнай структурай і скіраваны на дасягненне пэўных мэт. Звычайна мэты актаў прымянення права дакладна і ясна вызначаюцца і акрэсліваюцца ў праве, яго нормах. Але часта норма права, якая павінна быць прыменена, утрымлівае ў сабе магчымасць выбару з боку правапрымяняльніка таго ці іншага варыянту рашэння. У гэтых сітуацыях цалкам лагічна паўстае пытанне аб эфектыўнасці прынятага рашэння і, адпаведна, эфектыўнасці акта прымянення права. Калі прынятае рашэнне дасягае тых мэт, якія вынікаюць са зместу нормы права, то акт прымянення права можна лічыць эфектыўным.

Як да прымянення права цалкам, так і адносна актаў прымянення права існуе шэраг патрабаванняў, асобныя з якіх дакладна замацаваны на нарматыўным узроўні. Ёсць агульныя патрабаванні да зместу і формы акта, яго структуры, існуюць нарматыўна замацаваныя патрабаванні да асобных відаў актаў прымянення права. За тым, наколькі акты прымянення права адпавядаюць нарматыўна ўсталяваным патрабаванням па зместу і форме, звычайна ў дзяржаве ажыццяўляюцца строгія нагляд і кантроль. У дзяржаве ствараюцца нават спецыяльныя дзяржаўныя структуры, напрыклад, пракуратура, на якія ўскладваюцца абавязкі па кантролю за актамі прымянення права. Адпаведнасць актаў прымянення права па свайму зместу і форме нарматыўна ўсталяваным патрабаванням азначае, што акты прымянення дзейнічаюць у дакладна акрэсленым прававым полі і выконваюць ускладзеныя на іх «прававыя абавязкі». І, наадварот, неадпаведнасць актаў прымянення права нарматыўна замацаваным патрабаванням азначае, што яны будуць аспрэчаны ці аб'яўлены незаконнымі і іх трэба адмяніць.

Незаконныя, неабгрунтаваныя акты прымянення права, акты прымянення права, якія былі вынесены з парушэннем усталяванай формы і працэдуры прыняцця, нематываваныя і немэтазгодныя акты павінны быць адменены. У шэрагу выпадкаў нават асобныя парушэнні працэдуры прыняцця актаў прымянення права прыводзяць да юрыдычнай нікчэмнасці актаў прымянення права.

5. Тлумачэнне права

Права – даволі складаная сацыяльная з'ява, таму рэалізацыя і прымяненне права, яго выкарыстанне, вывучэнне і выкладанне патрабуюць значных высілкаў з боку зацікаўленых сацыяльных суб'ектаў. Высвятленне зместу права асабіста для сябе, а таксама вытлумачэнне для іншых сацыяльных суб'ектаў называецца тлумачэннем права. Зразумела, што ў сацыяльным жыцці тлумачыцца не толькі права, але і іншыя сацыяльныя рэальнасці, іншыя рэчы, тэксты і г. д. Тлумачэнню падлягаюць усе незразумелыя ці малазразумелыя з'явы, падзеі, працэсы. Але змест і характар тлумачэння прадвызначаюцца ў кожным разе прыродай аб'екта (прадмета), які тлумачыцца, а таксама мэтамі і задачамі тлумачэння, асаблівасцямі суб'ектаў, якія тлумачаць аб'ект, і шэрагам іншых істотных момантаў. Усе яны даюць уяўленне аб тлумачэнні.

Права ў разгорнутым (поўным) выглядзе існуе, як вядома, у трох формах: у форме прававых адносін, у форме прававой свядо-

масці і ў форме нарматыўнага замацавання. Кожная з гэтых форм існавання права мае свае адметнасці і ўласцівыя ёй механізмы ўздзеяння на паводзіны ўдзельнікаў грамадскіх адносін. Акрамя гэтага, як вядома, права можа існаваць у скарочаным выглядзе і ў поўнай форме. Усе гэтыя абставіны не могуць не ўплываць на змест і характар тлумачэння права. Разгледзім варыянт тлумачэння права, калі яно існуе ў трох формах.

Па самых разнастайных прычынах і з самымі рознымі патрэбамі да права звяртаюцца сацыяльныя суб'екты. Кожны з нас можа сам вывучаць права даступнымі прыёмамі і сродкамі ў асабістых мэтах, а таксама ў мэтах вытлумачэння зместу дзеючага права для іншых асоб. Далёка не абавязкова тлумачэнне права будзе звязана пры гэтым з непасрэдным працэсам увасаблення права ў паводзінах людзей. Гэта тлумачэнне права ў самым шырокім сэнсе слова. Можна з пэўнай агаворкай сцвярджаць, што ў шырокім сэнсе слова тлумачэнне права звязана з рэалізацыяй права, з яго дзеяннем.

У больш вузкім сэнсе слова тлумачэнне права звязана з працэсам прымянення права. Часцей за ўсё менавіта ў дадзеным сэнсе слова тлумачэнне права азначаецца і асвятляецца ў юрыдычнай навуцы, хаця ў асобных вучэбных курсах тэма тлумачэння права разглядаецца ў якасці асобнай тэмы. У такім разе *пад тлумачэннем права можна разумець дзейнасць, якая скіравана на поўнае і дакладнае асэнсаванне і ўсведамленне зместу права правапрымяняльнікам, а таксама на вытлумачэнне і давядзенне сапраўднага зместу права да ведама іншых правапрымяняльнікаў і карыстальнікаў права.*

Такім чынам, да ліку суб'ектаў тлумачэння права ў вузкім сэнсе слова адносяцца толькі ўпаўнаважаныя на прымяненне права органы, установы дзяржавы, службовыя асобы і іншыя сацыяльныя структуры. У шырокім сэнсе слова ў склад суб'ектаў тлумачэння права ўключаюцца ўсе сацыяльныя суб'екты і арганізацыі, якія ў ходзе сваёй дзейнасці асэнсоўваюць прававыя з'явы і вытлумачваюць іх іншым сацыяльным суб'ектам і арганізацыям. У першым выпадку можна весці размову аб афіцыйным тлумачэнні права, таму што суб'екты такога тлумачэння дзейнічаюць ад імя дзяржавы, упаўнаважаны на ўладную дзейнасць па прымяненню права і іх думкі, іх разважанні, высновы аб сапраўдным змесце права звычайна кладуцца ў падмурак вынесеных рашэнняў па справе. У другім выпадку тлумачэнне будзе неафіцыйным. Такім чынам, па суб'ектах тлумачэння яно падзяляецца на афіцыйнае і неафіцыйнае. Неафіцыйнае тлумачэнне можа быць самым розным – пісьмовым і вусным, зыходзіць ад асоб і ад арганізацый. Разнавіднасцю

неафіцыйнага тлумачэння права з'яўляецца навуковае (дактрынальнае) тлумачэнне.

У сваю чаргу, афіцыйнае тлумачэнне права падзяляецца на нарматыўнае і казуальнае. Казуальнае тлумачэнне вычэрпвае сябе канкрэтнай сітуацыяй, мае разавае значэнне для канкрэтнага выпадку прымянення права. Нарматыўнае тлумачэнне зместу права выходзіць за межы канкрэтнай справы. Яно з'яўляецца абавязковым і ў іншых выпадках, калі прымяняецца патлумачаная норма права. Іншымі словамі, патлумачаная норма права павінна будзе прымяняцца ў іншых выпадках у тым сэнсе і з тым зместам, якія яна атрымала пасля нарматыўнага тлумачэння. Такім чынам, казуальнае тлумачэнне – індывідуальна-прававое тлумачэнне, а нарматыўнае тлумачэнне – такое тлумачэнне, у выніку якога ствараецца правіла паводзін агульнага характару.

Казуальнае тлумачэнне заўсёды звязана з канкрэтнай справай. Нарматыўнае тлумачэнне можа быць звязана з разглядам канкрэтнай справы, але часцей за ўсё не звязана з нейкай асобнай справай па прымяненню права. Прыкладам нарматыўнага тлумачэння ў прававой сістэме Рэспублікі Беларусь з'яўляецца дзейнасць ВАК Рэспублікі Беларусь. Згодна з п. 4 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 560 ад 17 лістапада 2004 года «Аб зацвярджэнні Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь» ВАК Беларусі надзелены правам даваць абавязковае афіцыйнае (нарматыўнае) тлумачэнне ўказа Прэзідэнта краіны.

Праблема тлумачэння права ўзнікла даўно. Можна сказаць, са з'яўленнем самаго права. Але набыла яна значную актуальнасць пасля таго, як само права набыло завершаную, «поўную» форму існавання, асабліва пасля таго, як значная частка дзеючых норм права стала ствараццa шляхам «зверху–уніз». Пры эвалюцыйным шляху станаўлення права, пры паступовым фармаванні прававых эквівалентаў, іх асэнсаванні і наступным замацаванні ў дзеючых нормах права сапраўдны змест норм права звычайна быў добра зразумелы правапрымяняльнікам і карыстальнікам.

Праблема ўскладнілася пасля таго, як у выніку спецыялізацыі і дыферэнцыяцыі органаў і ўстаноў дзяржавы адны яе органы і структуры сталі спецыялізавацца пераважна на стварэнні права, а іншыя – на яго рэалізацыі і прымяненні.

Гісторыі развіцця права вядомы спробы забараніць увогуле ўсякае тлумачэнне права правапрымяняльнікамі. Так, пасля ўвядзення ў дзеянне знакамітага кодэкса Юсцініана суддзям была забаронена дзейнасць па тлумачэнню права. У спрэчных выпадках,

калі для суддзі было не ўсё ясна і зразумела ў змесце норм права, ён павінен быў звяртацца да самаго імператара з хадайніцтвам аб тлумачэнні права. Знакаміты француз Ш. Мантэск'е – адзін з стваральнікаў тэорыі падзелу ўлад – лічыў, што суддзя заўсёды павінен быць вуснамі закону.

Адносіны да тлумачэння права кардынальна памяняліся пасля прыняцця французскага грамадзянскага кодэкса (кодэкса Напалеона) 1804 года, у арт. 4 якога было замацавана правіла аб тым, што суддзя не мог адмовіць у разглядзе справы на падставе незразумеласці зместу нормы права. Іншымі словамі, суддзя быў абавязаны самастойна высветліць (вытлумачыць) сапраўдны змест нормы права і вырашыць справу па сутнасці.

З XIX ст., з часоў знакамітага нямецкага юрыста Ф. Савіньі, у юрыдычнай навуцы ў розных мадыфікацыях разважаюць аб наступных спосабах высвятлення сапраўднага зместу норм права: граматычным, гістарычным, мэтавым і сістэмным.

Граматычны спосаб пабудаваны на выкарыстанні правіл граматыкі, лексікі і сінтаксісу для высвятлення сапраўднага зместу права. Сэнс гістарычнага спосабу заключаецца ў тым, што правапрымяняльнік высвятляе змест нормы права, вывучаючы тыя гістарычныя абставіны і ўмовы, гістарычныя падзеі і факты, якія падштурхнулі заканадаўцу (у шырокім сэнсе слова) на выданне той ці іншай нормы права, і спрабуе зразумець у гістарычным кантэксце яе змест.

Мэтавы спосаб – такі шлях высвятлення зместу нормы права, у якім правапрымяняльнік імкнецца найперш высветліць мэту прыняцця той ці іншай нормы права. Сістэмны спосаб уяўляе сабой такі шлях высвятлення зместу нормы права, які заснаваны на вывучэнні структурных і функцыянальных сувязей паміж нормамі права, суадносін розных тэрмінаў і паняццяў па іх аб'ёму і зместу, якія ўжываюцца ў розных нормах права, і г. д.

6. Прабелы ў праве, спосабы запаўнення і ліквідацыі прабелаў у праве

Калі права існуе ў першапачатковай сваёй форме, на ўзроўні (у форме) праваадносін, то натуральна, што ні аб якіх прабелах (пустотах) у праве не можа ісці размова. Калі ў сферы грамадскіх адносін, якія складваюцца пад непасрэдным уплывам таварна-грашовых адносін, эквівалентных па сваёй прыродзе, узнікае патрэба ў стварэнні адпаведнага эквіваленту, стандарта, правіла, то яно ў любым выпадку ствараецца. Першапачаткова як аднаразовае, а затым яно паўтараецца і становіцца нормай права.

Але як толькі права набывае сваю класічную форму існавання – трохузроўневую структуру, то адразу высвятляецца, што ў праве могуць узнікнуць (утварыцца) пустоты (прабелы). Па самых розных прычынах аб'ектыўнага і суб'ектыўнага парадку ў сістэме дзеючых норм права ў пэўны перыяд адсутнічаюць неабходныя нормы права для рэгулявання прававых па свайму зместу грамадскіх адносін. Можна нават сцвярджаць, што такія пустоты (прабелы) знаходзяцца заўсёды, таму што не існуе люстэркавасці і тоеснасці паміж прававымі па свайму зместу грамадскімі адносінамі і нормамі права, у якіх павінны быць замацаваны створаныя ў рэальных грамадскіх адносінах прававыя стандарты (эквіваленты). А ў сітуацыі, калі права ствараецца шляхам «зверху–уніз», то ўвогуле адсутнасць патрэбных норм права абумоўліваецца недасканаласцю правіл фармулявання і стварэння лагічна замкнутай і несупярэчлівай сістэмы норм права.

Такім чынам, праблема з прабельнасцю ў праве існуе пры ўмове, што само права функцыянуе ў трох сваіх іпастасях – у форме прававых адносін, у форме правасвядомасці і ў форме норм права. Аб прабельнасці ў праве сведчаць некалькі момантаў. Па-першае, адсутнасць неабходных для *рэалізацыі* і прымянення норм права. Па-другое, адносіны і сітуацыі, адносна якіх і да якіх павінны быць рэалізаваны і прыменены нормы права, маюць прававую прыроду, як часта кажуць, знаходзяцца ў сферы прававога рэгулявання. Зразумела, што адсутнасць патрэбных для рэалізацыі і прымянення норм права высвятляецца ў ходзе рэалізацыі і прымянення права.

Адсутнасць неабходных для належнага функцыянавання права норм стварае пэўныя нязручнасці, таму што механізм прававога рэгулявання пачынае даваць збоі, права губляе сваю выніковасць. Адзіным легальным шляхам ліквідацыі знойдзеных прабелаў права з'яўляецца стварэнне неабходных норм права. Але стварэнне неабходных норм права – даволі працяглы ў часе працэс, а часта здараецца так, што прабельнасць у праве высвятляецца якраз у той момант, калі норма права павінна быць прыменена.

Для вырашэння такіх сітуацый юрыдычная навука і практыка выкарыстоўваюць дзве тэарэтыка-прававыя і практычна-арыентаваныя канструкцыі – канструкцыю аналогіі права і аналогіі закону. З дапамогай дадзеных канструкцый прабелы ў праве часова *пераадольваюцца*.

Аналогіяй права называюць такі шлях часовага пераадолення прабелаў у праве, пры якім упаўнаважаныя органы, установы, службовыя асобы і іншыя сацыяльныя структуры вырашаюць канкрэтную справу прававога характару на падставе прынцыпаў права (агульнаправавых, галіновых і г. д.), так званага «духа права».

Аналогіяй закону называюць такі шлях часовага пераадолення прабелаў у праве, пры якім упаўнаважаныя органы, установы, службовыя асобы і іншыя сацыяльныя структуры вырашаюць канкрэтную справу прававога характару на падставе норм права, якія рэгламентуюць падобныя грамадскія адносіны. Часта прыбягаюць і да субсідзіярнага прымянення норм права.

З часоў старажытнага Рыма ў прававых сістэмах дзейнічае аксіёма, згодна з якой прабелы ў сістэме права нельга запаўняць шляхам аналогіі, калі размова ідзе аб прыцягненні да юрыдычнай адказнасці і ўскладанні іншых мер юрыдычнага ўздзеяння на асобу.

Пытанні для самаправеркі

1. Як суадносяцца паміж сабой паняцці «ажыццяўленне права», «дзеянне права» і «рэалізацыя права»?
2. Якія нормы права рэалізуюцца праз такую форму рэалізацыі права, як захаванне?
3. Чым адрозніваюцца паміж сабой такія формы рэалізацыі права, як выкананне і выкарыстанне?
4. Ці правільнымі з'яўляюцца сцвярджэнні аб тым, што з дапамогай прымянення права могуць ажыццяўляцца выкананне, выкарыстанне і захаванне права?
5. Сфармулюйце прычыны, найбольш тыповыя сітуацыі, якія прымушаюць дзяржаву, яе органы, установы, арганізацыі, службовых асоб, іншыя сацыяльныя структуры актыўна ўмешвацца ў працэс рэалізацыі права.
6. Якімі прыметамі прымяненне права адрозніваецца ад іншых форм рэалізацыі права?
7. Дайце класіфікацыю прымянення права і ахарактарызуйце яе віды.
8. Пералічыце асноўныя патрабаванні да прымянення права і раскрыйце іх змест.
9. Якая ісціна знаходзіцца падчас прымянення права?
10. Пералічыце стадыі (этапы) прымянення права і раскрыйце іх змест.
11. Якія патрабаванні вылучаюцца да акта прымянення права?
12. Раскрыйце структуру акта прымянення права.
13. Абгрунтуйце асноўныя патрабаванні да акта прымянення права і асноўныя ўмовы яго эфектыўнасці.
14. Раскрыйце змест паняцця «тлумачэнне права» і абгрунтуйце яго віды.
15. Раскрыйце змест асноўных спосабаў высвятлення зместу норм права.
16. Якія прычыны абумоўліваюць прабельнасць у праве?
17. Якім чынам ліквідуюцца і пераадольваюцца прабелы ў праве?
18. У якіх сферах грамадскіх адносін забараняецца прымяненне аналогіі права і аналогіі закону?

Тэма 17. ПРАВАСВЯДОМАСЦЬ, ПРАВАВАЯ КУЛЬТУРА І ПРАВАВОЕ ВЫХАВАННЕ

1. Паняцце, сутнасць, азначэнне і віды прававой свядомасці.
2. Структура (будова) прававой свядомасці.
3. Паняцце, азначэнне і паказчыкі прававой культуры.
4. Прававое выхаванне.

1. Паняцце, сутнасць, азначэнне і віды прававой свядомасці

Тры моманты патрэбна мець на ўвазе, каб вызначыць прыроду (сутнасць) прававой свядомасці і даць яе азначэнне. Па-першае, правасвядомасць уяўляе адну з іпастасяў права, адну з форм яго існавання. Па-другое, правасвядомасць з'яўляецца адной з форм грамадскай свядомасці. Па-трэцяе, характар правасвядомасці прадвызначаецца тым шляхам фармавання права, які ўласцівы пэўнай прававой сістэме. Першыя два моманты характарызуюць прававую свядомасць увогуле як сацыяльна-прававую рэальнасць, а трэці момант указвае на магчымыя асаблівасці правасвядомасці ў нейкай прававой сістэме, але пры разглядзе яе прыроды менавіта шлях фармавання права, яго станаўленне з'яўляецца пачаткам аналізу гэтай з'явы.

Правасвядомасць у якасці асобнай сацыяльна-прававой з'явы ўзнікае і развіваецца як асобная праява існавання права. Пры фармаванні права, якое пачынаецца ў рэальных прававых па свайму зместу адносінах, правасвядомасць складваецца праз асэнсаванне і ўсведамленне прававых па свайму характару эквівалентаў, стандартаў, іх зместу, прызначэння і г. д. Яна не можа быць зведзена да простага адлюстравання таго, што было стыхійна ці паўстыхійна сфармавана ў грамадскіх адносінах, а ўтрымлівае ў сабе асобныя надзеі і пажаданні адносна тых прававых стандартаў, правіл, якія павінны быць замацаваны ў нарматыўнай складанай частцы права. Пры фармаванні права ў адваротным кірунку змест правасвядомасці крыху мяняецца, таму што мяняецца яе дачыненне да нарматыўнай часткі права.

Калі ў першым выпадку нарматыўная частка не можа быць сфармавана без удзелу прававой свядомасці, то ў другім выпадку – ужо сама нарматыўная частка (праява) права непасрэдна ўплывае на змест прававой свядомасці. У першым выпадку роля прававой свядомасці актыўная, у другім яна сама падвяргаецца ўздзеянню з боку іншай праявы існавання права. У першым выпадку абавязко-

ва застануцца тыя ідэі, пажаданні, надзеі, пачуцці прававога характару, якія не будуць здзейснены, бо не будуць адлюстраваны і замацаваны ў нарматыўнай частцы. У другім выпадку ўжо пад уздзеяннем норм права ўзнікнуць ідэі, пажаданні, надзеі, пачуцці, якія будуць патрабаваць свайго наступнага замацавання ў нарматыўнай частцы права.

Такім чынам, як у першым, так і ў другім выпадках рэальна існуе такая частка прававой свядомасці (уяўленні аб прававых стандартах, правілах, іх мадэлі, ідэі, пачуцці, пажаданні, перажыванні, эмоцыі), якая не адлюстравана, не замацавана ў нормах дзеючага права, але іх з'яўленне абумоўлена рознымі прычынамі, рознымі часткамі (праявамі) права. У першым выпадку па-за межамі дзеючай нарматыўнай часткі права застаюцца ідэі, пачуцці, перажыванні, якія абумоўлены развіццём таварна-грашовых, эквівалентных па сваёй сутнасці грамадскіх адносін, а ў другім – замацаванымі ў дзеючых нормах права стандартамі, эквівалентамі, нормамі.

Але вельмі значная частка правасвядомасці, асабліва ў форме прававых стандартаў, правіл, норм, якія існуюць у правасвядомасці, практычна адэкватныя тым правілам, стандартам і эквівалентам, якія сфармаваліся ў рэальных грамадскіх адносінах ці знайшлі сваё замацаванне ў правасвядомасці пасля з'яўлення ў нарматыўнай частцы права. Побач з ідэямі, пачуццямі, якія разыходзяцца з сутнаснымі праявамі права, у правасвядомасці рэальна існуюць тыя ідэі, пачуцці, эмоцыі, тэорыі, у якіх адлюстроўваецца прырода права, якія адпавядаюць прыродзе эквівалентных па сваёй сутнасці грамадскіх адносін і адлюстроўваюць прававыя эквіваленты, стандарты, якія знайшлі замацаванне ў дзеючых нормах права.

Такім чынам, мы маем справу з тым, што ў правасвядомасці існуе два аб'екты адлюстравання, дзве актыўныя сілы, якія ўздзейнічаюць на яго змест. І гэтыя дзве сілы, два аб'екты з'яўляюцца самастойнымі праявамі (формамі) існавання права. У сваю чаргу, кожная з праяў (форм) права падвяргаецца ўздзеянню з боку прававой свядомасці.

Усе тры формы права, тры яго праявы не могуць існаваць адна без другой, кожная з іх актыўна ўздзейнічае на другую і разам з тым у кожнай з іх існуюць тоесныя моманты, якія іх робяць адным і тым жа – правам. У якасці адной з форм (праяў існавання) права прававая свядомасць уяўляе сістэму (сукупнасць) прававых эквівалентаў, стандартаў, правіл, норм, якія існуюць у выглядзе, у форме прававых ідэй, тэорый, пачуццяў, перажыванняў аб дзеючым праве, а таксама аб тым праве, якое не знайшло свайго належнага

замацавання ў нарматыўнай частцы права ці якое павінна быць замацавана ў нарматыўнай частцы права.

Для правасвядомасці ў якасці самастойнай формы грамадскай свядомасці характэрны, па-першае, тое, што ўласціва ўсім астатнім формам грамадскай свядомасці, а, па-другое, узаемадзеянне з імі, уплыў на іх і залежнасць ад іншых форм грамадскай свядомасці.

У кожнай з форм грамадскай свядомасці існуе свой адметны, спецыфічны прадмет адлюстравання (аб спецыфіцы прадмета адлюстравання прававой свядомасці ішла размова раней), і разам з тым усе яны асэнсоўваюць і адлюстроўваюць грамадскае жыццё, усе яго інстытуты цалкам. Апошняе не можа не ўплываць на змест кожнай з самастойных форм грамадскай свядомасці.

Прырода правасвядомасці ў сувязі з адлюстраваннем усіх праяў, форм і інстытутаў грамадскага існавання праяўляецца ў тым, што заканамернасці, формы, інстытуты грамадскага жыцця, якія наўпрост не ўваходзяць у сферу дзеяння права, але тым не менш асэнсоўваюцца выключна з дапамогай «прававых інструментаў», самымі спецыфічнымі з іх з'яўляюцца правы і абавязкі. Усе звесткі, уся інфармацыя, якая складае змест іншых форм грамадскай свядомасці – палітычнай, маральнай, эстэтычнай і г. д. – «трансфармуецца» ў прававую свядомасць толькі пасля таго, як яна будзе асэнсавана праз прызму правоў і абавязкаў. Можна сказаць і так. Усё тое, што не з'яўляецца непасрэдным прадметам адлюстравання правасвядомасці, усё тое, што атрымала асэнсаванне ў іншых формах грамадскай свядомасці, у самой правасвядомасці, набывае выключна прававую форму, праходзіць фільтр з прававых інструментаў і сродкаў і толькі пасля гэтага ўключаецца ў склад прававой свядомасці.

Гэта можа быць самая розная па зместу і характару «прававая інфармацыя», самыя розныя «прававыя ідэі, тэорыі», але іх адрозненне ад, так сказаць, карэннай правасвядомасці, ад той часткі прававой свядомасці, якая сфармавалася ў якасці складанай часткі (формы) існавання права, зводзіцца да таго, што карані, прычыны апошняй знаходзяцца ў полі, у сферы дзеяння, існавання права, у тых грамадскіх адносінах, якія заснаваны на эквівалентных пачатках, абумоўлены таварна-грашовымі адносінамі і тымі адносінамі, якія непасрэдна ўзніклі пад уздзеяннем таварна-грашовых адносін.

Гэтыя ідэі, тэорыі і іншая інфармацыя аб праве таксама аказваюць уплыў на фармаванне нарматыўнай складанай часткі права, на яе рэалізацыю ў рэальных грамадскіх адносінах, з іх дапамогай

асэнсоўваюцца і ўсведамляюцца прававыя эквіваленты, правілы, нормы, якія складаюцца ў прававых грамадскіх адносінах, але яны выконваюць усё ж дапаможную ролю ў існаванні права, у яго развіцці і функцыянаванні.

Але ўсё ж, нягледзячы на тое, што паміж адзначанымі прававымі ідэямі, тэорыямі аб праве існуе розніца, тым не менш паміж імі існуюць і тоесныя моманты, якія дазваляюць зрабіць агульную выснову аб тым, што *правасвядомасць уяўляе сабой сістэму (сукупнасць) ідэй, тэорый, пачуццяў, эмоцый, пажаданняў аб дзеючым праве, а таксама аб пажаданым праве.*

Цывілізацыйныя асаблівасці грамадства наўпрост адбіваюцца на стане правасвядомасці грамадства. Практычна ў кожнай цывілізацыі нейкая асобная форма грамадскай свядомасці з'яўляецца дамінуючай, вызначальнай. Менавіта праз яе грамадства фармуе для сябе асноўныя каштоўнасныя каардынаты паводзін і светаўспрымання. Менавіта праз гэтую форму свядомасці ўспрымаецца навакольны свет і будуюцца міжнародныя і міждзяржаўныя адносіны. Прававая свядомасць дамінуе ў англасаксонскай цывілізацыі. Для ўсходнеславянскай цывілізацыі найбольш характэрнай формай свядомасці з'яўляецца праваслаўе.

Усе астатнія формы грамадскай свядомасці ў гэтым плане падпарадкаваны дамінуючай форме грамадскай свядомасці. Адсюль вынікае, што змест правасвядомасці, яе роля сярод іншых форм грамадскай свядомасці якраз вызначаюцца тым месцам правасвядомасці, якое яна займае ў сістэме іншых форм грамадскай свядомасці.

Віды правасвядомасці выдзяляюцца па самых розных падставах, але найчасцей сярод крытэрыеў класіфікацыі прававой свядомасці з'яўляюцца яе носьбіты, г. зн. самыя розныя сацыяльныя групы людзей.

У гэтых варунках звычайна выдзяляюць правасвядомасць розных узроставых груп насельніцтва – моладзі, правасвядомасць людзей працоўнага ўзросту, правасвядомасць людзей сталага ўзросту (пенсіянераў) і г. д. У сваю чаргу, правасвядомасць моладзі падзяляецца на правасвядомасць вучнёўскай моладзі і моладзі, якая занята ў сферы матэрыяльнай вытворчасці. Сярод людзей працоўнага ўзросту можна выдзяляць правасвядомасць розных груп людзей у залежнасці ад галін народнай гаспадаркі, у якіх яны працуюць, напрыклад, правасвядомасць людзей, якія заняты ў сферы матэрыяльнай вытворчасці, паслуг, навуцы, ахове здароўя, адукацыі і г. д.

2. Структура (будова) прававой свядомасці

Прававая свядомасць, як і іншыя формы грамадскай свядомасці, мае сваю будову (структуру).

Структура (будова) правасвядомасці шмат у чым прадвызначаецца той абставінай, што яна, з аднаго боку, з'яўляецца складанай часткай права, а з другога – адной з форм грамадскай свядомасці.

Правасвядомасць, з'яўляючыся часткай права, адной з форм існавання права), утрымлівае ў сабе прававыя стандарты, прававыя эквіваленты, правілы, нормы, а, дакладней, мадэлі норм, правіл, стандартаў. У якасці самастойнай формы грамадскай свядомасці, якая ўзнікла ў сувязі з такой сацыяльна-прававой рэальнасцю, як права, і якая тым не менш уваходзіць у склад грамадскай свядомасці, правасвядомасць складваецца з ідэй, пачуццяў, перажыванняў аб праве, дзеючым праве і жадаемым праве.

Такім чынам, існуюць такія прававыя ідэі, тэорыі, абавязковай складанай часткай якіх з'яўляюцца прававыя стандарты, правілы, нормы, без якіх самі ідэі, тэорыі губляюць свой сэнс і існаваць наўпрост не могуць. Цяжка ўявіць, напрыклад, існаванне тэорыі калектыўнага дагавору, у якой бы цалкам адсутнічалі меркаванні, ідэалы, уяўленні і больш канкрэтныя стандарты аб тым, якім павінен быць калектыўны дагавор. Разам з тым ідэі, тэорыі, канцэпцыі аб тым, што ўвогуле ўяўляе сабой права, якое яно мае дачыненне да дзяржавы, як яно ўзнікла і г. д., наўпрост могуць не ўтрымліваць у сабе ўяўленняў аб прававых стандартах, правілах і эквівалентах.

Часцей за ўсё ў правасвядомасці выдзяляюцца такія элементы (часткі), як прававая псіхалогія і прававая ідэалогія.

Прававая псіхалогія – гэта пачуцці, эмоцыі, перажыванні, якія так ці інакш звязаны з правам, яго дзеяннем. Гэта могуць быць станоўчыя і адмоўныя пачуцці, эмоцыі і перажыванні. Можна разважаць аб пачуццях, эмоцыях і разважаннях, якія выкліканы непасрэдным удзелам асобы ў дзеяннях прававога характару ці формамі псіхікі прававога характару, якія заўсёды прысутнічаюць пры навуковым аналізе права і яго дзеяння.

Прававая ідэалогія ўяўляе сабой сукупнасць ідэй, тэорый, канцэпцый аб праве, яго сутнасці, дзеянні, развіцці, паходжанні і г. д. Прававая ідэалогія з'яўляецца формай асэнсавання права самім сабой. Праз прававую ідэалогію вывучаецца каштоўнасць права, яго месца сярод іншых інстытутаў грамадства, у тым ліку асэнсоў-

ваецца і сама правасвядомасць. Такім чынам, прававая ідэалогія з'яўляецца вышэйшай формай, вышэйшым узроўнем правасвядомасці, сродкам самаасэнсавання правам самога сябе.

Будова (структура) правасвядомасці можа быць разгледжана і праз сувязь з дзейнасцю людзей у сферы права. У сферы дзеяння права здзяйсняюцца асобныя ўчынкі (дзеянні) і ажыццяўляюцца паводзіны. Кожная з гэтых форм дзейнасці суправаджаецца своеасаблівымі формамі прававой свядомасці. На ўзроўні асобных учынкаў мы сустракаемся з прававымі эмоцыямі, пачуццямі, перажываннямі. На ўзроўні асобных дзеянняў у сферы права набываюцца таксама навыкі і ўменні паводзін у сферы права. Асобнай праявай правасвядомасці на дадзеным узроўні з'яўляюцца прававыя ўстаноўкі, г. зн. характар адносін суб'екта да дзеючага права (згодзен – не згодзен; паважаю – не паважаю), а таксама жаданне кіравацца ў сваім жыцці правам. У той жа час цалкам магчыма разгледзець будову правасвядомасці ў іншым ракурсе, а дакладней, праз прывязку ўсіх сродкаў асэнсавання права да ўчынкаў, да дзеянняў у сферы права і да паводзін у сферы права.

Уся сукупнасць прававых учынкаў (дзеянняў) у сферы права складае прававую дзейнасць, якая ўсведамляецца, асэнсоўваецца ў форме прававых тэорый, канцэпцый, катэгорый, паняццяў і ідэй. Яны складаюць другі ўзровень прававой свядомасці – тэарэтычную прававую свядомасць. У сваю чаргу, першы ўзровень прававой свядомасці можа быць абазначаны ў якасці практычнай правасвядомасці. Практычная і тэарэтычная правасвядомасць аб'ядноўваюцца ў нейкую цэласнасць праз прафесійную прававую свядомасць юрыстаў. Прафесійная прававая свядомасць юрыстаў скіравана, такім чынам, на інтэграцыю розных узроўняў прававой свядомасці.

Прававая свядомасць можа быць індывідуальнай, групавой і агульнасацыяльнай. Праўда, такі падзел правасвядомасці павінен суправаджацца яе аналізам і па іншых крытэрыях. Напрыклад, у індывідуальнай правасвядомасці варта суаднесці прававую псіхалогію і наяўнасць прававой ідэалогіі, варта вывучыць прававую ўстаноўку і г. д. А на ўзроўні агульнасацыяльнай правасвядомасці мэтазгодна вызначыць ролю тэарэтычнай правасвядомасці і яе здольнасць аказваць уплыў на паводзіны людзей у сферы дзеяння права.

Пад уздзеяннем самых розных фактараў (прычын) правасвядомасць можа быць дэфармавана. Пад дэфармацыяй правасвядомасці можна разумець разнастайныя адхіленні правасвядомасці

індывідаў, асобных сацыяльных груп ад тых стандартаў прававой свядомасці, ад тых яе мадэляў, якія характэрны для асобы і групы. Дэфармацыя правасвядомасці можа быць звязана з працэсамі станаўлення права і ўзнікаць у працэсе нарматворчасці, а можа быць абумоўлена і шэрагам прычын падчас трансфармацыі нарматыўнай часткі права ў паводзіны ўдзельнікаў грамадскіх адносін.

Калі правасвядомасць нейкай сацыяльнай групы не знаходзіць падтрымкі ў грамадстве і замацавання ў дзеючым праве, то гэта адмоўна адбіваецца на адносінах да права з боку прадстаўнікоў пэўнай сацыяльнай групы. Калі ў ходзе рэалізацыі права асоба не знаходзіць у дзеючым праве патрэбных ёй прававых стандартаў і эквівалентаў, то гэта таксама прыводзіць да адмоўнага стаўлення асобы да права. Дэфармацыі правасвядомасці могуць быць часовымі і пастаяннымі, выкліканымі аб'ектыўнымі і суб'ектыўнымі прычынамі, яны падзяляюцца на пераадольныя і непераадольныя дэфармацыі.

Важным паказчыкам прававой свядомасці ў грамадстве з'яўляюцца такія з'явы, як прававы нігілізм і прававы ідэалізм (ці фетышызм). Іх таксама можна разглядаць у якасці своеасаблівых праяў дэфармацыі прававой свядомасці. Адмоўнае стаўленне да права, якое знайшло пашырэнне сярод значнага кола грамадства, – дрэнны паказчык для правасвядомасці і прававой сістэмы грамадства. Не лепшым трэба лічыць і распаўсюджанасць у грамадскай свядомасці прававога ідэалізму, які сведчыць аб неадэкватнай ацэнцы з боку супольнасці рэальных магчымасцей права пры ўздзеянні на грамадскія адносіны, яго ўплыву на жыццё.

3. Паняцце, азначэнне і паказчыкі прававой культуры

Спецыялісты-культуролагі сцвярджаюць, што налічваецца звыш 300 самых розных азначэнняў культуры, якія былі сфармуляваны ў рэчышчы філасофіі і іншых грамадскіх навук. Кожнае з азначэнняў звяртае ўвагу на асобныя бакі вывучаемай з'явы – культуры і акцэнтуе ўвагу на ўласцівасцях гэтай рэаліі. У айчыннай юрыдычнай навуцы ўжо на самым пачатку пастаноўкі праблемы і вывучэння прававой культуры (канец 50- х–пачатак 60-х гадоў XX ст.) была звернута ўвага на тое, што ў прававой культуры арганічна спалучаюцца дасягненні грамадства ў сферы дзеяння права, у распрацоўцы разнастайных тэорый аб праве, у стварэнні адмысловай нарматыўнай прававой базы грамадства, у развіцці юрыдычнай навукі і адукацыі, а таксама ступень засваення прававых каштоўнасцей грамадствам, асобнымі слаямі насельніцтва, грамадзянамі.

Такім чынам, юрыдычная навука адразу ўспрыняла такі падыход да вывучэння прававой культуры, які быў вельмі распаўсюджаным сярод прадстаўнікоў іншых гуманітарных навук. Ён характарызуецца такім падыходам да вызначэння прававой культуры, пры якім звяртаецца ўвага на *арганічнае спалучэнне дзвюх складаных частак*. Адну з іх прадстаўляюць дасягненні грамадства ў прававой сферы – у стварэнні права, яго рэалізацыі, дасягненні ў юрыдычнай навуцы і адукацыі і г. д. Другую – ступень засвоенасці дасягненняў у сферы права шырокімі коламі грамадства, здольнасць грамадства кіравацца ў паўсядзённым жыцці дасягненнямі ў сферы права пры вырашэнні самых разнастайных жыццёвых праблем. Не варта меркаваць аб стане прававой культуры грамадства, напрыклад, толькі па дасягненнях у стварэнні права, у распрацоўцы адмысловай сістэмы крыніц права, калі, напрыклад, нарматыўная складаная частка права не ўвасабляецца ў паводзінах удзельнікаў грамадскіх адносін.

Паняцце прававой культуры звязана з паняццем прававой свядомасці, бо без апошняй уявіць прававую культуру немагчыма, але яно выходзіць за межы прававой свядомасці і наўпрост сутыкаецца з іншымі прававымі з'явамі, прававымі інстытутамі грамадства. У самым агульным плане *прававая культура можа быць азначана ў якасці асобнага зрэза, пэўнага стану прававой сістэмы грамадства.* А паколькі прававая сістэма грамадства ўключае ў сябе, акрамя прававой свядомасці, і іншыя кампаненты, то, натуральна, што, акрамя стану прававой свядомасці, да паказчыкаў (індыкатараў) прававой культуры ўваходзяць таксама індыкатары (паказчыкі) стану тых кампанентаў (элементаў) прававой рэчаіснасці, якія ўваходзяць у склад прававой сістэмы грамадства.

Як вядома, прававая сістэма ўяўляе разгорнутую ва ўсіх адносінах сутнасць права. У яе склад уваходзяць нарматыўная складаная частка права, прававая свядомасць і прававыя адносіны. Акрамя гэтага, у склад прававой сістэмы грамадства ўключаюцца іншыя праявы і з'явы прававога жыцця, напрыклад, стан законнасці ў грамадстве, які пранізвае і стварэнне права, і яго рэалізацыю.

На наш погляд, у склад паказчыкаў (індыкатараў) прававой культуры ўваходзяць наступныя моманты існавання і станаўлення права, яго развіцця.

Па-першае, стан правасвядомасці грамадства, насычанасць грамадскай свядомасці звесткамі аб праве, веданнем права дае ўяўленне аб тым, як адэкватна створаныя ў грамадскіх адносінах прававыя эквіваленты, стандарты будуць асэнсаваны і затым замаца-

ваны ў нарматыўнай частцы права, а таксама аб тым, як нарматыўная частка права будзе затым увасабляцца ў рэальныя паводзіны ўдзельнікаў прававых адносін.

Па-другое, стан нарматыўнай складанай часткі права, асаблівa крыніц права, стан іх уладкаванасці і несупярэчлівасці, стан сістэматызацыі заканадаўства таксама з'яўляюцца важнымі паказчыкамі прававой культуры грамадства. Гэтыя паказчыкі сведчаць аб значнасці права для грамадства і аб адносінах грамадства да права.

Па-трэцяе, стан правапарадку ў рэальных грамадскіх адносінах сведчыць аб якасці нарматыўнай часткі права, а таксама аб тым значэнні права, якое надаецца ўдзельнікамі грамадскага жыцця прававым стандартам, прававым нормам, прадпісанням пры вызначэнні імі сваіх паводзінаў у сферы дзеяння права.

Непасрэднае дачыненне да развіцця і функцыянавання прававой сістэмы грамадства маюць тыя інстытуты грамадства і дзяржавы, дзейнасць якіх звязана са стварэннем і рэалізацыяй права. Без гэтых структур функцыянаванне прававой сістэмы будзе паралізавана, а таму іх стан, іх уплыў на прававую сістэму трэба таксама лічыць паказчыкамі стану прававой сістэмы. Таму стан праватворчасці, асабліва нарматворчасці, а таксама стан правапрымяняльных структур, асабліва стан правасуддзя – важныя паказчыкі прававой культуры грамадства.

На ўсе складаныя часткі прававой сістэмы грамадства непасрэдны ўплыў аказвае юрыдычная навука, а таксама юрыдычныя кадры, а таму стан і паказчыкі развіцця юрыдычнай навукі і юрыдычнай адукацыі, наяўнасць арганізаванасці гэтых прававых інстытутаў, дасягненняў у гэтых галінах юрыдычнай дзейнасці, безумоўна, з'яўляюцца паказчыкамі прававой культуры грамадства.

Паколькі будова прававой сістэмы ў розных прававых сем'ях вызначаецца спецыфікай, то гэта адбіваецца на асаблівасцях паказчыкаў прававой культуры, іх значнасці ў вызначэнні стану прававой культуры і, адпаведна, высноў аб узроўні прававой культуры пэўнага грамадства. Калі, напрыклад, у рэлігійных прававых сем'ях рэлігія дамінуе сярод іншых форм свядомасці, падпарадкоўвае сабе ўсе іншыя формы грамадскай свядомасці, а правілы паводзін рэлігійнага характару дамінуюць сярод крыніц права, то натуральна, што стан прававой свядомасці грамадства і такіх крыніц права, як нарматыўны прававы акт, у гэтых прававых сістэмах будзе значна адрозніваца ад стану гэтых самых паказчыкаў (індыкатараў) прававой культуры ў сучаснай рамана-германскай прававой сям'і, у

якой рэлігійная свядомасць не дамінуе сярод іншых форм грамадскай свядомасці, а нарматыўны прававы акт (пісаная крыніца права), наадварот, займае вядучае становішча сярод крыніц права. Таму, па-першае, меркаваць аб стане прававой культуры толькі па асобных паказчыках будзе не зусім правільна, а, па-другое, хутчэй за ўсё, для кожнай з прававых сем'яў існуюць свае паказчыкі стану прававой культуры, а, дакладней, свая значнасць асобных індыкатараў прававой культуры.

Такім чынам, вывучэнню прававой культуры ў кожнай прававой сістэме павінна перш-наперш папярэднічаць ранжыраванне паказчыкаў, іх субардынацыя.

На прававую сістэму грамадства, як вядома, актыўна ўздзейнічаюць разнастайныя працэсы, якія адбываюцца ў іншых сферах жыцця грамадства. Напрыклад, эканамічная і сацыяльная сістэмы грамадства наўпрост уздзейнічаюць на ўзровень жыцця людзей і ўплываюць на стан законнасці і правапарадку. Таму, калі стан законнасці і правапарадку і лічыць адным з паказчыкаў прававой культуры грамадства, то трэба мець на ўвазе, што далёка не заўсёды ён з'яўляецца сведчаннем стану толькі прававой сістэмы грамадства. І ў гэтых варунках не варта рабіць радыкальныя высновы аб стане прававой культуры ў грамадстве, калі, напрыклад, мы ведаем, што правапарушальнасць і стан законнасці наўпрост абумоўлены не якаснымі паказчыкамі стану прававой сістэмы грамадства, а прычынамі, якія ляжаць за межамі прававой сістэмы, у іншых сістэмах грамадства.

4. Прававое выхаванне

Прававое выхаванне ў самым агульным плане ўяўляе працэс далучэння асобы да прававых каштоўнасцей грамадства, фармаванне на гэтай падставе прававых уяўленняў, набыццё навыкаў паводзін у прававой сферы. Асноўнай мэтай прававога выхавання з'яўляецца пераўтварэнне прававых каштоўнасцей у матывы паводзін асобы.

Прававое выхаванне павінна непасрэдна абапірацца на дзяржаўна-прававую ідэалогію, асноўныя параметры якой замацаваны ў Асноўным законе (Канстытуцыі) краіны. У гэтым палітыка-прававым дакументе ўтрымліваюцца фундаментальныя, асноватворныя палітыка-прававыя палажэнні, якія складаюць каркас, шкілет працы ўсіх органаў, арганізацый і ўстаноў дзяржавы, усіх грамадскіх аб'яднанняў, якія скіраваны на прававое выхаванне насельніцтва.

Працэс прававога выхавання арганічна спалучае ў сабе дзве складаныя часткі, два элементы.

Першы элемент зводзіцца да таго, што выхаванне заўсёды спалучана з перадачай нейкай карыснай інфармацыі ад аднаго сацыяльнага суб'екта да другога. Пры гэтым у сферы публічнай дзейнасці працэс перадачы прававой інфармацыі вельмі часта суправаджаецца прапагандай і агітацыяй, якія надаюць працэсу прававога выхавання мэтанакіраваны характар. Сутнасць другога элемента прававога выхавання зводзіцца да таго, што інфармаванне насельніцтва, прававая прапаганда і агітацыя заўсёды павінны суправаджацца «дэманстрацыяй» лепшых узораў, прыкладаў паводзін у сферы дзеяння права, прывіццём пазітыўных навыкаў і ўменняў прававога характару.

Ад стану прававой прапаганды і агітацыі і ўвогуле прававой асветы шмат у чым залежаць вынікі прававога выхавання, стан законнасці і правапарадку ў дзяржаве і грамадстве. Але яшчэ з савецкіх часоў, калі прававой прапагандзе і прававой асвеце надавалася вялікае значэнне, вядома, што прававое выхаванне найлепшым чынам ажыццяўляецца праз усеагульнае навучанне праву, праз навучанне грамадзян навыкам паводзін у сферы права.

Вялікая роля ў справе прававога выхавання належыць стану і сродкам перадачы прававой інфармацыі, даступнасці прававой інфармацыі, магчымасці яе атрымання карыстальнікамі ў самых аддаленых населеных пунктах краіны. У Рэспубліцы Беларусь, як вядома, створаны і эфектыўна працуе Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі (скарочана – НЦПІ), у якім назапашваецца прававая інфармацыя аб дзеючым у краіне праве. У НЦПІ створаны ЭБДПІ – Эталонны банк дадзеных прававой інфармацыі, у рэгіёнах працуюць Рэгіянальныя цэнтры прававой інфармацыі. Кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь можа атрымаць своечасовую і даставерную прававую інфармацыю па любому пытанню. У электронным фармаце створаны Звод законаў Рэспублікі Беларусь, які працуе на карысць прававому выхаванню насельніцтва.

І хаця існуе аксіёма, згодна з якой няведанне законаў не вызваляе ад адказнасці за іх парушэнне, але найлепшы шлях да фармавання правамерных паводзін, умацавання законнасці і правапарадку – шлях прававога выхавання, выхавання, якое заснавана на веданні закону. Распаўсюджанне сапраўднай прававой інфармацыі якраз і спрыяе веданню права.

Адметнай асаблівасцю прававога выхавання ў параўнанні з іншымі відамі выхавання, напрыклад, мастацкім выхаваннем, зво-

дзіцца да таго, што прававое выхаванне мае кансерватыўны характар. Гэта азначае, па-першае, што прававое выхаванне заснавана на далучэнні асобы да пэўных прававых стандартаў, каштоўнасцей, якія маюць стабільны і дакладна акрэслены характар, і, па-другое, абавязковай мэтай менавіта прававога выхавання павінна быць прывіццё асобе паводзін згодна з тымі правіламі і прывітымі стандартамі ў сферы права дзеяння, да якіх была далучана асоба праз перадачу ёй прававой інфармацыі і прывіццё навыкаў прававых паводзін. Выхаваная ў прававых адносінах асоба паводзіць сябе ў сферы права аднастайна, стандартна, толькі так, як яна была навучана.

Пытанні для самаправеркі

1. Якое месца займае прававая свядомасць у справе стварэння права і пры яго рэалізацыі?
2. Ахарактарызуйце прадмет адлюстравання прававой свядомасці.
3. У якім парадку інфармацыя і звесткі іншых форм грамадскай свядомасці трансфармуюцца ў прававую свядомасць?
4. Пералічыце функцыі прававой свядомасці і раскрыйце іх змест.
5. Раскрыйце парадак узаемадзеяння прававой свядомасці з іншымі формамі грамадскай свядомасці.
6. Раскрыйце будову (структуру) прававой свядомасці.
7. Выдзеліце віды прававой свядомасці і раскрыйце іх змест.
8. Якім чынам ментальнасць народа аказвае ўплыў на стан яго правасвядомасці і прававой культуры?
9. Якімі прыметамі прававая культура адрозніваецца ад іншых відаў культуры грамадства?
10. Ахарактарызуйце складаныя часткі прававой культуры.
11. Пералічыце паказчыкі прававой культуры і раскрыйце іх змест.
12. Ці можна распрацаваць універсальныя паказчыкі (індыкатары) прававой культуры для розных прававых сем'яў?
13. Раскрыйце механізм уплыву неправавых сістэм і інстытутаў грамадства на стан прававой культуры грамадства.
14. Назавіце асаблівасці прававога выхавання і раскрыйце іх змест.
15. Абгрунтуйце асноўныя накірункі прававога выхавання ў Рэспубліцы Беларусь.

Тэма 18. ПРАВАВЫЯ АДНОСІНЫ

1. Паняцце, азначэнне і віды прававых адносін.
2. Змест прававых адносін.
3. Суб'екты (удзельнікі) прававых адносін.
4. Аб'екты прававых адносін.
5. Юрыдычныя факты.

1. Паняцце, азначэнне і віды прававых адносін

Вядома, што адной з праяў права з'яўляюцца прававыя па сваёй прыродзе грамадскія адносіны. Грамадскія адносіны, якія маюць таварна-грашовы характар, а таксама тыя адносіны, якія сфармаваліся пад непасрэдным удзелам таварна-грашовых адносін, функцыянуюць на суразмерных (эквівалентных) пачатках. Менавіта гэтая група грамадскіх адносін і мае прававую прыроду. Гэтыя адносіны з'яўляюцца прававымі па сваёй сутнасці. Іх развіццё заканамерна прыводзіць да таго, што ў мэтах захавання суразмерных, эквівалентных пачаткаў пры размеркаванні і перараз меркаванні матэрыяльных каштоўнасцей удзельнікі такіх адносін павінны стварыць нейкія стандарты, трафарэты, правілы, якія б забяспечвалі адзінства і аднастайнасць у сферы абмену матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей. Пасля таго, як такія стандарты, формы, правілы створаны, можна лічыць, што прававыя па сваёй прыродзе грамадскія адносіны набылі завершаную форму, пераўтварыліся ў «класічныя» прававыя адносіны, адносіны, у якіх права не проста прысутнічае ў якасці нейкіх элементаў, а ў форме адной з сваіх іпастасяў – прававых адносін.

Важна падкрэсліць і той момант, што аб тым, што грамадскія адносіны з'яўляюцца прававымі, сведчаць не нейкія знешнія ў стасунках з прававымі адносінамі фактары і паказчыкі, а ўнутраны стан саміх грамадскіх адносін. Пасля таго, як у змесце прававых па сваёй прыродзе адносін фактычна сфармавалася другая іпастась існавання права – нормы (стандарты) права, пасля гэтага грамадскія адносіны пераўтварыліся ў прававыя адносіны. Такім чынам, аб існаванні прававых адносін сведчыць само права, дакладней, адна з яго праяў – норма права. Іншымі словамі, аб наяўнасці права ў грамадскіх адносінах сведчыць само права, аб адной іпастасі права сведчыць іншая яго форма.

Гэтаксама ў далейшым аб прававой прыродзе і прававым характары норм права будуць сведчыць прававыя па свайму зместу грамадскія адносіны. Калі створаная шляхам «зверху–уніз» норма

права будзе ўвасоблена ў рэальных грамадскіх адносінах менавіта ў той форме, у той мадэлі, якая была створана, можна будзе ўпэўнена рабіць выснову аб тым, што дадзеная норма мае прававую прыроду як па форме, так і па сутнасці. Справа ў тым, што ў гэтых варунках можна сцвярджаць, што грамадскія адносіны, на рэгуляванне якіх былі скіраваны нормы, мелі прававую прыроду, і тое, што норма права, якая была «прыўнесена» ў іх, «прыжылася» і аказалася прыдатнай для навядзення парадку ў грамадскіх адносінах, былі падрыхтаваны да ўзнікнення ў іх прававых стандартаў, правіл, норм. Іншы ход падзей так ці інакш прывёў бы да фармавання такіх стандартаў і эвалюцыйным шляхам, паступова.

Увогуле грамадскія адносіны ўяўляюць сабой пэўную структуру пэўнага віду чалавечай дзейнасці. Чалавечая дзейнасць узнікае з натуральных патрэбаў і інтарэсаў асобы, якія падштурхоўваюць да здзяйснення пэўных учынкаў, пэўных дзеянняў. Калі такія ўчынкі, дзеянні паўтараюць іншыя ўдзельнікі сацыяльнага жыцця і яны набываюць устойлівы характар, то ў грамадстве складваецца асобны від чалавечай дзейнасці. Устойлівая структура (будова) гэтай дзейнасці і ёсць тая з'ява, якую мы называем грамадскімі адносінамі. Новыя пакаленні людзей, уступаючы ў жыццё, ужо маюць у наяўнасці папярэдні вопыт пакаленняў, тыя віды чалавечай дзейнасці, якія сфармавалі папярэднікі, тую структуру (будову) чалавечай дзейнасці і тыя стандарты, правілы, якімі кіраваліся раней. Людзі заканамерна далучаюцца да папярэдняга вопыту, пачынаюць займацца тымі ці іншымі відамі чалавечай дзейнасці, уступаюць у тыя грамадскія адносіны, якія сфармаваліся да іх. Такім чынам, выраз «уступіць у грамадскія адносіны» азначае пачаць займацца тымі відамі чалавечай дзейнасці, якія сфармавалі папярэднікі, «прымерыць» на сябе пэўныя ролі ў пэўных грамадскіх адносінах.

Прававыя адносіны ўяўляюць самастойны і асобны від грамадскіх адносін. Яны не ўпісваюцца ў звычайную класіфікацыю грамадскіх адносін, напрыклад, па сферах чалавечай дзейнасці ці па нейкіх іншых падставах. Побач з гэтым відам грамадскіх адносін знаходзяцца тыя грамадскія адносіны, якія не з'яўляюцца прававымі. Як прававымі, так неправавымі могуць быць самыя розныя па зместу і характару грамадскія адносіны – эканамічныя, палітычныя, сацыяльныя, кіраўнічыя і г. д.

Частка прававых адносін адлюстроўваецца і замацоўваецца ў крыніцах права. Пры гэтым адбываецца фармалізацыя, удакладненне і канкрэтызацыя прававых адносін. Затым нормы права пачынаюць уздзейнічаць на паводзіны суб'ектаў прававых адносін.

Пры гэтым складваецца ўражанне, што прававыя адносіны і складваюцца на падставе норм права. Для правядзення размежавання паміж праваадносінамі, якія складваюцца паступова, вырастаюць з рэальных патрэбаў грамадскага жыцця, і тымі праваадносінамі, мадэлі якіх замацаваны і адлюстраваны ў дзеючых нормах права і якія складваюцца ўжо на падставе дзеючых норм права, можна выкарыстаць выраз «заканаадносіны». Пры гэтым пад заканаадносінамі можна разумець тыя сацыяльныя сувязі, якія складваюцца паміж людзьмі на падставе дзеючых норм права. Пры гэтым, зразумела, трэба памятаць, што «заканаадносіны» з'яўляюцца толькі часткай прававых адносін.

Прававыя адносіны ўяўляюць сабой асобны від грамадскіх адносін і выдзяляюцца ў самастойную групу па наступных прыметах.

Па-першае, прававыя адносіны ўяўляюць сабой структуру такога віду чалавечай дзейнасці, зместам якой з'яўляецца абмен каштоўнасцямі (маёмаснымі і немаёмаснымі) на эквівалентнай (суразмернай) аснове.

Па-другое, прававыя адносіны характарызуюцца тым, што іх удзельнікі (суб'екты) маюць прававыя магчымасці ўзаемаўздзеяння. Гэтыя прававыя магчымасці называюцца суб'ектыўнымі юрыдычнымі правамі і суб'ектыўнымі юрыдычнымі абавязкамі.

Па-трэцяе, прававыя адносіны з'яўляюцца такімі грамадскімі адносінамі, якія заўсёды знаходзяцца пад кантролем і аховай з боку дзяржавы і іншых упаўнаважаных грамадствам сацыяльных суб'ектаў.

Па-чацвёртае, прававыя адносіны ўяўляюць такі від грамадскіх адносін, якія заўсёды ў выпадках парушэнняў абараняюцца прымусовай сілай дзяржавы.

Кожная з праяў (іпастасяў) права ў цыкле дзеяння права, у яго руху ад зараджэння да ўвасаблення ў паводзінах удзельнікаў грамадскіх адносін праяўляецца двойчы. З прававых па свайму зместу грамадскіх адносін пачынаецца стварэнне права, яго рух праз прававую свядомасць да норм права, а самі нормы праз прававую свядомасць увасабляюцца ў грамадскіх адносінах, якія маюць прававую прыроду. Прычым увасабленне норм права ў грамадскіх адносінах адбываецца пераважна праз складванне паміж удзельнікамі грамадскага жыцця прававых сувязей, такіх сувязей, удзельнікі якіх валодаюць суб'ектыўнымі правамі і выконваюць юрыдычныя абавязкі. Такія сувязі ў юрыдычнай літаратуры таксама называюць прававымі адносінамі.

З прававымі адносінамі мы сустракаемся ў ходзе дзеяння права двойчы – пры зараджэнні права і пры яго ўвасабленні ў паводзінах удзельнікаў грамадскага жыцця. Магчыма, дадзеныя абставіны прывялі да таго, што сярод навукоўцаў-юрыстаў не існуе аднастайнасці ў разуменні і азначэнні такой з'явы, як прававыя адносіны. У залежнасці ад погляду на тую ці іншую праяву прававых адносін навукоўцы і робяць свае высновы аб прыродзе прававых адносін і даюць іх азначэнне. Напрыклад, пры акцэнтаванні ўвагі на праваадносінах, якія складваюцца на падставе норм права ў азначэннях прававых адносін, часта ўзгадваецца мадэль паводзін, якая ўтрымліваецца ў нормах права. А пры разглядзе прававых адносін, якія фармуюцца ў рэальным жыцці, узгадваюцца паступовасць, заканамернасць і іншыя якасці прававых адносін.

Але паміж дзвюма праявамі прававых адносін існуюць тоесныя моманты. Прававыя адносіны ў любым выпадку звязаны з дзейнасцю іх удзельнікаў. Без дзейнасці ўдзельнікаў прававыя адносіны ўвогуле не могуць сфармавацца (узнікнуць), без дзейнасці суб'ектаў грамадскага жыцця яны не могуць быць здзейснены. Таму дзейнасць удзельнікаў грамадскіх адносін, якія з'яўляюцца прававымі, з'яўляецца вузлавым момантам у разуменні іх сутнасці і зместу. Дзейнасці без удзельнікаў не існуе.

Дзейнасцю, якая прыводзіць да фармавання прававых адносін, а таксама дзейнасцю, праз якую ажыццяўляюцца ў грамадскіх адносінах прадпісанні норм права і рэалізуюцца прававыя адносіны, займаюцца практычна ўсе сацыяльныя суб'екты і арганізацыі, бо цяжка ўявіць грамадства, у якім існавалі б нейкія сацыяльныя суб'екты і арганізацыі, якія б не карысталіся маёмаснымі і немаёмаснымі каштоўнасцямі, а таму і не прымалі б удзелу як у стварэнні прававых адносін, так і ў іх рэалізацыі.

Займаючыся дзейнасцю, якая прыводзіць да фармавання прававых адносін, а таксама да ўвасаблення норм права ў рэальныя грамадскія адносіны, удзельнікі прававых адносін заўсёды робяць гэта па нейкіх патрэбах і маюць пры гэтым нейкія інтарэсы. Дадзеныя патрэбы і інтарэсы спалучаны з нейкімі маёмаснымі і немаёмаснымі каштоўнасцямі, дзеля атрымання (набыцця) якіх суб'екты займаюцца пэўным відам дзейнасці і ўдзельнічаюць ва ўвасабленні норм права ў рэальныя паводзіны.

Такім чынам, сама дзейнасць прававога характару заўсёды ажыццяўляецца сацыяльнымі суб'ектамі, якія пры гэтым задавальняюць свае патрэбы і інтарэсы праз маёмасныя і немаёмасныя каштоўнасці. Істотным момантам для праваадносін з'яўляецца і тое,

што яны заўсёды знаходзяцца пад кантролем з боку дзяржавы і заўсёды абараняюцца яе прымусовай сілай. Той момант, што праваадносіны ўзнікаюць на падставе норм права, а таксама той аспект, што праваадносіны ўзнікаюць на падставе юрыдычных фактаў, як уяўляецца, характэрны пераважна (калі не выключна) тым праваадносінам, якія ўзнікаюць на падставе норм права на этапе рэалізацыі нарматыўнай часткі права, і іх пры азначэнні праваадносін можна не ўлічваць. З'яўляючыся самастойнай формай (іпастассю) права*, праваадносіны ўяўляюць сабой асобны від грамадскіх адносін, удзельнікі якога валодаюць прававымі магчымасцямі і выконваюць прававыя абавязкі і які заўсёды кантралюецца з боку дзяржавы і абараняецца яе прымусовай сілай.*

Праваадносіны можна класіфікаваць па самых розных падставах.

Праваадносіны можна падзяліць на палітычныя, сацыяльныя, эканамічныя, ідэалагічныя і г. д. У залежнасці ад таго, нормамі якой структуры права рэгламентуюцца грамадскія адносіны, прававыя адносіны падзяляюцца на прававыя адносіны пэўнай галіны права, напрыклад, грамадзянскія праваадносіны, публічныя, прыватныя, матэрыяльныя, працэсныя, рэгулятыўныя, ахоўныя. Па форме размеркавання прававых магчымасцей і прававых абавязкаў паміж удзельнікамі прававых адносін яны падзяляюцца на простыя (на адным баку толькі права, а на другім – толькі абавязкі) і складаныя (кожны з бакоў мае прававыя магчымасці і выконвае прававыя абавязкі). Па колькасці ўдзельнікаў прававыя адносіны падзяляюцца на аднабаковыя, двухбаковыя і шматбаковыя.

Незалежна ад відаў праваадносіны маюць агульную структуру. У прававых адносінах выдзяляюцца наступныя элементы: змест, суб'екты, аб'екты. Важным момантам у функцыянаванні прававых адносін пры рэалізацыі норм права ў рэальных грамадскіх адносінах маюць падставы ўзнікнення праваадносін – юрыдычныя факты.

2. Змест прававых адносін

Рэальнасць любых адносін можа быць спраўджана праз дзейнасць сацыяльных суб'ектаў, якія з пэўнымі мэтамі і для задавальнення пэўных інтарэсаў ажыццяўляюць пэўны від чалавечай дзейнасці. Яны, з аднаго боку, падтрымліваюць сваімі дзеяннямі існуючыя структуры грамадскага жыцця, існуючыя грамадскія адносіны, а, з другога – увасабляюць у жыццё прадпісанні норм права, у якіх адлюстраваны тыповыя моманты існуючых грамадскіх, прававых па свайму зместу адносін. Такім чынам, змес-

там прававых адносін заўсёды выступаюць фактычныя ўчынкі, дзеянні ўдзельнікаў грамадскага жыцця, якія ўчыняюцца ў сферы дзеяння права і ў межах пэўнага віду грамадскіх адносін.

Без фактычных дзеянняў, учынкаў немагчыма існаванне прававых адносін. Паколькі гэтыя дзеянні ажыццяўляюцца ў сферы права і з імі звязаны размеркаванне і перараз меркаванне матэрыяльных і нематэрыяльных каштоўнасцей, то яны звычайна фармалізуюцца, канкрэтызуюцца, дакладна акрэсліваюцца. Без гэтага немагчымы нармальнае існаванне прававых адносін, стабільнае іх развіццё. Фармалізацыя, канкрэтызацыя і ўдакладненне дзеянняў удзельнікаў грамадскіх адносін адбываюцца і ў нормах дзеючага права. На мове пазітыўнага права, на мове дзеючых норм права дзеянні ўдзельнікаў прававых адносін выкладаюцца праз прававыя магчымасці і прававыя абавязкі ўдзельнікаў грамадскіх адносін.

Для функцыянавання прававых адносін важна, каб удзельнікі ажыццяўлялі дзеянні прававога характару, г. зн. дзеянні, праз якія адбываюцца размеркаванне і перараз меркаванне маёмасных і немаёмасных каштоўнасцей пры захаванні суразмерных (эквівалентных) пачаткаў. Такія дзеянні могуць ажыццяўляцца пры наяўнасці пазітыўнага права і без наяўнасці норм права. Праваадносіны пры гэтым будуць існаваць і функцыянаваць, праўда, у іншай форме. Для дакладнасці трэба заўважыць, што існуюць у дзяржаўна-арганізаваным грамадстве такія прававыя адносіны, якія не могуць узнікнуць і функцыянаваць без наяўнасці норм пазітыўнага права.

Сітуацыя, пры якой абсалютная большасць прававых адносін так ці інакш знаходзіць сваё адлюстраванне і замацаванне ў дзеючых нормах права, абумовіла наяўнасць у юрыдычнай навуцы высноў аб тым, што ў праваадносін маюцца фактычны змест і юрыдычны змест. Пад фактычным зместам пры гэтым звычайна разумеюць тыя дзеянні і ўчынкі, якія здзяйсняюць удзельнікі грамадскіх адносін, а пад юрыдычным – магчымасці прававога характару (суб'ектыўныя правы) і прававыя абавязкі (юрыдычныя абавязкі). Пры гэтым падкрэсліваецца, што фактычныя дзеянні павінны адпавядаць прававым магчымасцям і юрыдычным абавязкам, што суб'ектыўныя правы і юрыдычныя абавязкі з'яўляюцца «мёртванароджанымі» без фактычных дзеянняў удзельнікаў грамадскіх адносін.

Пры гэтым кожнай прававой магчымасці, кожнаму суб'ектыўнаму праву адпавядаюць, як правіла, пэўныя юрыдычныя абавязкі. У юрыдычнай навуцы суб'ектыўнае юрыдычнае права падзяляецца на тры прававыя магчымасці, якім адпавядаюць, якім карэспандуюць тры часткі (элементы) суб'ектыўнага абавязку:

1) магчымасці ажыццявіць пэўныя ўласныя дзеянні (праву на ўласныя дзеянні) адпавядае абавязак устрымліваецца ад пэўных дзеянняў, якія будуць перашкаджаць рэалізацыі дадзенага суб'ектыўнага права;

2) магчымасці патрабаваць ажыццяўлення пэўных дзеянняў ад іншых удзельнікаў прававых адносін (праву на чужыя дзеянні) звычайна адпавядае абавязак ажыццявіць патрэбныя дзеянні;

3) магчымасці звярнуцца да дзяржавы за абаронай парушаных суб'ектыўных праў адпавядае абавязак выканаць патрабаванні з боку дзяржавы і іншых упаўнаважаных структур.

3. Суб'екты (удзельнікі) прававых адносін

Суб'ектамі прававых адносін у самым агульным плане з'яўляюцца ўсе тыя ўдзельнікі разнастайных па зместу і форме, прававых па прыродзе грамадскіх адносін, у выніку шматлікіх дзеянняў якіх фармуюцца самыя розныя прававыя стандарты і трафарэты, прававыя нормы. Да ліку суб'ектаў прававых адносін трэба аднесці таксама і тых сацыяльных суб'ектаў і іх арганізацыі, якія прымаюць непасрэдны ўдзел у стварэнні права, у праватворчасці і асабліва нарматворчасці. Нелагічна было б не ўключаць тых сацыяльных суб'ектаў і арганізацый, вынікам дзеянняў якіх з'яўляецца фармальна азначанае правіла паводзін – норма права, у склад удзельнікаў прававых адносін. Атрымалася б так, што прававыя нормы, пазітыўнае права ствараюць суб'екты, якія самі не ўдзельнічаюць у прававым жыцці, не ажыццяўляюць прававых дзеянняў, а таму і не могуць нічога ведаць аб праве.

Суб'ектаў (удзельнікаў) прававых адносін можна аб'яднаць у асобныя групы. Па-першае, гэта фізічныя асобы і самыя розныя іх аб'яднанні. Па-другое, гэта самыя розныя сацыяльныя аб'яднанні і іх арганізацыі. Па-трэцяе, гэта сацыяльныя супольнасці (народ, нацыя) і іх арганізацыі – дзяржава і дзяржавападобныя арганізацыі. Кожная з гэтых груп удзельнікаў прававых адносін (суб'ектаў прававых адносін), у сваю чаргу, падзяляецца на падгрупы.

Так, у склад фізічных асоб уваходзяць суб'екты нацыянальнага права, звычайна гэта грамадзяне, і суб'екты замежнага права, звычайна гэта іншаземцы, асобы без грамадзянства (апатрыды) і асобы з падвоеным грамадзянствам (біпатрыды). Фізічныя асобы ў мэтах дасягнення пэўных мэт і вырашэння сваіх задач могуць ствараць самыя розныя арганізацыі: прадпрыемствы, фірмы, установы, грамадскія аб'яднанні і г. д. Фізічныя асобы маюць адметныя прававыя ўласцівасці, з дапамогай якіх вызначаюцца іх права-

выя магчымасці, аб'ём суб'ектыўных праў і юрыдычных абавязкаў. Гэта праваздольнасць, дзеездольнасць і дзеліктаздольнасць. Пад праваздольнасцю звычайна разумеецца здольнасць асобы мець правы і выконваць абавязкі. Лічыцца, што праваздольнасць асоба набывае адразу пасля нараджэння. Дзеездольнасць – гэта здольнасць асобы сваімі дзеяннямі набываць (карыстацца, ажыццяўляць) і карыстацца суб'ектнымі правамі і выконваць юрыдычныя абавязкі. Дзеліктаздольнасць фізічнай асобы – гэта здольнасць адказваць за свае ўчынкі і дзеянні, несці ўскладзеныя на асобу меры юрыдычнага ўздзеяння, меры юрыдычнай адказнасці. Праваздольнасць, дзеездольнасць, дзеліктаздольнасць у сукупнасці ствараюць такую характарыстыку фізічных суб'ектаў прававых адносін, якая называецца правасуб'ектнасцю.

Для характарыстыкі створаных фізічнымі асобамі арганізацый звычайна ўжываюць нарматыўна замацаваныя паняцці юрыдычнай асобы і кампетэнцыі. Паняцце юрыдычнай асобы адлюстроўвае пэўныя якасці, якімі павінна валодаць арганізацыя, якая ўступае ў разнастайныя грамадскія адносіны пераважна маёмаснага характару. Для таго, каб набыць якасць юрыдычнай асобы, арганізацыя павінна мець адасобленую маёмасць, свой разліковы рахунак і валодаць іншымі якасцямі. Паняцце кампетэнцыі часцей за ўсё выкарыстоўваецца для характарыстыкі арганізацый, якія ўступаюць у самыя розныя публічныя адносіны, адносіны па кіраванню, па ажыццяўленню ўлады. Кампетэнцыя ўяўляе набор магчымасцей, пераважна ўладнага характару, якімі валодае пэўная арганізацыя, а таксама сістэму абавязкаў, якія яна павінна выконваць. Часта адна і тая ж арганізацыя адначасова з'яўляецца і юрыдычнай асобай, і валодае кампетэнцыяй, але гэтыя якасці праяўляюцца ў розных па зместу і характару прававых адносінах.

У склад другой групы суб'ектаў праваадносін уваходзяць такія сацыяльныя аб'яднанні, як сям'я, працоўны калектыў, тэрытарыяльны калектыў (напрыклад, калектыў жыльцоў дома), а таксама створаныя гэтымі сацыяльнымі аб'яднаннямі разнастайныя арганізацыі – прафесійныя саюзы, органы мясцовага самакіравання і г. д.

Нарэшце, у склад трэцяй групы суб'ектаў уваходзяць, па-першае, сацыяльныя аб'яднанні – нацыі, народнасці, народ, а таксама створаныя імі арганізацыі – дзяржава і дзяржавападобныя ўтварэнні. Гэтая група валодае такімі прававымі якасцямі, якія належаць ім ад Бога, напрыклад, правам нацыі на самавызначэнне, правам народа на вызначэнне свайго лёсу і стварэнне адпаведнай яго ўяўленням дзяржавы, выбарам яе формы і прававога рэжыму, формы дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання. Дзяржава – адзіны

афіцыйны прадстаўнік народа, яна валодае прававой здольнасцю ўступаць у самыя розныя міжнародныя (міждзяржаўныя) адносіны, заключаць разнастайныя пагадненні, а таксама быць самастойным суб'ектам унутрыдзяржаўных прававых адносін.

Трэба ўзгадаць і тое, што частка суб'ектаў прававых адносін, якія ўваходзяць у склад першай, другой і трэцяй груп удзельнікаў грамадскіх адносін, мае магчымасць удзельнічасць у стварэнні норм пазітыўнага права і быць такім чынам суб'ектамі асобнага віду прававых адносін – прававых адносін па стварэнню пазітыўнага права, суб'ектамі нарматворчасці.

Для характарыстыкі прававога становішча ўдзельнікаў прававых адносін, пераважна фізічных асоб, у юрыдычнай літаратуры ўжываюцца такія характарыстыкі, паняцці, катэгорыі, як прававы статус, прававы модус, прававое становішча. Пад прававым статусам удзельніка прававых адносін можна разумець увесь набор, усю сістэму прававых магчымасцей і юрыдычных абавязкаў, якія патэнцыяльна можа мець пэўная катэгорыя суб'ектаў прававых адносін – грамадзян, асоб без грамадзянства і г. д. Пад прававым становішчам можна разумець той фактычны прававы стан, у якім знаходзіцца пэўны, канкрэтны суб'ект (удзельнік) прававых адносін. Можна разважаць таксама аб агульным прававым статусе, напрыклад, фізічных асоб, і асобным прававым модусе грамадзян, асоб без грамадзян і г. д.

4. Аб'екты прававых адносін

Пад аб'ектамі прававых адносін у самым агульным плане часцей за ўсё разумеюць тыя матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці, дзеля якіх суб'екты грамадскіх адносін уступаюць паміж сабой у самыя розныя сувязі, нешта ствараюць, размяркоўваюць і перараз мяркоўваюць. Кожнае грамадства, кожная нацыянальная прававая сістэма будуюцца, функцыянуюць такім чынам, што яны заўсёды імкнуцца, з аднаго боку, дакладна акрэсліць, пералічыць і замацаваць у нормах права тыя каштоўнасці, якія могуць быць аб'ектамі прававых адносін, а, з другога боку, вызначыць, пералічыць і забараніць для карыстання тыя каштоўнасці, якія не могуць быць аб'ектамі прававых адносін. Гэта тэарэтычны падыход да вызначэння аб'ектаў прававых адносін. У практыцы функцыянавання прававых сістэм пераважае эмпірычны шлях вызначэння аб'ектаў як першай, так і другой групы. Толькі дакладнае знаёмства з прававой сістэмай, яе функцыянаваннем дае падставы для высноў аб дазволеных і забароненых для выкарыстання ўдзельнікамі прававых адносін каштоўнасцей.

Безумоўна, каштоўнасці як першай, так і другой групы не могуць быць аднолькавымі для кожнай з вядомых нам прававых сем'яў. У адной прававой сям'і, напрыклад, забараняецца мець некалькі шлюбаў, у той час як для другой такая практыка з'яўляецца звычайнай і натуральнай. Развіццё грамадства прыводзіць да таго, што адны каштоўнасці выходзяць з ужытку і перастаюць быць аб'ектамі прававых адносін, у той час як з'яўляюцца новыя каштоўнасці, якія становяцца аб'ектамі прававых адносін.

У самым агульным плане можна сцвярджаць, што аб'ектамі прававых адносін з'яўляюцца такія каштоўнасці, якія ўтвараюцца ў выніку сацыяльна-карыснай дзейнасці людзей, дзейнасці, якая скіравана на паляпшэнне дабрабыту людзей і якая адпавядае маральным і прававым патрабаванням. Можна зрабіць выснову і адносна тых каштоўнасцей, якія не могуць быць аб'ектамі прававых адносін. Каштоўнасці, якія ствараюцца ў выніку сацыяльна-шкоднай дзейнасці і накіраваны на разбурэнне грамадства і асобы, не адпавядаюць маральным і прававым параметрам, не могуць быць аб'ектамі прававых адносін.

У той самы час не могуць выступаць аб'ектамі прававых адносін тыя каштоўнасці, якія хаця і былі створаны ў выніку сацыяльна-карыснай дзейнасці, але не адпавядаюць нейкім тэхнічным (і адпаведна прававым) параметрам, напрыклад, прадукты харчавання, тэрмін захавання якіх скончыўся. Часам здараецца і так, што каштоўнасці, якія былі створаны ў выніку сацыяльна-шкоднай дзейнасці, пасля адпаведных працэдур як тэхнічнага, так і прававога характару могуць стаць аб'ектамі прававых адносін.

У агульнай тэорыі права выкарыстоўваюцца паняцці аб'ектаў права, аб'ектаў норм права і аб'ектаў прававых адносін. Пры гэтым пад аб'ектам права можна разумець усе тыя грамадскія адносіны, якія маюць прававую прыроду і на якія ўздзейнічаюць нормы пазітыўнага права. Пад аб'ектамі норм права можна разумець паводзіны самых разных удзельнікаў грамадскіх адносін. Менавіта на паводзіны ўдзельнікаў прававых адносін скіраваны нарматыўныя патрабаванні, імператывы норм права. Пад аб'ектамі прававых адносін можна разумець усе тыя каштоўнасці, дзеля карыстання якімі суб'екты права ўступаюць у прававыя адносіны.

Беларуская нацыянальная прававая сістэма будуецца такім чынам, што аб'екты прававых адносін вызначаюцца, па-першае, шляхам фармулявання прававых забарон на выкарыстанне асобных каштоўнасцей у якасці аб'ектаў прававых адносін, а, па-другое, шляхам усталявання дазволаў на выкарыстанне каштоўнасцей у якасці аб'ектаў прававых адносін. Напрыклад, забараняецца пе-

радаваць у прыватную ўласнасць землі сельскагаспадарчага прызначэння. У той самы час землі несельскагаспадарчага прызначэння пры пэўных умовах могуць быць перададзены ў прыватную ўласнасць.

У беларускай прававой сістэме да ліку тых каштоўнасцей, якія могуць быць аб'ектамі прававых адносін, адносяцца: а) матэрыяльныя каштоўнасці (напрыклад, жылы дом); б) нематэрыяльныя каштоўнасці (напрыклад, жыццё, здароўе і г. д.); в) прадукты, вынікі інтэлектуальнай дзейнасці чалавека (напрыклад, вырабы мастацтва, кнігі); г) каштоўныя паперы (напрыклад, імянныя прыватызацыйныя чэкі, аблігацыі); д) самыя розныя дзеянні як юрыдычных, так і фізічных асоб (напрыклад, лекцыі, спектаклі, канцэрты); е) вынікі пэўных дзеянняў (напрыклад, паслугі сувязі); ж) іншыя каштоўнасці. Тут прыведзены далёка не поўны пералік тых каштоўнасцей, якія могуць быць аб'ектамі прававых адносін у нацыянальнай прававой сістэме Рэспублікі Беларусь.

5. Юрыдычныя факты

Прававыя адносіны, якія з'яўляюцца гістарычна і генетычна першаснай праявай (формай) існавання права, складваліся ў выніку разнастайных пагадненняў паміж удзельнікамі таварна-грашовых, эквівалентных па свайму характару адносін. Патрэбы, інтарэсы, матывы людзей і іх згода па ажыццяўленню прававых па свайму характару дзеянняў былі дастатковымі для функцыянавання праваадносін. Але пасля таго, як права набыло сваю нарматыўную форму існавання, а прававыя адносіны былі выкладзены і замацаваны ў нормах права ў якасці своеасаблівых мадэляў пажаданых паводзін удзельнікаў прававых адносін, узнікла праблема прывязкі гэтых мадэлей да рэальных грамадскіх адносін. Яна была вырашана наступным чынам. У нормах права, а дакладней у гіпотэзах норм права, сталі замацоўваць, прадугледжваць тыя рэальныя жыццёвыя абставіны, з наступленнем (узнікненнем) якіх і сталі звязваць трансфармацыю прадпісанняў норм права ў рэальныя грамадскія адносіны, у паводзіны людзей шляхам фармавання паміж суб'ектамі грамадскіх адносін «законаадносін». *Гэтыя рэальныя жыццёвыя абставіны, з узнікненнем якіх паміж суб'ектамі грамадскіх адносін складваюцца, спыняюцца, змяняюцца прававыя адносіны, называюцца ў навуцы юрыдычнымі фактамі*

Юрыдычныя факты звычайна класіфікуюцца па нейкіх прыметах на асобныя групы.

Так, па волевай прымеце юрыдычныя факты падзяляюцца на падзеі, дзеянні і стан. Падзеі не залежаць ад волі тых суб'ектаў, паміж якімі складваюцца, спыняюцца ці мяняюцца прававыя адносіны. Напрыклад, стыхійнае бедства абумоўлівае ўзнікненне адных прававых адносін паміж, напрыклад, органамі па надзвычайных сітуацыях і тымі, хто пацярпеў ад стыхійнага бедства, да знікнення прававых адносін паміж людзьмі, калі, напрыклад, была знішчана нейкая каштоўная папера, і да змены ў маёмасных прававых адносінах, калі былі пашкоджаны пэўныя рэчы. Дзеянні з'яўляюцца самым пашыраным відам юрыдычных фактаў, якія выдзелены па волевай прымеце. Яны залежаць наўпрост ад волі будучых удзельнікаў прававых адносін. Гэта могуць быць аднабаковыя дзеянні, а могуць быць двухбаковыя пагадненні. Да дзеянняў адносяцца юрыдычныя акты. Напрыклад, выданне кіраўніком установы загада аб прэміраванні супрацоўніка за дасягненні ў працы.

Да юрыдычных фактаў, якія называюцца станам (ці юрыдычным станам), адносяцца, напрыклад, стан грамадзянства ці безгрампадзянства, роднасныя стасункі, пенсіённы стан і г. д.

У сваю чаргу, падзеі звычайна падзяляюць на абсалютныя і адносныя, а дзеянні – на правамерныя і неправамерныя, прычым правамерныя падзяляюцца, у сваю чаргу, на юрыдычныя акты і юрыдычныя ўчынкі, а неправамерныя – на злачынствы і іншыя правапарушэнні.

Юрыдычныя факты падзяляюцца ў залежнасці ад іх уплыву на развіццё прававых адносін на праваствараючыя, на правазмяняючыя і на праваспыняючыя.

Калі для ўзнікнення, змянення ці спынення прававых адносін патрабуецца не адна жыццёвая сітуацыя, не адзін юрыдычны факт, а іх сістэма, паслядоўнасць фактаў, то такую сукупнасць юрыдычных фактаў называюць «фактычным складам». Напрыклад, каб стаць студэнтам юрыдычнага факультэта Установы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы», патрэбна мець сярэднюю адукацыю, паспяхова прайсці конкурс і на падставе загада рэктара быць залічаным у склад студэнтаў юрыдычнага факультэта. У сваю чаргу, фактычныя склады могуць быць простымі, калі патрэбна наяўнасць розных фактаў, якія адносяцца да нейкай адной галіны права, і складанымі, калі для ўзнікнення, змянення і спынення праваадносін патрэбны факты з розных галін права.

З агульнага правіла аб тым, што пад юрыдычнымі фактамі можна разумець тыя фактычныя, рэальныя абставіны, учынкі, дзеянні, якія прадугледжаны, замацаваны ў нормах права і з якімі звяз-

ваюцца ўзнікненне, спыненне і змяненне прававых адносін, існуюць пэўныя выключэнні. Напрыклад, юрыдычныя фікцыі. Згодна з юрыдычнай фікцыяй памерлага чалавека, памерлай можа быць прызнана асоба, якая адсутнічае пэўны тэрмін, месцазнаходжанне якой дакладна высветліць не здолелі кампетэнтныя органы і адносна якой было вынесена рашэнне суда аб прызнанні памерлай асобай. У дадзеных варунках мы маем справу не з рэальнасцю, а з тым, што павінна быць прызнана рэальным фактам. Пасля таго, як адносна пэўнай асобы было прынята кампетэнтнае рашэнне аб прызнанні яе памерлай, у іншых суб'ектаў прававых адносін можа памяняцца прававое становішча. Нехта можа атрымаць магчымасць на юрыдычнае скасаванне шлюбу, нехта можа ўступіць у спадчынныя адносіны і г. д.

Пытанні для самаправеркі

1. Якія грамадскія адносіны можна лічыць прававымі, калі яны ператвараюцца ў прававыя адносіны?
2. Пералічыце прыметы прававых адносін і раскрыйце іх змест.
3. Дайце класіфікацыю прававых адносін.
4. Што ўяўляюць сабой «законаадносіны»?
5. Якія прававыя адносіны складваюцца толькі на падставе норм права?
6. Раскрыйце змест прававых адносін.
7. Раскрыйце будову (структуру) і змест суб'ектыўнага права і юрыдычнага абавязку.
8. Дайце класіфікацыю ўдзельнікаў прававых адносін і ахарактарызуйце іх віды.
9. Раскрыйце змест праваздольнасці, дзеяздольнасці, дзеліктаздольнасці, правасуб'ектнасці, прававога статусу і прававога становішча.
10. У чым Вы бачыце асаблівасці прававога становішча замежнікаў, асоб без грамадзянства і замежных грамадзян?
11. У чым Вам бачыцца розніца паміж аб'ектамі права, нормамі права і прававымі адносінамі?
12. Дайце класіфікацыю і пералічыце аб'екты прававых адносін, якія ўласцівы беларускай нацыянальнай прававой сістэме.
13. Якія фактары аказваюць уплыў на выбар каштоўнасцей, якія могуць быць аб'ектамі прававых адносін?
14. Дайце паняцце і азначэнне юрыдычных фактаў.
15. Правядзіце класіфікацыю юрыдычных фактаў.
16. Раскрыйце змест паняцця «фактычны склад».
17. Што ўяўляюць сабой юрыдычныя фікцыі, якое месца яны займаюць у прававой сістэме грамадства?

Тэма 19. ПРАВАМЕРНЫЯ ПАВОДЗІНЫ, ПРАВАПАРУШЭННЕ ЮРЫДЫЧНАЯ АДКАЗНАСЦЬ

1. Правамерныя паводзіны і іх віды.
2. Паняцце, прыметы і віды правапарушэння.
3. Юрыдычны склад правапарушэння.
4. Паняцце, азначэнне і віды юрыдычнай адказнасці.
5. Мэты і функцыі юрыдычнай адказнасці.

1. Правамерныя паводзіны і іх віды

У паўсядзённым жыцці ўдзельнікі грамадскіх адносін здзяйсняюць самыя розныя ўчынкі і ажыццяўляюць розныя дзеянні. Адны з іх адбываюцца ў сферы дзеяння права і таму маюць прававую прыроду, а іншыя – за межамі дзеяння права. Адносна апошняй групы можна зрабіць выснову, што гэта ўчынкі і паводзіны, якія з'яўляюцца юрыдычна (у прававых адносінах) нейтральнымі. Змест гэтых паводзін не заснаваны на абмене каштоўнасцей на суразмерных пачатках, іх узнікненне не абумоўлена з'яўленнем у грамадстве рэгулярнага тавараабмену, і ў сваім развіцці гэтыя сацыяльныя адносіны не абумоўлены таварна-грашовымі сувязямі, а заснаваны зусім на іншых, неэквівалентных пачатках. Напрыклад, учынкі і дзеянні, якія здзяйсняюцца пад уплывам маральных імператываў і норм, можна аднесці да ліку юрыдычна нейтральных. Міласэрныя ўчынкі, напрыклад, па сваёй сутнасці могуць быць спалучаны з размеркаваннем і перараз меркаваннем каштоўнасцей, але гэта адбываецца на неэквівалентнай аснове, і таму міласэрныя ўчынкі з'яўляюцца юрыдычна нейтральнымі.

Тыя самыя ўчынкі і дзеянні, якія ажыццяўляюцца фізічнымі і юрыдычнымі асобамі, органамі і арганізацыямі ў сферы дзеяння права, з'яўляюцца прававымі і падзяляюцца на дзве вялікія групы (формы). Першую з іх складаюць тыя ўчынкі і дзеянні, якія цалкам адпавядаюць прававым прадпісанням, знаходзяцца ў русле дзеючага права. Іх называюць правамернымі. А тыя ўчынкі і дзеянні, якія не адпавядаюць прававым прадпісанням, а, наадварот, разыходзяцца з імі, парушаюць дзеючае права, яго нормы складаюць самастойную групу (форму) прававых паводзін (паводзін у сферы дзеяння права) – правапарушэнні.

Правамерныя паводзіны, учынкі, дзеянні звычайна падзяляюцца на самыя розныя групы і віды – правамерныя паводзіны юры-

дычных і фізічных асоб, арганізацый, органаў і ўстаноў; правамерныя паводзіны ў розных структурах права – грамадзянскія, сямейныя, публічныя, прыватныя, матэрыяльныя, працэсуальныя, рэгулятыўныя, ахоўчыя і г. д. Найбольш прадуктыўнай у навуковых і практычных адносінах з'яўляецца класіфікацыя правамерных паводзін, дзеянняў і ўчынкаў у залежнасці ад тых матываў, якімі кіруюцца суб'екты грамадскіх адносін, ажыццяўляючы разнастайныя дзеянні ў сферы дзеяння права. Па дадзенай прымеце правамерныя паводзіны падзяляюцца на:

1) звычайныя, у нейкіх адносінах «аўтаматычныя» правамерныя паводзіны, учынкі, дзеянні, якія здзяйсняюцца ў сферы дзеяння права шматлікімі суб'ектамі права, прычым яны не задумваюцца над правамернасцю ці неправамернасцю такіх дзеянняў;

2) правамерныя ўчынкі (дзеянні), якія можна назваць тэрмінам «законапаслухмяныя». Законапаслухмянымі лічацца тыя правамерныя ўчынкі, якія здзяйсняюцца суб'ектамі права ў адпаведнасці з яго прадпісаннямі і патрабаваннямі таму, што яны асцерагаюцца пакарання за іншыя неправамерныя паводзіны;

3) правамерныя дзеянні і ўчынкі, якія здзяйсняюцца ў адпаведнасці з нормамі права таму, што такія паводзіны характэрны для бліжэйшага атачэння ўдзельнікаў грамадскіх адносін, напрыклад, у сям'і, у працоўным калектыве, сярод сяброў і г. д., гэта канфармісцкія правамерныя ўчынкі;

4) учынкі і дзеянні правамернага характару, якія ажыццяўляюцца ў адапаведнасці з нормамі права таму, што суб'екты права цалкам згодныя з прадпісаннямі норм права, салідарныя з прававымі патрабаваннямі. Гэтыя правамерныя ўчынкі называюцца салідарнымі (альбо салідарысцкімі);

5) правамерныя ўчынкі і дзеянні, якія здзяйсняюцца фізічнымі асобамі з перакананнямі ў тым, што толькі з дапамогай правамерных паводзін, толькі з дапамогай права чалавек можа дасягнуць сваіх мэт, – гэта сацыяльна-актыўныя правамерныя ўчынкі і паводзіны.

Кожная з адзначаных груп (відаў) правамерных паводзін перасякаецца з астатнімі відамі і групамі, мае нейкае падабенства з імі. Так, звычайныя правамерныя паводзіны шчыльна звязаны з законапаслухмянымі. Але ў першым выпадку размова ідзе аб «звычайна» правамерных паводзінах, а ў другім – аб правамерных паводзінах, якія ажыццяўляюцца таму, што суб'екты ўсведамляюць магчымыя пагрозы з боку дзяржавы і грамадства. Здымаюцца такія пагрозы, адсутнічае належны кантроль за такімі паводзінамі і

тыя самыя суб'екты могуць здзейсніць неправамерныя ўчынкі і дзеянні. Таму законапаслухмяныя правамерныя паводзіны – не самы лепшы від правамерных паводзін.

Канфармісцкія паводзіны ў нейкіх адносінах нагадваюць салідарысцкія правамерныя паводзіны. Але ў першым выпадку правамернасць учынкаў і дзеянняў абумоўлена як бы знешнімі прычынамі. Суб'екты не ўсведамляюць (могуць не ўсведамляць) сваю згоду (салідарнасць) з дзеючым правам, бліжэйшае атачэнне ў сваіх паводзінах выпрацоўвае нейкі стэрэатып правамернасці, і асоба прытрымліваецца гэтага стэрэатыпу, не пранікаючы ў змест дзеючага права і не атасамляючы свае інтарэсы і каштоўнасці з каштоўнасцямі, якія замацаваны ў дзеючым праве.

Салідарысцкія правамерныя паводзіны можна лічыць адной з самых дасканалых форм (відаў) правамерных паводзін, таму што асоба паводзіць у адпаведнасці з духам і зместам права, бо яе інтарэсы і яе каштоўнасці цалкам адпавядаюць зместу дзеючага права. У дзеючым праве асоба знаходзіць патрымку і надзею пры ажыццяўленні сваіх інтарэсаў, пры набыцці, размеркаванні і перараз-меркаванні каштоўнасцей.

Сацыяльна-прававая актыўнасць заснавана на салідарысцкіх правамерных паводзінах, перасякаецца з імі. Цяжка ўявіць сацыяльна-прававую актыўнасць, якая б была абумоўлена прычынамі, далёкімі ад салідарнасці са зместам, духам права. Разам з тым сацыяльна-прававая актыўнасць, якая не заснавана на разуменні магчымасцей права, на рэальным усведамленні таго, што можа быць зроблена з дапамогай права ў сацыяльным жыцці, прыводзіць да так званага «злоўжывання правам». Выкарыстоўваючы магчымасці прававой формы, асоба можа бясконца звяртацца да службовых асоб, дзяржаўных органаў, устаноў і арганізацый з разнастайнымі зваротамі, скаргамі, прапановамі, у якіх не ўтрымліваецца змястоўных высноў, неабходнай інфармацыі і г. д.

Адзначаная форма празмернай сацыяльна-прававой актыўнасці, як правіла, распаўсюджана сярод тых суб'ектаў права, для якіх уласцівы прававы ідэалізм (фетышызм). Такім чынам, сацыяльна-прававая актыўнасць асобнымі сваімі праявамі і момантамі можа судакранацца з дэфармаванай прававой свядомасцю. У гэтых выпадках сацыяльна-прававая актыўнасць пераўтвараецца ў сваю супрацьлегласць па выніках і скіраванасці.

Вучэнне аб правамерных паводзінах наўпрост сутыкаецца з прававой свядомасцю, прававой культурай і прававым выхаваннем. Прававое выхаванне адной са сваіх мэт мае выпрацоўку саліда-

рысцкіх правамерных паводзін, паводзін, якія былі бы абумоўлены перакананасцю ў справядлівасці права і неабходнасці захавання і выканання яго патрабаванняў. Распаўсюджанасць салідарысцкіх правамерных паводзін у грамадства сведчыць аб узроўні прававой культуры і характарызуе прававую культуру асобы ў якасці асобы з высокай прававой культурай.

2. Паняцце, прыметы і віды правапарушэння

Правапарушэнне – адна з распаўсюджаных форм паводзін фізічных і юрыдычных асоб, органаў, арганізацый і службовых асоб у сферы дзеяння права. *Пад правапарушэннем у самым агульным плане можна разумець супрацьпраўнае, свядомае (асэнсаванае), грамадска-шкоднае дзеянне.*

Правапарушэнне – гэта заўсёды дзеянне. Дзеянне характарызуецца як нейкімі актыўнымі дзеяннямі з боку правапарушальніка, так і пасіўнымі дзеяннямі, але пры гэтым права якраз патрабуе актыўнасці з боку суб'ектаў грамадскіх адносін. Прыкладам пасіўных дзеянняў, якія лічацца правапарушэннем, можа быць астаўленне чалавека ў небяспецы асобай, якая павінна і магла аказаць чалавеку неабходную дапамогу.

Правапарушэннем не лічацца светапогляды асобы, яе перакананні і думкі, усё тое, што звязана з унутраным мірам асобы. Да таго часу, пакуль унутраны светапогляд асобы не выказаны, не праяўлены праз знешне актыўныя ці знешне пасіўныя паводзіны асобы, яны застаюцца за межамі прававога рэгулявання і не ацэньваюцца як правамерныя ці неправамерныя. Безумоўна, калі ўнутраныя перакананні абумовілі здзяйсненне правапарушэння, яны ўключаюцца ў аналіз і структуру правапарушэння ў якасці пабуджальных прычын, матываў неправамерных паводзін, якія падлягаюць прававой ацэнцы.

Правапарушэннем лічыцца толькі ўсвядомленае, асэнсаванае дзеянне. Асоба поўнасцю кантралюе свае дзеянні, мае волю на іх здзяйсненне, кіруецца пэўнымі матывамі, яна цалкам ахоплівае свядомасцю свае ўчынкі і дзеянні. Нельга лічыць правапарушэннем неправамерныя дзеянні асобы, якія здзейснены пад фізічнай і псіхічнай пагрозай. Напрыклад, пад пагрозай жыццю асобы яе прымушаюць здзейсніць адміністрацыйнае ці службовае правапарушэнне. Не з'яўляюцца правапарушэннямі дзеянні душэўна хворых асоб, асоб, якія не дасягнулі пэўнага ўзросту, які звычайна лічыцца неабходным дзеля таго, каб асоба асэнсоўвала і ўсведамляла грамадскую шкоднасць, супрацьпраўнасць сваіх дзеянняў.

У сітуацыях, калі па нейкіх прычынах асоба не ў стане кантраляваць свае дзеянні і здзяйсняе ўчынкі, знаходзячыся ў непрытомным стане, нельга адносіць яе дзеянні да ліку правапарушэнняў. Праўда, непрытомны стан – гэта такі стан, які не залежыць ад волевых высілкаў самой асобы. Калі ж асоба сама сябе давяла да непрытомнага стану і ўчыніла дзеянне неправамернага характару, то дадзеная абставіна не вызваляе асобу ад юрыдычнай адказнасці. Такім чынам, непрытомны стан, у якім знаходзіцца асоба і пры якім яе дзеянні не лічацца правапарушэннем, – гэта такі стан, які выкліканы прычынамі, якія не залежаць ад волевых высілкаў самой асобы. Існуюць такія псіхічныя захворванні, пры якіх асоба ажыццяўляе пэўныя дзеянні, але пры гэтым не кантралюе іх сваёй воляй, не можа ўплываць на іх, і таму такія дзеянні не лічацца правапарушэннямі. Натуральна, што правапарушэнні, якія ажыццяўляюцца юрыдычнымі асобамі, арганізацыямі, органамі і ўстановамі, заўсёды адносяцца да ліку кантралюемых воляй і заўсёды здзяйсняюцца ў прытомным стане.

Правапарушэннем лічыцца такое асэнсаванае і ўсвядомленае дзеянне, якое прычыняе шкоду грамадскім адносінам, правам і інтарэсам грамадства і дзяржавы, іншым людзям. Шкода праяўляецца ў розных формах, але ў самым агульным плане грамадская шкоднасць усіх і кожнага правапарушэння зводзіцца ў рэшце рэшт да таго, што парушаецца нармальны рытм існавання і развіцця прававых адносін і грамадскіх адносін увогуле. Грамадская шкоднасць можа выражацца ў пашкоджанні рэчаў, іншай маёмасці, крадзяжах і рабаўніцтвах, прычыненні шкоды жыццю і здароўю асобы, гвалце і незаконным пазбаўленні волі. Шкода павінна быць усвядомленай і асэнсаванай. Толькі такая шкода можа лічыцца прыметай правапарушэння. Звычайна ўсведамленне і асэнсаванне шкоды звязваецца з дасягненнем асобай пэўнага ўзросту. Лічыцца, што асоба да пэўнага ўзросту не ў стане поўнасцю ўсведамляць свае ўчынкі, ацэньваць іх значнасць і шкоднасць. Узроставая мяжа для кожнага віду правапарушэнняў і нават у межах аднаго і таго ж віду правапарушэнняў можа быць рознай. Шкода грамадскім адносінам можа быць прычынена толькі ўдзельнікамі грамадскага жыцця, толькі суб'ектамі грамадскіх адносін. Шкода, якая прычынена іншымі жывымі істотамі, а не фізічнымі асобамі, не ўваходзіць у пералік прымет правапарушэнняў. За шкоду, якая прычынена жывымі істотамі, адказваюць уладальнікі (уласнікі) жывых істот.

Шкоду грамадскім адносінам, нармальнаму рытму іх развіцця і функцыянаванню наносіць не нейкае адно правапарушэнне, на-

ват самае цяжкае, а іх сістэма, іх колькасць, распаўсюджанасць у грамадстве. Напрыклад, распаўсюджанасць адміністрацыйных правапарушэнняў ці дысцыплінарных праступкаў ў стане прычыніць вялікую грамадскую шкоду нават тады, калі кожны паасобку дысцыплінарны праступак, напрыклад, спазненне на працу, на першы погляд не ўяўляе вялікай грамадскай шкоды. Грамадская шкоднасць характарызуе сацыяльную значнасць правапарушэння, а супрацьпраўнасць – юрыдычную скіраванасць.

Правапарушэннем лічыцца такое ўсвядомленае, асэнсаванае, грамадска шкоднае дзеянне, якое парушае дзеючае права. Менавіта права, а не толькі нормы пазітыўнага права. Таму і разглядаемая прымета правапарушэння фармулюецца не як парушэнне норм права, не як нормапарушэнне, а як правапарушэнне. Для рамана-германскай прававой сям'і, у якой права існуе ў трох сваіх праявах (іпастасях), а асноўнай крыніцай права з'яўляецца нарматыўны прававы акт, правапарушэннем лічыцца грамадска-шкоднае ўсвядомленае дзеянне, якое парушае тыя нормы дзеючага права, якія дакладна замацаваны ў такіх афіцыйных крыніцах права, як нарматыўны прававы акт. Прычым гэтае правіла ўдакладняецца вядомай з часоў рымскага права аксіёмай аб тым, што не існуе правапарушэння і пакарання, калі гэта не прадугледжана ў законе (нарматыўным прававым акце). Натуральна, у тых прававых сем'ях і сістэмах, дзе асноўнымі крыніцамі права з'яўляюцца іншыя крыніцы права, напрыклад, прававыя прэцэдэнты, правапарушэнні прадугледжаны пераважна ў гэтай крыніцы права, а для прававых сем'яў звычаёвага характару ўласціва замацаванне правапарушэнняў і іх відаў у такой крыніцы права, як прававы звычай.

З дапамогай адзначаных прымет дзеянні, якія з'яўляюцца правапарушэннямі, адрозніваюцца ад дзеянняў, учынкаў, якія цалкам адпавядаюць дзеючаму праву і ўваходзяць у склад тых прававых дзеянняў, якія называюцца правамернымі паводзінамі.

З мэтай больш падрабязнага і грунтоўнага вывучэння правапарушэнняў у юрыдычнай навуцы праводзяць іх класіфікацыю. Сярод падстаў класіфікацыі часцей за ўсё выкарыстоўваюцца прыметы, уласцівыя правапарушэнням.

Па форме дзеяння правапарушэнні падзяляюцца на правапарушэнні актыўнага і пасіўнага характару, на правапарушэнні, якія суправаджаюцца актыўнымі знешнімі дзеяннямі, вынікамі якіх з'яўляецца шкода грамадскім адносінам. Пасіўнымі лічацца правапарушэнні, пры якіх асоба не здзяйсняе неабходных дзеянняў, іншымі словамі, бяздзейнічае ў той час, як яна абавязана гэта зрабіць.

Па ступені шкоднасці грамадскім адносінам правапарушэнні падзяляюцца на злачынствы і праступкі. Лічыцца, што самымі шкоднымі правапарушэннямі з'яўляюцца злачынствы.У рамана-германскай прававой сям'і ўсе правапарушэнні, якія адносяцца да злачынстваў, звычайна замацоўваюцца ў Крымінальным кодэксу. У сваю чаргу, праступкі таксама падзяляюцца на асобныя групы: на грамадзянскія, адміністрацыйныя, дысцыплінарныя і г. д.

У залежнасці ад характару тых норм права, якія парушаюцца і адначасова ўваходзяць у склад пэўных структур права, правапарушэнні падзяляюцца на матэрыяльныя і працэсуальныя, публічныя і прыватныя, канстытуцыйныя, грамадзянскія, сямейныя, фінансавыя і г. д.

Прыметы правапарушэння, якія былі разгледжаны вышэй, даюць магчымасць правесці дакладныя межы паміж правамернымі і неправамернымі паводзінамі. Правесці такія межы вельмі важна, бо аднясенне тых ці іншых дзеянняў і ўчынкаў да складу правапарушэнняў заўсёды прыводзіць у рух дзяржаву, якая павінна адрэагаваць на неправамерныя дзеянні, правапарушэнні з тым, каб выканаць сваю місію ў грамадстве па абароне права, яго ўзнаўленню і захаванню.

3. Юрыдычны склад правапарушэння

У юрыдычнай навуцы для характарыстыкі правапарушэнняў распрацаваны і выкарыстоўваюцца дзве тэарэтыка-прававыя канструкцыі, якія перасякаюцца паміж сабой, у нечым падобныя адна на другую, але якія выконваюць розныя функцыі: тэарэтыка-прававая канструкцыя прыметы правапарушэння і юрыдычны склад правапарушэння. З дапамогай прымет правапарушэння праводзіцца дакладная мяжа паміж правамернымі і неправамернымі паводзінамі. А вось з дапамогай тэарэтыка-прававой канструкцыі юрыдычны склад правапарушэння вызначаюцца ўнутраная будова правапарушэнняў, іх архітэктоніка, якія дазваляюць, па-першае, дакладна размежаваць правапарушэнні па асобных відах і, па-другое, правесці размежаванні сярод правапарушэнняў унутры асобных відаў правапарушэнняў, напрыклад, размежаванні сярод злачынстваў, правесці дакладную іх юрыдычную кваліфікацыю.

Такім чынам, тэарэтыка-прававая канструкцыя прыметы правапарушэння і тэарэтыка-прававая канструкцыя юрыдычны склад правапарушэння канкрэтызуюць нашыя ўяўленні ад учынках і дзеяннях у сферы права. Першая канструкцыя праводзіць градацыю

паміж дзеяннямі і ўчынкамі ў сферы дзеяння права, удакладняе мяжу паміж правамернымі і неправамернымі паводзінамі, а другая – удакладняе змест і характар выключна правапарушэнняў, служыць іх канкрэтызацыі і ідывідуалізацыі. Калі прыметы правапарушэння характарызуюць знешнія прыметы і ўласцівасці дзеянняў і бяздзеянняў, то юрыдычны склад правапарушэнняў скіраваны на характарыстыку ўнутранай будовы правапарушэння.

Адсутнасць у нейкага дзеяння, у нейкага ўчынка ў сферы права хаця б адной з прымет правапарушэння сведчыць аб адсутнасці падзеі правапарушэння. Няма ўсіх прымет, якія характэрны для правапарушэння –няма і такой з'явы, як правапарушэнне, дзеянне адносіцца да правамерных паводзін. Адсутнасць у складзе правапарушэння хаця б аднаго з элементаў юрыдычнага складу правапарушэння сведчыць аб адсутнасці складу правапарушэння цалкам. Пры характарыстыцы юрыдычнай адказнасці адсутнасць падзеі правапарушэння і складу правапарушэння з'яўляецца падставай для спынення юрыдычнага пераследу, калі яно мае месца.

Такім чынам, юрыдычны склад правапарушэння – гэта ўнутраная структура правапарушэння, яго будова. Элементы юрыдычнага складу правапарушэння з'яўляюцца своеасаблівымі індыкатарамі, якія дазваляюць правесці ідэнтыфікацыю правапарушэння з яго азначэннямі, якія замацаваны ў дзеючым праве. Звычайна выдзяляюць чатыры элементы юрыдычнага складу правапарушэння: суб'ект правапарушэння, аб'ект правапарушэння, суб'ектыўны бок правапарушэння, аб'ектыўны бок правапарушэння.

Суб'ектамі правапарушэння з'яўляюцца тыя ўдзельнікі грамадскіх адносін, якія ўчынілі дзеянне, якое адпавядае ўсім прыметам правапарушэння. У самым агульным плане суб'ектамі правапарушэнняў могуць быць усе віды ўдзельнікаў прававых адносін. Існуе шчыльная ўзаемазалежнасць паміж удзельнікамі прававых адносін, тымі суб'ектамі, якія ствараюць права, і тымі суб'ектамі, якія здзяйсняюць правапарушэнні. У прынцыповым плане гэта адно і тое ж кола ўдзельнікаў сацыяльнага жыцця, якія выступаюць у розных іпастасях і ў розных якасцях пры стварэнні права, рэалізацыі права і ў выпадках здзяйснення правапарушэння. Не існуе такіх прававых адносін і такіх суб'ектаў праваадносін, якія б не парушаліся і якія б не парушалі прававых адносін. Іншая справа, што характар і змест правапарушэнняў будзе розным, як рознай будзе і юрыдычная адказнасць.

Суб'ектамі могуць быць фізічныя асобы, сацыяльныя аб'яднанні, дзяржава, дзяржаўныя органы, службовыя асобы. Сацыяль-

ныя аб'яднанні, дзяржава, дзяржаўныя органы, іншыя калектыўныя ўтварэнні з'яўляюцца суб'ектамі правапарушэння пры ўмове, што ў іх ёсць адзіная воля, калі адказнасць гэтых удзельнікаў прававых адносін прадугледжана ў нормах міжнароднага і нацыянальнага права. Для кожнай групы суб'ектаў прававых адносін і, адпаведна, правапарушэнняў у юрыдычнай навуцы сфармуляваны і на нарматыўным узроўні замацаваны адпаведныя патрабаванні. Для фізічных асоб такімі патрабаваннямі з'яўляюцца ўзроставыя межы, а таксама іх характарыстыка ў якасці грамадзян, замежнікаў, асобаў без грамадзянства і г. д.

Аб'ектамі правапарушэнняў з'яўляюцца самыя розныя віды грамадскіх адносін, якім у выніку правапарушэнняў наносіцца шкода. Сэнс гэтай шкоды зводзіцца да таго, што парушаецца нармальны рытм развіцця і функцыянавання грамадскіх адносін. Пры гэтым трэба праводзіць розніцу паміж аб'ектамі правапарушэнняў і тымі каштоўнасцямі, якія з'яўляюцца аб'ектамі прававых адносін. Калі прычыняецца нейкая шкода аб'ектам прававых адносін, напрыклад, рэчам, то, безумоўна, парушаюцца гэтыя рэчы, аб'екты прававых адносін, але адначасова наносіцца шкода інтарэсам уласнікаў гэтых рэчаў і парушаецца нармальны стан адносін уласнасці. Такім чынам, каштоўнасці, якім прычынена шкода, выступаюць непасрэднымі прадметамі правапарушэння, а аб'ектам правапарушэнняў заўсёды з'яўляюцца грамадскія адносіны.

Суб'ектыўны бок правапарушэнняў уключае ў сябе віну ў форме наўмыснасці і неасцярожнасці, а таксама матывы і мэты здзяйснення правапарушэнняў. Віноўным лічыцца такое ўсвядомленае і асэнсаванае дзеянне, якое характарызуецца адмоўным, негатыўным стаўленнем асобы да інтарэсаў грамадства, дзяржавы, людзей і г. д. Віна зводзіцца да стаўлення асобы да інтарэсаў іншых удзельнікаў грамадскіх адносін. Правапарушальнік вылучае свае інтарэсы ў якасці самых важных і самых галоўных, а з інтарэсамі іншых людзей, грамадскіх аб'яднанняў, супольнасцей і дзяржавы не лічыцца. Больш таго, гэтым інтарэсам наўмысна ці па неасцярожнасці наносіцца шкода. Калі правапарушальнік усведамляе, што ён наносіць шкоду інтарэсам іншых удзельнікаў грамадскіх адносін, жадае гэта зрабіць і робіць, мы маем справу з наўмыснымі правапарушэннямі. Калі правапарушальнік не ўсведамляе, што сваімі дзеяннямі прычыняе шкоду, але можа і павінен усведамляць адмоўныя вынікі сваіх дзеянняў, то такая віноўнасць называецца неасцярожнасцю.

Адмоўныя, негатыўныя адносіны правапарушальніка да інтарэсаў іншых удзельнікаў грамадскіх адносін, характар віноўнасці ўдакладняюцца праз характарыстыку матываў і мэт правапарушэнняў. Мэта канкрэтызуе скіраванасць волі правапарушальніка і дазваляе зрабіць выснову аб форме віны правапарушальніка. Матыў указвае на прычыну паводзін правапарушальнікаў і дазваляе зрабіць выснову аб глыбіні і характары адмоўных, негатыўных адносін асобы да інтарэсаў грамадства, дзяржавы і іншых асоб.

Аб'ектыўны бок правапарушэння складаецца з асноўных і дадатковых элементаў. Да асноўных момантаў (элементаў) правапарушэнняў адносіцца само дзеянне (актыўныя і пасіўныя паводзіны), тыя наступствы, што вынікаюць з дзеяння, а таксама прычынная сувязь, якая існуе паміж дзеяннямі і наступствамі. Пры гэтым прычынная сувязь павінна быць канкрэтнай. Павінна быць дакладна ўстаноўлена сувязь паміж дзеяннем і адмоўнымі шкоднымі вынікамі, павінна быць даказана, што менавіта гэтыя дзеянні выклікалі менавіта гэтыя наступствы. Да дадатковых характарыстык правапарушэнняў адносяцца абставіны здзяйснення правапарушэнняў, месца правапарушэння, час правапарушэння, спосаб і сродкі.

4. Паняцце, азначэнне і віды юрыдычнай адказнасці

Пад юрыдычнай адказнасцю можна разумець *асобны від прававых адносін, якія ўзнікаюць (складваюцца) паміж правапарушальнікамі і дзяржавай альбо іншым афіцыйным прадстаўніком супольнасці.*

Гэтыя адносіны маюць свой адметны змест. Правапарушальнікі абавязаны перанесці меры ўздзеяння, але пры гэтым маюць права на тое, каб меры ўздзеяння адпавядалі зместу і характару правапарушэння і былі ўскладзены ў адпаведнасці з дзеючым правам. У сваю чаргу, дзяржава мае права прымяніць меры ўздзеяння да правапарушальніка, але пры гэтым абавязана прымяніць меры ўздзеяння ў адпаведнасці з законам з улікам характару праванарушэння.

Юрыдычная адказнасць з'яўляецца адным з праяўленняў дзяржаўнага прымусу, але выдзяляецца ў якасна асобны від дзяржаўнага прымусу, таму што заўсёды ўзнікае толькі на падставе правапарушэння. Іншыя меры дзяржаўнага прымусу таксама ажыццяўляюцца на падставе дзеючых норм права, але іх прымяненне не абумоўлена, не вынікае непасрэдна з правапарушэння. Іншыя меры дзяржаўнага прымусу, напрыклад, прымусовы прывод у міліцыю,

могуць быць спалучаны з правапарушэннем. Але такая сувязь існуе далёка не заўсёды. Дагляд асоб і рэчаў пры паветраных перавозках, пры перасячэнні дзяржаўнай мяжы і г. д. часта суправаджаецца мерамі дзяржаўнага ўздзеяння і дзяржаўнага прымусу, але гэта не вынікае з правапарушэнняў. Юрыдычная адказнасць заўсёды суправаджаецца не толькі мерамі дзяржаўнага прымусу, але і асуджэннем правапарушальнікаў з боку дзяржавы, супольнасці і іх аб'яднанняў.

Юрыдычная адказнасць у якасці самастойнага, асобнага віду прававых адносін заўсёды ўзнікае на пэўных падставах. Да ліку падстаў юрыдычнай адказнасці адносяцца найперш нормы права, у якіх прадугледжваецца юрыдычная адказнасць (юрыдычныя падставы правапарушэння), само правапарушэнне (фактычныя падставы правапарушэння) і рашэнне кампетэнтнага органа дзяржавы, установы аб прымяненні мер дзяржаўнага прымусу да правапарушальніка.

Звычайна юрыдычная адказнасць падзяляецца (класіфікуецца) на пэўныя віды па нейкіх крытэрыях у залежнасці ад характару і віду правапарушэння. Па дадзенай падставе звычайна выдзяляюць крымінальную, адміністратыўную, грамадзянскую, матэрыяльную і дысцыплінарную адказнасць. У юрыдычнай літаратуры, акрамя вышэйакрэсленых відаў юрыдычнай адказнасці, у якасці самастойных відаў разглядаюць таксама публічна-прававую, прыватна-прававую, матэрыяльна-прававую, працэсуальна-прававую, канстытуцыйную, экалагічную і г. д. юрыдычную адказнасць.

Юрыдычная адказнасць, якая ўзнікае з правапарушэння, называецца негатыўнай юрыдычнай адказнасцю, адказнасцю за тыя адмоўныя, негатыўныя дзеянні, якія ўжо былі ўчынены суб'ектамі грамадскіх адносін. Але ў юрыдычнай навуцы распрацоўваецца і іншы аспект паняцця юрыдычнай адказнасці – паняцце пазітыўнай (ці перспектыўнай) юрыдычнай адказнасці. Адказнае стаўленне асобы да выканання сваіх абавязкаў, актыўнае выкарыстанне прававых магчымасцей для выканання ўскладзеных абавязкаў, імкненне найлепшым чынам ажыццяўляць свае абавязкі і рэалізаваць правы таксама ўяўляюць юрыдычную адказнасць, характарызуюць юрыдычна адказнае стаўленне суб'ектаў грамадскіх, пераважна прававых адносін да выканання сваіх абавязкаў, да інтарэсаў грамадства і дзяржавы.

Праўда, адносна перспектыўнай (пазітыўнай) юрыдычнай адказнасці можна выказаць і іншыя меркаванні. Можна лічыць, што гэта праява, разнавіднасць маральнай адказнасці, адказнасці, якая

ажыццяўляецца ў сферы дзеяння права. Пры ўскладанні юрыдычнай адказнасці, а таксама пры прыняцці іншых мер юрыдычнага ўздзеяння на правапарушальнікаў правапрымяняльнікі кіруюцца прэзумпцыяй невінаватасці. Мяркуецца, што асоба фізічная і асоба юрыдычная з'яўляюцца добрасумленнымі, невінаватымі. Іх віна павінна быць даказана ва ўстаноўленым парадку і ў адпаведнасці з нормамі дзеючага права.

5. Мэты і функцыі юрыдычнай адказнасці

Пад мэтамі юрыдычнай адказнасці разумеюць той стан у грамадскіх адносінах, той стан правапарадку, той стан забеспячэння інтарэсаў асобы і чалавека, да якога імкнуцца пры ўсталяванні і замацаванні інстытута юрыдычнай адказнасці і асобных іх відаў юрыдычнай адказнасці. Функцыя (функцыі) юрыдычнай адказнасці – гэта місія, гэта роля інстытута юрыдычнай адказнасці ў жыцці грамадства і дзяржавы. Да ліку функцый юрыдычнай адказнасці адносяцца: пакаральная, прэвентыўная, кампенсацыйная, сігнальная.

Пакаральная функцыя зводзіцца да ўскладання разнастайных мер дзяржаўна-прававога ўздзеяння на асобу, арганізацыю, іншых суб'ектаў прававых адносін з тым, каб аказаць «эквівалентнае» ўздзеянне на іх, якое адэкватна той шкодзе, што нанесена грамадскім адносінам, інтарэсам дзяржавы і грамадства.

Прэвентыўная (альбо папераджальная) функцыя юрыдычнай адказнасці зводзіцца да таго, каб папярэдзіць здзяйсненне правапарушэнняў з боку той асобы, якая ўчыніла правапарушэнне, а таксама з боку іншых суб'ектаў (удзельнікаў) грамадскіх адносін. У першым выпадку размова ідзе аб прыватным папярэджанні (прыватнай прэвенцыі), а ў другім выпадку – аб агульнай прэвенцыі (агульным папярэджанні).

Кампенсацыйная функцыя юрыдычнай адказнасці характарызуецца тым, што правапарушальнік пад пагрозай дзяржаўнага прымусу ці непасрэдна пад прымусам кампенсуе тыя страты, тую шкоду, якія былі прынесены грамадству, дзяржаве, інтарэсам асобы, супольнасці, безумоўна, калі гэтыя страты магчыма кампенсаваць.

Сігнальная функцыя – гэта сродак (сведчанне), з дапамогай якога дзяржава і супольнасць могуць меркаваць аб стане законнасці і правапарадку ў грамадстве і дзяржаве, гэта сродак, з дапамогай якога можна рабіць высновы аб мерах па паляпшэнню і ўзмацненню законнасці і правапарадку ў дзяржаве і супольнасці.

Юрыдычная адказнасць у якасці самастойнага прававога інстытута, які прадугледжвае ўжыванне даволі жорсткіх сродкаў і прыёмаў уздзеяння на правапарушальнікаў, заўсёды ажыццяўляецца ў адпаведнасці з матэрыяльнымі нормамі і працэсуальнымі патрабаваннямі, на падставе пэўных прынцыпаў.

Прынцып законнасці азначае, што юрыдычная адказнасць павінна быць ускладзена на падставе норм права і ў поўнай адпаведнасці з нормамі права, гэта значыць, з захаваннем усталяваных правіл і працэдур ускладання юрыдычнай адказнасці.

Прынцып неадваротнасці юрыдычнай адказнасці азначае, што юрыдычная адказнасць павінна быць прыменена ў кожным выпадку, калі здзейснена правапарушэнне. Для рэалізацыі прэвентыўнай функцыі юрыдычнай адказнасці важным з'яўляецца не цяжар пакарання, а неадваротнасць пакарання.

Прынцып індывідуалізацыі юрыдычнай адказнасці азначае, што меры дзяржаўнага і прававога ўздзеяння на асобу павінны быць адэкватнымі, дакладна суразмернымі здзейсненаму правапарушэнню і пры іх ускладанні заўсёды павінна прысутнічаць мэта выпраўлення правапарушальніка і аказанне выхаваўчага ўплыву на іншых удзельнікаў грамадскіх адносін.

Прынцып справядлівасці юрыдычнай адказнасці ўлічвае не толькі індывідуальныя асаблівасці правапарушальніка, але і інтарэсы дзяржавы і грамадства, інтарэсы іншых асоб, якія зацікаўлены ў тым, каб меры юрыдычнай адказнасці былі адэкватнымі характару правапарушэння, садзейнічалі папярэджванню правапарушэнняў, умацаванню законнасці і правапарадку.

Пытанні для самаправеркі

1. Якія віды прававых паводзін Вы ведаеце?
2. Ахарактарызуйце правамерныя паводзіны, вызначце іх віды ў залежнасці ад матываў здзяйснення і раскрыйце змест кожнага з відаў правамерных паводзін.
3. Якія з відаў правамерных паводзін уяўляюць найбольшую карысць для грамадства і дзяржавы?
4. Раскрыйце змест такой прыметы правапарушэння, як дзеянне.
5. Раскрыйце змест такой прыметы правапарушэння, як супрацьпраўнасць.
6. Ахарактарызуйце такую прымету правапарушэння, як грамадская шкоднасць.
7. Што ўяўляе сабой тэарэтыка-прававая канструкцыя юрыдычны склад правапарушэння, якім чынам яна суадносіцца з прыметамі правапарушэння?

8. Раскрыйце змест аб'ектыўнага боку і аб'екта правапарушэння.

9. Раскрыйце змест суб'екта правапарушэння і суб'ектыўнага боку правапарушэння.

10. Дайце азначэнне юрыдычнай адказнасці, ахарактарызуйце яе прыметы і падставы.

11. Правядзіце класіфікацыю юрыдычнай адказнасці і выдзеліце яе віды.

12. Ахарактарызуйце мэты і функцыі юрыдычнай адказнасці.

13. Пералічыце прынцыпы юрыдычнай адказнасці і раскрыйце іх змест.

14. Правядзіце параўнаўчы аналіз юрыдычнай і маральнай адказнасці.

15. У чым Вы бачыце падабенства паміж юрыдычнай і палітычнай адказнасцю і ў чым розніца паміж імі?

16. Якімі рысамі падобныя і якімі рысамі адрозніваюцца юрыдычная адказнасць у міжнародным праве і юрыдычная адказнасць у нацыянальным праве?

17. Ці можна выпрацаваць аднолькавыя віды юрыдычнай адказнасці ў міжнародным і нацыянальным праве?

Тэма 20. ПРАВА І ІНШЫЯ САЦЫЯЛЬНЫЯ РЭГУЛЯТАРЫ

1. Сацыяльнае рэгуляванне, яго віды, заканамернасці і функцыі.
2. Сацыяльныя, тэхнічныя і прававыя нормы.
3. Суадносіны права і маралі.

1. Сацыяльнае рэгуляванне, яго віды, заканамернасці і функцыі

Грамадства не можа існаваць без таго, каб не ўздзейнічаць на паводзіны сваіх членаў. Такое ўздзеянне ажыццяўляецца ў мэтах самазахавання і развіцця грамадства. Сродкі ўздзеяння на паводзіны людзей у грамадстве называюцца сацыяльнымі рэгулятарамі. Сацыяльныя рэгулятары адэкватны ўзроўню развіцця грамадства і мэтам, якое яно ставіць перад сабой. Самым першасным сродкам уздзеяння на паводзіны асобы былі разавыя распараджэнні (вяленні), на падставе якіх і ў мэтах выканання якіх ажыццяўляліся пэўныя дзеянні ці адбывалася ўстрыманне ад пэўных дзеянняў. Сваё значэнне, сваю сілу такія распараджэнні (вяленні) страчвалі пасля таго, як праводзіліся ў жыццё.

На пэўным этапе развіцця грамадства, пасля таго, як чалавек быў здатны рабіць абагульненні, з'явіліся правілы паводзін агульнага характару. Агульнасць правіл паводзін (нормаў) зводзіцца да

таго, што яны могуць прыкладвацца да пэўных сітуацый не адзін раз, а дакладна не вызначаную колькасць раз. Зразумела, што пры стварэнні агульных правіл паводзін губляюцца індывідуальнасць і непаўторнасць вяленняў, якія ўтрымліваюцца ў правілах паводзінах, яны абстрагуюцца ад тых жыццёвых момантаў, якія маюць індывідуальныя рысы і адлюстроўваюць толькі тое агульнае, што ўласціва жыццёвым сітуацыям аднаго роду і віду. Чым менш прымет жыццёвых сітуацый адлюстроўваецца ў правілах паводзін, тым больш абстрактнымі яны з'яўляюцца. Абстрактнасць правіл паводзін можа надаваць пры пэўных умовах і большую ўстойлівасць, таму што змест правіл паводзін залежыць ад меншай колькасці ўласцівасцей канкрэтных жыццёвых сітуацый. Пасля таго, як у грамадстве побач з індывідуальнымі сацыяльнымі рэгулятарамі склаліся правілы паводзін агульнага характару, паміж імі сфармаваліся пэўныя залежнасці і ўзаемасувязі.

Існаванне індывідуальных рэгулятараў так ці інакш пастаянна завязвацца на правілах паводзін агульнага характару. Разавыя распараджэнні (вяленні) шляхам абагульнення пераўтвараліся ў правілы паводзін агульнага характару. А правілы паводзін агульнага характару пры сваёй рэалізацыі сталі патрабаваць індывідуальных вяленняў (распараджэнняў), з дапамогай якіх яны прыкладваліся да канкрэтных жыццёвых сітуацый. Безумоўна, асобныя вяленні разавага характару ў якасці сацыяльных рэгулятараў працягвалі існаваць і надалей, як, дарэчы, і асобныя правілы паводзін агульнага характару рэалізоўваліся без дапамогі індывідуальных сацыяльных рэгулятараў. Але ўзаемасувязь паміж правіламі паводзін агульнага і індывідуальнага характару сфармавалася ў якасці самастойнай заканамернасці сацыяльнага рэгулявання грамадскіх адносін. Змест яе можна сфармуляваць наступным чынам. Індывідуальныя вяленні (распараджэнні) адносна адных і тых жа, падобных жыццёвых сітуацый прыводзяць да фармавання правіл паводзін агульнага характару, а правілы паводзін агульнага характару пры ўздзеянні на грамадскія адносіны абапіраюцца на індывідуальныя вяленні (распараджэнні), без якіх трансфармавацца ў рэальныя грамадскія адносіны яны, як правіла, не могуць.

Такім чынам, самымі першаснымі формамі (відамі) сацыяльных рэгулятараў з'яўляюцца індывідуальныя вяленні і правілы паводзін агульнага характару – нормы паводзін (нарматыўныя рэгулятары). Правілы паводзін агульнага характару складаюць такую групу сацыяльных рэгулятараў, якая называецца нарматыўнымі рэгулятарамі грамадскіх адносін, а індывідуальныя, разавыя распара-

джэнні (вяленні) уваходзяць у склад яшчэ адной самастойнай групы сацыяльных рэгулятараў – групы ненарматыўных рэгулятараў.

Па свайму зместу, па сваёй скіраванасці індывідуальныя вяленні (распараджэнні) і правілы паводзін агульнага характару былі рознымі. Вядома, што самымі першаснымі правіламі паводзін першабытнага грамадства былі разнастайныя *табу* – забароны. Затым узніклі больш складаныя правілы паводзін – *міфы*. Міф утрымліваў у сабе ўжо не толькі забароны, але і нейкія станоўчыя правілы паводзін, узоры, на якія павінны былі арыентавацца ўсе суб'екты грамадскіх адносін. А *каляндар* уяўляў сістэму правіл паводзін, у якой адначасова ўтрымліваліся забароны, дазволы (правілы паводзін станоўчага характару) і іншыя арыенціры. Значыць, ва ўмовах існавання табу – забарон і індывідуальныя вяленні (распараджэнні) мелі забараняльны характар.

Ва ўмовах, калі з'явіліся міф і каляндар, трансфармаваліся і індывідуальныя вяленні (распараджэнні). Сказанае азначае, што ва ўзаемаадносінах паміж нарматыўнымі рэгулятарамі і індывідуальнымі вяленнямі (распараджэннямі) дамінуюць правілы паводзін агульнага характару. Перамена ў гэтай форме сацыяльнай рэгуляцыі абумоўлівала перамены ў характары, відах і змесце індывідуальных рэгулятараў. Кожнаму новаму віду правіл паводзін адпавядае якасна новы від індывідуальных вяленняў (распараджэнняў).

Адзначаныя ўзаемасувязі паміж правіламі паводзін агульнага характару (нарматыўнымі рэгулятарамі) і індывідуальнымі вяленнямі можна лічыць адной з заканамернасцей сацыяльнага рэгулявання грамадскіх адносін.

З узнікненнем календара звязана з'яўленне ў сістэме нарматыўнага рэгулявання грамадскіх адносін такога віду правіл паводзін, які мае інтэгратыўны характар. Ускладніўшыяся формы жыццядзейнасці грамадства ва ўмовах вытворчай эканомікі запатрабавалі, па-першае, дыферэнцыяцыі сярод правіл паводзін, а, па-другое, усталявання паміж асобнымі відамі правіл паводзін інтэгратыўных сувязей. У падмурку развіцця інтэгратыўных сувязей паміж відамі нарматыўных рэгулятараў ляжалі, безумоўна, інтэгральныя сувязі асобных відаў чалавечай дзейнасці.

З узнікненнем календара паміж асобнымі нарматыўнымі рэгулятарамі, у іх сістэме хутчэй за ўсё пачынае складвацца адна з заканамернасцей нарматыўнага рэгулявання грамадскіх адносін. Сутнасць яе заключаецца ў тым, што паміж асобнымі відамі правіл паводзін фармуюцца асобныя ўзаемаадносіны, якія затым, пасля ўзнікнення права, сталі праяўляцца ў форме іерархіі, субардына-

цыі паміж рознымі па зместу і характару нормамі права і іх крыніцамі. Змест дадзенай заканамернасці можна сфармуляваць наступным чынам. Правілы паводзін агульнага характару развіваліся ад простых па свайму зместу і структуры да больш складаных. Пры гэтым сістэма больш складаных правіл паводзін заўсёды імкнулася падпарадкаваць сабе сістэму правіл паводзін больш простых, зрабіць яе залежнай ад сябе альбо адсунуць на перыферыю нарматыўнага рэгулявання.

Паміж сістэмай больш складаных правіл паводзін і сістэмай больш простых правіл паводзін фармаваліся і ўсталёўваліся своеасаблівыя субардынацыйныя ўзаемазалежнасці. Сістэма нарматыўнага рэгулявання, якая сфармавалася раней, працягвала існаваць і рэгуляваць грамадскія адносіны, але пры гэтым яна знаходзілася ў сілавым поле больш складанай сістэмы і вымушана была падпарадкоўвацца тым прынцыпам і тым каштоўнасцям, якія сфармаваліся і замацаваліся ў нарматыўных сістэмах больш высокага ўзроўню.

Паколькі ва ўмовах першабытнага грамадства існавала сацыяльная аднароднасць, адсутнічалі сацыяльныя супярэчнасці, якія былі заснаваны на колькаснай і якаснай маёмаснай няроўнасці, то паміж рознымі відамі правіл паводзін нарматыўнага і ненарматыўнага характару не магло існаваць супярэчнасцей у іх сучасным разуменні. Розныя віды сацыяльных рэгулятараў уздзейнічалі на розныя бакі, «пласты» грамадскіх адносін, але дзейнічалі яны пры гэтым узаемаўзгоднена, дапаўняючы адзін аднаго. Яны, умоўна кажучы, размяшчаліся на адной лініі, але па сваёй значнасці і важнасці нагадвалі піраміду, на вяршыні якой знаходзіліся самыя каштоўныя з іх, тыя правілы, якія вызначалі жыццядзейнасць чалавека. У гэтым сэнсе слова правілы паводзін, якія існавалі ў старажытнасці, ужо былі строга ранжыраваны паміж сабой, прычым ранжыраваны незалежна ад віду – былі гэта правілы паводзін, якія былі сфармуляваны ў календары, захоўваліся як міфы ці як табу.

Такім чынам, да моманту ўзнікнення права ў якасці самастойнага віду правіл паводзін грамадства ўжо мела дастаткова грунтоўныя ўяўленні аб важнасці і значнасці правіл паводзін, аб іх ранжыраванасці, узаемазалежнасці і ўзаемадапаўняльнасці, а таксама аб тых формах, у якіх яны замацоўваліся і выкладаліся. У гэтым сэнсе слова тыя ўяўленні аб юрыдычнай сіле, вяршэнстве (першынстве) права над іншымі правіламі паводзін, а таксама аб вяршэнстве асобных крыніц права (напрыклад, закону) над іншымі крыніцамі права з’яўляюцца пэўнай мадыфікацыяй тых уяўленняў аб ранжыраванасці норм, якія былі назапашаны яшчэ ў старажытнасці.

Сутнасць яшчэ адной заканамернасці нарматыўнага рэгулявання грамадскіх адносін, якая сфармавалася ў старыжытнасці, на самых ранніх этапах існавання грамадства, зводзіцца да таго, што адначасова і, хутчэй за ўсё, паралельна з утварэннем сістэмы сацыяльнага і перш-наперш нарматыўнага рэгулявання грамадскіх адносін быў сфармуляваны і асобны механізм перадачы правіл паводзін ад аднаго пакалення да другога, які быў заснаваны на звычцы не парушаць вядомыя ўсім людзям правілы паводзін – табу, міфы і правілы календароў.

У падмурак такіх правіл паводзін былі пакладзены спецыфічныя правілы-сродкі, з дапамогай якіх захоўваліся і абараняліся табу, міфы, календары – рытуалы, абрады, нормы этыкета. З дапамогай гэтых правіл паводзін адбывалася рэалізацыя правіл паводзін у паўсядзённым жыцці і адначасова забяспечвалася іх перадача ад пакалення да пакалення, фармавалася ўстаноўка, звычка, а затым і звычай захоўваць і выконваць ад века дадзеныя правілы паводзін. У гэтым сэнсе слова не будзе перабольшаннем сцвярджэнне аб тым, што падзел усіх правіл паводзін на матэрыяльныя і працэсуальныя адбыўся яшчэ ў старажытным грамадстве.

На прыкладзе станаўлення, развіцця і трансфармацыі сістэмы нарматыўнага рэгулявання першабытнага грамадства дакладна прасочваецца і яшчэ адна заканамернасць нарматыўнага рэгулявання грамадскіх адносін, а, дакладней, заканамернасць ва ўзаемаадносінах сістэмы нарматыўнага рэгулявання грамадскіх адносін і сістэмы арганізацыі ўлады і кіравання. Сутнасць яе заключаецца ў наступным. Нам вядома, што правілы паводзін першабытнага грамадства выражалі ў роўнай меры і ступені волю і інтарэсы кожнага суродзіча, а таму ўспрымаліся кожнай асобай у якасці сваіх уласных правіл паводзін і выконваліся добраахвотна. У першабытным грамадстве першапачаткова не існавала асобных органаў улады і кіравання, якія б сачылі за ажыццяўленнем правіл паводзін. Да парушальнікаў прымяняліся выхаваўчыя меры ўздзеяння, а пры неабходнасці прымус, але ўсе меры зыходзілі ад імя ўсёй супольнасці, у іх праяўляліся воля і інтарэсы ўсіх і кожнага суродзіча.

Разам з тым па меры развіцця першабытнага чалавека і ўскладнення сістэмы нарматыўнага рэгулявання грамадскіх адносін, асабліва пасля з'яўлення такога нарматыўнага рэгулятара, як міф, у першабытным грамадстве з'явіліся шаманы, якія спецыяльна займаліся захаваннем правіл паводзін і ўважліва сачылі за тым, каб выконваліся правілы паводзін – рытуалы, абрады, этыкет і г. д. Шаманы мелі вялікі аўтарытэт сярод суродзічаў. Ці не так было

пры фармаванні права? Гісторыя мае ўласцівасць паўтарацца. Фармаванне якасна новых правіл паводзін абумовіла фармаванне і адпаведных структур, якія павінны былі захоўваць і абараняць гэтыя правілы паводзін, а далейшая спецыялізацыя сярод правіл паводзін заканамерна абумоўлівала і дыферэнцыяцыю ў сістэме органаў дзяржаўнай улады і кіравання.

2. Сацыяльныя, тэхнічныя і прававыя нормы

Існаванне грамадства спалучана з актыўным умяшальніцтвам у навакольнае асяроддзе, у прыроду. З прыроднага асяроддзя чалавек атрымліваў неабходныя для свайго існавання і развіцця спажыўныя рэчы. Разнастайныя прыродныя багацці выкарыстоўваюцца пры вытворчасці неабходных сродкаў вытворчасці і сродкаў спажывання. І калі на самых першасных этапах свайго існавання і развіцця чалавек адаптаваўся да навакольнага асяроддзя і ў гэтых мэтах ствараў пэўныя правілы паводзін, якія дазвалялі яму прыстасавацца да навакольнага асяроддзя, то паступова ён вымушаны быў распрацоўваць такія правілы паводзін, якія дазволілі б не толькі прыстасаваць паводзіны да навакольнага асяроддзя, але і найлепшым чынам і з найбольшай выніковасцю ўздзейнічаць на прыроду. Як у першым, так і ў другім выпадку спецыфічныя правілы паводзін, якія ствараў чалавек у сваім узаемадзеянні з прыродай, ахопліваюцца агульным паняццем *тэхнічных норм*.

Назва «тэхнічныя» мае ўмоўны характар, таму што паміж чалавекам і тэхнікай, паміж чалавекам і прыродай увогуле не можа існаваць ніякіх правіл паводзін. Правілы паводзін існуюць толькі ў грамадстве, складваюцца паміж людзьмі і рэгулююць адносіны паміж людзьмі. У гэтым сэнсе слова выключна тэхнічных норм не існуе. Усе нормы, усе правілы паводзін маюць сацыяльны характар. Але тэрмін «тэхнічныя» падкрэслівае своеасаблівасць гэтага віду правіл паводзін. Ён указвае на тое, што сваім паходжаннем, сваім існаваннем дадзеныя правілы паводзін абумоўлены не толькі нейкімі сацыяльнымі імператывамі, а неабходнасцю выкарыстання прыроднага асяроддзя ў мэтах забеспячэння жыццядзейнасці чалавека. Пад прыродным асяроддзем разумеюцца і сродкі вытворчасці, і разнастайныя механізмы, і тэхналогіі, якія, умоўна кажучы, знаходзяцца паміж людзьмі і без якіх не можа быць ажыццёўлены вытворчасць, размеркаванне і перараз меркаванне тавараў-матэрыяльных каштоўнасцей. І таму цалкам зразумела, што без

правіл паводзін, якія рэгламентуюць узаемадачыненні паміж людзьмі ў сувязі з неабходнасцю выкарыстання імі самых розных прыродных фактараў, немагчыма здзейсніць пэўныя вытворчыя, эканамічныя, сацыяльныя дзеянні, дасягнуць пэўных мэт.

Такім чынам, увогуле ўсе сацыяльныя рэгулятары, правілы паводзін нарматыўнага характару можна падзяліць на дзве групы. Першую з іх складаюць тыя нарматыўныя рэгулятары, існаванне якіх выклікана выключна сацыяльнымі патрэбамі, імператывамі сацыяльнага характару. Да іх ліку можна аднесці, напрыклад, правілы этыкету. Другую групу сацыяльных рэгулятараў, правіл паводзін нарматыўнага характару складаюць тыя нарматыўныя рэгулятары, існаванне якіх выклікана прыроднымі ў самым шырокім сэнсе слова фактарамі (прычынамі). Гэтую групу сацыяльных норм можна называць сацыяльна-тэхнічнымі альбо тэхнічнымі.

У сучасным грамадстве назіраецца колькасны рост тэхнічных норм, а таму важна не толькі ведаць іх паходжанне, іх прыроду, але і ўзаемадачыненне з іншымі відамі сацыяльных норм і найперш з правам.

У самым агульным плане можна зрабіць наступную выснову. Тыя тэхнічныя нормы маюць прававую прыроду, з'яўленне і ўзнікненне якіх абумоўлена развіццём таварна-грашовых адносін, якія функцыянуюць на эквівалентных пачатках, а таксама тыя тэхнічныя нормы, якія ўзніклі пад ускосным уздзеяннем эквівалентных па сваёй прыродзе грамадскіх адносін.

Значная частка тэхнічных норм мае прававую прыроду з моманту свайго ўзнікнення, з моманту свайго стварэння. Яны не могуць існаваць без прававой формы. Напрыклад, тыя тэхнічныя правілы, якія звязаны з вытворчасцю таварна-матэрыяльных каштоўнасцей, з іх абменам, размеркаваннем і перараз меркаваннем на эквівалентных, суразмерных пачатках, маюць прававую прыроду з моманту свайго ўзнікнення, фармулявання. Гэта такія тэхнічныя правілы, якія не могуць існаваць без азначаных працэсаў і па-за межамі азначаных працэсаў. Існуюць і такія тэхнічныя нормы, якія набываюць (ці могуць набыць) прававую афарбоўку ўжо пасля стварэння. Многія правілы выкарыстання тэхнічных прыстасаванняў і механізмаў так званага «хатняга ўжытку» самі па сабе не маюць прававога характару. Яны набываюць прававую афарбоўку пасля таго, як іх неналежнае захаванне і выкананне прыводзіць да негатыўных сацыяльных наступстваў, якія, у сваю чаргу, павінны быць прадугледжаны ў дзеючым праве.

У сучасным грамадстве права пранікае ва ўсе пласты грамадскіх адносін. Заканамернасцю яго развіцця і функцыянавання з'яўляецца шчыльная ўзаемасувязь права з усімі відамі тэхнічных норм і правіл яшчэ да таго часу, калі яны будуць парушаны ці прывядуць да негатыўных сацыяльных наступстваў. Існаванне такіх дзяржаўна-надзорных уладных структур і органаў, як санітарная інспекцыя, органы прамыслова-атамнага нагляду, інспекцый па захаванню правіл і норм выканання пэўных відаў працы, органаў пажарнага нагляду і да іх падобных структур, якія дзейнічаюць на падставе права і сочаць за належным выкананнем тэхнічных, санітарна-тэхнічных, прамысловых, пажарных правілаў і г. д., сведчыць аб тым, што стан і выкананне тэхнічных правіл паводзін падвяргаюцца прававой ацэнцы яшчэ да таго, як яны могуць быць парушаны. Тут мы маем справу з прэвентыўным сацыяльна-прававым кантролем за захаваннем тэхнічных правіл і норм. Само права, яго прававыя нормы як бы падпарадкаваны існуючым тэхнічным нормам і правілам. Яны ствараюцца дзеля належнага забеспячэння тэхнічных норм, тэхнічных стандартаў. Не існуе стандартаў, адсутнічаюць тэхнічныя нормы, няма патрэбы і ў прававых нормах, існаванне якіх абумоўлена неабходнасцю захавання і забеспячэння тэхнічных стандартаў і правіл.

Безумоўна, знешнім сведчаннем таго, што тэхнічная норма мае прававы змест і характар, з'яўляецца факт яе замацавання і выражэння ў дзеючых крыніцах права. Аб гэтым можа сведчыць і санкцыянаваная абарона тэхнічных норм з боку дзяржавы ў выпадках, калі тэхнічныя нормы не знайшлі свайго замацавання ў дзеючых крыніцах права. Прыкладам першага віду тэхнічных прававых норм з'яўляюцца самыя розныя дзяржаўныя стандарты, тэхнічныя ўмовы на выраблены рэчы, дзяржаўныя стандарты на паслугі і працэсы (напрыклад, адукацыйныя стандарты). Яны фармулююцца, ствараюцца кампетэнтнымі органамі дзяржавы, выдаюцца імі ў форме тых нарматыўных прававых актаў, якія мае права выдаваць кампетэнтны орган дзяржавы ці службовая асоба. Прыкладам другога віду з'яўляецца наступная пасля выдання рэгістрацыя пэўных тэхнічных правіл і стандартаў, выдадзеных пэўным міністэрствам і зарэгістраваных у Нацыянальным рэестры прававых актаў. Па нейкіх прычынах тэхнічныя нормы і правілы могуць быць не зарэгістраваны ў Нацыянальным рэестры і таму не будуць мець прававой прыроды.

3. Суадносіны права і маралі

Акрамя права, у грамадстве дзейнічае яшчэ адна універсальная сістэма сацыяльнага рэгулявання – мараль, а таму ўзаемаадносіны гэтых сацыяльных рэгулятараў уяўляюць найбольшую цікавасць. Права галоўным чынам звернута да знешніх праяў чалавечых паводзін, а мараль – да ўнутраных матываў, да ўнутранага стану чалавека. Праўда, права, яго нормы не могуць дзейнічаць без уплыву на волю і свядомасць удзельнікаў грамадскіх адносін, а мараль, у сваю чаргу, хаця і звернута да ўнутранага стану чалавека, яго волі, сумлення і скіравана на тое, каб перабудаваць яго ўнутраны свет, тым не менш мае на мэце і фармаванне адпаведных маральным запаветам учынкаў і дзеянняў, правамерных паводзін. Такім чынам, нават самы першасны аналіз узаемаадносін паміж правам і мараллю сведчыць аб тым, што па нейкіх параметрах яны перасякаюцца, у нейкіх кропках судакранаюцца.

Факт тоеснасці паміж людзьмі ў першабытным грамадстве дае, на наш погляд, падставы зрабіць выснову аб тым, што ў першабытным грамадстве, па меншай меры, на самых ранніх этапах яго развіцця, не магло існаваць маралі і маральных правіл паводзін. Справа ў тым, што мараль і маральныя правілы паводзін складваюцца ва ўмовах, калі чалавек у стане выдзеліць сябе з нейкага цэлага, асэнсаваць сваю «самасць», усвядоміць сябе ў якасці самастойнага і незалежнага індывіда, як асобу, якая мае свае адметныя, асабістыя інтарэсы, якія не супадаюць з інтарэсамі іншых людзей і інтарэсамі калектыву. Толькі пры супастаўленні гэтых розных па зместу і скіраванасці інтарэсаў у свядомасці і душы чалавека складваюцца ацэнкі інтарэсаў, адбываецца іх субардынацыя, аддаецца перавага тым ці іншым інтарэсам, а паводзіны чалавека ў залежнасці ад перавагі тых ці іншых інтарэсаў ацэньваюцца як справядлівыя ці несправядлівыя, добрыя ці шкодныя, маральныя ці амаральныя.

Адначасова можна канстатаваць наступнае. Толькі пасля фармавання асабістых, непаўторных, індывідуальных інтарэсаў у першабытным грамадстве маглі сфармавацца перадумовы для ўзнікнення індывідуальнай, а затым і прыватнай уласнасці, спачатку спарадычнага, а затым і рэгулярнага тавараабмену. Таму з'ява, а дакладней, працэс трансфармацыі «тоеснага» грамадства ў грамадства «індывідуальнае» патрабуе далейшага пільнага вывучэння. Тут, у гэтым працэсе, як можна з вялікай доляй упэўненасці меркаваць, палягаюць карані маралі і маральнасці, карані прыват-

най уласнасці і развіцця права. Адначасова можна выказаць версію аб тым, што індывідуалізацыя грамадства была адной з самых першых і самых істотных прычын (ці перадумоў) дыферэнцыяцыі сістэмы нарматыўнага рэгулявання і фармавання асобных відаў правіл паводзін першабытнага грамадства.

Суадносіны права і маралі былі прадметам шматлікіх і вельмі грунтоўных даследаванняў. Паколькі аўтарам развіваецца ідэя аб эквівалентнай сутнасці права, то менавіта праз прызму тэарэтычных каардынат «эквівалентнасць» (суразмернасць) – «неэквівалентнасць» і разглядаюцца суадносіны права і маралі.

Ідэя эквівалентнасці, суразмернасці таварна-грашовых адносін з'яўляецца першай выключна прававой ідэяй, а наяўнасць эквівалентнасці, суразмернасці ў таварна-грашовых адносінах – першаглінкай права. Эквівалентны пачатак прававых адносін адрозніваe іх ад адносін маральных, у якіх абмен каштоўнасцей на эквівалентных пачатках адсутнічае. Матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці ў маральных адносінах таксама могуць пераходзіць ад аднаго да другога боку, але не на каштоўнасна-эквівалентнай аснове, а як праява любові, міласэрнасці, спачування бліжняму. Больш таго, маральны ўзровень грамадства, акрамя ўсяго іншага, вызначаецца менавіта тым, наколькі распаўсюджаны ў грамадстве працэсы добраахвотнага перараз мяркавання каштоўнасцей на неэквівалентнай аснове. І маральная моц асобы па сутнасці зводзіцца да таго, наколькі развіты ў яе здольнасці да таго, каб перадаць людзям каштоўнасці, якімі яна карыстаецца на неэквівалентнай падставе.

Для прававых па сваёй сутнасці адносін характэрна тое, што яны заснаваны на фармальнай роўнасці бакоў, што працэс іх функцыянавання непазбежна прыводзіць да фармавання фактычнай няроўнасці бакоў, да зацвярджэння заканамернасці, правільнасці і справядлівасці няроўнасці, асвячэння фактычнай няроўнасці правам. Для маральных адносін характэрна зусім іншая заканамернасць. Маральнасць скіравана на ўсталяванне маёмаснай раўнамернасці. Такім чынам, маральны прынцып зводзіцца да таго, каб пазбавіцца маёмаснай няроўнасці сярод людзей. Людзі знаходзяцца ў розных адносінах да ідэалу, але ў адносінах паміж сабой яны павінны быць у маёмасных адносінах як мага больш роўнымі.

Працэсы фармавання фактычнай няроўнасці і, адпаведна, фармавання эквівалентнасці і права, а таксама імкненне грамадства да маёмаснай роўнасці праходзяць, адбываюцца адначасова, перасякаюцца і стымулююць адзін аднаго, але рух маральнасці ў сацыяльнай прасторы мае зусім іншую скіраванасць, чым скіраванасць

і прызначэнне права. Права ствараецца (зыходзіць) на падставе фармальнай роўнасці бакоў і зацвярджае ў грамадстве фактычную няроўнасць, а маральнасць жа адштурхоўваецца ад такой няроўнасці і імкнецца ўсталяваць у грамадстве фактычную роўнасць бакоў. Такім чынам, права і мараль дзейнічаюць у адзіным сацыяльным полі, але «полюсы» ў прававога і маральнага поля розныя, нават супрацьлеглыя.

Выснова аб тым, што для маралі і для права ўласціва розная сацыяльная скіраванасць, мае важнае значэнне для нарматворчасці і заканатворчасці, таму што тыя грамадскія адносіны, якія пабудаваны выключна на маральных пачатках, не могуць быць прадметам заканадаўчага ўздзеяння. Не патрэбна казаць і аб тым, што маральныя перакананні людзей, іх ідэалы і мэты не могуць быць падвергнуты заканадаўчаму рэгуляванню. Заканадавец павінен абыходзіць сваёй увагай сферу этыкі. Улада, якая ўмешваецца ў этычную сферу існавання грамадства, пераходзіць межы свайго дзеяння.

Безумоўна, дзяржава не можа пакінуць па-за сваёй увагай адносіны па сацыяльнай абароне насельніцтва, адносіны па міласэрнасці, аказанню сацыяльнай дапамогі і падобныя да іх сацыяльныя сувязі. Справа ў тым, што закон пры гэтым дзейнічае ўсё ж у сферы права. Ён знаходзіцца на мяжы дзеяння і ўзаемадзеяння права і маралі, ён дакладна акрэслівае межы дзеяння права і вызначае тую мяжу, далей за якую права рухацца не можа. У нейкім сэнсе слова такія законы дзейнічаюць супраць права, бо абмяжоўваюць поле яго дзеяння. Яны застаюцца ў сферы дзеяння права, рэгулююць каштоўнасныя адносіны, але робяць гэта хутчэй за ўсё па інерцыі, чым па сутнасці.

На змест такіх законаў уздзейнічаюць і маральныя імператывы. Гэта, аднак, не дае падстаў меркаваць аб тым, што гэта законы маральныя. Маральныя стандарты толькі тады маюць адносіны да права, калі яны знаходзяцца ў межах і ў полі дзеяння права, калі арганічна спалучаны з прававымі адносінамі, з'яўляюцца іх неад'емнай складанай часткай, калі нельга іх адмежаваць ад права.

У права і маралі свае каардынаты, якія не супадаюць і, адпаведна, свая мера і свая шкала справядлівасці. У прававых адносінах справядліва тое, што заснавана на эквівалентных пачатках, на эквівалентных узаемадачыненнях і не парушае іх фармальнай роўнасці. Прычым сістэма эквівалентаў гістарычна пераменчывая і выпрацоўваецца не інакш як пры ўдзеле хаця б двух бакоў грамадскіх адносін. Справядлівасць жа ў маральным сэнсе слова бу-

дуецца на неэквівалентнай падставе. Шкала маральнай справядлівасці не абумоўлена кан'юнктурнымі пераменамі, яна з'яўляецца вечнай. Для прававой шкалы справядлівасці важна, каб знешні бок паводзін чалавека цалкам знаходзіўся ў сістэме эквівалентных кардынат, таму што права мае справу са знешнімі дзеяннямі людзей (дзеяннямі ці бяздзеяннямі) па пераразмеркаванню каштоўнасцей. Наадварот, знешні бок паводзін асобы для ацэнкі маральнасці паводзін мае не самае істотнае значэнне. Ён узважваецца на шалях маральнасці толькі ў сувязі з тым, як ён стасуецца з любоўю да бліжняга ці з карыснымі матывамі.

Пытанні для самаправеркі

1. Якія прычыны ляжаць у падмурку ўзнікнення ў грамадстве сістэмы сацыяльнага рэгулявання?
2. З якіх асноўных кампанентаў (форм) складаецца сістэма сацыяльнага рэгулявання?
3. Сфармулюйце адказ на пытанне аб характары ўзаемаадносін паміж нарматыўнымі і індывідуальнымі сацыяльнымі рэгулятарамі.
4. Правядзіце класіфікацыю і выдзеліце віды нарматыўных рэгулятараў грамадскіх адносін.
5. Сфармулюйце асноўныя заканамернасці, якія ўласцівы развіццю і функцыянаванню нарматыўных рэгулятараў грамадскіх адносін.
6. Раскрыйце змест і выдзеліце асноўныя віды тэхнічных правіл паводзін (тэхнічных норм).
7. Як суадносяцца паміж сабой тэхнічныя і прававыя нормы?
8. Сфармулюйце асноўныя функцыі сацыяльных рэгулятараў.
9. Сфармулюйце паняцце маралі, выдзеліце агульныя рысы і акрэсліце адметнасці, якія ўласцівы праву і маралі.
10. Раскрыйце асноўныя заканамернасці ўзаемадзеяння права і маралі.

Тэма 21. ПРАВАВАЯ ДЗЯРЖАВА: ГІСТОРЫЯ, ТЭОРЫЯ, ПРАКТЫКА

1. Асноўныя накірункі, узроўні і праявы ўзаемаадносін паміж дзяржавай і правам.
2. Фармаванне поглядаў на прававую дзяржаву.
3. Асноўныя прыметы (складаныя часткі) прававой дзяржавы.
4. Дзяржава прававая, сацыяльная і дзяржава эфектыўная.

1. Асноўныя накірункі, узроўні і праявы ўзаемаадносін паміж дзяржавай і правам

Дзяржава і права – дзве самастойныя з'явы, два вельмі важныя інстытуты грамадства, таму прырода і характар іх узаемадзеяння здаўна цікавілі даследчыкаў. У гісторыі палітыка-прававой думкі прасочваюцца дзве лініі, два накірункі ў асэнсаванні прыроды і характару ўзаемаадносін паміж дзяржавай і правам.

Згодна з першай з іх дзяржава як пры сваім узнікненні (паходжанні), так і пры далейшым функцыянаванні заўсёды мае перавагу (прыярытэт, першынство) над правам. Дзяржава дамінуе над правам. Яна стварае права па свайму ўласнаму меркаванню, змяняе яго. Права з'яўляецца працягам дзяржавы. Другая лінія ў распрацоўцы дадзенай праблематыкі зводзіцца да сцвярджэння перавагі (першынства, вяршэнства) права (закону) над дзяржавай. Права ўзнікае з нараджэннем чалавека, а дзяржава складваецца ў мэтах забеспячэння права. Дзяржава выступае сродкам, інструментам увасаблення і рэалізацыі права.

Прырода і характар узаемаадносін паміж дзяржавай і правам у канцэптуальных адносінах вызначаюцца падыходамі да вызначэння іх сутнасці, зместу і форм існавання. Згодна з канцэнцыяй разумення сутнасці дзяржавы, якая адстойваецца аўтарам, дзяржава ўяўляе сабой адзіна магчымую сілу, адзіна магчымы сродак, форму ажыццяўлення ўлады ў сацыяльна неаднародным грамадстве. Дзяржава ўвасабляе сілу, якая знаходзіцца над супярэчнасцямі грамадства і павінна забяспечваць правядзенне ў жыццё агульнасацыяльных інтарэсаў. Знешне дзяржава існуе, функцыянуе, праяўляецца ў выглядзе сукупнасці (сістэмы) надзеленых уладнымі паўнамоцтвамі органаў і ўстаноў дзяржавы. Права ў сваю чаргу з'яўляецца адзіна магчымым нарматыўным рэгулятарам адносін у сацыяльна неаднародным грамадстве, яно ўяўляе сабой сістэму эквівалентаў (суразмернасцей), з дапамогай якіх рэгламентуюцца

заснаваныя на эквівалентных пачатках грамадскія адносіны. Знешне права існуе (праяўляецца) у выглядзе сістэмы (сукупнасці) фармальна азначаных правіл паводзін агульнага характару (норм права).

Узаемаадносіны паміж дзяржавай і правам патрэбна разглядаць на двух узроўнях – на ўзроўні ўзаемаадносін іх сутнасці і на ўзроўні ўзаемаадносін форм іх існавання і функцыянавання. І далёка не заўсёды характар узаемаадносін паміж гэтымі з'явамі на сутнасным узроўні тоесныя праявам узаемаадносін на ўзроўні фармальным. Але як на сутнасным узроўні, так і на ўзроўні фармальным узаемадзеянне паміж дзяржавай і правам характарызуецца: а) розніцай паміж дзяржавай і правам; б) адзінствам дзяржавы і права; в) уздзеяннем дзяржавы на права; г) уздзеяннем права на дзяржаву; д) супярэчнасцямі паміж дзяржавай і правам.

Розніца паміж дзяржавай і правам на ўзроўні іх сутнасці назіраецца ў наступным. Дзяржава ўяўляе сабой сістэму ўладных адносін, у якіх удзельнікі знаходзяцца паміж сабой у залежных і ўзаемападпарадкавальных узаемасувязях. Адзін бок мае магчымасці, валодае правамі, а іншы бок, як правіла, знаходзіцца ў падпарадкаванасці першаму боку, абавязаны выконваць распараджэнні і загады першага боку. Права ж на ўзроўні сутнасці можа быць вызначана ў якасці фармальна азначаных прававых адносін, у якіх бакамі з'яўляюцца фармальна роўныя ўдзельнікі, кожны з якіх валодае пэўнай сукупнасцю праў (прававых магчымасцей) і юрыдычных абавязкаў. Розніца паміж дзяржавай і правам на ўзроўні ўзаемаадносін іх праяў (форм) праяўляецца больш наглядна. Дзяржава – гэта заўсёды сістэма (сукупнасць) надзеленых уладнымі паўнамоцтвамі органаў і ўстаноў, якія знаходзяцца паміж сабой у іерархічных (субардынацыйных) залежнасцях. Права ў сваю чаргу ўяўляе сістэму (сукупнасць) правіл паводзін агульнага характару, якія знаходзяць сваё замацаванне і выражэнне ў знешніх формах замацавання і выражэння права – у афіцыйна ўсталяваных крыніцах права.

Адзінства паміж дзяржавай і правам назіраецца на генетычным узроўні, на ўзроўні іх паходжання, а таксама на ўзроўні іх функцыянавання. Дзяржава і права ўзнікаюць адначасова і ў выніку фактычна адных і тых жа сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў у грамадстве, якія адбыліся ў ходзе і выніку неалітычнай рэвалюцыі, развіцця таваравытворчасці, тавараабмену, фармавання таварна-грашовых адносін, сацыяльна неаднароднага грамадства, супярэчнасцей паміж асобнымі групамі насельніцва. Але з гэтых працэсаў арганічна «выраслі» дзве знешне і па сутнасці розныя з'я-

вы – дзяржава і права. Першая ўяўляе, як было адзначана вышэй, асобную форму, асобны від, праяву сацыяльнай улады, а другая ўяўляе асобную форму, асобны від сацыяльнага рэгулявання, асобную праяву правіл паводзін.

Адзінства паміж дзяржавай і правам праяўляецца і ў функцыянальных стасунках. Дзяржава без права не можа належным чынам функцыянаваць, праводзіць у жыццё прынятыя ўладныя рашэнні, а права без дзяржаўнай падтрымкі далёка не заўсёды можа быць увасоблена ў паводзіны ўдзельнікаў грамадскіх адносін.

Уздзеянне дзяржавы на права адбываецца па двух напрамках, у двух накірунках. Гэтыя напрамкі звязаны са стварэннем права і з ажыццяўленнем права.

Па-першае, дзяржава з'яўляецца сродкам надання праву цывілізаванай формы. Права, як вядома, зараджаецца ў рэальных грамадскіх адносінах, у тых адносінах, якія маюць таварна-грашовую прыроду і пабудаваны на эквівалентных пачатках. Прававыя суразмернасці, эквіваленты складваюцца стыхійна ў выніку сутыкнення разнастайных інтарэсаў удзельнікаў таварна-грашовых адносін. Затым яны асэнсоўваюцца ў якасці справядлівых і правамерных эквівалентаў і, нарэшце, замацоўваюцца ў дзеючых крыніцах права. Пры замацаванні эквівалентаў у дзеючых крыніцах права ад іх «адсякаюцца» тыя моманты і ўласцівасці, якія не адпавядаюць агульнасацыяльным уяўленням аб праве, альбо яны не «ўпісваюцца» ў дзеючую сістэму прававых эквівалентаў. Гэтыя дзеянні дзяржавы ўмоўна можна назваць «цывілізацыяй» права.

Па-другое, дзяржава, як вядома, з'яўляецца адзіна магчымым і афіцыйным прадстаўніком усяго грамадства, яна дзейнічае ад імя ўсёй супольнасці і з'яўляецца універсальным сродкам, з дапамогай якога забяспечваецца аднастайнасць у рэалізацыі права на тэрыторыі адпаведнай дзяржавы, а пры сумесных дзеяннях дзяржаў – і на тэрыторыі некалькіх дзяржаўных утварэнняў.

Безумоўна, дзяржава не ў стане стварыць права адвольна, па свайму густу. Дзяржава не ў стане надаць неправавым па свайму зместу і характару адносінам прававую прыроду, як яна не ў стане і знішчыць прававую прыроду грамадскіх адносін. Яна можа не прызнаваць прававой прыроды грамадскіх адносін, не абараняць гэтыя адносіны сваёй сілай, але прававыя адносіны не перастануць ад гэтага быць прававымі. Калі дзяржава не абараняе прававыя па сваёй сутнасці грамадскія адносіны сваёй прымусовай сілай, то грамадства ў стане знайсці іншыя формы і сродкі такой абароны.

Уздзеянне права на дзяржаву, гэтаксама, як і дзяржавы на права, адбываецца таксама па двух накірунках.

Па-першае, толькі з дапамогай права, якое мае фармальна азначаны, ясны і аднастайны характар, можна строга і дакладна акрэсліць сістэму органаў улады і кіравання, фармалізаваць і ўсталяваць іерархічныя ўзаемасувязі паміж органамі і ўстановамі дзяржавы, замацаваць іх кампетэнцыю, паўнамоцтвы. Толькі з дапамогай права можна дакладна вызначыць і акрэсліць адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел дзяржавы і ўсталяваць яе межы. Ніякі іншы нарматыўны рэгулятар для вырашэння гэтых задач не прыдатны. Такім чынам, дзяржава ў стане «самасфармавацца» толькі з дапамогай права. Без права, без яго актыўнага ўздзеяння на дзяржаву дзяржава не можа стаць дзяржавай.

Па-другое, толькі з дапамогай права можна дакладна акрэсліць межы і характар уздзеяння дзяржавы на грамадства, на асобу, акрэсліць правы і абавязкі асобы адносна дзяржавы, а таксама правы і абавязкі дзяржавы адносна асобы. Права з'яўляецца адзінай універсальнай мовай, на якой адбываюцца зносіны паміж грамадствам і дзяржавай, паміж асобай і дзяржавай. Іншай мовы зносін паміж імі не існуе.

Супярэчнасці паміж дзяржавай і правам можна назіраць у выпадках, калі па нейкіх прычынах альбо права, альбо дзяржава ўзаемадзейнічаюць адзін з другім рознымі праявамі сваёй сутнасці. Напрыклад, дзяржава судакранаецца з правам тым бокам сваёй сутнасці, які называецца «вузкакласавым», у той час як права дзейнічае як універсальны нарматыўны рэгулятар, у якім адлюстраваны агульнасацыяльныя інтарэсы і ўяўленні аб прававых эквівалентах і правілах.

2. Фармаванне поглядаў на прававую дзяржаву

Разгледжаныя праявы ўзаемаадносін паміж дзяржавай і правам назіраліся ў рознай ступені на доўгім гістарычным шляху развіцця дзяржавы і права, іх суіснавання. Адзначаныя элементы ўзаемаадносін паміж дзяржавай і правам, узроўні ўзаемаадносін і іх накірункі – своеасаблівыя каардынаты, у межах якіх будуюцца самыя розныя формы арганізацыі дзяржаўнасці. Адной з такіх форм з'яўляецца прававая дзяржава.

Некалькі момантаў трэба мець на ўвазе пры разглядзе пытання аб фармаванні тэорыі (поглядаў) на прававую дзяржаву. Па-першае, тэорыя прававой дзяржавы не ўяўляе сабой завершаную канцэпцыю, яна пастаянна ўдакладняецца і развіваецца. Па-другое, назва тэорыі, а, адпаведна, і яе змест гучаць па-рознаму ў залежнасці ад дактрынальна-прававых традыцый, у межах якіх разгля-

даецца тэорыя прававой дзяржавы. Па-трэцяе, далёка не заўсёды назва, якая абазначае тую ці іншую сацыяльна-прававую рэальнасць, адпавядае яе сутнасці.

Тэрмін «прававая дзяржава» з'явіўся ў першай палове XIX ст. у працах нямецкіх навукоўцаў К.Т. Велькера, Р.Ф. Моля, а асобныя навуковыя палажэнні, высновы і канцэпцыі, якія затым увайшлі арганічнымі складанымі часткамі ў тэорыю прававой дзяржавы, выказваліся яшчэ старажытнымі грэкамі. Было б, аднак, памылкова лічыць, што старажытныя грэкі распрацоўвалі тэорыю прававой дзяржаўнасці. Аб такой сацыяльна-прававой рэчаіснасці стала магчымым разважаць пасля фармавання раннебуржуазных дзяржаўных утварэнняў. Вось чаму звычайна лічаць тэорыі раннебуржуазных мысліцеляў Г. Гроцыя, Дж. Лока, Т. Мора, Т. Гобса, Ш. Мантэск'е, І. Канта, Ж.-Ж. Русо, у якіх разглядаліся розныя бакі сучаснай ім раннебуржуазнай дзяржаўнасці, найбольш значнымі ў распрацоўцы тэорыі прававой дзяржаўнасці.

Далейшыя даследаванні тэорыі прававой дзяржаўнасці найперш абапіраліся на вопыт развіцця буржуазнай дзяржаўнасці. Эвалюцыя дадзенай формы дзяржаўнасці (формы ў шырокім сэнсе слова), асабліва ў заходнееўрапейскіх дзяржавах, давала шматлікія прыклады для абагульнення вопыту пабудовы прававой дзяржавы і яго пераймання іншымі дзяржавамі. Перайманне перадавога вопыту пабудовы прававой дзяржавы заўсёды суправаджалася мадыфікацыяй запазычаных элементаў падзелу ўлады і забеспячэння адзінства дзяржаўнай улады, пабудовы цывільнай супольнасці і яе элементаў – самакіравання, шматпартыйнасці, дэмакратычнай дзяржаўнасці і г. д. Вось чаму нельга гаварыць аб нейкай ідэальнай мадэлі прававой дзяржаўнасці, толькі аб нейкіх тэндэнцыях ва ўладкаванні самой дзяржаўнай улады, арганізацыі яе ўзаемадачыненняў з грамадствам, узаемаадносін з правам, з чалавекам і асобай.

3. Асноўныя прыметы (складаныя часткі) прававой дзяржавы

Для прававой дзяржавы ўласціва такая прымета, як падзел улады. Лічыцца нават, што там, дзе не існуе падзелу ўладаў, адсутнічае і Канстытуцыя.

Размежаванне кампетэнцыі і функцый паміж асобнымі органамі і ўстановамі ўлады існавала і ў старажытнасці. Але для прававой дзяржавы характэрна не толькі функцыянальнае размежаванне паміж асобнымі органамі ўлады, але і паміж асобнымі галінамі ўлады – заканадаўчай, выканаўчай, судовай. Натуральна, што разме-

жаванне паміж асобнымі галінамі ўлады арганічна спалучана з такім самым размежаваннем і паміж асобнымі органамі. Прынцып падзелу ўладаў, які ўласцівы сучасным прававым дзяржавам, арганічна спалучаны з прынцыпам адзінства дзяржаўнай улады і яе асобных галінаў. У арганізацыйна-прававым плане прынцып адзінства дзяржаўнай улады ўвасабляецца часцей за ўсё ў інстытуце прэзідэнцтва. Так, у Рэспубліцы Беларусь Прэзідэнт краіны лічыцца кіраўніком дзяржавы, мае шырокія паўнамоцтвы па каардынацыі дзеянняў самастойных галін улады – заканадаўчай, выканаўчай і судовай. Ён забяспечвае адзінства дзяржаўнай улады, яе мэтанакіраванасць, эфектыўнасць.

Для прававой дзяржавы ўласціва такая прымета, як вяршэнства права. Памылкова лічыць, што права мае прыярытэт, перавагу (вяршэнства) над дзяржавай, быццам бы права дамінуе над дзяржавай, што апошняя знаходзіцца ў нейкай падпарадкаванасці праву. У такім разе заканамерна ўзнікае шэраг пытанняў – аб той сіле, якая можа забяспечыць перавагу права над дзяржавай, аб той сіле, якая фармулюе права і забяспечвае яго дзеянне і г. д.

Аб вяршэнстве права ў якасці прыметы прававой дзяржавы можна разважаць адносна сучаснай свецкай дзяржавы, як, дарэчы, і аб самой прававой дзяржаве як утварэнні, што характэрна для сучасных цывілізаваных краін. Вяршэнства права ў такім разе азначае прыярытэт, перавагу дадзенага нарматыўнага рэгулятара над іншымі відамі правіл паводзін агульнага характару. У такой дзяржаве пры сутыкненні, пры супярэчнасцях паміж правамі і нормамі іншых сацыяльных рэгулятараў перавага (прыярытэт) захоўваецца заўсёды за правам. Натуральна, што ў сучасных тэалагічных дзяржавах, тым больш у дзяржавах, якія існавалі ў старажытнасці, аб дамінаванні, аб прыярытэце права над іншымі нарматыўнымі рэгулятарамі размовы ісці не можа. Сказанае азначае, што далёка не кожная з існуючых сёння дзяржаў адпавядае ўсім прыметам прававой дзяржавы, прынамсі прымеце вяршэнства права.

Часта дадзеную прымету прававой дзяржавы фармулююць інакш, напрыклад, праз сцвярджэнне вяршэнства закону. Але вяршэнства закону – гэта толькі ўласцівасць адной з разнавіднасцей прававых сем'яў, а менавіта рамана-германскай прававой сям'і. Вяршэнства закону характарызуе парадак пабудовы сістэмы крыніц права, пры якім на вяршыні піраміды ўсіх крыніц права заўсёды знаходзіцца закон. Іншыя крыніцы права знаходзяцца ў субардынацыйных і іерархічных залежнасцях ад закону. Але для англасаксонскай прававой сям'і такая прымета, як вяршэнства закону, не ўласціва. Разам з тым менавіта тыя дзяржавы, дзе прыярытэт ся-

род крыніц права належыць не закону, а прэцэдэнту, і прэтэндуюць на статус прававых дзяржаў.

Імкненне асобных аўтараў падкрэсліць дадзеную прымету прававой дзяржавы выразам «вяршэнства прававога закону» не мяняе сутнасці справы. Таму што ў гэтых варунках мяняецца характарыстыка толькі самаго закону, а не мяняецца характарыстыка ва ўзаемадачыненнях паміж дзяржавай і правам.

Наяўнасць грамадзянскай (цывільнай) супольнасці звычайна ўказваецца сярод прымет прававой дзяржавы. Пад цывільнай супольнасцю часцей за ўсё разумеюць такі стан грамадства, які характарызуецца высокай ступенню яго самаарганізацыі, наяўнасцю ў грамадстве інстытутаў мясцовага самакіравання, развіццём рынкавых адносін і г. д., шырокімі магчымасцямі ўплыву грамадства праз інстытуты цывільнай супольнасці на дзяржаву. Безумоўна, такі ўплыў інстытутаў грамадзянскай супольнасці на дзяржаву, па-першае, адбываецца праз права і толькі ў межах права, а, па-другое, такі ўплыў не можа і не павінен быць скіраваны на разбурэнне дзяржавы і супольнасці.

Да характарыстык грамадзянскай супольнасці можна аднесці таксама наяўнасць у грамадстве разнастайных палітычных партый, якія акумулююць розныя палітычныя інтарэсы і імкнуцца ажыццявіць іх праз дзейнасць органаў і ўстаноў дзяржавы. Грамадзянскую супольнасць характарызуе таксама наяўнасць розных ідэалогій, у тым ліку абавязковая наяўнасць дзяржаўнай ідэалогіі. Не можа існаваць і нармальна развівацца дзяржава, якая не мае сваёй агульнадзяржаўнай ідэалогіі. Такая дзяржава не мае дакладна вызначаных кірункаў у сваім развіцці, агульных каштоўнасцей. Наяўнасць шматпартыйнасці, ідэалагічная разнастайнасць у грамадстве характарызуюць дзяржаву ў якасці сучаснай дэмакратычнай дзяржавы, а наяўнасць агульнадзяржаўнай ідэалогіі ў такой дзяржаве азначае, што такая дзяржава з'яўляецца моцнай дэмакратычнай дзяржавай.

Дзяржава выяўляе і рэпрэзентуе інтарэсы ўсёй супольнасці, забяспечвае адзінства грамадства, яго цэласнасць, развіццё і самаразвіццё. І таму інстытуты грамадскай (цывільнай) супольнасці павінны быць скіраваны таксама на ажыццяўленне гэтых жа задач і дасягненне гэтых жа мэт. Іншая справа, што метады і прыёмы працы ў інстытутаў і арганізацый грамадзянскай супольнасці могуць адрозніваца ад метадаў і форм дзейнасці дзяржавы. Але толькі пры супрацоўніцтве грамадзянскай супольнасці і дзяржавы, толькі пры падтрымцы дзяржавы з боку сацыяльнай супольнасці варта разважаць аб наяўнасці такой прыметы ў сучаснай прававой дзяржавы, як грамадзянская супольнасць.

Для прававой дзяржавы характэрна не проста наяўнасць грамадзянскай (цывільнай) супольнасці, а дакладнае размежаванне функцый і дзейнасці паміж дзяржавай, яе інстытутамі і органамі і паміж грамадзянскай супольнасцю, яе інстытутамі, органамі. Дзяржава стварае для дзейнасці грамадзянскай супольнасці адпаведную прававую базу, аказвае матэрыяльна-фінансавую падтрымку дзейнасці інстытутаў, органаў і ўстаноў, а грамадзянская (цывільная) супольнасць садзейнічае дзяржаве ў выкананні ёй сваіх задач і ажыццяўленні функцый.

Прававая дзяржава характарызуецца такімі ўзаемадачыненнямі паміж дзяржавай і асобай, паміж дзяржавай і грамадзянінам, якія заснаваны на ўзаемаадказнасці і прававых магчымасцях уплыву дзяржавы на асобу і асобы на дзяржаву.

На жаль, характарызуючы ўзаемадачыненні паміж дзяржавай і асобай, дзяржавай і чалавекам, звяртаюць увагу на тое, што ў прававой дзяржаве правы і свабоды чалавека маюць прыярытэт, перавагу, вяршэнства над інтарэсамі, правамі і магчымасцямі дзяржавы. У такім разе сама дзяржава ўспрымаецца ў якасці нейкай варожай сілы ў адносінах да асобы і чалавека. На самай справе, дзяржава выяўляе і абараняе як агульнасацыяльныя, так і прыватныя інтарэсы асобы і чалавека, а таму аб дамінаванні і прыярытэце альбо інтарэсаў і праў асобы, альбо інтарэсаў і праў асобы і чалавека разважаць памылкова. Інтарэсы дзяржавы, яе правы і магчымасці не трэба супрацьпастаўляць інтарэсам і правам асобы і чалавека. Трэба, па-першае, дакладна размежаваць правы і свабоды асобы, грамадзяніна і дзяржавы, а, па-другое, выдзеліць тыя сферы існавання грамадства, тыя правы і свабоды асобы і грамадзяніна, якія маюць перавагу над інтарэсамі і правамі дзяржавы, а таксама тыя сферы існавання грамадства, дзе перавагу мае агульнасацыяльны інтарэс і інтарэс дзяржавы.

Пры дакладным размежаванні сфер, праў і прававых магчымасцей супярэчнасці паміж дзяржавай і асобай, дзяржавай і грамадзянінам будуць зведзены да мінімуму.

Усе адзначаныя прыметы прававой дзяржаўнасці існуюць як нейкая тэарэтычная канструкцыя, як мадэль прававой дзяржавы. Не існуе нейкай фармалізаванай і дакладна азначанай характарыстыкі прававой дзяржаўнасці, нейкіх усебакова і дакладна акрэсленых яе прымет. Не існуе і не можа існаваць дзяржавы, якая б з'яўлялася ідэалам прававой дзяржаўнасці. Разам з тым асобныя ўласцівасці грамадзянскай супольнасці, характарыстыкі праў і свабод чалавека і грамадзяніна замацаваны ў міжнародна-прававых дакументах, шматбаковых міжнародных дагаворах (дэкларацыях, канвенцыях, пактах і г. д.). Але ў гэтых міжнародна-прававых даку-

ментах выражана воля шматлікіх дзяржаўных утварэнняў, і таму яны прымаюцца многімі сучаснымі дзяржавамі ў якасці дакументаў, абавязковых для выканання.

Кожная з сучасных дзяржаў мае сваю адметную гісторыю, свой шлях развіцця, абапіраецца на сваю эканамічную і сацыяльную структуру, свае цывілізацыйныя каардынаты, у межах якіх яна будуе сваю знешнюю і ўнутраную палітыку. Ніхто ў міжнародных зносінах не мае права навязваць свае ўласныя меркаванні і ўяўленні, у тым ліку ўяўленні аб прававой дзяржаве, у якасці ідэальных, адзіна правільных і справядлівых. У кожнай сучаснай дзяржавы свой шлях пабудовы прававой дзяржаўнасці і свае адметныя заканамернасці пабудовы прававой дзяржавы з улікам гістарычных традыцый, з улікам культурнага ўзроўню, менталітэту народа, геаграфічнага і сацыяльна-эканамічнага становішча.

4. Дзяржава прававая, сацыяльная і дзяржава эфектыўная

У сучаснай юрыдычнай навуцы існуюць тэрміналагічныя выразы і словаспалучэнні, з дапамогай якіх апісваюцца розныя бакі сучаснай дзяржавы – прававая дзяржава, сацыяльная прававая дзяржава, дзяржава сацыяльная і эфектыўная. Кожнае з гэтых словаспалучэнняў і выразаў абазначае асобныя бакі дзяржавы, падкрэслівае тыя ўласцівасці, якія характарызуюць сучасную дзяржаву.

Асобныя элементы тэорыі сацыяльнай дзяржаўнасці пачалі актыўна распрацоўвацца ў канцы XIX–пачатку XX ст. Гэта было абумоўлена развіццём у тагачасных дзяржаў актыўнай сацыяльнай дзейнасці. Функцыянаванне дзяржаў на прынцыпах лібералізму, калі дзяржавы не выказвалі ўмяшальніцтва ў эканамічныя і сацыяльныя працэсы, хутка прывяло да таго, што ў грамадстве накапілася вельмі шмат сацыяльных супярэчнасцей, якія выклікалі непажаданыя сацыяльныя катаклізмы і выбухі. Актыўнае ўмяшальніцтва дзяржавы ў размеркаванне і перараспределение матэрыяльна-фінансавых каштоўнасцей суправаджалася распрацоўкай сацыяльнай палітыкі і ўсебаковым развіццём сацыяльнай функцыі. Асабліва бурнае і шырокае развіццё сацыяльная дзейнасць дзяржавы набыла ў Германіі часоў Бісмарка. Менавіта ў той час пачалі складвацца і развівацца асноўныя складаныя часткі сацыяльнай функцыі, якая атрымала бурнае развіццё ў сучаснай Федэратыўнай Рэспубліцы Германіі.

Міжнароднае супрацоўніцтва дзяржаў у сацыяльнай сферы, якое было заканамерным вынікам распрацоўкі і рэалізацыі ўнутрыдзяржаўнай сацыяльнай палітыкі, прывяло да з'яўлення міжнародна-прававых дакументаў (пактаў і дэкларацый), у якіх на між-

народным узроўні замацоўваліся разнастайныя сацыяльныя, грамадзянскія і культурныя правы і свабоды. Так з'явіліся міжнароднаправавыя пакты і правы чалавека і асобы першага і другога пакаленняў.

Развіццё сацыяльнай функцыі заўсёды суправаджаецца значным умяшальніцтвам дзяржавы ў працэсы размеркавання і перарасперкавання матэрыяльных каштоўнасцей, ростам бюджэту дзяржавы і асабліва той яго часткі, якая накіравана на ажыццяўленне разнастайных сацыяльных праграм. Акрамя гэтага, сучасная дзяржава актыўна ўмешваецца ў вытворчыя працэсы, у эканамічную сферу існавання супольнасці. Усё гэта, безумоўна, садзейнічае росту дабрабыту людзей, спрыяе развіццю чалавека і асобы, але адначасова суправаджаецца і ростам утрыманскіх настрояў і ўтрыманскай псіхалогіі ў грамадстве. Таму заканамерна паўстае пытанне аб межах і аб'ёмах сацыяльнай дзейнасці дзяржавы, узнікае праблема эфектыўнасці сродкаў, якія выдаткоўваюцца дзяржавай на ажыццяўленне эканамічнай і сацыяльнай дзейнасці. Такі ракурс разгляду пытанняў эканамічнай і сацыяльнай дзейнасці ў спалучэнні з развіццём разнастайных дзяржаўных праграм і планаў прыкладна ў сярэдзіне 70-х гадоў мінулага стагоддзя абумовіў з'яўленне ў заходнееўрапейскай палітыка-прававой літаратуры паняцця эфектыўнай дзяржавы.

Паняцці і тэрміны прававой, сацыяльнай і эфектыўнай дзяржаўнасці адлюстроўваюць розныя бакі дзяржавы. Гэта не асобыя этапы яе развіцця, не асобныя фазы і тым больш тыпы, гэта асобныя паняцці і тэрміны, з дапамогай якіх абазначаюцца і характарызуюцца асобныя ўласцівасці і якасці сучаснай дзяржавы.

Пытанні для самаправеркі

1. Як Вы разумееце выраз аб тым, што прававая дзяржава з'яўляецца асобнай формай (праявай) узаемаадносін паміж дзяржавай і правам?
2. Раскрыйце змест асноўных накірункаў і ўзроўняў разгляду пытання аб суадносінах дзяржавы і права.
3. Раскрыйце змест адзінства і розніцы паміж дзяржавай і правам.
4. Раскрыйце змест асноўных накірункаў уздзеяння дзяржавы на права і права на дзяржаву.
5. Якія з палітыка-прававых ідэй, якія былі выказаны ў старажытнай Грэцыі, можна аднесці да кампанентаў тэорыі прававой дзяржавы?
6. Якія з ідэй прававой дзяржаўнасці былі сфармуляваны Ш. Мантэск'е, Дж. Локам, Т. Гобсам, Ж.-Ж. Русо, І.Кантам?
7. Пералічыце асноўныя кампаненты тэорыі прававой дзяржавы, якія Вы ведаеце.
8. Раскрыйце змест паняцця грамадзянскай супольнасці.
9. У чым Вы бачыце межы ўздзеяння дзяржавы на грамадства?
10. Пералічыце асноўныя ўласцівасці эфектыўнай дзяржаўнасці.

ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ №1

Пытанне 1. Якія формы ўласнасці існавалі ў першабытным грамадстве?

– індывідуальная;
– калектыўная;
– дзяржаўная;
– агульнанародная;
– сямейная.

Пытанне 2. Якія фактары вызначалі прыналежнасць сродкаў вытворчасці і матэрыяльных каштоўнасцей да калектыўнай («агульнай») уласнасці?

– яны ствараліся агульнымі намаганнямі супольнасці;
– яны былі вельмі каштоўнымі;
– выкарыстоўваліся агульнымі намаганнямі супольнасці;
– былі вельмі значнымі для людзей;
– служылі інтарэсам усяго калектыву.

Пытанне 3. Якія з адзначаных матэрыяльных каштоўнасцей і сродкаў вытворчасці знаходзіліся ў калектыўнай уласнасці?

– прамысловая тэрыторыя;
– кап'ё;
– жыллё;
– вогнішча;
– тапор.

Пытанне 4. Чым была абумоўлена наяўнасць у першабытным грамадстве індывідуальнай («прыватнай») уласнасці на сродкі вытворчасці і матэрыяльныя каштоўнасці?

– была абумоўлена патрэбамі вытворчасці;
– гэта адпавядала інтарэсам супольнасці;
– сродкі вытворчасці адпавядалі асаблівасцям уладальніка;
– гэта вынікала з жаданняў уладальніка;
– гэта адбывалася стыхійна.

Пытанне 5. Якія з адзначаных матэрыяльных каштоўнасцей і сродкаў вытворчасці знаходзіліся ў індывідуальнай («прыватнай») уласнасці?

– лук;

– лодка;
– вогнішча;
– жыллё;
– кап’ё.

Пытанне 6. Які з адзначаных шляхоў ва ўзаемаадносінах форм уласнасці ў першабытным грамадстве быў асноўным?

– пераход сродкаў вытворчасці і матэрыяльных каштоўнасцей з індывідуальнай у калектыўную ўласнасць;
– пераход сродкаў вытворчасці і матэрыяльных каштоўнасцей з калектыўнай у індывідуальную ўласнасць;
– пераход сродкаў вытворчасці і матэрыяльных каштоўнасцей з калектыўнай у дзяржаўную ўласнасць;
– пераход сродкаў вытворчасці і матэрыяльных каштоўнасцей з індывідуальнай у дзяржаўную ўласнасць;
– пераход сродкаў вытворчасці і матэрыяльных каштоўнасцей з сямейнай у дзяржаўную ўласнасць.

Пытанне 7. Якія прычыны ляжалі ў падмурку пераходу сродкаў вытворчасці і матэрыяльных каштоўнасцей з калектыўнай у індывідуальную ўласнасць?

– выпадак;
– эканамічныя прычыны;
– гвалтоўны захоп;
– маральныя перакананні;
– палітычная мэтазгоднасць.

Пытанне 8. Пры якіх умовах калектыў мог пагадзіцца на пераход сродкаў вытворчасці і матэрыяльных каштоўнасцей з калектыўнай у індывідуальную ўласнасць?

– калі гэта садзейнічала павышэнню вытворчых вынікаў працы;
– калі гэта ішло на карысць калектыву;
– калі гэта ішло на карысць асобе;
– калі гэта адбывалася пад прымусам;
– калі гэта адбывалася стыхійна.

Пытанне 9. Чым характарызавалася сістэма размеркавання матэрыяльных каштоўнасцей, якая была заснавана на дамінаванні?

– яна залежала ад працоўнага ўкладу асобы;

– яна вызначалася сацыяльным станам асобы;
– мела роўназабяспечваючы характар;
– перавагу ў размеркаванні мелі самыя дужыя асобы;
– размеркаванне адбывалася па прынцыпу разборкі.

Пытанне 10. Як Вы разумееце «роўназабяспечваючы» характар размеркавання ў першабытным грамадстве?

– пры размеркаванні ўлічвалася розніца ў патрэбах;
– пры размеркаванні ўлічвалася розніца ва ўзросце;
– пры размеркаванні ўлічваліся вышэйшыя інтарэсы калектыву;
– пры размеркаванні ўлічваліся найперш асабістыя інтарэсы;
– пры размеркаванні перавагу мелі самыя дужыя асобы.

Пытанне 11. Якія рысы найбольш адметна характарызуюць першабытную праабшчыну?

– невялікая група людзей (20–30 дарослых асоб);
– яна вяла адносна адасоблены лад жыцця;
– трымалася на прыгоднай для палявання і збіральніцтва тэрыторыі;
– на чале праабшчыны стаяў важак;
– жыццё праабшчыны было пераважна аседлым.

Пытанне 12. Якія рысы найбольш адметна характарызуюць родавую абшчыну?

– гэта аб'яднанне людзей, якія вядуць сумесную гаспадарку;
– гэта аб'яднанне людзей, якое заснавана на роднасных сувязях;
– роднасныя сувязі ляжаць у падмурку сумеснай гаспадаркі;
– на чале родавай абшчыны стаяў важак;
– у родавай абшчыне былі неўладкаваныя палавыя адносіны.

Пытанне 13. Які фактар аказаў рашаючы ўплыў на пераход (развіццё) ад праабшчыны да родавай абшчыны?

– развіццё вытворчых сіл;
– біялагічны фактар;
– развіццё вытворчых адносін;
– працэс адбыўся стыхійна;
– кліматычны фактар.

Пытанне 14. Якія фактары (ці фактар) аказалі рашаючы ўплыў на пераход ад мацярынскай да бацькоўскай родавай абшчыны, а затым і да першабытнай суседскай абшчыны?

– развіццё вытворчых сіл;
– біялагічны фактар;
– развіццё вытворчых адносін;
– працэс адбываўся стыхійна;
– прыродны фактар.

Пытанне 15. Якія прыметы характэрныя для арганізацыі ўлады і кіравання ў першабытным грамадстве?

– адсутнасць асобнай групы людзей для кіравання;
– супадзенне ўлады з усім насельніцтвам;
– наяўнасць спецыяльнага апарату кіравання;
– улада арганічна ўплецена ў іншыя праявы жыцця грамадства;
– улада ажыццяўляецца на грамадскіх пачатках.

Пытанне 16. Якія адметныя рысы былі ўласцівы ўладзе і кіраванню ў праабшчыне?

– прымітыўнасць улады;
– спалучэнне ўсіх паўнамоцтваў у руках адной асобы;
– ажыццяўленне ўлады на грамадскіх пачатках;
– улада і кіраванне былі заснаваны на «фізічнай перавазе»;
– наяўнасць спецыяльных сродкаў прымусу.

Пытанне 17. Якія прычыны ляжалі ў падмурку трансфармацыі ўлады і кіравання ў першабытным грамадстве?

– прыродныя сілы;
– развіццё эканамічнай сістэмы грамадства;
– змены ў сацыяльным ладзе грамадства;
– перамены ў светапоглядзе першабытных людзей;
– з'яўленне новых правіл паводзін.

Пытанне 18. Якімі з адзначаных рысаў характарызуюцца ўлада і кіраванне ў родавай абшчыне?

– існаваў «падзел працы» паміж органамі ўлады і кіравання;
– найбольш важныя пытанні роду вырашаліся на агульным сходзе;
– аператыўнае кіраванне ажыццяўляў старэйшына;

– ваенныя функцыі ажыццяўляў военачальнік;
– рэлігійныя функцыі ажыццяўляў шаман.

Пытанне 19. Якія з органаў улады і кіравання былі ў першабытным грамадстве на родавай стадыі развіцця?

– агульны сход суродзічаў;
– старэйшына;
– военачальнік;
– суд;
– шаман.

Пытанне 20. Якія з пытанняў жыццядзейнасці родавай абшчыны вырашаліся на агульным сходзе суродзічаў?

– пачатак вайны і заключэнне міру;
– выбары старэйшыны і военачальніка;
– перамена месца стойбішча;
– асуджэнне суродзіча;
– выбары шамана.

Пытанне 21. Які з органаў улады і кіравання родавай абшчыны вырашаў усе найбольш важныя пытанні жыццядзейнасці грамадства?

– старэйшына;
– агульны сход суродзічаў;
– военачальнік;
– суд;
– шаман.

Пытанне 22. Каго ў родавай абшчыне выбіралі падчас вядзення ваенных дзеянняў?

– шамана;
– старэйшыну;
– военачальніка;
– агульны сход;
– суд.

Пытанне 23. Хто ажыццяўляў культавую функцыю ў родавай абшчыне?

– агульны сход суродзічаў;
– старэйшына родавай абшчыны;

– шаман;
– военачальнік;
– суд.

Пытанне 24. Што ў сучаснай навуцы абазначаецца тэрмінам «неалітычная рэвалюцыя», які ўпершыню ўвёў у навуковы зварот англійскі вучоны Г.Чайлд?

– барацьба паміж беднымі і багатымі;
– перамены ў жыцці грамадства, якія адбыліся пасля і ў ходзе пераходу ад прысвойваючай да вытворчай эканомікі;
– перамены ў жыцці грамадства, якія адбыліся пасля ўзнікнення палявання і рыбалоўства;
– перамену месца стойбішча родавай абшчыны пад уздзеяннем кліматычных фактараў;
– барацьбу паміж рознымі родавамі абшчынамі за лепшае стойбішча.

Пытанне 25. Якія віды вытворчай дзейнасці чалавека былі найбольш характэрнымі для прысвойваючай эканомікі?

– жывёлагадоўля;
– земляробства;
– паляванне;
– збіральніцтва;
– рыбалоўства.

Пытанне 26. Якія віды вытворчай дзейнасці чалавека найбольш адметна характарызуюць вытворчую эканоміку?

– жывёлагадоўля;
– земляробства;
– паляванне;
– збіральніцтва;
– рыбалоўства.

Пытанне 27. Да якіх зменаў у сацыяльным жыцці грамадства прывёў пераход ад прысвойваючай да вытворчай эканомікі?

– узніклі першыя з вядомых нам цывілізацый;
– з'явіліся паляўнічыя;
– адбыліся карэнныя змены ў сацыяльным жыцці грамадства;
– памянялася і ўскладнілася сацыяльная структура грамадства;
– з'явіліся шаманы.

Пытанне 28. Да якіх вынікаў у сферы кіравання і ажыццяўлення ўлады ў грамадстве прывёў пераход ад прысвойваючай да вытворчай эканомікі?

– ускладнілася арганізацыя вытворчасці і грамадскай працы;
– з'явіліся новыя, невядомыя раней кіраўнічыя функцыі;
– сфармаваўся асобны (дзяржаўны) апарат кіравання і прымусу;
– з'явіўся суд;
– была створана паліцыя.

Пытанне 29. Што па сваёй сутнасці ўяўляюць тры буйныя падзелы грамадскай працы?

– падзел сродкаў вытворчасці і прыладаў працы;
– спецыялізацыю ў сродках вытворчасці і прыладах працы;
– уяўляюць спецыялізацыю ў вытворчай дзейнасці;
– зводзяцца да росту вытворчасці грамадскай працы;
– зводзяцца да пераразмеркавання вынікаў вытворчасці.

Пытанне 30. Якія наступствы адбыліся пасля і ў выніку трох буйных падзелаў грамадскай працы?

– узнікла якасная маёмасная няроўнасць сярод насельніцтва;
– вырасла вытворчасць працы і сфармаваўся тавараабмен;
– сфармавалася колькасная маёмасная няроўнасць;
– з'явіўся лішкавы прадукт;
– адбылося перамешванне насельніцтва.

Пытанне 31. Якімі прыметамі дзяржаўна-арганізаванае грамадства (дзяржава) адрозніваецца ад першабытнага грамадства?

– яно з'яўляецца сацыяльна-неаднародным грамадствам;
– людзі ў ім падзяляюцца па тэрыторыі пражывання;
– у грамадстве фармуецца якасна новая сістэма ўлады і кіравання;
– кіраванне ў гэтым грамадстве ажыццяўляецца за плату;
– у гэтым грамадстве з'яўляецца рэлігія.

Пытанне 32. Што азначае падзел людзей па тэрыторыі пражывання, які характарызуе дзяржаўна-арганізаванае грамадства?

– падзел людзей па родавай прымеце ў гэтым грамадстве захоўвае сваё ранейшае значэнне;

– падзел людзей па родавай прымеце адсоўваецца ў гэтым грамадстве на другое і трэцяе па значнасці месцы;
– родавыя сувязі ў гэтым грамадстве не маюць свайго ранейшага значэння ў вытворчым працэсе;
– родавыя сувязі ў гэтым грамадстве не маюць ранейшага значэння ў размеркаванні прадуктаў вытворчасці;
– сацыяльнае становішча асобы не вызначаецца болей яе родавымі сувязямі.

Пытанне 33. Якія з адзначаных прымет найбольш дакладна характарызуюць новую сістэму ўлады і кіравання, якая сфармавалася ў дзяржаўна-арганізаваным грамадстве?

– улада і кіраванне выдзеліліся ў гэтым грамадстве ў самастойную функцыю, самастойны від чалавечай дзейнасці;
– у гэтым грамадстве ўлада і кіраванне адпавядаюць інтарэсам усіх індывідаў і іх груп;
– улада і кіраванне ў гэтым грамадстве выконваюцца асобнай групай людзей;
– улада і кіраванне не ў стане выражаць і задавальняць інтарэсы ўсіх індывідаў і іх груп;
– для ажыццяўлення ўлады і кіравання ў гэтым грамадстве ствараецца асобны апарат кіравання.

Пытанне 34. Чаму ў дзяржаўна-арганізаваным грамадстве патрабуецца матэрыяльна-фінансавае забеспячэнне органаў улады і кіравання?

– таму што гэтага жадаюць прафесійныя кіраўнікі;
– гэта заканамерна вынікае з патрэбаў усяго грамадства;
– таму што дзяржаўны апарат ніякай вытворчай дзейнасцю не займаецца;
– таму што насельніцтва жадае гэтага;
– матэрыяльна-фінансавае забеспячэнне органаў улады і кіравання садзейнічае росту вытворчасці працы.

Пытанне 35. Якімі прыметамі характарызуецца шлях узнікнення «дзяржавы-ўласнасці»?

– яна фармуецца пераважна ў Заходняй Еўропе;
– дзяржаўнымі служачымі становяцца, як правіла, самыя багатыя людзі ці іх прадстаўнікі;

– дзяржава выступае рэгулюючай і каардынуючай сілай ва ўмовах узаемнага абмену матэрыяльнымі каштоўнасцямі;
– яна фармуецца пераважна ў рэгіёнах Азіі і Афрыкі;
– дзяржава ўзнікае праз прыватызацыю функцыі кіравання.

Пытанне 36. Якімі прыметамі характарызуецца ўзнікненне «дзяржавы-ўлады»?

– яна фармуецца пераважна ў Заходняй Еўропе;
– яна фармуецца пераважна ў рэгіёнах Азіі і Афрыкі;
– дзяржаўнымі служачымі станавіліся, як правіла, самыя багатыя людзі ці іх прадстаўнікі;
– дзяржава выступае рэгулюючай і каардынуючай сілай ва ўмовах узаемнага абмену матэрыяльнымі каштоўнасцямі;
– дзяржава ўзнікае праз прыватызацыю функцыі кіравання.

Пытанне 37. Якія з адзначаных стадый у фармаванні дзяржаўна-арганізаванага грамадства (дзяржавы) складаюць агульныя заканамернасці паходжання дзяржавы?

– буйныя падзелы грамадскай працы і фармаванне якаснай маёмаснай няроўнасці;
– з'яўленне лішкавага прадукту і рэгулярнага тавараабмену;
– узнікненне колькаснай маёмаснай няроўнасці;
– фармаванне тэрытарыяльнай суседскай абшчыны;
– фармаванне асобнай сістэмы кіравання, ажыццяўлення ўлады.

Пытанне 38. Якія фактары аказалі ўплыў на тое, што агульныя заканамернасці паходжання дзяржавы праяўляліся ў разнастайных формах?

– час фармавання дзяржаўна-арганізаванага грамадства;
– непаўторныя сацыяльна-эканамічныя ўмовы;
– своеасаблівасць геаграфічных і кліматычных умоў;
– вопыт развіцця іншых цывілізацый і народаў;
– з'яўленне рэгулярнага тавараабмену.

Пытанне 39. Якія адметныя рысы ўласцівы паходжанню дзяржавы на Усходзе?

– на яе ўзнікненне значны ўплыў аказалі прыродныя (геаграфічны і кліматычны) фактары;

– яна ўзнікае за межамі адасобленых абшчын у якасці асобнай функцыі па кіраванню супольнасцю і ажыццяўленню ўлады;
– манапалізацыя функцыі па кіраванню і ажыццяўленню ўлады пэўнай групай насельніцтва;
– рашаючы ўплыў на фармаванне дзяржавы на Усходзе аказаў свабодны тавараабмен;
– колькасная маёмасная няроўнасць спачатку ўзнікае паміж кіраўнікамі і абшчыннікамі.

Пытанне 40. Якія з адзначаных дзяржаўных утварэнняў адносяцца да дзяржаў, якія ўзніклі на Усходзе?

– узнікненне дзяржавы ў Егіпце;
– узнікненне дзяржавы ў шумерыйцаў;
– паходжанне дзяржавы ў Індыі;
– паходжанне дзяржавы ў Кітаі;
– узнікненне дзяржавы ў Карфагене.

Пытанне 41. Якія адметныя рысы ўласцівы паходжанню дзяржавы ў Афінах?

– дзяржава арганічна вырастала з патрэбаў асобных абшчын;
– рашаючы ўплыў на фармаванне дзяржавы аказаў свабодны тавараабмен;
– каланізацыя грэкамі пабярэжжа Міжземнага мора;
– перамешванне паміж сабой прадстаўнікоў розных родаў і плямёнаў;
– фармаванне якасна новых органаў улады і кіравання.

Пытанне 42. Хто з адзначаных гістарычных асоб правёў рэформы і завяршыў працэс фармавання дзяржавы ў Афінах?

– Сервій Тулій;
– Плутарх;
– Салон;
– Платон;
– Клісфен.

Пытанне 43. Хто з адзначаных гістарычных асоб правёў рэформы і завяршыў працэс фармавання дзяржавы ў Рыме?

– Сервій Тулій;
– Плутарх;

– Салон;
– Платон;
– Клісфен.

Пытанне 44. Якімі адметнымі рысамі характарызуецца працэс фармавання дзяржаўна-арганізаванага грамадства ў Рыме?

– дзяржава вырастае пад вызначальным уздзеяннем працэсаў, што праходзілі ўнутры рымскай абшчыны;
– рашаючы ўплыў на фармаванне дзяржавы аказаў свабодны тавараабмен;
– на працэс фармавання дзяржавы значны ўплыў аказала барацьба прышлага насельніцтва з уласна рымскім народам;
– перамешванне паміж сабой прадстаўнікоў розных родаў і плямёнаў;
– фармаванне якасна новых органаў улады і кіравання.

Пытанне 45. Якімі прыметамі характарызавалася прышлае насельніцтва – plebs?

– у яго склад уваходзілі асабіста вольныя людзі;
– plebs валодаў прамысловым і гандлёвым багаццем, зямельнай уласнасцю;
– plebs прымаў удзел у вырашэнні пытанняў кіравання супольнасцю, удзельнічаў у сходах і займаў службовыя пасады;
– plebs выплачваў падаткі і адбываў вайсковую павіннасць;
– удзельнічаў у падзеле заваяваных зямель і нарабаванага падчас ваенных дзеянняў багацця.

Пытанне 46. Што з адзначанага зрабіў Сервій Тулій у Рыме дзеля заснавання дзяржавы?

– усталяваў цэнз і размеркаваў падаткі ў залежнасці ад маёмаснага становішча асобы;
– падзяліў насельніцтва па маёмаснай прымеце на пяць разрадаў;
– падзяліў тэрыторыю Рыма на чатыры новыя «тэрытарыяльныя племені»;
– стварыў новую супольнасць з уласна рымскага народа і прышлага насельніцтва;
– стварыў новыя органы ўлады і кіравання.

Пытанне 47. Якія з адзначаных прыметаў найбольш адметна характарызуць працэс узнікнення дзяржавы ў франкаў (германскага народа)?

– захоп франкамі Паўночна-Усходняй Галіі;
– падзел заваяванай зямлі і нарабаванай маёмасці на карысць родавай знаці, военачальнікаў і дружыны;
– франкі знаходзіліся на момант заваявання на стадыі «ваеннай дэмакратыі»;
– захоп франкамі часткі тэрыторыі Заходняй Рымскай імперыі прывёў да перамешвання насельніцтва;
– дзяржава ў франкаў сфармавалася ў якасці раннефеадальнай дзяржавы.

Пытанне 48. Чым характарызуецца працэс узнікнення дзяржавы шляхам «запрашэння на княжэнне»?

– дзяржава ўзнікае выключна пад уздзеяннем унутраных абставін жыццядзейнасці грамадства;
– вялікае пашырэнне такі шлях узнікнення дзяржавы меў ва ўсходніх славян;
– на момант «запрашэння на княжэнне» ў усходніх славянаў была пашырана колькасная маёмасная дыферэнцыяцыя;
– «запрашэнне на княжэнне» ёсць асобны інстытут, які «тэхналагічна» завяршае працэс стварэння дзяржавы;
– запрошаныя на княжэнне варагі выконвалі ў стварэнні дзяржавы ролю трэцяй, нейтральнай сілы.

Пытанне 49. Якая з форм паходжання дзяржаў найбліжэй па асноўных параметрах да паходжання дзяржавы ў Рыме?

– паходжанне дзяржавы ў франкаў (германскага народа);
– узнікненне дзяржавы ў Афінах;
– паходжанне дзяржавы на Усходзе;
– узнікненне дзяржавы шляхам «запрашэння на княжэнне»;
– паходжанне дзяржавы ў Егіпце.

Пытанне 50. Якая з адзначаных ніжэй фаз у фармаванні дзяржаўна-арганізаванага грамадства з'яўляецца вузлавой у разуменні працэсаў фармавання дзяржавы?

– узнікненне якаснай маёмаснай няроўнасці сярод насельніцтва;
– рост вытворчасці працы і фармаванне тавараабмену;

– фармаванне колькаснай маёмаснай няроўнасці;
– з'яўленне лішкавага прадукту;
– перамешванне насельніцтва.

Пытанне 51. Якія з адзначаных правіл паводзін былі ўласцівы першабытнаму грамадству?

– навука;
– табу;
– міф;
– права;
– календары.

Пытанне 52. Які з указаных відаў правіл паводзін першабытнага грамадства можна лічыць першапачатковым?

– навука;
– табу;
– міф;
– права;
– календары.

Пытанне 53. У якой паслядоўнасці ўзнікалі асноўныя віды правіл паводзін першабытнага грамадства?

– табу – календары – міфы;
– міф – каляндар – табу;
– табу – міф – каляндар;
– каляндар – табу – міф;
– міф – табу – каляндар.

Пытанне 54. У чым Вам бачыцца сутнасць «табу»?

– у дазволах на пэўныя дзеянні;
– у вызначэнні асобных дзеянняў;
– у забароне пэўных дзеянняў;
– у пакаранні асобных дзеянняў;
– у стымуляванні нейкіх дзеянняў.

Пытанне 55. Якія з адзначаных прымет найбольш адметна характарызуюць «табу»?

– яны складваліся стыхійна, нічым не матываваліся і нічым не абгрунтоўваліся;

– яны узнікалі ў ходзе практычнай дзейнасці людзей;
– яны ўстанаўліваліся важаком па яго меркаванню;
– яны навязваліся чалавечаму калектыву звонку, складваліся пад уздзеяннем навакольнага прыроднага асяроддзя;
– табу захоўваліся з-за страху перад невядомай небяспекай, якая пагражала калектыву і чалавеку ў выпадку парушэння забароны.

Пытанне 56. Якія з адзначаных прымет найбольш адметна характарызуюць такі від правіл паводзін, як міф?

– міфы былі прымітыўнай формай грамадскай свядомасці, сродкам мыслення першабытнага чалавека і пазнання рэчаіснасці;
– у міфах захоўваліся веды чалавека аб навакольным асяроддзі, аб яго месцы ў прыродзе і грамадстве;
– з дапамогай міфаў абмяжоўваўся жывёльны інстынкт і жывёльны індывідуалізм першабытнага чалавека;
– міфы замацоўвалі звесткі аб шляхах вандравання, аб месцах стаянак, аб спосабах вырабу сродкаў вытворчасці;
– у міфах захоўваліся правілы аб шлюбна-сямейных адносінах, аб класах сваяцкіх адносін, татэмічныя правілы.

Пытанне 57. Якімі прыметамі характарызуецца нарматыўна-рэгулятыўная частка міфа?

– яна змяшчае набор станоўчых і адмоўных прыкладаў, правіл паводзін;
– у ёй фармулююцца спосабы паводзін, якімі павінен кіравацца чалавек;
– у гэтай частцы міфа змяшчаюцца разнастайныя забароны;
– правілы паводзін, якія змяшчаюцца ў міфе, суправаджаюцца, як правіла, пэўнымі абрадамі, рытуаламі;
– у міфах утрымліваюцца не толькі забароны, але і стымулы для станоўчых паводзін.

Пытанне 58. Якімі адметнымі рысамі характарызуецца каляндар?

– каляндар уяўляе якасна новы від правіл паводзін у параўнанні з табу і міфамі;
– каляндар узнікае ва ўмовах вытворчай эканомікі;
– ён рэгламентуе жыццядзейнасць першабытных абшчын збіральнікаў, паляўнічых, рыбаловаў і кожнага чалавека ў гэтых абшчынах;

– каляндар рэгламентуе жыццядзейнасць абшчын земляробаў і жывёлаводаў і кожнага чалавека ў гэтых абшчынах;
– ён уяўляе звод норм права.

Пытанне 59. Якія адметныя рысы характарызуюць сістэму нарматыўнага рэгулявання ва ўмовах вытворчай эканомікі?

– табу і міфы перамяшчаюцца на «перыферыю» сістэмы нарматыўнага рэгулявання;
– розныя віды правіл паводзін рэгулявалі розныя бакі і розныя «пласты» грамадскіх адносін;
– дамінуючае становішча ў сістэме нарматыўнага рэгулявання займае каляндар;
– табу, міфы і календары рэгламентуюць адначасова ўсю сістэму грамадскіх адносін і займаюць пры гэтым аднолькавае месца;
– розныя віды правіл паводзін ва ўмовах вытворчай эканомікі па сваёй значнасці нагадваюць своеасаблівую піраміду.

Пытанне 60. У чым праяўляецца прыродны характар правіл паводзін першабытнага грамадства?

– яны фармуляваліся падчас прыстасавання чалавека да навакольнага прыроднага асяроддзя;
– правілы паводзін першабытнага чалавека адпавядалі прыродзе чалавека;
– яны былі вельмі жорсткімі па свайму зместу;
– гэтыя правілы паводзін адпавядалі прыродзе таго жывёльнага свету, які акружаў першабытнага чалавека;
– першабытны чалавек не прыдумваў гэтыя правілы паводзін, а браў іх у гатовым выглядзе з прыроднага асяроддзя.

Пытанне 61. У чым праяўляецца звычаёвы характар правіл паводзін першабытнага грамадства?

– яны з'яўляюцца звычаямі па форме існавання і захавання;
– гэта старыя, вядомыя ўсім правілы паводзін, якімі людзі кіруюцца ў паўсядзённым жыцці;
– гэта прывычка, якая фармавалася на працягу доўгага часу, не парушаць вядомыя чалавеку правілы паводзін – табу, міфы, календары;
– звычаёвы характар праяўляецца ў тым, што яны былі правіламі-сродкамі для захавання і выканання іншых правіл паводзін;
– гэта былі асобныя, «працэсуальныя правілы» паводзін.

Пытанне 62. У чым праяўляецца «монанарматыўны характар» правіл паводзін першабытнага грамадства?

– яны былі адзінымі і непадзельнымі ў залежнасці ад характару рэгулюемых грамадскіх адносін;
– гэтыя правілы паводзін мелі аднолькавыя механізмы ўздзеяння на грамадскія адносіны;
– гэтыя правілы паводзін мелі аднолькавыя сродкі абароны ў выпадку іх парушэння;
– яны былі адзінымі для ўсіх членаў першабытнага грамадства;
– яны знаходзіліся ў арганічнай сувязі з эканомікай і ідэалогіяй прысвойваючай і вытворчай эканомікі.

Пытанне 63. У чым Вы бачыце рэлігійны характар правіл паводзін першабытнага грамадства?

– яны заўсёды асвяшчаліся нейкай звышсілай;
– яны суправаджаліся ахвярапрынашэннямі ідалам;
– яны фармуляваліся шаманамі;
– у іх падмурку ляжалі патрабаванні шматлікіх багоў, а затым і адзінага Бога;
– рэлігійны характар праяўляецца ў тым, што яны захоўваліся і выконваліся пад уздзеяннем рэлігіі.

Пытанне 64. Якія з адзначаных прымет характарызуюць працэс выканання правіл паводзін у першабытным грамадстве?

– правілы паводзін у першабытным грамадстве выконваліся добраахвотна, бо яны зыходзілі ад усёй супольнасці;
– іх захаванне забяспечвалася аўтарытэтам усёй супольнасці;
– існавалі спецыяльныя органы, якія прымянялі меры прымусу;
– у першабытным грамадстве не існавала спецыяльных органаў, якія б сачылі за іх выкананнем;
– правілы паводзін першабытнага грамадства выконваліся пад пагрозай прымянення прымусу.

Пытанне 65. Чаму правілы паводзін першабытнага грамадства не мелі прадстаўніча-абавязваючага характару?

– таму што ў той час не існавала розніцы паміж правамі і абавязкамі;
– першабытныя людзі былі фізічна і псіхалагічна тоеснымі паміж сабой;

– не існавала супярэчнасцей у грамадстве і паміж асобнымі людзьмі, якія былі абумоўлены якаснай і колькаснай маёмаснай няроўнасцю;
– таму што людзі не разумелі розніцы паміж правамі і абавязкамі;
– таму што ў той час панавалі роднасныя сувязі, якія нівеліравалі розніцу паміж правамі і абавязкамі.

Пытанне 66. Якія з грамадскіх адносін з'яўляюцца «родавай пупавінай» права?

– усе грамадскія адносіны;
– грамадскія адносіны маральнага характару;
– таварна-грашовыя адносіны;
– рэлігійныя адносіны;
– адносіны паміж рознымі родамі і плямёнамі.

Пытанне 67. Што з'яўляецца «стрыжнем» права?

– «стрыжнем» права з'яўляецца норма права;
– эквівалент, г. зн. суразмернасць, і ёсць «стрыжнем» права;
– маральныя патрабаванні з'яўляюцца «стрыжнем» права;
– «стрыжнем» права з'яўляюцца рэлігійныя адносіны і нормы;
– адносіны паміж родамі і плямёнамі з'яўляюцца «стрыжнем» права.

Пытанне 68. Дзеля чаго патрабуецца знешняя фіксацыя права, «матэрыялізацыя» норм права?

– каб у свядомасці людзей аднастайна зафіксаваць «раз і назаўсёды» прававыя эквіваленты;
– каб надаць прававым эквівалентам, суразмернасцям агульнаабавязковае значэнне;
– знешняя фіксацыя права адбывалася выпадкова;
– з дапамогай знешняй фіксацыі падкрэслівалася непарушнасць норм права;
– знешняя фіксацыя норм права спатрэбілася для таго, каб узвысіць таго, хто ствараў нормы права.

Пытанне 69. Чаму права патрабуе абавязковай знешняй абароны з боку грамадства і яго афіцыйнага прадстаўніка – дзяржавы?

– таму што ў грамадстве пастаянна ідзе барацьба інтарэсаў адносна эквівалентнасці (суразмернасці);

– для захавання выпрацаванага прававога эквіваленту патрабуецца знешняя прымусовая сіла;
– для права гэта непатрэбна, а для дзяржавы ўмяшанне ў прававыя працэсы неабходна;
– толькі з дапамогай знешняй прымусовай сілы з боку грамадства і дзяржавы можна стварыць права;
– гэтага патрабуюць маральныя перакананні грамадства.

Пытанне 70. У чым выражаецца прадстаўніча-абавязваючы характар права?

– у тым, што нормы права надзяляюць нейкіх сацыяльных суб'ектаў правамі і адначасова ўскладваюць на іншых суб'ектаў абавязкі;
– у тым, што ў грамадстве пастаянна ідзе барацьба інтарэсаў за правы і абавязкі;
– у тым, што дзяржава імкнецца так размеркаваць правы і абавязкі сярод людзей;
– у прымусовай сіле з боку грамадства і дзяржавы;
– у маральных перакананнях.

Пытанне 71. Які з адзначаных фактараў быў асноватворным для «еўрапейскага шляху» фармавання права?

– таварна-грашовыя адносіны;
– дзяржава;
– рэлігія;
– прыродны фактар;
– навука.

Пытанне 72. Які з адзначаных фактараў быў асноватворным для «азіяцкага шляху» фармавання права?

– таварна-грашовыя адносіны;
– дзяржава;
– рэлігія;
– прыродны фактар;
– навука.

Пытанне 73. Чым характарызуецца «еўрапейскі шлях» фармавання права?

– большая частка норм права складваецца ў жыцці грамадства паступова, а дзяржава бярэ іх пад сваю ахову і абарону;

– значную ролю ў фармаванні права адыгрывае мараль;
– большая частка норм права выдаецца дзяржавай;
– рэлігійныя нормы аказвалі рашаючы ўплыў на фармаванне норм права;
– значную ролю ў фармаванні права адыгрывае звычай.

Пытанне 74. Чым характарызуецца «азіяцкі шлях» фармавання права?

– большая частка норм права складваецца ў жыцці грамадства паступова, а дзяржава бярэ іх пад сваю ахову і абарону;
– значную ролю ў фармаванні права адыгрывае мараль;
– большая частка норм права выдаецца дзяржавай;
– рэлігійныя нормы аказвалі рашаючы ўплыў на фармаванне норм права;
– значную ролю ў фармаванні права адыгрывае звычай.

Пытанне 75. Якія змены адбыліся ў нарматыўнай сістэме грамадства пасля ўзнікнення права?

– старая нарматыўная сістэма грамадства разбурылася;
– права вылучылася ў нарматыўнай сістэме на першае месца;
– права стала рэгламентаваць самыя значныя грамадскія адносіны;
– адбыліся якасныя перамены ў іншых правілах паводзін;
– сфера дзеяння адных правіл паводзін павялічылася, а другіх – зменшылася.

Пытанне 76. Якім чынам выкарыстоўваліся старыя правілы паводзін, уласцівыя першабытнаму грамадству, пры стварэнні права?

– у асобных правіл паводзін мяняўся змест толькі часткі старога правіла;
– частцы правіл паводзін надавалася новае гучанне, г. зн. пры захаванні формы яны напаўняліся новым зместам;
– актыўна выкарыстоўваліся правілы-сродкі, якія былі характэрнымі для першабытнага грамадства;
– пры стварэнні норм права старыя правілы паводзін практычна не выкарыстоўваліся;
– пры стварэнні норм права старыя правілы паводзін выкарыстоўваліся толькі ў якасці «будаўнічага матэрыялу».

Пытанне 77. Які з адзначаных шляхоў у фармаванні норм права быў галоўным?

– захаванне старых правіл паводзін і наданне ім прававога зместу;
– змена старых правіл паводзін і наданне ім прававога характару;
– фармаванне норм права, якія мелі выключна прававыя карані;
– захаванне асноўнай масы старых правіл паводзін і наданне іх частцы прававога зместу;
– захаванне часткі старых правіл паводзін і наданне асноўнай іх масе прававога зместу.

Пытанне 78. Адзначце фактары, якія выступаюць прычынамі існавання мноства канцэпцый (тэорый) паходжання дзяржавы і права.

– разнастайнасць і супярэчлівасць інтарэсаў розных сацыяльных групп;
– «вузкарэгіянальны падыход» да фармулявання канцэпцый аб паходжанні дзяржавы і права;
– накапленне новых ведаў аб умовах і заканамернасцях паходжання і развіцця дзяржавы і права;
– перамены ў метадалогіі даследавання грамадства, дзяржавы і права;
– множнасць фактараў, якія ўплываюць на ўзнікненне і развіццё дзяржавы і права.

Пытанне 79. Якія з адзначаных фактараў адносяцца да ліку гнасеалагічных (пазнавальных) прычын, што ўплываюць на існаванне мноства канцэпцый аб паходжанні дзяржавы і права?

– разнастайнасць і супярэчлівасць інтарэсаў розных сацыяльных груп;
– «вузкарэгіянальны падыход» да фармулявання канцэпцый аб паходжанні дзяржавы і права;
– накапленне ўсё новых і новых ведаў аб умовах і заканамернасцях развіцця дзяржавы і права;
– перамены ў метадалогіі даследавання грамадства, дзяржавы і права;
– множнасць фактараў, якія ўплываюць на ўзнікненне і развіццё дзяржавы і права.

Пытанне 80. Якія з адзначаных фактараў адносяцца да ліку сацыяльна- палітычных прычын, што ўплываюць на існаванне мноства канцэпцый аб паходжанні дзяржавы і права?

– разнастайнасць і супярэчлівасць інтарэсаў розных сацыяльных груп;
– «вузкарэгіянальны падыход» да фармулявання канцэпцый аб паходжанні дзяржавы і права;
– накапленне ўсё новых і новых ведаў аб умовах і заканамернасцях развіцця дзяржавы і права;
– перамены ў метадалогіі даследавання грамадства, дзяржавы і права;
– множнасць фактараў, якія ўплываюць на ўзнікненне і развіццё дзяржавы і права.

Пытанне 81. На якія групы ўмоўна падзяляюцца ўсе канцэпцыі (тэорыі) аб паходжанні дзяржавы і права?

– тэорыі аб паходжанні як дзяржавы, так і права;
– канцэпцыі аб паходжанні дзяржавы;
– тэорыі аб паходжанні грамадства, права і дзяржавы;
– вучэнні аб паходжанні права;
– тэорыі аб паходжанні грамадства, дзяржавы і права.

Пытанне 82. У якіх з адзначаных тэорый разглядаюцца пытанні паходжання як дзяржавы, так і права?

– тэалагічная дактрына;
– ірыгацыйная тэорыя;
– гістарычная школа права;
– марксісцкая тэорыя;
– тэорыя гвалту.

Пытанне 83. У якіх з адзначаных тэорый разглядаюцца пераважна пытанні паходжання дзяржавы?

– тэалагічная дактрына;
– ірыгацыйная тэорыя;
– гістарычная школа права;
– марксісцкая тэорыя;
– тэорыя гвалту.

Пытанне 84. У якіх з адзначаных тэорый разглядаюцца пераважна пытанні паходжання права?

– тэалагічная дактрына;

– ірыгацыйная тэорыя;
– гістарычная школа права;
– марксісцкая тэорыя;
– тэорыя гвалту.

Пытанне 85. Якую з адзначаных тэорый аб паходжанні дзяржавы і права можна лічыць гістарычнай першай тэорыяй?

– ірыгацыйная тэорыя;
– тэалагічная дактрына;
– гістарычная школа права;
– марксісцкая тэорыя;
– тэорыя гвалту.

Пытанне 86. Якія з адзначаных адметных рысаў уласцівы тэалагічнай тэорыі паходжання дзяржавы і права?

– дзяржава і права залежаць ад волі Усявышняга;
– дзяржава і права ствараюцца Богам;
– дзяржава і права – з'явы вечныя і нязменныя;
– дзяржава і права ўзнікаюць натуральным шляхам;
– напачатку ўзнікае права, а пасля фармуецца дзяржава.

Пытанне 87. Якія з адзначаных элементаў тэалагічнай тэорыі паходжання дзяржавы і права былі сфармуляваны Птахатэпам?

– грамадства з'яўляецца пірамідай;
– вяршыняй піраміды з'яўляюцца Богі і іх абраннік фараон;
– падножжам піраміды з'яўляецца просты народ;
– паміж богамі і народам размяшчаюцца жрацы, а ўся піраміда аб'ядноўваецца правасуддзем і багіняй Маат;
– царская ўлада (дзяржаўнасць) зышла з неба, а першым месцам дзяржаўнасці быў горад Эрэду.

Пытанне 88. Якія з адзначаных элементаў тэалагічнай тэорыі паходжання права былі сфармуляваны ў Бібліі?

– спачатку Бог даруе абранаму Богам народу маральны закон;
– праз прарока Маісея і яго 10 запаветаў абраны Богам народ атрымлівае асновы сацыяльнага ладу;
– народ сам захацеў мець законы і права;
– народ атрымаў законы і права на каменных скрыжалях, якія прынёс прарок Маісей з гары Сінай;
– закон і права абраны народ Ізраіля атрымаў ад прарока Самуіла.

Пытанне 89. Якія з адзначаных элементаў тэалагічнай тэорыі паходжання дзяржавы і права былі сфармуляваны Аўгусцінам Блажэнным?

– на зямлі заўсёды існавалі «два грады» (дзве дзяржавы): град зямны і град нябесны;
– град зямны і град Божы суседнічаюць на адной Зямлі, існуюць адзін каля другога;
– зямная дзяржава забяспечвае ўнутраны мір, якім карыстаецца дзяржава Божая;
– царкоўная ўлада мае прыярытэт над дзяржаўнай уладай;
– грэх ёсць першая прычына рабства.

Пытанне 90. Якую з адзначаных тэорый паходжання дзяржавы і права Жазэф дэ Мэстр лічыў «ідэалогіяй» французскай рэвалюцыі і разбурэння каралеўскай улады?

– марксісцкую;
– тэорыю гвалту;
– гістарычную школу права;
– дагаворную тэорыю;
– ірыгацыйную дактрыну.

Пытанне 91. Якія з адзначаных элементаў тэалагічнай тэорыі паходжання дзяржавы і права былі сфармуляваны Жазэфам дэ Мэстрам?

– грамадства ніколі не ўзнікае ў выніку дагавору паміж людзьмі;
– дагавор можа быць парушаны, таму развіццё дзяржаўнасці можа перарвацца;
– дзяржава ёсць арганізм, які жыве невядомай яму сілай;
– сімвал адзінства дзяржавы ёсць кароль;
– Бог з'яўляецца творцай улады і адначасова суддзёй улады.

Пытанне 92. Якія з адзначаных палажэнняў уласцівы патрыярхальнай тэорыі паходжання дзяржавы і права?

– дзяржава вырастае з супольнага пражывання людзей;
– дзяржаўная ўлада вырастае з разросшайся сям'і;
– першая сям'я ёсць адначасова і першай дзяржавай;
– дзяржаўная ўлада ёсць заканамерны працяг бацькоўскай улады;
– кароль валодае ўладай як патрыярх і нашчадак патрыярха Адама.

Пытанне 93. Якія з адзначаных рысаў патрыярхальнай тэорыі аб паходжанні дзяржавы і права былі сфармуляваны Р.Філмэрам?

– кароль з'яўляецца бацькам сваіх падданых;
– дзяржава ўзнікае з сумеснага пасялення людзей;
– бацькоўская ўлада з'яўляецца манархічнай уладай;
– права бацькоўства працягвалася натуральным шляхам;
– дзяржава ўзнікае натуральным шляхам.

Пытанне 94. Якія з адзначаных палажэнняў уласцівы дагаворнай тэорыі аб паходжанні дзяржавы і права?

– дзяржава – справа рук чалавека;
– дзяржава ўзнікае па волі Усявышняга;
– першапачаткова чалавечая супольнасць існуе без дзяржавы;
– натуральны стан чалавека папярэднічае дзяржаве:
– дзяржава ўзнікае ў выніку дагавору паміж людзьмі.

Пытанне 95. Хто з адзначаных аўтараў сцвярджаў, што дзяржава ўзнікае ў выніку двух дагавораў аб стварэнні дзяржавы?

– Гроцый Гуга;
– Пуфендорф Самуіл;
– Гобс Томас;
– Лок Джон;
– Русо Ж-Ж.

Пытанне 96. Якія з адзначаных адметных рысаў уласцівы арганічнай тэорыі паходжання дзяржавы і права?

– грамадства з'яўляецца жывым арганізмам, які развіваецца натуральным шляхам;
– дзяржава з'яўляецца арганізмам у арганізме ці жыццёва важным яго органам;
– дзяржаўная ўлада па сваёй сутнасці ёсць натуральнае панаванне цэлага над часткамі;
– дзяржава існуе вечна і з'яўляецца вынікам натуральнага развіцця;
– у выніку падзелу працы ў першабытным грамадстве з'явіліся «ніжэйшы клас» і «вышэйшы клас».

Пытанне 97. Якія з адзначаных адметных рысаў уласцівы тэорыі гвалту?

– асноўная прычына ўзнікнення дзяржавы – заваяванне аднаго племені другім;
– асноўная прычына ўзнікнення дзяржавы – гвалт адной часткі грамадства над другой;
– дзяржава ўзнікае ў той момант, калі пераможцы ў барацьбе пачынаюць шкадаваць жыццё скароных;
– дзяржава і права ўзнікаюць натуральным шляхам з дадзяржаўных утварэнняў;
– дзяржава ўзнікае з факту заваявання адной арды другой ардой.

Пытанне 98. Якія з адзначаных адметных рысаў уласцівы марксісцкай тэорыі паходжання дзяржавы і права?

– прычыны ўзнікнення дзяржавы і права крыюцца ў развіцці вытворчых адносін грамадства;
– дзяржава і права маюць класавы характар, таму што выражаюць і абараняюць інтарэсы эканамічна і палітычна пануючых класаў;
– дзяржаве і праву папярэднічае першабытнае грамадства;
– барацьба паміж класамі ёсць рухаючая сіла гісторыі;
– дзяржава і права ёсць асноўныя сродкі прымірэння класаў.

Пытанне 99. Хто з адзначаных аўтараў распрацоўваў марксісцкую тэорыю паходжання дзяржавы і права?

– Дзюрынг Я.;
– Энгельс Ф.;
– Кауцкі К.;
– Маркс К.;
– Ленін У.

Пытанне 100. У якой з тэорый паходжання дзяржавы і права найперш узнікае права, а дзяржава ствараецца для захавання і абароны права?

– у тэалагічнай тэорыі;
– у патрыярхальнай;
– у марксісцкай;
– у тэорыі гвалту;
– у арганічнай тэорыі.

ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ №2

Пытанне 1. Якія з адзначаных прымет уласцівы дзяржаве?

– наяўнасць асобнай эканамічнай і сацыяльнай сістэмы;
– наяўнасць улады і кіравання;
– наяўнасць асобнай публічнай улады;
– наяўнасць насельніцтва;
– наяўнасць тэрыторыі.

Пытанне 2. Якая з прымет дзяржавы ў канцэнтраванай форме ўтрымлівае ў сабе сутнасць дзяржавы?

– дзяржаўны суверэнітэт;
– сувязь дзяржаўнай улады з правам;
– асобная публічная ўлада;
– наяўнасць тэрыторыі і насельніцтва;
– асобны апарат кіравання і прымусу.

Пытанне 3. Якія з адзначаных рысаў характарызуюць сутнасць дзяржавы?

– дзяржава ўтрымлівае і стрымлівае супярэчнасці грамадства;
– стварае для вырашэння супярэчнасцей цывілізаваныя формы;
– дзяржава забяспечвае цэласнасць і адзінства грамадства;
– стварае ўмовы для самаразвіцця грамадства;
– дзяржава захоўвае мір і спакой у грамадстве.

Пытанне 4. Якія з інтарэсаў, што выражае і забяспечвае дзяржава, з'яўляюцца агульнасацыяльнымі?

– забеспячэнне тэрытарыяльнай цэласнасці і незалежнасці дзяржавы;
– абарона маламаёмасных слаёў насельніцтва;
– пераадоленне тэхнагенных катастроф і аварый;
– выражэнне інтарэсаў «сярэдніх слаёў» насельніцтва;
– ахова прыроды і «ўзнаўленне» прыродных рэсурсаў.

Пытанне 5. Якія з інтарэсаў, што выражае і забяспечвае дзяржава, з'яўляюцца «вузкласавымі»?

– забеспячэнне тэрытарыяльнай цэласнасці і незалежнасці дзяржавы;

– абарона маламаёмасных слаёў насельніцтва;
– пераадоленне тэхнагенных катастроф і аварый;
– выражэнне інтарэсаў «сярэдніх слаёў» насельніцтва;
– ахова прыроды і «ўзнаўленне» прыродных рэсурсаў.

Пытанне 6. Як суіснуюць у дзяржаве агульнасацыяльныя і «вузкакласавыя інтарэсы»?

– дзяржава аддае перавагу агульнасацыяльным інтарэсам;
– дзяржава заўсёды ажыццяўляе «вузкакласавыя інтарэсы»;
– дзяржава адначасова ажыццяўляе як агульнасацыяльныя, так і «вузкакласавыя інтарэсы»;
– дзяржава аддае перавагу вузкакласавым інтарэсам;
– дзяржава праводзіць у жыццё свае ўласныя інтарэсы.

Пытанне 7. Якія прыметы ўласцівы асобнай публічнай уладзе?

– яна з'яўляецца ў сацыяльна неаднародным грамадстве;
– яна ўласціва любой супольнасці і існуе вечна;
– публічная ўлада ўяўляе самастойны від чалавечай дзейнасці;
– яна ўзвышаецца над грамадствам;
– не супадае з інтарэсамі ўсяго грамадства.

Пытанне 8. Чаму асобная публічная ўлада ў сацыяльна неаднародным грамадстве з'яўляецца палітычнай уладай?

– таму што ажыццяўляе палітычнае кіраванне;
– яна вымушана ўлічваць разнастайныя інтарэсы грамадства;
– павінна балансаваць розныя інтарэсы, узважваць і ўзгадняць іх;
– яна ніколі не адпавядае інтарэсам усіх груп і слаёў насельніцтва;
– яна аддае перавагу тым ці іншым інтарэсам насельніцтва.

Пытанне 9. Чые інтарэсы ўвасабляе і абараняе дзяржаўная ўлада?

– патрэбы і інтарэсы тых, хто ажыццяўляе ўладу;
– інтарэсы толькі асобных груп людзей;
– толькі інтарэсы ўсяго грамадства;
– агульныя інтарэсы супольнасці і асобных груп насельніцтва;
– інтарэсы эканамічна і палітычна пануючых класаў.

Пытанне 10. Якім чынам суадносяцца паміж сабой паняцці сацыяльнай і публічнай улады?

– сацыяльная ўлада ёсць праява, разнавіднасць публічнай улады;
– публічная ўлада з'яўляецца відам сацыяльнай улады;
– сацыяльная ўлада па аб'ёму тоесна публічнай уладзе;
– публічная ўлада існуе незалежна ад сацыяльнай улады;
– сацыяльная ўлада ўздзейнічае на публічную ўладу.

Пытанне 11. Як суадносяцца паміж сабой паняцці публічнай і дзяржаўнай улады?

– дзяржаўная ўлада ёсць праява, разнавіднасць публічнай улады;
– публічная ўлада з'яўляецца відам дзяржаўнай улады;
– дзяржаўная ўлада па аб'ёму тоесна публічнай уладзе;
– публічная ўлада існуе незалежна ад дзяржаўнай улады;
– дзяржаўная ўлада ўздзейнічае на публічную ўладу.

Пытанне 12. Што азначае тэрмін «дзяржаўная ўлада»?

– асобную функцыю па кіраванню грамадствам;
– асобную разнавіднасць сацыяльнай і палітычнай улады;
– асобную разнавіднасць публічнай улады;
– асобную сістэму ўлады і кіравання;
– асобны апарат кіравання і ажыццяўлення ўлады.

Пытанне 13. Што азначае тэрмін «дзяржава»?

– асобную функцыю па кіраванню грамадствам;
– асобную разнавіднасць сацыяльнай і палітычнай улады;
– асобную разнавіднасць публічнай улады;
– асобную сістэму (сродак) арганізацыі ўлады і кіравання;
– асобны апарат кіравання і ажыццяўлення ўлады.

Пытанне 14. Якім чынам звязаны паміж сабой дзяржаўная ўлада і дзяржава?

– дзяржаўная ўлада ёсць праява і функцыя дзяржавы;
– дзяржава з'яўляецца праявай і функцыяй дзяржаўнай улады;
– дзяржаўная ўлада і дзяржава існуюць паралельна;
– дзяржаўная ўлада і дзяржава суадносяцца як функцыя і сродак;
– дзяржаўная ўлада і дзяржава існуюць незалежна адна ад другой.

Пытанне 15. Якімі прыметамі адрозніваецца дзяржаўная ўлада (дзяржава) ад іншых форм сацыяльнай (палітычнай) улады?

– выступае ад імя ўсёй супольнасці;
– манапольна валодае асобным апаратам кіравання і прымусу;
– манапольна валодае правам выдаваць законы (права);
– мае адметную эканамічную і сацыяльную сістэму;
– мае такую якасную ўласцівасць, як суверэнітэт.

Пытанне 16. Дзяржаўны суверэнітэт складаецца з наступных частак:

– з вяршэнства дзяржаўнай улады;
– сувязі дзяржавы з правам;
– самастойнасці дзяржаўнай улады;
– незалежнасці дзяржаўнай улады;
– з сувязі дзяржавы з апаратам прымусу.

Пытанне 17. Якія віды асобнай публічнай улады існуюць у дзяржаўна-арганізаваным грамадстве?

– дзяржаўная ўлада;
– бацькоўская ўлада;
– мацярынская ўлада;
– улада палітычных і непалітычных арганізацый;
– улада старэйшыны і военачальніка.

Пытанне 18. Тыпалогія развіцця дзяржавы дазваляе зрабіць наступнае:

– пабудаваць ідэальную дзяржаву;
– адкрыць і сфармуляваць сутнасць дзяржавы;
– уладкаваць і сістэматызаваць веды аб дзяржаве;
– даць азначэнне дзяржавы;
– набыць новыя веды і атрымаць новыя дадзеныя аб дзяржаве.

Пытанне 19. Якая з тыпалогій дзяржавы ўлічвае «чалавечае вымярэнне» развіцця дзяржавы?

– фармацыйная тыпалогія;
– цывілізацыйная тыпалогія;
– тыпалогія асобы;
– тыпалогія калектываў;
– асабіста-прававая тыпалогія.

Пытанне 20. На якіх падставах адбываецца аб'яднанне дзяржаў у пэўныя тыпы пры фармацыйнай тыпалогіі?

– у залежнасці ад грамадска-эканамічнай фармацыі;
– у залежнасці ад рэлігійных перакананняў насельніцтва;
– ад уплыву асобы на правапарадак;
– на падставе этнічнага складу насельніцтва;
– на падставе геаграфічных і прыродных фактараў.

Пытанне 21. На якіх падставах адбываецца аб'яднанне дзяржаў у пэўныя тыпы пры асабіста-прававой тыпалогіі?

– у залежнасці ад грамадска-эканамічнай фармацыі;
– у залежнасці ад рэлігійных перакананняў насельніцтва;
– ад уплыву асобы на правапарадак;
– на падставе этнічнага складу насельніцтва;
– на падставе геаграфічных і прыродных фактараў.

Пытанне 22. На якіх падставах адбываецца аб'яднанне дзяржаў у пэўныя тыпы пры цывілізацыйнай тыпалогіі?

– у залежнасці ад грамадска-эканамічнай фармацыі;
– у залежнасці ад рэлігійных перакананняў насельніцтва;
– ад уплыву асобы на правапарадак;
– на падставе этнічнага складу насельніцтва;
– на падставе геаграфічных і прыродных фактараў.

Пытанне 23. Матэрыялізацыя дзяржаўнай улады – гэта:

– выкарыстанне дзяржаўнай уладай матэрыяльных сродкаў і рэсурсаў;
– ажыццяўленне ўлады асобнай групай людзей;
– задавальненне дзяржаўнай уладай асабістых матэрыяльных патрэб;
– стварэнне асобных органаў і ўстаноў для ажыццяўлення ўлады;
– стварэння дзяржавай асобных матэрыяльных каштоўнасцей.

Пытанне 24. Выніковасць дзеяння асобнай публічнай (дзяржаўнай) улады залежыць ад:

– належнай арганізацыі вярхоўнай дзяржаўнай улады;
– належнага ажыццяўлення дзяржаўнай улады на тэрыторыі дзяржавы;

– спрыяльных прыродных (кліматычных) умоў;
– аптымальных сувязей вярхоўнай улады з насельніцтвам;
– наяўнасці добрасумленных людзей.

Пытанне 25. З якіх элементаў складаецца форма дзяржавы?

– формы праўлення;
– формы і памераў тэрыторыі дзяржавы;
– дзяржаўна-прававога рэжыму;
– формы дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання;
– палітыка-прававога рэжыму.

Пытанне 26. Якія з адзначаных бакоў (элементаў) формы дзяржавы характарызуе форма праўлення?

– дзеянне дзяржаўнай улады на тэрыторыі краіны;
– метады і прыёмы ўзаемасувязі паміж дзяржаўнай уладай і насельніцтвам;
– арганізацыю мясцовай улады у адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках;
– узаемасувязі паміж вярхоўнай уладай і мясцовымі ўладнымі структурамі;
– арганізацыю вярхоўнай дзяржаўнай улады, структуру вышэйшых органаў улады і іх узаемаадносіны.

Пытанне 27. Якія з бакоў (элементаў) формы дзяржавы характарызуе форма дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання?

– дзеянне дзяржаўнай улады на тэрыторыі краіны;
– метады і прыёмы ўзаемасувязі паміж дзяржаўнай уладай і насельніцтвам;
– арганізацыю мясцовай улады ў адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках;
– узаемасувязі паміж вярхоўнай уладай і мясцовымі ўладнымі структурамі;
– арганізацыю вярхоўнай дзяржаўнай улады, структуру вышэйшых органаў улады і іх ўзаемаадносіны.

Пытанне 28. Якія з бакоў (элементаў) формы дзяржавы характарызуе дзяржаўна-прававы рэжым?

– дзеянне дзяржаўнай улады на тэрыторыі краіны;
– метады і прыёмы ўзаемасувязі паміж дзяржаўнай уладай і насельніцтвам;

– арганізацыю мясцовай улады у адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках;
– узаемасувязі паміж вярхоўнай уладай і мясцовымі ўладнымі структурамі;
– арганізацыю вярхоўнай дзяржаўнай улады, структуру вышэйшых органаў улады і іх узаемаадносіны.

Пытанне 29. Хто з знакамітых філосафаў упершыню сістэматызаваў навуковыя ўяўленні аб форме праўлення?

– Платон;
– Арыстоцель;
– Цыцэрон;
– Палібій;
– Арыстарх.

Пытанне 30. Хто са знакамітых навукоўцаў удасканальваў вучэнне аб форме праўлення ў XIX ст.?

– Г. Вормс;
– Р. Моль;
– І.К. Блюнчлі;
– А. Прейс;
– А. Аляксееў.

Пытанне 31. Якія з форм праўлення Арыстоцель і Палібій лічылі правільнымі?

– алігархію;
– арыстакратыю;
– дэмакратыю;
– манархію;
– паліцыю.

Пытанне 32. Якія з форм праўлення Палібій і Арыстоцель адносілі да няправільных форм?

– алігархію;
– арыстакратыю;
– дэмакратыю;
– манархію;
– паліцыю.

Пытанне 33. Пры якіх умовах правільныя формы праўлення трансфармуюцца ў няправільныя?

– калі дзяржава развіваецца нестабільна;
– калі дзяржава з'яўляецца слабай у ваенных адносінах;
– калі ўладу ў дзяржаве не ажыццяўляе народ;
– калі ўлада ажыццяўляецца ў асабістых мэтах;
– калі ўладу ажыццяўляе адна асоба.

Пытанне 34. Якія формы праўлення звычайна выдзяляюцца ў сучаснай юрыдычнай навуцы?

– федэратыўная;
– манархічная;
– рэспубліканская;
– унітарная;
– асабістая.

Пытанне 35. Якія формы дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання звычайна выдзяляюцца ў сучаснай юрыдычнай навуцы?

– федэратыўная;
– манархічная;
– рэспубліканская;
– унітарная;
– асабістая.

Пытанне 36. Якія рысы ўласцівы манархічнай форме праўлення?

– вярхоўная ўлада звычайна перадаецца ў спадчыну;
– улада звычайна перыядычна перабіраецца;
– вярхоўную ўладу ажыццяўляюць некалькі органаў;
– вярхоўная ўлада звычайна ажыццяўляецца адной асобай;
– улада звычайна размяркоўваецца паміж асобнымі органамі.

Пытанне 37. Якія рысы ўласцівы рэспубліканскай форме праўлення?

– вярхоўная ўлада звычайна перадаецца ў спадчыну;
– улада звычайна перыядычна перабіраецца;
– вярхоўную ўладу ажыццяўляюць некалькі органаў;
– вярхоўная ўлада звычайна ажыццяўляецца адной асобай;
– улада звычайна размяркоўваецца паміж асобнымі органамі.

Пытанне 38. Якія з названых дзяржаў маюць манархічную форму праўлення?

– Англія;
– ФРГ;
– Нідэрланды;
– Індыя;
– Іспанія.

Пытанне 39. Якія з названых дзяржаў маюць рэспубліканскую форму праўлення?

– Англія;
– ФРГ;
– Нідэрланды;
– Індыя;
– Іспанія.

Пытанне 40. Якая форма праўлення ў Рэспубліцы Беларусь?

– парламентарная рэспубліка;
– парламентарная манархія;
– прэзідэнцкая рэспубліка;
– змешаная форма праўлення;
– манархія.

Пытанне 41. Якія рысы ўласцівы форме дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання?

– падзел тэрыторыі дзяржавы на нейкія адзінкі;
– перадача вяленняў вярхоўнай улады мясцовым органам;
– перадача вяленняў вярхоўнай улады насельніцтву;
– структура мясцовых органаў улады і кіравання;
– прававое становішча тэрытарыяльных адзінак.

Пытанне 42. Якія спосабы ажыццяўлення вярхоўнай дзяржаўнай улады на тэрыторыі дзяржавы Вы ведаеце?

– просты;
– змешаны;
– складаны;
– выбарны;
– спосаб прызначэння.

Пытанне 43. Якія рысы характарызуюць унітарную дзяржаву?

– аднолькавае прававое становішча тэрытарыяльных адзінак і органаў улады на месцы;
– рознае прававое становішча тэрытарыяльных адзінак і органаў улады на месцы;
– існаванне паміж вярхоўнай уладай і мясцовымі органамі «прамежкавых» уладных структур;
– адзіныя для дзяржавы органы заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады;
– тэрытарыяльныя адзінкі маюць права выхаду са складу дзяржавы.

Пытанне 44. Якія рысы характарызуюць федэратыўную дзяржаву?

– аднолькавае прававое становішча тэрытарыяльных адзнак і органаў улады на месцы;
– рознае прававое становішча тэрытарыяльных адзінак і органаў улады на месцы;
– у ім паміж вярхоўнай уладай і мясцовымі органамі існуюць прамежкавыя ўладныя структуры;
– адзіныя для дзяржавы органы заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады;
– тэрытарыяльныя адзінкі маюць права выхаду са складу дзяржавы.

Пытанне 45. Якія рысы характарызуюць канфедэратыўную дзяржаву?

– аднолькавае прававое становішча тэрытарыяльных адзінак і органаў улады на месцы;
– рознае прававое становішча тэрытарыяльных адзінак і органаў улады на месцы;
– у ім паміж вярхоўнай уладай і мясцовымі органамі існуюць прамежкавыя ўладныя структуры;
– адзіныя для дзяржавы органы заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады;
– тэрытарыяльныя адзінкі маюць права выхаду са складу дзяржавы.

Пытанне 46. Якія з названых дзяржаў з'яўляюцца унітарнымі?

– Іспанія;
– Рэспубліка Беларусь;

– Індыя;
– Польшча;
– Германія.

Пытанне 47. Якія з названых дзяржаў з'яўляюцца федэрацыямі?

– Іспанія;
– Рэспубліка Беларусь;
– Індыя;
– Польшча;
– Германія.

Пытанне 48. Якія з названых дзяржаў можна аднесці да канфэдэрацыі?

– Злучаныя Штаты Амерыкі;
– Швейцарыя;
– Аб'яднаная Арабская Рэспубліка;
– Расійская Федэрацыя;
– Федэратыўная Рэспубліка Германія.

Пытанне 49. Якія з адзначаных момантаў характарызуюць уздзеянне дзяржаўнай улады на грамадства?

– дзеянне толькі ў межах прававога поля;
– прававыя прыёмы і сродкі арганізацыі і ажыццяўлення ўлады;
– выкарыстанне палітычных і маральных сродкаў дзеяння;
– прынцып «дазволена ўсё, што не забаронена»;
– прынцып «дазволена толькі тое, што дазволена».

Пытанне 50. Якія з адзначаных момантаў характарызуюць уплыў насельніцтва на дзяржаўную ўладу?

– дзеянне толькі ў межах прававога поля;
– прававыя прыёмы і сродкі арганізацыі і ажыццяўлення ўлады;
– выкарыстанне палітычных і маральных сродкаў дзеяння;
– прынцып «дазволена ўсё, што не забаронена»;
– прынцып «дазволена толькі тое, што дазволена».

Пытанне 50. Якія віды дзяржаўна-прававога рэжыму Вы ведаеце?

– аўтакратычны;
– аўтарытарны;

– дэмакратычны;
– таталітарны;
– грамадзянскі.

Пытанне 51. Якія віды палітыка-прававога рэжыму Вы ведаеце?

– аўтакратычны;
– аўтарытарны;
– дэмакратычны;
– таталітарны;
– грамадзянскі.

Пытанне 52. Як суадносяцца паміж сабой палітыка-прававы і дзяржаўна-прававы рэжымы?

– палітыка-прававы рэжым – частка дзяржаўна-прававога рэжыму;
– дзяржаўна-прававы рэжым – частка палітыка-прававога рэжыму;
– палітыка-прававы рэжым – ядро дзяржаўна-прававога рэжыму;
– палітыка-прававы і дзяржаўна-прававы рэжым перасякаюцца;
– дзяржаўна-прававы рэжым – ядро палітыка-прававога рэжыму.

Пытанне 53. Адносная самастойнасць дзяржаўнай улады – гэта:

– незалежнасць дзяржавы ад грамадства;
– самастойнасць віду працы па яе ажыццяўленню;
– магчымасць выбару напрамкаў і сродкаў развіцця;
– задавальненне дзяржавай сваіх асабістых інтарэсаў;
– адноснае ўздеянне дзяржавы на грамадства.

Пытанне 54. Паняцце і азначэнне функцый дзяржавы патрабуе:

– разумення ўнутраных і знешніх патрэб грамадства і дзяржавы;
– уключае мэты і задачы дзяржавы;
– дзеянне дзяржавы па дасягненню мэт і выкананню задач;
– асноўныя накірункі дзеяння дзяржавы;
– матэрыяльна-фінансавыя рэсурсы і сродкі дзяржавы.

Пытанне 55. Аб асобнай, самастойнай функцыі дзяржавы сведчыць:

– наяўнасць самастойнай сферы грамадскіх адносін;
– асноўны напрамак дзеяння дзяржавы ў дадзенай сферы грамадства;

– устойлівасць дзеяння дзяржавы ў пэўнай сферы;
– асобная сістэма органаў улады для ажыццяўлення пэўнай дзейнасці;
– урэгуляванасць дадзенай сферы грамадскіх адносін правам.

Пытанне 56. Функцыі дзяржавы можна класіфікаваць на:

– унутраныя і знешнія;
– палітычныя і непалітычныя;
– галоўныя і дадатковыя;
– вечныя і часовыя;
– фінансавыя і арганізацыйныя.

Пытанне 57. Якія з адзначаных рысаў характарызуюць адзінства функцый дзяржавы?

– унутраныя функцыі ўздзейнічаюць на знешнія;
– гэта два самастойныя і назалежныя віды функцый;
– знешнія функцыі ўплываюць на ўнутраныя;
– унутраныя функцыі перасякаюцца са знешнімі;
– яны ўзмацняюць грамадства і дзяржаву.

Пытанне 58. Якія з адзначаных функцый дзяржавы адносяцца да ўнутраных?

– функцыя супрацоўніцтва;
– эканамічная;
– прыродарэсурсавая;
– экспансіі;
– ідэалагічная.

Пытанне 59. Якія з адзначаных функцый дзяржавы адносяцца да знешніх?

– функцыя супрацоўніцтва;
– эканамічная;
– прыродарэсурсавая;
– экспансіі;
– ідэалагічная.

Пытанне 60. Чым істотна адрозніваюцца паміж сабой эканамічная, ідэалагічная, палітычная і ідэалагічная функцыі дзяржавы?

– скіраванасцю дзейнасці дзяржавы;
– часам уздзеяння дзяржавы на грамадскія адносіны;
– сферамі ўздзеяння дзяржавы;

– механізмамі прававога рэгулявання;
– падзелам па іх значнасці.

Пытанне 61. Дзяржава выконвае эканамічную функцыю шляхам:

– распрацоўкі эканамічнай палітыкі, праграм эканамічнага развіцця;
– праз дзяржаўную ўласнасць;
– фінансавання эканамічных праектаў і праграм;
– праз прававое рэгуляванне эканамічных працэсаў;
– з дапамогай падаткаў і крэдытаў.

Пытанне 62. Сацыяльная функцыя дзяржавы скіравана на тое, каб:

– уздзейнічаць на дэмаграфічныя праблемы ў грамадстве;
– забяспечыць інтарэсы маламаёмасных слаёў насельніцтва;
– захаваць сацыяльны мір і спакой у грамадстве;
– вырашыць усе сацыяльныя праблемы;
– стварыць формы і сродкі вырашэння сацыяльных праблем.

Пытанне 63. Якая з унутраных функцый дзяржавы з'яўляецца самай значнай?

– эканамічная;
– палітычная;
– сацыяльная;
– ідэалагічная;
– прыродарэсурсавая.

Пытанне 64. Ідэалагічная функцыя дзяржавы ажыццяўляецца шляхам:

– распрацоўкі дзяржаўнай ідэалогіі;
– правядзення ідэалагічных мерапрыемстваў;
– забароны іншых відаў ідэалогіі;
– дэідэалагізацыі дзяржавы;
– ідэалагічнай асветы і ідэалагічнага выхавання.

Пытанне 65. Пры ажыццяўленні прыродарэсурсавай функцыі дзяржава:

– узнаўляе прыродныя рэсурсы;
– звычайна валодае правам уласнасці на прыродныя рэсурсы;
– непасрэдна ўздзейнічае на прыроду;
– ахоўвае прыроднае асяроддзе;
– устанаўлівае парадак выкарыстання прыродных рэсурсаў.

Пытанне 66. Незалежнасць і самаразвіццё грамадства і дзяржавы забяспечваецца найперш праз выкананне:

– ідэалагічнай функцыі;
– функцыі экспансіі;
– функцыі забеспячэння бяспекі;
– палітычнай функцыі;
– прыродарэсурсавай функцыі.

Пытанне 67. Забеспячэнне дзяржавай сваіх інтарэсаў на тэрыторыі іншых дзяржаў ажыццяўляецца з дапамогай:

– ідэалагічнай функцыі;
– функцыі экспансіі;
– функцыі абароны краіны;
– палітычнай функцыі;
– прыродарэсурсавай функцыі.

Пытанне 68. Пад функцыяй экспансіі можна разумець:

– распрацоўку дзяржаўнай ідэалогіі;
– пранікненне дзяржавы на тэрыторыю іншых дзяржаў;
– палітычную прапаганду сярод насельніцтва;
– ажыццяўленне прыродаахоўных мерапрыемстваў;
– разнастайныя мерапрыемствы абарончага характару.

Пытанне 69. Функцыя забеспячэння бяспекі дзяржавы і грамадства ажыццяўляецца праз:

– ваенную арганізацыю дзяржавы, яе войска;
– распрацоўку эканамічных, палітычных і сацыяльных праграм;
– забеспячэнне эканамічнай, фінансавай і інфармацыйнай бяспекі;
– прыродаахоўныя мерапрыемствы;
– забеспячэнне энергетычнай бяспекі.

Пытанне 70. Якія з адзначаных функцый беларускай дзяржавы з'яўляюцца пастаяннымі?

– эканамічная;
– інтэграцыі;
– палітычная;
– сацыяльная;
– ідэалагічная.

Пытанне 71. Якія з адзначаных функцый беларускай дзяржавы з'яўляюцца часовымі?

– эканамічная;
– інтэграцыі;
– палітычная;
– сацыяльная;
– ідэалагічная.

Пытанне 72. Эвалюцыя знешніх функцый дзяржавы адбывалася шляхам:

– перамен у іх сутнасці і змесце;
– перамен у сродках і метадах ажыццяўлення;
– змен у накірунках дзеяння дзяржавы;
– змен іх значнасці і важнасці;
– з'яўлення прынцыпова новых функцый.

Пытанне 73. Якія з названых форм ажыццяўлення функцый дзяржавы адносяцца да ліку арганізацыйна-прававых форм?

– кантрольная;
– нормастваральная;
– правапрымяняльная;
– судовая;
– праваахоўная.

Пытанне 74. Якія з названых арганізацыйна-прававых форм ажыццяўлення функцый адносяцца да універсальных?

– кантрольная;
– нормастваральная;
– правапрымяняльная;
– судовая;
– праваахоўная.

Пытанне 75. Якія з названых метадаў прававога ўздзеяння выкарыстоўваюцца пры ажыццяўленні функцый дзяржавы?

– прававога заахвочвання;
– прававога кантролю;
– прававога выхавання;
– прававога прымусу;
– прававой прапаганды.

Пытанне 76. Якая якасць, складовая частка дзяржавы з'яўляецца «матэрыялізаванай часткай дзяржавы»?

– асобная публічная ўлада;
– палітычная ўлада;
– дзяржаўная ўлада;
– апарат дзяржавы;
– тэрыторыя дзяржавы.

Пытанне 77. Для апарату дзяржавы ўласцівы наступныя прыметы:

– складаецца з сістэмы органаў, арганізацый і ўстаноў;
– органы дзейнічаюць ад імя грамадства і дзяржавы;
– апарат функцыянуе на грамадскіх пачатках;
– органы валодаюць уладнымі паўнамоцтвамі;
– яны пабудаваны на прынцыпах іерархіі і субардынацыі.

Пытанне 78. Рухаючай сілай апарату дзяржавы з'яўляюцца:

– органы дзяржавы;
– арганізацыі і ўстановы дзяржавы;
– дзяржаўныя служачыя;
– матэрыяльныя і фінансавыя сродкі;
– органы ажыццяўлення прымусу.

Пытанне 79. Як суадносяцца паміж сабой функцыі і апарат дзяржавы?

– функцыі ажыццяўляюцца праз апарат дзяржавы;
– апарат дзяржавы ўплывае на змест функцый дзяржавы;
– функцыі дзяржавы вызначаюць структуру апарату;
– апарат дзяржавы вызначае функцыі дзяржавы;
– функцыі і апарат дзяржавы шчыльна ўзаемазвязаны.

Пытанне 80. Як суадносяцца паміж сабой паняцці апарату і механізма дзяржавы?

– яны абазначаюць адну і тую ж рэальнасць;
– апарат дзяржавы ўключае механізм дзяржавы;
– механізм дзяржавы ўключае апарат дзяржавы;
– апарат абазначае структуру дзяржаўнай улады;
– механізм дзяржавы абазначае функцыянаванне дзяржавы.

Пытанне 81. Як суадносяцца паміж сабой паняцці дзяржаўнага апарату і апарату дзяржавы?

– яны розныя па аб'ёму і функцыянальнай прыналежнасці;
– дзяржаўны апарат уключае апарат дзяржавы;

– апарат дзяржавы перасякаецца з дзяржаўным апаратам;
– апарат дзяржавы ўключае дзяржаўны апарат;
– гэта тоесныя па аб'ёму і прызначэнню паняцці.

Пытанне 82. Як змяняўся апарат дзяржавы?

– ускладняўся;
– мяняўся ў адпаведнасці з задачамі і функцыямі дзяржавы;
– спрашчаўся і памяншаўся;
– заставаўся нязменным;
– павялічваўся.

Пытанне 83. Якія фактары аказвалі ўплыў на развіццё апарату дзяржавы?

– аб'ём вырашаемых дзяржавай праблем і задач;
– прыродна-геаграфічны фактар;
– дзяржаўна-тэрытарыяльнае ўладкаванне;
– унутранае становішча грамадства і дзяржавы;
– знешнія абставіны.

Пытанне 84. З якіх кампанентаў (элементаў) складаецца апарат дзяржавы?

– з органаў дзяржавы;
– з насельніцтва;
– з арганізацый і ўстаноў;
– з тэрыторыі;
– з асобнай публічнай улады.

Пытанне 85. Якія прыметы ўласцівы органу дзяржавы?

– дзейнічае ад імя дзяржавы;
– мае ўладныя паўнамоцтвы (кампетэнцыю);
– мае штат і арганізацыйную структуру;
– з'яўляецца юрыдычнай асобай;
– пабудаваны на грамадскіх пачатках.

Пытанне 86. Якія з названых органаў улады ўваходзяць у склад апарату дзяржавы ва ўласным сэнсе слова?

– парламент;
– урад;
– пракуратура;

– натарыяльная кантора;
– паліцыя.

Пытанне 87. Якія з названых органаў улады ўваходзяць у склад апарату прымусу?

– парламент;
– урад;
– пракуратура;
– натарыяльная кантора;
– паліцыя.

Пытанне 88. Якія з названых органаў улады ўваходзяць у склад дзяржаўных устаноў?

– парламент;
– урад;
– пракуратура;
– натарыяльная кантора;
– паліцыя.

*Пытанне 89. «*Матэрыяльныя прыдаткі» апарату дзяржавы – гэта:

– дзяржаўныя банкі і і іншыя фінансавыя ўстановы;
– сродкі транспарту, сувязі і ўзбраення;
– турмы і іншыя месцы пазбаўлення волі;
– дзяржаўная казна, золатавалютны запас дзяржавы;
– дзяржаўныя ўстановы.

Пытанне 90. Органы дзяржавы ў залежнасці ад падзелу ўлад класіфікуюцца на:

– заканадаўчыя органы;
– выканаўчыя і распарадчыя органы;
– знешнепалітычныя;
– кантрольна-надзорныя органы;
– органы судовай улады.

Пытанне 91. Каардынуючую ўладу ў сучасных дзяржавах часцей за ўсё ажыццяўляюць:

– органы заканадаўчай улады;
– прэзідэнт краіны;
– урад краіны;

– органы судовай улады;
– органы пракуратуры.

Пытанне 92. На якія з відаў падзяляюцца органы дзяржавы згодна з будовай кіраўнічай дзейнасці?

– прадстаўнічыя органы дзяржавы;
– выканаўчыя і распарадчыя органы;
– праваахоўныя органы;
– кантрольна-надзорныя органы;
– каардынуючыя органы дзяржавы.

Пытанне 93. Органы дзяржавы па парадку стварэння падзяляюцца на:

– прызначаемыя;
– мясцовыя;
– выбіраемыя;
– кантрольныя;
– цэнтральныя.

Пытанне 94. Органы дзяржавы па парадку выпрацоўкі і прыняцця рашэнняў падзяляюцца на:

– калегіяльныя;
– калектыўныя;
– аднаасобныя;
– адзінаначальныя;
– кантрольныя.

Пытанне 95. Органы дзяржавы па часу дзеяння падзяляюцца на:

– пастаянныя;
– прадстаўнічыя;
– надзвычайныя;
– часовыя;
– сталыя.

Пытанне 96. Па аб'ёму кампетэнцыі органы дзяржавы класіфікуюцца на:

– цэнтральныя;
– мясцовыя;
– агульныя;

– галіновыя;
– спецыяльныя.

Пытанне 97. Па тэрыторыі дзеяння органы дзяржавы падзяляюцца на:

– цэнтральныя;
– мясцовыя;
– агульныя;
– галіновыя;
– спецыяльныя.

Пытанне 98. Прынцыпы арганізацыі і дзеяння апарату дзяржавы – гэта:

– патрабаванні да апарату дзяржавы;
– ідэі, на якіх арганізуецца і функцыянуе апарат дзяржавы;
– арганізацыйна-прававыя формы апарату дзяржавы;
– адметныя асаблівасці апарату дзяржавы;
– патрабаванні насельніцтва да апарату.

Пытанне 99. Да прынцыпаў арганізацыі і дзейнасці апарату дзяржавы адносяцца:

– прынцып дэмакратызму;
– прынцып прафесіяналізму і кампетэнтнасці;
– прынцып прагназавання і планавасці;
– прынцып галоснасці;
– прынцып законнасці.

Пытанне 100. Дзяржаўная служба – гэта:

– прынцып арганізацыі і дзеяння апарату дзяржавы;
– самастойны сацыяльны інстытут;
– дзяржаўна-прававы інстытут;
– асобны від грамадска-карыснай працы;
– праца насельніцтва ў інтарэсах дзяржавы.

Пытанне 101. Эфектыўнымі сродкамі барацьбы з бюракратызмам з'яўляюцца:

– дэмакратызацыя апарату дзяржавы;
– умацаванне дысцыпліны;
– фармалізм у працы служачых;
– галоснасць у дзейнасці апарату дзяржавы;
– кантроль за дзейнасцю апарату дзяржавы.

ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ №3

Пытанне 1. Якія рысы ўласцівы сістэме нарматыўнага рэгулявання?

– яна складваецца з асобных відаў правіл паводзін;
– правілы паводзін рэгулююць розныя пласты адносін;
– усе віды правіл паводзін мяняюцца са зменамі ў грамадстве;
– сістэма рэгулявання застаецца заўсёды нязменнай;
– мяняюцца толькі асобныя віды правіл паводзін.

Пытанне 2. Якія змены ў сістэме нарматыўнага рэгулявання адбываюцца пасля з'яўлення права?

– сістэма нарматыўнага рэгулявання застаецца ранейшай;
– яна дапаўняецца прававымі эквівалентамі (нормамі права);
– яна знікае і застаецца толькі права;
– старая сістэма развальваецца і ўзнікае новая сістэма;
– права стварае цалкам самастойную сістэму рэгулявання.

Пытанне 3. Якое месца займае права ў сістэме нарматыўнага рэгулявання грамадскіх адносін?

– права арганічна дапаўняе сістэму нарматыўнага рэгулявання;
– права з'яўляецца дадатковым відам нарматыўнага рэгулявання;
– яно знаходзіцца на перыферыі нарматыўнага рэгулявання;
– права падпарадкавана іншым відам правіл паводзін;
– права з'яўляецца галоўнай часткай нарматыўнага рэгулявання.

Пытанне 4. Якія грамадскія адносіны рэгулююцца менавіта правам?

– маральныя адносіны;
– вытворчыя адносіны;
– таварна-грашовыя адносіны;
– адносіны, якія заснаваны на эквівалентных пачатках;
– адносіны па абмену і размеркаванню каштоўнасцей.

Пытанне 5. Якімі сродкамі права ўздзейнічае на рэгулюемыя грамадскія адносіны?

– права прыстасоўвае сродкі, якія ўласцівы іншым правілам паводзін;
– у праве існуюць свае адметныя прыёмы і сродкі;

– права складаецца з суразмерных адносінам эквівалентаў;
– эквіваленты ў праве адэкватны рэгулюемым адносінам;
– прававыя эквіваленты замацоўваюцца ў нормах права.

Пытанне 6. Якім чынам ствараюцца прававыя эквіваленты?

– запазычваюцца ад іншых відаў правіл паводзін;
– бяруцца наўпрост з грамадскіх адносін;
– ствараюцца якасна новыя, невядомыя раней эквіваленты;
– прававыя эквіваленты ствараюцца адвольна;
– існуюць вечна.

Пытанне 7. У якіх формах існуе права?

– у выглядзе нарматыўнай часткі;
– у форме прававой свядомасці;
– у форме маральнай свядомасці;
– у форме прававых грамадскіх адносін;
– як пачуццё права.

Пытанне 8. Якая сфера грамадскіх адносін наўпрост абумоўлівае развіццё права?

– вытворчыя адносіны;
– этычныя адносіны;
– таварна-грашовыя адносіны;
– усе віды грамадскіх адносін;
– навуковыя адносіны.

Пытанне 9. Якія з адзначаных форм характэрны для развіцця права?

– права пашырае поле свайго дзеяння;
– поле дзеяння права звужаецца;
– павелічэнне колькасці норм права;
– памяншэнне колькасці норм права;
– поле права застаецца нязменным.

Пытанне 10. Якія змены ў сістэме нарматыўных рэгулятараў адбываюцца пасля ўзнікнення права?

– права падпарадкоўвае сабе ўсе іншыя правілы паводзін;
– яно пастаянна пашырае поле свайго дзеяння;
– права імкнецца забараніць усе астатнія віды правіл;

– права падпарадкоўваецца іншым правілам паводзін;
– права заўсёды займае асобную нішу.

Пытанне 11. Права развіваецца такім чынам, што:

– адбываецца абнаўленне ў праве;
– яно заўсёды старэе;
– назіраецца пераемнасць у праве;
– у праве адбываюцца рэгрэсіўныя з'явы;
– адбываюцца працэсы рэцэпцыі.

Пытанне 12. Пад рэцэпцыяй у праве разумеецца:

– пераемнасць у праве;
– запазычанне прававых норм і інстытутаў;
– абнаўленне ў праве;
– пастаянныя змены ў праве;
– старэнне норм права.

Пытанне 13. Прынцып права характарызуецца тым, што:

– з'яўляецца фундаментальнай ідэяй аб праве;
– у ім адлюстроўваецца сутнасць права;
– прынцыпы права заўсёды замацоўваюцца ў законе;
– не ўсе прынцыпы знаходзяць замацаванне ў законе;
– прынцыпы права існуюць самі па сабе.

Пытанне 14. Якія з адзначаных прававых рэальнасцей з'яўляюцца прынцыпамі права?

– адзінства праў і абавязкаў;
– гуманізм;
– фармальная роўнасць бакоў;
– дэмакратызм;
– адказнасць за віну.

Пытанне 15. Які з адзначаных прынцыпаў права патрабуе спалучэння праў і абавязкаў?

– прынцып фармальнай роўнасці;
– прынцып спалучэння пераканання і прымусу;
– прынцып адзінства праў і абавязкаў;
– прынцып фармальнай роўнасці бакоў;
– прынцып адказнасці за віну.

Пытанне 16. Які з адзначаных прынцыпаў права патрабуе захавання свабоды волі суб'ектаў прававых адносін?

– прынцып адзінства праў і абавязкаў
– прынцып фармальнай роўнасці бакоў;
– прынцып усеагульнай фармальнай роўнасці;
– прынцып спалучэння пераканання і прымусу;
– прынцып адказнасці за віну.

Пытанне 17. Якія ўласцівасці характэрны для аксіём права?

– гэта фундаментальныя ідэі аб праве;
– гэта звычаёвыя нормы;
– гэта элементарныя палажэнні прававога характару;
– гэта праверaныя вопытам прававыя правілы;
– гэта самыя элементарныя нормы права.

Пытанне 18. Пад функцыямі права разумеюцца:

– самыя характэрныя рысы права;
– асноўныя напрамкі ўздзеяння права на адносіны;
– асноўныя якасці права;
– асноватворныя нормы права;
– адметнасці права.

Пытанне 19. Якія з адзначаных функцый характарызуюць адносіны права да грамадства?

– рэгулятыўна-статычная;
– арганізацыйная;
– ахоўная;
– рэгулятыўна-дынамічная;
– інфармацыйная.

Пытанне 20. Якія з адзначаных функцый характарызуюць адносіны права да дзяржавы?

– рэгулятыўна-статычная;
– арганізацыйная;
– ахоўная;
– рэгулятыўна-дынамічная;
– інфармацыйная.

Пытанне 21. Якія з адзначаных функцый характарызуюць адносіны права да асобы?

– рэгулятыўна-статычная;
– арганізацыйная;
– ахоўная;
– рэгулятыўна-дынамічная;
– інфармацыйная.

Пытанне 22. Празмерныя спадзяванні на права называюцца:

– прававым нігілізмам;
– прававым фетышызмам;
– прававым ідэалізмам;
– прававой ілюзіяй;
– прававой прапагандай.

Пытанне 23. Адмоўнае стаўленне да права, прыніжэнне яго ролі называецца:

– прававым нігілізмам;
– прававым фетышызмам;
– прававым ідэалізмам;
– прававой ілюзіяй;
– прававой прапагандай.

Пытанне 24. Пры ўздзеянні на грамадскія адносіны права:

– разбурае грамадскія адносіны;
– права кансервуе грамадскія адносіны;
– права ўдасканальвае грамадскія адносіны;
– стабілізуе грамадскія адносіны;
– забараняе грамадскія адносіны.

Пытанне 25. Прававая сістэма – гэта:

– разгорнутая сутнасць права;
– яна ўключае ў сябе нормы права і крыніцы права;
– у прававую сістэму ўключаюцца грамадскія адносіны;
– прававая свядомасць – элемент прававой сістэмы;
– працэсы рэалізацыі і прымянення права.

Пытанне 26. У якой з прававых сем'яў асноўнай крыніцай права з'яўляецца свяшчэннае пісанне?

– рамана-германскай прававой сям'і;
– англасаксонскай прававой сям'і;
– скандынаўскай прававой сям'і;
– іўдзейскай прававой сістэме;
– мусульманскай прававой сям'і.

Пытанне 27. У якой з прававых сем'яў асноўнай крыніцай права з'яўляецца прававы прэцэдэнт?

– рамана-германскай прававой сям'і;
– англасаксонскай прававой сям'і;
– скандынаўскай прававой сям'і;
– іўдзейскай прававой сістэме;
– мусульманскай прававой сям'і.

Пытанне 28. Для якой прававой сям'і адносіцца прававая сістэма Рэспублікі Беларусь?

– рамана-германскай прававой сям'і;
– англасаксонскай прававой сям'і;
– скандынаўскай прававой сям'і;
– іўдзейскай прававой сістэме;
– мусульманскай прававой сям'і.

Пытанне 29. Якія з адзначаных прымет ўласцівы норме права?

– агульны характар;
– абгрунтаваны характар;
– фіктыўны характар;
– рэальны характар;
– фармальна азначаны характар.

Пытанне 30. Якая з прымет норм права грунтуецца на паўтараемасці тыповых сацыяльных сувязей?

– абстрактны характар;
– фармальна-азначаны характар;
– агульны характар;
– прадстаўніча-абавязваючы характар;
– рэальны характар.

Пытанне 31. Якая з адзначаных прымет характарызуе дакладнасць, яснасць і аднастайнасць у акрэсліванні праў і абавязкаў суб'ектаў права?

– абстрактны характар;
– фармальна-азначаны характар;
– агульны характар;
– прадстаўніча-абавязваючы характар;
– абарона з боку дзяржавы.

Пытанне 32. Якія часткі выдзяляюцца ў змесце нормы права?

– сацыяльная;
– рэальная;
– інтэлектуальна-псіхалагічная;
– юрыдычна-валявая;
– навуковая.

Пытанне 33. У якой з частак зместу нормы права ўвасабляюцца тыповыя жыццёвыя сітуацыі?

– сацыяльная;
– рэальная;
– інтэлектуальна-псіхалагічная;
– юрыдычна-валявая;
– навуковая.

Пытанне 34. У якой з частак зместу нормы права замацоўваецца правіла паводзін?

– сацыяльная;
– рэальная;
– інтэлектуальна-псіхалагічная;
– юрыдычна-валявая;
– навуковая.

Пытанне 35. У якой з частак зместу нормы права выражаецца ўсведамленне правіл паводзін як заканамерных, справядлівых, правільных, прававых?

– сацыяльная;
– рэальная;
– інтэлектуальна-псіхалагічная;
– юрыдычна-валявая;
– навуковая.

Пытанне 36. Для якой з адзначаных прававых сем'яў характэрна фармаванне норм права «знізу–уверх»?

– кантынентальнай;
– англасаксонскай;
– традыцыйнай;
– скандынаўскай;
– мусульманскай.

Пытанне 37. Для якой з адзначаных прававых сем'яў характэрна фармаванне норм права «зверху–уніз»?

– кантынентальнай;
– англасаксонскай;
– традыцыйнай;
– скандынаўскай;
– мусульманскай.

Пытанне 38. Якія з адзначаных элементаў (частак) у будове нормы права выдзяляў Г. Блэкстан?

– аб'яўляльную;
– абвінаўчую;
– загадвальную;
– садзейнічаючую;
– пакаральную.

Пытанне 39. Якія з адзначаных элементаў (частак) у будове нормы права выдзялялі нямецкія навукоўцы?

– дыспазіцыя;
– абвінавачванне;
– санкцыя;
– гармонія;
– гіпотэза.

Пытанне 40. Якую з традыцый у будове (структуры) нормы ўспрыняла айчынная юрыдычная навука?

– нямецкую;
– заходнееўрапейскую;
– французскую;
– англійскую;
– амерыканскую.

Пытанне 41. Якія з адзначаных груп (відаў) норм права забяспечваюць непасрэдны ўплыў іншых норм права на грамадскія адносіны?

– нормы-прадпісанні;
– зыходныя нормы;
– калізіённыя нормы;
– нормы-прынцыпы;
– дэфінітыўныя нормы.

Пытанне 42. Якія з адзначаных норм права наўпрост уздзейнічаюць на грамадскія адносіны і надзяляюць іх удзельнікаў правамі і абавязкамі?

– нормы-прадпісанні;
– зыходныя нормы;
– калізіённыя нормы;
– нормы-прынцыпы;
– дэфінітыўныя нормы.

Пытанне 43. Якія з адзначаных норм права фармулююць агульныя нарматыўныя палажэнні, мэты і задачы прававога рэгулявання, азначэнні прававых паняццяў?

– нормы-прадпісанні;
– зыходныя нормы;
– калізіённыя нормы;
– нормы-прынцыпы;
– дэфінітыўныя нормы.

Пытанне 44. Якія з адзначаных відаў норм права выдзяляюцца па часу дзеяння?

– вечныя;
– мясцовыя;
– пастаянныя;
– лакальныя;
– часовыя.

Пытанне 45. Якія з адзначаных відаў норм права выдзяляюцца па тэрыторыі дзеяння?

– вечныя;
– мясцовыя;

– пастаянныя;
– лакальныя;
– часовыя.

Пытанне 46. Якія з адзначаных відаў норм права адносяцца да зыходных норм права?

– дэфінітыўныя;
– дэфектыўныя;
– аператыўныя;
– аперацыйныя;
– калізіённыя.

Пытанне 47. Якія з адзначаных норм права ўтрымліваюць азначэнні паняццяў?

– дэфінітыўныя;
– нормы-прынцыпы;
– нормы-задачы;
– аператыўныя;
– калізіённыя.

Пытанне 48. З дапамогай якіх норм права адбываецца вырашэнне разнастайных супярэчнасцей паміж нормамі права?

– дэфінітыўныя;
– нормы-прынцыпы;
– нормы-задачы;
– аператыўныя;
– калізіённыя.

Пытанне 49. На якія групы падзяляюцца нормы-прадпісанні ў адпаведнасці з характарам рэгулюемых адносін?

– матэрыяльныя;
– імператыўныя;
– дыспазітыўныя;
– працэсуальныя;
– абавязваючыя.

Пытанне 50. Якія з адзначаных норм права падзяляюцца на падставе метаду ўздзеяння на грамадскія адносіны?

– матэрыяльныя;
– імператыўныя;

– дыспазітыўныя;
– працэсуальныя;
– абавязваючыя.

Пытанне 51. Якія з адзначаных норм выдзяляюцца па характару прадпісанняў?

– матэрыяльныя;
– імператыўныя;
– дыспазітыўныя;
– працэсуальныя;
– абавязваючыя.

Пытанне 52. Якія з адзначаных спосабаў выкарыстоўваюцца пры выкладанні норм права ў тэкстах крыніц права?

– прамы (поўны);
– ссылачны;
– адсылачны;
– бланкетны;
– дапаўняльны.

Пытанне 53. Пры якім з адзначаных спосабаў выкладання норм права ў тэксце крыніц права выкладаюцца поўнасцю ўсе элементы нормы?

– прамы (поўны);
– ссылачны;
– адсылачны;
– бланкетны;
– дапаўняльны.

Пытанне 54. Пры якім з адзначаных спосабаў выкладання норм права ў тэксце крыніц права робяцца спасылкі на іншыя крыніцы права?

– прамы (поўны);
– ссылачны;
– адсылачны;
– бланкетны;
– дапаўняльны.

Пытанне 55. Якія з акрэсленых спосабаў вымярэння эфектыўнасці норм права Вы ведаеце?

– спецыяльная эфектыўнасць норм права;
– сацыяльная эфектыўнасць норм права;
– юрыдычная эфектыўнасць норм права;
– юрысдыкцыйная эфектыўнасць норм права;
– юстыцыённая эфектыўнасць норм права.

Пытанне 56. Які з акрэсленых спосабаў вымярэння эфектыўнасці норм права дазваляе высветліць адпаведнасць паводзін суб'ектаў прадпісанням норм права?

– спецыяльная эфектыўнасць норм права;
– сацыяльная эфектыўнасць норм права;
– юрыдычная эфектыўнасць норм права;
– юрысдыкцыйная эфектыўнасць норм права;
– юстыцыённая эфектыўнасць норм права.

Пытанне 57. Які з акрэсленых спосабаў вымярэння эфектыўнасці норм права дазваляе ўсталяваць залежнасці паміж нормамі права і сацыяльнымі мэтамі?

– спецыяльная эфектыўнасць норм права;
– сацыяльная эфектыўнасць норм права;
– юрыдычная эфектыўнасць норм права;
– юрысдыкцыйная эфектыўнасць норм права;
– юстыцыённая эфектыўнасць норм права.

Пытанне 58. Які з акрэсленых помнікаў права Ціт Лівій лічыў крыніцай рымскага дзяржаўнага і грамадзянскага права?

– Дыгесты Юсцініана;
– Кодекс Юсцініяна;
– Законы XII табліц;
– Законы Ману;
– Кодэкс Гая.

Пытанне 59. Якія з адзначаных сацыяльна-прававых рэальнасцей абазначаюць у юрыдычнай літаратуры тэрмінам «крыніцы права»?

– праватворчасць сацыяльных суб'ектаў;
– дзейнасць дзяржавы па стварэнню права;

– звесткі аб праве, якія змяшчаюцца ў кнігах;
– афіцыйныя сродкі апублікавання права;
– афіцыйныя сховішчы прававых норм.

Пытанне 60. Якія з адзначаных фактараў уплывалі на выбар знешніх форм выражэння і замацавання норм права?

– шляхі станаўлення і фармавання права;
– рэлігійныя погляды;
– філасофскія ўяўленні;
– культурныя традыцыі;
– стасункі з іншымі народамі.

Пытанне 61. Якія з адзначаных відаў крыніц права заўсёды выкарыстоўваліся ў кожнай з прававых сістэм?

– прававы звычай;
– прававы прэцэдэнт;
– дагавор нарматыўнага зместу;
– нарматыўны прававы акт;
– свяшчэннае пісанне.

Пытанне 62. Якую з адзначаных крыніц права можна лічыць гістарычна першай крыніцай права?

– прававы звычай;
– прававы прэцэдэнт;
– дагавор нарматыўнага зместу;
– нарматыўны прававы акт;
– свяшчэннае пісанне.

Пытанне 63. Адзначце рысы (уласцівасці), якія выдзяляюць прававы звычай з усёй сістэмы звычаёвых правіл паводзін.

– прызнаецца прававым дзяржавай;
– прызнаецца прававым з боку грамадства;
– рэгулюе грамадскія адносіны;
– мае прававы характар і змест;
– рэгулюе прававыя адносіны.

Пытанне 64. Якія этапы ў сваім развіцці прайшоў прававы звычай у якасці крыніцы права?

– этап сімвалаў, абрадаў;
– этап рытуалаў і рэгламентаў;

– этап вершаў, прымавак і прыказак;
– этап песен, балад, казак;
– этап пісьмовага замацавання.

Пытанне 65. Якія з адзначаных рысаў найбольш характэрны прававому звычаю як асобнай крыніцы норм права?

– рэлігійны характар;
– партыкулярны характар;
– партыйны характар;
– кансерватыўны характар;
– канструктыўны характар.

Пытанне 66. Адзначце рысы (уласцівасці), якія характарызуюць менавіта прававы прэцэдэнт.

– гэта рашэнне юрысдыкцыйнага органа;
– гэта непаўторнае рашэнне;
– гэта рашэнне абавязковае для канкрэтнай справы;
– гэта рашэнне выкарыстоўваецца як узор;
– гэта рашэнне з'яўляецца асобным правілам паводзін.

Пытанне 67. У якой з адзначаных прававых сістэм выкарыстоўваецца такая крыніца права, як прававы прэцэдэнт?

– антычная;
– кантынентальная (рамана-германская);
– сям'я агульнага права;
– мусульманская прававая сям'я;
– сям'я традыцыйнага права.

Пытанне 68. У якой з адзначаных прававых сістэм прававы прэцэдэнт з'яўляецца вядучай (асноўнай) крыніцай права?

– антычная;
– кантынентальная (рамана-германская);
– сям'я агульнага права;
– мусульманская прававая сям'я;
– сям'я традыцыйнага права.

Пытанне 69. Якія з адзначаных рысаў характарызуюць узаемадзеянне закону і прававога прэцэдэнта ў англійскай прававой сістэме?

– прэцэдэнт падпарадкаваны закону;
– закон падпарадкаваны прэцэдэнту;

– закон дзейнічае толькі праз рашэнні судоў;
– суды могуць па свайму разуменню тлумачыць закон;
– законам адмяняюцца прэцэдэнты.

Пытанне 70. Адзначце прычыны, якія абумовілі з'яўленне такой крыніцы права, як дагавор нарматыўнага зместу.

– дагавор дазваляў пераадолець кансерватызм прававога звычая;
– дагавор дазваляў пераадолець партыкулярызм права;
– дагавор адмяняў прававы звычай;
– дагавор выкарыстоўваўся дзяржаўнай уладай;
– дагавор пераадольваў сімвалізм права.

Пытанне 71. Якія з адзначаных рысаў характарызуюць дагавор нарматыўнага зместу ў якасці крыніцы права?

– дагавор уяўляе пагадненне паміж суб'ектамі права;
– дагавор уяўляе пісьмовае ці вуснае пагадненне;
– шляхам дагавору ствараецца норма права;
– дагавор дазваляе выканаць пагадненне паміж суб'ектамі;
– дагавор абараняецца самімі суб'ектамі права.

Пытанне 72. У якіх з адзначаных прававых сістэм выкарыстоўваецца ў якасці крыніцы права дагавор нарматыўнага зместу?

– скандынаўская;
– кантынентальная (рамана-германская);
– сям'я агульнага права;
– мусульманская прававая сям'я;
– сям'я традыцыйнага права.

Пытанне 73. Якія з адзначаных рысаў уласцівы такой крыніцы права, як дактрына (навука)?

– гэта навуковыя разважанні і вывады аб праве;
– яны прызнаюцца прававымі з боку дзяржавы і грамадства;
– яны адлюстроўваюць прававыя рэальнасці;
– у іх фармулююцца прававыя эквіваленты;
– яны маюць агульнаабавязковы характар.

Пытанне 74. У якой з адзначаных прававых сістэм дактрына (навука) з'яўляецца асноўнай крыніцай норм права?

– савецкая;
– кантынентальная (рамана-германская);

– сям’я агульнага права;
– мусульманская прававая сям’я;
– сям’я традыцыйнага права.

Пытанне 75. У якой з адзначаных прававых сістэм свяшчэннае пісанне з’яўляецца асноўнай крыніцай норм права?

– савецкая;
– кантынентальная (рамана-германская);
– сям’я агульнага права;
– мусульманская прававая сям’я;
– сям’я традыцыйнага права.

Пытанне 76. Якая з адзначаных фармулёвак найбольш адэкватна адлюстроўвае час узнікнення такой крыніцы права, як нарматыўны прававы акт?

– гэта апошняя па часу ўзнікнення крыніца права;
– гэта самая старажытная крыніца права;
– гэта крыніца з’явілася ў Новы час;
– гэта крыніца існавала заўсёды;
– гэта крыніца склалася адносна нядаўна.

Пытанне 77. Якія з адзначаных рысаў характарызуюць нарматыўны прававы акт у якасці крыніцы?

– гэта заўсёды акт-дакумент;
– ён зыходзіць ад дзяржавы;
– у ім утрымліваюцца нормы права;
– ён абараняецца прымусовай сілай дзяржавы;
– ён рэгулюе грамадскія адносіны.

Пытанне 78. Якія прычыны абумоўліваюць шырокае выкарыстанне нарматыўнага прававога акта ў якасці крыніцы права?

– хуткасць выдання, адмены і ўнясення зменаў;
– уносіць аднастайнасць у рэгулюемыя адносіны;
– зыходзіць з аднаго цэнтра – дзяржавы;
– дакладна і ясна рэгулюе адносіны;
– мае фармальна-азначаны характар.

Пытанне 79. У якіх з адзначаных прававых сістэм нарматыўны прававы акт з’яўляецца асноўнай (вядучай) крыніцай права?

– савецкая;

– кантынентальная (рамана-германская);
– сям’я агульнага права;
– мусульманская прававая сям’я;
– сям’я традыцыйнага права.

Пытанне 80. Які з адзначаных тэрмінаў з’яўляецца родавым для абазначэння пералічаных крыніц права?

– рэгламент;
– закон;
– нарматыўны прававы акт;
– дэкрэт;
– ардананс.

Пытанне 81. Якія з адзначаных крыніц права выконвалі вядучую ролю на самых першасных этапах развіцця права?

– прававы звычай;
– прававы прэцэдэнт;
– нарматыўны прававы акт;
– свяшчэннае пісанне;
– дагавор нарматыўнага зместу.

Пытанне 82. Якія сувязі ўсталёўваюцца паміж асобнымі крыніцамі права?

– вяршэнства права;
– вяршэнства закону;
– іерархіі крыніц права;
– каардынацыі крыніц;
– субардынацыі крыніц.

Пытанне 83. Якія сувязі паміж крыніцамі права адметна характарызуюць кантынентальную (рамана-германскую) прававую сістэму?

– вяршэнства права;
– вяршэнства закону;
– іерархіі крыніц права;
– каардынацыі крыніц;
– субардынацыі крыніц.

Пытанне 84. Які з адказаў дакладна акрэслівае віды крыніц права, якія дзейнічаюць у прававой сістэме Рэспублікі Беларусь?

– нарматыўны прававы акт і дагавор нарматыўнага зместу;
– нарматыўны прававы акт і прававы прэцэдэнт;
– асноўныя крыніцы права;
– усе вядомыя крыніцы права;
– частка вядомых крыніц права.

Пытанне 85. Якія тэрміны ўжывае Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь для азначэння ўсёй сістэмы дзеючых у краіне крыніц права?

– нарматыўны прававы акт;
– закон;
– заканадаўчы акт;
– прававы акт;
– нарматыўны акт.

Пытанне 86. Якія з пералічаных крыніц права з'яўляюцца галоўнымі ў сістэме крыніц сучаснага беларускага права?

– нарматыўны прававы акт;
– дактрына (навука);
– дагавор нарматыўнага зместу;
– прававы звычай;
– прававы прэцэдэнт.

Пытанне 87. Якія з пералічаных крыніц права з'яўляюцца асноўнымі ў сістэме крыніц сучаснага беларускага права?

– нарматыўны прававы акт;
– дактрына (навука);
– дагавор нарматыўнага зместу;
– прававы звычай;
– прававы прэцэдэнт.

Пытанне 88. Якія з пералічаных крыніц права з'яўляюцца дадатковымі ў сістэме крыніц сучаснага беларускага права?

– нарматыўны прававы акт;
– дактрына (навука);
– дагавор нарматыўнага зместу;
– прававы звычай;
– прававы прэцэдэнт.

Пытанне 89. Якія фактары (карані) абумоўліваюць падзел крыніц права на асноўныя і дадатковыя?

– будова (структура) нормы права;
– сістэма (структура) права;
– формы існавання права;
– шляхі фармавання права;
– спосабы тлумачэння права.

Пытанне 90. З дапамогай якіх адзначаных тэарэтычных канструкцый, крытэрыяў адбываюцца ранжыраванне, субардынацыя і сістэматыка крыніц права?

– юрыдычная сіла;
– юрыдычныя факты;
– юрыдычная значнасць;
– юрыдычныя падзеі;
– юрыдычная вага.

Пытанне 91. Якімі з адзначаных фактараў вызначаецца юрыдычная сіла крыніц права?

– фармальнымі;
– матэматычнымі;
– фізічнымі;
– матэрыяльнымі;
– маральнымі.

Пытанне 92. Чым вызначаецца юрыдычная значнасць крыніц права?

– юрыдычнай сілай крыніц права;
– юрыдычнай мовай крыніц права;
– юрыдычнай вагай крыніц права;
– юрыдычнай прасторай крыніц права;
– юрыдычным часам крыніц права.

Пытанне 93. Праз юрыдычную сілу якой крыніцы сучаснага беларускага права можна вызначыць юрыдычную сілу іншых крыніц права?

– дагавор нарматыўнага зместу;
– нарматыўны прававы акт;
– царкоўныя нормы;

– дактрына (навука);
– прававы прэцэдэнт.

Пытанне 94. Якія з адзначаных нарматыўных прававых актаў уваходзяць у склад заканадаўчых актаў?

– законы;
– дэкрэты;
– указы;
– пастановы;
– распараджэнні.

Пытанне 95. Які з адзначаных тэрмінаў ужываецца для характарыстыкі асобнага становішча Канстытуцыі ў сістэме крыніц права?

– першынство;
– прыярытэтнасць;
– вярхоўнасць;
– вяршэнства;
– пераважнасць.

Пытанне 96. Які з адзначаных органаў улады ў Беларусі прымае законы?

– Нацыянальны сход;
– Палата прадстаўнікоў;
– Савет Рэспублікі;
– Прэзідэнт;
– Савет Міністраў.

Пытанне 97. Якія з адзначаных органаў улады ў Беларусі прымаюць заканадаўчыя акты?

– Нацыянальны сход;
– Палата прадстаўнікоў;
– Савет Рэспублікі;
– Прэзідэнт;
– Савет Міністраў.

Пытанне 98. Лакальныя нарматыўныя прававыя акты дзейнічаюць:

– на тэрыторыі вобласці;
– на тэрыторыі горада і раёна;
– у пэўнай арганізацыі;
– у пэўнай установе;
– на пэўным прадпрыемстве.

Пытанне 99. Нарматыўныя прававыя акты мясцовых органаў самакіравання і кіравання дзейнічаюць:

– на тэрыторыі вобласці;
– на тэрыторыі горада і раёна;
– у пэўнай арганізацыі;
– у пэўнай установе;
– на пэўным прадпрыемстве.

Пытанне 100. Калектыўны дагавор, які заключаецца паміж адміністрацыяй і прафсаюзным камітэтам, адносіцца да:

– лакальных нарматыўных прававых актаў;
– дагавораў нарматыўнага зместу;
– нарматыўных актаў прафсаюзных органаў;
– нарматыўных актаў кааператыўных органаў;
– прававога звычая.

ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ №4

Пытанне 1. У якіх формах існуе права?

– у форме норм права;
– у форме нарматыўных прававых актаў;
– у форме прававой свядомасці;
– у форме прававога дагавору;
– у форме прававых адносін.

Пытанне 2. Якія з фактараў ляжаць у падмурку адзінства норм права?

– адзінства дзяржаўнай волі;
– адзінства знешняй палітыкі дзяржавы;
– адзінства прынцыпаў права;
– адзінства ўнутранай палітыкі дзяржавы;
– адзінства рэгулюемых грамадскіх адносін.

Пытанне 3. Якія з фактараў ляжаць у падмурку падзелу норм права на структурныя часткі?

– спецыфіка грамадскіх адносін;
– спецыфікай сродкаў уздзеяння на грамадскія адносіны;
– спецыфікай знешніх адносін дзяржавы;
– спецыфікай дзеяння дзяржавы ўнутры краіны;
– сістэматызацыяй і кадыфікацыяй заканадаўства.

Пытанне 4. Якія з адзначаных структур права адначасова суіснуюць у сістэме права?

– галіновая структура;
– публічна-прыватная структура;
– міжнародна-нацыянальная структура;
– матэрыяльна-працэсуальная структура;
– рэгулятыўна-ахоўная структура.

Пытанне 5. Якую з адзначаных структур права можна лічыць галоўнай структурай у дачыненні да сістэмы заканадаўства?

– галіновая структура;
– публічна-прыватная структура;
– міжнародна-нацыянальная структура;

– матэрыяльна-працэсуальная структура;
– рэгулятыўна-ахоўная структура.

Пытанне 6. У якіх з адзначаных структур аб'ядноўваюцца нормы права з аднолькавымі «матэматычнымі знакамі»?

– галіновая структура;
– публічна-прыватная структура;
– міжнародна-нацыянальная структура;
– матэрыяльна-працэсуальная структура;
– рэгулятыўна-ахоўная структура.

Пытанне 7. Якія з адзначаных структур утвараюцца праз узаемадзеянне норм права з рознымі «матэматычнымі знакамі»?

– галіновая структура;
– публічна-прыватная структура;
– міжнародна-нацыянальная структура;
– матэрыяльна-працэсуальная структура;
– рэгулятыўна-ахоўная структура.

Пытанне 8. Якая з структурных частак галіновай структуры права з'яўляецца галоўнай (асноўнай) структурнай часткай?

– норма права;
– інстытут права;
– падінстытут права;
– галіна права;
– падгаліна права.

Пытанне 9. Якая з структурных частак галіновай структуры права мае свой адметны прадмет, метад і прававы рэжым?

– норма права;
– інстытут права;
– падінстытут права;
– галіна права;
– падгаліна права.

Пытанне 10. Якія з адзначаных структурных частак заўсёды існуюць у самастойнай галіне права?

– норма права;
– інстытут права;

– падінстытут права;
– галіна права;
– падгаліна права.

Пытанне 11. Якія з адзначаных структурных частак могуць не існаваць у самастойнай галіне права?

– норма права;
– інстытут права;
– падінстытут права;
– галіна права;
– падгаліна права.

Пытанне 12. Па свайму аб'ёму сістэма права:

– ўключае прававую сістэму;
– роўная прававой сістэме;
– з'яўляецца часткай прававой сістэмы;
– перасякаецца з прававой сістэмай;
– з'яўляецца адасобленай часткай прававой сістэмы.

Пытанне 13. Якія з адзначаных залежнасцей паміж структурнымі часткамі з'яўляюцца правільнымі, лагічнымі?

– норма права – інстытут права – галіна права;
– норма права – галіна права – інстытут права;
– інстытут права – галіна права – норма права;
– галіна права – норма права – інстытут права;
– галіна права – інстытут права – норма права.

Пытанне 14. Якія з адзначаных прымет характэрны для галіны права?

– прадмет прававога рэгулявання;
– аб'ект прававога рэгулявання;
– метад прававога рэгулявання;
– прававы рэжым;
– прававыя прыёмы і сродкі.

Пытанне 15. Якія з адзначаных прымет лічацца матэрыльным крытэрыем самастойнай галіны права?

– прадмет прававога рэгулявання;
– аб'ект прававога рэгулявання;

– метад прававога рэгулявання;
– прававы рэжым;
– прававыя прыёмы і сродкі.

Пытанне 16. Якія з адзначаных залежнасцей паміж прадметам і метадам прававога рэгулявання з'яўляюцца правільнымі?

– прадмет прававога рэгулявання залежыць ад метаду;
– прадмет прававога рэгулявання вызначае прававы рэжым;
– метад прававога рэгулявання вызначаецца прадметам;
– прававы рэжым вызначаецца метадам прававога рэгулявання;
– прадмет прававога рэгулявання вызначаецца рэжымам.

Пытанне 17. Якія з адзначаных галін права ўласцівы сістэме права Рэспублікі Беларусь?

– канстытуцыйнае права;
– дзяржаўнае права;
– адміністрацыйнае права;
– ахоўнае права;
– рэгулятыўнае права.

Пытанне 18. Якая з адзначаных структур выдзяляецца ў залежнасці ад рэгулюемых і абараняемых інтарэсаў?

– галіновая;
– публічна-прыватная;
– міжнародна-нацыянальная;
– матэрыяльна-працэсуальная;
– рэгулятыўна-ахоўная.

Пытанне 19. Якая з адзначаных структур выдзяляецца ў залежнасці ад характару рэгулюемых грамадскіх адносін?

– галіновая;
– публічна-прыватная;
– міжнародна-нацыянальная;
– матэрыяльна-працэсуальная;
– рэгулятыўна-ахоўная.

Пытанне 20. Якая з адзначаных структур выдзяляецца ў залежнасці ад забеспячэння функцый права?

– галіновая;
– публічна-прыватная;

– міжнародна-нацыянальная;
– матэрыяльна-працэсуальная;
– рэгулятыўна-ахоўная.

Пытанне 21. Якая з адзначаных структур выдзяляецца ў залежнасці ад забеспячэння функцый права?

– галіновая;
– публічна-прыватная;
– міжнародна-нацыянальная;
– матэрыяльна-працэсуальная;
– рэгулятыўна-ахоўная.

Пытанне 22. На якія галіны падзяляецца міжнароднае права?

– міжнароднае публічнае права;
– галіновае права;
– міжнароднае прыватнае права;
– міжнародна-нацыянальнае права;
– матэрыяльна-працэсуальнае права.

Пытанне 23. Якая з адзначаных характарыстык найбольш адэкватна характарызуе ўзаемаадносіны міжнароднага і нацыянальнага права?

– міжнароднае права вяршэнствуе над нацыянальным правам;
– нацыянальнае права вяршэнствуе над міжнародным;
– міжнароднае і нацыянальнае права – самастойныя сістэмы;
– міжнароднае права дамінуе над нацыянальным правам;
– нацыянальнае права дамінуе над міжнародным правам.

Пытанне 24. З чаго складваецца сістэма заканадаўства?

– з норм права;
– з усіх крыніц права;
– з крыніц нацыянальнага права;
– з сістэмы нарматыўных прававых актаў;
– з сістэмы права.

Пытанне 25. Які з элементаў з'яўляецца першасным элементам сістэмы заканадаўства?

– прававы акт;
– норма права;

– галіна заканадаўства;
– нарматыўны прававы акт;
– інстытут заканадаўства.

Пытанне 26. Якое з падраздзяленняў з'яўляецца асноўным у сістэме заканадаўства?

– прававы акт;
– норма права;
– галіна заканадаўства;
– нарматыўны прававы акт;
– інстытут заканадаўства.

Пытанне 27. Якія з адзначаных фактараў паўплывалі на неабходнасць вывучэння дзеяння крыніц права?

– развіццё права;
– сутыкненне розных прававых сістэм;
– фармаванне цывілізацый і цывільнай супольнасці;
– дзяржаўная ўлада стала асноўным стваральнікам права;
– узніклі самыя розныя віды крыніц права.

Пытанне 28. У якой з адзначаных прававых сістэм знайшлі сваё найбольш поўнае ўвасабленне правілы дзеяння права і яго крыніц?

– грэчаскае права;
– рымскае права;
– іўдзейскае права;
– шумерыйскае права;
– славянскае права.

Пытанне 29. Якая з адзначаных крыніц права з'яўляецца галоўнай пры вызначэнні межаў дзеяння крыніц права?

– дагавор нарматыўнага зместу;
– прававы звычай;
– нарматыўны акт;
– нарматыўны прававы акт;
– прававы прэцэдэнт.

Пытанне 30. Якія з адзначаных момантаў характарызуюць дзеянне нарматыўнага прававога акта ў часе?

– набыццё актам юрыдычнай сілы;

– зваротная сіла акта;
– пражыванне акта;
– апублікаванне акта;
– страта актам юрыдычнага значэння.

Пытанне 31. Якія з адзначаных спосабаў уступлення нарматыўнага акта ў сілу замацаваны ў Рэспубліцы Беларусь нарматыўна?

– акт набывае сілу пасля яго прыняцця;
– акт набывае сілу пасля яго напісання;
– акт набывае сілу пасля ўключэння яго ў Нацыянальны рэестр;
– акт набывае сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання;
– акт набывае сілу пасля падпісання.

Пытанне 32. Якія з адзначаных спосабаў уступлення нарматыўнага акта ў сілу не замацаваны ў Рэспубліцы Беларусь нарматыўна?

– акт набывае сілу пасля яго прыняцця;
– акт набывае сілу пасля яго напісання;
– акт набывае сілу пасля ўключэння яго ў Нацыянальны рэестр;
– акт набывае сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання;
– акт набывае сілу пасля падпісання.

Пытанне 33. Якія з адзначаных выданняў з'яўляюцца афіцыйнамі крыніцамі апублікавання?

– «Звязда»;
– «Полымя»;
– «Народная газета»;
– «Савецкая Беларусь»;
– «Рэспубліка».

Пытанне 34. Якія з адзначаных спосабаў страты актам юрыдычнай сілы знайшлі нарматыўнае замацаванне?

– простая (прамая) адмена нарматыўнага прававога акта;
– фактычная адмена дзеяння нарматыўнага прававога акта;
– сканчэнне тэрміну, на які быў прыняты нарматыўны прававы акт;
– адмена нарматыўнага прававога акта Канстытуцыйным Судом;
– адміранне (змяненне) грамадскіх адносін.

Пытанне 35. Якія з адзначаных спосабаў страты юрыдычнай сілы нарматыўнага акта не замацаваны ў Рэспубліцы Беларусь нарматыўна?

– простая (прамая) адмена нарматыўнага прававога акта;
– фактычная адмена дзеяння нарматыўнага прававога акта;
– сканчэнне тэрміну, на які быў прыняты нарматыўны прававы акт;
– адмена нарматыўнага прававога акта Канстытуцыйным Судом;
– адміранне (змяненне) грамадскіх адносін.

Пытанне 36. Як гучыць агульнае правіла аб зваротнай сіле дзеяння нарматыўнага прававога акта?

– закон зваротнай сілы не мае;
– закон зваротную сілу мае;
– закон можа мець зваротную сілу;
– закон не можа мець зваротнай сілы;
– закон заўсёды мае зваротную сілу.

Пытанне 37. Якія з адзначаных паказчыкаў правільна сведчаць аб зваротнай сіле нарматыўнага прававога акта?

– закон мае зваротную сілу, калі ён змякчае адказнасць;
– закон мае зваротную сілу, калі ён адмяняе адказнасць;
– закон мае зваротную сілу, калі ён адмяняе пакаранне;
– закон мае зваротную сілу, калі ён паляпшае становішча асобы;
– закон мае зваротную сілу, калі гэта прадугледжана ў законе.

Пытанне 38. Якія з адзначаных частак уваходзяць у склад тэрыторыі дзяржавы?

– частка зямной паверхні;
– нетры зямлі;
– унутраныя воды;
– тэрытарыяльныя воды;
– тэрыторыя пасольстваў.

Пытанне 39. Якія з адзначаных характарыстык уласцівы для поўнай юрысдыкцыі дзяржавы?

– фармуляванне правіл паводзін;
– выкананне правіл паводзін;
– ажыццяўленне правасуддзя;

– правядзенне самастойнай знешняй палітыкі;
– правядзенне самастойнай унутранай палітыкі.

Пытанне 40. Юрысдыкцыя дзяржавы бывае:

– тэрытарыяльная;
– экстэрытарыяльная;
– поўная;
– абмежаваная;
– спецыяльная.

Пытанне 41. Па дзеянню ў прасторы юрысдыкцыя бывае:

– тэрытарыяльная;
– экстэрытарыяльная;
– поўная;
– абмежаваная;
– спецыяльная.

Пытанне 42. Па аб'ёму юрысдыкцыя дзяржавы бывае:

– тэрытарыяльная;
– экстэрытарыяльная;
– поўная;
– абмежаваная;
– спецыяльная.

Пытанне 43. Згодна са статуарнай тэорыяй statuta personalia – гэта:

– вызначэнне юрыдычнага становішча асобы;
– вызначэнне праў на нейкія рэчы;
– вызначэнне праў на імя;
– вызначэнне праў на тэрыторыю;
– вызначэнне становішча нерухомасці.

Пытанне 44. Згодна са статуарнай тэорыяй statuta realia – гэта:

– вызначэнне юрыдычнага становішча асобы;
– вызначэнне праў на нейкія рэчы;
– вызначэнне праў на імя;
– вызначэнне праў на тэрыторыю;
– вызначэнне становішча нерухомасці.

Пытанне 45. Якія з пералічаных асоб валодаюць імунітэтам?

– манархі;
– экзархі;
– прэзідэнты;
– прадстаўнікі;
– дэпутаты.

.

Пытанне 46. Выраз lex specialis deroqat lex qeneralis азначае:

– спецыяльны закон падпарадкаваны агульнаму закону;
– агульны закон падпарадкаваны спецыяльнаму;
– спецыяльны закон пераўзыходзіць агульны закон;
– спецыяльны закон адмяняе дзеянне агульнага закону;
– спецыяльны закон канкрэтызуе закон агульны.

Пытанне 47. На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь вяршэнствам валодаюць:

– агульнапрызнаныя прынцыпы міжнароднага права;
– агульнапрызнаныя нормы міжнароднага права;
– міжнародныя звычаі;
– міжнародныя пакты;
– міжнародныя дагаворы.

Пытанне 48. Якія з адзначаных спосабаў прымяняюцца ў Рэспубліцы Беларусь для дачы згоды на абавязковасць для яе норм міжнароднага права?

– падпісанне дагавору;
– абмен дакументамі;
– ратыфікацыя дагавору;
– далучэнне да дагавору;
– прызнанне дагавору.

Пытанне 49. Які з адзначаных органаў улады ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляе ратыфікацыю дагавораў?

– Прэзідэнт краіны;
– Нацыянальны Сход;
– Савет Міністраў;
– Міністэрства замежных спраў;
– Міністэрства юстыцыі.

Пытанне 50. Які з адзначаных органаў улады ажыццяўляе папярэднюю экспертызу міжнародных дагавораў на іх адпаведнасць Асноўнаму закону краіны?

– Прэзідэнт краіны;
– Нацыянальны Сход;
– Савет Міністраў;
– Міністэрства замежных спраў;
– Міністэрства юстыцыі.

Пытанне 51. Якія з адзначаных этапаў (стадый) уласцівы працэсу стварэння права?

– стварэнне законаў;
– складванне праваадносін;
– стварэнне праваадносін;
– стварэнне правасвядомасці;
– стварэнне норм права.

Пытанне 52. Якія з адзначаных характарыстык з'яўляюцца самымі істотнымі для праватворчасці?

– прававая рэгламентаванасць;
– завершанасць усіх этапаў (форм) стварэння права;
– дзейнасць дзяржавы па стварэнню права;
– мэтанакіраванасць дзеянняў па стварэнню права;
– сістэмнасць дзеянняў па стварэнню права.

Пытанне 53. Якія з адзначаных рысаў характарызуюць нарматворчасць?

– гэта дзейнасць па стварэнню норм права;
– гэта стварэнне нарматыўнай часткі існавання права;
– гэта дзейнасць мае мэтанакіраваны характар;
– гэта дзейнасць упаўнаважаных суб'ектаў;
– гэта заўсёды планавая дзейнасць.

Пытанне 54. Якое месца займае заканатворчасць сярод паняццяў стварэння права, праваўтварэння, праватворчасці і нарматворчасці?

– заканатворчасць уключае ў сябе адзначаныя паняцці;
– заканатворчасць з'яўляецца відам нарматворчасці;
– заканатворчасць – самастойны від праватворчасці;

– заканатворчасць з’яўляецца этапам стварэння права;
– заканатворчасць – заключны этап стварэння права.

Пытанне 55. Якое месца займае дзейнасць па стварэнню нарматыўных прававых актаў у сістэме нарматворчасці ?

– уяўляе сабой частку, від заканатворчасці;
– разнавіднасць стварэння права;
– разнавіднасць нарматворчасці;
– самастойны від стварэння права;
– самастойны этап праватворчасці.

Пытанне 56. Якое з адзначаных паняццяў характарызуе дынаміку фармавання права?

– стварэнне права;
– праваўтварэнне;
– праватворчасць;
– фармаванне права;
– законаўтварэнне.

Пытанне 57. Якія з адзначаных відаў праватворчасці выдзелены ў залежнасці ад органаў і асобных галін улады?

– заканатворчасць;
– нарматворчасць органаў выканаўчай улады;
– падзаконная праватворчасць;
– нарматворчасць органаў судовай улады;
